БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
Кафедра беларускага мовазнаўства

МОВА – ЛІТАРАТУРА – КУЛЬТУРА

Матэрыялы IX Міжнароднай
навуковай канферэнцыі памяці прафесара
Арнольда Яфімавіча Міхневіча

Мінск, 15–16 кастрычніка 2020 г.

Мінск
БДУ
2020

УДК 811.161.3(06)+821.161.3.09(06)
ББК 81.411.3я431+83.3(4Беи)я431
М74

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я :
А. А. Радзевіч (гал. рэд.), *А. І. Бельскі, І. А. Гапоненка, А. В. Губкіна, Л. В. Давыдава, С. М. Запрудскі, Г. І. Кулеш, А. М. Муравіцкая, Ю. В. Назаранка, В. У. Праскаловіч, М. Р. Прыгодзіч, А. У. Пятровіч, Т. Р. Рамза, А. Л. Садоўская, М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова, М. К. Чаеўская, Г. К. Чахоўскі, Т. Л. Чахоўская, В. К. Шчэрбін, С. М. Якуба, Н. В. Яненка*

Р э ц э н з е н т ы :
доктар філалагічных навук прафесар *В. Д. Старычонак*;
доктар філалагічных навук прафесар *Т. І. Шамякіна*

Мова – літаратура – культура : матэрыялы IX Міжнар. навук. канф. памяці праф. А. Я. Міхневіча, Мінск, 15–16 кастр. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Радзевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2020. – 297 с.
М74
ISBN 978-985-881-069-6.

Прадстаўлены матэрыялы IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мова – літаратура – культура», прысвечанай памяці прафесара А. Я. Міхневіча, працы якога сталі класікай не толькі нацыянальнай, але і замежнай філалогіі. Удзельнікі канферэнцыі абмеркавалі такія актуальныя тэматычныя кірункі, як аспекты моўных даследаванняў, беларуская тэрміналогія і тэрмінаграфія, гісторыя беларускай мовы, беларуская літаратура: гісторыя і сучаснасць, нацыянальныя літаратуры ў сусветным кантэксце, методыка выкладання філалагічных дысцыплін і інш.

Адрасуецца студэнтам, настаўнікам, навуковым супрацоўнікам, а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі філалогіі і культуры.

УДК 811.161.3(06)+821.161.3.09(06)
ББК 81.411.3я431+83.3(4Беи)я431

ISBN 978-985-881-069-6

© БДУ, 2020

На філалагічным сумежжы

Традыцыя правядзення сёлетняй дзявятай па ліку навуковай канферэнцыі бярэ свой адлік часу яшчэ з канца XX стагоддзя, калі ў кастрычніку 1997 г. адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя», правядзенне якой рэгламентавалася Міжнародным лінгвістычным праектам «Najnowsze dzieje języków słowiańskich», што выконваўся ў Апольскім універсітэце пад кіраўніцтвам Польскай акадэміі навук і пры падтрымцы ЮНЕСКА. Менавіта ў пастанове гэтай канферэнцыі канстатавалася неабходнасць не радзей аднаго разу ў два гады правядзенне навуковых канферэнцый па актуальных праблемах развіцця сучаснай беларускай мовы. Пазней да лінгвістаў далучыліся літаратуразнаўцы, метадысты і культуролагі, а першая частка ў назве канферэнцыі стала залежаць ад профілю кафедры-арганізатара навуковага форуму.

Правядзенне сёлетняй канферэнцыі супала з сумнай навіной аб смерці аднаго з самых слынных лінгвістаў на постсавецкай прасторы – прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча. Вучні і калегі вучонага вырашылі прысвяціць яе памяці навукоўца. Істотна змяніўся і фармат правядзення самой канферэнцыі, з-за аб'яўленай пандэміі каронавіруснай інфекцыі яна стала вочна-завочнай, частка выступленняў была заслухана ў анлайн-рэжыме. Аднак гэтыя абставіны не перашкодзілі актыўнаму ўдзелу ў яе правядзенні як многім аўтарытэтным даследчыкам праблем філалагічнага сумежжа, так і тым, што толькі спрабуе знайсці сваё месца ў вывучэнні шматаспектных пытанняў лінгвістыкі, літаратуразнаўства і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін.

Ад імя аргкамітэта канферэнцыі хачу выказаць асаблівую падзяку прафесару Таццяне Расціславаўне Рамза і дацэнту Юліі Віктараўне Назаранцы за пранікнёнае лірычна-мастацкае афармленне і вядзенне пленарнага пасяджэння, а таксама дацэнту Георгію Чахоўскаму і ст. выкладчыку Аляксандру Радзевічу, дзякуючы якім былі падрыхтаваны камп'ютарная версія і арыгінал-макет гэтага зборніка. Шчыры дзякуй усім, хто спрычыніўся да нашага мерапрыемства, аддаў даніну павагі нашаму навуковаму і жыццёваму Настаўніку Арнольду Яфімавічу Міхневічу.

Мікалай Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства, доктар філалагічных навук, прафесар

Круглы стол
(Пленарнае пасяджэнне)

ПАМЯЦІ ПРАФЕСАРА А. Я. МІХНЕВІЧА

З УСПАМІНАЎ ПРА А. Я. МІХНЕВІЧА

І.С. Роўда

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
RovdoIS@bsu.by

Успаміны прысвечаны доктару філалагічных навук, прафесару А. Я. Міхневічу, чалавеку, які шмат зрабіў для беларускай лінгвістыкі і культуры, пад кіраўніцтвам якога абаронена шмат дысертацый; чалавеку, у якога шмат чаму можна было навучыцца.

Ключавы словы: А.Я. Міхневіч; прафесар; дысертацыя; аспірант.

На філалагічным факультэце часта праходзяць канферэнцыі, чытанні, прысвечаныя знакамітым лінгвістам, літаратарам нашай краіны, людзям, якія шмат зрабілі для нашай навукі і культуры, вядомасць якіх выйшла за межы Беларусі.

Лёс кожнага чалавека ў значнай ступені прадвызначаецца людзьмі, якія сустракаюцца на яго шляху. Адным з такіх людзей на маім шляху быў Арнольд Яфімавіч Міхневіч. У свае аспіранцкія гады я, канечне ж, ведаў, што ёсць у нашай краіне такі прафесар, але сустрэўся з ім першы раз у сітуацыі, якая дазволіла мне па-іншаму ўспрымаць узаемаадносіны людзей розных пакаленняў. Для напісання кандыдацкай дысертацыі мне не хапала адной манаграфіі, якой у нашай краіне не было. Мой навуковы кіраўнік прафесар П. П. Шуба падказаў, што гэта выданне ёсць у А. Я. Міхневіча і параіў папрасіць у яго кнігу. Мне на той час здавалася, што вядомы чалавек, да якога звяртаешся з такой “дробяззю”, можа нават пакрыўдзіцца. Мае дрыжыкі ў каленях адразу спыніліся, калі Арнольд Яфімавіч, якога я сустрэў на факультэце, адказаў, што няма ніякіх праблем з тым, каб я мог атрымаць манаграфію, і мы паехалі да яго дамоў, абмяркоўваючы па дарозе некаторыя фрагменты маёй дысертацыі. Прафесар не толькі даў пачытаць мне кнігу, але падарыў яшчэ і сваю. Я вяртаўся дадому і думаў пра тое, што зрабіў для сябе “вялікае” адкрыццё: аказваецца, прафесар такі ж чалавек, як і малады аспірант, толькі старэйшы, больш вопытны і мудры, асабліва, калі цудоўныя

чалавечыя якасці гэтага чалавека арганічна ўпісваюцца ў яго тытулы і званні.

Нездарма кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Арнольда Яфімавіча можна, безумоўна, аднесці да такіх людзей. Пачуццё гумару А. Я. Міхневіча грунтавалася на добрым веданні не толькі розных лінгвістычных напрамкаў, але і беларускай, і сусветнай літаратуры, фальклору, традыцый розных народаў, педагогікі. Ён часта выступаў апанентам кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, быў рэцэнзентам манаграфій, падручнікаў па беларускай і рускай мовах для сярэдняй і вышэйшай школ. Фармалізму ў яго рэцэнзіях, водгуках не было, але я не памятаю, каб яны кім-небудзь успрымаліся як злыя ці абразлівыя. Быў ён апанентам і маёй доктарскай дысертацыі. Арнольд Яфімавіч добра разумеў, што чалавек, які выходзіць за трыбуну ў якасці саіскальніка вучонай ступені, заўсёды хвалюецца. Таму ён пачаў сваё выступленне з гісторыі пра раніцу дня, калі ён адкрыў газету і ў сваім гараскопе прачытаў, як апанент павінен ставіцца да тых, каго апаніруе. Члены савета ўспрынялі такі пачатак яго выступлення з усмешкай, а ў мяне хваляванне адразу ж амаль прайшло. Але самае цікавае заключалася ў тым, што ў газеце сапраўды было пра гэта напісана, а я і па сённяшні дзень захоўваю артыкул з той газеты як напамін яшчэ пра адзін урок А. Я. Міхневіча: умець ставіць сябе на месца іншага і падтрымаць чалавека ў складаных жыццёвых абставінах.

Прайшлі гады. Быў час, калі мы працавалі з Арнольдам Яфімавічам на адным факультэце, у адным савеце, не раз абмяркоўвалі розныя навуковыя, метадычныя і проста жыццёвыя пытанні, і кожны раз я лавіў сябе на думцы, што часцінкі яго вялікага вопыту магу пазычыць, пераняць і быць удзячным лёсу за сустрэчу з чалавекам, які мяне не вучыў, але ў якога я вучыўся.

РОЛЯ А.Я. МІХНЕВІЧА Ў РАЗВІЦЦІ ЛІНГВІСТЫКІ АФАРЫЗМА ЯК АДНАГО З НАПРАМКАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ СЕМІЁТЫКІ

В.К. Шчэрбін

Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
slavalex@mail.ru

Зварот да аналізу навуковай спадчыны А.Я. Міхневіча кожны раз знаёміць нас з новымі гранямі яго навуковага таленту. Асноўнай тэмай дадзенага аналізу стала вызначэнне ролі А.Я. Міхневіча ў развіцці лінгвістыкі афарызма і сацыяльнай семіётыкі. Апошнім часам навуковыя даследаванні па гэтых напрамках гуманітарыстыкі імкліва развіваюцца, што абумоўлена павелічэннем вагі малых тэкставых формаў ва ўмовах сучаснага інфармацыйна-кагнітыўнага выбуху. А.Я. Міхневіч адным з першых адчуў

гэтыя тытанічныя “зрухі” ў развіцці моўнай і тэкставай культуры і прыцягнуў нашу ўвагу да такіх “зрухаў”. У артыкуле прыводзяцца шматлікія доказы на карысць гэтай высновы.

Ключавыя словы: навуковая спадчына А.Я. Міхневіча; лінгвістыка афарызма; сацыяльная семіётыка; малыя тэкставыя формы; ідыямемы.

Як аднаму з вучняў А.Я. Міхневіча і як прадстаўніку яго навуковай школы, мне шмат разоў даводзілася аналізаваць навуковую спадчыну Арнольда Яфімавіча і друкаваць па выніках такіх аналізаў адпаведныя навуковыя працы. У прыватнасці, да іх ліку можна аднесці наступныя мае публікацыі:

(1) Арнольд Яфімавіч Міхневіч (Да 60-годдзя з дня нараджэння): Біябібліяграфічны паказальнік. Мн.: Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі, 1996. – 48 с.;

(2) Кароткі нарыс навукова-педагагічнай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі Арнольда Яфімавіча Міхневіча // Міхневіч А. Я. Выбраныя працы. Мн.: Права і эканоміка, 2006. С. 3–25;

(3) І плённа, і з талентам: Навуковыя абсягі Арнольда Міхневіча // Роднае слова. 2006. № 9. С. 30–31;

(4) Кароткі нарыс навукова-педагагічнай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі Арнольда Яфімавіча Міхневіча // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. Вып. 5. Да 70-годдзя з дня нараджэння доктара філалагічных навук, прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча. Мн.: РІВШ, 2006. С. 10–35;

(5) Беларуская мовазнаўчая энцыклапедыстыка // Скарынавы запаветы і сучаснасць. Да 95-годдзя з дня нараджэння прафесара У.В. Анічэнкі: Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2019. С. 322–329.

Прычым, калі першыя чатыры публікацыі насілі юбілейны характар і ў іх рабіўся агляд усёй навукова-педагагічнай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці юбіляра, то ў пятай нашай публікацыі аналізуецца галоўная праца жыцця Арнольда Міхневіча – створаная па яго ініцыятыве і пад яго рэдакцыяй энцыклапедыя “Беларуская мова” (Мн., 1994. Скарочана: БМЭ). Пры гэтым указаная энцыклапедыя параўноўвалася намі па шэрагу паказчыкаў з наступнымі па часе свайго выдання трыма энцыклапедычнымі даведнікамі. У ліку апошніх: “Мовы свету” В.І. Рагаўцова (Магілёў, 2009. Скарочана; МСЭД); лінгвістычная частка першага тома рускамоўнай дванаццацітомавай “Энциклопедии для школьников и студентов” (Мн., 2009. Скарочана: ЭШС1); сёмы том гэтай жа шматтомавай “Энциклопедии для школьников и студентов” (Мн., 2017. Скарочана: ЭШС7), цалкам прысвечаны беларускай мове. У выніку ажыццяўлення параўнальнага

аналізу зместу ўказаных мовазнаўчых энцыклапедычных даведнікаў была зроблена наступная выснова: “…цалкам замяніць БМЭ наступныя па часе свайго выдання МСЭД, ЭШС1 і ЭШС7 нават узятыя разам не могуць, бо ў іх адсутнічаюць многія тыпы энцыклапедычных артыкулаў (артыкулы-персаналіі, артыкулы пра многія агульналінгвістычныя паняцці, артыкулы аб асноўных мовазнаўчых працах, гістарычных крыніцах і падзеях, артыкулы пра многія арганізацыйныя мовазнаўчыя структуры і г.д.), якія шырока прадстаўлены ў БМЭ” [1, с. 327].

Аднак сёння мы звернемся да разгляду той часткі навуковай спадчыны Арнольда Міхневіча, якая не разглядалася намі раней і якая, на наш погляд, і сёння вызначае ўзровень распрацоўкі такога найноўшага напрамку ў беларускім мовазнаўстве, як лінгвістыка афарызма. Мне могуць запярэчыць, што бясспрэчным лідарам гэтага напрамку ў Беларусі з’яўляецца выкладчык Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова Яўген Іваноў, які выдаў ужо дзве хрэстаматыі [2; 3] і мноства навуковых артыкулаў па лінгвістыцы афарызма (гл., напр.[4]). Усё гэта так, але ў адрозненне ад Яўгена Іванова наш юбіляр займаўся ў сваіх даследаваннях па афарыстыцы Якуба Коласа, Станіслава Леца, Яна Ліцынія Намыслоўскага і іншых творцаў афарыстычных выслоўяў не толькі пытаннямі лінгвістыкі афарызма, але і праблемамі семіётыкі афарызма, семіётыкі смеху, семіётыкі эмоцый, этналінгвістыкі і лінгвістыкі фальклору, крылаталогіі і ўвогуле ідыяматыкі, вывучэннем феноменаў мадальнасці і ідыямеметыкі, і шмат чым яшчэ, што так або інакш закранае афарыстыку і звязвае яе з такой шырокай галіной ведаў, як сацыяльная семіётыка.

Таму, хто лічыць неабавязковым для сучаснага мовазнаўца мець такі шырокі навуковы кругагляд, які быў уласцівы для Арнольда Міхневіча, можна нагадаць слушныя словы выдатнага расійска-амерыканскага лінгвіста Рамана Якабсона аб тым, што “ажыццяўляемыя ў цяперашні час даследаванні ў межах такіх перакрыжаваных напрамкаў, як сацыялінгвістыка, антрапалагічная лінгвістыка, этналінгвістыка ці лінгвістыка фальклору, уяўляюць сабою наглядны пратэст супраць усё яшчэ існуючых перажыткаў сасюраўскай тэндэнцыі абмежавання задач і мэтаў лінгвістыкі. Тым не менш, такое абмежаванне задач і мэтаў, што накладваецца асобным лінгвістам або лінгвістычным напрамкам на прадмет свайго даследавання, нельга лічыць “згубным”; усякае пільнае даследаванне абмежаванай вобласці ўнутры лінгвістыкі, любое самаабмежаванне і вузкая спецыялізацыя заслугоўваюць права на існаванне. Памылковым і згубным можна лічыць толькі грэбаванне іншымі сферамі мовы, якія з’яўляюцца быццам бы неістотнымі і другараднымі; асабліва ж шкодныя спробы поўнага выключэння такіх сфер з “сапраўднай” лінгвістыкі” [5, с. 380–381]. На думку Р. Якабсона, “лінгвістычныя даследаванні неабходна дапоўніць больш шырокімі семіятычнымі і антрапалагічнымі даследаваннямі” [5, с. 383].

Пра тое, што развіццё сучаснага мовазнаўства ідзе ва ўказаным Р. Якабсонам напрамку няспыннага пашырэння дысцыплінарных межаў лінгвістыкі, найбольш яскрава сведчыць той факт, што нават паняцце моўнай нормы тлумачыцца ў сучасных семантычных слоўніках не толькі як лінгвістычнае паняцце: “…паколькі мова з’яўляецца па азначэнню сацыяльнай з’явай, звернутай да розных сфер чалавечай дзейнасці, моўную норму нельга, відаць, абмежаваць выключна лінгвістычным аспектам, а неабходна хутчэй трактаваць як мультымадальную сацыяльна-гістарычную катэгорыю” [6, с. 144–145]. На наш погляд, Арнольд Яфімавіч востра адчуваў гэтую генеральную тэндэнцыю да пашырэння межаў сучаснага мовазнаўства і заўсёды імкнуўся быць у ліку першапраходцаў пры засваенні новых навуковых дысцыплін і напрамкаў.

Паспрабуем паказаць гэта на матэрыяле прац А.Я. Міхневіча, у якіх вывучаюцца адзінкі такога напрамку сацыяльнай семіётыкі, як меметыка, якая самым непасрэдным чынам звязана з лінгвістыкай афарызма. Большасць з нас, відаць, пазнаёмілася з паняццем *мем* пасля перакладу на рускую мову і выдання ў 2016 г. маскоўскім выдавецтвам “АСТ” кнігі брытанскага біёлага Рычарда Докінза “Эгаістычны ген” (1976), які і ўвёў ва ўжытак паняцце *мем* для абазначэння базавай адзінкі культурнай эвалюцыі, своеасаблівага культурнага гена: “Нам неабходна імя для новага рэплікатара, назоўнік, які адлюстраваў бы ідэю аб адзінцы перадачы культурнай спадчыны… Ад прыдатнага грэчаскага кораня атрымліваецца слова “мімема”, але мне хочацца, каб слова было аднаскладовым, як і “ген”. Я спадзяюся, што мае сябры, якія атрымалі класічную адукацыю, даруюць мне, калі я скарачу слова “мімема” да “мем”. <…> Прыкладамі мемаў служаць мелодыі, ідэі, модныя слоўцы і выразы, спосабы гатавання ежы альбо пабудовы арак” [7, с. 295].

Аднак у навуковых працах А.Я. Міхневіча тэрміны *мімема*, *ідыямема* выкарыстоўваюцца значна раней 2016 года. Напрыклад, у артыкуле “Да семіётыкі смеху”, упершыню апублікаваным Арнольдам Яфімавічам яшчэ ў 2006 годзе, ужываецца тэрмін *мімема смеху*, пры дапамозе якога апісваюцца розныя тыпы гукавой рэакцыі, такія як смех на *–а (ха-ха-ха),* смех на *–э (хе-хе-хе), смех на –о (хо-хо-хо)* і інш. [8, с. 179]. У сваю чаргу, тэрмін *ідыямема,* па ўласнаму прызнанню А.Я. Міхневіча, запазычаны ім у 2003 годзе з працы Ю.М. Каравулава для апісання “розных ідыямем беларускай мовы на фоне і ў супастаўленні з рускай. Аднак гэта былі хутчэй ілюстрацыі да тэзіса аб ідыяматычнасці мовы беларусаў, якая не зводзіцца толькі да паняцця “устойлівы моўны зварот, значэнне якога не вызначаецца значэннем уваходзячых у яго склад слоў”, г.зн. да аднаго тыпу добра вывучаных ідыямем, называемых фразеалагізмамі. Ідыяматычнасць уласціва ўсяму ладу мовы і маўлення любога этнасу… Відавочна, што ідыяматычнасць мовы звязана з характарам этнакультуры” [9, с. 147]. Цікава, што ў працытаваным трохстаронкавым артыкуле А.Я. Міхневіча

падаецца значна больш шырокая і падрабязная сінаптычная схема ідыямем нацыянальнай мовы, чым у адпаведных раздзелах манаграфій Ю.М. Каравулава, прысвечаных стварэнню аналагічных сінаптычных схем ідыямем (гл. [10, с. 80–100; 11, с. 47–110]).

Трэба сказаць, што да ўжывання ў сваіх працах тэрміна *ідыямемы* для абазначэння сукупнасці разнастайных ідыяматычных адзінак Арнольд Яфімавіч прыйшоў не адразу. Спачатку для характарыстыкі асобных з'яў ідыяматыкі і афарыстыкі Якуба Коласа ім выкарыстоўваўся тэрмін *малыя формы творчасці*: "Па-за ўвагай чытачоў і даследчыкаў, вядома, не засталіся тыя асноўныя формы, у якія адлівалася мастацкая думка творцы, - верш і апавяданне, аповесць і вершаваная казка, паэма і раман і інш. Аднак яны не вычэрпваюць усёй разнастайнасці жанраў, характэрных для Якуба Коласа. Пісьменнік быў майстрам і малых форм творчасці – афарыстычных выказванняў, аўтарскіх прыказак, трапных найменняў, анекдотаў, праклёнаў, заклікаў, прыгаворак і г.д., што могуць быць аб'яднаны агульным паняццем выслоўя" [12, с. 230].

Але потым спецыялістамі, што працуюць у галіне ідыяматыкі, афарыстыкі і меметыкі, былі вызначаны наступныя ўзаемасувязі рознай вектарнай накіраванасці паміж ідыёмамі і мемамі:

1) Інтэрнет-мемы, медыя-мемы, палітычныя, сацыяльныя і іншыя тыпы мемаў могуць стварацца шляхам трансфармацыі афарызмаў, прыказак, крылатых слоў і іншых ідыём. На думку Н.Н. Фёдаравай, "актывізацыя выкарыстання трансфармаваных прыказак тлумачыцца тым, што яны выконваюць асаблівы "сацыяльны заказ", "асучасніваюць" шаблонізіраваныя шматгадовым (а часта і шматвяковым) выкарыстаннем парэміі і адлюстроўваюць актуальныя для носьбітаў мовы рэаліі" [13, с. 14];

2) Ствараемыя найноўшыя мемы з цягам часу таксама могуць ператварацца ў ідыёмы. У сваім артыкуле "Феномен Інтэрнет-мема" О.А. Змазнева і Н.В. Ісаева задаюць рытарычнае пытанне: "Што ж чакае ў далейшым такую з'яву, як мемы?" - І самі даюць адказ на гэта пытанне. – "Па-першае, гэта шлях затухання, паступовага пераходу ў пасіўную лексіку. <…> А, па-другое, - лексікалізацыя, пераход у фразеалагізмы, крылатыя словы і выразы" [14, с. 67].

На скрыжаванні гэтых рознанакіраваных узаемасувязей паміж ідыёмамі і мемамі якраз і знайшлі сваё месца а) аб'яднальнае паняцце *ідыямема* і б) стварэнне сінаптычных схем ідыямем нацыянальных моў – задача, з вырашэннем якой так бліскуча, на наш погляд, справіўся Арнольд Міхневіч. Кажам гэта з веданнем справы, таму што самім давялося праводзіць даследаванне па вывучэнні розных тыпаў мемаў і навукі, аб'ектам якой яны з'яўляюцца (меметыкі). Па выніках гэтага даследавання былі зроблены наступныя высновы:

"1) меметыка (як навука аб гістарычных, культурных, палітычных, сацыяльных, эканамічных і іншых тыпах мемаў) з'яўляецца ў цяперашні час

новай міждысцыплінарнай навукай, выкарыстанне метадалагічных і семіятычных магчымасцей якой выступае яшчэ адным фактарам у працэсах вывучэння, захавання і перадачы наступным пакаленням назапашаных навуковых ведаў;

2) меметыка, будучы міждысцыплінарнай навукай і адным з напрамкаў сацыяльнай семіётыкі, садзейнічае ўстанаўленню больш трывалых сувязей апошняй з іншымі відамі семіятычных даследаванняў (біясеміётыкай, кіберсеміётыкай, палітычнай семіётыкай, семіётыкай культуры, эканамічнай семіётыкай і г.д.)" [15, с. 45].

Што ж даюць сёння ў практычным плане прадстаўнікам беларускай гуманітарнай навукі лінгвістыка афарызма і звязаныя з ёю навуковыя напрамкі (ідыяматыка, меметыка, семіётыка афарызма, сацыяльная семіётыка і інш.)? Ва ўмовах сучаснага інфармацыйна-кагнітыўнага выбуху, калі прасцей і танней правесці новае даследаванне, чым адшукаць вынікі папярэдняга, доўгія навуковыя нарратывы (манаграфіі, навуковыя артыкулы і інш.), на наш погляд, непазбежна саступяць шлях малым формам навуковай творчасці – навуковым афарызмам, цытатам, удалым навукова-папулярным мемам, трапным азначэнням ключавых навуковых паняццяў і канцэптаў, якія сёння становяцца сапраўднымі навукова-культурнымі генамі, што забяспечваюць перадачу найбольш важнай навуковай інфармацыі наступным пакаленням даследчыкаў.

Сведчаннем таго, што ўказаны працэс "мініяцюрызацыі" навуковых тэкставых форм ужо актыўна ідзе, з'яўляецца імклівы рост папулярнасці такіх выданняў, як "Пароли. От фрагмента к фрагменту" Жана Бадрыйяра, "Гарики" Ігара Губермана, "Славянские сутры» Эдуарда Скобелева, "Словарный запас» Льва Рубінштэйна, "Прикольный словарь (антипословицы и антиафоризмы)" Хары Вальтара і Валерыя Макіенкі. Інакш кажучы, на новым этапе развіцця сучаснай тэкставай культуры адбываецца вяртанне да той мемарыяльнай практыкі захавання ведаў, якая існавала ў эпоху да з'яўлення кнігадрукавання. З гісторыі беларускай фальклярыстыкі вядома, што да з'яўлення рукапісных і друкаваных тэкстаў усе этнаграфічныя, культурныя, гістарычныя, моўныя і іншыя звесткі пра жыццё беларускага народа на працягу многіх стагоддзяў перадаваліся ад аднаго пакалення беларусаў да наступнага пакалення пры дапамозе шматлікіх прыказак, прымавак, загадак, жартаў, песень і іншых жанраў вуснай народнай творчасці. Згадаем слушныя словы выдатнага беларускага фальклярыста і лексікографа Івана Насовіча на гэты конт: "Беларусы ўсе факты, усе выпадковасці чалавечага жыцця, усе ўчынкі, як добрыя, так і дрэнныя, і ўсякае нават меркаванне пра што-небудзь падводзяць пад мерку прыказак сваіх" [16, с. 3]. Пераемнасць з папярэдняй мемарыяльнай практыкай захавання ведаў нам бачыцца не ў вяртанні вуснай формы такой перадачы (хаця і яна выкарыстоўваецца больш шырока ў апошні час), а ў вяртанні малых тэкставых форм.

Навуковая мудрасць і нават геніяльнасць такіх асоб, як прафесар Аднольд Яфімавіч Міхневіч, на наш погляд, якраз і заключаецца ў тым, што яны першымі адчуваюць такія тытанічныя “зрухі” ў развіцці нашай моўнай і тэкставай культуры і прыцягваюць нашу ўвагу да такіх “зрухаў”.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Шчэрбін В.К.* Беларуская мовазнаўчая энцыклапедыстыка // Скарынавы запаветы і сучаснасць: да 95-годдзя з дня нараджэння прафесара У. В. Анічэнкі: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі [«Святло Скарынавых ідэй», г. Гомель, 2019 г. / рэдкалегія: А. М. Воінава (галоўны рэдактар) [і інш.]. Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2019. С. 322–329.
2. Языковая природа афоризма: очерки и извлечения: пособие для филологических специальностей высших учебных заведений / Министерство образования Республики Беларусь, Могилевский государственный университет им. А. А. Кулешова / сост., общ. ред. и вступ. ст. Е.Е. Иванов. Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2001. 437 с.
3. Лингвистика афоризма: хрестоматия: учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по филологическим специальностям / сост. Е. Е. Иванов. Мінск : Вышэйшая школа, 2018. 303 с.
4. *Іваноў Я.Я.* Афарызм як прадмет філалогіі і аб’ект лінгвістыкі // Веснік БДУ. Сер. 4. 1994. № 3. С. 61–65.
5. *Якобсон Р.* Лингвистика в ее отношении к другим наукам // Якобсон Р. Избранные работы / пер. с англ., нем., фр.; сост. и общ. ред. В. А. Звегинцев. М. : Прогресс, 1985. С. 369–420.
6. *Бочкарев А.Е.* Семантический словарь. Нижний Новгород : ДЕКОМ, 2003. 197 с.
7. *Докинз Р.* Эгоистичный ген / пер. с англ. М.: АСТ: CORPUS, 2016. 512 с.
8. *Михневич А.Е.* К семиотике смеха (2006) // Міхневіч Арнольд. Выбраныя працы : Мова-Культура-Камунікацыя. Минск : РІВШ, 2013. С. 177–181.
9. *Михневич А.Е.* Синоптическая схема идиомем языка: опыт построения (2003) // Міхневіч Арнольд. Выбраныя працы. Мінск : Права і эканоміка, 2006. С. 147–149.
10. *Караулов Ю.Н.* Активная грамматика и ассоциативно-вербальная сеть. М. : ИРЯ РАН, 1999. 180 с.
11. *Караулов Ю.Н., Филиппович Ю.Н.* Лингвокультурное сознание русской языковой личности. Моделирование состояния и функционирования. М. : Азбуковник, 2008. 336 с.
12. *Міхневіч А., Назаранка Ю.* Выслоўі і афарызмы Якуба Коласа // Полымя. 2001. № 11. С. 230–261.
13. *Федорова Н.Н.* Современные трансформации русских пословиц : автореферат дис. ... кандидата филологических наук : 10.02.01 / Новгород. гос. ун-т им. Ярослава Мудрого. Великий Новгород, 2007. 20 с.
14. *Змазнева О.А., Исаева Н.В.* Феномен Интернет-мема // Русская речь. 2014. № 3. С. 62–67.
15. *Щербин В.К.* Меметика как новая междисциплинарная наука и направление социальной семиотики // Журнал БГУ. Социология. 2019. № 4. С. 40–47.
16. Сборник белорусских пословиц, составленный И.И. Носовичем // Сборник Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. СПб. : Типография Имп. АН, 1874. Т. XII. № 2. 272 с.

АРТАЛАГІЧНАЯ ГРАМАТЫКА ПРАФ. А. Я. МІХНЕВІЧА

С.А. Важнік

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Акадэміка Курчатава, 5, 220045, Мінск, Рэспубліка Беларусь
waznik@yandex.ru

У публікацыі разглядаюцца працы прафесара А.Я. Міхневіча ў галіне арталогіі – навукі аб правілах і нормах ужывання моўных адзінак у маўленні. Адыход ад нормаў літаратурнай мовы падчас індывідуальнага маўлення складае асноўную праблему арталогіі. Таму шмат увагі надаецца памылкам, недакладнасцям, адступленням ад нормаў, што выяўляюцца ў маўленчай практыцы беларусаў. Прасочваецца таксама ідэя выяўлення спецыфікі беларускага сінтаксісу – нацыянальна-маркіраваных сінтаксічных канструкцый, што ўваходзяць у склад нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі беларускай мовы.

Ключавыя словы: арталогія; культура мовы; нацыянальная сінтаксічная ідыяматыка; ідыяматычнасць маўлення; мова – моўца – маўленне; сінтаксічныя памылкі.

1. *“Кожная ў свеце штуковіна мае свайго Бетховена…”** (С.Е. Лец), або Чалавек, Вучоны, Даследчык ад А да Я.

* Праф. А.Я. Міхневіч вельмі любіў фрашкі і афарызмы вядомага польскага сатырыка Станіслава Ежы Леца і нават прысвяціў яго “непрычасаным думкам” асобны артыкул. Такая “штуковіна”, як беларуская лінгвістыка, сапраўды мае свайго Мэтра. І імя гэтага Волата лінгвістычнай думкі – **Арнольд Яфімавіч Міхневіч**.

Мне і маім калегам з кафедры сучаснай беларускай мовы сапраўды пашчасціла працаваць разам з прафесарам А.Я. Міхневічам – Мовaведам ад А да Я ў беларускім мовазнаўстве (глядзіце ініцыялы!), сапраўдным Філолагам і Энцыклапедыстам свайго часу, грунтоўным Тэарэтыкам, выключным Лектарам і вытанчаным Рытарам і, самае галоўнае, з Настаўнікам, Асобай (у навуцы поспехаў дасягаюць толькі асобы!) і Чалавекам з вялікай літары. Камунікаванне з Арнольдам Яфімавічам было сапраўдным святам, а яго з’яўленне на кафедры СБМ – падзеяй для ўсіх супрацоўнікаў кафедры. Гарантавана ты атрымоўваеш і добры настрой (Прафесару было ўласціва выключнае пачуццё гумару), і новыя веды (Прафесар заўсёды цікавіўся навуковай работай маладых калег і, безумоўна, падказваў. Падказваў літаратуру, тэмы новых даследаванняў, ідэі. Ён як сапраўдны гуманіст не баяўся імі дзяліцца). Праца з Арнольдам Яфімавічам – гэта такая пазітыўная “прышчэпка” на ўсё творчае навуковае жыццё. Хаця б ад адчування таго, што ты можаш свабодна размаўляць з жывым класікам, браць прыклад і вучыцца. Дзякуй Прафесару Міхневічу за Навуку!!

У Цвятаевай ёсць кніга пад назвай *“Мой Пушкін”*. Перафразіруючы класіка і раскажу пра *“Майго Міхневіча”*.

Маё знаёмства з Арнольдам Яфімавічам распачалося яшчэ на 2-м курсе філфака БДУ, калі я прымаў удзел у 2-м Сорасаўскім конкурсе і атрымаў фінансаванне ад Фонда Сораса за сваё першае навуковае даследаванне, прысвечанае дзеяслоўнаму прэдыкату. Рэцэнзентам маёй навуковай працы быў якраз праф. Міхневіч. Мне, безумоўна, было цікава, а хто гэта такі? Я пачаў шукаць нейкія звесткі. Тады інтэрнэта не было – таму шукаў па друкаваных крыніцах. У энцыклапедыі *“Беларуская мова”* я знайшоў фотаздымак Арнольда Яфімавіча і ўжо ведаў, як ён выглядае…

Першая сустрэча з Прафесарам адбылася падчас выступлення Арнольда Яфімавіча на філфаку, куды ён быў запрошаны ў якасці госця і расказваў пра свае працы. Чарга дайшла да манаграфіі *“Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы”* [4]. Да свайго гонару, я адзіны з курса змог адказаць на правакацыйнае пытанне Прафесара, датычнае селекцыйнай катэгорыі *адчужальнасці / неадчужальнасці*, якая якраз і апісваецца ў гэтай манаграфіі. І нават задаў пытанне па прысвячэнні манаграфіі прафесару Ц.П. Ломцеву, як потым высветлілася, духоўнаму настаўніку Арнольда Яфімавіча. Так у маім спісе Асоб у лінгвістыцы з’явілася яшчэ адно прозвішча – ЛОМЦЕЎ. Цімафей Пятровіч Ломцеў – яшчэ адна знакавая фігура ў мовазнаўстве не толькі беларускім, але і рускім. Мяркуйце самі: першы дэкан філалагічнага факультэта БДУ, аўтар першай доктарскай дысертацыі па беларускай мове (прынамсі, па гістарычным сінтаксісе), “прадцеча” рускага семантычнага сінтаксісу. Вось, дарэчы, адкуль цікавасць Арнольда Яфімавіча да *семантычнага сінтаксісу* ды *граматыкі* ўвогуле.

Ну, а непасрэдна пазнаёміцца атрымалася, калі Арнольд Яфімавіч стаў прафесарам, а трохі пазней – і загадчыкам кафедры сучаснай беларускай мовы.

Больш блізкае знаёмства атрымалася падчас працы над зборнікам *“Арнольд Міхневіч. Выбраныя працы”* [1], які выдаваўся да 70-годдзя з дня нараджэння Вучонага – у 2006 годзе. У Выбраных працах прадстаўлены найбольш знакавыя артыкулы Арнольда Яфімавіча, многія з якіх выдаваліся ў замежных часопісах. З гэтай нагоды мы з А.А. Радзевічам некалькі разоў прыходзілі да Прафесара дадому (а жыў ён на *Лагойскім тракце, 27*), разам адбіралі публікацыі, абмяркоўвалі канцэпцыю зборніка. Па шчырасці, гэта былі самыя незабыўныя імгненні зносінаў з Арнольдам Яфімавічам. З гэтага перыяду запомніўся адзін жарт: я тады жыў на вуліцы *Шырокая* (зусім недалёка ад Прафесара), на што Арнольд Яфімавіч заўважыў, што я жыву на *Брадвеі*. З таго часу для мяне вуліца *Шырокая* – гэта мінскі *Брадвей*.

Зборнікам Выбраных прац праф. Міхневіча распачалася навуковая Серыя ***“Мовaведы Беларусі”***. Арнольд Яфімавіч блаславіў выданне гэтай серыі. З 2006 года па сённяшні дзень выдадзены 9 зборнікаў прац такіх выбітных Асоб і Даследчыкаў, як: *А.Я. Міхневіч* (2006; 2013), *Н.Б. Мячкоўская* (2008), *С.М. Прохарава* (2009), *В.У. Мартынаў* (2009),

А.І. Яновіч (2011), *Г.А. Цыхун* (2012), *А.Я. Супрун* (2013), *М.І. Канюшкевіч* (2019). Рыхтуюцца да друку зборнікі *Л.І. Бурака* і *І.Я. Лепешава*.

Дарэчы, мала хто ведае, што Арнольд Яфімавіч пісаў *Энцыклапедыю беларускага гумару*. Падчас наведвання кватэры Прафесара мы з А.А. Радзевічам на ўласныя вочы бачылі тэчку з матэрыяламі такой Энцыклапедыі. На жаль, яна так і засталася ў рукапісе. А рукапісы, як вядома, не гараць… Калі яны алічбаваныя. Спадзяюся, што калі-набудзь і яна ўбачыць свет.

2. *“Нават у яго маўчанні былі граматычныя памылкі”* (С.Е. Лец), або Арталагічная граматыка праф. Міхневіча.

Паводле праф. Міхневіча, ***арталогія*** – гэта навука аб правільным маўленні: аб правілах і нормах ужывання моўных адзінак у маўленні [6, с. 17]. Па нашых назіраннях, многія працы А.Я. Міхневіча арталагічныя па сваёй сутнасці. Чысціня штодзённага маўлення беларусаў сведчыць пра стан быцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў сітуацыі “паміж”. Гэтага нельга не заўважаць, гэтаму нельга не супрацьдзейнічаць, што і робіць праф. А.Я. Міхневіч у сваіх арталагічных працах.

Арталагічны складнік прасочваецца ў навуковай творчасці А.Я. Міхневіча яшчэ з выдання дапаможніка *“Белорусский язык для небелорусов”* (3-яе выданне – *“Белорусский язык для говорящих по-русски”*) [2; 3], дзе пяру даследчыка належаць раздзелы *“Сінтаксіс”* і *“Кароткі дыферэнцыяльны руска-беларускі слоўнік”*. У іх асноўная ўвага звяртаецца на выяўленне сінтаксічнай спецыфікі беларускай мовы ў рускамоўным дачыненні. У *“Кароткім дыферэнцыяльным руска-беларускі слоўніку”* [3, с. 249–262] ідэя выяўлення моўнай спецыфікі беларускай мовы рэалізавана ў найбольшай ступені: прыводзяцца сінтаксічныя канструкцыі, што складаюць “залаты фонд” нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі беларускай мовы, паказаны адрозненні ў спалучальнасці беларускіх і рускіх дзеясловаў і асобных назоўнікаў. У трэцім выданні дапаможніка разглядаецца і такая арталагічная праблема, як *ідыяматычнасць маўлення* [3, с. 325–330]. Ва ўсіх трох выданнях дапаможніка прадстаўлены раздзел *“Ідыяматычныя выражэнні”*.

Другая праца, якую варта згадаць у арталагічным аспекце, – *“Руска-беларускі размоўнік”*. Тут адрознівальныя рысы беларускай мовы, што выяўляюцца ў жывым беларускім маўленні, апісваюцца ў *“Супастаўляльных лексіка-граматычных нататках”* [5, с. 202–262]. Так, напрыклад, у размоўніку прадстаўлены наступныя артыкулы: рус. *нет* – бел. *няма, не; обеими руками – аберуч; благодарить товарища – дзякаваць таварышу; у меня есть – я маю; мне снилось – я сніў; два новых стола – два новыя сталы; друг друга – адзін аднаго; от – ад; о, про – аб, пра; на скорую руку – так-сяк накасяк* і інш.

Самая важная арталагічная праца А.Я. Міхневіча, дзе вучоны дае тэарэтычнае абгрунтаванне арталогіі, – першы ў нашай краіне арталагічны даведнік *“Слоўка за слоўкам”* А.Я. Міхневіча, Л.П. Кунцэвіч, Ю.В. Назаранкі [6], жанр якога аўтары вызначылі як “алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх”.

Паводле А.Я. Міхневіча, арталагічныя нататкі, сабраныя ў кнізе, “служаць адной мэце: дапамагчы асэнсоўваць факты *мовы*, падкрэсліць ролю *моўцы*, навучыць свядома ставіцца да ўласнага *маўлення*” [2006: 3]. АЯ вылучыў курсівам словы **МОВА – МОЎЦА – МАЎЛЕННЕ**, бо яны адлюстроўваюць тры бакі “слоўнай камунікацыі” і “ўтвараюць тое, што прынята называць *культурай мовы*” [6, с. 3].

У прадмове да арталагічнага даведніка Прафесар слушна адзначае, што варта тэрміналагічна размяжоўваць паняцці *МОВА* і *МАЎЛЕННЕ*. На гэтым, дарэчы, пабудаваны ўвесь сінтаксіс прафесара Міхневіча. Калі ***мова*** – гэта сістэма, то ***маўленне*** – гэта рэалізацыя моўнай сістэмы ў працэсе камунікацыі, або “неабсяжная стыхія бытавання нацыянальнай мовы ў вуснах людзей”.

Пры гэтым такія навукі, як *арталогія* і *культура мовы (маўлення)* сутыкаюцца з шэрагам праблем, што звязаны “з якасцю індывідуальнага валодання сістэмай нацыянальнай мовы, з уменнем асобы выбіраць з гэтай сістэмы тыя сродкі – словы, звароты, сказы, націскі, інтанацыю, стыль, – якія зробяць уласную мову (а дакладней: уласнае маўленне!) з’явай высокай культуры”.

Інакш кажучы, “чым горш ведае моўца мову, тым большая верагоднасць памылкі або простай недакладнасці ў перадачы сродкамі мовы ўласнай думкі. Калі выбар зроблены правільна, то гэта сведчыць пра тое, што моўца валодае адпаведнымі нормамі літаратурнай мовы” [6, с. 3–4]. Адыход жа ад нормаў нацыянальнай мовы падчас “індывідуальнага маўлення” якраз і складае асноўную праблему арталогіі. Таму аўтараў дапаможніка цікавяць **памылкі, недакладнасці, адступленні ад нормаў**, што назіраюцца ў беларускай маўленчай практыцы. Робяцца памылкі, значыць, ёсць *арталагічная праблема*. Па сутнасці, *“Слоўка за слоўкам”* – гэта **слоўнік памылак, слоўнік адступленняў ад літаратурных нормаў.** Прычым аўтары не толькі аналізуюць адпаведныя “памылковыя” моўныя з’явы, але і даюць рэкамендацыі па іх прадухіленні.

Разгледзім **тыпалогію сінтаксічных памылак** у [6]:

1) шматлікія кантамінацыі, што выклікаюць парушэнне *сінтаксічнай* або *лексічнай спалучальнасці:*

1.1) на базе блізкасці значэнняў дзеясловаў-паронімаў: ***абагуліць*** **факты, *меркаванні, *сказанае (гаспадаркі, маёмасць, рэчы)* – ***абагульніць*** *вывады, даныя, назіранні;* ***асвоіць*** **кодэкс афіцэрскага гонару (станок, замежную мову, грошы, новае радовішча, друкарскую справу, камп’ютэр)* – ***засвоіць*** *жыццёвы ўрок, правіла паводзін, звычку* і інш.;

1.2) на базе блізкасці значэнняў і лексічнай або семантычнай спалучальнасці: ***адыгрываць ролю*** *(*адыграць вялікае значэнне) –* ***мець значэнне; адчыніць*** *(*рот, *вочы – акно, вароты) –* ***адкрыць*** *(рот, кран, ваду, пасяджэнне, сход, талент, сакрэт, лік, рахунак, душу, сэрца);* ***выкладаць я.-н. прадмет*** *(*курс лекцый – матэматыку, фізіку, мову) –* ***чытаць / весці*** *(курс лекцый);* ***зраўняць лік*** *(*становішча) –* ***выраўняць становішча; выклікаць інтарэс*** *(*уражанне) –* ***пакідаць уражанне; даць параду*** *(*заўвагу) –* ***зрабіць заўвагу*** і інш.;

1.3) на базе дзвюх блізказначных, сінанімічных канструкцый і сінтаксічнай спалучальнасці: ***абмежавацца*** *чым (*на гэтым) –* ***спыніцца*** *на чым;* ***адзначыць*** *што (*аб гэтым) –* ***сказаць*** *пра што / аб чым;* ***адрознівацца*** *ад (*сярод нас)–* ***вылучацца*** *сярод (сярод аднакурснікаў);* ***адплаціць*** *за што (*на дабро – дабром за дабро) –* ***адказаць*** *на што (на дабро);* ***аплаціць*** *што (*за праезд – праезд) –* ***заплаціць*** *за што (за праезд);* ***атаясамленне*** *чаго з чым (*аднаго рада з'яў другому) – прыпадабненне чаго да чаго / чаму;* ***ахарактарызаваць*** *што (*аб становішчы ў краіне) –* ***расказаць*** *аб чым;* ***гарантаваць*** *што (*за стан здароўя) –* ***адказваць, несці адказнасць*** *за што;* ***звярнуць увагу*** *на што (*узроўню адукацыі) –* ***удзяліць увагу*** *чаму;* ***зрабіць уражанне*** *на каго / што (*у каго) –* ***пакінуць уражанне*** *у каго;* ***прысвяціць*** *чаму (*для экскурсіі – экскурсіі) –* ***адвесці*** *для чаго (для экскурсіі)* і інш.;

2) калькі: *абдрук, агалоска, адкіды, бягучы год, вышэйшая школа;*

3) сінтаксічныя русізмы: **выкладчык адбыўся (!выйсці, !стаць) – !сход адбыўся; *унесці чвэрць насельніцтва – !адабраць…; *як справы? – !як жыццё?, !як маешся?, !што чуваць?; *падзея* ***з'яўляецца*** *чым (Гэтая падзея* ***з'яўляецца*** *кропкай адліку ў беларускай гісторыі) – !Гэтая падзея* ***ёсць****…*;

4) сінтаксічныя паланізмы: **мне на гэтым не залежыць – !для мяне гэта не мае значэння* і інш.*;*

5) таўталогія: *планы на будучае, перадавы авангард, малады юнак, ківаць галавой, задавацца пытаннем* і інш.;

6) алагізмы: *цэны даражэюць, піць тост, узняць тост* і інш.

Асобнае месца ў слоўніку-даведніку адведзена **ўласна беларускім канструкцыям**, што складаюць спецыфіку беларускай мовы пры супастаўленні з іншымі славянскімі мовамі, у тым ліку і блізкароднаснымі (параўн.: *ані не здзівіў, як не бегма, далібог, крокаў з дзесяць, праўду кажучы, больш-менш, першы раз, як след, работы па вушы* і інш.).

Багата ў слоўніку і **шматлікіх моўных варыянтаў**. Варыянтнасць, піша А.Я. Міхневіч [6, с. 28], – гэта ўласцівасць любой натуральнай мовы. Па-беларуску можна сказаць *некалькі гадоў / год; з-за / праз; пра / аб; да / к; дыску'рс – ды'скурс; зала – зал; занятак – заняткі; ігрок – гулец; абсядуць дзеда гуртам / гуртом; ісці па лесе / лесам; бывайце / да пабачэння* і г.д. Па сваёй прыдатнасці да ўжывання варыянты вельмі нераўнавартасныя,

неаднародныя, і таму для іх аналізу і ацэнкі патрабуюцца не толькі моўнае чуццё і густ, але і мовазнаўчая падрыхтаванасць і дасведчанасць.

Праф. Міхневіч сцвярджае, што “арталагічны даведнік далёкі ад пажаданай паўнаты. Падобная праца будзе працягвацца датуль, пакуль людзі слухаюць і чытаюць. Мова багацейшая за маўленне, а быццё чалавека багацейшае за мову. У гэтым – крыніца маўленчых памылак, але – перш за ўсё – крыніца надзеі, што моўца ніколі не страціць цікавасці да мовы і маўлення, без якіх няма зносін – падмурку чалавечага жыцця” [6, с. 5]. Вельмі спадзяюся, што арталагічная праца Арнольда Яфімавіча будзе працягнута. Перш за ўсё яго сааўтарамі. Заклікаю студэнтаў далучыцца да гэтай справы – і на падставе *“Слоўка”* пачаць ствараць пэўны электронны рэсурс ў Сеціве (= у якіх-небудзь сацыяльных сетках).

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Міхневіч А*. Выбраныя працы / рэд. С.А. Важнік. Мінск : Права і эканоміка, 2006. 230 с.

2. *Кривицкий А.А.* Белорусский язык для небелорусов / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. Минск : Вышэйш. школа, 1973 (1978). 272 с.

3. *Кривицкий А.А.* Белорусский язык для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный / 3-е изд., перераб. Минск : Вышэйш. шк., 1990. 367 с.

4. *Міхневіч А.Я.* Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы / рэд. В.У. Мартынаў. Мінск : Навука и тэхника, 1976. 263 с.

5. *Михневич А.Е.* Русско-белорусский разговорник. Минск : Вышэйш. школа, 1991. 334 с.

6. Слоўка за слоўкам: алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх / А.Я. Міхневіч, Л.П. Кунцэвіч, Ю.В. Назаранка. Мінск : БДУ, 2006. 165 с.

ДА ІНВЕНТАРЫЗАЦЫІ ЗЛУЧНІКАЎ І ІНШЫХ СРОДКАЎ СУВЯЗІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

М. І. Канюшкевіч

Незалежны даследчык, Гродна, Рэспубліка Беларусь,
marikon9@mail.ru

Паказваецца аўтарскі вопыт інвентарызацыі злучнікаў і іх аналагаў, якія у той ці іншай ступені выконваюць у беларускай мове злучальныя і канструктыўныя функцыі злучніка. Разглядаюцца метады тэарэтычнага мадэлявання для мэтанакіраванага атрымання названых рэляцыйных адзінак: а) трансфармацыя іменнай сінтаксемы ў прэдыкатыўную і, адпаведна, утварэнне злучніка ад прыназоўніка, б) камбінаванне граматычных канструкцый “прыназоўнік + суадносны займеннік + злучнік / злучальнае слова”, якія могуць выконваць функцыю цэласнага злучальнага сродка.

Ключавыя словы: злучнік; прыназоўнік; іменная сінтаксема; прэдыкатыўная сінтаксема; метад мадэлявання.

> Отдельное лексическое значение не имеет “прямого доступа” в грамматику, но может получить грамматический статус, войдя в лексический класс изофункциональных слов, имеющий формально-структурный показатель (А. Е. Михневич).
>
> Включение лексического значения в число средств, формирующих синтаксическую структуру, переводит его из плана лексической абстракции в план грамматической и, хотя не прекращает существование слов как лексических единиц, снимает их номинативную значимость, заменяя ее значимостью коммуникативной (А. Е. Михневич).

Перадумовы даследавання. Рэгламентаваны аб’ём артыкула вымагае нас падаць некаторыя палажэнні ў выглядзе пастулатаў.

1. Мы гаворым тэкстамі. І толькі ў тэксце, ў камунікацыі моўная адзінка прадстае перад даследчыкам як рэальны аб’ект. Асабліва гэта датычыць злучнікаў і тых сінтаксічных сродкаў, якія могуць сумяшчаць у тэксце функцыю злучніка з іншымі функцыямі.

2. Граматычны статус злучніка дваісты. Па традыцыі яго адносяць да марфалогіі, хоць катэгарыяльны крытэрый яго атрыбуцыі ляжыць у сінтаксісе: злучнік, звязваючы адзінкі будовы (словы ці сказы) аднаго узроўню, утварае адзінку пабудовы больш высокага ўзроўню. Дакладней кажучы, злучнік – адзінка морфасінтаксісу.

3. Мадэль складанага сказа ці нават тэксту не абмяжоўваецца толькі спецыялізаванымі паказчыкамі сувязі, “у ёй могуць, а парой і павінны адлюстроўвацца **пазіцыі знамянальных кампанентаў**, паміж якімі ўстанаўліваецца гэтая сувязь” [Черемисина, Колосова 1987, с. 78]; (выдзяленне наша – М. К.).

4. Колькасць сінтаксічных сродкаў са злучальнай функцыяй ў беларускай і рускай (магчыма, і ў іншых славянскіх) мовах шмат большая, чым гэта зафіксавана ў існуючых лексікаграфічных і граматычных крыніцах. Самую вялікую колькасць злучнікаў і іх аналагаў дае “Руская граматыка” (1980): па нашых падліках, 609 адзінак [Русская грамматика 1980, т. 2, с. 682–684]. Сярод іх такія незвычайныя для службовых адзінак фразеасхемы, як *нельзя сказать… чтобы*; *чтобы не сказать*; *скорее наоборот*; *слишком… чтобы* і інш. Лінгвісты адзначаюць, што “публікацыя гэтага спіса – важны крок уперад у вывучэнні праблемы скрэп” [Черемисина, Колосова 1987, с. 124].

6. У акадэмічных апісаннях беларускага сінтаксісу такіх прадметных паказальнікаў няма, але раздзел “Злучнік” у першым томе “Граматыкі беларускай мовы” (аўтар раздзела П. М. Гапановіч) налічвае 114 злучнікаў і 13 спалучэнняў у ролі далучальных злучнікаў [Граматыка… 1962, с. 471–506]. Падлікі дакладныя, паколькі пералік амаль кожнага разраду злучнікаў закрываўся завяршальным злучнікам *і* перад апошнім словам спісу.

У другім томе “Граматыкі беларускай мовы” у раздзеле “Складаны сказ” з падраздзеламі, прысвечанымі складаназлучаным (аўтар раздзела Л. І. Бурак) і складаназалежным (аўтар П. П. Шуба) сказам, дакладна падлічыць злучальныя сродкі немагчыма, бо пры характарыстыцы адносін у складаных сказах шмат якія пералічэнні мелі фіналь “і г. д.”, асабліва калі размова ішла аб спалучэнні класічных злучнікаў з часціцамі ці са знамянальнымі словамі. Можна толькі канстатаваць, што сінтаксічнае поле сістэмы беларускіх злучнікаў у другім томе нашмат больш пашыранае, чым марфалагічнае [Граматыка…, с. 486–677].

Аналагічныя раздзелы сінтаксіса складаназлучаных (аўтар А. Я. Міхневіч) і складаназалежных (аўтар К. У. Скурат) сказаў “Беларускай граматыкі” не павялічылі спісу злучальных сродкаў, хоць і адрозніваюцца ўвагай да іх ўнутранай катэгарызацыі [Беларуская граматыка 1986, с. 272–304].

7. Назіранні М. В. Ляпон над функцыянаваннем у тэксце рэлятываў прывялі яе да наступных высноў: неабходны “перагляд пытання аб змесце катэгорыі «злучнік», г. зн. **прынцыповы выхад** (не толькі ў даследаваннях па тэксце, але і ў нарматыўна-апісальных граматыках) **за межы «чыстага злучніка»** – за межы злучальнікаў, прынятых граматыстамі ў клас злучнікаў у якасці ідэальных прадстаўнікоў гэтага класа; пытанне аб рэальным фондзе злучальнікаў, які павінен фіксаваць слоўнік і граматыка, можа быць вырашана **сілай аўтарытэта самой прыроднай мовы**” [Ляпон 1986, с. 195–196] (выдзяленне ва ўсіх трох месцах наша. – М. К.).

Пастаноўка праблемы. Са сказанага вынікае, што наспела неабходнасць інвентарызацыі ўсіх злучальнікаў – не толькі злучнікаў і іх аналагаў, але і іншых, у тым ліку і знамянальных, слоў, якія у той ці іншай ступені выконваюць у беларускай мове злучальныя і канструктыўныя функцыі злучніка.

Мы ставім перад сабой мэту інвентарызацыі беларускіх злучальных сродкаў без вызначэння іх дакладнага лінгвістычнага статусу. Для нас больш важнай задачай з’яўляецца фіксацыя гэтых сродкаў у беларускай мове як яе рэлятыўнага патэнцыялу, асабліва ў іх аб’ектыўным рэальным ужыванні – як нацыянальнай стыхіі маўлення ў розных крыніцах, у розных сацыяльных і прафесійных колах, на розных каналах перадачы інфармацыі.

Метадалогія і методыка даследавання. Шляхоў інвентарызацыі злучальных сродкаў некалькі. Адзін з іх эмпірычны – пошук кантэкстаў і аналіз і сістэматызацыя знойдзеных у іх адзінак. Карпусы тэкстаў значна паскорылі працу даследчыкаў, але самога шляху не змянілі.

Другі шлях тэарэтычны, які прадугледжвае атрыманне злучальнага сродка метадам мэтанакіраванага мадэлявання і наступнай верыфікацыі ўжывання атрыманай адзінкі ў маўленчай практыцы. Стварэнне мадэляў можна ажыццявіць двума спосабамі. Першы спосаб – трансфармацыя іменнай сінтаксемы ў прэдыкатыўную і, адпаведна, утварэнне злучніка ад

прыназоўніка. Напрыклад: *вырашаць пытанне* ***ў святле*** *апошніх падзей*; *вырашаць пытанне* ***ў святле таго, як*** *дыктуюць апошнія падзеі.* Рэпертуар прыназоўнікава-іменных сінтаксем [Канюшкевіч 2008–2010] дазволіў атрымаць значна большую колькасць злучальных сродкаў, чым тое поле, якое займае класічны злучнік у апісальных граматыках. Зафіксаваны, напрыклад, злучнік *нягледзячы на тое, што*, але ў гэтай жа функцыі ў граматыках адсутнічаюць прыназоўнікава-злучальныя спалучэнні *з апорай на тое, што*; *нароўні з тым, што*; *з разліку на тое, што*; *з тым разлікам, што*; *за кошт таго, што*; *на прадмет таго, што* і шмат іншых. Аналагічнае дачыненне да ўтварэння такіх аналітычных злучальных сродкаў маюць і злучальныя словы: параўн.: *нароўні з тым, што* (дзе *што* – злучнік) і *нароўні з тым, што* (дзе *то* – адносны займеннік).

Другі спосаб мадэлявання – камбінаванне спалучэнняў “прыназоўнік + суадносны займеннік + злучнік / злучальнае слова”, якія могуць выконваць функцыю асобнага злучальнага сродка.

Аналіз мадэлявання. Колькі асобных моўных адзінак уяўляе сабой фіналь *-а* ў сказе *Паўлінк**а** моцн**а** кахал**а** Максім**а***? Напрошваецца па меншай меры чатыры варыянты адказу.

1) Дзве адзінкі: а) канчатак *-а* ў назоўніках і б) суфікс *-а* ў прыслоўі (паводле ролі дадзеных марфем у слове). Далей адказы тычацца толькі флексій.

2) Дзве адзінкі: а) канчатак *-а* з граматычным значэннем жаночага роду (*Паўлінк**а**, кахал**а***), б) канчатак *-а* з граматычным значэннем мужчынскага роду (*Максім**а***) (паводле катэгорыі роду).

3) Тры адзінкі: а) канчатак *-а* з граматычным значэннем назоўніка жаночага роду ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку (*Паўлінк**а***); б) канчатак *-а* з граматычным значэннем жаночага роду дзеяслова прошлага часу адзіночнага ліку (*кахал**а***); в) канчатак *-а* назоўніка мужчынскага роду ў форме роднага склону адзіночнага ліку (*Максім**а***) – з улікам катэгарыяльнага значэння часціны мовы, катэгорый роду, склону і ліку.

4) Дзесяць адзінак (калі раскладаць кожнае граматычнае значэнне гэтых флексій паасобку). Мяркуем, што, апошні варыянт самы дакладны, паколькі ўсе нашы *-а* – аманімічныя грамемы, а значыць розныя моўныя адзінкі.

Тое ж можам сказаць і аб склонава-лікавай парадыгме назоўніка: усе яго 12 флексій – розныя грамемы, хоць некаторыя з іх могуць супадаць па форме. Казаць тут аб полісеміі няма падстаў, паколькі на вызначэнне склонавай семантыкі назоўніка ўплываюць, акрамя формаў слова, яшчэ тры фактары – лексічнае значэнне самога слова, кіруючае склонам слова (звычайна дзеяслова ці яго дэрывата) і прыназоўнік. І гэтыя фактары спрацоўваюць галоўным чынам ўжо ў сінтагме – ў словазлучэнні ці ў сказе, дзе словаформа пераўтвараецца ў сінтаксему – мінімальную сінтаксічную

адзінку, характар якой абумоўліваецца і крысталізуецца толькі ў выказванні.

Сінтаксема, як вядома, мае двухкампанентную структуру: яна складаецца з фарманта і намінатыўнага (або лексічнага) кампанента. Фармантам іменнай сінтаксемы можа выступаць толькі флексія (*Паўлінк-**а***) ці прыназоўнік + флексія (***з** Паўлінк-**ай***).

Так, у сказах *Паўлінка выйшла замуж **за Максіма*** і *Паўлінка ўзяла шлюб **з Максімам*** выдзеленыя сінтаксемы маюць аднолькавыя намінатыўныя кампаненты, але розныя фарманты: а) *за* + *-а*; б) *з* + *-ам*. Такія фарманты сінтаксем вельмі падобныя на “конфіксы” ў вытворным слове (гэта заўважылі раней Е. Курыловіч, а потым удакладніла М. У. Усеваладава [Всеволодова 2014]). Такія “конфіксы” яшчэ не атрымалі сваёй інвентарызацыі ні ў рускай, ні ў беларускай мовах. А гэта таксама службовыя адзінкі мовы на прамежкавым ўзроўні паміж марфалогіяй і сінтаксісам. І такіх адзінак шмат, бо ёсць яшчэ сінтаксемы і *без Максіма, да Максіма, перад Максімам, апрача Максіма, нароўні з Максімам, паралельна з Максімам, са згоды Максіма…*

Намінатыўны кампанент сінтаксемы – гэта дэнатат сінтаксемы, ўвесь той яе лексічны патэнцыял, які намінуе рэчаіснасць, – падзеі, прадметы, з’явы. Намінацыя рэалізуецца рознымі сродкамі: а) іменнай сінтаксемай, дзе аб’ём намінатыўнага кампанента зводзіцца да памеру асновы слова (*Паўлінка выйшла замуж за **Максім**а*), б) словазлучэннем, дзе аб’ём намінатыўнага кампанента мае памер асноў двух слоў (*Паўлінка выйшла замуж за **свайго суседа***), в) лексічнага напаўнення прэдыкатыўнай адзінкі – даданага сказа (*Паўлінка выйшла замуж за таго, каго **завуць Максімам** / хто **завецца Максімам** / чыё **імя Максім***).

«Складаны сказ – гэта адзін з прыватных выпадкаў **тэхнічнага рашэння** моўнай рэалізацыі поліпрапазіцыйнай семантычнай структуры» [Шмелева 2010, с. 122] (выдзелена аўтарам. – М.К.), таму калі выбар моўцы спыняецца на рэалізацыі намінатыўнага кампанента сінтаксемы ў форме даданай часткі складанага сказа, то адпаведна мяняецца і структура фарманта гэтай прэдыкатыўнай сінтаксемы: да прыназоўніка *за* далучаецца суадносны займеннік *той* у такой склонавай форме, якая адпавядае кіраванню прыназоўніка: *за Максім**а*** – *за **таго***. Інакш кажучы, *таго* – гэта “флексія” даданай часткі, якая разам з прыназоўнікам *за* ўтварае такі самы сінтаксемны “конфікс”, што і “конфікс” *за* + *-а* у наміналізаванай сінтаксеме ***за** Максім**а***.

Паколькі намінатыўны кампанент прадстаўлены прэдыкатыўнай адзінкай, то граматычную сувязь паміж рознаўзроўневымі адзінкамі (фармантам і намінатыўным кампанентам) ў такой сінтаксеме ажыццяўляе адносны займеннік *хто*, форма якога, хоць і абумоўлена даданай часткай, але ён, па-першае, звязаны з суадносным займеннікам *той* у родзе і ліку і,

па-другое, выступае як своеасаблівы “інтэрфікс” цэласнага злучальнага спалучэння, які згладжвае шво паміж рознаўзроўневымі элементамі сказа.

У нашых прыкладах вышэй мы атрымалі такіх злучальных спалучэнняў тры: *за таго, каго*; *за таго, хто*; *за таго, чыё.* З прыведзеных вышэй прыназоўнікава-склонавых сінтаксем ў прэдыкатыўныя атрымаем фарманты апошніх: *без таго, хто*; *да таго, хто*; *перад тым, хто*; *апрача таго, хто*; *нароўні з тым, хто*; *паралельна з тым, хто*; *са згоды таго, хто.*

Вынікі і перспектывы даследавання. Такім чынам, ў мове ёсць яшчэ адзін прамежкавы (морфасінтаксічны) ўзровень службовых адзінак – прыназоўнікава-злучальныя (ці прыназоўнікава-злучнікавыя?) спалучэнні, якія выступаюць фармантамі прэдыкатыўных сінтаксем і ў складаным сказе выконваюць злучальную функцыю як цэласныя адзінкі. Іх інвентарызацыя і апісанне ўжо пачаліся [Канюшкевіч 2019], але гэтая праца не пад сілу аднаму чалавеку.

Нашы эксперыменты па выяўленні злучальнага патэнцыялу абодвума спосабамі мадэлявання паказалі, што ён, хоць і агромністы, але вылічальны, а значыць, атрыманыя спалучэнні не маўленчыя, а моўныя адзінкі. Верыфікацыя мадэляў кантэкстамі з корпусных і Інтэрнэт-рэсурсаў паказала, што іх рэалізацыя ў маўленчай практыцы складае толькі пятую частку асваення гэтых мадэляў носьбітамі мовы. Прычыны такога маўленчага абмежавання яшчэ трэба высвятляць.

Бібліяграфічныя спасылкі

Беларуская граматыка: у 2-х ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. Мінск : Навука і тэхніка. Ч. 1. 1985. 431 с.; Ч. 2. 327 с.

Всеволодова М. В. Русские предлоги и средства предложного типа : материалы к функционально-грамматическому описанию реального употребления. Кн. 1 : Введение в объективную грамматику и лексикографию русских предложных единиц / М. В. Всеволодова, О. В. Кукушкина, А. А. Поликарпов; под общ. ред. М. В. Всеволодовой. М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2014. 304 с.

Граматыка беларускай мовы : у 2 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа; рэд. К. К. Атраховіч (Крапіва). Т. 1. Марфалогія. Мінск : Выд-ва АН БССР, 1962. 539 с.; Т. 2. Сінтаксіс. Мінск : Навука і тэхніка, 1966. 756 с.

Канюшкевіч М. І. Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання. Матэрыялы да слоўніка. У 3 ч. Гродна : ГрДУ, 2008 – 2010; Ч.1. Дыяпазон А–Л. 2008. 492 с.; Ч. 2. Дыяпазон М – П. 2010. 619 с.; Ч. 3. Дыяпазон Р – Я. 2010. 535 с.

Канюшкевіч М. І. Беларускія злучнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання. Матэрыялы да слоўніка. У 3 ч. Ч. 1. Дыяпазон А – З. Гродна : ГрДУ, 2019. 302 с.

Ляпон М. В. Смысловая структура предложения и текст : К типологии внутритекстовых категорий. М. : Наука, 1986. 198 с.

Русская грамматика. В 2 т. / АН СССР; Ин-т русск. яз. М. : Наука, 1980. Т. 1. 783 с.; Т. 2. 710 с.

Черемисина М. И., Т. А. Колосова. Очерки по теории сложного предложения. Новосибирск : Наука, 1987. 197 с.

Шмелева Т. В. Техника сложного предложения // Лингвистические идеи В. А. Белошапковой и их воплощение в современной русистике. Тюмень : Мандр и К[а], 2010. С. 116–133.

РОЛЯ ГІПОТЭЗЫ Ў НАВУКОВЫМ ДАСЛЕДАВАННІ (ПАМЯЦІ А.Я. МІХНЕВІЧА)

Н.Ю. Паўлоўская

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт,
вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
info@mslu.by

Арнольд Яфімавіч Міхневіч з’яўляецца не толькі цудоўным чалавекам, выдатным педагогам і аратарам. Таленавіты мовазнаўца, даследчык з бязмежным лінгвістычным кругаглядам, эрудыцыяй, Арнольд Яфімавіч застанецца ў памяці яго вучняў аўтарытэтным вучоным, тонкім псіхолагам, які заахвочваў на пошукі новых ідэй, ухваляў самастойнасць, ініцыятыўнасць, незалежнасць навуковых поглядаў. На прыкладзе толькі аднаго праекта – граматычнай тэорыі мадальнасці – добра відаць, што Арнольд Яфімавіч быў унікальным даследчыкам, генератарам новых ідэй, рэалізацыя якіх, па сутнасці, стварыла беларускую нацыянальную лінгвістычную школу высокага ўзроўню і патэнцыялу.

Ключавыя словы: Арнольд Яфімавіч Міхневіч; навуковае даследаванне; праблема і гіпотэза; гіпатэтычныя веды; канцэпцыя мадальнасці; канцэптуалізацыя і катэгарызацыя; узроўні значэння ў адзінках мадальнасці; кагнітыўна-дыскурсіўная канцэпцыя мадальнасці; мадальная суперструктура; камунікатыўная стратэгія; мадальная тактыка; характарыстыка дыскурсу.

Навуковае даследаванне ў якасці найбольш развітай формы тэарэтычных ведаў на першым этапе вызначаецца двума асноўнымі структурна-змястоўнымі кампанентамі – праблемай і гіпотэзай. Калі праблема – гэта асэнсаванне супярэчнасцей паміж фактамі і старымі спосабамі іх тлумачэння, гіпотэза – форма нявызначаных ведаў, якая змяшчае думку, здагадку, што мае патрэбнасць у доказе. Гіпатэтычныя веды носяць імавернасный характар і патрабуюць абгрунтавання, праверкі. У ходзе даследавання адны з іх становяцца тэорыяй, іншыя – відазмяняюцца, удакладняюцца ці адкідаюцца і пераходзяць у вобласць зманаў. На ўзроўні дысертацыйных прац гіпотэзы побач з тэмамі часцей за ўсё прапаноўваюцца навуковым кіраўніком ці кансультантам. Для паспяховай навуковай кар’еры матываваныя маладыя спецыялісты шукаюць аўтарытэтных, маштабных, багатых навуковымі ідэямі настаўнікаў і арганізатараў, старшых сяброў, якія могуць прапанаваць грунтоўную, сучасную, перспектыўную тэму даследавання.

Мне вельмі пашчасціла: на сваім навуковым і жыццёвым шляху я сустрэла Арнольда Яфімавіча Міхневіча – геніяльнага мовазнаўца з

бязмежным лінгвістычным кругаглядам і эрудыцыяй, цудоўнага чалавека, выдатнага педагога і аратара. У кожным сваім вучні гэты вялікі вучоны адшукваў індывідуальныя крэатыўныя здольнасці для арыгінальнага вырашэння даследчыцкіх задач, накіроўваў працу ў патрэбнае рэчышча, робячы прапановы і заўвагі не дакучліва, далікатна, але настойліва і абгрунтавана. За гады супрацоўніцтва Арнольд Яфімавіч ніколі не ціснуў сваім аўтарытэтам на сваіх падапечных, наадварот заахвочваў і ўхваляў самастойнасць, ініцыятыяўнасць, незалежнасць навуковых поглядаў, заснаваных у першую чаргу на трывалым навуковым фундаменце даследаванняў папярэднікаў.

Разважанні, меркаванні, ідэі А.Я. Михневіча, выказаныя ў манаграфіях, шматлікіх артыкулах, падручніках, дапаможніках, дакладах на канферэнцыях, у прыватных размовах, з'явіліся пунктам адліку многіх даследаванняў яго вучняў і паслядоўнікаў.

Так, асновай граматычнай тэорыі мадальнасці, распрацаванай намі на фактычным матэрыяле беларускай мовы, паслужыла думка Арнольда Яфімавіча аб мадальных значэннях двух тыпаў, якія грунтуюцца на ідэях верагоднасці і імператыўнасці. З гэтай гіпотэзы была сфарміравана канцэпцыя мадальнасці, якая пашыраецца, дапаўняецца новымі фактамі ў сувязі са станаўленнем кагнітыўна-дыскурсіўнай парадыгмы навуковых ведаў.

Мадальнасць – адна з цэнтральных ацэначных катэгорый мыслення и мовы, якая суадносіць выказванне і рэчаіснасць з пункту погляду моўцы ў адпаведнасці з паўнатой ведаў пра аб'ект, ступенню задаволенасці яго патрэб, жаданняў, імкненняў, інтарэсаў, мэтаў.

Паняцці верагоднасці і імператыўнасці мы звязалі з працэсамі катэгарызацыі і канцэптуалізацыі мадальных з'яў. Моўныя катэгорыі, выступаючы асновай ведаў чалавека пра свет, маюць кагнітыўную аснову ў тым сэнсе, што іх утварэнне – катэгарызацыя – адносіць аб'ект да пэўнага класа і праяўляе найбольш істотныя яго прыметы. Канцэптуалізацыя – утварэнне канцэптаў – спараджаючы новыя сэнсы, таксама разглядаецца як працэс структурацыі ведаў. Аднак, з'яўляючыся класіфікацыйнай дзейнасцю, катэгарызацыя і канцэптуалізацыя адрозніваюцца паводле сваёй мэты: калі першая вылучае «мінімальныя адзінкі чалавечага вопыту ў іх ідэальнай зместавай падачы», другая «аб'ядноўвае моўныя адзінкі, якія маюць падабенства ці характарызуюцца як тоесныя, у буйныя разрады» [3, с. 93].

Мадальнасць, безумоўна, належыць да ўніверсальных, базавых кагнітыўна-дыскурсіўных феноменаў, уласцівых розным мовам. Само яе існаванне з'яўляецца фактам аб'ектыўным. Агульны змест мадальнасці залежыць не толькі ад канкрэтнай мовы, а вызначаецца кагнітыўнай і прагматычнай дзейнасцю чалавека. Гэта дае падставы адрозніваць

семантычны, канцэптуальны, камунікатыўна-прагматычны ўзроўні значэння ў адзінках мадальнасці.

Сучасны погляд на мадальнасць – яе разгляд у рэчышчы кагнітыўна-дыскурсіўнай парадыгмы навуковых ведаў, якая характырызуецца міждысцыпліннасцю, узрастаннем ролі суб'екта і яго цэннасных адносін да прадмета даследавання, мульціпарадыгмальнасцю – прызнаннем «адначасовага руху ў розных накірунках да розных ісцін, ніводная з якіх не лепш і не горш за іншую» [2, с. 16].

Прынцып інтэгратыўнасці як сінтэз ведаў, набытых у розных вобласцях, павінен улічвацца пры кадыфікацыі мадальнасці, паколькі гэты біяпсіхалагічны, семіятычны, кагнітыўны, сацыяльны феномен абумоўлівае наяўнасць ў яе асноўных рэпрэзентантах – словах, словазлучэннях, выказваннях, дыскурсах – сінергетычных ведаў, што выходзяць за межы моўнага кантынууму.

Кагнітыўна-дыскурсіўная канцэпцыя мадальнасці рэалізуецца параметрамі і правіламі, што ахопліваюць разнавіднасці мадальных значэнняў, выкарыстаных у розных тыпах дыскурсу. Усе адлюстраваныя падзеі адрасат успрымае мадальна асэнсаванымі, а сістэма гэтых параметраў і правілаў фарміруецца паняццямі макраструктуры, суперструктуры, макрапрапазіцыі, прапанаванымі Т.А. ван Дэйкам [1, с. 41–67]. Макраструктурай мадальнасці варта лічыць маўленча-разумовую здольнасць суб'екта ўвасабляць рэчаіснасць у прапазіцыю моўных адзінак.

Мадальнымі суперструктурамі з'яўляюцца кагнітыўныя мадэлі, схемы, што ахопліваюць усю сістэму моўных сродкаў і якія даюць магчымасць сканцэнтраваць увагу толькі на неабходных для вывучэння ўласцівасцях аб'екта. Дыскурс і факты ў ім прафілююцца ў адносінах да індывідуальных нормаў і цэннасцей камунікантаў. Згодна з гэтым мадальнасць ідэнтыфікуе аднесенасць адзінак дыскурсу да таго ці іншага магчымага свету, што маецца ў распараджэнні ўдзельнікаў камунікацыі і рэалізуецца з дапамогай дыхатамічных кагнітыўных параметраў рэальнасці/патэнцыяльнасці, дэскрыптыўнасці/крэатыўнасці, верагоднасці/валітыўнасці. Мадальна афармленыя выказванні рэпрэзентуюць, такім чынам, паслядоўнасць дзеянняў, што адлюстроўваюць пераход ад зыходнага магчымага свету да пажаданага. Прыведзеныя кагнітыўныя велічыні і іх камбінаторыка дазваляюць рэпрэзентаваць суперструктуру мадальнасці ў выглядзе макраполя імавернасці з палямі праблематычнай, простай, катэгарычнай верагоднасці, магчымасці (*рэальнасць/патэнцыяльнасць, дэскрыптыўнасць, верагоднасць*) і макраполя волевыяўлення з палямі аптатыўнасці, імператыўнасці, неабходнасці (*патэнцыяльнасць, крэатыўнасць, валітыўнасць*). Задаючы агульную форму, суперструктуры мадальнасці і яе віды арганізуюцца макрапрапазіцыямі, якія выводзяцца з мноства падобных з'яў, канструююцца на аснове значэнняў і акцэнтуюць мадальны аб'ём інфармацыі.

У якасці кагнітыўна-дыскурсіўнай катэгорыі, што выходзіць за межы лексічнай і граматычнай семантыкі, мадальнасць, рэалізуе камунікатыўныя стратэгіі, тактыкі, прыёмы, з дапамогай якіх выяўляюцца веды, думкі, установкі, інтарэсы, мэты карыстальнікаў мовы, спосабы і шляхі разумення адрасатам аўтарскіх інтэнцый. Калі стратэгіі ўвасабляюць «глабальныя намеры аўтара» (паводле Т.А. ван Дэйка), выбраныя ім правілы прымянення моўных адзінак для рэпрэзентацыі канкрэтных камунікатыўных мэтаў, то тактыкі – гэта сукупнасць прыёмаў і сродкаў для дасягнення гэтых мэтаў.

Агульнымі мадальнымі стратэгіямі выступаюць дзве: 1) інфармаванне моўцы аб з'явах рэчаіснасці ці змесце выказвання ў адпаведнасці са ступенню паўнаты яго ведаў аб гэтых падзеях; 2) адрасаванае ці неадрасаванае ўздзеянне моўцы на атрымальніка інфармацыі для выканання/невыканання ім дзеяння.

Мадальныя тактыкі ў якасці комплексу моўных і маўленчых прыёмаў пабудовы дыскурсу (Г.А. Золатава) і камунікатыўных хадоў як маўленчых дзеянняў (В.С. Ісерс) выяўляюцца ў кожным канкрэтным выпадку згодна з аўтарскімі стратэгіямі і інтэнцыямі. Прыкладамі мадальных тактык могуць быць наступныя: пераканання, парада, забарона, пагроза, прыцягненне ўвагі, абарона сваёй пазіцыі ў выглядзе прабачэння, апраўдання, тлумачэння, эксплікацыя нормаў, навязванне поглядаў і жаданняў, самапрэзентацыя, удакладненне, каментаванне, проціпастаўленне, засцярога, папрок, маскіроўка, адхіленне ад тэмы, змягчэнне, вылучэнне, устанаўленне кантакту і інш. (Т.А. ван Дэйк, В.С. Ісерс, А.В. Ільіна, Т.В. Раманава і інш.). Мадальныя макраструктура, суперструктуры, макрапрапазіцыі, стратэгіі, тактыкі з'яўляюцца кагнітыўна-дыскурсіўнымі характарыстыкамі любога дыскурсу, неабходны для эфектыўнай эксплікацыі пазіцыі моўцы, для рэалізацыі прадстаўленняў слухача, а таксама выступаюць крытэрыямі пры кадыфікацыі гэтай катэгорыі.

Так, у афарыстычных радках Р. Барадуліна *А ўсё ж цікава: Ад часу ўцякаем мы Ці час ад нас уцякае?* адначасова рэалізаваны стратэгіі інфармавання аб хуткай хадзе часу і ўздзеяння на адрасата, каб ён не марнаваў сваё жыццё дарэмна. У гэтым рытарычным пытанні-роздуме засведчаны мадальныя тактыкі запрашэння да разважання аб непатрэбнай чалавеку мітусні, і імпліцытнага жадання аўтара звярнуць увагу чытача на каштоўнасць кожнага імгнення, рэалізаваныя ў прыёмы прыцягнення ўвагі, няпэўнасці, папярэджвання.

Гэта ўдача і вялікае шчасце, калі адносіны навуковага кіраўніка і саіскальніка складваюцца як творчае ўзаемадзеянне, калі адбываецца не толькі перадача навуковага вопыту, даследчыцкіх навыкаў, але і ўстанаўліваецца высокая планка інтэлектуальнага ўзроўню і адказнасці вучонага, якая для паслядоўнікаў становіцца найважнейшым арыенцірам у складанай сістэме жыццёвых каардынат.

Аўтарытэтны вучоны, найдасканалейшы мастак вуснага жанру, лекцыйнага маналога, філалагічнай размовы, глыбокі, тонкі і дасціпны суразмоўца і дарадчык, доктар філалагічных Арнольд Яфімавіч Міхневіч – прыклад высокага служэння навуцы і адукацыі. Больш за 500 яго навуковых прац, сярод якіх слоўнікі, энцыклапедыі, хрэстаматыі, дапаможнікі, артыкулы – гэта інтэлектуальны і навуковы ўзор мульціпарадыгмальнага, энцыклапедычнага бачання свету для яго вучняў, паслядоўнікаў, нашчадкаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Дейк Т. А. ван.* Язык. Познание. Коммуникация : сборник работ / составление В. В. Петрова ; пер. с англ. яз.; под ред. В. И. Герасимова ; вступ. ст. Ю. Н. Караулова, В. В. Петрова. Москва : Прогресс, 1989. 310 с.

2. *Залевская А.А.* Проблема знания в различных ракурсах // Studia linguistica cognitiva. Вып. 2 : Наука о языке в изменяющейся парадигме знания. Иркутск : БГУЭП, 2009. С.14–64.

3. Краткий словарь когнитивных терминов / под общ. ред. Е. С. Кубряковой. М., 1996. 245 с.

АРНОЛЬД ЕФИМОВИЧ МИХНЕВИЧ: СЕКРЕТЫ РИТОРИЧЕСКОГО ОБАЯНИЯ

Т.В. Игнатович

Белорусский государственный университет,
ул. К. Маркса, 31, 220030, г. Минск, Республика Беларусь,
tavlig@mail.ru

Рассматривается вклад А.Е. Михневича в развитие лекторского мастерства в советскую эпоху и риторики в постсоветское время, характеризуются научные исследования ученого в этой области, описываются созданные им учебные пособия. Речевая практика А.Е. Михневича подтверждает его методические рекомендации. Цель исследования – дать краткий обзор научной и педагогической деятельности ученого в области ораторского искусства.

Ключевые слова: риторика; лекторское мастерство; публичное выступление; учебные пособия; речевое творчество.

> *Если одним словом можно сделать счастливым человека, какой нужно быть скотиной, чтобы этого не сказать!* (Р. Роллан)
>
> *Вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў* (У. Караткевіч)

Риторическое мастерство ценилось во все времена как способ презентации личности, даже в ситуациях приоритета коллективных форм деятельности.

Легендарная личность в области речевого мастерства – Арнольд Ефимович. Это его имя вошло в анналы истории развития риторики как искусства слова и науки об ораторском мастерстве. Потому что советский и постсоветский период их развития связан прежде всего с его деятельностью.

Советская ораторская школа представлена прежде всего «публичными чтениями» партийных лидеров всех рангов, поэтому обучение риторическому мастерству сводилось к овладению искусством партийной пропаганды. Немного специалистов-филологов занималось этой деятельностью, среди них личность Арнольда Ефимовича как глоток свежего воздуха.

Во главу угла ораторской подготовки пропагандистов он ставил важные для публичного выступления вопросы, методические решения некоторых из них до сих пор являются актуальными и находятся вне временной привязки. В статьях, брошюрах, наиболее полно в пособии «Ораторское искусство лектора» (1984) раскрываются вопросы, которые традиционно рассматривались в общей и частной риториках. Общая риторика со времен М.В. Ломоносова последовательно раскрывала этапы риторической деятельности оратора: подготовленность и подготовка; анализ проблемы и формулирование темы, планирование речи; виды вступления и заключения, способы изложения в основной части; коммуникативные качества речи и выработка индивидуального стиля; невербальное сопровождение речи; преодоление ораторской лихорадки и др. [2]

В «Хрестоматии по лекторскому мастерству» (1978) подобраны тексты и отрывки из оригинальных речей, фрагменты художественных произведений и предложена система работы с этим материалом. Чего стоит блестящий анализ знаменитой лекции К.А. Тимирязева «Растение-сфинкс» для рабочих о симбиозе – найденной природой возможности взаимопомощи разнородных организмов с великолепно выстроенной рефлексией в социальные отношения! [4]

В ряде статей и учебных пособий [2, 3 и др.] А.Е. Михневич выстроил систему подготовки к лекции, в том числе научно-популярной лекции: от выбора темы и замысла до реализации и самоанализа. Он проработал вопросы логики и психологии в речи, привлечения и удержания внимания слушателей, содержания, композиции и речевого оформления текста, импровизации в процессе публичного выступления, преодоления предстартовой лихорадки, ведения дискуссии, конструктивного и корректного рецензирования и др.

В его научном наследии, которое хранится в Государственном учреждении «Национальный архив Республики Беларусь» **(**BY НАРБ ф. 1429**)**, встречаем самые разные жанры научных работ, посвященных вопросам речевой подготовки: во времена активного участия во Всесоюзном обществе «Знание», во время работы в Институте управления

и предпринимательства, в МГЛУ и БГУ, в бытность ректором Белорусского института проблем культуры. Это книги “Из истории ораторского искусства”, “Хрестоматия по лекторскому искусству”, “Введение в методику лекционной пропаганды”, “Ораторское искусство лектора”, “О красноречии в шутку и всерьёз”, научно-методические пособия по курсу “Культура общения” и статьи по отдельным проблемам ораторского мастерства.

В его наследии, письменном и устном, нет «праздных слов», все слова «сказаны умело». Мы знаем Арнольда Ефимович как уникального лектора по многим вопросам языкознания и общения, нам он знаком как руководитель научных коллективов, профессор, руководитель самых высоких рангов, в должностные обязанности которого входили публичные выступления информационные, убеждающие, побуждающие к действию, воодушевляющие, дискуссии и обсуждения, и везде Арнольд Ефимович умел сказать единственно правильные эффективные слова.

Особо следует ответить мастерство ведения беседы в непринужденной обстановке, в том числе застольные беседы, тосты. Этому жанру важных для каждого ситуаций профессор Михневич уделил особое внимание во вступительном слове «Несколько слов о тосте» «Тосты от «Парадокса», в книгах «Алтар Стала: Маленькая, не зусім сур’ёзная энцыклапедыя звестак пра застолле, звычаі, тосты, віно» (Мінск, 2003) и «маленькой энциклопедии сведений о застолье, тостах, вине, обычаях “…Узнімем келіхі надзеі”» (2011).

И еще об одной грани ораторского мастерства Арнольда Ефимовича сказать нужно. Профессор Михневич посеял доброе семя на научную почву: 3 доктора наук и 15 кандидатов получили аттестат в научную жизнь из его рук, он был членом нескольких советов по защите диссертаций, членом Экспертного совета ВАК. В совете при БГУ по специальности 13.00.02 – теория и методика обучения и воспитания он был председателем в течение 4 лет. Как специалист по методике преподавания русского и белорусского языка он выступал в дискуссии, как председатель организовывал дискуссию. И во всех ролях он был главным психотерапевтом для соискателя, медиатор для членов совета и оппонентов, скрещивающих копья в словесных баталиях. И в самых простых, и в весьма оригинальных идеях диссертанта он видел выходы в будущие перспективные исследования и направлял научный поиск в неизведанное. Давайте послушаем один из таких советов.



Секрет риторического обаяния Арнольда Ефимовича Михневича очень прост: он великолепно воплощал в своем речевом творчестве все те рекомендации и советы, о которых писал в своих научных и методических произведениях по риторике.

Библиографические ссылки

1. *Михневич А.Е.* Несколько слов о тосте // Тосты от «Парадокса». Минск, 1997. С. 5–8; Изд. 2-е. Минск, 1998. С. 5–8; Изд. 3-е. Минск, 1999. С. 4–8
2. *Михневич А.Е.* Ораторское искусство лектора. М. : Знание, 1984. 192 с.
3. *Михневич А.Е.* «Слово, сказанное умело», или композиция лекции как коммуникативная тактика // Коммуникативные стратегии : материалы докл. Междунар. науч. конф. Ч. 1. Минск, 2003. С. 19–23
4. *Михневич А.Е.* Хрестоматия по лекторскому мастерству. Минск : Выш. шк., 1978. 178 с.
5. *Міхневіч А.Я.* Алтар стала: маленькая, не зусім сур'ёзная энцыклапедыя звестак пра застолле, звычаі, тосты, віно. Мінск, 2003. 91 с.
6. *Няміга Я.* Узнімем келіхі надзеі : маленькая энцыклапедыя звестак пра застолле, тосты, віно, звычаі. Брэст : БрДУ, 2011. 132 с.
7. О красноречии в шутку и всерьёз : сборник / сост. А.Е. Михневич. М. : Знание, 1989. 64 с.

А. Я. МІХНЕВІЧ – ПАЭТ, ПЕРАКЛАДЧЫК, МАЙСТАР ЭПІГРАМЫ

Ю. В. Назаранка

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Вул. К.Маркса, 3, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
julijanazarenko@mail.ru

Талент вучонага шматгранны, бывае, захапленні ніякім чынам не звязаны з асноўнай працай, асабліва калі прафесійны лёс звязаны з дакладнымі навукамі. Але прафесар А.Я. Міхневіч быў лінгвістам ва ўсім, нават у сваім імкненні перакладаць мастацкія тэксты, прычым тэксты паэтычныя, а мастацкі пераклад паэзіі – самы складаны від перакладу. І такое захапленне, відаць, "прымусіла" Арнольда Яфімавіча і самому пісаць вершы, ператвараючыся з перакладчыка ў аўтара не толькі лірычных вершаў, але і сяброўскіх эпіграм.

Ключавыя словы: лінгвістыка; мастацкі пераклад; мастацкі тэкст; арыгінальны твор; лірычны верш; эпіграма.

Арнольд Яфімавіч Міхневіч прайшоў доўгі і шырокі чалавечы шлях, пакінуўшы нам самае каштоўнае, што назаўжды застанецца пасля яго – СЛОВА. Слова навукоўца, слова даследчыка, слова настаўніка, дарадцы, кіраўніка, калегі, рэцэнзента, апанента, эксперта, нават медыятара… Але мне хочацца спыніцца на тых словах, якімі Арнольд Яфімавіч шчодра дзяліўся не з усімі, відаць, сціпла лічачы сябе аматарам, хоць мы ведам, што ён быў прафесіяналам ва ўсім, за што б ні браўся. Арнольд Міхневіч пакінуў нам слова паэта і перакладчыка, бо кожны, хто бярэцца за літаратурны пераклад верша, – паэт.

Зрабіўшы вялікі ўнёсак у вывучэнне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму, ён не мог не рэалізаваць практычны бок перакладу – Арнольд Яфімавіч надзвычай паспяхова перакладаў на беларускую некаторыя вершы славутых рускіх паэтаў (А.С. Пушкіна, А.А. Блока, А.А. Фета, У. Набокава, Р. Гамзатарва), а таксама рускамоўныя пераклады замежных (А. Хаям, А. Рэмбо,), сам пісаў вершы і эпіграмы пад псеўданімам Януш Няміга.

Не прэтэндуючы ні на лінгвістычны, ні, тым больш, на літаратуразнаўчы аналіз паэтычнай спадчыны Арнольда Яфімавіча, хачу проста прадставіць увазе блізкіх А.Я. Міхневічу людзей плён яго не зусім навуковага, але надзвычай філалагічнага захаплення – тэксты вершаў, для нагляднасці размешчаныя побач з арыгіналам (або рускамоўным перакладам з іншай мовы).

Арнольд Яфімавіч цаніў жыццё, ягоныя радасці, быў аматарам прыгажосці і знаўцам жаночай натуры, таму многія пераклады прысвечаны тэме кахання. Гэты тытульны верш Пушкіна перакладалі на беларускую мову неаднаразова (Максім Лужанін, Сяргей Махнач), але спроба А.Я. Міхневіча – вельмі пераканаўчы камплімент “залатому веку” рускай паэзіі. Канечне ж, «Я вас любил»:

Я вас любил: любовь еще, быть может,	*Я вас кахаў, і ўсё яшчэ каханне*
В душе моей угасла не совсем;	*У маёй душы пад попелам гарыць;*
Но пусть она вас больше не тревожит;	*Але трывожыць вас яно не стане,*
Я не хочу печалить вас ничем.	*Не перашкодзіць сумам светла жыць.*
Я вас любил безмолвно, безнадежно,	*Я вас кахаў таемна, апантана,*
То робостью, то ревностью томим;	*Пяшчотна думкаю ваш вобраз калыхаў;*
Я вас любил так искренно, так нежно,	*Я вас кахаў так шчыра, так аддана,*
Как дай вам бог любимой быть другим.	*Дай Божа, каб вас іншы так кахаў.*

Цікава, што Арнольд Яфімавіч перакладаў і А. Фета, які сам быў яшчэ і перакладчыкам – у 1884 годзе за пераклад сачыненняў Гарацыя А. Фет стаў першым лаўрэатам поўнай Пушкінскай прэміі Імператарскай Акадэміі навук:

А. Фет «Как много, боже мой…»

Как много, боже мой, за то б я отдал ней,	*Як многа, божа ж мой, за тое я б аддаў,*
Чтоб вечер северный прожить тихонько с нею	*Каб вечар трапяткі пражыць ціхутка з ёю.*

И всё пересказать ей языком очей, Хоть на вечер один назвав ее своею, Чтоб на главе моей лилейная рука, Небрежно потонув, власы приподнимала, Чтоб от меня была забота далека, Чтоб счастью одному душа моя внимала, Чтобы в очах ее слезинка родилась – Та, над которой я так передумал много, – Чтобы душа моя на всё отозвалась – На всё, что было ей даровано от бога!	*Я б моваю вачэй усё пераказаў,* *І ў светлы час яна была б маёю.* *І валасоў маіх лілейная рука* *Краналася б тады. І песціла ласкава.* *Змяльчэла б, перасохла клопату рака,* *На шчасце і любоў душа займела б права.* *І каб слязінкамі вачэй, мне дарагіх,* *Жыцця адкрылася бясконцая дарога.* *І каб і сэрца, і душа маліліся на іх,* *На ўсё, што даравана ёй было ад Бога.*

Філасофская лірыка заўсёды была сугучная творчай натуры Арнольда Яфімавіча, таму ён не мог абмінуць верш сімваліста А. Блока «Есть минуты». Звернем ўвагу на тое, што пераклад фармальна даўжэйшы на цэлае чатырохрадкоўе, тут бачыцца выразна творчы падыход Арнольда Яфімавіча да перакладу, ён вырашыў, як бачым, закальцаваць кампазіцыю свайго перакладу:

Есть минуты, когда не тревожит Роковая нас жизни гроза. Кто-то на плечи руки положит, Кто-то ясно заглянет в глаза... И мгновенно житейское канет, Словно в темную пропасть без дна... И над пропастью медленно встанет Семицветной дугой тишина... И напев заглушенный и юный В затаенной затронет тиши Усыпленные жизнию струны Напряженной, как арфа, души.	*Ёсць хвіліны, калі не турбуе* *Нам душу навальніца жыцця.* *Хтосьці рукі падаць нам спрабуе,* *Хтосьці ў вочы зірне з небыцця.* *І імгненна будзённае знікне,* *Быццам чорная бездань зглыне.* *І над бездannю раптам узнікне* *Цішыня, невядомая мне.* *І мелодыя юні далёка* *І таемна звініць у душы,* *Адбіваючыя глыбока* *У зацятым чаканні душы.* *Ёсць імгненні, калі мы ахвочы* *Пазабыць аб жыццёвай жудзе.* *Хтосьсці ясна зірне нам у вочы,* *Хтосьці рукі на плечы ўскладзе.*

З рускамоўнага перакладу Бенедзікта Ліўшыца (1934 г.) Арнольд Яфімавіч пераклаў верш Арцюра Рэмбо (у перакладзе з французскай назва верша «Sensation» перакладаецца як “адчуванне”; “успрыняцце”, "уражанне"; "пачуццё", нават “сенсацыя”, таму назвы перакладаў значана адрозніваюцца. Усе пераклады на рускую мову харошыя, кожны нясе адбітак свайго часу і светаўспрымання паэта, што перакладаў гэтыя радкі, але пераклад Арнольда Яфімавіча ўражвае асаблівай цеплынёй:

Артюр Рембо «Ощущения»

В сапфире сумерек пойду я вдоль межи, Ступая по траве подошвою босою. Лицо исколют мне колосья спелой ржи, И придорожный куст обдаст меня росою.	*Ў блакітна-мройнае змярканне* *напрасткі* *Па полі я іду праз колкае калоссе.* *А ветрык лашчыцца да твару і рукі*

Не буду говорить и думать ни о чем – Пусть бесконечная любовь владеет мною – И побреду, куда глаза глядят, путем Природы – счастлив с ней, как с женщиной земною.	*Ледзь чутна – пырскамі дажджу…* *Мне падалося,* *Каханне валадарыць у маім жыцці,* *Свабода – ў сэрцы й галаве ад думак чынных.* *І мне, як цыгану, ўсё роўна, дзе брысці –* *Сам-насам я з Прыродай – любаю Жанчынай.*

Асобную ролю ў жыцці Міхневіча займала культура застолля, якой ён прысвяціў “малую і не вельмі сур’ёзную кнігу пра віно, тосты і застоллі” – “Алтар стала” [1], якая была перавыдадзена і дапоўнена, змяніўшы статус на “энцыклапедыю” [2]. Таму тэма вершаванага тоста займае пачэснае месца ў творчасці А.Я. Міхневіча як перакладчыка:

Расул Гамзатов «Три горских тоста»

Наполнив кружки, мудрствовать не будем И первый тост такой провозгласим: “Пусть будет хорошо хорошим людям И по заслугам плохо – всем плохим!” Ещё нальём и вспомним изреченье, Достойное громокипящих рек: “Пусть детство будет кратким, как мгновенье, А молодость пусть длится целый век!” И в третий раз содвинем кружки вместе. “Друг чести, пей до дна! Не половинь! Пусть обойдут нас горестные вести, А сыновья – переживут. Аминь!”	*Нальём кілішкі – разважаць не будзем,* *І першы тост наш прагучыць такім:* *Хай будзе добра ўсім харошым людзям* *І па заслугах блага – ўсім ліхім!* *Яшчэ нальём, адкінуўшы сумненне,* *Хай верыць кожны добры чалавек:* *Дзяцінства пройдзе як адно імгненне,* *А маладосць вас не пакіне век!* *Нарэшце ўзнімем келіхі надзеі.* *Мой сябра, пі да дна, не палавінь!* *Хай абмінуць нас прыкрыя падзеі,* *Ну, а сыны –перажывуць. Амінь!*

І, вядома ж, спадчыну аднаго з самых яркіх прадстаўнікоў такой тонкай справы, як Усход, у творах якога сышліся і мудрасць, і філасофія, і каханне, і віно – Амара Хаяма (персідскі філосаф, матэматык, астраном, якога мы ведаем найперш як паэта), не мог абысці пільнай перакладчыцкай увагай Арнольд Яфімавіч:

Омар Хайям. Избранные рубайи

«Ад и рай – в небесах», – утверждают ханжи. Я, в себя заглянув, убедился во лжи: Ад и рай – не круги во дворце мирозданья, Ад и рай – это две половины души.	*«Пекла й рай – у вышыні», – так сцвярджаюць ханжы,* *Але я зразумеў сутнасць гэтай ілжы.* *Пекла й рай не шукай у далёкіх нябёсах:* *Пекла й рай – гэта дзве іпастасі душы.*

Усе, хто тым ці іншым чынам сутыкаўся з Арнольдам Яфімавічам, цудоўна памятаюць пра ягонае славутае пачуццё гумару. У літаратурным плане гэты талент рэалізаваўся ў напісанні эпіграм (так старажытныя грэкі

называлі вершаваныя надпісы, якія высякаліся на каменных помніках, таму сам Арнольд Яфімавіч жартаўліва перакладаў тэрмін на беларускую мову як “канцапіскі”). На вялікі жаль, з тых эпіграм, якія напісаў Арнольд Міхневіч кожнаму (! а нас тады было 20 чалавек) члену кафедры сучаснай беларускай мовы да аднаго са святочных пасяджэнняў (2006 год), нам удалося аднавіць толькі тры.

Эпіграма на А.Л. Садоўскую

З лінгвістычнай дубальтоўкі
Б’е Анжэла птушак лоўка.
Вельмі добра абскубе
Ў картатэку сабе,
І ў выніку той акцыі
Мы маем дысертацыю.

Эпіграма на С.А. Важніка

Сяргей Аляксандравіч Важнік
Баяр мне нагадвае думных.
Ён самы разумны з адважных
І самы адважны з разумных.

Эпіграма на Ю.В. Назаранка

Няма цяпер для Юліі ні дня, ні ночы.
А момант вось такі гняце яе рабочы:
Ну, як змагацца з гэтай дзікай мафіяй,
Што ў методыцы завецца арфаграфіяй,
Бо што ні правіла, то мноства розных поглядаў,
Але ж не кінеш арфаграфію без догляду!

Завяршыць экскурс у мастацкі свет творчасці А Я. Міхневіча хочацца аўтарскім вершам Майстра, які толькі на першы погляд сумны, а на самай справе гэта мудры запавет усім нам, такі самы, якім і быў, якім мы НАЗАЎЖДЫ яго запомнім:

Назаўжды

Як песня жаўрукова на світанні,
Да нас прыходзіць першае каханне.
Яно ў душы нязгасным болем стане
Назаўжды.

Як цёплы дождж пад летнім сонцам, хутка,
Мінае сталасць з радасцю і смуткам…
І ўжо ў мінулым светлая мінутка
Назаўжды.

Як белыя снягі за лістападам –
Нябёсамі ўсталёваным абрадам,

Прыходзіць старасць апусцелым садам
Назаўжды…

Так, назаўжды… ў бясконцасці Сусвету
Жыццё – як бліскавічная камета,
Але мы шчасце зведалі, і гэта –
Назаўжды!

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Няміга Я.* Алтар стала. Мінск : Энцыклапедыя. 2003. 94 с.
2. *Няміга Я.* Узнімем келіхі надзеі : маленькая энцыклапедыя звестак пра застолле, тосты, віно, звычаі. Брэст : БрДУ, 2011. 132 с.
3. Строки от сердца : сборник оригинальных и переводных произведений студентов и преподавателей университета. Стихотворения на разных языках. / редкол. А.В. Зубов (отв. ред) [и др.]. Минск : Асар, 2008. 234 с.
4. Строки от сердца : стихотворения на разных языках, проза / Вып. 4 : Стихотворения на разных языках. Переводы. Проза; редкол. А.В. Зубов (отв. ред) [и др.]. Минск : Ковчег, 2018. 156 с.

УНЁСАК А. Я. МІХНЕВІЧА Ў ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

Т. Р. Рамза

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Карла Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Ramza@bsu.by

Упершыню аналізуецца дзейнасць А. Я. Міхневіча ў сферы пашырэння беларускай мовы як замежнай, у тым ліку і як народнай. Аб’ектам даследавання сталі навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя, вучэбныя і вучэбна-метадычныя публікацыі А. Я. Міхневіча, якія датычацца праблематыкі беларускай мовы і яе вывучэння, а таксама інтэрв’ю прафесара. Мэта артыкула – паказаць шматвектарнасць, наватарства і глыбіню такой асветніцкай працы.

У дзейнасці А. Я. Міхневіча, скіраванай на пашырэнне беларускай мовы, правамерна вылучыць тры ўзаемазвязаныя кірункі: уласна навуковы, метадычны і арталагічны. Крытэрыямі для іх вылучэння стала тэматыка публікацый, іх жанр і адрасаванасць чытацкай аўдыторыі. Уласна навуковы кірунак арыентаваны перадусім на замежных спецыялістаў і падкрэсліванне спецыфічных рыс беларускай мовы на фоне іншых славянскіх моў. Метадычны кірунак – гэта стварэнне практычных дапаможнікаў па авалоданні беларускай мовы перш за ўсё дарослымі. Арталагічны кірунак дзейнасці разлічаны на пашырэнне культуры беларускага маўлення сярод усіх аматараў камунікавання па-беларуску.

Ключавыя словы: беларуская мова як замежная; А. Я. Міхневіч; папулярызацыя беларускай мовы; методыка; арталогія.

У адным са сваіх інтэрв'ю Арнольд Яфімавіч адзначыў: «…у мяне, відаць, ёсць гэткая навукова-папулярызатарская жылка. А папулярызаваць у мовазнаўстве можна любы аспект» [13].

У прапанаваным артыкуле размова пойдзе пра папулярызацыю ім беларускай мовы як замежнай. Беларуская мова як замежная разумецца тут шырока: і як уласна замежная мова, і як мова народная, у тым ліку і для саміх беларусаў, сацыялізацыя якіх у сям'і адбывалася і адбываецца на рускай мове. Як вядома, «у адрозненне ад роднай мовы, засваенне якой ідзе неасэнсавана і інтуітыўна (шлях "знізу ўверх"), засваенне замежнай мовы ажыццяўляецца ўсвядомлена і мэтаскіравана (шлях "зверху ўніз")» [1, с. 310]. Распрацоўкі А. Я. Міхневіча, датычныя гэтай галіны, разлічаны якраз на асэнсаванае стаўленне асобы да спасціжэння беларускай мовы.

Мэта артыкула – паказаць шматвектарнасць, наватарства і глыбіню такой папулярызатарскай дзейнасці. Матэрыялам для даследавання сталі навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя, вучэбныя і вучэбна-метадычныя публікацыі А. Я. Міхневіча, а таксама яго інтэрв'ю.

Правамерна, на маю думку, у дзейнасці Арнольда Яфімавіча, скіраванай на папулярызацыю беларускай мовы, умоўна адрозніваць тры напрамкі: уласна навуковы, метадычны і арталагічны. Крытэрыямі для іх вылучэння стала тэматыка публікацый, іх жанр і адрасаванасць чытацкай аўдыторыі. Калі першы кірунак датычыць найперш вучоных, другі – выкладчыкаў, настаўнікаў, студэнтаў, то трэці – усіх зацікаўленых у вывучэнні і выкарыстанні беларускай мовы. Зразумела, што ніякіх межаў паміж названымі кірункамі не існуе і не можа існаваць, але іх размежаванне падаецца карысным як для цэласнага ўяўлення пра зробленае вучоным у гэтай сферы, так і для яго сістэматызацыі.

1. Навуковая папулярызацыя беларускай мовы

Навуковая папулярызацыя беларускай мовы А. Я. Міхневічам, на маю думку, пачалася з моманту ўключэння яго ў сярэдзіне 1960-х гг. у склад Міжнароднай камісіі па вывучэнні граматычнага ладу славянскіх моў. На той час далёка не ўсе замежныя славісты ўяўлялі сабе, як гучыць беларуская мова і якія яе асаблівыя рысы. Такая выснова вынікае з цытаты самога Арнольда Яфімавіча: «Яны [члены камісіі – *Т. Р.*] ніколі не чулі жывую беларускую мову, адны казалі, што яна нагадвае польскую, другія – украінскую, трэція – рускую. "А ці ёсць такая беларуская мова, ці гэта сувязь трох моў?" – такое пытанне. Ну я кажу: вы можаце лічыць, як хочаце, але чыстых моў у пэўным разуменні ўвогуле няма. А сучасная руская мова ці не напалову царкоўна- ці стараславянская. Праўда ж? А англійская мова ці не напалову раманская? Колькі там раманскай лексікі. Значыць, не гэта шукайце, а шукайце якраз своеасаблівыя рысы» [13].

І ў сваіх публікацыях (адзінаасобных ці калектыўных) ён актуалізаваў увагу менавіта на адметных рысах беларускай мовы на фоне рускай і іншых

славянскіх моў. Да такіх прац неабходна аднесці, з аднаго боку, сумесныя міжнародныя праекты, сярод якіх (1) «Словарь славянской лингвистической терминологии» (Прага, 1977, 1979) [17], над падрыхтоўкай беларускай часткі якога ён працаваў разам з Г. А. Цыхуном, М. Р. Суднікам і інш.; (2) раздзел «Беларуская мова» ў томе «Славянскія мовы» з энцыклапедыі «Языки мира» (Масква, 2005) [7]; а з другога боку, калектыўныя працы, падрыхтаваныя і выдадзеныя ў Беларусі.

Успамінаючы працу над тэрміналогіяй у складзе нацыянальнай групы па «Слоўніку славянскай лінгвістычнай тэрміналогіі», А. Я. Міхневіч казаў: «..Мне даручалася першая апрацоўка матэрыялу. А для мяне гэта было вельмі цікава, бо гэта быў яшчэ адзін з кірункаў лінгвістычных даследаванняў, а тым самым узбагачалася і ўяўленне пра беларускую мову, пра граматыку: калі давалася, дапусцім, актуальнае чляненне, пра якое ніхто ніколі не пісаў у беларускім мовазнаўстве (на той час выкарыстоўваўся толькі тэрмін лагічны націск, аднак гэта не тоесныя паняцці). На жаль, у падручніках для ВНУ і школы выкарыстоўваюцца традыцыйныя тэрміны, але не гэтага шкада, а шкада, што за гэтай традыцыйнай тэрміналогіяй застаюцца і традыцыйныя ўяўленні пра сістэму беларускай мовы. Традыцыйная тэрміналогія абмяжоўвае вывучэнне мовы. Вось чаму для эўрыстычнага даследавання ні традыцыйных тэрмінаў, ні традыцыйных формаў выражэння значэння не хапае, і таму ў нас такая павярхоўная граматыка» [13].

Адносна раздзела «Беларуская мова» ў томе «Славянскія мовы» з энцыклапедыі «Языки мира» А. Я. Міхневіч казаў: «Самым цікавым для мяне было паказаць некаторыя спецыфічныя рысы нашай мовы. Дапусцім, мала пісалася і гаварылася пра наяўнасць аналітычных канструкцый у славянскіх мовах, у тым ліку і беларускай. Але калі адзінка ў сказе абапіраецца на суседнія адзінкі, то гэта і ёсць вытокі аналітызму. Вось пра аналітызм я там напісаў. <…> Гэта такі нарыс на рускай мове, які можа служыць крыніцай першапачатковага азнаямлення з беларускай мовай: усё ж гэта энцыклапедыя, а не падручнік. Думаю, што не адзін славіст яшчэ зазірне ў артыкул “Беларуская мова”, а там ёсць усё: семантыка, сінтаксіс, марфалогія, лексіка і г. д.» [13].

З калектыўных прац, падрыхтаваных і выдадзеных у Беларусі, у якіх А. Я. Міхневіч наўпрост удзельнічаў, адзначым «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» (1980) [14], над 2-ім томам якога ён працаваў сумесна з В. У. Мартынавым і інш., а таксама энцыклапедыю «Беларуская мова» (1994) [2], навуковым рэдактарам і адным з аўтараў якой ён быў. Варта згадаць, што А. Я. Міхневіч – аўтар некалькіх дзясяткаў артыкулаў у самых розных даведачных выданнях, як: «Беларуская савецкая энцыклапедыя» ў 12 т. (1969–1975), «Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя» (1981), «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 т. (1996–2004), «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» ў 5 т. (1984–1987) і інш., а таксама адзін з

аўтараў раздзела «Словазлучэнне» ў «Беларускай граматыцы» (1986) і «Кароткай граматыцы беларускай мовы» (2010).

Разважаючы ў адным з інтэрв'ю пра прыцягальнасць беларускай мовы менавіта для навукоўцаў, А. Я. Міхневіч канстатаваў: «А да беларускай мовы [цікаваць даследчыкаў], наадварот, расце, таму што беларуская мова ў пэўным сэнсе захавала вельмі многа цікавага для ўсіх славістаў: тая ж самая палеская лексіка. Успомніце новы кірунак, які фактычна стварыў Мікіта Ільіч Талстой разам з беларускімі даследчыкамі – вывучэнне палескай лексікі і этнаграфічнае даследаванне Палесся. Заўсёды цікавасць да мовы, нават далёкай мовы, дае зусім новыя магчымасці разглядаць уласную мову. Таму "хвалі" ў цікавасці да беларускай мовы я б убачыў так: пераход ад цікаўнасці да цікавасці» [13].

2. Арталагічны кірунак, ці беларуская мова для цікаўных

І якраз каб зацікавіць перадусім саміх беларусаў у камунікаванні па-беларуску, А. Я. Міхневіч шмат рабіў для пашырэння культуры беларускага маўлення. Такая сістэматычная дзейнасць пачалася ім ужо з 1968 г. у газеце «Звязда» ад 6 сакавіка, дзе ён распачаў рубрыку «Фарбы мовы» пад загалоўкам «Запрашаем цікаўных», прысвечаную пытанням моўнай культуры; ініцыятыву падхапілі супрацоўнікі Інстытута мовазнаўства АН БССР, дзе ён на той час працаваў. У сваёй нататцы, запрашаючы чытачоў да абмеркавання надзённых праблем беларускай мовы, ён указваў, што «размова будзе цікавай і сапраўды карыснай толькі тады, калі ўдзел у ёй возьмуць самыя шырокія колы людзей, усе, хто не ставіцца да мовы абыякава». Пазней, у 1991 г., А. Я. Міхневіч у газеце «Вечерний Минск» вёў рубрыку «Белорусский язык для всех»; а ў 2003 г. зноў «Звязда» з рубрыкай «Сем прыступак у свет мовы», нататкі з якой сталі часткаю калектыўнага даведачнага выдання «Слоўка за слоўкам: алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх» [11].

«Культура маўлення, – па словах А. Я. Міхневіча, – гэта неабсяжная стыхія бытавання нацыянальнай мовы ў вуснах людзей, і тут, бясспрэчна, узнікае шмат праблем, звязаных з якасцю індывідуальнага валодання сістэмай нацыянальнай мовы, з уменнем выбіраць з гэтай сістэмы тыя сродкі – словы, звароты, сказы, націскі, інтанацыю, стыль, – якія зробяць уласную мову (а дакладней: уласнае маўленне!) з'явай высокай культуры» [11, с. 3]. Як навукоўцу, настаўніку і рытару яму было важна, як гавораць беларусы па-беларуску; прычым як вучоны ён назапашваў эмпірычны матэрыял, даследаваў і асэнсоўваў фактары ўзнікнення «няправільнасцей» у маўленні, а як выкладчык і лектар у даходлівай форме даносіў чытачу / слухачу лінгвістычную ісціну, чым засцерагаў яго ад магчымых хібаў.

Улічваючы няпростую сітуацыю двухмоўя ў Беларусі, А. Я. Міхневіч падкрэсліваў, што тэрмін *арталогія* «ўказвае не толькі на правільнасць ужывання моўных адзінак, але і на навуковую і сацыяльную правільнасць самаасэнсавання ўласнай маўленчай дзейнасці і мовазнаўчых рэфлексій» [9

с. 15]. Нездарма ў сваёй прадмове да 3-га выдання дапаможніка «Белорусский язык для говорящих по-русски» А. Я. Міхневіч эпіграфам узяў словы Уладзіміра Дубоўкі: «..Жыць з людзьмі, сустракаючыся з імі штодня, і не ведаць іх мовы – я лічу недастойным людской годнасці. Апрача таго, гэта значыла б прызнацца ў сваёй бяздарнасці. Ці цяжка вывучыць яшчэ адну мову!» [3, с. 3].

3. Метадычны кірунак у пашырэнні беларускай мовы

А. Я. Міхневіч не толькі заклікаў да вывучэння беларускай мовы, але і ствараў практычныя дапаможнікі па яе авалоданні. Так, кніга «Белорусский язык для небелорусов» (1973), над якой А. Я. Міхневіч працаваў сумесна з А. А. Крывіцкім і А. І. Падлужным, была «первым опытом издания курса белорусской фонетики и грамматики, предназначенного для читателя-небелоруса» [4, с. 3]. Кніга атрымала станоўчы рэзананс як у краіне, так і за яе межамі і перавыдавалася яшчэ тройчы. Калі ў 1973 г. наклад склаў 2000 асобнікаў, у 1978 – 2 200, у 2008 – 2 500, то ў 1990 – 50 000 (!). Тут несумненную ролю адыграў год выдання, які прыпаў на час другой хвалі беларускага Адраджэння. У прадмове да кнігі А. Я. Міхневіч пісаў, што гэта «не школьный учебник и не грамматика для филологического факультета. Скорее его можно рассматривать как научно-популярные очерки, в которых рассказывается о белорусском языке, и прежде всего для тех, кто хотел бы углубить свое знание языка или начать его практическое изучение» [3, с. 4].

Прафесар максімальна выкарыстоўваў свой навуковы і навукова-папулярызатарскі досвед для заахвочвання вывучэння беларускай мовы як саміх рускамоўных беларусаў, так і замежнікаў, якія валодалі рускай ці англійскай мовамі. Дзеля гэтага ім былі падрыхтаваны і выдадзены два размоўнікі: руска-беларускі [8] і англа-беларускі [12]. Не застаўся А. Я. Міхневіч убаку і ад новых выклікаў сучаснай навукі: ён актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы камп'ютарных праграм па вывучэнні беларускай мовы рускамоўнымі (напр. [10]).

Разважаючы, чаму беларуская дыдактычная навука да сёння не мае стандартнага падручніка для замежных навучэнцаў, адзначаў, што «такія дапаможнікі ствараліся найперш па мовах сусветназначымых, якія забяспечваюць камунікацыю, якія патрэбны практычна» [13]. Таму любая спроба стварэння падобных дапаможнікаў па беларускай мове не толькі ім падтрымлівалася, але нярэдка ім жа і ініцыявалася. Так, у 1999 г. з Енскага ўніверсітэта (Германія) вывучаць беларускую мову на філфак БДУ прыехала студэнтка Клаўдыя Гуртыг (Claudia Hurtig), якая, прыслухаўшыся да парады Арнольда Яфімавіча, абрала ў якасці свайго курсавога праекта тэму «Кароткая граматыка беларускай мовы для нямецкіх студэнтаў». Вынікам гэтага праекта стала кніга «Kurze belarussische Grammatik in Tabellen für deutschsprachige Studenten» (2001) [15], надрукаваная ў Мінску пад навуковай рэдакцыяй А. Я. Міхневіча. Працягам гэтай працы стала паглыбленае тэарэтычна і дапоўненае практычнай часткаю выданне

«Belarussische Grammatik in Tabellen und Übungen» [16], апублікаванае ў Мюнхенскім выдавецтве «Otto Sagner» на замову рэдактара праф. Рэдэра.

Падсумаванне: унёсак А. Я. Міхневіча ў папулярызацыю беларускай мовы як замежнай (у шырокім сэнсе) неперабольшана важкі, значны як у навуковым, так і вучэбна-метадычным плане. Але не меншая вага прафесара і ў тым, што ягоныя працы даюць моцны імпульс да разваг, да пошуку, да крэатыву, бо, як сказаў сам А. Я. Міхневіч, «за плячыма – шлях, але й наперадзе дарога. Дарога пазнання мовы. Дарога яе захавання, удасканалення і пашырэння» [2, с. 6]. Нам, філолагам, ёсць што рабіць, ёсць куды імкнуцца і на каго раўняцца.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Азимов Э. Г.* Словарь методических терминов (теория и практика преподавания языков) / Э. Г. Азимов, А. Н. Щукин. СПб : Златоуст, 1999. 472 с.
2. Беларуская мова : энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1994. 655 с.
3. *Кривицкий, А. А.* Белорусский язык для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. 3-е изд., перераб. Мінск : Выш. шк, 1990. 368 с.
4. *Кривицкий А. А.* Белорусский язык для небелоруссов / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. Мінск : Выш. шк., 1973. 272 с.
5. *Кривицкий А. А.* Белорусский язык для небелоруссов / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. 2-е изд., испр. и доп. Мінск : Выш. шк., 1978. 352 с.
6. *Кривицкий А. А.* Белорусский язык. Для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. Мінск : Выш. шк., 2008. 83 с.
7. *Михневич А. Е.* Белорусский язык / Н. В. Бирилло, Ю. Ф. Мацкевич, А. Я. Михневич, Н. В. Рогова // Языки мира : Славянские языки. М. : Academia, 2005. С. 548–594.
8. *Михневич А.Е.* Русско-белорусский разговорник. Мінск : Выш. шк., 1991. 335 с.
9. *Міхневіч А. Я.* Арталагічны даведнік : асноўныя тыпы артыкулаў // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. Мінск : РІВШ, 2004. Вып. 3. С. 15–22.
10. *Міхневіч А. Я.* Беларуская мова : камп'ютарныя сцэнарыі для навучання рускамоўных / А. Я. Міхневіч, А. В. Зубаў. Мінск : НІА, 1999. 147 с.
11. *Міхневіч А. Я.* Слоўка за слоўкам : алф. давед. па культуры бел. мовы для ўсіх / А. Я. Міхневіч, Л. П. Кунцэвіч, Ю. В. Назаранка. Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2006. 166 с.
12. *Міхневіч А. Я., Навічэнка Н. М.* Англа-беларускі размоўнік. English-Byelorussian phrase-book. Мінск : Навука і тэхніка, 1992. 240 с.
13. «Навукі без эўрыстыкі, без нейкіх, хоць маленькіх, але адкрыццяў, проста не існуе» : інтэрв'ю (2006) Т. Р. Рамзы з праф. А. Я. Міхневічам. URL: https://philology.by/mihnevic-eurystyka (дата звароту: 10.10.2020).
14. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. Т. 2 : В / [А. Я. Міхневіч і інш.]; рэд. В. У. Мартынаў]. Мінск : Навука і тэхніка, 1980. 344 с.
15. *Hurtig C.* Kurze belarussische Grammatik in Tabellen für deutschsprachige Studenten / Гуртыг К. Кароткая граматыка беларускай мовы ў табліцах. Мінск : Тэхналогія, 2001. 89 с.

16. *Hurtig C., Ramza T.* Belarussische Grammatik in Tabellen und Übungen / Гуртыг К., Рамза Т. Граматыка беларускай мовы ў табліцах і практыкаваннях // Slavistische Beiträge / Herausgegeben von P. Rehder. München : Verlag Otto Sagner, 2003. Bd. 420. 267 S. (Studienhilfen; Bd. 13).

17. Slovník slovanské lingvistické terminologie = Словарь славянской лингвистической терминологии = Dictionary of slavonic linguistic terminology / Red. A. Jedlička. Praha : Academia, 1977–1979. T. 1. 1977. 554 c.; T. 2. 1979. 486 c.

ЛІНГВАДЫДАКТЫЧНЫ АСПЕКТ ВЫВУЧЭННЯ ПАМЫЛАК У БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ ТЭКСТАХ

А. В. Варанецкая[1)], У. І. Куліковіч[2)]

[1)] Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
вул. Свярдлова, 13а, 220006, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
alesyavoronetskaya@yandex.by

[2)] Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
вул. Свярдлова, 13а, 220006, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
nino-1924@mail.ru

Аналіз памылак у сучаснай навуковай парадыгме – неад'емная частка стварэння тэорыі навучання мове і тэорыі рэдагавання. Нягледзячы на шэраг дасягненняў у гэтай галіне, асобныя пытанні даследавання ненарматыўных канструкцый не страцілі сваёй актуальнасці і патрабуюць увагі з тэарэтычнага і практычнага поглядаў. Артыкул прысвечаны ўдакладненню семантычнага аб'ёму і сутнасці тэрмінаў "памылка" і "апіска" шляхам аналітычнага агляду навуковай літаратуры. Разглядаюцца розныя падыходы да вывучэння феномену памылкі, згодна з якімі асэнсоўваецца як паняцце з'явы памылкі, так і прырода яе з'яўлення, прынцыпы і найважнейшыя прыкметы, якія дазваляюць класіфікаваць віды памылак, стварыць іх тыпалогію.

Ключавыя словы: ненарматыўныя ўтварэнні; тэрмін "памылка" ; тэрмін "апіска"; моўная норма; лінгвадыдактыка; тэорыя рэдагавання.

Уводзіны. Памылкі – заканамерная з'ява працэсу навучання. Ёсць вядомае выказванне: "Не памыляецца той, хто нічога не робіць. Не бойцеся памыляцца – бойцеся паўтараць памылкі". Сфарміраваць дасканалую пісьменнасць без аналізу памылак, без высвятлення прычын іх узнікнення, прагназавання магчымасці ўзнікнення памылак, разумення памылка-небяспечных месцаў і распрацоўкі методыкі іх папярэджання немагчыма. Пытанне аб ненарматыўных утварэннях даследавана ў лінгвадыдактыцы, што тлумачыцца практычнымі патрэбамі адукацыі, вывучэння беларускай мовы. У работах Н. М. Антановіч, В. І Свірыдзенкі, І. А. Буторынай, Н. У. Антонавай, М. Г. Яленскага [1], У. І. Куліковіча [2; 3; 4], В. У. Зелянко [5] з'ява разглядаецца з пункту гледжання педагогікі, адлюстроўваюцца агульныя тэарэтычныя пытанні лінгваметодыкі навучання і тэарэтычныя праблемы сучаснай беларускай арфаграфіі, аналізуецца лінгвадыдактычны

патэнцыял тэкстаў у развіцці культуры маўлення школьнікаў і студэнтаў пры навучанні беларускай арфаграфіі. Ф. С. Бацэвіч [6], А. А. Капялюшны [7], А. Э. Мільчын [8] ставяць пытанне аб стварэнні агульнай тэорыі памылак як “спецыяльнай навуковай дысцыпліне”, прадметам якой можа стаць вывучэнне характару, класіфікацыі і прычын узнікнення розных ненарматыўных лінгваадзінак, метадаў іх папярэджання. “Памылказнаўства” можа прэтэндаваць і на ролю важнага раздзела методыкі выкладання мовы. Комплексны аналіз моўных анарматываў на матэрыяле газетных украінскамоўных артыкулаў правяла Т. Г. Бандарэнка [9]. Памылкі ў беларускамоўных тэкстах паўстаюць у якасці аб’екта даследавання і ў працах напрамку рэдагавання і журналістыкі У. І. Куліковіча [10; 11] і Н. М. Ступчык [12].

Задача артыкула – высветліць сутнасць паняццяў і тэрмінаў “памылка”, “апіска” з пункту гледжання сучаснай лінгвадыдактыкі і тэорыі рэдагавання і ўдакладніць іх семантычны аб’ём.

Асноўная частка. У сучаснай навуцы мяняюцца адносіны да памылак, іх аналіз становіцца неад’емнай часткай стварэння тэорыі любога напрамку. Кожная навука вывучае свае памылкі і не можа даць адказ на пытанне аб агульных параметрах для ўсіх памылак, прычынах іх узнікнення, іх відах і інш. Агульнай міждысцыплінарнай тэорыяй памылак лічыцца эралогія, асновы якой акрэслены ў працах Ф. А. Селіванава [13]. Даследчык кваліфікуе памылку як ненаўмысную няправільнасць, якую сістэма са зваротнай сувяззю ў стане заўважыць і ліквідаваць пры магчымасці.

Першым даследчыкам-лінгвістам, які акрэсліў асновы аналізу памылак, лічыцца Х. Джордж. У сваіх работах ён вылучыў важнасць вывучэння памылак у практыцы выкладання замежнай як другой мовы ва ўмовах білінгвізму. Вучань атрымлівае веды аб англійскай мове ад выкладчыка або з падручніка, што можна назваць “уваходам” (input). У сваю чаргу, вучаць выражаецца ў вуснай або пісьмовай форме мовы – гэта тое, што можна назваць “выхадам” (output). У тым выпадку, калі ўзнікае непажаданая форма (an unwanted form), якая не прадугледжана матэрыялам на ўваходзе, можна казаць пра ўзнікненне памылкі. Цікавасць павінны прадстаўляць прамежкавыя механізмы, якія выклікаюць памылку. Менавіта іх аналіз можа даць інфармацыю аб прыродзе такіх адхіленняў [14].

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у навуцы прапанаваны розныя падыходы да вывучэння феномену памылкі, усталяванню яе лінгвістычнай і нелінгвістычнай сутнасці. Сёння існуе некалькі канцэпцый, на якія ўказвае Т. Г. Бандарэнка [9]. Па-першае, памылка можа разглядацца як катэгорыя методыкі выкладання роднай і замежных моў. Па-другое, памылкі даследуюцца з мэтай павышэння ўзроўню пісьменнасці носьбітаў. Па-трэцяе, памылкі аналізуюцца ў практычнай стылістыцы як крыніца класіфікацыі нормаў. Па-чацвёртае, высвятляюцца механізмы ўзнікнення памылак. Па-пятае, асэнсоўваюцца прычыны ўзнікнення памылак і даследуюцца шляхі іх

ліквідацыі і папярэджання. Па-шостае, памылка можа вызначацца як аб'ект назіранняў за псіхічнымі працэсамі чалавека. Па-сёмае, здзяйсняюцца спробы тыпалагізацыі ненарматыўных адзінак. Па-восьмае, памылкі вывучаюцца ў цеснай сувязі з даследаваннямі спецыфікі мовы і з праблемамі нарматыўнасці ў СМІ. Па-дзявятае, вызначаецца статус памылак у матэматыцы і логіцы, выяўляюцца лагічныя асновы рэдагавання. Па-дзясятае, памылка паўстае аб'ектам вывучэння ў эдзіталогіі (рэдагаванні і выдавецкай справе). У адпаведнасці з гэтымі падыходамі асэнсоўваецца як паняцце з'явы памылкі, так і прырода яе з'яўлення, прынцыпы і найважнейшыя прыкметы, якія дазваляюць класіфікаваць віды памылак, стварыць іх тыпалогію.

Нягледзячы на шэраг дасягненняў у гэтай галіне, асобныя пытанні даследавання ненарматыўных канструкцый не страцілі сваёй актуальнасці і патрабуюць увагі з тэарэтычнага і практычнага поглядаў. Перш за ўсё гэта тычыцца праблемы высвятлення лінгвістычнай сутнасці паняцця памылкі.

Абагульненне навуковых поглядаў у галіне лінгвістыкі на паняцце "памылка" дазваляе сфармуляваць яе дэфініцыю і адмежаваць ад сінанімічных, але не тоесных тэрміналексем.

Так, у тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы ключавое слова для абазначэння тэрміна вызначаецца як няправільнасць:

ПАМЫЛКА, -і, *ДМ* -лцы, мн. -і, -лак, ж. Няправільнасць у дзеяннях, думках. *П. ў разліках. Напісаць без памылак. Выправіць памылку.* О *Памылка друку – памылка ў друкаваным тэксце* [15].

Такое абазначэнне назіраецца і ў тлумачальным слоўніку рускай мовы [16], што можна патлумачыць калькаваннем дэфініцыі з рускай мовы на беларускую. Тэрмін "апіска" пададзены ў асобным артыкуле:

АПІСКА, -і, ДМ апісцы, мн. -і, -сак, ж. Памылка з-за няўважлівасці ў пісьмовым тэксце [15].

У англійскай мове існуе больш за дзясятак сінанімічных тэрміналексем, якія прымяняюцца для абазначэння слова "памылка", але сярод іх mistake указвае на несістэмнасць/ненаўмыснасць памылкі; error – на няправільнасць па прычыне недахопу навыкаў, напрыклад, *grammatical error – грамматычная памылка*; slip – у сэнсе апіскі і інш.

Большасцю лінгвістаў тэрмін "памылка" разглядаецца як адхіленне ад нормы і як інструмент дасягнення правільнасці, нарматыўнасці. Ю. В. Красікаў разглядае паняцце як вынік разыходжання паміж планам і рэалізацыяй дзеяння, калі ўтвараецца несупадзенне паміж эталонам і канечным прадуктам дадзенага працэсу. Але паняцці памылка і адхіленне не раўназначныя, таму што памылка ўваходзіць у адхіленне, але адхіленне – гэта не заўсёды памылка. Таму паняцце "адхіленне" шырэй за паняцце "памылка" [17].

Калі разглядаць ненарматыўныя канструкцыі ў больш шырокім плане лінгвістычных з’яў, то неабходна адзначаць наяўнасць стылістычных прыёмаў павышэння выразнасці тэксту, якія можна тлумачыць як матываваныя парушэнні моўнай нормы. Л. Н. Мурзін адрозніває паняцці “моўная памылка” і “моўны прыём” на аснове мэтазгоднасці, памылка – адхіленне ад нормы, звязанае з выпадковымі збоямі ў рабоце моўнага механізму [18]. Відавочна, стылістычныя прыёмы нельга разглядаць у якасці памылкі, таму пры фармуляванні дэфініцыі варта адзначаць, што памылка – гэта менавіта нематываванае парушэнне літаратурнай мовы.

На наш погляд, семантычны аб’ём паняцця “памылка” найбольш поўна пададзены Т. Г. Бандарэнка: “памылка – анарматыў, гэта значыць такое ненарматыўнае лінгваўтварэнне, што ўзнікае ў выніку нематываванага парушэння літаратурнай нормы і з'яўляецца следствам няправільных разумовых аперацый” [9].

У лінгвадыдактыцы і педагогіцы асабліва важна адрозніваць сутнасць тэрміна “апіскі” ад “памылкі” для ўсвядомленага вылучэння найбольш часта дапушчальных ненарматыўных лінгваўтварэнняў, іх уліку і распрацоўцы методык іх папярэджання. Згодна з У. І. Куліковічам, пад тэрмінам “апіска” неабходна разумець вынік няўважлівасці таго, хто піша, які лёгка выяўляецца ім пасля чарговага прачытання слова [3]. Неабходна адзначыць акалічнасць: у галіне рэдагавання гэтае адрозненне не мае практычнай значнасці, так як першасная мэта рэдактара і карэктара – выявіць недахопы, а не навучыць аўтара пазбягаць дапушчаных памылак.

Аналіз метадычнай літаратуры паказвае, што адлюстраваць як адзіную класіфікацыю анарматываў, так і ўсе памылкі, якія сустракаюцца ў мове, немагчыма. Таму, лінгвадыдактычна вывучаючы семантычны аб’ем тэрміна “памылка”, варта адлюстраваць агульныя класіфікацыйныя прынцыпы.

У школьнай практыцы рэкамендавана вылучаць памылкі ў змесце, фактычныя, лагічныя, моўныя, стылістычныя – на змястоўна-моўным-стылістычным узроўні. Граматычная правільнасць ацэньваецца па колькасці арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак [19].

Заключэнне. Аналіз сутнасці тэрміна “памылка” дапамагае засяродзіць увагу навукоўцаў на вывучэнні праблематыкі ўзнікнення анарматываў. Агляд тэарэтычнай базы дазваляе вылучыць асобныя недакладнасці ў метадычных распрацоўках на дадзеную тэму, ставіць пытанні і высвятляць адказы, вывучаць прычыны і прагназаваць магчымасці ўзнікнення ненарматыўных лінгваўтварэнняў і, галоўным чынам, распрацоўваць практычна карысныя методыкі. Таму, на наш погляд, на наступным этапе вывучэння памылак мэтазгодна дакладна вызначыць дыферэнцыяльныя прыкметы і на іх аснове стварыць тыпалогію ненарматыўных канструкцый, якая засяродзіць увагу на неабходнасці прытрымлівацца агульнапрынятых нормаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах / Н. М. Антановіч [і інш.]. Мінск: Вышэйшая школа, 2019. 265 с.

2. *Куліковіч У. І.* Асноўныя прычыны арфаграфічных памылак у сучаснай беларускай мове // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте : сб. науч. статей по мат-лам III Междунар. науч. конф. (14–15 окт.) 2011 г.) / под ред. Е. Е. Иванова. Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2012. С. 66–71.

3. *Куліковіч У. І.* Правілы сучаснай беларускай арфаграфіі : вучэб. дапаможнік. Мінск : Новое знание, 2011. 222 с.

4. *Куліковіч У.І.* Матывацыя арфаграфічна граматнага пісьма па-беларуску сярод школьнікаў і студэнтаў // Роднае слова, 2014. №2. С. 50–55.

5. *Зелянко В. У.* Навучанне арфаграфіі беларускай мовы ў 5–11 класах : тэорыя і практыка : манаграфія. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2016. 194 с.

6. *Бацевич Ф. С.* Основы коммуникативной девиатологии. Львов : ЛНУ им. И. Франко, 2000. 236 с.

7. *Капелюшний А. О.* Стилістика й редагування: Практичний словник-довідник журналіста. Л. : ПАІС, 2002. 576 с.

8. *Мильчин А. Э.* Методика редактирования текста. Изд. 3-е, перераб. и доп. М. : Логос, 2005. 524 с.

9. *Бондаренко Т. Г.* Типологія мовних помилок та їх усунення під час редагування журналістських матеріалів: дис…. канд. філол. наук : 10.01.08. Черкаси, 2003. 283 арк.

10. *Куліковіч У. І.* Тыповыя граматычныя і лексічныя недакладнасці на старонках сучаснага перыядычнага друку // Моўна-культурная прастора Берасцейшчыны : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, Каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. Брэст : Альтэрнатыва, 2010. С. 101–105.

11. *Куліковіч У. І.* Тыпалогія арфаграфічных памылак на старонках СМІ // Журналістыка-2011 : стан, праблемы, перспектывы : матэрыялы 13-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю БДУ, 8–9 сн. 2011 г., Мінск / рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 13. Мінск : БДУ, 2011. С.226–229.

12. *Ступчык Н. М.* Аналіз некаторых памылак у тэкстах перыёдыкі // Зборнік работ 62-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Белдзяржуніверсітэта, 17–20 мая 2005 г., Мінск : у 3 ч. / [рэдкал.: А. Г. Захаров [і інш.]. Мінск, 2005. Ч. 2. С. 215–217.

13. *Селиванов Ф. А.* Поиск ошибочного и правильного. Тюмень, 2003. 157 с.

14. *Шевнин А. Б.* Эрратология и межъязыковая коммуникация // Вестник Воронежского государственного университета. Сер. «Лингвистика и межкультурная коммуникация». Воронеж : ВГУ, 2004. №2. С. 36–43.

15. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / Пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – 3-е выданне. Мінск: «Беларуская энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 2002. 784 с.

16. *Ожегов С. И., Шведова Н. Ю.* Толковый словарь русского языка. 4-е изд. М. : А ТЕМП, 2006. 944 с.

17. *Красиков Ю. В.* Теория речевых ошибок: (на материале ошибок наборщика). М. : Наука, 1980. 124 с.

18. *Мурзин Л. Н.* Норма, речевой прием и ошибка с динамической точки зрения // Речевые приемы и ошибки: типология, деривация и функционирование : сб. науч. трудов. М. : Институт языкознания АН СССР, 1989. С. 5–13.

19. *Піваварчык І. В.* Да пытання аб класіфікацыі памылак у пісьмовай форме // Актуальныя праблемы мовазнаўства (да 80-годдзя прафесара І. Я. Лепешава) :

Матэрыялы Міжнар. навук. канф., 28 кастрычніка 2004 г., Гродна / Адк. рэд. Т. І. Тамашэвіч. Гродна : ГрДУ, 2004. С. 281–285.

ИЗ ИСТОРИИ РАЗВИТИЯ АНАТОМИЧЕСКОЙ ТЕРМИНОЛОГИИ В БЕЛАРУСИ

В. Б. Галай

Белорусский государственный университет,
пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь,
nika.galai@gmail.com

В статье рассматривается развитие и пополнение анатомической терминологии в Беларуси. Начальный период формирования белорусской научной терминологии характеризуется тем, что в качестве терминов употреблялись слова из разговорного языка. Усиленно началась работа в 20-е годы XX века. Создатели первой анатомической терминологии использовали для одного и того же понятия разные термины. Следует отметить, что «Анатомия-словарь» - это первый справочник Беларуси.

Ключевые слова: анатомическая терминология; белорусская научная терминология; остеология; анатомические словари и справочники.

Анатомическая терминология – отражение многовекового развития медицинской науки. В первобытнообщинном строе знали о положении важных органов тела человека, о чем сообщается в древнекитайской книге «Нейцзин» (XI – VII вв. до н.э.). Знания, накопленные древней медициной, собраны знаменитым врачом Древней Греции Гиппократом (460–377 гг. до н.э.) в «Corpus Hippoctaticum» (свыше 100 медицинских сочинений). Гиппократ и его преемники унаследовали медицинскую лексику, применяемую многими поколениями народных врачевателей. С «Corpus Hippoctaticum» фактически начинается история европейской медицины и медицинской терминологии [1, с. 410].

Формирование белорусской терминологии происходило непосредственно в процессе развития определенных отраслей науки и в результате терминологической работы. Медицинская и анатомо-физиологическая лексика старобелорусского языка в своем составе имела необходимые средства для обеспечения всех известных в XIV – XVIII вв. отраслей медицинской науки: анатомии, физиологии, терапии, основ лечебных учреждений, фармакологии и акушерства. В письменных источниках того времени фиксируются чаще простейшие, известные с давних времен, анатомические знания. Вместе с тем на протяжении всего отмеченного периода этот пласт лексики пополнялся, особенно в XIV в. [2, с. 6]. Однако специальных терминологических словарей на белорусском языке в этот период не было.

Развитие и пополнение анатомической терминологии связано с периодом существования Великого княжества Литовского и

возникновением книгопечатания в Беларуси. До начала XX в. задача формирования белорусской терминологии вообще не ставилась. Поэтому особое внимание привлекают первые попытки создания, обработки и кодификации терминов современного белорусского языка. Одну из таких попыток сделали авторы так называемого «Сямімоўнага слоўніка», изданного в Лейпциге в 1918 г. (Sieben – Sprachen – Wörterbuch. Leipzig: O. Spamer, 1918), где белорусский язык впервые поставлен в один ряд с русским, польским, литовским, латышским, немецким и идишем. Этот словарь и его влияние на формирование определенных отраслей белорусской терминологии на начальном ее развитии все еще недостаточно изучен. В научном плане словарь интересен как одна из первых попыток, во многих случаях удачных, построить белорусскую терминологию на народной основе [3, с. 46].

Начальный этап формирования белорусской научной терминологии характеризуется тем, что в качестве терминов в сфере специальной коммуникации употреблялись (насколько это было возможно) слова из разговорного языка, ибо, как писал В.В. Виноградов, «всякая наука начинает с итогов, добытых мышлением и речью, и в дальнейшем в своем развитии не отрывается от народной речи [4, с. 49].

В 20-е годы XX в. началась терминологическая работа. В это время неоднократно вставал вопрос о создании белорусской научной терминологии: надо было облегчить преподавание некоторых дисциплин в средней и высшей школе. Для решения этой задачи в 1924 г. была основана Медицинская секция при Институте белорусской культуры БССР (затем в 1928 г. секция вошла в состав Института научного языка Белорусской академии наук). В состав терминологической комиссии по проблемам медицинской лексики вошли доктора Иван Цвикевич (еще в 1923 г. сотрудник естественнонаучной секции Иван Цвикевич начал составлять терминологию по анатомии, физиологии и гигиене) – председатель комиссии, Павел Тремпович – член комиссии и секретарь Павел Каравайчик. Надо отметить, что все они в совершенстве владели белорусским языком. В работе над медицинской терминологией ориентировались на Базельскую анатомическую номенклатуру (1895 г.). Для перевода на белорусский язык за основу были взяты латинские и русские термины из учебника анатомии человека А. Раубера и атласа В. Шпатегольца, а также из украинского и польского изданий Базельской анатомической номенклатуры. Подбирая белорусские соответствия, комиссия использовала анатомические и физиологические названия, собранные Институтом белорусской культуры, Я. Дроздовичем, словарями П. Берынды, Л. Зизания, И. Носовича, В. Ластовского. Первый труд секции – «Nomina anatomica alboruthenica» (анатомические названия в трех томах) – издан в 1926–1929 гг. Три выпуска разработанной и изданной в короткий срок первой национальной анатомической терминологии

включают 6710 терминов, которые даны на латинском, русском и белорусском языках. Несомненно, издание белорусской анатомической терминологии содействовало формированию единой, унифицированной системы анатомических терминов.

Следует отметить, что иногда создатели первой анатомической терминологии для выражения одного того же понятия использовали разные термины и терминоэлементы: *хрыбтовая дзірка (позвоночное отверстие), ніжняя атворына (нижнее отверстие), патылічная дзірка (затылочное отверстие), зрокавыя дзіркі (зрительные отверстия), рваная дзірка, прорва (рваное отверстие), серпаватая розьверць (полулунное отверстие); грудзінная роўнядзь (грудинная поверхность), роўнядзь патыліцы (затылочная поверхность), паўмесяцавая паверхня (полулунная поверхность), сустаўная западзіна (суставная поверхность); сустаўная паверхня рабровага грудка (суставная поверхность реберного бугорка), прычарвяковая ямінка (червячковая борозда), заслоначная баразна (запирательная борозда); узгузы плечніцы (суставные отростки плечевой кости), прыўзгузавая яміна (суставная ямка)* и др.

Характерной особенностью терминологии, разработанной Научно-терминологической комиссией, была высокая степень вариативности, обусловленная прежде всего подачей части заимствованных терминов вместе с белорусскими лексемами и неологизмами [5, с. 32]. Анализируя остеологию в Nomina Anatomica, вариантов встречается немного: *лямешніца, лямеш; тварная часць чэрапа, тварніца; пальцавыя косці, палечніцы; хістальныя рэбры, вольныя рэбры* (русск. *свободные*)*; лабякі, лобныя гузы* и др. Мы совершенно согласны с Л.А. Антонюк, что на раннем этапе развития науки… в Беларуси ученые и популяризаторы науки в своих публикациях научного и научно-популярного содержания часто использовали вместо неизвестных широкому кругу читателей заимствованных терминов слова живого белорусского языка, а иногда и узкие регионализмы, которые и были зафиксированы составителями выпусков [5, с. 32–33]. К примеру: *грудзінны храсткозрост (грудинный синхондроз – synchondrosis sternalis), ход пад'язычнае нэрвы (канал под'язычного нерва – canalis hypoglossi), ходзік бубеннае струны (каналец барабанной струны), атворына барабаннага ходзіку (отверстие барабанного канальца), сіткаваты пласток (решетчатая пластинка), дугаватае ўзвышша (полукружное возвышение), паземная частка (горизонтальная часть – pars horizontalis), заступаковыя косьці (плюсневые кости), надпятавіца (таранная кость), кружала надпятавіцы (блок таранной кости), каморкі (клетки), круцяк (вертел)* и др.

Хочется обратить особое внимание на правильный перевод с латинского на белорусский *minora, majora* (*'меньший, больший'*): *cornua majora* – русск. *большие рога* – БНТ: *большыя рогі*; *cornu minora* – русск. *малые рога* – БНТ: *меншыя рогі*; *foramina polatina minora* – русск. *малые*

небные отверстия – БНТ: *меншыя паднябенныя дзіркі*; *pelvis major* – русск. *большой таз* – БНТ: *большае лагво* (сучаснае: *вялікае лагво/вялікі таз*) и др. Создатели анатомической терминологии обращали внимание на степень сравнения. Еще интересно следующее: *acetabulum* – русск. *суставная впадина* – БНТ: *кубак* (в словаре Ярошевича *вяртлюжная западзіна*). Латинское *acetabulum – уксусник, соусник; чашка; ацетабул, мера емкости (0,07 л)*; анат. *вертлюжная впадина; зоол. присоска; бот. чашечка (цветка)* [6, с. 23].

На развитие белорусской терминологии отрицательно сказалась ее русификация как появление языковой реформы 1933 г.

В 1990-е годы продолжается возрождение белорусской научной терминологии. Авторские коллективы терминологических справочников ориентировались в своей работе на сохранение системных черт национального белорусского языка на всех его уровнях и избегали неоправданного калькирования и заимствования.

Активизировалась работа над разработкой медицинской терминологии в 1991–1998 гг.: изданы справочники, терминологический словарь по цитологии, словарь по общей и медицинской вирусологии, русско-белорусский медицинский словарь. Особого внимания заслуживает «Анатомический словарь: русско-белорусско-латинский, белорусско-латинский, латинско-белорусский / С.П. Ярошевич, Л.Н. Бойцов, Д.В. Ковалева [и др.]. Минск : Дизайн ПРО, 1998. 480с.», также «Анатомия: словарь / С.П. Ярошевич [и др.]. Минск: БГМУ, 2016. 248 с.». Эти словари составлены сотрудниками Белорусского государственного медицинского университета (в последнем принимала участие доцент БГУ). Все терминографические источники (начиная от БНТ и оканчивая «Анатомическим словарем») ориентированы на Базельскую анатомическую номенклатуру. Современная Terminologia Anatomica утверждена в Риме в 1992 г.

В издании «Анатомия: словарь» латинские и русские термины приводятся по «Международной анатомической терминологии» (под ред. Л. Л. Колесникова. М. : Медицина, 2003. 424 с.). В словаре дано больше заимствованных из латинского языка слов: *acromion – акромион – акраміён* (в БНТ: русск. *плечевой отросток – надплечнік*), *glabella – глабелла – глабэла* (в БНТ: русск. *переносица – міжброўны пляцок, надпераносьсе*); *alveoli dentalis – зубные альвеолы – зубныя альвеолы* (в БНТ: русск. *зубные луночки – зубныя місачкі*); *facies symphyseos – симфизиальная поверхность – сімфізавая паверхня* (в БНТ: *зроставая паверхня*); *epiphysis – эпифиз – эпіфіз* (в БНТ: *насадак; надростак (доўгае косці); шышкавіца, шышкаватае цела*); *conjugate diagonalis – диагональная коньюгата – дыяганальная кан'югата* и др.

На наш взгляд, «Анатомия – словарь» – это первый справочник в Беларуси, в котором предоставлены белорусские анатомические термины,

соответствующие международному стандарту. Несомненно, это издание значительно пополнило анатомическую терминологию. Надеюсь, что в скором будущем белорусскоязычная анатомическая терминология будет доработана и официально утверждена.

Библиографические ссылки

1. Энциклопедический словарь медицинских терминов : в 3 т. / редкол.: Б.В. Петровский (гл. ред.) [и др.]. М.: Сов. Энциклопедия. Т. 3: Рабдитозы – Ящур / П.П.Блохин [и др.]. 1984. 512 с.

2. *Ялоўская Э.А.* Анатама-фізіялагічная і медыцынская лексіка ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове XIV – пачатку XVIII стст.: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01. Мінск, 2001. 19 с.

3. *Любецкая К.* Сямімоўны слоўнік / Тэрміналагічны бюлетэнь. Мінск : БелІПК, 1997. Вып. 1.

4. *Красней В.П.* Беларуская тэрміналогія: зб. арт. / В.П. Красней; рэдкал.: Э.А. Ялоўская (адк. рэд.) [і інш.]; навук. рэд. М.Р. Прыгодзіч. Мінск : БДУ, 2011. 216 с.

5. *Антанюк Л.А.* Беларуская навуковая тэрміналогія : Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне. Мінск : Навука і тэхніка, 1987. 240 с.

6. *Дворецкий И.Х.* Латинско-русский словарь. 2-е изд. М. : Русский язык, 1976. 1096 с.

УКРАІНСКІЯ ЛІНГВІСТЫ ПРА ПРАБЛЕМУ ПЕРАЕМНАСЦІ Ў ГІСТОРЫІ ЎКРАІНСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОЎ

І.А. Гапоненка

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
haponienka@bsu.by

Артыкул прысвечаны праблеме лінейнасці развіцця ўкраінскай і беларускай моў. Паказваецца важнасць філіяцыйных даследаванняў, ад вынікаў якіх залежыць вырашэнне важных грамадскіх пытанняў і фарміраванне аб’ектыўных падыходаў да цэлага шэрагу важных моўна-гістарычных праблем **(**праблемы перыядызацыі гісторыі мовы, вызначэння моўнага “ўзросту”, акрэслення сацыялінгвістычнага тыпу мовы і інш.). Сцісла характарызуюцца разнастайныя ацэнкі факта пераемнасці паміж старабеларускай і новай беларускай літаратурнай мовай, якія існуюць у беларускім мовазнаўстве, дэманструецца дынаміка лінгвістычных поглядаў на гэтае пытанне. Прыводзяцца разгорнутыя разважанні ўкраінскіх лінгвістаў (ад 1960-х гадоў да нашых дзён), прысвечаныя высвятленню ступені і характару пераемнасці моўных традыцый ва ўкраінскай мове, аналізуюцца аргументы прыхільнікаў розных пунктаў погляду на пытанне пераемнасці, а таксама ўказваюцца меркаванні ўкраінскіх даследчыкаў адносна стадыйнай сувязі ў гісторыі беларускай мовы. Робіцца выснова, што пры вырашэнні пытання моўнай пераемнасці шэраг лінгвістычных стэрэатыпаў і традыцыйных метадалагічных падыходаў патрабуюць дадатковага асэнсавання. Канстатуецца каштоўнасць для беларускіх гісторыкаў мовы вопыту украінскіх калег па навуковым разглядзе філіяцыйнай праблемы.

Ключавыя словы: гісторыя мовы; праблема моўнай пераемнасці; філіяцыйны аспект даследаванняў; ацэнкі факта пераемнасці; разрыў моўных традыцый; прамая пераемнасць; апасродкаваная пераемнасць.

Высвятленне ступені і характару пераемнасці моўных традыцый з'яўляецца адной з вядучых задач гістарычнай навукі аб мове. Ад яе вырашэння залежыць фарміраванне аб'ектыўных падыходаў да цэлага шэрагу важных моўна-гістарычных праблем, у прыватнасці да праблемы перыядызацыі гісторыі мовы, вызначэння моўнага "ўзросту", акрэслення сацыялінгвістычнага тыпу мовы і інш. На сённяшні дзень абмеркаванне статуса мовы і даўнасці яе ўтварэння часам выходзіць за лінгвістычныя рамкі і пытанне моўнай пераемнасці набывае новае актуальнае, ужо не толькі навуковае, але і грамадскае гучанне.

Устанаўленне навуковых вывадаў па пытанні пераемнасці асабліва прынцыповым з'яўляецца для тых моў, якія зазналі неспрыяльнае ўмяшанне ў натуральныя эвалюцыйныя працэсы свайго развіцця. Менавіта таму філіяцыйны аспект даследавання на працягу многіх дзесяцігоддзяў застаецца актуальным у беларускім і ўкраінскім мовазнаўстве.

Беларускія даследчыкі разыходзяцца ў ацэнках факта пераемнасці паміж старабеларускай і новай беларускай літаратурнымі мовамі. У другой палове XX ст. многімі беларускімі мовазнаўцамі (А.І. Жураўскі, Н.Т. Вайтовіч, К. Крапіва, І.І. Крамко, Б.А. Плотнікаў, Л.І. Сямешка і інш.) праводзілася (ці, прынамсі, не аспрэчвалася, прымалася за аксіёматычную) думка, што новы літаратурны варыянт беларускай мовы сфарміраваўся ў вялікім часавым адрыве ад старога, вынікам чаго сталася страта прамой і непасрэднай пераемнасці паміж старой і новай беларускай літаратурнай мовай. Толькі некаторыя вучоныя выказвалі меркаванне адносна апасродкаванай пераемнасці, у якой ролю сувязнога звяна адыграла вусная народная творчасць (Л.М. Шакун), або ўвогуле абгрунтоўвалі бесперарыўнасць развіцця беларускай літаратурнай мовы (У.В. Анічэнка, А.Я. Баханькоў). У апошні час у беларускім мовазнаўстве заўважаецца эвалюцыя навуковых поглядаў на пытанне пераемнасці. Даследчыкі ўказваюць, што навуковая, афіцыйна-справавая, публіцыстычная стылёвыя разнавіднасці беларускай літаратурнай мовы ў новы перыяд сапраўды істотна абнаўляліся, але мова твораў мастацкага стылю фактычна працягвала сваё развіццё на аснове сінтэзу размоўнай народнай мовы з элементамі (найперш лексічнымі) старажытнай беларускай пісьменнасці (В.А. Ляшчынская, В.П. Лемцюгова, С.М. Струкава, Г.К. Ціванова і інш.). Акрамя таго, назіраецца пераход ад абстрагаваных разважанняў да стварэння статыстычнай доказнай базы факта моўнай пераемнасці (І.У. Будзько) (падрабязней гл. [2]).

Нягледзячы на тое, што працэсы станаўлення беларускай і ўкраінскай моў вызначаюцца наяўнасцю шматлікіх падобных знешніх гістарычных рыс, ва ўкраінскай лінгвістыцы падыходы да вырашэння пытання аб

пераемнай сувязі паміж старой і новай стадыямі моўнага развіцця істотна адрозніваюцца ад беларускіх.

Тут варта ўказаць адзін характэрны факт. У беларускай лінгвістыцы ў аснову гіпотэзы аб поўнай страце пераемнай сувязі паміж старой і новай моўнымі стадыямі было пакладзена меркаванне рускага моваведа М. М. Дурнаво [гл. 7, с. 127-128], які сцвярджаў, што *«нынешний белорусский литературный язык возник только в XIX в.; в основе его лежит один из центрально-б.-р. говоров. Вследствие стремления части б.-р. писателей последнего времени порвать со всеми традициями и сделать свой литературный язык отличным и от р., и от укр. в б.-р. литер. язык, особенно в язык научной прозы вошло много чужих элементов, несвойственных ни р. литер. языку, ни живым б.-р. говорам. Ни в какой связи со старым зап.-р. литер. языком XV–XVIII вв. он не стоит»* [3, с. 29]. Адсылка да аўтарытэта гэтага даследчыка была ключавой пры вырашэнні пытання пераемнасці ў беларускай мове, што выглядае не зусім дарэчным. Асноўную сферу інтарэсаў М.М. Дурнаво складала руская дыялекталогія і гісторыя рускай мовы, а беларускі моўны матэрыял ён выкарыстоўваў толькі фрагментарна. Пераемнасці ў гісторыі беларускай мовы ў працытаванай працы, як відаць, прысвечана літаральна некалькі радкоў, якія выглядаюць хутчэй як канстатуючая заўвага, а не як вынік скрупулёзных даследаванняў. Аналагічны вывад М.М. Дурнаво выказвае і аб характары традыцый у гісторыі ўкраінскага пісьменства. Украінская мова, на яго думку, узнікла *«только в конце XVIII в. и не стоит в генетической связи ни с цсл. литературным языком ю.-р. писателей предшествующей эпохи, ни с собственно русским литературным языком, ни с предшествующими попытками писать на м.-р. (XV–XVIII вв.). В основу его легло вост.-укр. Наречие м.-р.; элементов, несвойственных живой вост.-укр. народной речи, первые украинские писатели старались, по возможности, избегать, что им удавалось, пока литература на укр. ограничивалась стихами и повестями из украинского быта»* [3, с. 28]). Але ўкраінскія навукоўцы не схільныя прымаць такі пункт погляду.

Яшчэ з 60–70-х гадоў XX ст. украінскія даследчыкі гісторыі мовы фактычна адзінадушна сыходзіліся на тым, што на Украіне генетычная сувязь паміж даўняй пісьмовай мовай, якая па меншай меры рэгіянальна адстойвала некаторыя свае функцыі да канца XVIII ст., і новай украінскай літаратурнай мовай не была перарваная (паводле [15, с. 82]).

Пры гэтым у некаторых выданнях, прысвечаных гісторыі мовы, пытанне пераемнасці асобна не ставіцца, але і гэта паказальна, бо выклад вядзецца так, як быццам такога пытання ўвогуле не існуе і яго не варта дыскутаваць і даказваць факт наяўнасці пераемнай сувязі (гл., напрыклад, [8]).

Шэраг даследчыкаў бачаць элементы агульнасці старой і новай мовы ў тых народна-размоўных кампанентах, якія пранікалі яшчэ ў моўную канву

украінскіх старапісьмовых тэкстаў. Так, П.П. Плюшч мяркуе, што пры змене моўнага стану ў выніку пераходу ад старой літаратурнай мовы да новай адпалі штучныя, адарваныя ад народнай асновы элементы, што і надало мове новую якасць, але не ізалявала розныя этапы моўнага станаўлення адзін ад аднаго: *«Пад новай украінскай літаратурнай мовай трэба разумець літаратурную мову ўкраінскай нацыі на жывой нацыянальнай моўнай аснове. Гэтая мова якасна адрозніваецца ад старой украінскай літаратурнай мовы: між ёй і жывой украінскай мовай няма таго разрыву, які існаваў паміж жывой мовай народу і старой літаратурнай мовай»* [11, с. 34].

Падобным чынам выказваецца і М.К. Байчук, які складаючы перыядызацыю гісторыі ўкраінскай мовы, указвае, што *«з канца XVI ст. заканчваецца першы перыяд у развіцці старой украінскай літаратурнай мовы, які прайшоў пад знакам шырокага, вольнага і ўсеагульнага анароднівання ўспадкаванай ад старажытнарускай народнасці "руськай" літаратурнай мовы»* [1, с. 82]. З гэтага ж часу, па словах даследчыка, пачынаецца другі этап, калі мова паступова дэархаізуецца, насычаецца рысамі іншых моў (найперш польскай) і, самае галоўнае, рысамі вуснай размоўнай мовы. Гэты другі перыяд цягнецца на ўсходзе прыкладна да сярэдзіны XVIII ст., а на захадзе – да сярэдзіны XIX ст., пасля чаго *"старая ўкраінская літаратурная мова прыпыняе сваё існаванне"* і *«з канца XVIII і цягам усяго XIX ст. украінскі народ не прыпыняе намаганняў па стварэнні, удасканаленні і развіцці новай літаратурнай мовы»* [1, с. 83].

Яшчэ больш канкрэтная пазіцыя В.П. Русаніўскага: *«… хоць новая ўкраінская літаратурная мова – гэта якасна адрозная ад старой літаратурнай мовы з'ява, усё ж яна як у працэсе свайго станаўлення, так і пазней – ажно да сёння – абапіраецца на старую ўкраінскую літаратурную мову, асабліва на ўжываную ў ёй лексіку»* [12, с. 212]. Паказальна, што вывад аб пераемнасці паміж старым і новым этапам ва ўкраінскай мове даследчык распаўсюджвае на беларускую мову: *«сучасная беларуская літаратурная мова звязана спадчыннай повяззю са старабеларускай»* [12, с. 212].

У абарону пераемнасці катэгарычна выступае і В.А. Перадрыенка, які лічыць, што *"народная аснова з'яўляецца злучальным звяном у сістэме літаратурна-моўнай спадкаемнасці"* [10, с. 9]. Даследчык называе таксама гісторыкаў мовы, якія прытрымліваюцца аналагічных поглядаў (І.К. Біладзід, Е.М. Маркоўскі, Г.А. Леўчанка, М. Лесёў, А.А. Маскаленка, М.А. Жаўтобрух), і крытыкуе тых навукоўцаў (у тым ліку беларускіх), якія канстатуюць разрыў літаратурна-моўных традыцый паміж старым і новым перыядамі развіцця украінскай і беларускай мовы, бо *«такой кваліфікацыі пярэчыць сам факт гістарычна трывалага ўзаемадзеяння кніжнага і народнага кампанентаў у новую эпоху і яшчэ ў большай ступені ў даўнюю; яна не пацвярджаецца таксама аналізам адпаведнага матэрыялу*"; "*…тэзіс пра разрыў* [моўных традыцый – *І. Г.*] *… вынікаў з пэўнага ігнаравання*

пытанняў пераходу ад старой да новай украінскай літаратурнай мовы, а таксама з неадэкватнага іх асвятлення» [10, с. 14–15].

Аналагічным чынам выказваецца ўкраінскі лінгвіст М. А. Жаўтобрух: *«Адмаўленне пераемнасці, арганічнай сувязі паміж старой і новай украінскай літаратурнай мовай грунтуецца, відавочна, на аднабаковым асвятленні тых працэсаў, што адбываліся ў літаратурна-моўным жыцці Украіны свайго часу»* [5, с. 27]. Ён таксама называе тэзіс пра суцэльны заняпад у другой палове XVIII ст. традыцый стараўкраінскай літаратурнай мовы зусім не абгрунтаваным, і ўказвае, што ён вымагае поўнага перагляду. На яго думку, нягледзячы на заняпад у гэты час *«важных для стараўкраінскай мовы структурна-функцыянальных стыляў, … сама мова не прыпыніла тады свайго існавання, не выйшла з ужытку, не перастала абслугоўваць грамадскае жыццё ўкраінскага народу, задавальняючы яго, няхай і абмежаваныя, грамадскія патрэбы. А яе структурна-функцыянальныя стылі, звязаныя з развіццём свецкай літаратуры, не толькі не заняпалі, не звузілі сферу свайго выкарыстання, а, наадварот, актывізаваліся»*. Менавіта з гэтых стыляў пачынаецца новы этап гісторыі ўкраінскай мовы. У развіцці іншых стыляў *«не было поўнай і непасрэднай пераемнасці, хоць жыццяздольныя элементы гэтых стыляў, асабліва гісторыка-летапіснага жанру, таксама арганічна трансфармаваліся і ў новай украінскай літаратурнай мове»* [5, с. 36, 40].

Адмаўленне факта пераемнасці ва ўкраінскім мовазнаўстве канца XX ст. фіксуецца ў адзінкавых працах. М. А. Жаўтобрух указвае, што такіх поглядаў прытрымліваюцца Ф. Т. Жылко, П. Моўчан, Л. Л. Гумецка, М. І. Талстой [5, с. 27]. Расійскі лінгвіст М.І. Талстой, напрыклад, разважаючы пра так званыя славянскія рэгіянальныя мовы ў сучасны і данацыянальны перыяд, уключае ўкраінскую мову ў шэраг моў, у якіх адсутнічае даўняя пісьмовая традыцыя [14, с. 15-16]. Падобнага пункту погляду прытрымліваецца і расійскі славіст У.К. Жураўлёў [6, с. 83]. А Ф.Т. Жылко ўказвае, што на тэрыторыі Усходняй Украіны ў канцы XVIII ст. узнікла новая літаратурная мова ў выніку змены дыялектнай базы (з паўднёва-заходняй на паўднёва-ўсходнюю). На заходніх жа (галіцкіх) землях традыцыя стараўкраінскай мовы, на яго думку, увогуле не перарывалася, хоць тая мадыфікацыя стараўкраінскай мовы, якая там склалася (так званае “язычые”), было змешаным і ў многім штучным моўным утварэннем [4, с. 107-108].

Такім чынам, большасць украінскіх мовазнаўцаў другой паловы XX ст. сведчаць заняпад старой украінскай літаратурнай мовы і прынцыповыя адрозненні яе моўнай канцэпцыі ад новай літаратурнай мовы. Але гэтыя факты ацэньваюцца як цалкам натуральныя і несупярэчлівыя тэзісу аб неперарыўным працэсе моўнага развіцця. Зародкі новай формы, а менавіта элементы жывой мовы, выяўляюцца ўжо ў старажытны перыяд, а сама

народна-размоўная мова разглядаецца як мосцік, як павязуючы ланцужок двух розных этапаў моўнай гісторыі.

Пытанне пераемнай сувязі застаецца актуальным ва ўкраінскай лінгвістыцы і ў пазнейшы час. Украінскія моваведы ў працах апошніх дзесяцігоддзяў сцвярджаюць, што гэтая праблема не можа лічыцца канчаткова вырашанай і звяртаюць увагу на новыя яе аспекты.

Так, Л.Т. Масенка указвае, што дыскусія адносна характару ўзаемаадносін старой і новай украінскай мовы патрабуе працягу. Вырашэнне гэтага пытання, на думку даследчыцы, магчымае толькі з улікам усіх абставін моўна-культурнай сітуацыі на Украіне XVIII – пачатку XIX ст. Асабліва неабходным бачыцца вызначэнне *«характэрнага для таго часу грамадскага ўсведамлення і ўспрыняцця паняццяў «пісьмовая мова» і «кніжная мова», з аднаго боку, і паняццяў «вуснае маўленне» і «размоўнае маўленне», з другога, а таксама характару іх узаемаадносін…»* [9, с. 41]. У прыватнасці, істотна тое, ці знаходзіліся ўказаныя паняцці ў жорсткай апазіцыі паміж сабой, ці ўсё ж паміж імі былі пэўныя кропкі сутыкнення. Вельмі важным пры аналізе спецыфікі міжстадыйнай моўнай сувязі Л.Т. Масенка лічыць таксама кваліфікацыю пісьмовых помнікаў новага часу і прапануе выразна адрозніваць літаратурна апрацаваныя тэксты ад звычайных запісаў вуснай народнай творчасці [9, с. 43–44].

Праблеме лінейнасці развіцця ўкраінскай і беларускай моў грунтоўны артыкул прысвяціў вядомы ўкраінскі беларусіст А.І. Скапненка, асвятляючы яе шляхам параўнання беларускай і ўкраінскай моўнай сітуацыі. На думку даследчыка, крытэрыі для вызначэння характару ўзаемасувязі паміж старымі і новымі моўнымі ідыёмамі, а таксама дакладная методыка аналізу механізмаў пераемнасці яшчэ не ўстаноўлены. Увогуле тэорыя моўнага пераходу патрабуе комплекснага падыходу: і сацыякультурнага, і ўласна лінгвістычнага. Вялікае значэнне маюць таксама факты моўнай свядомасці ўдзельнікаў тых працэсаў, якіх падлягаюць ацэнцы. Калі ёсць магчымасць атрымаць сведчанні аб характары пераемнасці фактычных сучаснікаў працэсу пераходу ад адной моўнай стадыі да другой (напрыклад, такія, як вядомае выказванне беларускага пісьменніка Ф. Багушэвіча, які зусім недвухсэнсоўна ўказвае, што паводле адчуванняў носьбіта беларускай мовы XIX ст. старая пісьмовая мова цалкам зразумелая, а помнікі на ёй “як бы вот цяпер пісаліся”), то такія звесткі з’яўляюцца найкаштоўнейшымі аргументамі. Аб’ектыўнае ўяўленне пра моўныя традыцыі, як лічыць А.І. Скапненка, неабходна фарміраваць не апрыёрна, а на аснове аналізу пісьмовых крыніц таго часу, які знаходзіцца на стадыйнай мяжы. У сітуацыі з беларускай мовай гэта зрабіць праблематычна, паколькі на сённяшні дзень вядомая вельмі малая колькасць беларускамоўных тэкстаў XVIII – пачатку XIX ст. [13, с. 67-70]. Адпаведна навуковай задачай велізарнай значнасці ў беларускай гістарычнай

лінгвістыцы становіцца пошук і навуковае апісанне тагачасных помнікаў пісьменства.

У цэлым праведзены агляд розных розных аспектаў пытання моўнай пераемнасці ў гісторыі ўкраінскай літаратурнай мовы паказаў, што пры яго вырашэнні шэраг лінгвістычных стэрэатыпаў і традыцыйных метадалагічных падыходаў патрабуюць дадатковай ацэнкі. Для беларускіх гісторыкаў мовы вопыт украінскіх калег па навуковым аналізе філіяцыйнай праблемы можа аказацца надзвычай каштоўным.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Бойчук М.К.* Про періодизацію історії української літературної мови // Питання історичного розвитку української мови : тези доп. міжвуз. наук. конф., Харків, 15–20 груд. 1959 р. / Харків. держ. ун-т. Харків, 1959. С. 81–86.
2. *Гапоненка І. А.* Моўная пераемнасць : ад старабеларускага да адраджэнскага перыяду XIX-пачатку XX стагоддзя // Мова – Літаратура – Культура. Матэрыялы VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 28–29 кастрычніка 2010 г.). У дзвюх частках. Частка 1. Мінск, 2011. С. 49–55.
3. *Дурнаво Н.Н.* Введение в историю русского языка. М. : Наука, 1969. (перавыданне манаграфіі 1927 г.). [Электронны рэсурс]. URL: https://imwerden.de/pdf/durnovo_vvedenie_v_istoriyu_russkogo_yazyka_1969__ocr.pdf (дата звароту: 26. 09. 2020).
4. *Жилко Ф.Т.* Некоторые особенности развития украинского национального языка // Вопросы образования восточнославянских литературных языков. М. : изд-во Академии наук СССР, 1962. С. 102–109.
5. *Жовтобрюх М.А.* Давні традиції в новій українській літературній мові // Мовознавство. 1970. № 2. С. 27–40.
6. *Журавлев В.К.* Развитие народного образования на родном и русском языке в Белоруссии и на Украине (дооктябрьский период) // Национальный язык и национальная культура. М. : Наука, 1978. С. 63–107.
7. *Жураўскі А.І.* Важнейшыя адрозненні новай і старой беларускай літаратурнай мовай / А.І. Жураўскі, І.І. Крамко // Жывая спадчына / уклад.: Т.В. Кузьмянкова [і інш.]; пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1992. С. 106–129.
8. Історія українського правопису: XVI–XX століття / Нац. акад. наук України, Ін-т укр. мови ; упоряд.: В.В. Німчук, Н.В. Пуряєва. Київ : Наук. думка, 2004. 581 с.
9. *Масенко Л.Т.* До проблеми спадкоємності старої писемноїтрадиції в новій українській літературній мові // Мовознавство. 1995. № 4–5. С. 39–45.
10. *Передрієнко В.А.* Формування української літературної мови XVIII ст. на народній основі. Київ : Наук. думка, 1979. 143 с.
11. *Плющ П.П.* Історія української літературної мови. Київ : Вища шк., 1971. 423 с.
12. *Русанівський В.М.* Джерела розвитку східнослов'янських мов. Київ : Наук. думка, 1985. 231 с.
13. *Скопненко О.І.* Проблема наступності між старобілоруською та новою білоруською літературними мовами крізь призму нової української літературної мови // Мовознавство. 2015. № 2. С. 64–76.
14. *Толстой Н.И.* Славянские региональные литературные языки и их функции в современный и донациональный период // Славянские литературные языки в донациональный период (тезисы докладов). М. : Институт славяноведения и балканистики АН СССР, 1969. С. 14–16.

15. *Bieder H.* Розвиток української і білоруської літературних мов в XIX–XX ст.: конвергентні і дивергентні процеси // Studia Russica / Будапешт. ун-т. Будапешт, 2005. Т. 22. С. 82–88.

СЛОВАЎТВАРЭННЕ АД АСНОЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ ІНШАМОЎНАГА ПАХОДЖАННЯ

М. У. Гуль

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна,
бульвар Касманаўтаў, 21, 224016, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь,
boxformail35@mail.ru

Разглядаецца словаўтварэнне назоўнікаў ад іншамоўных дзеясловаў у межах навуковай (філасофска-сацыялагічнай, філалагічнай, псіхолага-педагагічнай, матэматычнай) і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі. Вылучаны найбольш пашыраныя мадэлі: *V + -нн-е, V + -ацыj-а, V + -оўк-а, V + -атар*; апісаны асаблівасці рэалізацыі гэтых мадэлей у розных тэрмінасістэмах. Пры ўтварэнні назваў адцягненага дзеяння таксама ўжываюцца менш прадуктыўныя мадэлі *V + аж; V + -арый*. З генетычнага пункту гледжання найбольш актыўнымі ў працэсах словаўтварэння выяўляюцца дзеясловы грэка-лацінскага і французскага паходжання.

Ключавыя словы: аддзеяслоўны субстантыў; дзеясловы іншамоўнага паходжання; мадэль; тэрмін; фармант.

Запазычванне з’яўляецца адной з неабходных умоў для развіцця лексічнай сістэмы мовы. На погляд А. К. Казкенавай, запазычванне стымулюе працэсы словаўтварэння, але ў сваю чаргу і актыўнае словаўтварэнне патрабуе інтэнсіўнага папаўнення слоўнікавага складу новымі невытворнымі словамі [2, с. 127]. Утварэнне вытворных слоў ад іншамоўных асноў пацвярджае неабходнасць запазычвання ў мове і з’яўляецца чарговым этапам уваходжання запазычання ў новае моўнае асяроддзе. Дэрывацыйны патэнцыял запазычанняў тлумачыцца як пазамоўнымі (актуальнасць паняццяў, якія абазначаюцца запазычаннямі), так і ўнутрымоўнымі прычынамі (невытворнасць запазычанняў). Ступень граматычнага засваення з’яўляецца не менш важным лінгвістычным фактарам. Запазычанні, якія не былі поўнасцю засвоены ў граматычным плане, маюць некаторыя асаблівасці пры ўключэнні ў працэсы словаўтварэння (напрыклад, неабходнасць інтэрфіксацыі: *рэле → рэлейны*; трансфармацыя фінальнай часткі асновы: *паліто → пальцечка*; актыўны ўдзел у кампазіцыі: *кіно → кінафільм, канаакцёр* і інш.).

Здольнасць іншамоўных адзінак утвараць новыя словы з’яўляецца аднім з найважнейшых крытэрыяў засвоенасці. Шэраг новых слоў, утвораных ад іншамоўных дзеясловаў, з’яўляецца паказчыкам іх актыўнасці і дэрывацыйнага патэнцыялу. У гэтым артыкуле разглядаецца словаўтварэнне назоўнікаў ад іншамоўных дзеясловаў у межах навуковай

(філасофска-сацыялагічнай, філалагічнай, псіхолага-педагагічнай, матэматычнай) і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі.

Утварэнне аддзеяслоўных субстантываў пры дапамозе фарманта -нн-е. Фармант -нн-е далучаецца да асновы інфінітыва з захаваннем фінальнага галоснага (V. незак. → N. неадуш. н.). У тэрміналогіі **сацыялогіі і філасофіі** ад асноў іншамоўных дзеясловаў такім спосабам утвараюцца шматлікія назоўнікі: *лідзіраваць → лідзіраванне* (ад асноў англійскага паходжання); *гіпастазаваць → гіпастазаванне*, *прагназаваць → прагназаванне*, *філасаваць → філасафаванне, філасофствацьваць → філасофствацьваванне* (ад асноў грэчаскага паходжання); *абстрагаваць → абстрагаванне*, *рэфлектаваць → рэфлектаванне*, *стымуляваць → стымуляванне*, *суб'ектывіраваць → суб'ектывіраванне* (ад асноў лацінскага паходжання); *дэкласаваць → дэкласаванне*, *мадэляваць → мадэляванне* (ад асноў французскага паходжання). **Філалагічныя** тэрміны-назоўнікі даволі актыўна ўтвараюцца ад асноў іншамоўных дзясловаў пры дапамозе фарманта **-нн-е:** *акцэнтаваць → акцэнтаванне*, *рэдагаваць → рэдагаванне*, *транскрыбіраваць → транскрыбіраванне* (ад асноў лацінскага паходжання); *сінкапіраваць → сінкапіраванне* (ад асноў грэчаскага паходжання); *калькаваць → калькаванне*, *мадэліраваць → мадэліраванне* (ад асноў французскага паходжання). Для **псіхолага-педагагічных** тэрмінаў таксама характэрная гэтая мадэль: *анкетаваць → анкетаванне, канспектаваць → канспектаванне, канструяваць → канструяванне, мадэляваць → мадэляванне, маніпуляваць → маніпуляванне, маралізаваць → маралізаванне, ранжыраваць → ранжыраванне* (ад асноў французскага паходжання), *тэсціраваць → тэсціраванне* (ад асноў англійскага паходжання), *шкалаваць → шкалаванне* (ад асноў лацінскага паходжання). Гэтая мадэль дастаткова распаўсюджаная і ў **матэматычнай** тэрміналогіі: *дыферэнцыраваць → дыферэнцыраванне, інтэграваць → інтэграванне, транспанаваць → транспанаванне* (ад асноў лацінскага паходжання); *сіметраваць → сіметраванне* (ад асноў грэчаскага паходжання). У тэрміналагічнай лексіцы субстантывы з гэтым фармантам галоўным чынам маюць значэнне апрадмечанага дзеяння (*лідзіраванне, рэфлектаванне*). Акрамя таго, назоўнікі гэтага тыпу могуць абазначаць сродак ажыццяўлення дзеяння (*тэсціраванне* – сродак праверкі ведаў).

У **навукова-тэхнічнай** тэрміналогіі фармант **-нн-е** з'яўляецца самым прадуктыўным ва ўтварэнні тэрмінаў са значэннем працэсаў [3, с. 76]: *глісіраваць → глісіраванне, манеўраваць → манеўраванне, рэверсаваць → рэверсаванне, фарсіраваць → фарсіраванне* (ад асноў французскага паходжання), *праектаваць → праектаванне, факусіраваць → факусіраванне, фармаваць → фармаванне* (ад асноў лацінскага паходжання); *фальцаваць → фальцаванне* (ад асноў нямецкага паходжання); *швартаваць → швартаванне* (ад асноў галандскага паходжання).

Утварэнне аддзеяслоўных субстантываў пры дапамозе фарманта -ацыj-а. Назоўнікі з фармантам **-ацыj-а (**і яго варынтамі), утвораныя ад дзеясловаў, абазначаюць пераважна адцягненае дзеянне (V. незак. → N. неадуш. ж.). У якасці ўтваральных выступаюць дзеясловы на ***-аваць***: *ідэнтыфікаваць → ідэнтыфікацыя*, *матываваць → матывацыя*; ***-ізаваць/-ызаваць***: *лібералізаваць → лібералізацыя*, *маргіналізаваць → маргіналізацыя, папулярызаваць → папулярызацыя* (ад асноў французскага паходжання); *вульгарызаваць → вульгарызацыя*, *інстытуцыяналізаваць → інстытуцыяналізацыя*, *пралетарызаваць → пралетарызацыя*, *сакралізаваць → сакралізацыя*, *субстанцыялізаваць → субстанцыялізацыя*, *фемінізаваць → фемінізацыя* (ад асноў лацінскага паходжання); *люмпенізаваць → люмпенізацыя* (ад асноў нямецкага паходжання); *фашызаваць → фашызацыя* (ад асноў італьянскага паходжання); *вестэрнізаваць → вестэрнізацыя* (ад асноў англійскага паходжання, усе прыклады з **філасофска-сацыялагічнай** тэрміналогіі). У **філалагічнай** тэрміналогіі таксама адбываецца ўтварэнне назоўнікаў пры дапамозе фарманта **-ацыj-а** ад асноў іншамоўных дзеясловаў: *лексікалізаваць → лексікалізацыя, метафарызаваць → метафарызацыя* (ад асноў грэчаскага паходжання); *нейтралізаваць → нейтралізацыя, палаталізаваць → палаталізацыя* (ад асноў лацінскага паходжання); *тэрміналагізаваць → тэрміналагізацыя* (ад асноў грэка-лацінскага паходжання). У **псіхолага-педагагічнай** тэрміналогіі зафіксаваны асобныя адзінкі з фармантам **-ацыj-а:** *вербалізаваць → вербалізацыя, індывідуалізаваць → індывідуалізацыя, інтэрыязаваць → інтэрыярызацыя, персаналізаваць → персаналізацыя, шпіталізаваць → шпіталізацыя* (ад асноў лацінскага паходжання); *гіпнатызаваць → гіпнатызацыя* (ад асноў грэчаскага паходжання), як і ў **матэматычнай**: *нумараваць → нумарацыя, палярызаваць → палярызацыя* (ад асноў грэка-лацінскага паходжання). Фармант **-ацыj-а** ўжываецца і пры ўтварэнні **навукова-тэхнічных** тэрмінаў: *дыслацыраваць → дыслакацыя, утылізаваць → утылізацыя, фільтраваць → фільтрацыя* (ад асноў лацінскага паходжання), *электрыфікаваць → электрыфікацыя* (ад асноў французскага паходжання).

Утварэнне аддзеяслоўных субстантываў пры дапамозе фарманта -оўк-а. Ад асноў іншамоўных дзеясловаў утвараюцца субстантывы з фармантам **-оўк-а** (V. незак. → N. неадуш. ж.). У **псіхолага-педагагічнай**, **філасофска-сацыялагічнай, матэматычнай** і **філалагінай** тэрміналогіях паводле гэтай мадэлі ўтвараюцца назвы абстрактных паняццяў: *арыентаваць → арыентоўка* (ад асноў нямецкага паходжання), *інсцэніраваць → інсцэніроўка*, *скандаваць → скандоўка* (ад асноў лацінскага паходжання); *рыфмаваць → рыфмоўка* (ад асноў грэчаскага паходжання); *матывіраваць → матывіроўка* (ад асноў французскага паходжання). Фармант **-оўк-а** выяўляецца больш прадуктыўным у **навукова-тэхнічнай** тэрміналогіі: *арміраваць →*

арміроўка, факусіраваць → факусіроўка, фармаваць → фармоўка, фарміраваць → фарміроўка (ад асноў лацінскага паходжання), *балансіраваць → балансіроўка, фарсіраваць → фарсіроўка, фрэзераваць → фрезероўка* (ад асноў французскага паходжання), *блакіраваць → блакіроўка, фальцаваць → фальцоўка* (ад асноў нямецкага паходжання).

У навукова-тэхнічнай тэрміналогіі пры працэсуальнай намінацыі ўсюды, дзе гэта практычна магчыма, паралельна з формай на -оўк-а суіснуе форма з -нн-е: *буксіроўка = буксіраванне, бункероўка = бункераванне, фальцоўка = фальцаванне*. Такія намінанты могуць быць словаўтваральнымі дублетамі, а могуць выяўляць семантычнае разыходжанне па суаднесенасці да розных катэгорый – дзеянне або сродак яго ажыццяўлення [3, с. 75–76].

Утварэнне аддзеяслоўных субстантываў пры дапамозе фарманта -атар. Назоўнікі з гэтым фармантам маюць агульнае значэнне ‘прадмет – утваральнік дзеяння ці прызначаны для яго ажыццяўлення’ [1, с. 232]. Сюды адносяцца назвы асоб паводле іх дзейнасці (V незак. → N адуш. м.): *эксперыментаваць → эксперыментатар* (ад асноў лацінскага паходжання), *эксплуатаваць → эксплуататар* (ад асноў французскага паходжання). У **навукова-тэхнічнай** тэрміналогіі словы, утвораныя па гэтай мадэлі, абазначаюць назвы механізмаў, прыбораў, прылад працы, якія служаць для ажыццяўлення дзеяння, названага ўтваральным словам (V незак. → N неадуш. м.): *акумуліраваць → акумулятар, вентыліраваць → вентылятар, вібрыраваць → вібратар, кандэнсіраваць → кандэнсатар* (ад асноў лацінскага паходжання)*, рэзаніраваць → рэзанатар* (ад асноў французскага паходжання).

У навуковай і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі пры ўтварэнні назваў адцягненнага дзеяння ўжываюцца наступныя мадэлі: 1) утварэнне аддзеяслоўных субстантываў пры дапамозе фарманта -аж назва адцягненага дзеяння (V незак. → N неадуш. м.) *інструктаваць → інструктаж* (ад асноў лацінскага паходжання), *пілаціраваць → пілатаж* (ад асноў французскага паходжання); 2) утварэнне аддзеяслоўных субстантываў пры дапамозе фарманта -арый (V незак. → N неадуш. м.) *каментаваць → каментарый* (ад асноў лацінскага паходжання). Неабходна заўважыць, што ў вытворных словах (па першай мадэлі) суфікс -ірава- адсутнічае і парна-мяккія зычныя чаргуюцца з цвёрдымі: *пілаціраваць → пілатаж*;

Такім чынам, у даследаванай тэрміналогіі дзеясловы іншамоўнага паходжання з’яўляюцца базай для ўтварэння назоўнікаў суфіксальным спосабам па некалькіх мадэлях, з якіх найбольш рэпрезентаваны прыкладамі V + -нн-е (вытворныя словы маюць значэнне апрадмечанага дзеяння); V + -ацыj-а (вытворныя словы абазначаюць пераважна адцягненае дзеянне). Мадэль V + -оўк-а больш пашырана ў навукова-тэхнічнай тэрміналогіі, дзе словы, утвораныя па гэтай мадэлі, часта суіснуюць з формай з -нн-е: *фальцоўка = фальцаванне* (вытворныя словы абазначаюць

дзеянне або сродак яго ажыццяўлення). Назоўнікі з фармантам -атар маюць агульнае значэнне ‘прадмет – утваральнік дзеяння ці прызначаны для яго ажыццяўлення’, а таксама значэнне ‘дзеючая асоба’; у навукова-тэхнічнай тэрміналогіі – ‘механізм, прыбор, прылада працы’. Пры ўтварэнні назваў адцягненнага дзеяння ўжываюцца мадэлі V + аж; V + -арый. З генетычнага пункту гледжання найбольш актыўнымі ў працэсах словаўтварэння выяўляюцца дзеясловы грэка-лацінскага і французскага паходжання.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларуская граматыка : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. Мінск : Навука і тэхніка, 1985. Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. 431 с.
2. *Казкенова А. К.* Онтология заимствованного слова: монография. М. : ФЛИНТА : Наука, 2013. 248 с.
3. *Мінакова Л. М.* Беларуская навукова-тэхнічная тэрміналогія: фарміраванне, функцыянаванне, склад / Л. М. Мінакова, С. М. Аніськова, А. А. Станкевіч ; М-ва адукацыі Рэп. Беларусь, ГДУ імя Ф. Скарыны. Гомель : ГДУ, 2004. 146 с.

АКТУЛІЗАЦЫЯ ФАКТЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКЦЫІ Ў МАСТАЦКІХ ТВОРАХ В. ІПАТАВАЙ І Л. РУБЛЕЎСКАЙ

В. П. Дзігадзюк

Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І.П. Шамякіна,
вул. Новая, 22, 247760, г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь,
Valya.digadyuk@mail.ru

Навуковы кіраўнік: *Чайка Наталля Уладзіміраўна, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі УА БДПУ імя М. Танка, доктар, прафесар*

Артыкул прысвечаны даследаванню тэкставай катэгорыі рэтраспекцыі на матэрыяле беларускай мастацкай прозы. Аналізуюцца сродкі рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставага віду дыскантынуума на ўзроўні лексемы, сказу і звышфразавага адзінства. Адзначаецца спецыфіка і механізмы іх функцыянавання ў мастацкіх тэкстах пісьменнікаў. Вызначаны адносіны, на аснове якіх ажыццяўляецца пераход у рэтраспектыўную часавую прастору – прычыны, прамой актуалізацыі мінулых падзей, удакладняльна-тлумачальныя адносіны.

Ключавыя словы: катэгорыя рэтраспекцыі; кампазіцыйна-тэкставая рэтраспекцыя; рэтраспектыўныя адносіны; дыскантынуум; экспліцытныя сродкі.

Адным з найбольш дыскусійных пытанняў у сучаснай лінгвістыцы з’яўляецца даследаванне тэксту, яго асаблівасцей і катэгорый. Наяўнасць колькасці тэкставых катэгорый з’яўляецца спрэчным, што залежыць ад падыходу даследчыка да іх вызначэння. І. Р. Гальперын [1], М. М. Кожына [2], Т. В. Мацвеева [3] і інш. лінгвісты разглядаюць тэкставыя катэгорыі ў аспекце тыпалагічных прыкмет тэксту, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні

яго семантычнай структуры. Аднак гэтае пытанне застаецца актуальным на сённяшні дзень і патрабуе больш дэталёвага вывучэння.

Катэгорыя *рэтраспекцыя* ўпершыню была вылучана І. Р. Гальперыным [1], пасля чаго больш грунтоўна даследавана Л. М. Фёдаравай [4], Н. У. Брусковай [5], І. У. Ціўяевай [6] на матэрыяле мастацкай англійскай і нямецкай літаратуры. Адсутнасць даследаванняў гэтай катэгорыі ў беларускім мовазнаўстве прадвызначае актуальнасць праблемы.

Кампазіцыйна-тэкставы від рэтраспекцыі, які характарызуецца парушэннем часавай паслядоўнасці падзей з мэтай увядзення новай інфармацыі, актуалізуецца на ўзроўні слова, сказу, звышфразавай адзінкі (ЗФА), на аснове адносін прамой актуалізацыі мінулых падзей, прычыны, удакладняльна-тлумачальных адносін.

Непаслядоўнасць у выкладанні падзей у мастацкім часе эксплікуецца моўнымі і тэкстуальнымі сродкамі, якія дапаўняюць адзін другога. Зрух у часавым кантынууме можа адбывацца прама пры дапамозе асобай семантыкі лексем, якая здольная актуалізаваць пераход у мінулае.

Шырока прадстаўлена група, якая ўваходзіць у склад сродкаў рэпрэзентацыі даследуемай катэгорыі – лексічныя адзінкі рэтраспектыўнага значэння з выражанай экспліцытнай семантыкай. Сюды адносяцца словы з семай «памяць». Найбольш распаўсюджанымі з’яўляюцца дзеясловы: *помніць, успамінаць, забыць, згадаць, прыпомніць, забыцца* і г. д. *Удава Катуніха? Напружваючы памяць,* ***успомніў*** *удаву і малое, што бегала за ёю. Няўжо гэта яна, закецаная, хваравітая дзяўчынка?* (В. Іпатава).

Неабходна адзначыць, што такія адзінкі звычайна ініцыююць рэтраспектыўныя ЗФА: *Многія са старэйшага пакалення, гледзячы на яе,* ***успаміналі*** *вяселле першай тады прыгажуні пры кракаўскім двары з князем Ілюком Астрожскім якраз на другі дзень пасля таго, як дачка старога Жыгімонта павянчалася з вялікім князем сямігародскім і будучым каралем Сігізмундам Аўгустам, стаяў на тым вяселлі каралеўскай дачкі князь Іллюк, чые вяселле адзначылі амаль гэтак жа пышна, як і папярэдняе…* (В. Іпатава). У такіх тэкстаструктурах звычайна змяшчаюцца лексіка-граматычныя сродкі, якія з’яўляюцца дадатковымі да здзяйснення звароту да мінулага.

Часцей за астатнія назіраецца ўжыванне дзеяслова *помніць* і яго сіноніма *успамінаць, прыпамінаць, напомніць* і г. д. Змена часавага плану адбываецца экспліцытна пры дапамозе семантычна рэтраспектыўнага характару адзінкі: *– Са мной Магдаліна, мая нявеста. Дзядуля, ты яе* ***памятаеш****. Мы прыходзілі да цябе зімой. Адчыняй* (Л. Рублеўская). Сустракаюцца лексемы рэтраспектыўнай семантыкі – *памяць, успамін, думкі* і г. д.

У якасці паказчыка дыскантынуума выкарыстоўваюцца словы разумовай дзейнасці са значэннем *‘уяўляць’*. Семантыка такіх адзінак цесна звязана з памяццю: тое, што ўзнікае ў думках на аснове ўспрымання якіх-

небудзь падзей, дзеянняў у прошлым. *Але **жыла з учарашняга дня** ў ёй нейкая незразумелая трывога. **Усплывалі ў вачах** залацістыя валасы, загарэлы разумны лоб – адкуль ён узяўся ў смерда?* (В. Іпатава). Аднак трэба адзначыць, што такая група слоў не заўсёды мае выразную семантыку рэтраспектыўнасці, але пад уплывам сюжэту змяняецца часавае месцазнаходжанне: ***Уяўленне паслужліва намалявала сцэну** таемнага спаткання пад старым дубам, няўдалае выкраданне нявесты, дуэльныя пісталеты ды іншае сентыментальна-рамантычнае шалупінне* (Л. Рублеўская). У дадзеных выпадках рэтраспектыўнасць мае быць, так як размова пра падзеі, якія ўяўляюцца персанажамі, ужо вялася.

Неабходна адзначыць, што словы семантыкі мінулага ў пераважнасці знаходзяцца ў пачатку рэтраспектыўнай тэкстаструктуры, радзей у канцы ЗФА або фрагмента тэксту. Іншы раз у звышфразавых адзінках адбываецца паўтор аднаго і таго ж паказчыка мінулага.

Перарыў у кантынууме апавядання назіраецца, калі рэтраспектыўная частка з'яўляецца прычынай здзяйснення або не рэалізацыі падзей, дзеянняў асноўнай лініі сюжэта. Сродкі рэпрэзентацыі катэгорыі дыскантынуума з адносінамі прычыны вызначаюцца на розных узроўнях – лексіка-граматычным, сінтаксічным.

Маркерам мінулых падзей у адносінах да папярэдняга выказвання на аснове значэння прычыны выступае іменная група **назоўнік + *назад, таму:*** *І яшчэ дзівілася**: два дні назад** не ведала яго, не помніла аб хлопчыку з Нясвіжа, а сёння як быццам і жыць без яго не можа? Хіба такое можа быць? Адкуль усё бярэцца?!* (В. Іпатава); **прыслоўі часу**: *– Ну, па-першае, калі **ўжо** ты **ўпершыню за два гады** зрабіў мне такую ласку, што загаварыў са мною, то я падазраю, гэта не без уплыву тваёй навукоўкі* **(**Л. Рублеўская.); **аказіянальныя маркеры:** *Пятрок з асаблівай радасцю прывітаў Еўку – яшчэ **з даўніх наездаў** князя ў замак прыглянулася яму ружовашчокая, з глыбокім поглядам цёмна-сініх вачэй і доўгай русявай касой дзяўчына* (В. Іпатава).

У складаназалежных сказах з даданай прычыны дыскантынуум, які суадносіцца з адносным часам, раскрывае прычыну здзяйснення або нездзяйснення дзеяння, якое выражана ў галоўнай частцы: *І з тым наказам памчаўся на Вадзяную вуліцу пасаднік Лось, а праз нейкі час ён прывёз дзяўчыну, але ў падранай сарочцы і з распушчанымі валасамі, **таму што удава Катуніха не толькі не аддала пасадніку грыўню, але абазвала яго ўсялякімі словамі і плюнула ў твар, а дзяўчына вырывалася ад яго і не жадала слухаць ніякіх загадаў, хаця і паслаў за ёй сам вялікі князь*** (В. Іпатава).

Дыскантынуум апавядання можа адбывацца ў камбінаваных складаных сказах згрупаванай структуры ў спалучэнні бяззлучнікавай і падпарадкавальнай сувязі. Бяззлучнікавая сувязь з'яўляецца дамінантнай, што і вызначае сэнсавыя адносіны паміж прэдыкатыўнымі блокамі –

прычынна-выніковыя: *Па Полацку папаўзлі чуткі, што Усяслаў – князь, мацнейшы за епіскапа:* ***іменна ён выгнаў быццам бы чорта з унучкі славутага Ірвідуба*** (В. Іпатава). Значэнне прычыны можа перадавацца пры наяўнасці мадальных дзеясловаў прошлага часу: *Магдаліна ажно пачырванела ад сораму – як яна* ***магла забыцца*** *пра птушку?* (Л. Рублеўская).

Паказчыкам адносін прычыны выступае сінтаксічная канструкцыя – **парцэляцыя.** У дадзеным выпадку ўказваецца прычына таго, аб чым гаворыцца ў асноўным кампаненце: *Вельмі хачу намаляваць мокрага п'янага янота, які круціцца на поручні, як стрыптызёрка на шосце. Не наважваюся.* ***Напалоханая я, спадарства. Адбілі ахвоту сцябацца*** (Л. Рублеўская).

Рэалізацыя катэгорыі дыскантынуума можа быць абумоўлена **логіка-граматычнымі фактарамі** і выражацца імпліцытна. Выяўлена, што азначаемая адзінка мае рэтраспектыўную спасылку ў выніку прычынных і прычынна-выніковых адносін. Маркер можа знаходзіцца ў прэпазіцыі да залежнай тэкстаструктуры: *Праз грыдніцу праходзячы, Прадыслава яшчэ раз блаславі́ла бацькава* ***паляванне****: змарыўшыся, грыдні спалі, нават добра не павячэраўшы.* (В. Іпатава) і ў постапазіцыі: *– А на паперы, я ж сказаў, цана спецыяльная. – Вочы Цяпы таксама не натуральна блішчэлі.* ***Відаць, «траўкі» Сева прынёс…*** (Л. Рублеўская).

Рэтраспектыўны пераход з тлумачальнымі адносінамі адбываецца спосабам удакладнення, канкрэтызацыі падзеі, звестак асноўнага плана апавядання. Сродкамі актуалізацыі прасторы мінулага ў кантынууме апавядання выступаюць розныя лексіка-граматычныя адзінкі.

Часта ў якасці паказчыка значэння выкарыстоўваюцца розныя іменныя групы, суадносныя з акалічнасцямі часу. Да такіх адзінак адносяцца **іменныя групы назоўнік + прыназоўнік** са значэннем пэўных узроставых перыядаў: *А там – прапахлы лекамі апошні прыпынак чалавечае дарогі, якая* ***са скрыжавання юнацтва*** *бачыцца бясконцай і прывабна таямнічай, і нельга нават падумаць, што калісьці давядзецца апынуцца на такім жа сумным прыпынку* (Л. Рублеўская); **назоўнік + прыметнік:** *Утульна я адчуваю сябе толькі ў мастакоўскіх майстэрнях – там, дзе састаўленыя ўздоўж сцен кераміка і палотны, дзе на паліцах аскепкі невядомых пасудзін і дзівосныя букеты з сухіх кветак і птушыных пёраў… Дзе можна знайсці зусім нечаканыя прадметы – ад чалавечага чэрапа да ліхтара, з якім* ***у мінулым стагоддзі*** *абходчык чыгункі сустракаў цягнік…* (Л. Рублеўская); **назоўнік +** ***назад, таму*****:** *– Значыць, выпадак… А як вы патлумачыце, што ваш падапечны,* ***які памёр тры дні таму****, зрабіў вас сваёй адзінай спадчынніцай?* (Л. Рублеўская).

Рэтраспектыўнасць падзей з удакладняльна-тлумачальнымі адносінамі можа рэалізоўвацца і з дапамогай **прыслоўяў часу, прыслоўных выразаў** ***некалі, калісьці, аднойчы,*** **прыметнікаў часу.** Так, у наступнай

тэкстаструктуры: *Ля самага выхаду балявалі татары, якія* ***напярэдадні*** *вартавалі палоннага князя. Чырвоныя, вясёлыя, яны кідалі косці, голасна рагаталі* (В. Іпатава) з дапамогай прыслоўя часу адбываецца зрух у мінулую прастору, інфармацыя якой удакладняе, тлумачыць падзеі сюжэта.

Крок назад у паслядоўным разгортванні падзей рэалізуецца пры дапамозе **сэнсавага або інтанацыйнага вылучэння**. Адасобленыя члены сказа рэтраспектыўна паведамляюць, паясняюць або дадаткова дапаўняюць сэнс выказвання. Так, у наступнай тэкстаструктуры: *Тым больш, ведаючы ўсё* ***– пра што я тут распавёў і пра што змаўчаў****, – ты, можа, не пераступіла б парог маёй хаты* (Л. Рублеўская), адасоблены член сказа, развіты залежнымі словамі, тлумачыць змест асобай словаформы «усё», што прадвызначае ўдакладняльна-паясняльныя адносіны.

На сінтаксічным узроўні кампазіцыйна-тэкставая рэтраспекцыя вызначаецца ў **складаназалежных сказах з даданай атрыбутыўнай часткай**: *Адна Марыля Гудзевіч, зеленавокая прыгажуня Марылька,* ***якая ўжо скончыла педтэхнікум****, бо была на два гады за яго, Антося, старэйшая, у сваім плюшавым пінжачку выглядае па-сапраўднаму элегантна* **(**Л. Рублеўская). Іншы раз сінтаксічная рэтраспектыўная сувязь падмацоўваецца лексічнымі адзінкамі часу. Зафіксаваны выпадкі, калі даданая частка, выражаная значэннем мінулага, азначае дзейнік галоўнай, якая ў сваю чаргу з'яўляецца рэтраспектыўнай і ў адносінах да атрыбутыўнай.

Зварот да мінулых падзей, з'яў у ЗФА рэалізоўваецца, калі **аўтасемантычны сказ уключае апорныя словы**, змест якіх раскрываецца сінсемантычнымі кампанентамі рэтраспектыўнага характару. Адносіны да мінулага падкрэсліваюцца лексічнымі адзінкамі часу: ***Плакала****, стараючыся, каб ніхто не пачуў ейнага плачу, сама не разумеючы,* ***аб чым яе туга…*** *Можа, па сваіх* ***ніколі не бачаных*** *дзеду і бабцы –* ***раней*** *ведала толькі іхнія імёны: Антоній і Марыя. Па хлопцу і дзяўчыне, што сустрэліся* ***пяцьсот год таму*** *ў маленькім ліцвінскім мястэчку, каб спазнаць самае салодкае і самае горкае на зямлі – каханне…* (Л. Рублеўская).

Аналіз фактычнага матэрыялу дазволіў адзначыць, што рэтраспектыўная інфармацыя ўводзіцца з аднаго боку як дадатковыя звесткі да асноўнага корпуса тэкстаструктур, але якія не адыгрываюць значную ролю ў ім. Аднак у большасці выпадкаў рэпрэзентацыя падзей, фактаў мінулага дазваляе раскрыць мастацкую задуму і з'яўляецца асноўным матэрыялам для працягу мастацкага сюжэта. Змена часавай прасторы асноўваецца на тых адносінах, якія садзейнічаюць гэтаму пераходу, пры гэтым зрух у мінулае адбываецца за кошт розных лексіка-граматычных сродкаў.

Такім чынам, намі даследавана кампазіцыйна-тэкставая рэтраспекцыя, якая характарызуецца парушэннем часавай прасторы з мэтай ўвядзення новай для чытача інфармацыі. Выяўлены адносіны, на аснове якіх

адбываецца дыскантынуум у апавяданні – прычыны, удакладняльна-тлумачальныя, адносіны прамой актуалізацыі мінулых падзей. Вызначаны сродкі рэпрэзентацыі даследуемай катэгорыі ў межах адзначаных значэнняў. На ўзроўні лексемы, словазлучэння і сказу напрамак у мінулае рэалізуецца з дапамогай розных іменных груп, прыслоўяў часу, аказіянальных маркераў, прыметнікаў з часавым значэннем, у складаных сказах, у сінтаксічных канструкцыях – парцэляцыях. На ўзроўні ЗФА сінсемантычныя кампаненты рэтраспектыўна раскрываюць сэнс аўтасемантычнага сказу. Як бачым, тэкставая катэгорыя рэтраспекцыя патрабуе больш дэталёвага вывучэння, а менавіта вызначэння іншых значэнняў, выяўлення сродкаў выражэння.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гальперин И. Р.* Континуум // Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин ; отв. ред. Г. В. Степанов. Изд. 9-е. М., 2016. С. 87–97.
2. *Кожина М. Н.* Стилистико-текстовой статус и взаимодействие категорий ретроспекции и проспекции в научной речи (интердисциплинарный аспект) // Речеведение. Теория функциональной статистики : избр. тр. / М. Н. Кожина. М., 2014. С. 372–413.
3. *Матвеева Т. В.* Функциональные стили в аспекте текстовых категорий. Синхронно-сопоставительный очерк. Свердловск : Изд-во Урал. ун-та, 1990. 172 с.
4. *Федорова Л. Н.* Категория ретроспекции в художественном тексте: на материале английского языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. М., 1982. 21 с.
5. *Брускова Н. В.* Категории ретроспекции и проспекции в художественном тексте : на материале немецкого языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. М., 1983. 22 с.
6. *Тивьяева И. В.* Ретроспективные сверхфразовые единства: формы и функции : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04. Тула, 2007. 175 с.

ФАКУЛЬТАТИВНЫЕ ФУНКЦИИ КАВЫЧЕК В ТЕКСТАХ СМИ БЕЛАРУСИ

О. Н. Жизневская

Минский государственный лингвистический университет,
ул. Захарова, 21, 220034, г. Минск, Республика Беларусь,
Jiznev-ol@rambler.ru

В текстах современных средств массовой информации (СМИ) Беларуси встречается немало номинаций, которые употребляются в кавычках. В статье рассматриваются факультативные функции кавычек на примере публикаций на семейную тематику. Делается вывод о том, что в медиатекстах кавычки, помимо основных функций, выполняют следующие факультативные функции: разрушают стандартное семиотическое отношение, которое по умолчанию реализуется автором; являются показателем «чужого слова»; свидетельствуют о том, что пишущий вкладывает в употребляемое слово нестандартный смысл, а читающий должен правильно

расшифровать смысловое задание автора; сигнализируют о колебаниях в осмыслении и о неоднозначности оценки тех явлений, которые стоят за номинациями, употребленными в кавычках.

Ключевые слова: средства массовой информации; медиатекст; номинации семейных ролей; кавычки; факультативные функции кавычек.

В словаре лингвистических терминов *кавычки* определяются как «парный знак препинания, который употребляется для выделения прямой речи, цитат, названий литературных произведений, газет, журналов, предприятий, а также отдельных слов, если они включаются в текст не в своем обычном значении, используются в ироническом смысле, предлагаются впервые или, наоборот, как устарелые» [2]. Из приведенной дефиниции следует, что основными функциями кавычек как пунктуационного знака являются передача прямой речи, цитат, выделение наименований. Вместе с тем в словаре также частично обозначены и факультативные функции кавычек (выделение слов в необычном значении), которые представляют большой исследовательский интерес. Б. С. Шварцкопф сводит случаи факультативного употребления кавычек к четырем группам: 1) кульминативная (кавычки служат для привлечения внимания читающего к данному слову иди выражению; 2) переносная (выделяется слово или выражение, имеющее метафорическое, метонимическое значение, передающее сравнение; 3) модальная (кавычки передают иронию или отрицательное отношение говорящего к данному понятию, а также ощущение неточности или условности номинации); 4) метаязыковая группа (кавычки выступают как способ оценки употребляемых языковых средств, обозначение чуждости средства стилистическому контексту или лексикону пишущего [3].

Заслуживает внимания тот факт, что достаточно большое количество номинаций в современных медиатекстах Беларуси употребляется в кавычках. Рассмотрим факультативные функции кавычек в текстах СМИ на примере публикаций на семейную тематику. Следует отметить, что в данных публикациях, как правило, отражены изменения в осмыслении традиционных семейных ролей. Эмпирической базой исследования послужили русскоязычные газеты «СБ. Беларусь сегодня» (далее – СБ) и «Комсомольская правда в Беларуси» (далее – КП), белорусскоязычная газета «Звязда» (далее – Зв.), интернет-портал «TUT.BY» (далее – T.by).

Инвариантное значение кавычек, по мнению Анны А. Зализняк, заключается в разрушении стандартного семиотического отношения, которое по умолчанию реализуется говорящим (пишущим); кавычки являются как показателем «чужого слова», так и показателем «своего смысла» [1]. С помощью кавычек-показателей «чужого слова» в номинациях семейных ролей могут осуществляться (эксплицитно или имплицитно) нейтральная и оценочная отсылки. Как отмечает Анна

А. Зализняк, говорящий употребляет заключенное в кавычки выражение, потому что оно «передает нужный ему смысл, но одновременно в содержание его сообщения входит отсылка к факту его прецедентного использования. Говорящий в той или иной мере дистанцируется от цитируемого выражения («это не я так говорю, это другие так говорят»), однако не отвергает данную номинацию» [1]: *«неблагополучная» мать*, *«обязанная» мамаша*, *«паўнавартасная» маці*; *«классический отец-одиночка»*, *«нядзельны тата»*; *«неблагополучный ребенок»*, *«ничей» ребенок*, *«изъять» ребенка* и др.:

Когда в нашей стране разводятся супруги, вопрос, с кем останутся дети, возникает редко, говорят специалисты. Конечно, с мамой!.. И только когда «неблагополучная» мать не в состоянии исполнять свой родительский долг, встает вопрос о том, чтобы ребенок жил с отцом (T.by, 20.08.2013).

В данном примере прилагательное *неблагополучная*, употребленное в кавычках и относящееся к матери, отсылает читателя к активно используемой в белорусском обществе номинации *неблагополучная семья*. При оценочной отсылке слова или выражения, употребляемые в кавычках, передают иронию или отрицательное отношение: *сумасшедшая «мамочка»*, *«положительная» мама*, *«как бы папа»*, *«мастер» алиментного жанра*, *«неадбыўшыйся» тата*, *«забывать» ребенка* и др.:

Моя жена выпивала и увлекалась транквилизаторами. Но никто из посторонних пьяной или под кайфом ее не видел и свидетельствовать о ее привычках и характере не мог. В итоге суд оставил дочь с «положительной» мамой... (СБ, 01.10.2004).

В данном контексте выявляется имплицитная оценочная отсылка к мнению судьи, посчитавшего, что мать в состоянии воспитывать ребенка, несмотря на аргументы отца. Лексема *положительная* употребляется в противоположном смысле и выражает иронию.

Заслуживают внимания и номинации *«яжемать»*, *«тыжемать»*, *«онажемать»*. Они используются в СМИ, когда речь идет о материнской жертвенности и нежелании выходить из вечного образа матери *(«яжемать»*), о навязывании обществом женщине-матери определенных стереотипов поведения (*«тыжемать»*, *«онажемать»*). По данной модели образованы номинации *«этожеребенок»* и *«онжеребенок!»*, которые восходят к выражениям *«Это же ребенок!»*, *«Он же ребенок!»*, имеющим оттенок снисходительности. В исследуемом материале указанные номинации употребляются в большинстве случаев с оттенком иронии в негативнооценочных контекстах:

Говорят, что не заводить детей теперь модно. Модно называть себя поиностранному «чайлдфри» и с легкой долей презрения отзываться о своих не таких успешных одноклассниках, свалившихся с карьерной лестницы, потому что связались с пеленками. «Онажемать» и

«этожеребенок» − некогда гордые слова ими пишутся как диагнозы и иллюстрируются ситуациями: «орущее создание в самолете», «ребенок с ногами на сиденье в метро», «дите, тыкающее палкой в Вечный огонь, пока родители распивают пивко на скамейке» (КП, 20.03.2013).

Кавычки, используемые в номинациях, репрезентирующих стереотипы семейных ролей, являются также показателем «своего смысла». Они свидетельствуют о том, что пишущий вкладывает в употребляемое слово нестандартный смысл, а читающий должен произвести некоторую операцию коррекции, чтобы правильно декодировать смысловое задание автора: *«чужая мама»*, *«летняя» мама*, *«мать-курьер»*, *«производительница»*, *«мама напрокат»*, *«нядзельная маці»*, *часовая «мама»*; *«ложный» отец*, *«суррогатный» отец*, *«донар»*, *«цяжарны» тата*; *«временный» ребенок*, *«притонный» ребенок*, *«штучнае» дзіця* и др.:

И это несмотря на то, что суррогатное материнство в России практикуется уже 18 лет, а «чужие мамы» вынашивают около 500 детей ежегодно. TUT.BY решил выяснить, насколько в Беларуси востребованы услуги «матерей-курьеров», сколько стоит такой способ решения проблемы бесплодия и какие мотивы толкают женщин «сдавать напрокат» свои репродуктивные органы? (T.by, 12.10.2013);

Такі бацька клапатлівы, гаспадарлівы, ініцыятыўны. Варыянт вельмі добры, але толькі ў тым выпадку, калі падобнымі якасцямі валодае і жонка. У адваротным выпадку маці хутка абрастае несямейнымі інтарэсамі і ператвараецца ў «нядзельную маці» (Зв., 16.03.2006);

Большасць нашых слухачоў і цяпер − гэта «цяжарныя» таты або бацькі немаўлят, якія прыходзяць у роспачы, бо не ведаюць, як сябе паводзіць, як перажыць цяжарнасць жонкі, што рабіць далей (Зв., 30.06.2016).

Одни и те же номинации в СМИ могут употребляться как в кавычках, так и без них: *временная мама* и *«временная» мама* в значении ‘суррогатная мать’; *профессиональная мама* и *«профессиональная» мама* в значении ‘приемная мать’; *второй папа* и *«второй» папа* в значении ‘отчим’; *SOS-папа* и *«SOS-папа»* в значении ‘родитель-воспитатель в SOS-Детской деревне’; *ребенок из пробирки*, *ребенок «из пробирки»* и *«ребенок из пробирки»* в значении ‘ребенок, который был зачат путем экстракорпорального оплодотворения’, *сонечнае дзіця* и *«сонечнае дзіця»* в значении ‘ребенок с синдромом Дауна’ и др. Представляется, что указанная особенность свидетельствует не только о неузуальности данных номинаций, но и о колебаниях в их осмыслении, о неоднозначности отношения и оценки.

Таким образом, в текстах СМИ кавычки, помимо основных функций, нередко выполняют факультативные функции: разрушают стандартное семиотическое отношение, которое по умолчанию реализуется говорящим (пишущим); являются как показателем «чужого слова», так и показателем

«своего смысла»; сигнализируют о колебаниях в осмыслении и о неоднозначности оценки тех явлений, которые стоят за номинациями, употребленными в кавычках.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Зализняк А. А.* Семантика кавычек [Электронный ресурс] / А. А. Зализняк // Русский филологический портал. URL: http://www.philology.ru/linguistics2/zaliznyak_anna-07.htm (дата обращения: 03.06.2020).
2. *Розенталь Д. Э.* Словарь-справочник лингвистических терминов / Д. Э. Розенталь, М. А. Теленкова. М. : Астрель, АСТ, 2001. 624 с.
3. *Шварцкопф Б. С.* «Я поставил кавычки потому, что…» // Облик слова : сб. ст. памяти Д. Н. Шмелева / Рос. акад. наук, Ин-т рус. яз. ; сост. и отв. ред. Л. П. Крысин. М., 1997. С. 374–375.

СІНІ КОЛЕР У МОЎНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ І РУСКІХ

І. У. Каліта

Univerzita Jana Evangelisty Purkyně v Ústí nad Labem,
Králova výšina 3132/7, 400 96 Ústí nad Labem, Česká republika,
inna.kalita@ujep.cz

Артыкул знаёміць з рэпрэзентацыяй сіняга колеру ў моўных карцінах свету беларусаў і рускіх. Мэтай даследвання з'яўляецца (1) вылучэнне агульнага і ўласнага ў лексіка-фразеалагічным полі блізкароднасных моў; (2) агляд метафар; (3) характарыстыка вітальнасці моўных адзінак у сінхраніі і дыяхраніі. Аб'ектам вывучэння з'яўляюцца лексічныя і фразеалагічныя адзінкі з семантыкай сіняга колеру, крыніцымі служаць беларускія і рускія слоўнікі і матэрыялы масмедый. Аналіз моўных адзінак паказвае, што ў моўных карцінах свету беларусаў і рускіх сіні колер прадстаўлены падобным чынам. Колькасць уласных адзінак мінімальная (Р. *сіні кафтан*, Б. *збіць на горкі / чорны яблык*), адрозненне назіраецца ў выкарыстанні назвы васілька – у рускіх народных гаворках, у адрозненні ад беларускіх, шырока ўжываюцца назвы з коранем *сін-* : *синёцвет, синецвётик, синецвётка, синюшник*. У рускай афіцыйнай сімволіцы сіні колер мае культуралагічнае значэнне, неафіцыйны беларускі сімбаларый надае культураносное значэнне васільку і васільковаму адценню. Праведзенае даследванне, у адрозненне ад папярэдніх, упершыню ахапіла дыяхронны і сінхронны зрэзы ў развіцці семантыкі сіняга колеру ў дзвюх мовах – ад старажытных асацыяцый (*сини очи, синий лёд, синевая рана*) да сучасных інавацый, якія закранаюць трансфармацыю выразу *да пасінення.* Лінгвістыка колеру адносіцца да маладых навуковых напрамкаў і яшчэ меньш пашырана ў сферы кампаратыўных даследванняў. Акрамя чыста лінгвістычнай значымасці, каштоўнасць распрацоўкі дадзенай тэмы спалягае ў магчымасці выкарыстання матэрыялу ў адукацыйным працэссе, перакладзе і міжкультурнай камунікацыі. Вынікі даследвання могуць быць карыснымі ў працэсе стварэння новай дзяржаўнай сімволікі Беларусі.

Ключавыя словы: лексіка; фразеалогія; каларонім; колер; сіні; славянскія мовы; беларускі; рускі; семантыка.

Рэпрэзентацыя сімволікі і функцый колеру ў славянскіх і неславянскіх мовах пачынае вывучацца ў другой палове XX ст. Тэарэтычны падмурак новай дысцыпліны заклалі Б. Берлін і П. Кей сваёй кнігай “Асноўныя колеравыя тэрміны” (Berlin – Kay, 1969: Basic Color Terms: Their Universality and Evolution). Пяцідзесяцігадовы вопыт вывучэння лінгвасемантыкі колеру сведчыць, што кожная нацыянальная традыцыя ў гэтым напрамку абірае свой шлях і прадмет даследвання. У Беларусі пераважае вывучэнне колеру ў стылях асобных беларускіх пісьменнікаў – гэты вектар развіваюць Ю. Бабіч, І. Струц, Л. Паплаўная, с. Лясовіч, У. Фалалееў, Г. Волкава. Лінгвістычных прац значна меньш, моўнай колерасемантыкай займаюцца І. Ялынцава, І. Швед, А. Садоўская, В. Ляшчынская, кампаратыўным даследванням каларонімаў у фразеалогіі прысвечаны працы І. Каліты. На памежжы лінгвакультуралогіі і мастацтвазнаўства напісана кніга М. Анемпадыстава «Колеры Беларусі». Сінтэтычны падыход да даследвання колеру ў сусветным маштабе з’яўляецца хутчэй нормай, чым выключэннем.

Мэта дадзенага артыкулу – аналіз рэалізацыі *сіняга колеру* ў моўных карцінах свету двух славянскіх народаў – беларусаў і рускіх. Кампаратыўны падыход накіраваны на (1) вылучэнне агульнага і ўласнага ў лексіка-фразеалагічным полі блізкароднасных моў, (2) агляд метафар, (3) характарыстыку вітальнасці моўных адзінак у сінхраніі і дыяхраніі.

Сіні колер адносіцца да храматычных халодных колераў і займае прамежкавае становішча паміж зялёным і чорным, у беларускай і рускай мовах гэты колер абазначаюць двума словамі: *сіні* – назва цёмнага колеру, Б. *блакітны* / Р. *голубой* – азначэнне светлага колеру, у той жа час многія мовы свету сіні і блакітны азначаюць адным прыметнікам: *blue* (англ.), *blau* (ням.), *modrý* (чэшск.).

Усходнеславянскія пісьмовыя помнікі фіксуюць прыметнік *сіні* з XI ст., калі ён не быў частотным, такая роля належала беламу і чорнаму колерам, а таксама чырвонаму і яго адценням [1, с. 23]. Усходнеславянскія пісьмовыя крыніцы доўгі час вывучаліся як агульная спадчына, таму ўласна беларускія ці рускія адзінкі не выдзяляліся. Сінім колерам у старажытнасці азначалі водныя паверхні, некаторыя прыродныя з’явы і апісвалі знешнасць чалавека: “*кровавь мужь и синь (Русск. правда), не синем море, синего Дону, синии молнии (Сл. о п. Іг.), в дузе свойство суть чрьвеное и сине и зелено (Ізб. Св. 1073 г.)*” [1, с. 35]. Такая сімволіка захоўваецца і ў наш час, з той розніцай, што ў старажытных тэкстах сіні азначаў ‘цёмны’ і ‘чорны’, зараз сіні азначае канкрэтны колер. На думку Н. Бахілінай, ў XI-XII ст. прыметнік *сіні* як колераазначэнне не выкрышталізаваўся, у ім яшчэ захоўваліся нейкія рысы больш старажытнага стану, калі ён быў ці шматзначным, ці наадварот, называў проста цёмны колер [1, с. 35], як колераабазначэнне *сіні* пачынае ўжывацца у XVIII ст., калі “сціраюцца” яго “пабочныя” значэнні [1, с. 184].

У XVII ст. моўная палітра сіняга колеру пашырылася, у пісьмовых крыніцах з'явіліся словы *синий, голубой, лазоревый*. Пры апісанні чалавека прыметнік *сіні* ўказваў на адценне скуры чалавека, які змерз; нездаровы (бледны) колер твару; колер збітага, параненага цела. Пашыраным было слова *сінец* – 'бес', 'д'ябал'. Ужываліся і сталыя выразы: *сини очи* –'вочы п'янага чалавека', *синий лёд* – 'вясенні лёд'. Найстарэйшыя асацыяцыі з сінім колерам – гэта вада/мора, неба, маланкі, колер вясёлкі, сінякі/біццё.

Іншы гістарычны перыяд адлюстроўвае "Гістарычны слоўнік беларускай мовы", у ім ахоплена лексіка XIV-XVIII ст.ст. Зафіксаваныя ў слоўніку сінія каларонімы можна падзяліць на некалькі семантычных груп:

(1) сіняк/збіццё: *сіне, сінявата.* "*Под оком правым – сине око подбито* (АВК, XXXVI, 2, 1582)"*; "ввесь сине вспухъ, кийми збит"* (АВК, XVIII, 109, 1592)" [4, Вып. 31, с. 265]; *синева / синетина*: "*пакли бы и жена сама умерла, то даст животъ за животъ ... рану за рану, синеву за синеву* ... (Скар. КІ, 39б-40)" [4, Вып. 31, с. 265]; *синевый, синьевый, синявый* – прым. ад синева; *синета* – 1. сінява, 2. синетина; *синетизна* – тое ж, што и синетина;

(2) фарбавальнік: *синельный* "узяли <...> сѣмени илненого чверти три, синельного сѣмени чверти двѣ" (АСД, I 183, 1590)" [4, Вып. 31, с. 265];

(3) колер: *синий / синый* (адзін з сямі асноўных колераў); *синёзелёный* (*сукно синіозелоно*); назва птушкі (*синица* – сініца, *синогорлица, синогарлица, синогордлица, сынагордлица, сыногорлица* – галубка);

(4) масць каня: *синегривый*;

(5) назва горада: *Сінягорск* – "*... сукна синегорского поставов осмь* <...>" (ИЮМ, XXXII, 176, 1578)" [4, Вып. 31, с. 266].

У "Гістарычным слоўніку беларускай мовы" пераважаюць назвы ран (*кровавыя, синевые, рубаные, битые синевые, синевые опухлые*), у якасці сінонімаў да сіняка ўжывалася восем слоў (*сине, синева, синетина, синость, синесть, синетизна, синетина, синятина*); прыведзены адзін ідыяматычны выраз *сінія раны* і тэрміналагічная назва *сіняя капуста* – 'сорт капусты'.

У XIX ст. словаўтваральны патэнцыял кораня *сін-* у беларускай мове ўзрос: (1) сінька, (2) сінельнік: "*Синельник. Красильщик. Сукно завези к синельнику, нехай акрасиць зелёно*" [9, с. 579]; (3) сінельня: "*Синельня. Красильня, красильная фабрика. <...>*" [9, с. 579]; (4) сінцюга: "*Синьцюга – верхняя одежа из фабричного цветного сукна и из окрашенного домашнего. В синьцюгу убравел, дак и пан великий став*" [9, с. 579]; (5) сіняціна "*Синяцина, уменш. Синяцинка. 1) Домашнее сукно, окрашенное синею краскою. Андарак из синяцины. 2) Верхняя одежа из домашнего синего сукна. Надзень синяцину, синяцинку*" [9, с. 579]; (6) сінявка/сіняк.

У беларускім лексіконе XIX ст. асаблівае месца займае "модная тэма" – фарбаванне тканіны і вопраткі: *сінька* – 'сродак для падфарбоўвання бялізны', *сінельник* – 'майстра па фарбаванню тканін', *сінельня* – 'майстэрня па фарбаванню'. Адначасова ўжываюцца ўжо знаёмыя выразы: *синій – синёй*

агонь – синій огонь, синёя моря; сёнь – ясень, растущий на болоте, с красной древесиной; синь – нитки синеватаго цвета, синяк – крепкій дуб – дуб-синяк; синьтюга – синій армяк; синебагровенький – эпитет василька; синятина – 1) фуфайка, 2) домашнее сукно. *"С синятинки армяк; синячёк – синеватый рыжик*" [6, с. 831].

Развіццё культурных стасункаў і мастацкай літаратуры ў XX ст. уносіць змены ў рэпрэзентацыю сіняга колеру ў беларускай мове, больш ужывальнымі становяцца адзінкі *сінь*, *сінеча, сінізна*; развіццё навукі спрыяе фармаванню навуковай тэрміналогіі – назваў раслін, птушак і жывёл: *сінегаловік* (лац. Eryngium) – 'шматгадовая лекавая расліна', *сінец* (лац. Ballerus ballerus) – 'рыба сямейства карпавых', *сініца* (лац. Parus) – 'птушка'; адначасова захоўваюцца некаторыя народныя назвы, напрыклад, *сіні камень* – 'медны купарос' [13, Т. 5/1, с. 136-137].

Слоўнік У. Даля ўтрымлівае адносна невялікую колькасць слоў з коранем сін-: *синева*, *синекуй* арх. Самоедск. "*Отверстие чума, для выпуска дыма*"; *синель* "фрн. *Бархатные снурки или мохровая нить для женских нарядов. Искажн. Раст. Сирень, будто от синий. Синельная, синелевая бахрома. Синельный шев, вышивание синелью*" [5, Т. 4, с. 186]. Акрамя названых, у слоўнікавым артыкуле "Синий" пералічаны хімічныя рэчывы, назвы птушак, рыб, раслін і грыбоў, у т.л. фразеалагічныя адзінкі: *сіня-пороха во рту не было, каков ни есть, а в синем* (кафтане); *враг силён, валяет и в синем*, т.е и в синем кафтане, и богача [5, Т. 4, с. 186].

У рускіх народных гаворках слоў з коранем *сін-* значна больш, чым у слоўніку Ў. Даля. "Словарь русских народных говоров" адлюстроўвае распаўсюджаную ў шматлікіх рускіх дыялектах назву васількa: "*Синёцвет м. 1. Василек. Липец. Ворон., 1929-1937. <…> синецвётик, м. Василек. Урал, 1972. Синецвётка, ж. 1. Василек. Даль. Синецветку пьют от припадков. Урал, 1972. Синецветкой зовут василек. Синецветку-то рвут в мае, ее пьют от расстройства, от нервов. Перм.* || *Растение Centaurea cyanus L., сем. сложноцветных; василек синий. Вят., Анненков. <…> синецвётник, м. Василек. Скотину поят синецветником. Урал, 1972. Перм*." [12, Вып. 37, с. 328]. "*Синюшник, м. <…> 2. Василёк. Твер., 1889. Калин., КАССР, Волог., Киров. Синюшник – трава от нарыву. <…>*" [11, Вып. 37, с. 340].

Фразеалагічных адзінак (ФА) з каларонімам *сіні* ў абедзвюх мовах налічваецца мала. "Фразеалагічны слоўнік" І. Лепешава фіксуе пяць адзінак: *гарэць сінім полымем, на сіні пазногаць, ні сінь-пораху, сіняя панчоха, сіняя птушка,* дзве з іх (*на сіні пазногаць, ні сінь-пораху*) устарэлыя. "Большой фразеологический словарь русского языка" прыводзіць толькі *синий чулок* [3, с. 636]. Руска-чэшскі фразеалагічны слоўнік, акрамя названай ФА, фіксуе: *гоняться/погнаться за синей птицей, гореть синим огнём, гореть синим пламенем, гори оно синим огнём, гори оно синим пламенем, синяя птица* [12, с. 695].

З агульный колькасці ФА з каларонімам *сіні*, якія можна знайсці ў розных слоўніках (без уліку параўнанняў), да абсалютных міжмоўных эквівалентаў адносяцца запазычанні: Б. *сіняя панчоха* – Р. *синий чулок,* Б. *сіняя птушка* – Р. *синяя птица,* Б. *блакітная кроў* – Р. *синих / голубых кровей,* неалагізм Б. *дзеці індзіга* – Р. *дети индиго* (псеўданавуковы тэрмін ‘таленавітыя дзеці з аўрай цёмна-сіняга колеру’); выразы Б. *гарэць сінім полымем* – Р. *гореть синим огнём / пламенем* і Б. *пасінець ад холаду* – Р. *посинеть от холода*. Да няпоўных эквівалентаў адносіцца ФА *да пасінення*.

Выраз *да пасінення* актывізуецца ў XXI ст. У беларускіх слоўніках ён адсутнічае, рускія слоўнікі фіксуюць яго адносна нядаўна, у XXI ст.: “*до посинения* ждать чего. Разг., ирон. Очень долго” [7, с. 142]; “*До посинения* Прост. До полной потери сил, до изнеможения. НСЗ-80; Ф 2, 79” [8, с. 142]. Абодва выданні адносяць ФА да пазалітаратурных (размоўная, простамоўе). Вядома, што неалагізмы не адразу ўваходзяць у слоўнікі, але ў дадзеным выпадку размова не ідзе пра абсалютную інавацыю. Выраз сустракаецца ў мастацкай літаратуры XX ст. Паводле дадзеных Рускага Нацыянальнага Корпусу – з другой паловы XX ст.: “*Он, наверное, напрашивается на спор, и, если в спор этот ввязаться, он будет до посинения доказывать, что искусство, стихи, особенно балет – все это никому не нужно*” [Василий Шукшин. Воскресная тоска (1958)] [10]. Беларускі корпус фіксуе гэтую ФА ў мове твораў В. Казько (“Суд у Слабадзе”, 1977), У. Караткевіча (“Чорны замак Альшанскі”, 1979), А. Крэйдзіча (“Белы крэмень”, 1995-2000) [2].

Выраз прыцягвае ўвагу магчымасцю рознаструктурнага фарматавання. Носьбітам рускай мовы добра вядомая ФА *избить до посинения* [дзеяслоў + ФА], якой адпавядае беларуская *збіць на горкі / чорны яблык* – прыклад паказвае розныя асацыятыўныя сувязі ў мысленні двух народаў.

На сучасным этапе ў беларускай і рускай мовах адбываецца працэс трансфармацыі ФА *да пасінення*. Першасная асацыяцыя, сфармаваная ў старажытнасці, звязаная са збіццём і сінякамі, доўгі час была тэмай, непрыдатнай для афіцыйнага абмеркавання, таму і сам выраз *да пасінення* лічылі размоўным. Кожная эпоха “карэкціруе” моўныя сродкі, у XXI ст. гэты размоўны выраз трапіў у цэнтр інавацыйнага працэсу і, дзякуючы палітычнай сферы, уключыўся ў дагэтуль нязвыклую інфармацыйную сферу, набрыняў новымі значэннямі. Ім актыўна карыстаюцца беларускія медыі, асабліва ў апошняе дзесяцігоддзе. ФА адносіцца да ўлюбёных выразаў А. Лукашэнкі: *“65-летний глава государства заявил, что не будет* ***«до посинения пальцев»*** *держаться за своё кресло* [14]; *“У меня не стоит вопрос любой судьбой* ***уцепиться до посинения*** *за это кресло* ***и держаться****. Я уже всего наелся, мне хватило» <…>”* [15]; *“Более того, Лукашенко даже заикнулся, что он не против попробовать свои силы в 2025 году, на седьмой, и даже на восьмой срок, по его словам, «****пока пальцы не посинеют****»”* [16]; *Хоть он и отрицает, что не будет* ***до посинения***

***находится у власти**, тем не менее это означает, что он будут находится у власти до последнего момента"* [16].

Расійскія СМІ пачалі ўжываць гэты выраз для каментавання У. Пуціна і значных падзей палітычнага жыцця: *"Путин хочет стать пожизненным обнуленцем. **Править до посинения**"* [17]; *"«Руководители церкви могут **извиняться до посинения**, но пока они делами не докажут, что берут на себя ответственность, их никто не услышит», – заявил Салливан"* [18].

ФА *да пасінення* праяўляе шырокую валентнасць, спалучаецца з шэрагам дзеясловаў, таму мае шырокую шкалу значэнняў: 'доўга', 'да страты сіл', 'закасаўшы рукавы', 'апантана', 'не шкадуючы сіл', 'заўзята'. У беларускай мове нашага часу пераважае значэнне 'трымацца за ўладу да канца'. Побач з самастойным выразам *да пасінення*, які у XX ст. у абедзвюх мовах далучаўся да шэрагу дзеясловаў і азначаў канкрэтнае дзеянне, якое праводзілася ўпарта, апантана і доўга, у XXI ст. ўзнікае новая канструкцыя, у якую ўваходзіць названая ФА: *да пасінення + пальцаў*, ці альтэрнатыўны, структурна адрозны варыянт – *да сініх / чорных пальцаў*. У параўнанні з прывычнай для XX ст. схемы [дзеяслоў + ФА], у XXI ст. узнікае новая схема [ФА + назоўнік], дзе ФА сама падпарадкоўвае і кіруе іншымі кампанентамі.

Аналіз слоўнікавага матэрыялу паказвае, што значных адрозненняў у лексічным складзе сініх каларонімаў беларускай і рускай моў не назіраецца, корань *сін-* адносіцца да праславянскай моўнай спадчыны, таму сам прыметнік у міжмоўным аспекце адрозніваецца толькі графічнымі паказчыкамі – напісаннем літары "і" – "и", і канчаткам *сін[і] / син[ий]*.

У моўных карцінах свету беларусаў і рускіх выяўляюцца наступныя агульныя семантычныя "сінія" маркеры:

1) Пабоі, раны, сінякі: уст. *синьевая рана – у* сучасных мовах – *сіняк* (самае старое значэнне паводле слоўнікаў).

2) Запазычанні: *сіняя панчоха – синий чулок; голубая кровь /* (кто?) *синих / голубых кровей – блакітная кроў*); *дзеці індзіга – дети индиго*.

3) Корань *сін-* ляжыць у аснове назваў кветак, грыбоў, птушак.

4) Пры характарыстыцы прыродных з'яў азначае іх натуральны характар, у некаторых выпадках – сімвалічнасць і прыгажосць.

5) Пры апісанні чалавека з'яўляецца негатыўным маркерам, у т.л. азначае п'яніцу (*сіняк*).

6) Паказчык модных тэндэнцый.

7) Працэс актывізацыі і трансфармацыі ФА *да пасінення*.

Адрозненне назіраем у арэальным распаўсюджанні назвы васількa: для рускіх народных гаворак характэрныя назвы *синёцвет, синецвётик, синецвётка, синюшник*, у беларускай мове натуральнай назвай з'яўляецца *васілёк*, сінонім якой – *валошка* сустракаецца радзей.

Яшчэ адно адрозненне закранае культуралагічны аспект, у Расіі XIX ст. сіні кафтан быў маркерам чалавека, які займаў вышэйшую пазіцыю на

сацыяльнай лесвіцы, пра што сведчаць ФА са слоўніку У. Даля. У Беларусі гэтага часу існавала мода на падсіньванне бялізны і фарбаванне вопраткі ў сіні колер, але ў дачыненні да гэтай "сацыяльнай моды" назіраюцца грэблівыя адносіны: "*В синьцюгу убравел, дак и пан великий став*». Беларусы не запазычылі ні слова "кафтан", ні сам кафтан. Паводле традыцыі, аформленай у часы Вялікага Княства Літоўскага, заможныя беларусы насілі кунтушы (таксама запазычанне). Кафтан, нягледзячы на яго запазычаны характар ў рускай мове, у беларусаў асацыятыўна звязваўся з рускімі. Таму *сіні кафтан* можна адносіць да расійскіх лінгварэалій XIX ст.

У моўных карцінах свету беларусаў і рускіх сіні колер рэалізуецца падобным спосабам. Гісторыя суседніх народаў цесна звязана, таму колькасць ўласна-нацыянальных адзінак мінімальная (Р. *синий кафтан,* Б. *збіць на горкі / чорны яблык*). Матэрыял слоўнікаў адлюстроўвае заканамерны факт – семантыка "сініх" каларонімаў у роднасных мовах супадае. Суседства – гэта таксама факт пераносу модных тэндэнцый. У XIX ст. сіні колер быў модным, таму распаўсюдзілася фарбаванне рэчаў. Пазней сіні колер увасобіў новае рэвалюцыйнае масавае мастацтва. Непрацяглы час – з 1920-х да 1933 г. у СССР існаваў савецкі агітацыйны эстрадны тэатр "Сіняя блуза", які ўзнік у Маскве. Назва паходзіла ад сцэнічнай формы – артысты насілі свабодныя сінія блузы і чорныя штаны ці спадніцы, што паспрыяла ўзнікненню назвы "сіняблузнік". Гэты вобраз быў адгалоскам традыцыйнай выявы рабочага на агітплакатах 1920-х г.г. Пасля гастроляў тэатра ў Мінску ў 1924 г., тэатральныя гурткі "Сіняй блузы" пачалі ўзнікаць у беларускіх гарадах – Віцебску, Гомелі, Барысаве, Полацку і інш.

У сучаснай расійскай афіцыйнай сімволіцы сіні колер, як адзін з колераў дзяржаўнага герба і сцяга, нясе культуралагічную нагрузку. Беларуская афіцыйная сімволіка знаходзіцца ў працэсе пераасэнсавання. Сіні колер у ёй адсутнічае, што супярэчыць каларыстыцы існуючай неафіцыйнай сімволікі, да якой здаўна адносіцца васілёк і яго колер. Васілёк для Беларусі, перш за ўсё – сімвал свабоды. Каларонім *сіні* ў неафіцыйнай анамастыцы прамаўляе псеўдатапонімамі *Сінявокая* і *край блакітных азёр*. Паводле беларускіх літаратуразнаўцаў, сіні і блакітны адносяцца да частотных колераў у творчасці М. Багдановіча, У. Караткевіча, Л. Геніюш, А. Вялюгіна. У працэсе стварэння новай дзяржаўнай сімволікі мэтазгодна ўлічваць вопыт "народнага колерасімвалізму", але таксама і той факт, што ў беларускай культуры гэты колер ніколі не быў дамінуючым, а асноўнае культураноснае значэнне заўсёды належала васільковаму адценню.

Бібліяграфічныя спасылкі

1) *Бахилина Н. Б.* История цветообозначений в русском языке. М. : Наука, 1975. 288 с.

2) Беларускі N-корпус. [Электронны рэсурс]. URL: https://bnkorpus.info (дата звароту: 24.10.2020).

3) Большой фразеологический словарь русского языка / отв. ред. В. Н.Телия; РАН. М. : АСТ-ПРЕСС КНИГА, 2006, 784 с.

4) Гістарычны слоўнік беларускай мовы / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. Вып. 31 / склад.: І. У. Будзько [і інш.] ; пад рэд. А. М. Булыкі. Мінск : Беларуская навука, 2011. 508 с.

5) *Даль В. И.* Толковый словарь живого великорусского языка : в 4 т. М. : Государственное издательство иностранных и национальных словарей, 1956. Т. 4. 684 с.

6) *Добровольский В. Н.* Смоленский областной словарь. Смоленск : Тип. П. А. Силина, 1914. 1022 с.

7) *Ларионова Ю. А.* Фразеологический словарь современного русского языка / 7000 выражений и словосочетаний. М. : Аделант, 2014. 512 с.

8) *Мокиенко В. М.* Большой словарь русских поговорок / В. М. Мокиенко, Т. Г. Никитина. М. : Олма Медиа Групп, 2007. 784 с.

9) *Насовіч І.* Слоўнік беларускай мовы / Факсімільнае выданне. Мінск : БелСЭ, 1983. 756 с.

10) Национальный Корпус русского языка. [Электронны рэсурс]. URL: https://ruscorpora.ru/new/ (дата звароту: 24.10.2020).

11) Словарь русских народных говоров / Российская академия наук, Институт лингвистических исследований. Вып. 37 : Свято – Скимяга / составители: Н. И. Андреева-Васина [и др.]. 2003. 415 с.

12) *Степанова Л.* / Stěpanova L. Rusko-český frazeologický slovník. Olomouc : Univerzita Palackého v Olomouci, 2007. 878 с.

13) Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад агульнай рэд. К. К. Атраховіча. Мінск : БелСЭ, 1982. Т. 5. Кн. 1. 663 с.

14) На парламентских выборах в Белоруссии явка более 70 процентов (17.11.2019). // Радио Свобода [Электронны рэсурс]. URL: https://www.svoboda.org/a/30276793.html (дата звароту: 24.10.2020).

15) Лукашенко заявил, что не держится за президентское кресло (29.12.2014) // РИА Новости [Электронны рэсурс]. URL: https://ria.ru/20141229/1040789382.html (дата звароту: 24.10.2020).

16) Парламент Белоруссии – декоративный орган: «главная роль» у Лукашенко. (18.11.2019) // ИА REGNUM [Электронны рэсурс]. URL: https://regnum.ru/news/polit/2781346.html (дата звароту: 24.10.2020).

17) *Гудков Д.* А вам надоело? Блог (3.06.2020) // Эхо Москвы [Электронны рэсурс]. URL: https://echo.msk.ru/blog/dgudkov/2654177-echo/ (дата звароту: 24.10.2020).

18) Немецкоязычные СМИ сообщают детали австралийской «национальной трагедии» (15.12.2017) // ИА Красная Весна [Электронны рэсурс]. URL: https://rossaprimavera.ru/news/ac6bf04a (дата звароту: 24.10.2020).

БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ТЭКСТЫ XVIII СТАГОДДЗЯ Ў ЗАМЕЖНЫХ ВЫДАННЯХ

І. І. Караткевіч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Акадэмічная, 25, 220050, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
viachirynka@gmail.com

У артыкуле прадстаўлены погляды некаторых беларускіх навукоўцаў і публіцыстаў, якія жылі або выдавалі свае працы за межамі Беларусі, на стан беларускай канфесійнай сітуацыі і мовы ў XVIII-м стагоддзі і іх разуменне гісторыка-культурнага працэсу на Беларусі.

Аўтары працытаваных крыніц, якія аналізавалі пісьмовыя тэксты канфесійнай скіраванасці на беларускай мове, адзначаюць іх выкарыстанне ў рэлігійным жыцці на Беларусі ў XVIII стагоддзі. Гэта дазваляе прапанаваць гіпотэзу пра недакладнасць традыцыйнага погляду на існаванне перапынку паміж перыядамі старабеларускай мовы і новай беларускай літаратурнай мовы і выказаць погляд пра наяўнасць пераемнасці паміж рознымі этапамі яе гістарычнага развіцця.

Ключавыя словы: канфесійныя тэксты; гісторыя беларускай мовы; пераемнасць пісьмовай традыцыі.

Тэксты на беларускай мове XVIII стагоддзя – гэта, у асноўным, тэксты канфесійнай скіраванасці. Таксама гэта пісьмовыя сведчанні вызначальных для Беларусі геапалітычных фактаў і падзей: па-першае, падзелу Рэчы Паспалітай і ўваходжанне беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі; а па-другое, спыненне паланізацыі і пашырэнне праваслаўя, якое “існавала перад уніяцкім часам каля 400 гадоў” [2, с. 123]. Да гэтага часу “беларуская эліта, якая несла адказнасць за адукацыю, культуру і навуку, была ў вялікай ступені спаланізаваная. Беларуская мова з 1696 г. знікае не толькі з афіцыйнага ўжытку, але і з іншых сфер грамадскага жыцця – адукацыі, асветы, культуры і інш.” [2, с. 123]. З гэтай прычыны амаль усе замежныя выданні па беларускай праблематыцы закранаюць пытанні становішча розных канфесій на Беларусі ў гэты перыяд і беларускамоўнае набажэнства.

У артыкуле будуць прадстаўлены погляды некаторых беларускіх навукоўцаў і публіцыстаў, якія жылі або выдавалі свае працы за мяжой, на стан беларускай канфесійнай сітуацыі і мовы ў XVIII-м стагоддзі і іх разуменне гісторыка-культурнага працэсу на Беларусі.

У артыкуле захаваны лексічныя і арфаграфічныя асаблівасці працытаваных крыніц.

Адам Станкевіч (1891, Гродзенская вобл. – 1949, Іркуцкая вобл.), каталіцкі святар, пісьменнік, літаратуразнаўца, адзначаў адметную ролю ўніятаў у функцыянаванні беларускай мовы ў канфесійным ужытку. Ён распавядае пра пашырэнне уніі на Беларусі наступным чынам: “Як ведаем, рэлігійная унія пачала ў нас пашырацца пасьля уніі палітычнай 1569 г., калі

ўсякая самадзельнасьць літоўцаў і беларусаў канчалася на карысьць Польшчы. Год 1569 – гэта канец нашай самадзельнасьці палітычнай; за гэтым жа годам прыйшоў год 1696 – як канец самадзельнасьці культурнай. У гэтым годзе быў выдан закон, адмяняючы ў публічным жыцьці нашага краю мову беларускую, а ўводзячы на яе месца мову польскую" [3, с. 131].

У гэтай сітуацыі дзейнасць уніяцкай канфесіі аказалася надзвычай своечасовай: "Паўстаўшая Унія, можна сказаць, інстынктыўна зьвярнулася да шырокіх беларускіх масаў; яна, карыстаючыся беларускай мовай, прычынілася да разьвіцьця беларускай культуры, да захаваньня беларускай народнасьці і гэтым была дужа карыснай для беларускага народу" [3, с. 131].

Асабліва важнай у гэтым плане ўважалася праца ва ўніяцкіх школах: "Уніяты як у царкве, так і ў школе абысьціся ўжо бяз мовы беларускай ніяк не маглі дзеля свайго асаблівага характару. У іх школах прадусім была мова беларуская. Вучылі ў гэтых школах, як і ў іншых, практычна, без падручнікаў, дарогай гутаркі і пісаньня. Найхутчэй, што ў школах уніяцкіх беларуская мова была ўжо мовай выкладовай усіх прадметаў" [3, с. 131].

Сапраўдны панегірык уніяцтву гучыць у такіх словах А. Станкевіча: "Вось жа праз унію Беларусь, праўда, шмат страціла, але, трэба прызнаць, здабыла значна больш – праз унію яна захавала веру айцоў сваіх на працягу 243 галоў і прынамсі ў сваей аснове захавала такжа і сваю нацыю. Унія дала беларусам правільную царкоўную арганізацыю, вынікаючую з апоры аб Рымскі Прастол, у меру тагачасных палітычных варункаў адрадзіла царкоўнае жыццё, падняла асьвету духавенства і народу, спрыяла разьвіцьцю беларускай народнай літаратуры. Уніяцкая літаратура – гэта літаратура з натуры сваей беларуская, бо ж яна мела на мэце выключна шырокія сялянскія масы, якіх дзякуючы гістарычным абставінам і была яна верай. Словам, унія, як бачым, гэта такая на нашых землях форма Хрысьціянства, якая найбліжэй сваей натурай да натуры беларускай, якая сапраўды зьяўляецца апорай нацыянальнай і культурнай гэтага народу" [3, с. 365]. І далей: "Уніяцкая царква сталася адзінай апорай беларускай нацыянальнасьці і беларускай культуры. Уніяцкая Царква сталася адзіным сродкам беларускага нацыянальнага яднаньня ў сваей сучаснасьці і сталася адзіным злучвом беларускай сучаснасьці зь беларускай нацыянальнай мінуўшчынай. Гэтых абедзьвюх мэтаў яна дасягала, карыстаючыся славянскім языком у Службе Божай, а такжа карыстаючыся языком родным, жывым, навучаючы ўніятаў-беларусаў аднаго і другога ў царкве і ў школе, наскольк гэтая існавала [3, с. 366].

Трэба адзначыць, што пахвала уніі, і ўвогуле дзейнасці ўніяцкіх святароў, не была галаслоўнай – яна абапіралася на даступныя для А. Станкевіча факты. Ён сцвярджаў, што зусім поўнага заняпаду беларускай мовы ў XVIII стагоддзі ў Беларусі не было, паколькі існавалі пісьмовыя беларускамоўныя крыніцы, "санкцыянаваныя" рэлігійнымі іерархамі: "У 1742 г. Папеж Бенэдыкт XIV буляй "Etsi Minime" загадаў духавенству

зьвярнуць асаблівую ўвагу на навучаньне народу праўдаў сьвятой веры. У зьвязку з гэтым загадам віленскі біскуп Зянковіч склікаў дыяцэзіяльны Сынод, які адбыўся ў віленскай катэдры 10 лютага і 12 лютага. Сынод між іншым пастанавіў гаварыць да народу навукі паводле старога звычаю ў народнай мове. З другой паловы XVIII в. дайшлі да нас такжа беларускія рэлігійныя паасобныя песьні, як “О, мой Божа, веру табе”, а такжа зборнік такіх песьняў пад загалоўкам “Kantyczka, abo Nabożne pieśni w narzeczu połockim” (Полацак, у друкарні Soc. Jezu, 1774), уложаная, як відаць з выданьня, полацкімі езуітамі. З канца XVIII спатыкаем яшчэ катэхізмоўку, выданую ўніятамі ў беларускай мове, друкаваную лацінскімі літарамі. Цікавая і цэнная гэта катэхізмоўка перахоўваецца ў Беларускім музэі ў Вільні. Гэтая катэхізмоўка сьведчыць, што Ўніяцкі Касьцёл у канцы XVIII ст. яшчэ не пакідаў цалком роднай мовы народу ў жыцьці рэлігійным” [3, с. 405].

Беларускі і замежны гісторык, літаратуразнавец, публіцыст *Антон Адамовіч* (1909, Мінск – 1998, Нью-Ёрк) у сваім нарысе “Па дарозе да Эўропы” выказвае думку, што супярэчанні паміж праваслаўем, каталіцтвам і ўніяцтвам у XVII – XVIII стст. адцягваюць увагу грамадскасці ад мастацкай літаратуры і, адпаведна, народнай мовы: “Буйна красуе адна рэлігійна-палемічная літаратура, дый тая шторaз менш пачынае паслугоўвацца беларускай мовай, бяручыся ўсё больш за польскую (не бязь вялікіх і можа навет станоўка-вялікіх уплываў на яе з боку беларускае мовы)” [1, с. 322]. Аўтар піша, што ў гэты час “літаратурная традыцыя ў беларускай мове замірае на Беларусі. Бадай апошнім словам яе зьяўляюцца сярэднявечныя “школьныя драмы” канца XVII – пачатку XVIII стст., аналёгічныя заходне-эўрапэйскім містэрыям, моралітэ й мірaклям, якія асабліва разьвіліся ў заснованых езуітамі школах. Але беларуская мова выступае тут толькі побач з мовамі лацінскай і польскай і толькі ў інтэрмэдыях і інтэрлюдыях, прычым ейным носьбітам зьяўляецца выстаўляны зазвычай на сьмех селянін-беларус, ад гэтай пары нагул – асноўная фігура беларускага народу. <…> У XVIII веку старая беларуская літаратура занепадае зусім, асабліва пасьля адыходу Беларусі да Расеі ў выніку ведамых разьдзелаў Польшчы” [1, с. 322–323].

Юры Туронак (1929, Літва – 2019, Польшча, беларускі гісторык, які працаваў і жыў у Польшчы) у сваіх даследаваннях гісторыі беларускага каталіцтва не закранае прама моўныя пытанні сярэдзіны XVIII стагоддзя, аднак шмат распавядае пра перапляценне канфесійных традыцый на беларускіх землях і ўскосны ўплыў гэтага перапляцення на ўжыванне беларускай мовы. Так, упамінаючы пра Вялікае Княства Літоўскае і “пануючую ў ім старабеларускую канцылярскую мову” [4, с. 401], Ю. Туронак піша, што ў выніку “паўстала асаблівая сацыяльная катэгорыя – беларускамоўнае рыма-каталіцкае насельніцтва” [4, с. 401]. Канстатуючы, што ў касцёле традыцыйна выкарыстоўваюцца лацінская і польская мовы,

Ю. Туронак прыводзіць аргументы на карысць таго, што “ў Рыма-каталіцкай царкве здаўна ўжывалася беларуская мова. Пра гэта сьведчаць захаваныя рукапісы XV стагодзьдзя: “Пра муку Пана Нашага Езуса Хрыста”, “Аповесьць пра Трох Каралёў”, “Плач Маткі над Сынам”, “Пра ўваскрасеньне Хрыстова”, “Размовы Рыгора, папы рымскага”, “Імша к сьці Маткі Божай” з тлумачэньнямі і іншыя. У 1585 у Вільні выйшаў першы беларускамоўны падручнік катэхізісу [гл. спасылку: Маецца на ўвазе падручнік, выдадзены на старабеларускай мове кірыліцай езуітамі. Два ацалелыя паасобнікі гэтай кнігі захоўваюцца ў Каралеўскай бібліятэцы ў горадзе Упсала (Швэцыя) – Ю.Т., с. 402], а ў 1681 пераклад з Тамаша Аквінскага пра насьледаваньне Хрыста” [4, с. 402].

Выключная роля каталіцкай канфесіі, у прыватнасці, езуіцкай, дала магчымасць аўтару падкрэсліць яе несумненна станоўчую ролю ў распаўсюджанні беларускамоўнага набажэнства, у тым ліку, у сярэдзіне і другой палове XVIII стагоддзя: “Істотную ролю ў гэтай галіне адыгралі езуіты, якія ў сваіх школах, на чале зь Віленскай акадэміяй, праводзілі навучаньне беларускай мовы, вучылі рэлігійных песьняў і на гэтай мове прамаўлялі казаньні ў касьцёлах. У 1774 г. стараньнямі полацкіх езуітаў была выдадзеная беларускамоўная “Kantyczka”, а трохі пазьней – іншыя царкоўныя песьні. У гэты час, г. зн. на схіле Рэчы Паспалітай і на пачатку расейскай акупацыі, з ініцыятывы езуітаў і магілёўскага архібіскупа Богуша-Сестранцэвіча распачалося ўвядзеньне беларускай мовы ў дадатковыя набажэнствы (сьвятая імша, натуральна, адпраўлялася на лаціне” [4, с. 402].

Як відаць, аўтары працытаваных крыніц, аналізуючы пісьмовыя тэксты (найчасцей, па зразумелых прычынах, рэлігійныя), сцвярджаюць іх выкарыстанне, хоць і не заўсёды частае, у канфесійным жыцці на Беларусі ў XVIII стагоддзі. Гэта дазваляе меркаваць пра недакладнасць традыцыйнага погляду на гісторыю беларускай літаратурнай мовы, у прыватнасці, на перапынак у яе развіцці паміж перыядамі старабеларускай мовы і новай беларускай літаратурнай мовы.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Адамовіч А.* Да гісторыі беларускае літаратуры. Мінск : Выдавец ІП Зьміцер Колас, 2005. 1464 с.

2. *Астапенка А.* Игде зродилися иускормлены суть по Бозе. Дослед беларускага нацыяналізму. Санкт-Пецярбург : Невский Простор, 2010. 734 с.

3. *Станкевіч А.З.* Богам да Беларусі. Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. 1097 с.

4. *Туронак Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. 882 с.

ПРАБЛЕМЫ ПЕРАКЛАДУ З РУСКАЙ МОВЫ НА БЕЛАРУСКУЮ ТЭРМІНАЎ СФЕРЫ КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

А. А. Кірдун

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,
вул. Свярдлова, 13а, 220006, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
allakirdun@mail.ru

Адзначаецца актуальнасць мэтанакіраванай дзейнасці навукоўцаў па дасягненні эквівалентнасці перакладу з рускай мовы на беларускую тэрмінаў камп'ютарных тэхналогій (ТКТ). Апісваюцца праблемы, якія неабходна пераадолець для забеспячэння безбар'ернага выкарыстання беларускай мовы ў абазначанай сферы: адсутнасць сучасных спецыялізаваных перакладных руска-беларускіх і беларускамоўных тлумачальных слоўнікаў; прадстаўленасць ТКТ у абмежаванай колькасці ў акадэмічных тлумачальных слоўніках агульнаўжывальнай беларускай лексікі, а таксама ў агульных перакладных руска-беларускіх слоўніках; варыянтнасць назвы і полінайменнасць аднаго і таго ж дэнатата ў беларускамоўных тэкстах. Звяртаецца ўвага на блок праблем, што ўзнікаюць пры перакладзе ТКТ з рускай мовы на беларускую пры дапамозе сістэм машыннага перакладу і падкрэсліваецца, што ўсе аўтаматычныя інструменты з'яўляюцца толькі дапаможнымі ў дзейнасці перакладчыка. Заключаецца, што камп'ютарныя тэхналогіі – гэта міждысцыплінарная і зменлівая прадметная вобласць, паняційная база якой пастаянна пашыраецца, а таму патрабуе асаблівага падыходу да выпрацоўваемых тэрмінаў, і праблемы перакладу ТКТ з рускай мовы на беларускую могуць быць пераадолены праз сумесную працу лінгвістаў і спецыялістаў у галіне камп'ютарных тэхналогій.

Ключавыя словы: тэрміны камп'ютарных тэхналогій; эквівалентнасць перакладу; полінайменныя паняцці; варыянтныя назвы; дэнататыўная суаднесенасць тэрмінаадзінак.

На сучасным этапе для Рэспублікі Беларусь актуальнай з'яўляецца задача па забеспячэнні ўмоў для безбар'ернага выкарыстання беларускай мовы ў тых сферах навукова-тэхнічнай галіны, якія бесперапынна, імкліва і інтэнсіўна развіваюцца, і найперш у сферы камп'ютарных тэхналогій. Адзін са шляхоў вырашэння гэтай задачы бачыцца ў мэтанакіраванай дзейнасці навукоўцаў па дасягненні эквівалентнасці перакладу адпаведнай тэрміналагічнай лексікі з рускай мовы на беларускую і адначасовым пераадоленні шэрага ўзаемаабумоўленых праблем рознага характару, сярод якіх:

- адсутнасць сучасных спецыялізаваных перакладных руска-беларускіх і беларускамоўных тлумачальных слоўнікаў, якія маглі б служыць для розных груп карыстальнікаў арыенцірам пры атрыманні інфармацыі аб стандартызаваных і гарманізаваных тэрмінах камп'ютарных тэхналогій (далей – ТКТ), ці, інакш, тэрмінах, што абазначаюць паняцці, звязаныя: з апаратным забеспячэннем камп'ютара, якое ўключае электронныя схемы,

кабелі, платы, крыніцы электрасілкавання, запамінальныя ўстройствы, прынтары, перыферыйныя ўстройствы [4, с. 26]; з праграмным забеспячэннем камп'ютара, якое ўяўляе сабой набор каманд і ўмоўна падзяляецца на тры групы: сістэмнае праграмнае забеспячэнне, прыкладное праграмнае забеспячэнне, прыкладныя інструментальныя сродкі [1, с. 19–20]; з працэсамі ўзаемадзеяння чалавека і камп'ютара. Як слушна адзначае М. І. Свістунова, «тыя слоўнікі, што выйшлі, – невялікія па аб'ёме і не падаюць назвы шматлікіх новых паняццяў, што ўзніклі цягам апошніх дзесяці гадоў…» [3, с. 168];

- прадстаўленасць ТКТ у абмежаванай колькасці ў акадэмічных тлумачальных слоўніках агульнаўжывальнай беларускай лексікі, а таксама ў агульных перакладных руска-беларускіх слоўніках. У прыватнасці, нягледзячы на шырокую распаўсюджанасць у сучасным паўсядзённым маўленні такіх тэрмінаадзінак, як *аккаунт, архиватор, апгрейд, андроид, браузер, гиперссылка, драйвер, девайс, дескриптор, кластер, модем, оцифровка, парсер, плагин, прокси-сервер, ровминг, сервер, спам, транзакция, трафик, фишинг, вредоносный код, вредоносная программа, родительская директория, всплывающее меню, всплывающее окно, вспомогательная память, конвертация данных, разрешение экрана, растровое изображение, спящий режим* і інш., іх беларускія адпаведнікі пакуль не прадстаўлены нават у анлайн-версіях абазначаных слоўнікаў (гл., напрыклад, рэсурсы https://www.skarnik.by/ і http://www.slounik.org/). Таксама ў лексікаграфічных крыніцах пакуль не адлюстраваны і тыя змяненні, што адбыліся ў значэннях лексічных адзінак літаратурнай мовы ў сувязі з іх тэрміналагізацыяй у працэсе развіцця сферы камп'ютарных тэхналогій. Напрыклад, у тлумачальным слоўніку беларускай мовы, размешчаным на рэсурсе https://www.skarnik.by/, слова *дакумент* суадносіцца толькі з папяровым носьбітам інфармацыі, а значэнні, якія б звязвалі гэтае слова з камп'ютарам (напрыклад – 'любы тэкставы файл, які ствараецца пры дапамозе камп'ютарнай праграмы'), не прыводзяцца. "Камп'ютарныя" значэнні з'явіліся, але не адлюстраваны ў тлумачальных слоўніках і ў лексем *адрас, архітэктура, платформа, партал, порт, сервіс, сетка, шлюз, экспарт* і інш.
- варыянтнасць назвы і полінайменнасць аднаго і таго ж дэнатата ў беларускамоўных навуковых і публіцыстычных артыкулах, вучэбных дапаможніках, манаграфіях. Напрыклад, для тэрміна *приложение*, якім абазначаецца праграма для камп'ютара, што кіруецца канкрэтнай аперацыйнай сістэмай і разлічана на непасрэднае ўзаемадзеянне з карыстальнікам, і які з'яўляецца апорным кампанентам у многіх састаўных тэрмінаадзінках (напрыклад: *мобильные приложения, пользовательские приложения, профессиональные приложения, корпоративные приложения* і інш.), знаходзім наступныя адпаведнікі: 1) *дадатак*: *«Прыкладное ПЗ – праграмы для рашэння задач пэўнага класа прадметнай вобласці. <…> Для*

наймення прыкладных праграм выкарыстоўваюць тэрмін ***дадаткі****»* (http://informatika7.adu.by/?page_id=199&lang=by); *«Дыспетчары Гомельскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі больш за паўгода карыстаюцца* ***мабільным дадаткам****, які дазваляе ў рэальным часе вызначаць месцазнаходжанне пацыента і машын хуткай дапамогі…»* (https://nastgaz.by/mabilnyya-dadatki-i-shtuchny-intelekt/); 2) *прыкладанне*: *«У адрозненне ад вышэйапісаных аўдыярэдактараў, Wavosaur – гэта параўнальна невялікае, кампактнае і функцыянальнае* ***прыкладанне****»* (https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/194056/1/36-43.pdf); *«Па сутнасці, IT-спецыялісты з'яўляюцца карыстальнікамі інфармацыйных тэхналогій. Яны выкарыстоўваюць наяўныя аперацыйныя сістэмы, праграмнае забеспячэнне і* ***прыкладанні*** *ў тандэме...»* (https://sites.google.com/view/infarmatyka/home/camu-vucac); 3) *дастасаванне*: *«Год таму мы стварылі мабільнае* ***дастасаванне*** *для перакладаў на мову – цяпер ім карыстаецца больш за 30 тысяч чалавек»* (https://bobr.by/news/newscompany/123767); *«М-банкінг дазваляе ўладальнікам плацёжных картак банка з дапамогай мабільнага тэлефона і ўстаноўленага ў ім спецыяльнага* ***дастасавання*** *M-Belarusbank у любы час сутак і з любой кропкі свету кіраваць грашовымі сродкамі…»* (http://www.malorita.by/?p=11239); 4) *праграма* (*камп'ютарная праграма, карыстальніцкая праграма, прыкладная праграма*): *«Jaws for Windows – самая папулярная ў свеце праграма экраннага доступу, якая працуе на ПК ў асяроддзі Windows»* (https://elib.bspu.by/bitstream/doc/33848/1/Паршонок%20-%2033_презентация_2018_бел.pdf); *«Агульная архітэктура рэалізацыі сістэмы працы з кантэнтам змяшчае тры ўзроўні: база дадзеных (MySQL); backend, які прадстаўлены Django-дадаткам;* ***карыстальніцкая праграма*** *(HTML5+JavaScript)»* (https://elib.bsu.by/bitstream/123456789 /215036/1/13-19.pdf); *«СКБД, што захоўвае даныя, і* ***прыкладная праграма****, што інтэрпрэтуе гэтыя даныя, з'яўляюцца рознымі дадаткамі, г.-зн. існуюць дадатак-сервер і дадатак-кліент»* (https://adu.by/wp-content/uploads/2014/e-book/inf/11_1.pdf); і інш. Трэба адзначыць, што праблема полінайменнасці і варыянтнасці ў камп'ютарнай тэрміналогіі ўжо неаднаразова закраналася ў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры [3; 5; 6]. Аўтары звяртаюць увагу на такія рады найменняў, як *налады – наладкі – настройкі* (рус. *настройки*), *выява – відарыс – малюнак – вобразатвор* (рус. *изображение*), *устройства – прылада – прыстасаванне* (рус. *устройство*), *папка – тэчка* (рус. *папка*), *ідэнтыфікацыя карыстальніка – спраўджванне карыстальніка – апазнаванне карыстальніка* (рус. *идентификация пользователя*) і інш. У нашай практыцы выкладання дысцыпліны "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" на факультэце інфармацыйных тэхналогій БДТУ падчас працы з прафесійна арыентаванымі навуковымі тэкстамі таксама былі вылучаны полінайменныя паняцці, напрыклад: *апаратны супын – апаратнае перарыванне – апаратнае прыпыненне* (рус.

аппаратное прерывание), *база даных – база звестак – база дадзеных* (рус. *база данных*), *вонкавы інтэрфейс – знешні інтэрфейс – бачны інтэрфейс* (рус. *внешний интерфейс*), *гнуткі дыск – цвёрды дыск – жорсткі дыск* (рус. *жёсткий диск*), *кабельны разьём – кабельны раздым* (рус. *кабельный разъём*), *перыяд абарачэння – перыяд звароту – перыяд абароту* (рус. *период обращения*), *саманавучальная сістэма – самаабучальная сістэма* (рус. *самообучающаяся система*) і інш. Прычыны ўзнікнення варыянтнасці і полінайменнасці ТКТ у навуковым дыскурсе самыя розныя: ад моўных густаў аўтараў і іх маўленчай кампетэнтнасці да нявырашаных навуковых праблем, звязаных з дэнататыўнай суаднесенасцю тых ці іншых тэрміналагічных адзінак у абедзвюх мовах.

Асобны блок праблем узнікае пры спробах перакладу ТКТ з рускай мовы на беларускую пры дапамозе сістэм машыннага перакладу [2]. У прыватнасці, анлайн-перакладчык у браўзеры «Яндекс» прапаноўвае ў некаторых выпадках у якасці беларускамоўных эквівалентаў адзінкі размоўнага стылю, напрыклад: рус. *компьютер, принтер, кодирование информации, копирование, окно настройки* – бел. «Яндекс» *кампутар, кадаванне інфармацыі, капіяванне, акно налады* (правільна: *камп'ютар, кадзіраванне інфармацыі, капіраванне, акно настройкі*); словы без уліку лексічнай спалучальнасці, напрыклад: *рус. база данных, информационная среда, карта цветовых переходов, разрешающая способность монитора, сжатие данных* – бел. «Яндекс» *база дадзеных, інфармацыйная серада, карта каляровых пераходаў, дазвол манітора, сціск дадзеных* (правільна: *база даных, інфармацыйнае асяроддзе, карта колеравых пераходаў, раздзяляльная (адрознівальная) здольнасць манітора, сціскання даных*); і інш. Нягледзячы на значныя дасягненні ў галіне машыннага перакладу, пакуль не існуе сістэм, якія дазвалялі б атрымліваць дасканалы пераклад (у тым ліку і беларускамоўны). Усе аўтаматычныя інструменты з'яўляюцца толькі дапаможнымі ў дзейнасці перакладчыка.

Відавочна, што камп'ютарныя тэхналогіі – гэта міждысцыплінарная і зменлівая прадметная вобласць, паняційная база якой пастаянна пашыраецца, а таму патрабуе асаблівага падыходу да выпрацоўваемых тэрмінаў. На наш погляд, вышэйадзначаныя праблемы могуць быць пераадолены праз арганізацыю мэтанакіраванай сумеснай працы лінгвістаў і спецыялістаў у галіне камп'ютарных тэхналогій.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Зубова И.И.* Информационные технологии в лингвистике. М. : Academia, 2004. 208 с.

2. *Кірдун А.А.* Машынны пераклад: гісторыя, сучасны стан і якасць тэкстаў на беларускай мове [Электронны рэсурс] // Скориновские чтения – 2019 : современные тенденции развития издательского дела : мат-лы IV Междунар. форума, Минск, 24–25 сент. 2019 г. Минск : БГТУ, 2019. С. 44–47. URL: http://elib.belstu.by/handle/123456789/31954 (дата звароту: 01.08.2020).

3. *Свістунова М.І.* Некаторыя праблемы сучаснай беларускамоўнай ІТ-тэрміналогіі [Электронны рэсурс] // Беларускае слова: тэрмін і вобраз : зб. артыкулаў па матэрыялах навуковых чытанняў, прысвечаных памяці праф. В. П. Краснея, г. Мінск, 27 снежня 2017 г. / БДУ, Філалагічны фак., Каф. гісторыі беларускай мовы ; рэдкал.: М.І. Свістунова (адк. рэд.) [і інш.] ; пад агул. рэд. М. Р. Прыгодзіча. Мінск : БДУ. С. 167–175. URL: http://elib.bsu.by/handle/123456789/194857 (дата звароту: 01.08.2020).

4. *Таненбаум Э.* Архитектура компьютера / Э. Таненбаум, Т. Остин ; пер. с анг. Е. Матвеева. 6-е изд. СПб : Питер, 2013. 816 с.

5. *Шасцярнёва Л.* Сістэмная арганізацыя беларускай камп'ютарнай лексікі [Электронны рэсурс] / Л. Шасцярнёва, Ю. Лук'янюк // Журналістыка-2013: стан, праблемы і перспектывы : мат-лы 15-й Міжнар. навук.-практ. канф., 5–6 сн. 2013 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 14. Мінск : БДУ, 2013. С. 210–216. URL: http://elib.bsu.by/handle/123456789/89189 (дата звароту: 01.08.2020).

6. *Шчасная К.* Паслугач не знойдзены, або Складанасці беларускай камп'ютарнай тэрміналогіі [Электронны рэсурс] // Літаратура і мастацтва. 2013. 19 ліпеня (№ 28). С. 8. URL: http://csl.bas-net.by/press- nan/2013/07/19_paslugach_ne_znojdzeny.pdf (дата звароту: 03.08.2020).

ТРАКТОВКА РАЗНИЦЫ ВНУТРЕННИХ ФОРМ СЛОВ: СИНХРОННЫЙ ПОДХОД

А.И. Ковалева

Белорусский государственный университет,
пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, республика Беларусь,
kowalowa_anna@mail.ru

Научный руководитель – И.С. Ровдо,
доктор филологических наук, профессор

Подробно рассматриваются трактовки разницы внутренних форм семантически эквивалентных слов разных языков, представленные в сопоставительных исследованиях. На базе анализа работ, посвященных проблеме внутренней формы слова, выделены критерии разницы внутренних форм. Прежде всего, структурный критерий, связанный с разницей частеречной принадлежности и количеством мотиваторов сопоставляемых слов, а также типом мотивированности последних. Семантический критерий предполагает неидентичность морфемной структуры и различие мотивирующих признаков сопоставляемых слов. В качестве критерия разницы внутренних форм, оптимального для сопоставительных исследований, направленных на выявление специфического отражение мира средствами разных языков, предлагается рассматривать семантику внутренних форм.

Ключевые слова: внутренняя форма слова; лексико-семантическая группа; мотивирующий признак; морфемная структура слова; мотивирующее слово.

Словосочетание «внутренняя форма слова» (далее – ВФ) благодаря своей образности получает различные трактовки и используется в филологических работах различных направлений. Одним из интереснейших аспектов расмотрения ВФ является анализ данного феномена в качестве

элемента национальной языковой картины мира. Большим потенциалом при изучении ВФ как закрепленного в структуре слова выразителя специфического взгляда на действительность обладают сопоставительные исследования, концентрирующиеся на проблеме сходства и различия ВФ семантически эквивалентных лексических единиц разных языков. Однако даже в рамках сопоставительных работ нет единого четкого представления о том, какие ВФ можно считать различными. Отсутствие решения вопроса о сущности разницы ВФ не позволяет вычленить и проанализировать те участки лексических систем сопоставляемых языков, внутри которых ВФ слов демонстрируют специфическое отражение мира. В целях определения критерия различия ВФ, который является наиболее адекватным для выявления такого рода материала, остановимся на рассмотрении подходов к проблеме разницы ВФ в крупных сопоставительных работах.

Ключевую роль в решении вопроса о сущности разницы ВФ играют цели конкретного исследования и лексический материал, анализируемый в нем. В подавляющем большинстве работ, касающихся проблемы ВФ семантически эквивалентной лексики нескольких языков, сопоставлению подвергаются члены субстантивных ЛСГ (наименования лиц [4], животных [8], птиц [3], рыб [7], головных уборов и обуви [2], предметно-бытовая лексика [6]). Часть исследователей сосредотачивается на изучении структурных особенностей ВФ таких номинаций, анализируя целые группы лексических единиц, полученные в результате классификации. Например, в составе заявленной автором в заглавии работы ЛСГ исследуется соотношение числа мотивированных и немотивированных единиц сопоставляемых языков, структурно и семантически мотивированных слов, слов с полной и неполной членимостью [2]. Авторы выявляют количество лексических единиц с метафорической и неметафорической ВФ, а также определяют соотношение фонетически, морфологически и семантически мотивированных слов в границах ЛСГ сопоставляемых языков [8]. В качестве оснований для классификации используются и такие формальные признаки, как частеречная принадлежность мотивирующих слов, количество мотивирующих слов [6]. В упомянутых работах нет определения того, что составляет разницу ВФ двух конкретных лексических единиц, поскольку целью таких исследований является выделение классов ВФ и сопоставление количества единиц в них. Потенциально любой из вышеуказанных параметров может быть использован в качестве критерия различия ВФ не только у целых классов слов, но и у двух отдельных семантически эквивалентных единиц. Однако очевидно, что вышеназванные параметры сопоставления всесторонне характеризуют эквивалентную лексику определенной ЛСГ с точки зрения ее структурных особенностей, но оставляют за границами исследования вопрос о закрепленном в структуре мотивированного слова национально специфическом взгляде на объект номинации – о семантической

составляющей ВФ. По этой причине ни один из указанных выше критериев не может быть принят в качестве параметра определения различия ВФ у двух семантически эквивалентных единиц сопоставляемых языков, если целью исследования является анализ языковых картин мира на материале ВФ слов.

В большей части вышеназванных работ [3, 4, 6, 7, 8] в сопоставительном аспекте рассматривается и семантическая составляющая ВФ – мотивирующий признак, под которым понимают «один из признаков самой реалии, выделяемый как «представитель» всей совокупности ее признаков, способный наиболее ярко охарактеризовать данный предмет в ряду ему однородных» [1, с. 96]. Несмотря на то, что у отдельных авторов мотивирующий признак получает другие наименования, методика сопоставления материала в данных исследованиях одинакова: у всех членов ЛСГ определяется мотивирующий признак, на основании чего устанавливается характерный для каждого из сопоставляемых языков репертуар мотивирующих признаков, а также преобладание того или иного признака у единиц заявленной ЛСГ. Сопоставление мотивирующих признаков, характерных для членов ЛСГ исходного языка, с мотивирующими признаками членов той же ЛСГ языка сопоставления позволяет выявить закономерности именования объектов действительности в относительно замкнутых лексических группах.

Потенциально мотивирующий признак может быть использован в качестве критерия определения различия ВФ у двух конкретных единиц сопоставляемых языков. Однако в таком случае за границами исследования окажется значительное число двуязычных лексических пар, члены которых демонстрируют между собой отличия несколько более тонкие, чем отличия в мотивирующем признаке. Это связано с тем, что мотивирующий признак указывает лишь на общее направление мысли при наименовании, в то время как структура мотивированного слова фиксирует не только направление мысли, но и конкретное название того явления А, через которое данное явление В получило собственное название. Проиллюстрировать это можно следующими примерами. В паре рус. *сверток* – бел. *пакунак* со значением ‘предмет или ряд предметов, завернутых в один пакет, в одну пачку’ (здесь и далее примеры на русско-белорусском материале) и русское, и белорусское слово запечатлели в своих ВФ один и тот же мотивирующий признак – действие, совершенное над объектом. Однако ВФ русского слова отмечает, что предметы были свернуты, то есть обернуты, в то время как ВФ белорусского аналога обладает более широким значением, указывая на то, что предметы были упакованы – сложены в какую-либо тару. Таким образом, ВФ обоих членов пары рус. *сверток* – бел. *пакунак* характеризует объект, именуемый этими словами, как нечто упакованное. Однако различие между ВФ слов, связанное с разными типами мотивированности, заметно, так как ВФ русского слова *сверток* (слово с прямой

мотивированностью) указывает на действие, реально совершенное над объектом, а ВФ белорусского аналога *пакунак* (слово с конденсированной мотивированностью) чрезвычайно широка по семантике и объединяет под своим названием целый ряд действий, только одно из которых направлено на создание *свертка.* Если за разницу ВФ принять различие в мотивирующем признаке русского и белорусского слов, представленные нами в качестве иллюстрации рус. *сверток* – бел. *пакунак* и подобные им пары необходимо будет рассматривать как слова с одинаковой ВФ, а разница в семантике ВФ русского и белорусского эквивалентов останется без внимания. То же справедливо и для пары рус. *взяток* – бел. *ношка* ‘нектар или пыльца, добытые пчелой за один раз’. У обоих членов данной пары выделяется один и тот же мотивирующий признак – действие, но ВФ слов сохранили связь с наименованиями разных стадий того процесса, в котором участвует медоносная пчела: русское слово указывает на количество нектара, которое пчела способна взять, а белорусское – на то количество нектара, которое пчела может нести.

Таким образом, если цель исследования – выявление репертуара мотивирующих признаков членов какой-либо ЛСГ в нескольких языках и их последующее сопоставление, разницей между значениями ВФ слов можно пренебречь, поскольку она не отражается на характере мотивирующих признаков. А если в задачи исследования входит без привязки к определенной ЛСГ обнаружить участки лексических систем сопоставляемых языков, которые демонстрируют специфическое отражение мира, то учет разницы в значениях ВФ сопоставляемых слов представляется нам обязательным, так как позволяет выявить уникальные для каждого отдельного слова связи между явлениями действительности, закрепленные в морфемной структуре.

Именно неидентичность морфемной структуры избирает в качестве показателя различия ВФ слов К.А. Токарев в диссертационном исследовании, посвященном проблеме сходства и различия ВФ семантических эквивалентов [5]. В отличие от вышеупомянутых работ, в рамках данного исследования сопоставление лексического материала производилось на базе пар семантически эквивалентной лексики, которая не была ограничена тематически. Это сделало возможным перенесение акцента при исследовании ВФ с мотивирующего признака на морфемную структуру слова. К. А. Токарев под совпадением ВФ понимает «тождество первичного признака мотивации и внешней формы» [5, с. 10], то есть, во-первых, семантическую идентичность мотивирующих слов, во-вторых, обязательное наличие в структуре слова семантически эквивалентных формантов, как в паре англ. *founder* ‘основатель’ (< *found* ‘основать’, er – суффикс со значением исполнителя действия) – укр. *засновник* (< *засновати* ‘основать’, *ник* – суффикс со значением исполнителя действия).

Анализ большого объема русских и белорусских семантических эквивалентов позволяет утверждать, что такого рода сопоставление детально учитывает значение мотивирующей базы и формантов, представленных в слове, но создает парадоксальные условия для изучения ВФ как вербального хранителя знаний о связи между явлениями. Скрупулезное изучение морфемной структуры слова и ее семантики, предлагаемое в работе К. А. Токарева, вынуждает рассматривать разницу между формантами сопоставляемых слов как достаточный показатель разницы ВФ. Например, одним из переводов белорусского слова *акраец* на русский язык является слово *краюха* ‘большой ломоть хлеба, отрезанный от края’. В структуре обоих слов благодаря одному и тому же мотивирующему *край* просматривается указание на место нахождения этой части хлебного каравая до того, как она была отделена от него. При этом, если для выявления различия ВФ пользоваться методикой совокупного сопоставления семантики мотивирующего слова и формантов членов анализируемой пары, необходимо будет рассматривать семантические эквиваленты рус. *краюха* и бел. *акраец* как слова с разной ВФ, поскольку форманты данных слов семантически неидентичны: суффикс русского слова *-юх* участвует в создании слов словообразовательного типа с общим значением ‘предмет, характеризующийся отношением к тому, что названо мотивирующим словом’, а белорусский конфикс *а-…-ец* отличается более специализированным значением ‘прадмет, які з’яўляецца часткай таго, што названа ўтваральным словам’. Кроме того, жесткая привязка к семантической эквивалентности формантов как обязательному критерию идентичности ВФ обязывает расценивать все пары, один из членов которых является конверсивом, а другой – структурным дериватом (рус. *нечистый* – бел. *нячысцік* ‘злой дух, черт’), как пары с различной ВФ, поскольку в структуре первого слова отсутствует формант со значением ‘асоба – носьбіт прыметы, названай утваральным словам’, а в структуре второго наличествует. Для исследования ВФ слова, которая ценна прежде всего как указатель на сохранившиеся в струтуре слова связи между явлениями действительности, учет семантики форманта представляется чрезмерным, поскольку, если принимать разницу в семантике между формантами сопоставляемых слов за достаточный критерий разницы ВФ, техника словопроизводства, обусловленная возможностями конкретной словообразовательной системы, может отвлечь исследователя от семантической основы наименования.

Таким образом, анализ конкретных семантически эквивалентных единиц русского и белорусского языков приводит к выводу о том, что, если целью исследования является установление зон лексических систем сопоставляемых языков, которые демонстрируют специфическое отражение мира посредством различных ВФ слов, сопоставление мотивирующих признаков не позволяет учесть индивидуальную, не

сводимую к отдельным типам (действие, объект действия и т.п.) семантику, закодированную в структуре деривата. Совокупное же сопоставление семантики и мотивирующих баз, и формантов предполагает обязательный учет техники словообразования, что может заслонить семантическую общность основы наименования некоторого явления в двух рассматриваемых языках. В связи с этим при сопоставительном анализе ВФ считаем наиболее оптимальным сфокусировать внимание на семантике мотивирующих слов, что позволит, не отвлекаясь на структурные отличия слов, выявить, с опорой на наименования каких явлений действительности были созданы лексические единицы. При таком подходе в случае, если мотивирующие слова обоих сопоставляемых дериватов являются семантическими эквивалентами друг друга, ВФ дериватов стоит признать одинаковыми (рус. *гребец* и бел. *вясляр*, так как рус. *грести* переводится бел. *веславаць*), в противном случае – различными (рус. *копилка* и бел. *скарбонка*, поскольку рус. *копить* не переводится бел. *скарб* и наоборот).

Библиографические ссылки

1. *Голев Н. Д.* О принципах номинации и методе их исследования // Материалы научной конференции, посвященной 50-летию образования СССР. Вып. 5 : Лингвистика. Теоретические вопросы русского языка и его говоров. Томск : Изд-во ТГУ, 1972. С. 94-99.
2. *Даукаева Г. Р.* Сопоставительный анализ наименований головных уборов и обуви в английском, немецком и татарском языках: дисс… канд. фил. наук: 10.02.20. Уфа, 2004. 208 л.
3. *Дробаха Л. В.* Національно-культурна специфіка назв птахів в українській та німецкій мовах: дис. … канд. філ. наук: 10.02.17. Кіровоград, 2002. 187 арк.
4. *Зайнетдинова И. Р.* Анализ внутренней формы наименований лица в английском и французском языках: дис. ... канд. фил. наук: 10.02.20. Уфа, 2004. 163 л.
5. *Токарев К. О.* Внутрішня форма слова як параметр міжмовного зіставлення: автореф. дис. ... канд. філ. наук: 10.02.17 / Донецький національний університет. Томск, 2011. 20 с.
6. *Чижик Н. А.* Мотивационно-сопоставительный аспект предметно-бытовой лексики русского языка: дисс… канд. фил. наук: 10.02.01. Томск, 2005. 218 л.
7. *Швець Н. В.* Мотиваційна основа іхтіонімів в англійській, французькій та українській мовах: дис. … канд.. філ.. наук: 10.02.17. Київ, 2016. 207 арк.
8. *Шевчик А. В.* Комплексное мотивологическое исследование зоонимов русского языка: автореф. дис. ... канд. фил. наук: 10.02.01 / Национальный исследовательский Томский государственный университет. Томск, 2011. 20 с.

СПЕЦЫФІКА МОЎНЫХ СРОДКАЎ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ «НАША НІВА» (1906–1915)

В.Д. Косціна

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
студэнтка 4 курса аддзялення «Беларуская філалогія»,
kostina_veronichka@list.ru

Навук. Кіраўнік: *І.А. Гапоненка, доктар філал. навук., праф.;*
вул. К. Маркса, 31, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
haponienka@bsu.by

Мова беларускай рэкламы, як і любая моўная з’ява ці лексічная група, прайшла пэўныя этапы свайго станаўлення і развіцця. Пачатак працэсу прыпадае на перыяд пачатку XX ст., які лічыцца асноватворчым у гісторыі новай беларускай літаратурнай мовы. У артыкуле ажыццяўляецца спроба прааналізаваць моўна-гістарычныя асаблівасці ў галіне беларускай рэкламы, у прыватнасці паказаць спецыфіку ўжывання моўных сродкаў у рэкламных аб’явах і паведамленнях у мове газеты “Наша Ніва”. У беларускім мовазнаўстве вывучэнне прынцыпаў стварэння тэкстаў рэкламнага зместу ў гістарычным аспекце – цалкам наватарскі даследчы кірунак. Атрыманне дакладнага ўяўлення аб нацыянальных традыцыях моўнага афармлення інфармацыйна-рэкламных матэрыялаў можа стацца важным укладам у распрацоўку навукова-тэарэтычных асноў беларускага капірайтынгу. У практычным сэнсе ў наш час, калі беларускамоўная рэклама становіцца прыкметнай з’явай на маркетынгавым полі Беларусі, вывучэнне і прымяненне гістарычнага вопыту пры напісанні рэкламных тэкстаў будзе спрыяць стварэнню эфектыўных нацыянальных рэкламных мадэляў і стратэгій. Гэта ў сваю чаргу можа садзейнічаць павелічэнню беларускамоўнага сектара ў рэкламе і ўзмацненню прэстыжу беларускай мовы за кошт рэкламнай публічнасці.

Ключавыя словы: рэкламны тэкст; функцыі рэкламы; рэкламны вобраз; сродкі мастацкай выразнасці; эфектыўнасць рэкламнага тэксту.

Рэклама – асобая сфера масавай камунікацыі, якая даследуецца спецыялістамі розных галін гуманітарнай навукі – лінгвістамі, сацыёлагамі, псіхолагамі, эканамістамі і інш. Сваё фармальнае выражэнне рэклама знаходзіць ў выглядзе пісьмовага дзелавога дакумента – рэкламнага тэксту[1], моўная спецыфіка якога выклікае асаблівую навуковую цікавасць. Мова рэкламы, г. зн. тыя слоўныя сродкі, якімі перадаецца змест рэкламнага паведамлення, можа быць стылістычна нейтральнай, перадаваць толькі пэўную інфармацыю і тым самым выконваць інфармацыйную функцыю. Але ж часта рэкламадаўцы, каб сфарміраваць дакладны вобраз аб’екта рэкламы ў чытачоў, выкарыстоўваюць у сваіх тэкстах мастацкія элементы.

[1] У сваім даследаванні мы выкарыстоўваем наступнае азначэнне паняцця “рэкламны тэкст”: гэта асобы тып тэксту, у якім прагматычнасць рэалізуецца адзінкамі практычна ўсіх моўных узроўняў [гл. 3, с. 21].

Мы ў сваім даследаванні паспрабуем прааналізаваць моўна-гістарычныя асаблівасці ў беларускай рэкламнай сферы, у прыватнасці пачатковыя тэндэнцыі ва ўжыванні сродкаў мастацкай выразнасці ў рэкламных тэкстах так званага нашаніўскага перыяду. Зварот да вывучэння традыцый стварэння рэкламы можа быць вельмі карысным у наш час, калі беларускамоўная рэклама становіцца заўважальнай з'явай на маркетынгавым полі Беларусі. Прымяненне гістарычнага вопыту будзе садзейнічаць фарміраванню эфектыўных нацыянальных мадэляў і стратэгій.

У якасці факталагічнай крыніцы намі была абраная газета "Наша Ніва". З нумароў газеты за 1906–1911 гг.[2] было выбрана і прааналізавана 349 тэкставых адзінак на беларускай і рускай мовах, якія, паводле нашага меркавання, можна адносіць да ліку рэкламных тэкстаў: разнастайныя аб'явы, абвесткі інфармацыйнага зместу, прызначаныя для азнаямлення чытачоў з новымі выданнямі і таварамі і для, кажучы сучаснай мовай, "прасоўвання" іх у мэтах распаўсюджвання і продажу.

У сучаснай рэкламе могуць выкарыстоўвацца спецыфічныя моўныя прыёмы: разнастайныя вобразна-мастацкія сродкі, рыфма, пытанні, афарызмы, паўторы і т. п. Усе яны прымяняюцца ў рэкламным тэксце з мэтай стварэння вобразнасці, кідкасці і аказваюць схаваны ўплыў на спажыўцоў. Існуе меркаванне, што сёння інфарматыўнасць рэкламнага тэксту адыходзіць на другі план перад яго экспрэсіўнай насычанасцю. Некаторыя ж даследчыкі прытрымліваюцца супрацьлеглага пункту погляду. Так, класік рэкламнага капірайтынгу Клод Хопкінс разважаў: «Многім рэклама ўяўляецца як мастацтва валодання пяром. Важнымі лічацца мова і стыль. Але яны якраз і не такія важныя. Калі прыгожы стыль і праяўляе сябе нейкім чынам, то выключна як недахоп. Ён стварае ўражанне спробы прадаць. А любая спроба выклікае супраціўленне» [паводле 2, с. 172]. Адпаведна, на думку прыхільнікаў такога падыходу, часцей за ўсё "перамагаюць" тыя рэкламадаўцы, якія надаюць большую ўвагу сэнсу, а не яго форме.

У цэлым жа найбольш дзейсныя рэкламныя тэксты будуюцца на дастаткова складаных прынцыпах. Іх стваральнікі пазбягаюць прамога апісання прадмета рэкламы, яго уласцівасцей і характарыстык. «Часцей за ўсё рэклама не толькі інфармуе чытача, але і фарміруе ў яго яскравы рэкламны вобраз праз сістэму мастацка-выразных сродкаў мовы. Да такіх сродкаў, безумоўна, адносяцца тропы і фігуры маўлення, якія, у сваю чаргу, з'яўляюцца адным з камунікатыўных прыёмаў, пры дапамозе якіх адбываецца эфектыўная камунікацыя са спажыўцом. Тропы і фігуры "выбудоўваюць" тэкст пэўным чынам і прадвызначаюць магчымасці выкарыстання слоў. Яны садзейнічаюць аздабленню, дапрацоўцы і стылістычнаму ўдакладненню гатовых рэкламных канструкцый» [7, с. 8].

[2] Факталагічнай крыніцай паслужылі выданні [4; 5; 6].

У «Нашай Ніве» першых гадоў (1906–1908 гг.) такая тэкставая разнавіднасць як рэкламныя паведамленні толькі пачынала развівацца, і прыёмы прымянення вобразна-мастацкіх сродкаў яшчэ знаходзіліся ў стадыі фарміравання. У пераважнай большасці тагачасныя рэкламуючыя тэксты напісаны стандартнай стылістычна-нейтральнай мовай, без ужывання спецыяльных моўных элементаў: *Съ 13-го декабря въ Вильнѣ выходитъ еженедѣльникъ "Наша трибуна". Въ еженедѣльникѣ принимаютъ участіе: Абрамовичъ Р., Александровъ С., Богровъ Ф., Гейликманъ Т., Зельцер С., Коссовскій В., Либеръ М., Лону С., Медемъ В., Роль П., Эдинъ П. и др. Подписная цѣна съ пересылкой и доставкой: На годъ 3 р., на полъ года – 1 р. 50 к., на 3 м. – 75 к., на 1 м. – 25 к. Заграницу на годъ 4 р., на полъ года – 2 р., на 3 м. – 1 р., на 1 м. 35 к. Цѣна отдѣльнаго номера 6 к. – За границей 8 к. Редаторъ-издательница Х.А. Райнусъ. Адресъ конторы и редакціи: Завальная 33, кв. 6* (1907, № 4). Тут рэкламадаўцы проста канстатуюць факты і не даюць ніякай ацэнкі аб'екту рэкламы.

У лічаных рэкламных паведамленнях заўважаецца выкарыстанне эпітэтаў, напрыклад, *"Политическая энциклопедія": "Цѣна 12 выпусковъ 12 руб. въ 3-хъ* ***роскошно*** *переплет. томахъ – 15 руб…"* (1907, № 30). Або рэклама машын Зыгмунта Нагродзкага: *"…вось якие* ***лепшие и надта патрэбные*** *у кожнай вйосковай гаспадарцы машыны…"* (1907, № 33). Сустракаецца таксама адзінкавы прыклад, які можа быць аднесены да моўнай (у прыватнасці графічнай) гульні, а менавіта ўключэнне ў рускамоўны тэкст лацінамоўнай устаўкі: *"Крупные и мелкіе капиталисты желающіе соединить* ***minimum*** *риска съ* ***maximum*** *прибыли…"* (1907, № 27). Можна меркаваць, што рэкламадаўцы выкарыстоўвалі названы прыём з мэтай эканоміі моўных сродкаў ці для дэманстрацыі сваёй адукаванасці.

У нумарах «Нашай Нівы» больш позняга перыяду (1909–1911 гг.) назіраецца выкарыстанне большай колькасці спецыфічных моўных сродкаў, што дае падставы гаварыць пра актывізацыю працэсу ўдасканалення мовы рэкламных паведамленняў. Аб гэтым таксама сведчыць той факт, што за 1906-1908 гг. намі было зафіксавана толькі 80 рэкламных тэкставых адзінак, а за 1909-1911 гг. – ужо 269.

У 1909–1911 гг. найбольш частотным моўным сродкам у нашаніўскіх рэкламных тэкстах становяцца *эпітэты* – «словы, якія характарызуюць якія-небудзь уласцівасці прадмета. У першую чаргу, яны павінны несці канкрэтыку, гэта значыць эпітэт павінны выражаць канкрэтныя асаблівасці аб'екта, выклікаць у спажыўца адчувальныя асацыяцыі» [7, с. 9]: *…****Модныя*** *цѣпки настоящ. новаго золота* ***изящн****. работы съ брелок. 75 коп...*» (1909, № 12); *«Современная жизнь при* ***колосальномъ*** *и все развивающемся ростѣ международныхъ сношеній дѣлаетъ для насъ обязательнымъ знаніе обычаевъ и нравовъ не только нашихъ ближайшихъ сосѣдей но и народовъ міра вообще…»* (1909, № 31–32); *«12 книгъ полнаго собранія сочиненій*

БРЕТЪ-ГАРТА отпечатанныхъ на ***хорошей*** *бумагѣ по 160 стр. каждая книга, большого формата. Всего 1900 страницъ* ***убористой*** *печати…»* (1909, № 31–32); *«Въ этой книгѣ подъ* ***прозрачными*** *псевдонимами выведены* ***интересныя*** *разоблаченія закулисныхъ тайнъ борцовъ…»* (1909, № 31-32); *«****Удивительные*** *результаты достигнуты благодаря средству "АЛКОЛА"… Оно превращало самыхъ* ***горькихъ*** *пьяницъ въ трезвыхъ, работоспособныхъ и дѣловыхъ людей…Въ ней вы найдете свѣдѣнія о средствѣ "АЛКОЛА" и о* ***чудесныхъ*** *результатахъ, достигнутыхъ благодаря этому* ***удивительному*** *средству…»* (1909, № 31–32); *«…Вы очень скоро и навсегда избавитесь отъ столь* ***мучительной и тяжкой болѣзни****…»* (1909, № 31-32); *«На гэты зборнік злажыліся больш за ўсё* ***пацешные*** *вершы…»* (1910, № 19) і інш.

У названы час у рэкламных тэкстах «Нашай Нівы» неаднаразова сустракаюцца *метафары.* У рэкламных паведамленнях метафара дазваляе адзначыць найбольш адметныя бакі аб'екта рэкламы, падкрэсліць яго значнасць. «Выразны рэкламны вобраз стварае метафара – выраз, які выкарыстаны ў пераносным значэнні на аснове падабенства якіх-небудзь прадметаў ці з'яў. Метафара мае мноства пазітыўных асаблівасцей: яна садзейнічае хуткай і эфектыўнай перадачы ідэі, настройвае спажыўца на актыўнае, усвядомленае асэнсаванне рэкламнай інфармацыі. Тым не менш, частае выкарыстанне метафар у бытавых зносінах прыводзіць да таго, што многія з іх становяцца штампамі» [7, с. 9]. У нашай факталагічнай крыніцы адзначаны наступныя прыклады ўжывання метафар: *«…Тѣло человѣка, его строеніе и жизнь, уходъ за тѣломъ съ момента рожденія и до смерти, отношенія между поламі, лѣченіе болѣзней въ ученіяхъ* ***свѣтилъ медицины****…»* (1909, № 31–32); *«На гэты зборнік злажыліся больш за ўсё пацешныя вершы, ў каторых аўтор умее* ***жывымі фарбамі*** *адмалеваць абычай і жыццё беларускаго селянства…»* (1910, № 19); *«"Наша Ніва" ўсе новые думскіе законы, каторые датыкаюцца Беларусі, разбірае і ацэнівае* ***жывымі прыкладамі*** *з жыцця Беларускаго краю…»* (1909, № 6 і 7); *«…Літэратурны аддзел будзе так зложэны, што чытач апрыч пекных вершоў-поэзіі, каторые дадуць яму* ***духоўную страву****, знойдзе ешчэ шмат артыстычных і сьмешных апаведаньнёў…»* (1911, № 46); *«"Наша Ніва" паставіла сабе мэту* ***будзіць пачуцьце*** *чалавека і грамадзяніна…»* (1909, № 6 і 7); *«"НАША НІВА" гэта* ***люстро душы, думак і патрэб Беларусі****…»* (1911, № 50); *«Сучасная беларуская* ***мысль выліваецца на паперы*** *у "Нашай Ніве", календары і беларускіх кніжках…»* (1911, № 51–54).

Рэкламадаўцы ў нашаніўскіх тэкстах 1909–1911 гг. пачалі выкарыстоўваць *параўнанні* – "стылістычны прыём; прыпадабненне аднаго прадмета іншаму, якое падкрэслівае іх агульную прыкмету" [2, с. 203]. Напрыклад, *«"Наша Ніва" едзіная газэта ў краю, каторая мае карэспандэнтаў бадай з усіх мястэчак і шмат з якіх вёсак; у гэтых карэспандэнціях,* ***як у люстры****, відаць усё жыццё нашых дагэтуль*

забытых беларусоў…» (1909, № 6 і 7); *«…Аб гэтым першым выданым ўжо зборнічку ня лішне сказаць, што ён так сама цікавы для карыстаньня з нотаў, як і для чытаньня ў ім чыста народных вершоў, каторые выражаюць і смутак, і ўсё тое, што* ***як у люстры*** *адбівае беларусаў…»* (1910, № 16–17). З дапамогай параўнанняў аўтарам тэкстаў лягчэй патлумачыць сэнс пэўнай з'явы праз нешта знаёмае ўсім. Таксама параўнанні служаць сродкам нагляднасці. Адзначым, што ў двух абсалютна розных аб'явах "Нашай Нівы" змешчаны аднолькавыя параўнанні.

У прааналізаваных тэкстах таксама варта адзначыць наяўнасць *анафары*. «Анафара – гэта паўтарэнне аднолькавых літар, аднолькавых частак слова, цэлых слоў або словазлучэнняў у пачатку сказа» [2, с. 204]. У газеце сустракаем адзіны выпадак яе выкарыстання: *«…**"Наша Ніва"** паставіла сабе мэту будзіць пачуцьце чалавека і грамадзяніна… **"Наша Ніва"** едзіная газэта ў краю, каторая мае карэспандэнтаў бадай з усіх мястэчак і шмат з якіх вёсак… **"Наша Ніва"** ўсе новые думскіе законы, каторые датыкаюцца Беларусі, разбірае і ацэнівае жывымі прыкладамі з жыцця Беларускаго краю… **"Наша Ніва"** тлумачыць сваім чытацелём усё, што робіцца на цэлым сьвеце і ў Расеі… **"Наша Ніва"** друкуець практычные гутаркі аб гаспадарцы… **"Наша Ніва"** тлумачыць, як нарыхтаваць розные культурные справы… **"Наша Ніва"** ў "Пачтовай скрынцы" дае атказы на ўсе пытаньня…»* (1909, № 6 і 7). Гэта важны моўны сродак у рэкламных тэкстах. Д.В. Бязлатны адзначае: «Моц рэкламнага ўздзеяння залежыць ад такога фактару, як паўтаральнасць інфармацыі. Для дасягнення эфекта ўнушэння недастаткова паведаміць інфармацыю толькі аднойчы. Трэба імкнуцца да таго, каб унушаемае паведамленне паўтаралася некалькі разоў, прычым кожны раз у яго ўносілася нешта новае, змяняліся спосабы і формы падачы зместу» [1, с. 6].

Блізкі па ўздзеянні рэкламны прыём – гэта *паралелізм канструкцый* з паўторам пэўных элементаў, г.зн. «аднолькавая сінтаксічная пабудова суседніх сказаў ці адрэзкаў маўлення…» [8, с. 56]: *«**Если** Вашъ желудокъ плохо варитъ, **если** Вы страдаете катарромъ запорами… **если** Вашъ организмъ истощенъ…»* (1909, № 31–32). Кожны раз, паўтараючы пэўны элемент, аўтар падкрэслівае дыялагічнасць рэкламнага паведамлення і тым самым нібы выклікае прыхільнасць чытача да сябе. Паўторы пэўных элементаў у рэкламных тэкстах надаюць маўленню эмацыйнасць і дынамічнасць і спрыяюць больш эфектыўнаму ўздзеянню на чытачоў і патэнцыйных кліентаў.

У нашаніўскіх рэкламных паведамленнях адзначаны адзін выпадак выкарыстання *парафраза*: *«…Давая каждому интеллигентному труженику широкій и дешевый доступъ къ **храму знаній**…»* (1909, № 31–32). «Парафраз – гэта скарочанае выкладанне, апісальная перадача сэнсу іншага выказвання ці слова» [2, с. 204]. Разглядаемы прыклад выкарыстоўваецца ў рэкламным паведамленні выдавецтва "Современная

Бібліотека”. Як вядома, *храм знаній* – гэта бібліятэка. Такім чынам, у дадзеным прыкладзе можна казаць пра схаванае параўнанне выдавецтва з сапраўднай бібліятэкай.

Прааналізаваўшы рэкламныя тэксты ў газеце «Наша Ніва», мы можам зрабіць вывад, што першае дзесяцігоддзе XX ст. адыграла важную ролю ў станаўленні беларускай рэкламнай сферы, у прыватнасці ў фарміраванні спецыфікі моўных сродкаў рэкламы. У 1906–1908 гг. рэкламныя тэксты яшчэ не вылучаліся шырокім выкарыстаннем спецыфічных моўных сродкаў, а былі напісаны стандартнай стылістычна-нейтральнай мовай. Пачынаючы з 1909 г. мова рэкламы ў «Нашай Ніве» паступова набывае іншы характар. Найбольш распаўсюджанымі сродкамі моўнай выразнасці ў гэты час становяцца эпітэты і метафары, паступова набывае папулярнасць выкарыстанне параўнанняў, анафары, парафразу, паралелізму канструкцый з лексічным паўторам, элементаў моўнай гульні. Спецыфічныя моўныя сродкі, адзначаныя намі ў рэкламных тэкстах «Нашай Нівы», з’яўляюцца важным элементам ў структуры рэкламы. Яны дапамагаюць максімальна ўздзейнічаць на чытача (патэнцыйнага пакупніка): прыцягваюць яго ўвагу да паведамлення, спрыяюць трываламу запамінанню зместа, г. зн. робяць тэкст больш эфектыўным. Выкарыстанне значна большай колькасці спецыфічных моўных сродкаў у рэкламных тэкстах «Нашай Нівы» ў 1909–1911 гг., у параўнанні з нумарамі ранейшых гадоў, дэманструе нам развіццё тагачаснай мовы і самой рэкламы як спецыфічнай камунікатыўнай разнавіднасці.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Безлатный Д.В.* Психология в рекламе: искусство манипуляции общественным сознанием. – М. : ООО “Ваш полиграфический партнер”, 2011. 236 с.

2. *Назайкин А.Н.* Копирайтинг : XXI век. Как создавать современные тексты : Учебное пособие. М. : «КДУ», «Университетская книга», 2017. 316 с.

3. *Назайкин А. Н.* Эффективный рекламный текст в СМИ. М. : Издательство Московского университета; Факультет журналистики МГУ имени М.В. Ломоносова, 2011. 480 с.

4. Наша Ніва : першая беларуская газета з рысункамі / Факс. выданне. Вып. 2 : 1909 г. Мінск : Беларуская навука, 1996. 768 с.

5. Наша Ніва : першая беларуская газета з рысункамі / Факс. выданне.. Вып. 3 : 1910 г. Мінск : Тэхналогія, 1998. – 800 с.

6. Наша Ніва : першая беларуская газета з рысункамі / Факс. выданне. Вып. 4 : 1911 г. Мінск : Тэхналогія, 2003. 684 с.

7. *Тискова О.В.* Языковые средства коммуникативной эффективности рекламы. [Электронны рэсурс]. URL: https://dergipark.org.tr/tr/download/article-file/155486 (дата звароту: 26. 09. 2020).

8. *Розенталь Д.Э.* Язык рекламных текстов : Учебное пособие / Д.Э. Розенталь, Н.Н. Кохтев. М. : МГУ, 1981. 150 с.

АКЦЭНТУАЦЫЯ Ў «СЛОЎНІКУ ЦЯЖКАСЦЕЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

У. І. Куліковіч

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,
вул. Свярдлова, 13а, 220006, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
nino-1924@mail.ru

Аналізуецца сістэма абазначэння націскных складоў ў слоўніку пры дапамозе спецыяльных знакаў ` (гравіс) і ´ (акут). Устаноўлена, што ўсе адзінкі лексікаграфічнага даведніка падзяляюцца на дзве групы: словы, дзе няма знакаў націску і словы, над якімі знак(і) націску стаяць. Аўтар прыходзіць да высновы, што ў слоўніку няма адзіных прынцыпаў выкарыстання знакаў націску, што адмоўна ўплывае на засваенне асобных акцэнталагічных і арфаэпічных нормаў беларускай мовы, патрабуе неадкладнай распрацоўкі рэкамендацый для рэдакцыйны-выдавецкіх супрацоўнікаў дзеля ўдасканалення культуры лексікаграфічных выданняў.

Ключавыя словы: акцэнтуацыя; націск; слоўнік; правілы акцэнтуацыі; практычнае пісьмо; норма акцэнталагічная; культура выдання; акут; гравіс.

Уводзіны. Адно са значэнняў шматзначнага тэрміна акцэнтуацыя – «абазначэнне націску ў словах ці фразе пісьмовага тэксту» [1, с. 16] з мэтай правільнага вымаўлення слова пры чытанні. Актуальнасць вывучэння сістэмы знакаў для ўказання на націскныя склады ў «Слоўніку цяжкасцей беларускай мовы» – першага «агульнадаступнага дапаможніка» [3, с. 3], дзе прыводзяцца і тлумачацца цяжкія выпадкі словаўжывання, формаўтварэння, акцэнталогіі каля 8 000 беларускіх слоў, абумоўлена, па-першае, той асноўнай задачай, якую вырашае гэтае лексікаграфічнае выданне – «садзейнічаць лепшаму засваенню норм пісьмовай і вуснай мовы, дапамагчы чытачу ў выбары варыянтаў слоў і форм, існуючых у межах літаратурнай мовы, у ацэнцы моўных фактаў з пункту гледжання правільнасці або няправільнасці іх ужывання» [3, с. 5]. Па-другое, дзеля стварэння рэкамендацый і правілаў для выкарыстання гэтых знакаў у беларускім практычным пісьме.

Таму задача артыкула – устанавіць, наколькі паслядоўна аўтары і рэдактары выдання выкарыстоўваюць спецыяльныя знакі для абазначэння націскных складоў у «Слоўніку цяжкасцей беларускай мовы» пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР М. В. Бірылы і доктара філалагічных навук А. І. Падлужнага [3].

Асноўная частка. У сувязі з цяжкасцямі арфаэпічнага характару, як адзначаюць складальнікі, у слоўнік уключаны чатыры асноўныя групы лексем:

– фанетычныя дублеты: *за́гарадны* і *загаро́дны*, *за́ячына* і *зае́чына*, *збля́кнуць* і *зблѐкнуць*, *кайданы́* і *кайда́ны*, *Каля́ды* і *Ко́ляды*, *ко̀лішні* і *калі́шні*, *насу́праць* і *насупро́ць*, *не́сці* і *нясці́*, *про́паліс* і *прапо́ліс*, *разгле́дзець* і

разглядзе́ць, *раскве́ціць* і *расквяці́ць*, *рася́ны* і *расяны́*, *стальма́х* і *стэ́льмах*, *уго́ру* і *ўгару́* і іншыя;

– словы з няўстойлівым або цяжкавызначальным націскам: *су́праць – супро́ць*, *ця́жкі – цяжкі́*, *падыспад*, *падсу́седзі*, сярод іх іншамоўныя: *аге́нт*, *ге́незіс*, *індустры́я*, *інсу́льт*, *карабіне́р* і іншыя;

– словы-амографы: *а́тлас – атла́с*, *галі́на – галіна́*, *і́рыс – ірыс*, *гру́бы – грубы́*, *ма́чтавы – мачтавы́*, *за́крутка – закру́тка*, *зара́з – за́раз*, *за́стаўка – заста́ўка*, *не́прыяцель – непрыя́цель*, *развадны́ – разво́дны*, *развіты – развіты́*, *разме́шаны – размяша́ны*, *саля́ны – саляны́* і іншыя;

– словы, у якіх узнікаюць цяжкасці пры вызначэнні націску ў формах: *во́бласць – абласце́й*, *гарпу́н – гарпуна́*, *капялю́ш – капелюша́*, *лі́нь – ліня́*, *сна́сць – снасце́й*. Найчасцей гэта лексемы, дзе пры змене формы слова націск пераходзіць з асновы на канчатак.

Усе адзінкі, пададзеныя ў слоўніку, можна падзяліць на дзве групы: словы, дзе няма знакаў націску і словы, над якімі знак(і) націску ўжывае(ю)цца.

Група 1. Словы, дзе знак націску не стаіць. Да гэтай групы адносяцца.

1. Аднаскладовыя лексічныя адзінкі: *дом*, *дроб*, *даць*, *клей*, *клуб*, *лань*, *лгаць*, *леў*, *кадзь*, *кедр*, *кмен* і *кмін*, *клык*, *цяць*, *шарж, шанс, шлюб* і іншыя.

2. Асобныя аднаскладовыя словы, што пішуцца праз злучок або ўваходзяць у склад фразеалагізмаў: *стоп-кран, адзін на адзін*, *на злосць*, ***але*** (і такіх слоў большасць): *жыў-быў*, *ку-клус-кла́н, о́пера-бу́ф*, *не на жа́рт*, *не ў ла́д*, *дзень у дзе́нь*, *з ча́су на ча́с*, *на жа́ль*, *на ўра́*. Сярод іх зафіксаваны выпадак, дзе націск падае на просты прыназоўнік – *на́ руку*, што супярэчыць агульнапрынятаму меркаванню, зафіксаванаму ў падручніках і дапаможніках: «У беларускай мове націск адзначаецца толькі ў знамянальных слоў. Службовыя словы далучаюцца ў маўленчай плыні да знамянальных слоў і не маюць тут, такім чынам, націску» [2, с. 196].

3. Словы, з літарай ***ё***, якая абазначае націскны галосны гук: *ёўня*, *сёння*, *сёмга*, *акцёр*, *выкапнёвы*, *каёт*, *калёквіум*, *карцёж*, *касцёр*, *шавіёт*, *кампаньён*, *шампіньён*, *шасцёра*, *ясянёвы*, *юніёр*, *дзеўчанё* і іншыя; у тым ліку і складаныя словы: *вѐчназялёны, галалёдзіца, густацёрты касцёвамазгавы́, касцёва-суста́ўны*. Выключэнні два: *цвѐрдакаме́нны*, *цвѐрданасе́лены*.

4. Словы-прыклады да ўсіх 80 правіл раздзела «ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА» [3, с. 59–70]: *архіепіскап*, *гідраэлетрастанцыя*, *Бі-бі-сі*, «*Нойе дойчэ бауэрнцайтунг*», *птушкафабрыка імя Н. К. Крупскай*, *Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі*, *вобласць Таскана*, *Франкфурт-на-Майне*, *Ханты-Мансійская нацыянальная акруга*, *квіслінгі, бефстроганаў* і іншыя. А таксама ўсе прыклады, дзе змешчана інфармацыя пра ўласныя асабовыя імёны і прозвішчы, уласныя геаграфічныя назвы (тапонімы) [3, с. 182–187]: фінскае мужчынскае імя *Калева*, татарскае жаночае імя *Айназа*, запазычаныя з

заходніх моў: *Атала*, *Заза*, *Нана*; тапонімы *Верхань*, *Гарадзень*, *Жыцень*, *Карасцень*, *Хацень*; *Мантэвідэа*.

5. Словы-тлумачэнні абрэвіятур: ЦК (цэка), ЦК КПБ (цэка капэбэ), ЦК КПСС (цэка капээсэс).

6. Словы, што пішуцца праз злучок з часціцай *такі*: *зноў-такі, усё-такі*, *так-такі*, **але**: *такі́-сякі́*.

7. Філасофскі тэрмін *не-я*.

Група 2. Словы, над якімі знак(і) націску ўжывае(ю)цца. Гэта самая шматлікая група. Націскныя склады ў такіх словах пазначаюцца пры дапамозе двух знакаў: ` (гравіс) і ´ (акут). Праўда, у раздзеле «Паметы і знакі» [3, с. 10] пра спецыфіку іх выкарыстання нічога не сказана, што, безумоўна, можна лічыць рэдактарскім недаглядам і ўплывае на сістэмнае выкарыстанне надрадковых элементаў. Сярод адзначанай групы намі ўстаноўлена сем падгруп: 1) словы, дзе ўжываецца адзін знак акут ´; 2) словы з адным знакам ` (гравіс); 3) словы, дзе выкарыстоўваюцца два аднолькавыя знакі акут ´; 4) словы, дзе стаяць два розныя знакі – ` (гравіс) і ´ (акут); 5) словы, дзе маюцца тры надрадковыя знакі – два знакі ` (гравіс) і адзін знак ´ (акут); 6) словы з чатырма надрадковымі знакамі – тры гравісы ` і адзін акут ´; 7) словы з трыма надрадковымі знакамі – адзін ` гравіс і два знакі акут ´.

2.1. Словы, дзе ўжываецца адзін знак ´ (акут). Да гэтай падгрупы належаць:

2.1.1. Усе простыя словы, якія складаюцца з двух і больш складоў. Націск тут зафіксаваны над дзевяццю літарамі, што абазначаюць галосныя гукі:

– над літарай ***а***: *а́зімутны*, *а́лібі*, *абра́за*, *дзірва́н*, *дыназа́ўр*, *калянда́р*, *канфера́нс, калашына́, чапяла́* і інш.;

– над літарай ***я***: *я́блык*, *я́лаўка*, *працяць, прамяня́ць, яцвя́жскі*, *лабія́льны*, *акумуля́тар*, *мядзя́к*, *плея́да*, *футля́р*, *дзеўчаня́, імя́, мітусня́* і інш.;

– над літарай ***о***, нягледзячы на тое, што яна з'яўляецца сігналам націскнога склада: *во́бад*, *ало́э*, *до́ля*, *лядо́ўня*, *ільго́та, дэдэро́н*, *наро́д*, *хао́с*, *вязьмо́*, *дэпо́*, *харчо́*, *манто́*, *рэўко́м*, *хвалько́* і іншыя. Выключэнне складаюць асобныя складаныя словы, дзе над літарай о знак націску не стаіць: *крокаме́р*, *фотака́ртка*, *фотаздымак*, *фок-ма́чта*, *фосфарзмяшча́льны, фосфарнакі́слы, форс-мажо́р, фот-гадзі́на, хорма́йстар, хронаскапі́чны, часоваабавя́заны, чатырох'я́русны, штодзе́нь, штове́чар, штого́д, штоме́сяц, штоты́дзень, што-ніштó, шторм тра́п*; **але**: *днòпаглы́бны* і інш.;

– над літарай ***э***, нягледзячы на тое, што яна з'яўляецца сігналам націскнога склада ў словах славянскага паходжання: *э́пас*, *чэ́рвеньскі*,

дварэ́ц, *да рэ́шты*, *дрэ́ва*, *шчэ́па*, *падрэ́з*, *упярэ́мешку*, *чарэ́мшына*, *шасэ́* і іншыя;

– над літарай ***е***: *е́хаць*, *але́й*, *рэзе́рв*, *дакуме́нт, крадзе́ж, падпе́рці*, *прыне́левы, эдэльве́йс, рэкардсме́н, жэле́, піке́, рэле́* і інш.;

– над літарай ***у***: *у́льтра*, *ду́дка*, *ду́чэ*, *ігу́мення*, *клу́нак*, *кажу́х*, *пту́шка*, *урассыпну́ю*, *прыгажу́н*, *макулату́ра*, *какаду́* і інш.;

– над літарай ***ю***: *ю́та*, *лю́дзі*, *капцю́р*, *інтэрв'ю́*, *упершыню́* і іншыя;

– над літарай ***ы***: *іспы́т*, *чаты́ры*, *бурштын*, *дзяншчы́к*, *кансультацы́йны*, *шашлы́к*, *учацвяры́х*, *ільняны́*, *касцяны́, пластавы́*, *шарсцяны́* і інш.;

– над літарай ***і***: *і́скра*, *і́лісты*, *і́клы*, *калі́бры*, *каляі́на*, *канцэрці́на*, *дэпазі́тар*, *чахахбі́лі*, *дзяўбці́*, *застудзі́ць*, *канваі́р* і інш.

2.1.2. Складанаскарочаныя словы: *дыпкур'е́р*, *вільгацяме́р, газаправо́д, камсаста́ў, крокаме́р*, *маскхала́т, метрабу́д, райвыканко́м*, **але:** *мета̀лало́м, пра̀мтава́ры*.

2.1.3. Складаныя словы, дзе націск на першым складзе другой часткі: *брандва́хта, вэксалядаве́ц*, *дванаццаціпе́рсны*, *дваццаці́го́ддзе*, *лыжаро́леры*, *канцэртма́йстар*, *капельма́йстар*, *кішачнапо́ласцевыя*, *мяккашэ́рсны, насаглотка, паралельнадзе́ючы, перысталі́стыя*, *таксапа́рк*, *фосфарнакі́слы*, *чатырох'я́русны*, **але**: *àграмі́німум, àгратэ́хніка, вѐрхнядзві́нскі, вàтэрлі́нія, вàтэрпо́ла, вѐералісты, лàўравішня*, *лѐсату́ндра*, *піянѐрла́гер*;

2.1.4. Складаныя іншамоўныя словы: *брандспо́йт віцмундзі́р, вундэркі́нд, гуміара́бік*, **але**: *блòкпо́ст*, *бра̀ндма́ўэр, дòнжуа́н, дòнкіхо́т, штрэ́йкбрэ́хер*;

2.1.5. Складаныя словы, напісаныя праз злучок, калі першае слова з'яўляецца аднаскладовым: *больш-ме́нш, перш-на́перш, план-гра́фік, план-ка́рта, план-схе́ма, сам-на́сам, тайм-а́ўт, фільм-канцэ́рт, фільт-прэ́с, шрыфт-ка́са, штаб-афіцэ́р, цэх-лабарато́рыя, член-карэспандэ́нт, яхт-клу́б,* ***але:*** *стòп-кра́навы, стòп-сігна́л, та́нк-амфі́бія, трын-трава́, трэ̀д-юніён, тэа́тр-буф, штàб-кватэ́ра, шэ́йх-уль-іслам*;

2.1.6. Асобныя складаныя словы, напісаныя праз злучок, калі ў другой частцы літара ё абазначае націскны галосны гук: *генера́л-маёр*.

2.2. Словы з адным знакам ` (гравіс) для абазначэння пабочнага націску. Гэта найперш складаныя словы, дзе ў другой частцы ёсць літара *ё,* над якой няма знака націску: *вѐчназялёны, двухсòтрублёвы*, *злу̀чанапялёсткавыя*, *мàламаёмасны*, *ву̀глепад'ёмнік.*

2.3. Словы, дзе выкарыстоўваюцца два аднолькавыя знакі акут ´. Да іх належаць:

2.2.1. Складаныя словы, напісаныя праз злучок: *авіяцы́йна-спартыўны*, *агаро́дніна-мало́чны*, *ілжэ́-Анто́наў, перакаці́-по́ле*, *а́льма-ма́тэр*, *буржуа́зна-дэмакраты́чны*, *буржуа́зна-паме́шчыцкі*, *бюджэ́тна-*

фінáнсавы, *дзé-нідзé*, *вагóн-выстаўка*, *вагóн-лядóўня*, *вагóнна-паравóзны*, *вагóн-рэстарáн*, *вáкуум-пóмпа*, *пілóт-інструктар*, *рамáн-газéта, рáным-рáна, цыíнкава-свінцóвы, яркá-чырвóны* інш.

2.2.2. Непадзельныя словаспалучэнні. Тут, як правіла, у кожным слове абазначаны націсны склад: *мамáева нашэ́сце*, *грамáдска карыíсны*, *навукóва абгрунтавáны*, *персóна нон грáта* і інш.

2.4. Словы, дзе стаяць два розныя знакі – ` (гравіс) і ´ (акут). Да іх адносяцца:

2.4.1. Складаныя словы, напісаныя разам, калі асноўны націск падае не на першы склад другой часткі слова: *асфàльтабетóн, бдèзапáс, гèацэнтрыíзм, брòнеаўтамабíль, вагòнабудаўнíчы, вèерападóбны, вìдэатэлефóн, вòднаспартыíўны, вòднаэнергетыíчны, вышэйназвáны, галòўпаштáмт, гòрнарабóчы, ілжэ̀вучэ́нне, лìтмантáж, лацìнаамерыкáнскі, прàмфінплáн* (прамыслова-фінансавы план), *утыìльсыравíна* і інш. Аднак ёсць нямала лексем, дзе:

а) у падобнай пазіцыі пабочныя націск не пастаўлены: *круцìгалóўка*, *керамзітабетóн*, *зернеўпарáдкаванне, кіслародазарóдны*, *першапрахóдчык*, *міралюбíвы*, *сарвігалавá, сальтамарталíст*, *узаемнапрымáльны*, *этылбензóл, этыласілікáтны, яснавяльмóжны* (гіст.);

б) ёсць пабочны націск, калі асноўны падае на першы склад другой часткі слова: *ілжэ̀свéдка*, *Ілжэ̀дзмíтрый;*

в) пабочны націск пазначаны знакам ´ (акут): *жыíванараджэ́нне,*

г) пабочны націск пазначаны знакам ` (гравіс), а слова пішацца праз злучок: *àльфа-выпрамянéнне*, *àльфа-жалéза*, *àльфа-прамяні́*, *àльфа-распáд*, *аўдыèнц-зáла* (ж. р.) і *аўдыéнц-зала (м. р.)*; *блòк-дыягрáма*, *блòк-кантáкт*, *блòк-механíзм*, *блòк-сігнáл*, *блòк-сістэ́ма*, *блòк-схéма*; *брàм-стэ́ньга*; бўгі-вўгі; *з бўхты-барáхты*; *бэ̀та-выпрамянéнне*, *бэ̀та-жалéза*, *бэ̀та-распáд*, *бэ̀та-часцíца*, *ваènна-адміністрацыíйны*, *ваènна-марскí*, *ваènна-павéтраны*, *ваènна-юрыдычны*; *вìцэ-адмірáл*, *вìцэ-кóнсул*, *вìцэ-прэзідэ́нт*, *вòдна-меліярацыíйны*, *вòдна-матóрны*, *вòляй-нявóляй*, *вòленс-нóленс*, *вўсна-паэтычны*, *гàма-выпрамянéнне*, *гàма-прамяні́*, *гàма-часцíцы*, *грòт-мáчта*, *далàй-лáма*, *дòберман-пíнчэр*, *дыìзель-матóр*, *дынàма-машыíна*, *зюйд-вéст*, *зюйд-óст*, *кааператыìўна-калгáсны*, *кàбель-крáн*, *кілавàт-гадзíна*, *кòк-сагыíз*, *лòрд-мэ́р*, *лўна-пáрк, люмпен-пралетарыя́т*, *màрш-парáд*, *мèцца-сапрáна*, *мèцца-тыíнта*, *мèч-рыíба*, *мòлат-рыíба* і інш.

2.5. Словы, дзе маюцца тры надрадковыя знакі – два знакі ` (гравіс) і адзін знак ´ (акут).

2.5.1. Гэта складаныя словы, дзе ёсць тры асновы: *àвіяматòрабудавáнне*, *àвіямèтэаслýжба*, *агарòднінабýльбасхóвішча*, *вèрхнекамèннавýгальны, гìдрамèтэаслýжба, цèплаэлèктрацэнтрáль, трýбаэлèктразвáрачны*, *пàртдзя̀ржкантрóль, рàдыёгìдраакустычны*,

спѐктрафо̀таметры́чны, *ста̀рацаркво̀ўнаславя́нскі*, *палі̀тпрасвѐтрабо́та, са̀ўінфа̀рмбюро́*.

2.6. Словы з чатырма надрадковымі знакамі – тры гравісы ` і адзін знак акут ´. Напрыклад: *а̀ўтавѐламо̀тагóнкі.*

2.7. Словы з трыма надрадковымі знакамі – адзін ` гравіс і два знакі акут ´. Такое слова пішацца праз злучок, дзе першая лексема складаецца з дзвюх асноў: *во̀дапрaво́дна-каналізацы́йны*.

Заключэнне. Акцэнтуацыя «Слоўніка цяжкасцей беларускай мовы» ў большасці выпадкаў садзейнічае лепшаму засваенню нормаў пісьмовай і вуснай мовы. Аднак аўтары і рэдактары лексікаграфічнага выдання непаслядоўна выкарыстоўваюць спецыяльныя знакі для абазначэння націскных складоў, што, па-першае, не спрыяе аб’ектыўна ацэньваць моўныя факты з пункту гледжання правільнасці або няправільнасці іх вымаўлення (*нìф-нáф*, *тра-та-тá*, *трах-тарарáх*, *цìк-тáк*), па-другое, у асобных выпадках не дазваляе ўстанавіць наяўнасць пабочнага націску ў шматскладовых і складаных словах: *пылаўло́ўнік*, *пы̀ланепранікáльны*, *пылападо́бны*, *прадэзінфіцы́раваць, прадэфілíраваць*, *пралетарызава́ны*; па-трэцяе, не садзейнічае сістэмнаму выкарыстанню надрадковых знакаў (гравіс ` і акут ´). Параўнайце: *го́рна-абагачáльны* і *го̀рнаартылеры́йскі*, *лімóнна-жóўты* і *лімо̀ннакíслы*, *ко̀нтр-адмірáл, мя́са-малóчны* і *мя̀сапрадýкты, óптыкаэлектрóніка* і *óптыка-электрóнны; прэ̀с-клýб, прэ̀с-мóлат, прэ̀с-фíльтр, прэ̀с-цэ́нтр; гі̀драто́рмаз*, *гу̀станасе́лены,* **але** *гідратэ́хніка*, *гідрапрывóд, густавалóсы* (пабочнага націску няма).

Падрыхтоўка такіх выданняў – складаны і працаёмкі працэс. Рэдактару падчас працы варта быць уважлівым і сачыць за тым, каб кожны выкарыстаны знак меў сваё лагічнае абгрунтаванне або тлумачэнне ў апараце лексікаграфічнай кнігі ці ў слоўнікавым артыкуле.

Бібліяграфічныя спасылкі

Арашонкава Г. У., Лемцюгова В. П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Пад рэд. М. В. Бірылы, А. І. Падлужнага. Мінск : Выш. шк., 1986. 210 с.

Плотнікаў Б. А., Антанюк Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. Мінск : Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. 672 с.

Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. Мінск : Выш. шк., 1990. 222 с.

ДА АКРЭСЛЕННЯ ПАНЯЦЦЯ «ФАКТАР» У ЛІНГВІСТЫЦЫ

К.П. Любецкая

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Акадэмічная, 25, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
katerina_lingvo@mail.ru

У працах лінгвістычнай тэматыкі даволі часта пры характарыстыцы ўплываў на развіццё і станаўленне нацыянальнай мовы выкарыстоўваецца паняцце “фактар”. Разам з тым вызначэнне гэтага паняцця і акрэсленне яго дыферэнцыяльных прымет застаецца як бы па-за межамі навуковага асэнсавання, што можа ўскладняць усведамленне ролі тых або іншых акалічнасцей існуючых моўных працэсаў. У артыкуле ставіцца за мэту сістэматызацыя наяўных разнавіднасцей паняцця “фактараў”. На падставе аналізу асобных навуковых крыніц праводзіцца аналіз зместавага напаўнення такіх тэрміналагічных спалучэнняў, як: знешні – унутраны, экстра-унутрымоўны, іншамоўны, пераважаючы – менш значны, традыцыйны – выпадковы, іншамоўны – нацыянальны і інш. фактар.

Ключавыя словы: сацыяльны фактар; знешні фактар; храналагічны фактар; геаграфічны фактар; навуковы фактар; іншамоўны фактар; нацыянальны фактар.

На падставе вывучэння пытанняў развіцця нацыянальных моў, удалося заўважыць, што навукоўцы даволі часта ў сваіх назіраннях звяртаюцца да выкарыстання паняцця “фактар”, якое ўзыходзіць да ідэй В. фон Гумбальта. Апелюючы даволі актыўна гэтым тэрмінам у якасці рабочага паняцця, аўтары навуковых прац, як правіла, не спыняюцца на яго характарыстыцы. Можна нават сцвярджаць, што вызначэнне гэтага паняцця ў мовазнаўчых працах не атрымала дэталёвага і ўважлівага апісання. Пры гэтым праз яго прызму разглядаюцца істотныя працэсы станаўлення нацыянальных моў, а само паняцце “фактар” выкарыстоўваецца як штосьці само сабой зразумелае. У сувязі з гэтым уяўляецца пажаданым больш уважліва паставіцца да гэтага паняцця і сістэматызаваць яго азначэнні і ўжыванні.

Пад паняццем “фактар” разумеюць звычайна “непасрэднае ці ўскоснае ўздзеянне на развіццё таго або іншага ідыёма вонкавых у адносінах да яго з’яў, асоб, працэсаў ці тэндэнцый. Пры гэтым такое ўздзеянне можа праяўляцца як у мэтанакіраваных дзеяннях пабочных феноменаў (актыўны ўплыў), так ў свядомым ці неўсвядомленым засваенні ці ўспрыняцці пэўных ідэй і тэндэнцый (пасіўны ўплыў). Не цяжка зразумець, што ўздзеянне ідыёмаў можа быць узаемным, хаця і не раўназначным” [14, с. 132].

Перадусім падзел можна правесці з улікам характару ўплыву: унутраныя і знешнія фактары. У асноўным шырокі спектр т.зв. знешніх фактараў зводзіцца да таго, што камунікатыўная функцыя мовы вызначае залежнасць мовы ад таго грамадства, у якім яна функцыянуе, пры гэтым даследчыкамі канстатуецца сацыяльная абумоўленасць мовы. Для таго каб пазбегнуць перабольшання ролі сацыяльных фактараў, навукоўцы раяць

скіроўваць увагу на вывучэнне ўздзеяння ўнутраных законаў мовы. Частка з вучоных адзначае, што складанасць пытання палягае ў неабходнасці вырашэння праблемы не ў агульным плане, але ў адносінах да пэўнага ўзроўню мовы і пэўнай падсістэмы. Цікава адзначыць, напрыклад, што тэрміналогія пры гэтым, з'яўляючыся складовай часткай лексікі, дазваляе разгледзець пытанні суадносін моўных і нямоўных фактараў больш выразна на працягу значнага перыяду той або іншай тэрмінасістэмы.

Знешнія фактары – гэта фактары гістарычнага развіцця навукі, тэхнікі, што абумовілі развіццё тэрмінасістэм. "Знешні фактар – гэта тыя гістарычныя і сацыяльныя ўмовы, у якіх адбываецца ўзаемадзеянне разглядаемых моў. Унутраны фактар – гэта тыя тыпы ўзаемадзеяння, якія абумоўліваюцца законамі гэтых моў, іх структурнымі сістэмамі" [8, с. 6]. "У аснове супрацьпастаўлення знешніх і ўнутраных фактараў ляжыць прынцып вызначэння прычыннасці з'яўлення моўных фактаў" [9, с. 4]. Аднак даследчыкамі адзначаецца таксама, што "не варта думаць, што законы развіцця мовы, што выцякаюць з яго грамадскай сутнасці, і законы, што выцякаюць са структуры мовы, - гэта розныя, узаемна не звязаныя заканамернасці як бы розных планаў функцыянавання мовы. На самой справе яны абумоўлены і непадзельны" [3, с. 33]. Пад знешнім моўным фактарам можна разумець уплыў сфарміраваных іншамоўных тэрмінасістэм на беларускую тэрміналогію.

Фармаванне і развіццё пэўнай мовы абумоўлены ўзаемадзеяннем экстра- (сувязь з сістэмай паняццяў) і інтралінгвістычных фактараў. Многія навукоўцы пры вывучэнні праблемы засваення іншамоўных слоў закранаюць пазамоўныя і ўласна моўныя прычыны запазычвання.

Пры вызначэнні адметнага ў экстралінгвістым і ўнутрылінгвістычным у лінгвістыцы прынята прытрымлівацца некалькіх меркаванняў: а) супрацьпастаўляць экстралінгвістычнае ўнутрылінгвістычнаму; б) апісваць вынікі іх узаемадзеяння; в) акрэсліваць залежнасць іх сувязі і ўзаемаабумоўленасці ад іншых фактараў.

Даследчыкамі адзначаецца, што знешні ўплыў на мову ніколі не пакідае грамадства абыякавым. На думку беларускіх даследчыкаў, улік сацыяльна-гістарычных фактараў істотны для асэнсавання адметнасцей развіцця беларускай тэрміналогіі.

"Пераважнае выкарыстанне рускай тэрміналагічнай сістэмы ў сферы навукова-тэхнічных даследаванняў склалася ў Савецкай Беларусі пад уплывам некалькіх фактараў: 1) узрастаючай ролі рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін; 2) сацыяльнага і эканамічнага адзінства нашай краіны; 3) рашаючай ролі Савецкай Расіі ў падрыхтоўцы навуковых кадраў у Беларусі і ў станаўленні беларускай савецкай навукі ў першыя дзесяцігоддзі пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і стварэння Беларускай ССР; 4) значна большай ступені развітасці навукова-тэхнічнай тэрміналогіі рускай мовы ў параўнанні з беларускай у перышя

дзесяцігоддзі развіцця беларускай савецкай навукі; 5) задач абмену навуковай інфармацыяй і навуковага супрацоўніцтва беларускіх вучоных; 6) блізкасці беларускай і рускай моў" [11, с. 6].

Сярод т.зв. сацыяльных фактараў вылучаюцца, напрыклад, ідэалагічны і палітычны [15, с. 132]. Вывучэнне ўплыву палітычнага і ідэалагічнага фактараў на развіццё мовы дазваляе мовазнаўцам весці гаворку пра т.зв. палітычна-ідэалагічную лінгвістыку [4, с. 104]. "Тры вядомыя традыцыі, у рамках якіх адбывалася фарміраванне і развіццё славянскіх літаратурных моў – генетычная (паводле М. Трубяцкога – царкоўнаславянская, для якой у першую чаргу была характэрна "пераемнасць"), арэальная (паводле М.Трубяцкога – чэшска-польская, якая вызначаецца "ўплывамі") і тыпалагічная (т.зв. Вукава, характэрнае паняцце – "узор") – утвараюць храналагічную шкалу, дзе т.зв. Вукава (а дакладней Копітарава) традыцыя з'яўляецца адносна найбольш позняй. Уключэнне ў гэтую традыцыю найбольш маладых па часе фарміравання, але геаграфічна аддаленых славянскіх літаратурных моў – беларускай і македонскай – сведчыць, што часавы фактар шмат у чым прадвызначцў іх характар" [14, с. 34].

Падчас вывучэння моўнага будаўніцтва могуць разглядацца абставіны падрыхтоўкі і правядзення рэформаў. Пры гэтым гаворка вядзецца пра т.зв. сітуацыйныя і ассяроддзевыя фактары або чыннікі [6, с. 24].

У некаторых працах ахарактарызаваны навуковы кантэкст моўнага рэфармавання - навуковы фактар.

Найбольшую ролю, на думку Г.Цыхуна, пры ўтварэнні і развіцці літаратурных моў адыгрываюць т.зв. "геаграфічны (прасторавы) і храналагічны (часавы) моманты, канкрэтная камбінацыя якіх і прадвызначае тып і характар літаратурнай мовы" [13].

У некаторых даследаваннях прасочваюцца змены ў мове ў залежнасці ад індывідуальнай псіхалогіі чалавека, выпадковымі рухамі ў яго маўленні. Увогуле ў шэрагу даследаванняў акрэсліваецца роля чалавечага фактара ў развіцці мовы [1, 10, 11]. Прынята весці гаворку пра гендэрны фактар [49], лінгвакультурны і крэатыўны [7] фактар. У комплекс сацыякультурных фактараў далучаюць як даўнейшыя рода-племянные сувязі, так і канфесійныя, палітычныя, ідэалагічныя, суперэтнічныя і інш. [13].

Па ступені ўздзеяння праводзіцца размежаванне фактараў на тыя, што можна аднесці да т.зв. "пераважаючых" і "менш значных". Сутнасць т.зв. "пераважаючых" крыецца ў тым, што яны аказалі непасрэдны ўплыў на фарміраванне літаратурнай мовы. "Менш значныя" фактары ў гэтым дачыненні мелі апасродкаванае ўздзеянне.

Па інтэнсіўнасці ўздзеяння сярод фактараў вылучаюцца тыя, што аказалі актыўны ўплыў на фармаванне і тыя, што маюць пасіўны ўплыў. Па працягласці ўздзеяння вылучаюцца т.зв. традыцыйныя або пастаянныя фактары ўплыву і выпадковыя. Варта памятаць пры гэтым, што т.зв.

фактары могуць узаемадзейнічаць, могуць змяняцца некалькі разоў, фактары могуць і пярэчыць.

Патрабуе ўдакладнення паняцце “іншамоўны фактар”. Па сваёй сутнасці яго ўплыў на развіццё мовы прадугледжваецца экстралінгвістычнымі прычынамі і выкліканы знешнім уздзеяннем адной мовы на іншую, аднак вынікі такога ўнікнення адбіваюцца перадусім на сістэме мовы. Адзначанае вышэй абумоўлівае характарыстыку іншамоўнага фактара як знешняга (пазамоўнага) і лінгвістычнага адначасова, што стымулюе вырашэнне такіх пытанняў, як: характар уплыву, характар запазычвання, прычыны, мэты і ўмовы гэтага працэсу, тыпы запазычванняў, характар і ступень іх змен.

Уплыў т.зв. іншамоўных фактараў можа праяўляцца таксама ў перайманні спосабаў будавання мовы. Найбольш істотнымі знешнімі фактарамі лічацца заходні і ўсходні, якія “уплывалі на вынікі міжславянскага моўнага ўзаемадзеяння. Што да паўднёвага фактара, то яму належала другарадная роля, якая ў сучасны перыяд развіцця славянскіх моў мінімізавалася” [12, с. 9]. Як адзначаецца лінгвістамі, для беларускай мовы “пераважаючы ўплыў на розных этапах яе развіцця мелі “расейскі”, “польскі”, “украінскі”, “нямецкі”, “славенскі” фактары. Але нельга недаацэньваць і ролю іншых фактараў, такіх, напрыклад, як “чэшскі” (успомнім хаця б яго ўплыў на мову перакладаў Францішка Скарыны ці лінгвістычныя погляды Янкі Станкевіча, якія істотным чынам паўплывалі на сучаснае разуменне паходжання беларускай мовы і на фарміраванне яе сучасных “літаратурных” варыянтаў)” [14, с. 132]. Несумненную цікавасць уяўляе вывучэнне ўздзеяння і менш знаных фактараў, якія сведчаць пра шматвектарны характар узаемадзеяння славянскіх моваў, культур і народаў. Не заўсёды ўзаемадзеянне магло мець непасрэдны характар, але ад гэтага яго роля не змяншаецца.

Уздзеянне “нацыянальнага” фактара застаецца вельмі моцным. “Кожная славянская літаратурная мова, асабліва т.зв. малых народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, аказваецца апутанай густой сеткай уплываў суседніх і больш далёкіх народаў, іх палітыкі, ідэалогіі, культуры, навукі і г.д. Пры гэтым па тых ці іншых суб’ектыўных прычынах “нацыянальны” кампанент такіх уплываў можа быць зусім непрапарцыянальным да ступені тэрытарыяльнай блізкасці і месца ў эканамічным, палітычным і і ншым жыцці Еўропы і свету” [16, с. 32].

Падагульняючы адзначанае вышэй, можна пагадзіцца з меркаваннем навукоўцаў, што “ўзаемадзеянне знешніх і ўнутраных фактараў – галоўны закон у развіцці мовы... У працэсе станаўлення новай якасці знешнія і ўнутраныя фактары могуць праявіцца з рознавялікай сілай, прычым нераўнамернасць іх узаемадзеяння вынікае звычайна ў тым, што стымулючая сіла ўздзеяння знешняга, сацыяльнага фактара або актывізуе ўнутраные працэсы ў мове, або, наадварот, замаруджвае іх. Прычыны таго і

іншага караняцца ў тых зменах, якія зазнае само грамадства, носьбіт мовы” [2, с. 8].

Такім чынам, можна меркаваць, што ўсведамленне напрацаванага ў лінгвістыцы значнага вопыту у характарыстыцы паняцця “фактар” (знешні – унутраны, экстра-унутрымоўны, іншамоўны, пераважаючы – менш значны, традыцыйны – выпадковы, іншамоўны – нацыянальны і інш.), паспрыяе дакладнасці правядзення навуковых даследаванняў у далейшым.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Будагов Р.А.* Человек и его язык. 2-е изд., расшир. М. : Изд-во МГУ, 1976.
2. *Валгина Н.С.* Активные процессы в современном русском языке : Учебное пособие для студентов вузов. М. : Логос, 2001. 304 с.
3. *Виноградов В.В.* Лексикология и лексикография : Избранные труды. М. : Наука, 1977. 312 с.
4. Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941) : хрэст. для студэнтаў філал. фак. У 2 ч. Ч. 2 / аўт.-уклад. С.М. Запрудскі, Г.І. Кулеш. Мінск : БДУ, 2008. 259 с.
5. *Заболотнова М.В.* Специфика реализации гендерного фактора при переводе с японского языка : морфосинтаксический уровень : диссертация… кандидата филологических наук: 10.02.20. Челябинск, 2007. 164 с.
6. *Запрудскі С.* Правапісныя рэформы ў славянскіх літаратурных мовах у XX стагоддзі. Мінск БДУ, 1998. 24 с.
7. *Коптева Н.В.* Функционирование колоризмов в художественном тексте как результата взаимодействия лингвокультурного и креативного факторов : На материале творчества русских писателей XIX–XX вв. : диссертация … кандидата филологических наук: 10.02.01. Ростов-на-Дону, 2005. 247 с.
8. *Крукоўскі Н.І.* Рускі лексічны ўплыў на сучасную беларускую літаратурную мову. Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук Беларускай ССР, 1958. 173 с.
9. Роль человеческого фактора в языке: Язык и картина мира / Б.А. Серебренников, Е.С. Кубрякова, В.И. Постовалова и др. М. : Наука, 1988. 216 с.
10. *Серебренников Б.А.* О материалистическом подходе к явлениям языка. М. : Наука, 1983. 319 с.
11. *Серебренников Б.А.* Об относительной самостоятельности развития системы языка. М. : Наука, 1968. 124 с.
12. *Цыхун Г.* Міжславянскае моўнае ўзаемадзеянне (сацыякультурны аспект) / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Бел. камітэт славістаў. Мінск : 2003. 24 с.
13. *Цыхун Г.* Сацыякультурны аспект у гісторыі беларускай літаратурнай мовы (т. зв. нямецкі фактар) // Normen, Namen und Tendenzen in der Slavia. Festschrift für Karl Gutschmidt zum 65. Geburtstag. München : Verlag Otto Sagner, 2004. S. 153–159.
14. *Цыхун Г.* Да беларуска-славенскіх дачыненняў (гістарычна-моўная праблематыка // Беларуская мова : шляхі развіцця, кантакты, перспектывы : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / рэдкал.: Г. Цыхун (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. С. 132–136.
15. *Litwinoŭskaja A., Cychun H.* Паланізмы ў лексічнай норме беларускай літаратурнай мовы. // Białostocki Przegląd Kresowy. T. 3. Kontakty językowe pogranicza kultur narodowych / pod redakcją Jana Franciszka Nosowicza. Białystok, 1995. S. 133–141.
16. *Wexler P.* Belorussifikation, Russifikation and Polonization trends in the Belorussian language 1890–1982 // Sociolinguistic perspectives on Soviet national languages: their past, present and future. Berlin; New York; Amsterdam. P. 38–56.

ЧИСЛОВОЙ КОД В ТВОРЧЕСТВЕ Е.А. ЕВТУШЕНКО

А.А. Печенькова

Витебский государственный университет имени П.М. Машерова,
Московский пр-т, 33, г. Витебск, Республика Беларусь,
anastasia4366@rambler.ru

Рассматривается числовой код в творчестве Е.А. Евтушенко с точки зрения частотности употребления; описаны основные значения найденных единиц; приведены примеры функционирования чисел и нумеративов в стихотворениях автора. Цель исследования – показать функционирование числа (как имени числительного, квантитатива, нумератива) в творчестве Е.А. Евтушенко в прагматическом и семантическом аспекте.

Ключевые слова: число; нумератив; числовой код; семантика числа; художественный текст; процесс метафоризации.

Современный анализ текста всё чаще обращается к прагматическому аспекту. Одной из малоизученных единиц является число. Исследования обычно обращены к числу как имени числительному и исключают нумеративы и/или квантитативы, однако расширенное понимание числа как единицы кода, заключающего в себе определенное значение, включает в себя и слова, косвенно связанные с именами числительными или являющимися результатом процессов нумерализации. Данная статья обратится к числовому коду в стихотворениях Е.А. Евтушенко.

Материалы и методы исследования. Для выявления прагматического аспекта числа в творчестве Е.А. Евтушенко были выбраны стихотворения, содержащие в текстах числа или нумеративы. Методы исследования: количественный, описательный, компонентного анализа.

Полученные результаты. Проведенный анализ имен числительных и нумеративов, входящих в тексты произведений Е.А. Евтушенко, следует отметить наличие авторской семантики обнаруженным единицам. Не каждое число имеет символическое значение, поэтому важно находить и разграничивать слова, которые имеют композиционную значимость и которые могут иметь опосредованное значение. Нами были обнаружены следующие особенности использования чисел в стихотворениях.

Число «один». Один обычно выражает какое-то единство, обособленность или перечисление, что обусловлено контекстом. В стихотворениях Е.А. Евтушенко прослеживаются основных два значения: обособленность, отстраненность, одиночество и последовательность предметов. Первый семантический ряд ярко представлен в «Письме в Париж» [1, с. 259] («… а вы свободны, когда один?») [1, с. 259], в первых строчках безымянного стихотворения «Я кошелек. Лежу на дороге. Лежу

один посередине дня» [1, с. 373], где неодушевленный предмет становится одиноким наблюдателем жизни людей вокруг или в «В миге полуосени-полузимы» [2]: «Снова один. Ничего. Не впервые. Лучше я буду совсем одинок» [2] и т.п. Последовательность предметов обнаруживается в «Когда мужчине сорок лет» [1, с. 125] и в «Парке» [1, с. 241]: «Один роман, другой роман, в а результате…» [1, с. 126] или «Один из них кричит о вреде открытой критики у нас, что, мол, враги кругом, что время неподходящее сейчас. Другой - что это все убого, что ложь рождает только ложь…»[1, с. 242], где значение в нумеративах «один» и «другой» (связанный с числом «два») становится единым, обозначающим смену предметов, малозначащую в жизни лирических героев. Иное значение переносится на слово «первый». Это в контексте часто субстантивированное существительное или адъективированное прилагательное. В каноничном стихотворении писателя «Людей неинтересных в мире нет» [1, с. 146] строки: «И если умирает человек, с ним умирает первый его снег, и первый поцелуй, и первый бой…» [1, с. 146], которые выражают принадлежность всех «первых» дел в жизни человека, которые принадлежат только ему и им же сохраняются. Такое же значение появляется в стихотворении «Между Лубянкой и Политехническим» [3] («Мой первый стих был горько поучительным, а всё же мой – ни у кого не спёрт!» [1]), в стихотворении «Глухариный ток» [3] («и первый шаг, такой же робкий…» [3]) и др.

Число «два» выражает парность каких-то явлений или предметов. Е.А. Евтушенко называет стихотворения «Два города» [1, с. 57] , в котором любовь сравнивается с двумя городами, «Две любви» [3], в котором дуализм проходит через весь текст «две любви – то ли это подарок <..>, то ли это война <..>, две любви, как два камня…» [1, с. 57] или в «Я старше себя на твои тридцать три» [3], где *два* обозначает «два прошлых» [3], «два бытия» [3] и «две пули» [3], которыми можно убить человека (из них одна для жизни лирического героя, а вторая – для жизни его любви). В упомянутом «Когда мужчине сорок лет» [1, с. 125] *два* выступает, как отражение типов стыда, один из которых «когда торгуешь» [1, с. 125] и «когда торгуют тобой» [1, с. 125]. Встречается также в стихотворении «Изумрудины» [3], где становится счетным словом для количества глаз: «Две изумрудины у тебя на лице» [3]. Интересно выражение в стихотворении «Я бужу своего двухколесного друга» [1, с. 179] (стихотворение «На велосипеде» [1, с. 179]), где за метафоричным выражением скрывается просто слово – велосипед. Число два выражается в субстантиве или адъективированном слове «другой», которое было упомянуто при семантике предыдущего имени числительного. В целом, данная лексема представлена значительно реже.

Выражение значений «три» и «тридцать» встречает в некоторых стихотворениях поэта. Простое число три и сложные числа, в составе которых встречается данная лексема, имеют сакральное значение в русской

культуре, так как мерилом можно считать триединство. У автора было обнаружено одноименное «Три фигурки» [3], где за фигурами скрывается семья («Три фигурки – вся моя семья» [3]), а в которой должно быть минимум три человека. Или в стихотворении «По ягоды» [1, с. 268]: «Три женщины и две девчонки куцых…» [1, с. 268], в котором каждая из женщина имеет свой прототип русского характера; в стихотворении «Три минуты правды» [3], посвященном кубинскому герою Хосе Антонио Эчеварилья, который смог пробраться в радиоцентр и рассказать людям правду, герой имеет всего лишь «три минуты» [3], чтобы рассказать правду. Герой готов бороться даже за такое время, чтобы донести до людей свою веру. Лексема «тридцать» встречается в стихотворении «Ира» [3], где тридцатилетие – это время, когда женщина стареет снаружи и уже должна найти себе партнера, однако Е.А. Евтушенко желает героине найти этого человека, или в стихотворении «В погоне за дешевой популярностью» [3] осмысляет тридцатилетие, как «Мне скоро тридцать. Я герой пародий, статей, разоблачительных стихов» [3], и говорит о мнении публики касательно содержания стихотворений. В упомянутом уже «Я старше себя на твои тридцать три» [3] упоминает важный возраст, связанный с Богом, который может обозначать возраст мудрости и ума. Порядковое «третий» претерпевает адъективацию и встречается в названиях двух стихотворений: «Третий снег» [1, с. 339], где люди ждут настоящей зимы, которая приходит с третьим не растаявшим сразу снегом, и «Третья память» [3], где «третья память – это память тела» [3], сравниваемая с ощущениями от пережитой ситуации или события.

Редкой, как и число два, является лексема четыре, обнаруженное в названии «Четыре чулочницы» [3], где четвертая чулочница одинока, в отличие от трёх других, имеющих мужей с недостатками. Четвертая осталась одна: «А четвёртая – та, что ничья не жена, остаётся одна и стоит у окна» [4], поэтому её утешат подаренным щенком. Четыре обычно олицетворяет времена года, однако здесь четверке предается значение обособленности, отдаленности от замкнутости и единства тройки. «Сорок» употребляется при обозначении возраста в строке из стихотворения «По ягоды» [1, с. 268]. Ярко отражен возраст «сорок лет» в одноименном названии «Когда мужчине сорок лет» [1, с. 125], где автор играет с числом как показателем опытом человека, возрастом завершенности взросления: «снисхожденья ему нет перед собой и перед богом», «пора наложить запрет на жажду удовольствий» [1, с. 125]. Очень ярко показывает стадии внутреннего взросления строки: «До сорока яснее цель, до сорока вся жизнь как хмель, а в сорок лет – похмелье» [1, с. 125], а после сорока человек становится спокойным и «жизнь его красит в серый цвет» [1, с. 125], чтобы сделать его подобным толпе. Автор призывает «не теряться в драме» [1, с. 125], потому что только человек решает, заканчивать ли жизнь на этом числе или «расцвести» [1, с. 125]. Сорок входит в состав года «сорок

первого» как маркера стихотворения о войне (к примеру, «Спутница» [1, с. 324]) и т.п.

Лексемы пять, шесть, семь, восемь, девять и десять почти не встречаются. Отдельно можно найти числительные *пять* и *семь* в стихотворении «И в детях правды нет…» [2], где возрасту дано свое значение: пять лет – «подлиза» [2], в семь – «ябеда» [2], или в стихотворении «Где дорога домой?» [3] упоминание возраста: шестилетний, пятилетняя. В стихотворении «На велосипеде» [1, с. 179] герой ставит «будильник на восемь» [1, с. 179], чтобы упорядочить время написания стихотворений. У числа «семь» есть обозначение «на семь бед мой ответ: где любовь, смерти нет» [3] («Что знает о любви любовь» [3]), в котором за число скрыты определенные преграды. В остальных стихотворениях данные числа встречаются редко или не имеют более глубоко значения. Десять встречает в выражении «до десятого пота» [1, с. 379] трудиться в стихотворении «Я сибирской породы» [1, с. 379].

Можно встретить число «сто» и «миллион» в значении общего, неконкретного количества: «Не помню, сколько их, галдевших, било. Быть может, сто, быть может, больше было…» [1, с. 101] (стихотворение «Картинка детства» [1, с. 101]), где упоминается воспоминания ребенка о войне и преувеличении маленьким человеком числа ввиду несоразмерности мира возрасту, или в стихотворении «Гены» [3] - «Когда с твоей кровью навсегда мильоны не услышанных пророков уйдут сквозь раны в землю без следа» [3], которое обозначает, что каждый человек является частью какого-то рода и каждое поколение отражает историю народа, его обычаи, традиции, эволюцию тела и разума.

Можно и отметить слова, которые могут выражать отсутствие числа. К примеру, в стихотворении «Нет лет» слово «нет» заменяет число ноль, а в стихотворениях «Был я столько раз больно ранен» [1, с. 28], «Когда мужики ряболицые…» [1, с. 119] и др. словом «столько» выражается какое-то большое и значимое число.

Исходя из данных, описанных выше, можно сделать вывод о том, что частотными и представленными большим количеством сем являются лексемы «один» и «три» (и их варианты), менее – «два», «четыре», остальные встречаются редко. Можно обнаружить слова, имеющие числовое значение, рода «нет» - ноль, «столько» - большое количество и др.

Заключение. Использование числа и нумератива в художественном тексте имеет значительное культурное значение. Обозначение и замена числом понятий единства, обособленности, дуальности и т.п. показывает через призму числового выражения понимание окружающего мира. Понятия триединства (от числа три), единости (от числа один), двойственности (от числа два) выражаются в прагматическом аспекте в

литературных произведениях. Для творчества Е.А. Евтушенко характерно использование чисел *один* и *три* и их производных, слов со значением числа или отсутствия какого-либо количества, что указывает на отражение понимания русской культуры (для славян характерно сакральное отношение к числам один и три). Таким образом, исследования в области семантики и прагматики числа как кода может показать отражение культуры в художественном тексте при помощи метафоризации количества.

Библиографические ссылки

1. *Евтушенко Е.А.* Полное собрание сочинений: классика XX века [Электронный ресурс]. Москва : Моя большая книга. 406 с. URL: https://fb2-epub.ru/load/babij_jar_polnoe_sobranie_stikhotvorenij_evgenij_evtushenko/1-1-0-13118 (дата обращения: 10.10.2020).

2. *Евтушенко Е.А.* Стихи [Электронный ресурс]. URL: https://rustih.ru/evgenij-evtushenko/ (дата обращения: 12.10.2020).

3. *Евтушенко Е. А.* Стихотворения [Электронный ресурс]. URL: http://www.evtushenko.net/index.html (дата обращения: 12.10.2020).

4. *Трессидер Дж.* Словарь символов. М. : Гранд : ФАИР-пресс, 1999. 443 с.

ЗМЕНЫ Ў ПРАВАПІСЕ БЕЛАРУСКІХ ЭКАНАМІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

В.У. Праконіна

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
veraprok88@mail.ru

На працягу XX–XXI стст. арфаграфічныя нормы мяняліся ў сувязі з рэформамі беларускага правапісу. На прыкладзе 243 беларускіх эканамічных тэрміналагічных адзінак разгледжаны і прааналізаваны змены арфаграфічнага афармлення тэрмінаў на падставе разгляду фактычнага матэрыялу крыніц беларускай эканамічнай тэрміналогіі. Змены ў правапісе беларускіх эканамічных тэрміналагічных адзінак былі прасочаны на двух паслядоўных этапах у развіцці арфаграфічнага афармлення тэрмінаў: змена арфаграфічных норм “тарашкевіцы” на “наркамаўку”; змена арфаграфічных норм паводле «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» 1959 года на нормы рэформы 2008 года. Аналіз фактычнага матэрыялу дае падставы сцвярджаць аб неабходнасці ў афармленні значнай колькасці беларускіх эканамічных тэрмінаў у адпаведнасці з апошнімі «Правіламі беларускай арфаграфіі» і ў стварэнні максімальна поўнага перакладнога тэрміналагічнага слоўніка, у якім былі б адлюстраваны сучасныя нормы правапісу.

Ключавыя словы: арфаграфічныя нормы; беларускія эканамічныя тэрміны; беларускі правапіс; змены ў правапісе.

На працягу станаўлення, фарміравання і развіцця беларускай эканамічнай тэрміналогіі беларускі правапіс неаднаразова мяняўся. У 20-ыя гг. XX ст. тэрмінолагі карысталіся “тарашкевіцай”, пасля рэформы 1933

года правапіс быў кардынальна зменены. А.І. Жураўскі адзначае, што «ў даваенных замежных выданнях на беларускай мове больш ці менш паслядоўна захоўваліся правапісныя і граматычныя нормы дарэформеннага беларускага правапісу, тады як у Савецкай Беларусі ўсе выданні прытрымліваліся толькі новага правапісу, прынятага ў 1933 г. Так фактычна ўзніклі два варыянты беларускай літаратурнай мовы, адрозненні паміж імі выяўляліся ў правапісных нормах, граматычных формах і ў лексіцы» [1, с. 8]. Палажэнні адпаведнай рэформы былі ўдакладнены ў «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацы» 1959 года. На сучасным этапе арфаграфічныя нормы былі мадыфікаваны ў 2008 годзе ў сувязі з выхадам новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Змены моўных норм вядуць да змен у правапісе беларускіх эканамічных тэрмінаў.

На прыкладзе 243 беларускіх эканамічных тэрміналагічных адзінак, адабраных з крыніц беларускай эканамічнай тэрміналогіі XX стагоддзя, былі прасочаны змены ў іх правапісе на двух паслядоўных этапах у развіцці арфаграфічнага афармлення тэрмінаў.

І. Змена арфаграфічных норм “тарашкевіцы” на “наркамаўку” пасля рэформы беларускага правапісу 1933 г. і ўдакладнення гэтай рэформы ў 1959 годзе;

ІІ. Змена арфаграфічных норм паводле «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» 1959 года на нормы рэформы 2008 года.

У межах першага этапа адбыліся наступныя змены ў арфаграфічным афармленні эканамічных тэрмінаў.

1. Неадлюстраванне асіміляцыйнай мяккасці на пісьме: *арышт маемасьці* [6, с. 52] – *арышт маёмасці* [4, с. 11], *арэчаўленьне* [13, с. 503] – *арэчаўленне* [27, с. 76], *валюта зьменная* [6, с. 54] – *зменная валюта* [12, с. 52],

2. Перадача фіналі –а ў нескланяльных іншамоўных словах замест фіналі -о: *ажыё* [6, с. 51], *ажыо* [13, с. 499] – *ажыа* [22, с. 291], *інкасо* [6, с. 58] – *інкаса* [20, с. 27], *камбіё* [6, с. 59] – *камбіа* [7, с. 195], *манко* [6, с. 61] – *манка* [8, с. 14], *сальдо* [13, с. 506] – *сальда* [8, с. 86].

3. Неадлюстраванне мяккасці [л’] на пісьме ў запазычаных тэрмінах: *алёнж* [6, с. 52] – *алонж* [7, с. 192], *амбаляж* [6, с. 52] – *амбалаж* [4, с. 9], *балянс* [14, с. 197] – *баланс* [4, с. 12], *блянк вэксальны* [6, с. 55] – *бланк вэксальны* [22, с. 292], *валёрызацыя* [6, с. 54] – *варарызацыя* [7, с. 193].

4. Змякчэнне [п], [м], [б], [в], [н], [з], [с] перад [э]: *акцыянэр* [6, с. 52] – *акцыянер* [4, с. 8], *асыгнацыя* [13, с. 499] – *асігнацыі* [4, с. 11], *банк камэрцыйны* [6, с. 59] – *камерцыйны банк* [12, с. 30], *бімэталізм* [13, с. 499] – *біметалізм* [20, с. 8–9], *бэса* [6, с. 53] – *беса* [22, с. 292], *вірэмэнт* [6, с. 54] – *вірэмент* [23, с. 283], *дэбэт* [13, с. 501] – *дэбет* [4, с. 30], *дэпонэнт* [6, с. 57] – *дэпанент* [20, с. 16].

5. Змены ў пачатковых галосных і зычных, страта пратэтычных зычных: *гіпотэка* [13, с. 501] – *іпатэка* [20, с. 27].

6. Перадача акання ў ненаціскных складах: *амортызацыя* [13, с. 499] – *амартызацыя* [24, с. 6], *боніфікацыя* [6, с. 53] – *баніфікацыя* [4, с. 16], *бордэро* [6, с. 53] – *бардэра* [22, с. 292], *доміцыль* [6, с. 56] – *даміцыль* [20, с. 23], *дэномінацыя* [13, с. 501] – *дэнамінацыя* [12, с. 17], *імобілізацыя капіталу* [6, с. 58] – *імабілізацыя капіталу* [22, с. 296].

7. Змена [дзк] на [дск]: *гаспадарка грамадзкая* [13, с. 501] – *гаспадарка грамадская* [28, с. 61], *падзел працы грамадзкі* [13, с. 501] – *грамадскі падзел працы* [8, с. 37], *праца грамадзка-карысная* [13, с. 505] – *грамадска карысная праца* [12, с. 47].

8. Замена суфіксаў –эр – на суфікс –ор: *арбітражэр, пасрэднік* [6, с. 52] – *арбітражор* [22, с. 291], *комі-вояжэр* [6, с. 60], *комівояжэр* [13, с. 503] – *коміваяжор* [12, с. 30], *экспортэр* [6, с. 71] – *экспарцёр* [8, с. 148].

9. Змякчэнне [т] у словах іншамоўнага паходжання: *тант'ема* [13, с. 506] – *танцьема* [8, с. 108], *рант'е* [13, с. 506] – *ранц'е* [8, с. 71], *ранцье* [9, с. 209].

10. Замена [а] на [э] ў корані іншамоўнага слова: *матар'ял* [6, с. 61] – *матэрыял* [25, с. 57].

У некаторых беларускіх эканамічных тэрмінах назіраюцца некалькі арфаграфічных змен у правапісе адначасова, напр. неадлюстраванне асіміляцыйнай мяккасці і замена [о] на [а] у ненаціскных складах і г.д.: *уласнасьць колектыўная* [13, с. 507] – *уласнасць калектыўная* [11, с. 207–208], *продукцыйнасьць* [14, с. 199] – *прадукцыйнасць* [10, с. 196], *разьмеркаваньне прыбыткаў* [6, с. 66] – *размеркаванне прыбытку* [4, с. 96], *росьпіска* [6, с. 66] – *распіска* [7, с. 197], *концэнтрацыя вытворчасьці* [13, с. 503] – *канцэнтрацыя вытворчасці* [11, с. 109–110], *ліквіднасьць балянсу* [6, с. 61] –*ліквіднасць балансу* [16, с. 60], *бугальтар* [6, с. 53] – *бухгальтэр* [13, с. 500] – *бухгалтар* [4, с. 17], *бугальтэрыя* [6, с. 53] – *бухгалтэрыя* [10, с. 15]. Гэта асаблівасць характэрна для такіх пар тэрмінаў, у якіх адзін з тэрмінаў узяты з крыніц пачатку XX стагоддзя, а другі – канца XX – пачатку XXI стст.

Паслядоўнае адлюстраванне названых арфаграфічных змен сведчыць пра тое, што к канцу першага этапа напісанне беларускай эканамічнай тэрміналогіі вызначалася аднастайнасцю і адпавядала “Правілам беларускай арфаграфіі” 1959 г.

Змены ў правапісе на другім этапе мелі наступныя асаблівасці:

1. Змены ў правапісе асобных зычных і галосных у корані слова і ў асобных суфіксах: *блоуаут* [17, с. 102] – *блоўаўт* [9, с. 202], *плацёжнае даручэнне* [8, с. 51] – *плацежнае даручэнне* [4, с. 42], *ф'ючэрская здзелка* [20, с. 80], *ф'ючэрсная здзелка* [24, с. 50] – *здзелка ф'ючарсная* [22, с. 296].

2. Перадача ненаціскной фіналі –ар у запазычаных словах замест фіналі –эр згодна з новай рэдакцыяй “Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”

(2008): *бартэрная здзелка* [21, с. 7] – *бартарная здзелка* [26, с. 10], *ордэр* [10, с. 43] – *ордар* [26, с. 29], *трэйдэр* [25, с. 91] – *трэйдар* [26, с. 42], *тэндэр* [29, с. 55] – *тэндар* [27, с. 78].

У прыведзеных парах беларускіх эканамічных тэрмінаў нарматыўным з'яўляецца другі тэрмін.

Змены ў правапісе беларускіх эканамічных тэрмінаў былі прааналізаваны на падставе разгляду фактычнага матэрыялу крыніц беларускай эканамічнай тэрміналогіі. Картатэка беларускіх эканамічных тэрмінаў налічвае 112 крыніц. Гэта слоўнікі (47), вучэбныя дапаможнікі і падручнікі (18), метадычныя указанні, праграмы і практыкумы (11), часопісы (36). 16 крыніц з дадзенага пераліку выдадзена пасля 2008 года. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць у афармленні значнай колькасці беларускіх эканамічных тэрмінаў у адпаведнасці з апошнімі "Правіламі беларускай арфаграфіі" і ў стварэнні максімальна поўнага перакладнога тэрміналагічнага слоўніка, у якім былі б адлюстраваны сучасныя нормы правапісу.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Жураўскі А. І.* Праблемы норм беларускай літаратурнай мовы / АН Беларусі, Беларус. кам. славістаў. Мінск : Навука і тэхніка, 1993. 35 с.

Крыніцы фактычнага матэрыялу

1. *Агароднікава С. В.* Беларуская мова : Зб. практыкаванняў для студэнтаў экан. ВНУ/ С. В. Агароднікава, М. І. Бажкова, І.І. Навасельцава. Мінск : БДЭУ, 1999. 88 с.

2. Аграрная эканоміка : Карот. слоўнік / П. В. Лешчылоўскі, Б. В.Ульянка, У. К.Буга; пад. рэд. Г.М. Лыча. Мінск : Ураджай, 1990. 143 с.

3. *Акуленка А. А.* Руска-беларускі слоўнік эканамічных тэрмінаў / А.А. Акуленка, Г.Ф. Вештарт, Т.М. Трухан. Мінск : Права і эканоміка, 2011. 123 с.

4. *Асіпчук А.М.* Беларуская мова. Прафесійная лексіка : дапам. / А.М. Асіпчук, В. В. Маршэўская, А.С. Садоўская. Гродна : ГрДУ, 2009. 271 с.

5. Беларуская навуковая тэрміналогія. Вып. 17 : Слоўнік бухгалтарскай тэрміналогіі : расійска-беларускі слоўнік : праект. Менск : Выд. ін-та беларус. культуры, 1928. 71 с.

6. Внешнеэкономическая деятельность : Словарь-справочник / С.Ю. Кричевский, Д.И. Панков, Л.В. Бедрицкая, В.Ф. Толстоухова; под ред. С.Ю. Кричевского. Минск : Выш. шк. 1992. 208 с.

7. *Гассиева И. И., Молочко Н. В.* Словарь-минимум экономических терминов : русско-белорусско-англо-французско-арабский : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т; ред. Р.В. Михновец. Минск : БГЭУ, 1995. Ч. 2. : Л–Я. 88 с.

8. *Губкіна А.В.* Беларуская мова. Эканамічная лексіка / А.В. Губкіна, В. А. Зразікава. Мінск : Издательство Гревцова, 2009. 198 с.

9. *Дубовик А.Е.* Англо-русско-белорусский словарь менеджера = English-Russian-Delarussian dictionary for a manager = Англа-руска-беларускі слоўнік менеджэра. Мінск : Выш. шк., 1996. 320 с.

10. Кароткі эканамічны слоўнік / скл. Я.А. Александровіч, В.В. Асмалоўскі, І.В. Балдзін, Ф. В. Баравік, А. І. Бязлюдаў, Р. П. Валевіч, С. С. Васкоўскі; пад рэд. М.І. Платніцкага. Мінск : БДЭУ, 1993. 256 с.

11. Краткий русско-белорусский словарь экономических и бухгалтерских терминов / сост. О. П. Зенькович, П. И. Малько, В. С. Молчан, А. А. Скикевич, Т. И. Скикевич; под ред. О. П. Зенькович. Минск : Ураджай, 1994. 88 с.

12. *Лапідус І.* Палітычная эканомія ў сувязі з тэорыяй савецкай гаспадаркі. Мінск : Белдзяржвыд., 1931. 516 с.

13. *Любімаў Л.* Палітычная эканомія : (пачатковы курс). Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925. 208 с.

14. *Лявонцьеў Л. А.* Пачатковы курс палітычнай эканоміі. Мінск : Дзяржвыд. Беларусі. Соцэкпраўсектар, 1936. 370 с.

15. *Малашук І. М.* Беларуская мова. Прафесійная лексіка: камунікатыўны аспект. Мінск : БДЭУ, 2009. 71 с.

16. Маркетинг: Словарь-справочник / Л. В. Бедрицкая, М. А. Кудревич, В. К. Матюшевская, М. В. Мишкевич, В. С. Протасеня, В. Ф. Толстоухова. Минск : Выш. шк., 1993. 333 с.

17. *Наталевич О. Г.* Русско-белорусский словарь экономических терминов (с учётом новых правил белорусской орфографии) / О. Г. Наталевич, М. Н. Юнаш, С. В. Огородникова. Минск : БГЭУ, 2010. 47 с.

18. Падлік, аналіз, кантроль : Руска-беларускі тлумачальны слоўнік / Скл. В. І. Стражаў, Л. І. Краўчанка, А. П. Міхалкевіч, Н. А. Русак, В. В. Кажарскі, П. Я. Панкоўская, А. М. Сушкевіч, Д. А. Панкоў. Мінск : БДІНГ, 1990. 32 с.

19. *Слепуха Н. В.* Краткий русско-белорусский словарь экономических терминов : учебно-методическое пособие. Минск : Частный институт управления и предпринимательства, 2007. 85 с.

20. Словарь менеджера / Г. И. Кравцова, М. И. Плотницкий, Р. П. Валевич, Е. И. Кравцов, Г. К. Мультан, М. Г. Пронина, А. Н. Тур; под ред. Г. И. Кравцовой, М. И. Плотницкого. Минск : Выш. шк., 1992. 136 с.

21. Словарь-справочник по современной экономике : на пяти языках / М.В. Мишкевич, Л. И., Василевская, В. Н., Ермаков, М.И. Плотницкий; под общ. ред. М.И. Плотницкого, М.В. Мишкевича. Минск : Выш. шк., 1996. 364 с.

22. Слоўнік катэгорый эканамічнай тэорыі / С. Я. Янчанка (кіраўнік), Т. І. Адамовіч, А. І. Ванькевіч і інш. Мінск : Ін-т эканомікі Нац. акад. навук Беларусі, 1999. 286 с.

23. Слоўнік эканамічных тэрмінаў / склад. Г.І. Базылева. Мінск : МДПІ, 1992. 54 с.

24. Тлумачальны слоўнік гандлёвых тэрмінаў / Р. П. Валевіч, М. М. Нясмелаў, А. Г. Роміна, Г. В. Траяноўская; пад агул. рэд. Р. П. Валевіч. Мінск : Выш.шк., 1995. 103 с.

25. Тэксты для аналізу і перакладу : Метадычныя распрацоўкі для студэнтаў-завочнікаў факультэтаў прадпрымальніцтва і кіравання па спецыяльнасці «Прадпрымальніцкая дзейнасць» / Бел. дзярж. аграр. тэхн. ун-т., Каф. бел. і рус. моў; склад. А. П. Занкавіч. Мінск : БАТУ, 1998. 13 с.

26. *Шаршнёў А. В.* Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Мінск : Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва, 2010. 85 с.

27. Эканамічная тэорыя : вучэбна-метадычны дапаможнік / Л. М. Давыдзенка і інш. Мінск : БДПУ, 2007. 339 с.

28. *Jasińska-Socha Teresa.* Mały praktyczny słownik biznesmena białorusko-polski polsko-białoruski : [około 2000 haseł] / Teresa Jasińska-Socha, Nadzieja Panasiuk. 1-ewyd. Warszawa : Wydawnictwa Szkolne i Pedagogiczne, 1995. 116 s.

МІКОЛА ШАБОВІЧ ЯК СТВАРАЛЬНІК І ДАСЛЕДЧЫК АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ

М. Р. Прыгодзіч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
mik197@tut.by

На матэрыяле паэтычных зборнікаў аналізуюцца індывідуальна-стылістычныя неалагізмы Міколы Шабовіча, прафесійнага лінгвіста і даследчыка аўтарскай неалагізацыі ў творах беларускіх пісьменнікаў 1920-х гадоў і адначасова інтэрпрэтатара і стваральніка ўласных неалагізмаў. Вызначаюцца словаўтваральныя тыпы і мадэлі, паводле якіх ствараюцца неалагізмы, аналізуюцца працэсы станаўлення і перспектывы далейшага развіцця аўтарскай неалагізацыі як аднаго з важнейшых спосабаў папаўнення і абнаўлення лексічнага саставу сучаснай беларускай літаратурнай мовы

Ключавыя словы: аўтарскія неалагізмы; неалагізацыя; лексічны састаў; папаўненне слоўніка; літаратурная кадыфікацыя; перспектывы развіцця.

Імя Міколы Шабовіча добра вядома як аматарам беларускай паэзіі, так і даследчыкам аказіянальнаўтворанай лексікі, выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Лаўрэат Рэспубліканскай прэміі «Залаты Купідон» і Міжнароднай літаратурнай прэміі імя С.А. Ясеніна, аўтар сямі паэтычных кніг не толькі ўважліва і самазахоплена даследуе літаратурную спадчыну іншых, але і стварае ўласныя “паэтычныя смеласці” (Г. Лорка). Пра словатворчасць паэта хораша выказаўся А. Нафрановіч: «У гэтай няпростай рабоце аб’ядноўваюцца тонкі назіральнік і вопытны мовазнаўца: *луг мядова-траваросны, рыжаспеўны вецер, натоўп шумнавіры, зорнаспеўна ў вышыні, яснаспевіць лета, глядзіць сонечнавока, кветавір, малітварука слухаць споведзь.* Пісьмо М. Шабовіча адметнае сваёй нязмушанасцю, радкі то бурліва струменяць, то цякуць спакойнай плынню. Кожны з іх сэнсава багаты, па-філасофску заглыблены, яны схіляюць, як правіла, чытача да роздуму. І тэхніка вершаскладання бездакорная. І самае, бадай, адметнае – музычнасць паэтычнай мовы …» [4].

Сёння ўжо складана адказаць на пытанне, што было раней: уласны аўтарскі неалагізм як элемент паэтыкі ці лінгвістычны складнік гэтага феномена. І не дзіва, калі ўлічыць, што ў свой час пачаткоўцу-паэту і маладому аспіранту прафесар Міхась Яўневіч прапанаваў тэму, звязаную з аказіянальным словам у беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гадоў XX стагоддзя. Адзначым, што кандыдацкая дысертацыя М. Шабовіча па аказіяналізмах была не першай у беларускім мовазнаўстве, да яго працы дысертацыйныя даследаванні абаранілі такія вядомыя сёння даследчыкі аўтарскіх неалагізмаў, як Г. Басава (1982), І. Казейка (1988), У. Бобрык (1992), Н. Чарнаброўкіна (1999), В. Варановіч (2000). Аднак ніхто з гэтых

лінгвістаў не звяртаўся да аналізу неалагічнай лексікі 1920-х гадоў, перыяду актыўных пошукаў маладымі літаратарамі новых сродкаў моўнай вобразнасці, сугучных рэвалюцыйнаму светаразуменню тых гадоў. Атрыманы вопыт аналізу паэтычных неалагізмаў аўтараў той эпохі дазволіў і паэту М. Шабовічу творча ўспрыняць узоры, тыпы і мадэлі стварэння індывідуальна-стылістычных неалагізмаў. Лінгвістычна-паэтычны “тандэм” у адной асобе прынёс цікавыя і арыгінальныя вынікі, засведчыў у многім унікальную словатворчасць.

Як адзначае А. А. Земская, «аказіяналізмы характарызуюць зусім асобы аспект вывучэння мовы – творчы, індывідуальны, эстэтычны: яны рэалізуюць індывідуальную, творчую кампетэнцыю гаворачага, хай гэта паэт, дзіця або звычайны чалавек. Яны арыентаваны не на правілы, агульныя для ўсіх носьбітаў мовы, але на здольнасці індывідуума выкарыстць магчымасці, закладзеныя ў сістэме мовы. Аказіяналізмы паказваюць, на што здольная мова пры стварэнні новых слоў, якія яе творчыя патэнцыі, глыбінныя сілы» [3, с. 180].

Паводле назіранняў беларускіх даследчыкаў аказіянальнага слова, найбольшую ўдзельную вагу ў гэтым працэсе займае суфіксацыя, пры дапамозе якой утвараюцца словы самых розных часцін мовы. Дамінуе гэты спосаб і ў М. Шабовіча, пры гэтым выкарыстоўваюцца пераважна вядомыя ў літаратурнай мове словаўтваральныя тыпы і мадэлі. Парадаксальна, але ў паэта найбольшай колькасцю паводле часцінамоўнай прыналежнасці вылучаюцца дзеясловы (намі зафіксавана 29 слоў), утвораныя пры дапамозе суфікса *-і- (-ы-)*. Такая актыўнасць гэтага старажытнага славянскага суфікса, на думку М. С. Васілеўскага, звязана з яго спрадвечнасцю ў жывым маўленні [1, с. 200], таму і выкарыстала сучасная беларуская літаратурная мова спаўна гэты дэрывацыйны тып. Параўн. у М. Шабовіча: *абраманіцца, забарыкадзіць, звясновіць, крылаціць, леціцца, нявесціцца, прыгожыць, ружовіць, футараліць* і інш.:

А беларускай песні – быць!
Яна прарвецца з рыштаванняў
І на Еўропы скрыжаваннях
Так вальнакрыла закрыліць!
А хто ўсумніцца – не дай божа,–
Маэстра Фінберг дапаможа
(Беларускай песні і Міхаілу Фінбергу).

Адзначым, што і ў мастацкіх тэкстах 1920-х гадоў гэты словаўтваральны тып займае лідарскія пазіцыі, пры гэтым асобныя аўтарскія словы сталі настолькі ўдалымі, што былі засвоены і неаднаразова выкарыстаны многімі паэтамі таго часу. Напрыклад, лексема *крышталіць* зафіксавана ў 16 кантэкстах васьмі аўтараў [6, с. 84], *імклівіць* – у 12 кантэкстах (прычым 8 з іх належаць У. Дубоўку) [6, с. 89].

Значнай колькасцю лексем у індывідуальнай словатворчасці М. Шабовіча прадстаўлены назоўнікі (19) і прыметнікі (17): *бярлогія, зеленавір, развіты* (развітанні*), хлусняр, шкадаўё; грачынны, далечны, лясотны, прывабна-вечаровы, словаблудны* і інш. Параўн.:

На шчодрым словасплаве
Хто не сляпы – скумекаў:
Зубра Гусоўскі ўславіў,
Карову – Толя Зэкаў
(Песня пра карову);

На ўзлеску дзесь, прылёгшы на стажку,
Пад спеў лясоўны грэшна-самавіты
Ты молішся лірычнаму радку,
Самому Богу молішся нібыта
(Хведару Гурыновічу).

Сярод аўтарскіх неалагізмаў М. Шабовіча выдзяляцца значная група складанняў, утвораных у выніку аб'яднання дзвюх і больш асноў самастойных слоў. Многія з іх знайшлі сваю часавую апрабацыю яшчэ на самым пачатку станаўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы і сталі трывалай асновай для абнаўлення яе лексічнага саставу. Яны ж, несумненна, паслужылі ўзорам і ў пэўнай ступені матывавалі з'яўленне ў сучаснага паэта сваіх уласных намінацый. Да ліку такіх адзінак можна аднесці наступныя: *адчайна-проста, адзінаспеўны, веснавейны, грэшна-самавіты, дзіўна-спеўны, дзіўнаквеціць, крылата-пакручаста, літпрыстойны, малітварука, светлаказка, узнёсла-прароча, хуткабег, шматкветна, шчымліва-пяшчотна* і інш.

У навуковай літаратуры па праблемах аўтарскай неалагізацыі неаднаразова выказваліся розныя погляды на лёс аказіянальных утварэнняў, іх мэтазгоднасці ў мастацкім тэксце. На наш погляд, абмяжоўваць таго ці іншага мастака слова толькі узуальнымі сродкамі – бесперспектыўны шлях. Напрыклад, у адным з артыкулаў Н. Гілевіча чытаем: «Стала даволі модным, амаль не пошасцю ў нашай паэзіі, утвараць новыя словы з дапамогай суфіксаў і прэфіксаў. Спосаб зусім не складаны: бярэцца любы назоўнік і ад яго ўтвараецца дзеяслоў, прыметнік ці прыслоўе, або бярэцца дзеяслоў і ад яго ўтвараецца назоўнік. Скажам, замест: у рацэ многа шчупакоў – пішуць: у рэчцы шчупачна. І па гэтаму ўзору – сотні іншых: у сажалцы – карасьна, у лесе – мурашна, на балоце – гадзючна, на падворку – індзючна і г. д. <…> …Хачу зрабіць агаворку: я – за актыўную моватворчасць пісьменніка, за абнаўленне слова, за тое, каб дзякуючы суфіксу ці прэфіксу яно засвяцілася нейкім новым сэнсам ці эмацыянальным адценнем. Але тут выключна важнае значэнне маюць пачуццё меры і густ – тыя якасці, якімі характарызуецца моватворчасць народа. Не пераступаць мяжу і не даходзіць да моўнага свавольства, да

гульні, -- вось што абавязаны помніць, шукаючы патрэбнае слова, пісьменнік. Мова – не для гульні. Мова – наш найкаштоўнейшы нацыянальны скарб. Мову стварае народ – і, відаць, не трэба нікому з нас ускладаць на свае ўласныя плечы гэту вялікую гістарычную місію» [2, с. 224, 226].

У сваёй моватворчасці Мікола Віктаравіч Шабовіч гэтую мяжу не пераступае. Ён выдатна разумее, што аўтарскія неалагізмы, нягледзячы на нібыта іх «літаратурна-узуальны» характар, не адразу (а, магчыма, і ніколі) не стануць агульналітаратурным сродкам. Толькі нямногія з іх трапяць у кананічныя слоўнікі, атрымаюць магчымасць стаць паўнапраўнымі адзінкамі ў лексічным саставе агульнанароднай мовы. Аднак імкнуцца да гэтага трэба абавязкова.

Аўтарскія неалагізмы трывала ўвайшлі ў сістэму моўна-выяўленчых сродкаў большасці беларускіх паэтаў і празаікаў. Пастаяннае папаўненне імі гэтай сістэмы садзейнічае далейшаму ўдасканаленню роднага слова, сведчыць пра яго жывы характар і невычэрпныя словаўтваральныя магчымасці [5, с. 75]. У праве на існаванне і актыўнае выкарыстанне індывідуальна-стылістычных неалагізмаў як фактаў літаратурнай мовы многае залежыць і ад кожнага з нас: настаўнікаў і выкладчыкаў беларускай мовы, вучоных-лексікографаў, студэнтаў і школьнікаў, нарэшце – саміх стваральнікаў гэтых лексічных адзінак.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Василевский Н. С.* К вопросу о словообразовательной структуре глаголов на –ить (на материале белорусского и русского языков) // Актуальные проблемы русского словообразования : Материалы III респ. науч. конф. Ташкент : Укитувчи, 1978. С. 198–200.
2. *Гілевіч Н.* Мова, якой мы пішам … // Покліч жыцця і часу: публіцыстычныя выступленні і артыкулы / Н. Гілевіч. Мінск, 1983.
3. *Земская Е. А.* Словообразование как деятельность. М. : Наука, 1992. 221 с.
4. *Нафрановіч Аркадзь.* «Не ўсё … яшчэ разгадана» // Літаратура і мастацтва. 2008. 4 ліпеня.
5. *Прыгодзіч М. Р.* Шчодрасць слова. Мінск : Народная асвета, 1990. 79 с.
6. *Шабовіч М. В.* Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гадоў XX стагоддзя. Мінск : Логвінаў, 2013. 196 с.

ТЫПАЛАГІЧНА-СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТЭМПАРАЛЬНЫХ СІНТАКСЕМ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Г. Ч. Рыжковіч

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
вул. Э. Ажэшка, 22, 230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь,
annamichalouskaya@mail.ru

Задача выдзялення і класіфікацыі элементарных сінтаксічных адзінак, якія служаць асновай для ўтварэння адзінак больш складаных узроўняў, з'яўляецца актуальнай для сучаснага мовазнаўства. Такімі адзінкамі з'ўляюцца сінтаксемы. Разам з флексіяй і лексічным значэннем назоўніка характар сінтаксемы і яе фарміраванне на сінтаксічным узроўні забяспечвае прыназоўнік, якія выконвае сінтаксемаўтваральную функцыю. У артыкуле разглядаюцца тэмпаральныя сінтаксемы і прыназоўнікавыя адзінкі, якія выконваюць ролю фарманта тэмпаральных сінтаксем.

Ключавыя словы: сінтаксема; тэмпаральная сінтаксема; фармант сінтаксемы; лексічны кампанент сінтаксемы; прыназоўнікавая адзінка.

Паняцце сінтаксемы ўвёў у лінгвістычны абарот А.М. Мухін у 60-я гг. XX стагоддзя [5]. Згодна з канцэпцыяй лінгвіста, сінтаксема ўяўляе сабой адзінства формы (сінтаксічнай) і зместу, г. зн. яна аб'ядноўвае сінтаксічныя элементы ў якасці яе варыянтаў, якія выконваюць сэнсаадрознівальную функцыю ў мове і характарызуюцца пэўнымі дыстрыбутыўнымі (сінтаксічнымі) прыкметамі [5, с. 55–56]. Г. А. Золатава разглядала сінтаксему як «мінімальную, далей непадзельную семантыка-сінтаксічную адзінку мовы, што выступае адначасова як носьбіт элементарнага сэнсу і як канструктыўны кампанент больш складаных сінтаксічных канструкцый і характарызуецца, такім чынам, пэўным наборам сінтаксічных функцый» [2, с. 4]. Адметнымі прыкметамі сінтаксемы служаць, адпаведна меркаванню даследчыцы, 1) катэгарыяльна-семантычнае значэнне слова, ад якога яна ўтворана, 2) адпаведная марфалагічная форма і 3) здольнасць сінтаксічна рэалізавацца ў пэўных пазіцыях. Такім чынам, сінтаксема характарызуецца трыма асноўнымі прыкметамі: формай, значэннем і функцыяй [2, с. 9].

Як адзначае М. І. Канюшкевіч, структурна сінтаксема падзяляецца на фармант і лексічны кампанент. Сродкам выражэння фарманта сінтаксемы служаць прыназоўнік у спалучэнні з флексіяй (***з*** *лесу*), толькі прыназоўнік (***на*** *потым*) або толькі флексія (*сястр****ой***). Прыназоўнік, выконваючы ролю фарманта сінтаксемы, выступае таксама маркёрам яе сінтаксічнай пазіцыі. Такім чынам, прыназоўнік не толькі фарміруе сінтаксему, але і забяспечвае яе значэнне [4, с. 5].

Тэмпаральныя прыназоўнікавыя адзінкі ў беларускай мове фарміруюць чатыры тыпы сінтаксем: тэмпаратыўныя, тэрмінатыўныя, дыменсіўныя і

дыстрыбутыўныя. У Рэестры М. І. Канюшкевіч [3] і Беларускім нацыянальным корпусе [1] намі было выяўлена 1527 прыназоўнікавых адзінак з тэмпаральнай семантыкай. Колькасную суаднесенасць тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак па тыпах фарміруемых імі сінтаксем прадставім у выглядзе табліцы [Табліца 1].

Табліца 1

Тып сінтаксемы	Колькасць тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак
тэмпаратывы	649
тэрмінатывы	474
дыменсівы	356
дыстрыбутывы	7
Усяго:	1527

Тэмпаратыўнае значэнне з'яўляецца самым распаўсюджаным. Тэмпаратыўныя сінтаксемы абазначаюць "час, у які працякае дзеянне" [1].

Прыназоўнікавыя адзінкі могуць фарміраваць уласна тэмпаральныя сінтаксемы. Напрыклад, *а* чым / якой гадзіне: ***а*** *дванаццатай гадзіне*, ***роўна а*** *палове першай*, ***а*** *вясне*; *аб* чым / якой гадзіне / калі: ***аб*** *адзінаццатай гадзіне*; *аб пары* чаго / калі: ***аб пары*** *ўтварэння*; *акурат пад* што / які час: ***акурат пад*** *Новы год*; *акурат перад* чым: ***акурат перад*** *святам*; *апоўдні* чаго: ***апоўдні*** *гарачага дня*; *а палове на* што / які час: ***а палове на*** *дзясятую*; *апасля* каго / чаго: ***апасля*** *першай паловы сустрэчы*, ***апасля*** *Дэкарта*; *беспасярэдне перад* чым: ***беспасярэдне перад*** *нашым нараджэннем*; *ва врэмя* чаго: ***ва врэмя*** *вайны*; *ва ўгодкі* каго / чаго: ***ва ўгодкі*** *паражэння* і інш.

Таксама сярод тэмпаратыўных сінтаксем намі выдзелены:

1) дакладны тэмпаратыў (***роўна ў*** *2.30*, ***роўна а*** *трынаццатай*, ***якраз у*** *поўнач*);

2) храналагічны тэмаратыў (***канца*** *XX стагоддзя*, ***на канец*** *года*, ***у канцы*** *1905 года*, ***у сярэдзіне*** *I тысячагоддзя*);

3) таксісны тэмпаратыў (***на*** *паляванні*, ***на год*** *абароны дысертацыі*, ***на момант*** *выхаду*, ***на час*** *адпачынку*, ***пры правядзенні*** *фінальнага паядынку*, ***пры паяўленні*** *бугалтара*);

4) суб'ектны тэмпаратыў (***за цараванне*** *Кацярыны*, ***пры*** *Касцюшцы*, ***за панаваннем*** *Аляксандра II*);

5) прыблізны тэмпаратыў (***амаль у канцы*** *стагоддзя*, ***дзесьці пры канцы*** *верасня*, ***дзесьці перад*** *святам*, ***крыху бліжэй да*** *Каляд*, ***дзесьці перад*** *Новым годам*, ***незадоўга да*** *сваёй смерці*);

6) тэмпаратыў непасрэднага следавання (***адразу за*** *стрэлам*, ***адразу апасля*** *конкурсу*, ***адразу па*** *вайне*, ***адразу па выхадзе*** *зборніка*, ***пасля*** *размовы*, ***услед за*** *сімптомамі*);

7) тэмпаратыў папярэдняга дзеяння (***перад*** *вяселлем*, ***перад заходам*** *сонца*, ***перад канцом*** *свету*, ***перад пачаткам*** *работы*);

8) тэмпаратыў – кропка адліку (***ад часаў*** *Тадэвуша Касцюшкі*, ***з першых дзён*** *жыцця*, ***з пачаткам*** *вайны*);

9) тэмпаратыў-экзісцыентыў (***з пераходам да*** *абраду*, ***з пераходам на*** *новы прынцып*, ***з узнікненнем*** *ВКЛ*, ***з утварэннем*** *новага пісьменніцкага саюза*);

10) тэмпаратыў даты (*загад* ***ад*** *1 ліпеня 2006 года*, ***за*** *2000 год*, *вынікі* ***на*** *першае верасня*);

11) тэмпаратыў адначасовасці (***адначасова з*** *навучаннем*, ***па ходу*** *работ*);

12) паступальны тэмпаратыў (***з набліжэннем*** *даты юбілею*, *з павелічэннем п*, ***з надыходам*** *XX стагоддзя*);

13) фазавы тэмпаратыў (***у стадыю*** *ўвасаблення*, ***у фазу*** *перадкапіталістычнага развіцця*, ***у эпоху*** *касмічнага турызму*, ***у этап*** *свайго развіцця*);

14) цыклічны тэмпаратыў (***у перыяды*** *менструацыі*);

15) тэмпаратыў-сітуатыў-кваліфікатыў (***у бытнасць*** *старшынёй калгаса*);

16) тэмпаратыў-карытыў (***без*** *чвэрці гадзіна*).

Тэмпаратыўныя значэнні, для выражэння якіх служаць тэмпаральныя прыназоўнікавыя адзінкі, могуць быць ускладнены прасторавымі значэннямі. Напрыклад, прыназоўнікавая адзінка *у плыні* чаго фарміруе тэмпаратыўна-каузатыўную сінтаксему: *Творы засталіся. А гучныя дэкларацыі патанулі* ***ў плыні часу*** (В. Зуёнак). Намі выяўлены таксама тэмпаратыўна-лакатыўныя сінтаксемы, якія сведчаць пра сінкрэтызм прасторава-часавых значэнняў. Ролю фармантаў тэмпаратыўна-лакатыўных сінтаксем выконваюць наступныя прыназоўнікавыя адзінкі: ***за парогам*** *века*, ***на пад'ездзе да*** *Мінску*, ***на падыходзе да*** *хаты*, ***пры выхадзе са*** *школы*, ***у знаку*** *Цяльца*.

Таксісны тэмпаратыў следавання фарміруюць прыназоўнікавыя адзінкі, у склад якіх уваходзяць першасныя прыназоўнікі *пасля*, *праз*, *па*. Лексічны кампанент такіх сінтаксем выражаны падзейнымі назоўнікамі: ***па прашэсці*** *часу*, ***пасля завяршэння*** *загрузкі*, ***пасля заканчэння*** *працы*, ***праз*** *дзесяць год* ***па заканчэнні*** *вайны*, ***праз*** *месяц* ***пасля пачатку*** *заняткаў*, ***па заканчэнні*** *вучобы*. Таксісны тэмпаратыў адначасовасці фарміруюць прыназоўнікавым адзінкі, структурным кампанентам якіх з'яўляецца першасны прыназоўнік *у*: ***у хадзе*** *сутычак*, ***у хвіліну*** *расстання*, ***у хвіліны*** *смутку*, ***у час*** *падарожжа*, ***у часу*** *голада*, ***у часе*** *касавіцы*.

Тэрмінатыўныя сінтаксемы абазначаюць час, тэрмін дзеяння [1], дзеянне працякае на працягу пэўнага часавага прамежку, пры гэтым заўсёды ўказваецца пачатковая і канчатковая часавыя межы працякаемага дзеяння.

Прыназоўнікавыя адзінкі дадзенай групы фарміруюць наступныя тыпы тэмпаральных сінтаксем:

1) уласна тэрмінатыўныя (***ад*** *раніцы*, ***ад*** *вяселля*, *дажыць* ***да*** *світання*, *працавалі* ***да*** *цямна*, ***да канца*** *2030 года*, ***за гады*** *акупацыі*, ***к канцу*** *напісання паэмы*);

2) дакладны тэрмінатыў (***роўна да*** *лістапада*, ***дакладна да*** *серады*, ***роўна з часу*** *паўстання*);

3) прыблізны тэрмінатыў (***як мінімум з*** *кастрычніка*, ***недзе аж да*** *ранку*, ***прыкладна к*** *чэрвеню*);

4) тэрмінатыў-інтэнсіў (***аж да*** *часоў Гедыміна*, ***аж да часу*** *мангольскага нашэсця*, ***аж да*** *лютага 1917 года*);

5) тэрмінатыў-экзісцыентыў (***да выезду з*** *Нясвіжа*, ***да выхаду з*** *хаты*, ***да заканчэння*** *дзейнасці*);

6) таксісны тэрмінатыў (***не пазней чым за*** *5 дзён* ***пасля*** *заканчэння імі вучобы*, ***не пазней чым*** *тры месяцы* ***з дня*** *звальнення*);

7) тэрмінатыў-кропка адліку (***ад дня*** *рэгістрацыі*, ***ад моманту*** *бліскавіцы*, ***ад пары*** *вяселля*, ***ад пачатку*** *ўрачыстасці*, ***з дня*** *нараджэння*, ***з дня*** *няволі*);

8) тэрмінатыў-канчатковая кропка (***да канца*** *месяца*, ***да парога*** *новага тысячагоддзя*);

9) пачатковая і канчатковая кропкі часавага адрэзка (***да канца*** *месяца* ***з моманту*** *паражэння*, ***з*** *тых часоў* ***і па*** *сёння*, ***з*** *XI* ***па канец*** *XVII стагоддзя*).

Дыменсіўныя сінтаксемы абазначаюць колькасную характарыстыку дзеяння [4]. Дыменсіўныя сінтаксемы прадстаўлены наступнымі тыпамі:

1) дыменсіў-патэнсіў (*гаварыць* ***аб*** *адну ноч*, ***за*** *адну ноч*, ***на*** *некаторы час*, ***на працягу*** *года*);

2) прыблізны дыменсіў (***больш чым на*** *тыдзень*, ***працягласцю больш чым*** *месяц*, ***працягласцю больш за*** *тры тыдні*).

Дыменсіўныя сінтаксемы з семантыкай прыблізнага часу могуць быць ускладнены ўказаннем на ніжнюю, верхнюю межы часавага адрэзка:

– прыблізны дыменсіў з верхняй межай часавага адрэзка (***працягласцю да*** *15 сутак*, *дзеці* ***ва ўзросце да*** *года*, ***маладзей*** *18 гадоў*);

– прыблізны дыменсіў з ніжняй межай часавага адрэзка (***працягласцю звыш*** *45 сутак*, ***тэрмінам болей чым на*** *адзін месяц*);

– прыблізны дыменсіў з верхняй і ніжняй межамі часавага адрэзка (***ва ўзросце ад*** *10 месяцаў* ***да*** *8 гадоў*, ***працягласцю ад*** *аднаго* ***да*** *пяці гадоў*, ***у інтэрвале ад*** *некалькіх дзясятых секунды* ***да*** *некалькіх секунд*).

Дыстрыбутыўныя сінтаксемы абазначаюць раздзяляльны час [1]. Дадзенае значэнне выражаюць прыназоўнікі што … *ад* чаго, *ад* чаго … *да* чаго, колькі адзінак *на* колькі адзінак, бел. *па* чым. У сінтаксемах: *дзень ада дня*, ***ад*** *выпадку* ***да*** *выпадку*, *сем пятніц* ***на*** *тыдні*, ***па*** *святах*.

Тэмпаральныя прыназоўнікі (130 адзінак) могуць таксама фарміраваць квантытатыўныя сінтаксемы: ***болей*** *пяці гадоў*, ***болей чым*** *месяц*, ***звыш*** *сямі*

стагоддзяў, ***крыху больш за*** *тыдзень*, ***менш чым за*** *стагоддзе*, ***на*** *12 хвілін* ***пазней***, ***не больш чым на*** *тыдзень*, ***не менеў*** *года*.

Квантытатыўныя сінтаксемы ў большасці выпадкаў спалучаюцца з іншымі тэмпаральнымі значэннямі. Намі выяўлены наступныя тыпы сінтаксем:

– квантытатыўна-тэмпаратыўныя: ***не больш чым праз*** *15–20 хвілін*, ***не больш як*** *месяц* ***назад***, ***не далей як*** *два месяцы* ***таму назад***;

– квантытатыўны-тэрмінатыўныя: ***менеў як на*** *год–паўтара*, ***не на больш чым*** *10 хвілін*;

– квантытатыўна-дыстрыбутыўныя: ***да*** *20–25 разоў* ***на*** *суткі*, ***не болей як*** *20 гадзін* ***у*** *тыдзень*, ***не больш як па*** *два тыдні*, ***не менеў як*** *5–6 гадзін* ***на*** *дзень*, ***не часцей за*** *адзін раз* ***у*** *месяц*, ***па*** *некалькі разоў* ***на*** *дзень*.

Такім чынам, прыназоўнік выходзіць за рамкі марфалогіі, паколькі ён, выконваючы ролю фарманта сінтаксемы, уводзіць яе ў выказванне і забяспечвае яе значэнне, таму ў сучасным мовазнаўстве прыназоўнік разглядаецца як морфасінтаксічная катэгорыя. Тэмпаральныя прыназоўнікавыя адзінкі фарміруюць тэмпаратыўныя, тэрмінатыўныя, дыменсіўныя, дыстрыбутыўныя сінтаксемы, а таксама сінтаксемы з сінкрэтычнай семантыкай.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларускі N-корпус [Электронный ресурс]. URL: bnkorpus.info (дата обращения: 15.09.2019).
2. *Золотова Г. А.* Синтаксический словарь : репертуар элементарных единиц русского синтаксиса. М. : Наука, 1988. 386 с.
3. *Канюшкевіч М. І.* Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання : матэрыялы да слоўніка: у 3 ч.. Гродна : ГрДУ, 2008–2011. 3 ч.
4. *Конюшкевич М. И.* Синтаксемообразующая функция предлога и механизмы определоживания знаменательной лексики // Вопросы функциональной грамматики : сб. науч. тр. / под ред. М. И. Конюшкевич. Гродно, 2005. Вып. 5. С. 3–19.
5. *Мухин А. М.* Синтаксема как функциональная синтаксическая единица // Философские науки. 1961. №3. С. 53–65.

САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЛЕКСІКА АНГЛАМОЎНАГА ПАХОДЖАННЯ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ (СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ)

М. Л. Савасцюк

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
вул. К Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
mlsmls@bk.ru

Навуковы кіраўнік: Прыгодзіч М. Р., доктар філалагічных навук, прафесар

Адным з актуальных пытанняў сучаснай лінгвістыкі з'яўляецца вывучэнне семантыкі запазычанняў і аналіз іх функцыянавання ў мове-рэцыпіенце. У артыкуле даследаванню з пункту гледжання полісеміі (вылучана 108 адзінак), ужывання ў пераносным сэнсе (23 адзінкі), функцыянавання ва ўстойлівых выразах (5 адзінак), падвергліся 557 лексем сацыяльна-палітычнай сферы, запазычаных беларускай мовай з англійскай. Разлядаецца частотнасць іх ужывання ў сучасным беларускамоўным публіцыстычным дыскурсе як прымета ступені семантычнай адаптаванасці. Тэарэтычныя назіранні ілюструюцца прыкладамі з часопісаў і газет канца XX – пачатку XXI стст. Таксама адзначаюцца некаторыя асаблівасці прычын і працэса міграцыі англіцызмаў у беларускую мову.

Ключавыя словы: англіцызмы; запазычванне; запазычаная лексіка; сацыяльна-палітычная лексіка; семантычная адаптацыя запазычанняў.

Змены, што ў канцы XX – пачатку XXI стст. закранулі ўсе сферы жыццядзейнасці сусветнага грамадства і непасрэдна Рэспублікі Беларусь, сталі прычынай актывізацыі некаторых зрухаў у лексічным корпусе беларускай мовы: з аднаго боку, пэўныя словы губляюць сваю актуальнасць, з другога, адбываецца міграцыя запазычанняў (найперш, з англійскай мовы), утвараюцца неалагізмы.

Сярод асноўных спецыфічных экстралінгвістычных фактараў актывізацыі працэсу лексічнага запазычвання беларускай мовай з іншых моў у апошнія дзесяцігоддзі можна назваць, па-першае, той факт, што з 80-х – 90-х гадоў XX стагоддзя ва ўсім свеце пачаўся якасна новы этап эвалюцыі грамадства, звязаны з імклівым развіццём інфармацыйных тэхналогій. У выніку гэтага скоку абыўся пераход ад індустрыяльнага грамадства мінулага на новае – інфармацыйнае. Змены новай эпохі выразна адлюстроўваюцца ў вобласці сацыяльна-культурнага дыскурса і, як вынік, ва ўзнікненні новага тыпу чалавека: чалавека інфармацыйнага (Homo Informaticus). «Працэсы імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій прывялі да фарміравання новай парадыгмы грамадскіх працэсаў, пераўтварэння самога грамадства і нават трансфармацыі самой існасці чалавека. Адпаведна, на пачатку XXI стагоддзя менталітэт беларусаў, які фарміраваўся цягам стагоддзяў, перацярпеў вялікія змены і мы маем справу

ўжо з новым чалавекам, які… жыве ў адметна новым «інфармацыйным басейне»… Абмен інфармацыяй ужо не звязаны з існаваннем дзяржаўных межаў і іншых бар'ераў, у тым ліку моўных» [1, с. 88–89].

Па-другое, адбыліся змены ў менталітэце носьбітаў беларускай мовы, на якія паўплывала атрыманне Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці, новы палітычны курс краіны, нарошчванне яе зносін з іншымі дзяржавамі, развіццё турызму, актывізацыя міграцыі насельніцтва. Разам з гэтым павялічыліся і магчымасці грамадзян Беларусі ў асабістым развіцці, што спрыяла трансфармацыі ўспрымання многіх аспектаў сацыяльнага і культурнага жыцця, паслужыла адпраўной кропкай для якасна іншага стаўлення да інфармацыі, цікавасці да замежных моў. З 1991 года ў краіне выросла два пакаленні грамадзян, пазбаўленых кансерватызму і не абмежаванных ва ўзаемадзеянні з носьбітамі замежных моў, як у непасрэдным кантакце, так і праз інтэрнэт. Такая культурная і сацыяльна-палітычная сітуацыя прывяла да адкрытасці беларусаў успрымаць новае, далучацца да яго, актыўна і неадкладна карыстацца новымі ведамі, магчымасцямі, адпаведна, і лексікай.

Па-трэцяе, ужыванне іншамоўнай лексікі стала «трэндам» сярод пэўных колаў носьбітаў мовы. Становіцца відавочным, што пад уздзеянннем моды трансфармуецца не толькі візуальная, але і моўная рэальнасць. Разважаючы аб сучасным стане розных моў свету, трэба прывесці меркаванне В. Р. Кастамарава: «Уяўленні аб правільным і эфектыўным выкарыстанні мовы, якія мяняюцца і даводзяцца часам да абсурду, можна пазначыць словам мода. Іншымі словамі, мода ёсць крайняя праява густу, больш індывідуальная, хутка мінучая, якая кідаецца ў вочы і звычайна выклікае раздражненне ў старэйшай і кансерватыўнай часткі грамадства. Моўная мода, мабыць, больш прамалінейна звязаная з модай у іншых сферах жыцця, чым моўны густ – з агульным густам эпохі» [2, с. 24].

У даследаванні мы разглядаем сацыяльна-палітычную лексіку. Гэта колькасна найбольшая лексіка-семантычная група, у корпус якой, па нашых падліках уваходзяць 557 адзінак (каля 15% ад агульнай колькасці зафіксаваных намі англіцызмаў, роўнай больш як 3600 адзінкам [3]). Да сацыяльна-палітычнай лексікі мы адносім назвы (сучасных і гістарычных) сацыяльна-палітычных плыней і рухаў і іх прыхільнікаў, назвы з'яў і мерапрыемстваў сацыяльнай і палітычнай сфер, асоб, якія па роду дзейнасці звязаны з гэтымі сферамі, назвы грамадскіх і палітычных арганізацый і ўстаноў, дэрываты, утвораныя ад такіх лексем. Групу складаюць як тэрміналагічныя (каля 62 %), так і нетэрміналагічныя моўныя адзінкі (агульнаўжывальная лексіка, размоўная, жарганізмы) (каля 38 %).

Публіцыстычны дыскурс непасрэдна звязаны з сацыяльна-палітычным працэсамі, а таму ўдзельнікі гэтага дыскурса (перш за ўсё аўтары) хутка рэагуюць на іх выбарам тэм і, безумоўна, лексікі для дасягнення дасканалага адлюстравання палітычнай і сацыяльнай сітуацыі.

Згодна з формуліроўкай М. Я. Цікоцкага, «галоўнае сацыяльнае прызначэнне публіцыстыкі – актыўнае ўмяшанне ў жыццё дзеля фарміравання грамадскай думкі сучаснікаў… Грамадская думка – гэта рэальнае існаванне грамадскай свядомасці таго ці іншага класа або грамадства ў цэлым у пэўны момант жыцця. Яна грунтуецца на адносна ўстойлівым узроўні свядомасці мас, які ў сваю чаргу характарызуецца станам ідэалогіі і грамадскай псіхалогіі пэўнага класа або грамадства ў цэлым. Усе падзеі жыцця, якія прыцягваюць увагу грамадства і таму трапляюць у арбіту грамадскай думкі, знаходзяць адлюстраванне ў публіцыстычным творы ў выглядзе думак пра іх, пэўных ацэнак, як рацыяналістычных (меркаванні, вывады, заключэнні, характарыстыкі, азначэнні і г.д.), так і эмацыянальных (уяўленні, пачуцці, настрой і г.д.)» [4, с. 5].

Колькасць прааналізаваных намі крыніц публіцыстычных тэкстаў, у якіх былі зафіксаваны англіцызмы сацыяльна-палітычнай групы складае 258 нумароў газет (асноўная частка з іх – выпускі газеты «Звязда» (150 нумароў), а таксама «Культура» «Літаратура і мастацтва» (далей «ЛіМ»), «Чырвоная змена», «Настаўніцкая газета», «Новы час», «Голас Радзімы», «Універсітэт», «Народная газета», «Раніца»); 38 выпускаў часопісаў («Алеся», «Беларусь», «Бярозка», «Вожык», «Дзеяслоў», «Маладосць», «Беларуская думка»).

З 557 англіцызмаў сацыяльна-палітычнай лексікі ва ўзгаданых крыніцах зафікавана 309 лексічных адзінак, для якіх удалося знайсці прыклады ўжывання ў публіцыстычным дыскурсе (56 % ад агульнай колькасці адзінак групы). Многія з іх ужываюцца ва ўзгаданых крыніцах неаднаразова. Гэта сведчыць аб даволі высокай стпені актыўнасці англіцызмаў сацыяльна-палітычнай сферы ў мове публіцыстычнага дыскурса. Параўн.: *байкер*, *бойфрэнд*, *буккросінг*, *істэблішмэнт*, *кансалтынгавы*, *краўдфандынг*, *лонг-ліст*, *мэйнстрым*, *піяршчык*, *рэйтынг*, *саміт*, *сексізм*, *скаўтынг*, *сноб*, *сэр*, *тайм-менеджмент*, *унісекс*, *флірт*, *халакост*, *харасмент*, *хіпстарскі*, *хоспіс* і інш. Безумоўна, гэта, галоўным чынам, намінацыі, што маюць непасрэднае дачыненне да сучаснай сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў свеце. Найбольш высокі ўзровень ужывальнасці прадэманстравалі такія англіцызмы, як *блок*, *дыскамфорт*, *імідж*, *інтэрактыўны*, *камфорт*, *клуб*, *лідар*, *лэдзі*, *медыя*, *офіс*, *парламент*, *піяр*, *рэспандэнт*, *стандарт*, *сэрвіс*, якія (акрамя лексем *інтэрактыў*, *інтэрактыўны*, *медыя*, *піяр*) фіксуюцца слоўнікамі беларускай мовы, выданых да 2000 года [5], [6], і занялі ў беларускамоўным ужытку даволі трывалыя пазіцыі. Параўн.: *Блок* (ад block) – грамадска-палітычнае аб’яднанне дзяржаў, партый, груповак для дасягнення агульнай мэты. *Другі варыянт: пачаць з сілавога блока – ваенных, МУС і г. д. (Звязда, 02.02.2016)*; *Партыйны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС), які ўзначальвае канцлер Германіі Ангела Меркель,*

прыхільнік нармалізацыі адносін з Расіяй (Звязда, 16.06.2017); *Павелічэнне расійскай эскадры каля берагоў Сірыі пазней заўважылі ў Паўночнаатлантычным блоку (Звязда, 18.09.2018)*. *Дыскамфорт* (ад discomfort, ад грэч. dys- = не + англ. comfort = утульнасць, зручнасць) – адсутнасць умоў, неабходных для нармальнай жыццядзейнасці людзей, выканання пэўнай работы; нязручнасць. *А калі ехаць па тратуары, то дыскамфорт адчуваюць ужо пешаходы (Звязда, 30.10.2015)*; *Ці дастаўляюць шэраговыя ўдзельнікі дыскамфорт прафесіяналам? (Звязда, 07.11.2015)*; *Артысты правакуюць – і вось ужо ў некага пачуццё дыскамфорту (Звязда, 27.02.2016)*; *У цэнтры ўвагі А. Паповай – праблемы соцыуму: бытавы і быццёвы дыскамфорт, адзінота чалавека, яго неўладкаванасць, пошукі свайго месца ў жыцці (ЛіМ, 08.12.2017)*. *Піяр* / *PR* (ад P.R., ад p(ublic) r(elations) = грамадскія сувязі) – мэтанакіраваная дзейнасць у СМІ, правядзенне рэкламных акцый з мэтай стварэння іміджу і папулярызацыі каго-, чаго-н. (звычайна ў палітыцы, шоубізнесе). *У часы Блока творцы марылі пра славу, нашым часам – пра піяр (Маладосць, № 9, 2006, с. 3)*; *Вакол яго хадзіў выключна «белы» піяр, яму шчыра зычылі поспеху, яго праводзілі і сустракалі ў аэрапорце не толькі дзяўчаты з фан-клуба, а дзясяткі паклоннікаў конкурсу (Звязда, 12.01.2018)*; *Трэнды і перспектывы ў PR сталі тэмай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Звязда, 01.03.2018)* і інш.

У даследаваных намі крыніцах не прадстаўлены 248 лексем. Гэта назвы сацыяльна-палітычных з'яў жыццядзейнасці англамоўных краін – сучасных (53 адзінкі. Параўн.: *дыксікрат*, *лейбарыст*, *лендлорд*, *лорд-канцлер*, *прынц-консарт*, *сцюард*, *сэтльмент*, *трэд-юніён*, *хай-скул* і інш.) і гістарычных (32 адзінкі. Параўн.: *гарвізм*, *даміньён*, *капігольд*, *котэры*, *лалард*, *лудзіты*, *тэны*, *фабіяізм*, *фрыгольд*, *эрл* і інш.); назвы з'яў, якія недастаткова трывала замацаваліся ў беларускай мове і ўжываюцца ў якасці стылістычных сінонімаў да ўласнабеларускіх слоў (*бодзігард* (целаахоўнік), *гёрлфрэнд* (сяброўка, дзяўчына) і інш.); дэрываты ад тэрмінаў англамоўнага паходжання (*лакаўтаваны*, *лакаўтавацца*, *лакаўтаваць*, *лакаўтчык* (ад *лакаўт*)) і некаторыя іншыя лексемы.

У гэтым кантэксце трэба адзначыць сучасную тэндэнцыю да хуткай міграцыі некаторых англамоўных лексічных новаўтварэнняў (*брэксіт* і інш.) і актуалізаванай лексікі (*лакаўт* і інш.) у беларускую мову. У якасці прыклада разгледзем тэрмін *Brexit* (*брэксіт*) (ад Britain = Брытанія + exit = выхад) – выхад Аб'яднанага каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі са складу Еўрапейскага саюза. У англамоўным публіцыстычным дыскурсе ўпершыню гэты тэрмін быў ужыты палітыкам Пітэрам Вайлдынгам у артыкуле ад 15 мая 2012 года («Stumbling towards the Brexit») у блогу медыя-рэсурса EURACTIV [7]. У снежні 2016 года гэта слова атрымала навуковае тлумачэнне і было ўключана ў «Оксфардскі слоўнік англійскай мовы» (Oxford English Dictionary) [8]. Вельмі хутка тэрмін стаў

інтэрнацыяналізмам. У гэты перыяд англіцызм трапляе і ў актыўны ўжытак у беларускамоўным публіцыстычным дыскурсе. Параўн.: *Дык ці адбудзецца той самы «брэксіт» і чым ён такі непрыемны для Старога Свету? (Звязда, 01.03.2016)*; *І дэцэнтралізацыя гэта настолькі ж моцна ўздзейнічае на палітыку, эканоміку: дастаткова згадаць толькі брытанскі «брэксіт» (Культура, 25.03.2017)*; *Раней было вядома, што Лондан збіраўся пакінуць Еўрасаюз роўна праз два гады пасля запуску* Brexit *(Звязда, 11.11.2017)*.

У склад корпуса сацыяльна-палітычнай лексікі ўваходзяць 108 полісемантычных англіцызмаў (каля 19 % ад агульнай колькасці англіцызмаў групы). З іх 54 лексемы валодаюць адным значэннем з некалькіх. Параўн.: *андэграўнд, бізнес-клас, імідж, маніторыг, пікап, пул, прэсінг, свінгер, сёрфіць* і інш. *Блок* (ад block) – грамадска-палітычнае аб'яднанне дзяржаў, партый, груповак для дасягнення агульнай мэты. *Другі варыянт: пачаць з сілавога блока – ваенных, МУС і г.д. (Звязда, 02.02.2016); Партыйны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС / ХСС), які ўзначальвае канцлер Германіі Ангела Меркель, прыхільнік нармалізацыі адносін з Расіяй (Звязда, 16.06.2017)*). *Маніторынг* (ад monitoring, ад monitor = раіць, кантраляваць, ад лац. monitor = які назірае) – назіранне, праграмаванне сітуацый у розных кірунках жыцця сучаснага грамадства. *Сістэма маніторынгу дазваляе службам чыгункі ў рэжыме рэальнага часу атрымліваць аператыўныя даныя па 23 параметрах (Звязда, 18.11.2015)*; *У цяперашні час атрыманы першыя вынікі тэрміновага і дыстанцыйнага маніторынгу стану сэрца ў студэнцкім асяроддзі (Звязда, 12.01.2017)* і інш.

Таксама 54 англіцызмы валодаюць двума і больш значэннямі. Параўн.: *байкот*, *бос*, *дайхардаўцы*, *камонер*, *клуб*, *лідар*, *лобі*, *сквайр*, *хайпаваць* і інш. *Істэблішмэнт (ад establishment, ад establish = заснаваць, устанавіць, умацаваць) – 1)* эліта, вузкае кола людзей пераважна ў грамадска-палітычнай сферы, якое аказвае вызначальны ўплыў на развіццё эканомікі, фарміраванне ідэалогіі і палітыкі дзяржавы; людзі, якія складаюць І., займаюць, як правіла, кіруючыя пасады ў асноўных галінах дзейнасці, імкнуцца абмежаваць сваё кола, маюць высокія ганаровыя званні. *У бліжэйшы час (ён) стане досыць прыкметнай фігурай беларускага палітычнага істэблішмэнту (Чырвоная змена, 11.06.2000)*; *Журналісты і частка палітычнага істэблішмэнту абвінавачваюць кіраўніка дзяржавы ў вельмі блізкіх сувязях з грузінскай варажбіткай Ленай Лалішвілі (Звязда, 05.04.2003)*; 2) трывалае, устойлівае становішча ў грамадстве. *Міс* (ад Miss) – 1) ветлівы зварот да незамужняй жанчыны ў Англіі, Амерыцы (звычайна далучаецца да прозвішча або імя). *Затое Адмірал Бум, міс Кларк, Палісмен, Мармуровы хлопчык сабакі Эдуард і Варфаламей апынуліся дакладна такімі, як уяўляецца падчас чытання кнігі (ЛіМ, 12.08.2016)*; 2) разам з адпаведным словам (Сусвет, Інтэрнэшнл і інш.) назва конкурса і тытул дзяўчыны-пераможцы гэтага конкурсу (міс Свету і інш.). *Разабрацца ў*

гэтым дапаможа Вольга Сярожнікава, «Міс фота-2002», дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці (Чырвоная змена, 09.09.2005); *Гэта не перашкодзіла ёй узяць удзел у конкурсе «Міс-Ашмяны», дзе яна атрымала ганаровы прыз «Міс-грацыя» (Звязда, 17.06. 2017)* і інш. [3]

Сведчаннем высокага ўзроўню семантычнай адаптаванасці з'яўляецца ўжыванне лексемы ў пераносным сэнсе. З вылучаных полісемантычных англіцызмаў 23 валодаюць пераносным сэнсам. Для іх характэрна даволі актыўнае ўжыванне ў публіцыстычным дыскурсе, што дэманструецца наяўнасцю прыкладаў у даследаваных крыніцах амаль да кожнай лексемы. Параўн.:

Байкот (ад *boycott*) – разрыў адносін з кім-н. як знак незадавальнення яго паводзінамі; адказ ад чаго-н. *Абястлушчаныя малако, тварог, сыр і іншыя прадукты становяцца нормай на стале. Алею і наогул усім тлустым прадуктам аб'яўлены байкот (Алеся, № 8, 2016, с. 52)*.

Барбі (ад Barbie) – дзяўчына, што з'яўляецца прыхільніцай стылю, да якога звяртаюцца маладыя дзяўчаты з вытанчанай фігурай, светлымі доўгімі валасамі, і для якога характэрна актыўнае ўжыванне ружовага колеру ў адзенні і яркі макіяж.

Бум (ад boom) – шуміха, ажыятаж, празмернае ажыўленне вакол чаго-н. *Тады такія цацкі былі сапраўднай навінкай, выклікалі хвалю першага буму (ЛіМ, 21.10.2005); Бум спажывання інтэрнэт-трафіку ў МТС звязваюць з запускам паслугі «Unlim за мяжой» (Звязда, 17.10.2018)*.

Даўнінг-стрыт (ад Downing Street) – 1) рэзідэнцыя англійскага прэм'ер-міністра; 2) англійскі ўрад.

Ліліпут (ад Lilliput = назва маленькага чалавечка, жыхара выдуманай краіны Ліліпуціі ў рамане Дж. Свіфта «Падарожжа Гулівера» (1726)) – нікчэмны, малазначны чалавек.

Лінчаванне (ад лінч) – маральныя здзекі, уніжэнне, асуджэнне каго-н. *Потым пачалося «лінчаванне». Студэнты выступалі адзін за адным з трыбуны і бэсцілі сваіх настаўнікаў (Культура, 29.10-04.11.2005)*.

Клан (ад clan, ад кельц. clann) – замкнутая група людзей, звязаных якімі-н. інтарэсамі (эканамічнымі, дзелавымі і інш.). *Высвятляецца, што забойства – справа рук мафіёзнага клана, які запраўляе падпольным таталізатарам падчас футбольных матчаў (Чырвоная змена, 17.01.2003)*.

Магіканін (ад Mohican, ад індз. Mo-hi-konnuis) – апошні прадстаўнік чаго-н.

Мімікраваць (ад *мімікрыя*) – прыстасавацца / прыстасоўвацца да пэўных абставінаў. *Інтэлігенцыя, якая мімікруе, прасоўваецца да Хаосу, страшней, чым просты абывацель (ЛіМ, 24.04.1998)*.

Набоб (ад nabob) – вельмі багаты чалавек, які жыве ў раскошы.

Пентагон (ад Pentagon) – міністэрства абароны ЗША. *Прэс-аташэ Пентагона, падпалкоўнік ВПС Элен Крэнке заявіла, што праз тры тыдні міністэрства абароны можа зноў павысіць узрост рэзервістаў*

(Настаўніцкая газета, 02.04.2005); *Улады трох гарадоў ЗША падалі іск супраць Пентагона (Звязда, 28.12.2017).*

Прэсінг (ад pressing) – ціск (псіхалагічны, эканамічны, палітычны, экалагічны) на каго-н.; прыцісканне. *Беларусь... у даволі няпростых умовах працяглага знешняга прэсінгу за сваю самастойную пазіцыю, пазбегла тых катаклізмаў, якія патрэслі свет (Звязда, 20.01.2016); Сёння такая форма палявання здымае прэсінг, што аказваецца на дзікую прыроду (Звязда, 03.03.2016).*

Пурытанін (ад Puritan) – чалавек надзвычайна суровага спосабу жыцця. *Елізар'еў не пурытанін і не пазбягае, што называецца, вострых тэм (ЛіМ, 24.11.2017).*

Рэйд (ад raid) – нечаканая рэвізія, праверка дзейнасці якіх-н. аб'ектаў, што праводзіцца групай актывістаў па заданню грамадскіх арганізацый. *Месяц Іван ездзіў у рэйды ў якасці грамадскага інспектара (Чырвоная змена, 01.02.2018).*

Рэкардсмен (ад recordsman, ад record = рэкорд + man = чалавек) – 1) чалавек, які дасягнуў найбольшых поспехаў у чым-н.; 2) з'ява або прадукт, які паказаў найлепшы вынік. *«Трыбунал» – рэкардсмен паводле колькасці пастановак у Савецкім Саюзе (Наша Ніва, 21.07.2006)*; *Рэкардсмен – таматы дробнага гатунку, за іх просяць 60 тысяч (Звязда, 27.02.2016)*.

Скотланд-ярд (ад Scotland Yard (назва вуліцы)) – лонданская крымінальная паліцыя. *Тым часам Скотланд-Ярд пачаў шукаць сваякоў гэтага чалавека ў Вялікабрытаніі (Звязда, 09.01.1990); 1829 год – у Лондане сэрам Робертам Пілем была сфарміравана і пачала дзейнічаць грамадзянская паліцыя Вялікага Лондана, якая пасля атрымала назву Скотланд-Ярд (Звязда, 29.09.2018)*.

Стандартызацыя (ад стандарт) – адсутнасць, знікненне ў кім-н. або ў чым-н. арыгінальнасці, індывідуальных асаблівасцей; шаблоннасць, трафарэтнасць. *У адрозненні ад расійскага тэлебачання, дзе ўсё падаўляе стандартызацыя і ў шоу-бізнесе ўсё больш бізнесу і ўсё менш шоу, у нас яшчэ ёсць магчымасць змяніць сітуацыю (ЛіМ, 19.11.1999)*.

Тандэм (ад tandem) – сумесная дзейнасць; саюз, садружнасць каго-, чаго-н. *Нямногія творчыя адзінкі схільныя да «падваення», аднак калі ўжо такі тандэм двух персанажаў шоу-бізнесу адбыўся, трымаецца ён зазвычай доўга (Звязда, 19.04.2006)*.

Фаст-фуд (ад fast food) – аб нечым, што робіцца вельмі хутка, без дасканалай прапрацоўкі, са штучным ідэйным напаўненнем. *Аўтары вырабляюць своеасаблівы фастфуд, які мае ўсім спадабацца, але, з іншага боку, імкнуцца паказаць асаблівасці сваёй культуры праз агульназразумелую мову творчасці, – адзначыў Джо Данторн (ЛіМ, 17.02.2017); На погляд Руслана Макарэвіча, гэтыя песні – на стагоддзі: «А цяпер моладзь спажывае «музычны фастфуд»» (Звязда, 02.10.2018)*. Гэта лексема вылучаецца сярод англіцызмаў гэтага спіса, тым, што з'яўляючыся

адзінкай корпуса кулінарнай лексікі, яна ў апошняе дзесяцігоддзе набыла пераноснае значэнне, у якім ужываецца ў дачыненні да сацыяльна-культурных з'яў.

Хіпі (ад hippie, hippy) – чалавек, які паводзіць сябе экстравагантна, знарок неахайна і прэтэнцыёзна апранаецца.

Хуліган (ад англ. hooligan) – *разм.* дзіця, якое не парушае грамадскі парадак, але дастаўляе бацькам турботы сваімі паводзінамі. *Такія дзеці, маючы моцны і незалежны характар, нярэдка адкрыта ігнаруюць школу і маюць рэпутацыю хуліганаў (Чырвоная змена, 23.06.2006).*

Хуліганіць (ад хуліган) – адступаць ад агульнапрынятых нормаў у паводзінах, творчасці і пад., але не выклікаць турботаў у грамадскасці і бліжэйшага асяроддзя. *Руслан Вашкевіч у сваіх работах не проста хуліганіў, а ствараў постмадэрнісцкае мастацтва (ЛіМ, 23.06.2017).*

Хуліганства (ад хуліган) – адступленне ад агульнапрынятых нормаў у паводзінах, творчасці і пад., якое не з'яўляецца сацыяльна небяспечным. *Ды ўсё ж маладзёжнасць асацыюецца з эксперыментам, маладым задорам, творчым «хулінганствам» – чымсьці новым, крэатыўным, а не замшэлым (Культура, 08.08.2015).*

Высокі ўзровень семантычнай адаптаванасці запазычанага слова праяўляецца пры ўжыванні яго ў складзе ўстойлівых спалучэнняў слоў. У групе сацыяльна-палітычнай лексікі вылучаецца 5 такіх выразаў; да таго ж яны даволі актыўна праяўляюцца ў публіцыстычным дыскурсе. Параўн.:

Аб'явіць байкот – поўнасцю або часткова разарваць адносіны з кім-н. або чым-н. як знак незадавальнення яго паводзінамі, амовіцца ад чаго-н. *Абястлушчаныя малако, тварог, сыр і іншыя прадукты становяцца нормай на стале. Алею і наогул усім тлустым прадуктам аб'яўлены байкот (Алеся № 8, 2016, с. 52).*

Апошні з магікан – апошні прадстаўнік сацыяльнай з'явы, якая адмірае (па назве рамана амерыканскага пісьменніка Фенімора Купера «The last of the Mohicans»). *Я (апошні з магікан) усё яшчэ шчырую на заводзе, а ён нясе сваю вахту ў кватэры (Беларуская думка, № 1, 2005, с. 60).*

Аўральны рэжым – рэжым, пры якім вядзецца актыўная работа з мэтай тэрміновага завяршэння пэўнага задання. *Да вырашэння праблемы падключаюцца ў аўральным рэжыме спецыялісты другой лініі (Звязда, 05.11.2015).*

Буферная дзяржава / краіна / зона – звычайна слабая ў ваенных і палітычных адносінах краіна, якая знаходзіцца паміж тэрыторыямі або сферамі ўплыву вялікіх дзяржаў. *Па-другое, тая рэспубліка, якую варта было стварыць на думку Масквы, павінна была быць як мага далей на Захад і як мага меней на Усход… Буферная рэспубліка, тэрыторыяй якой можна было б ахвяраваць у выпадку нешчаслівага для савецкай Расіі развіцця падзей на заходнім напрамку (ЛіМ, 28.12.2018).*

Першая лэдзі – жонка кіраўніка дзяржавы. *А на ўрачыстую цырымонію ўзнагароджвання прыехала нават першая лэдзі Расійскай Федэрацыі Людміла Пуціна (Раніца, 26.10.2006); Ён пажартаваў, што былая першая лэдзі нібыта заплаціла «аднаму разумніку» за гэты слоган $ 1,9 млн (Звязда, 04.04.2019)*.

Такім чынам, можна вылучыць наступныя асаблівасці семантычнай адаптацыі англамоўнай сацыяльна-палітычнай лексікі ў публіцыстычным дыскурсе:

1. Сацыяльна-палітычная група прадстаўлена тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лексікай. Прычым, тэрміналагічная лексіка выкарыстоўваецца ў публіцыстычным дыскурсе значна актыўней.
2. Група налічвае даволі вялікую колькасць полісемантычных лексем (108 адз.), якія шырока прадстаўлены ў публіцыстычным дыскурсе.
3. Лексемы з пераносным значэннем найбольш прадстаўлены ў сацыяльна-палітычнай лексіка-семантычнай групе (23 адз.) і актыўна ўжываюцца ў публіцыстычным дыскурсе.
4. Устойлівыя выразы, кампанентам якіх з'яўляецца англіцызм сацыяльна-палітычнай сферы, трывала замацаваліся ў беларускай мове.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Астапенка А.* Інфармацыйнае грамадства і менталітэт беларускага Homo Informaticus // Трансфармацыя ментальнасці беларусаў ум XXI ст. : матэрыяла навук.-практ. канферэнцыі (Мінск, 24 лістапада 2013 г.) / пад рэд. А. Я. Тараса. Рыга : Інстытут беларускай гісторыі і культуры, 2013. С. 81–98.
2. *Костомаров В. Г.* Языковой вкус эпохи: Из наблюдений над речевой практикой масс-медиа. М. : Педагогика-пресс, 1994. 247 с.
3. *Савасцюк М. Л.* Англіцызмы беларускай мовы : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2019. 391 с.
4. *Цікоцкі М. Я.* Стылістыка публіцыстычных жанраў. Мінск : Вышэйшая школа, 1971. 288 с.
5. *Булыка А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. Мінск : БелЭн, 1999. 2 т.
6. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : Больш за 65 000 слоў / Пад. рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. Мінск : БелЭн, 1996. 784 с.
7. *Wilding P.* Stumbling towards the Brexit // BlogActive [Электронны рэсурс]. URL: https://blogactiv.eu/blog/2012/05/15/stumbling-towards-the-brexit (дата звароту: 15.08.2020).
8. *Line H.* Oxford English Dictionary offers definition of Brexit as it adds new words // Independent [Электронны рэсурс]. URL: https://www.independent.co.uk/news/uk/home-news/brexit-definition-oxford-english-dictionary-add-new-words-2016-a7476271.html (дата звароту: 15.08.2020).

КАГНІТЫЎНЫ ПАДЫХОД У ФРАЗЕАЛОГІІ

А. Л. Садоўская

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Карла Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Sadovskaja741@rambler.ru

У артыкуле разглядаецца спецыфіка кагнітыўнага падыходу ў фразеалогіі. Акрэсліваюцца аб'ект, тэарэтычныя і эксперыментальныя задачы кагнітыўнай фразеалогіі, адметнасць кагнітыўнага падыходу да вывучэння нацыянальна-культурных канатацый фразеалагізмаў. Прыводзіцца агляд шэрагу навуковых работ па кагнітыўнай фразеалогіі. Устанаўліваецца, што для выяўлення нацыянальных асаблівасцей і ўніверсалій моўнай творчасці ў сферы фразеалогіі варта звяртацца да аналізу фразеасемантычных палёў.

Ключавыя словы: кагнітыўная лінгвістыка; кагнітыўная фразеалогія; моўная карціна свету; фразеалагічная карціна свету; культурна-нацыянальнае светабачанне; семантыка; фразеасемантычнае поле.

У межах сучаснай антрапалагічнай парадыгмы наспела неабходнасць паглядзець на мову з боку яе ўдзелу ў пазнавальнай дзейнасці чалавека. Мова, як адзначае В. А. Маслава, – "гэта сродак перадачы думкі, якую яна "ўпакоўвае" ў моўную форму. Веды, якія выкарыстоўваюцца пры гэтым, не з'яўляюцца толькі ведамі пра мову. Гэта таксама веды пра свет, пра сацыяльны кантэкст, веды пра прынцыпы моўных зносін, пра адрасата, фонавыя веды і г.д. Ні адзін з названых тыпаў ведаў нельга лічыць прыярытэтным, толькі вывучэнне іх усіх у сукупнасці і ўзаемадзеянні наблізіць нас да разумення сутнасці моўнай камунікацыі" [19, с. 4].

Манаграфіі, калектыўныя працы і асобныя артыкулы А. П. Бабушкіна, Г. А. Валохіна, З. Д. Паповай, Ю. С. Сцяпанава, І. А. Сцерніна, В. М. Тэлія і шэрагу іншых даследчыкаў, якія выйшлі ў апошнія дзесяцігоддзі, утрымліваюць важныя тэарэтычныя палажэнні па пытаннях пра тое, як захоўваюцца нашы веды пра свет, як яны структураваны ў мове ў працэсе камунікацыі. Даследаваннем гэтага і займаецца кагнітыўная лінгвістыка. З'яўленне тэрміна *кагнітыўная лінгвістыка* вучоныя адносяць да 80-х гадоў XX стагоддзя і звязваюць яго з іменем М. Бірвіша. Гэты новы кірунак у мовазнаўстве выходзіць за межы ўласна лінгвістыкі, яго цікавяць таксама логіка, псіхалогія, сацыялогія, філасофія. Кагнітыўныя лінгвісты побач з моўнай і наіўнай карцінамі свету вылучаюць канцэптуальную карціну свету асобнага чалавека з улікам гендарнага падыходу. Канцэптуальная карціна свету ўключае ўніверсальныя і нацыянальныя канцэпты, а таксама канцэптуалізацыю кожнай моўнай асобы. Выключную цікавасць уяўляюць канцэптуальныя карціны свету творчых асобаў, бо яны могуць уплываць не

толькі на нацыянальную карціну свету, але (у асобных выпадках) і на агульначалавечую.

З цягам часу са складу кагнітыўнай лінгвістыкі вылучылася і кагнітыўная фразеалогія. Кагнітыўны падыход у фразеалогіі з'яўляецца прынцыпова новым у вырашэнні наступных тэарэтычных і эксперыментальных задач: «як структураваны змест фразеалагічных адзінак і якія спосабы яго фармалізацыі; якім чынам аказваецца "ўплеценай" у "тканіну" моўнага значэння семантыка культуры, гэта значыць, як знакі культуры – яе ўстаноўкі, стэрэатыпы, эталоны, сімвалы, міфалагемы і інш. – "уваходзяць" у змест фразеалагічных адзінак; праз якія кагнітыўныя працэдуры кадзіравання і ўспрымання фразеалагічных адзінак ажыццяўляецца суаднясенне двух кодаў – кода мовы і кода культуры – і як фармалізаваць дадзены працэс; у чым заключаецца культурная своеасаблівасць фразеалагічных адзінак і інш» [11, с. 3].

У кагнітыўнай парадыгме фразеалагізм разумеецца як мікратэкст, які структуруецца падчас інтэрпрэтацыі носьбітам мовы ўсіх тыпаў семантычнай інфармацыі фразеалагізма ў семантычнай прасторы культурных ведаў, прыналежных суб'екту моўных зносін [11, с. 2]. У работах фразеолагаў [11, 22] вылучаюцца наступныя тыпы кагнітыўных працэдур, якія супадаюць з макракампанентамі значэння фразеалагічных адзінак: *дэнататыўная апрацоўка*, якая аперыруе ведамі пра ўласцівасці таго, што абазначаецца, пра тыповае ўяўленне пра прадмет ці з'яву; *ацэначная* – інтэрпрэтацыя таго, што абазначаецца, з пазіцыі каштоўнасных крытэрыяў суб'екта, з улікам нарматыўнага канона моўнай асобы. У гэты выпадку важна ўлічыць таксама, што імпліцытная тэорыя асобы праяўляецца на двух узроўнях – ідэалагічным і штодзённа-побытавым. На ідэалагічным узроўні яна абапіраецца на вобразы, якія прадстаўлены ў міфатворчасці, этычных трактатах, рэлігійных догмах, мастацкіх творах і г.д. Штодзённа-побытавы ўзровень – гэта жыццёвыя ўяўленні, распаўсюджаныя ў масавай свядомасці. Ідэалагічныя вобразы, як правіла, больш сістэмныя, больш прэскрыптыўныя і нарматыўныя: вобразы з міфаў і вобразы літаратурных герояў з'яўляюцца эталонам для пераймальнасці носьбітамі дадзенай культуры. Вывучэнне нарматыўнага канона асобы на першым узроўні выяўляе іерархію каштоўнасных арыенціраў культуры. Эталоны, прадстаўленыя на ідэалагічным узроўні, не заўсёды адпавядаюць уяўленням, якія замацоўваюцца ў масавай свядомасці. Напрыклад, маральна-этычныя нормы паводзін прадпісваюць чалавеку клапаціцца пра будучыя пакаленні, пра тое, што ён пакіне пасля сябе на зямлі, але гэта не пацвярджае фразеалагічна-парэмійны матэрыял: *Пасля нас хоць патоп; На наш век будзе, а пасля нас хоць трава не расці; Па маёй смерці няхай хоць выюць чэрці; Пасля нас не будзе нас* і г.д.

Наступныя кагнітыўныя працэдуры: *матывацыйная* – аперацыі з уяўнымі або разумова прадстаўленымі гештальт-структурамі

(матывацыйны макракампанент фразеалагічнага значэння ўказвае на асацыятыўна-вобразную сувязь аб'екта і таго словазлучэння, якое выкарыстоўваецца для новага абазначэння сітуацыі); *эматыўная* – эмацыянальна-ацэначная рэакцыя на вобразную гештальт-структуру як адбітак перажытых эмоцый; *стылістычная* – аперацыі сацыяльнага маркіравання ўмоў маўлення, г.зн. дарэчнасць або недарэчнасць ўмоў выкарыстання дадзенага словазлучэння ў тых ці іншых сацыяльна значных умовах.

Такім чынам, асноўным аб'ектам даследавання ў кагнітыўнай фразеалогіі з'яўляецца семантыка. "Фразеалагічнае значэнне лічыцца элементам зместу фразеалагічнай карціны свету – выбудаванай у свядомасці ўпарадкаванай сукупнасці фразеалагічных уяўленняў пра рэчаіснасць" [5, с. 75].

Як адзначае А. Я. Чыкіна, "у рэчышчы кагнітыўнай лінгвістыкі не толькі было распрацавана новае разуменне фразеалагізма і метады аналізу, неабходныя для выяўлення лінгвакультуралагічных канатацый паняццяў, якія ўваходзяць у план зместу або ў план выражэння фразеалагічнай адзінкі. Кагнітыўная лінгвістыка прапаноўвае адметны, кагнітыўны падыход да выяўлення нацыянальна-культурных канатацый фразеалагізмаў" [25].

Працягваючы ідэі В. Гумбальта і Л. Вайсгербера пра мову як дзейнасць і дзейсны сродак стварэння свету, кагнітыўная лінгвістыка звяртаецца да намінатыўнага падыходу ў вывучэнні моўных адзінак, у тым ліку і фразеалагізмаў. Акцэнт на анамасіялагічны аспект дазваляе ўбачыць мову ў дзеянні, апісаць заканамернасці лінгвакрэатыўнага мыслення носьбіта мовы, якія і з'яўляюцца першапрычынай і перадумовай узнікнення нацыянальнай адметнасці фразеалогіі [25].

Даследаванне анамасіялагічнага аспекту фразеалогіі ў рэчышчы кагнітыўнага падыходу робіць неабходным зварот да ідэаграфічнага апісання фразеалогіі, паколькі толькі на дастаткова вялікіх ідэаграфічных масівах становіцца відавочнай сувязь вобразнай асновы фразеалагізмаў з культурна-нацыянальным светабачаннем, г.зн. каштоўнасна-арыентаваным менталітэтам народа – носьбіта мовы.

Такім чынам, для выяўлення нацыянальных асаблівасцей і ўніверсалій моўнай творчасці ў сферы фразеалогіі неабходна звярнуцца найперш да аналізу фразеасемантычных палёў. Напрыклад, да асэнсавання беларускай фразеалогіі семантычнага поля *'каханне, вяселле, сям'я'*, семантычнага поля *'працоўная дзейнасць чалавека', 'эмоцыі і пачуцці чалавека', 'паводзіны чалавека', 'фізічны стан чалавека'* і інш. "З дапамогай семантычных палёў становіцца рэальнай спроба ўзнаўлення нацыянальнай моўнай карціны свету ў асобных фрагментах, зададзеных тэматычнай класіфікацыяй семантычных палёў" [12, с. 80–81].

Пералічаныя вышэй і іншыя задачы пры даследаванні ідэаграфічных масіваў, суадносных з апазіцыяй базавых канцэптаў культуры 'труд –

безделье’ і ‘ум – глупость’ (на матэрыяле рускай і французскай моў) з мэтай апісаць універсальнае і культурна-спецыфічнае ў светабачанні і адлюстраванні яго фрагментаў у фразеалагічных адзінках вырашаюцца, напрыклад, у кандыдацкай дысертацыі цытаванай намі вышэй маскоўскай даследчыцы М. Л. Каўшовай [11]. Ідыяматыцы ў кагнітыўным і лінгвакультуралагічным аспектах прысвечаны і дысертацыі шэрагу іншых расійскіх даследчыкаў, напрыклад, І. Г. Вражновай [1], Э. А. Гашымава [2], Ю. В. Жэвайкінай [8], А. Ю. Мазаевай [18], Г. Б. Феакціставай [24] і інш. Вывучэнню канцэптаў фразеалагічнай карціны свету прысвечаны шэраг манаграфій беларускай даследчыцы В. А. Ляшчынскай [15, 16, 17]. Каштоўнай крыніцай для далейшага кагнітыўнага вывучэння фразеасемантычных палёў будзе і слоўнік “Вобраз чалавека ў беларускай фразеалогіі” В. А. Ляшчынскай і З. У. Шведавай [14].

Выбар таго або іншага вобраза-матыву звязаны са светабачаннем суб’екта, з яго карцінай свету [21]. Асацыятыўна-вобразнае ўяўленне ёсць унутраная форма слова або фразеалагізма. Даследаванне ўнутранай формы важна для кагнітыўнай лінгвістыкі ў плане вывучэння лінгвакрэатыўных працэсаў мыслення. У кагнітыўнай лінгвістыцы ўнутраная форма выступае як квазістэрэатып або эталон пэўнай сітуацыі, асацыюецца з лексічнымі або фразеалагічнымі прэсупазіцыямі [23, с. 44, 97]. Д. А. Дабравольскі адзначае, што ўнутраная форма адыгрывае важную ролю злучальнага звяна паміж дзвюма карцінамі свету ў ідыяматыцы – паміж літаральна, даслоўна ўспрынятымі фразеалагізмамі і актуальнай моўнай карцінай свету [7, с. 58].

Галоўнае, што аб’ядноўвае ўсе даследаванні кагнітыўнай арыентацыі, у процівагу сістэмацэнтрычным распрацоўкам “традыцыйнай” фразеалогіі, – гэта тэндэнцыя да разгляду зместу фразеалагізмаў як структуры ведаў пра тое, што імі абазначаецца; разуменне актуальнага значэння як выніку апрацоўкі пэўных ведаў пра свет, з якімі звязана фразеалагічная адзінка; спроба мадэлявання таго або іншага аспекту значэння фразеалагізмаў [3, с. 157].

Кагнітыўны падыход да значэння фразеалагізмаў адкрывае вялікія магчымасці ў рэчышчы лінгвістычнага мадэлявання актуальнага значэння фразеалагічных адзінак. Як вядома, ідыяматычныя значэнні большай часткай метафарычныя. Гэта дазваляе аднавіць комплекс тых канцэптуальных пераўтварэнняў, якія ляжаць у аснове фарміравання актуальнага значэння фразем. Мадэляванне ў фразеалогіі на сённяшні дзень – вельмі перспектыўны кірунак, асабліва фразеаўтваральнае мадэляванне, заснаванае на ўнутранай форме фразеалагізма.

Пытанні кагнітыўнага і лінгвакультурнага аспектаў даследавання фразеалагізмаў закранаюцца ў вучэбна-метадычным дапаможніку віцебскіх даследчыц Г. Я. Аксянчук і А. У. Даніч «Изучение фразеологии в ВУЗе» [20]. Значная ўвага кагнітыўнай арыентацыі фразеалагічных даследаванняў нароўні з лінгвакультуралагічнай інтэрпрэтацыяй фразеалагізмаў надаецца

таксама ў дапаможніку В. А. Ляшчынскай «Сучасная беларуская мова: фразеалогія» [13]. Актуальным пытанням кагнітыўнай фразеалогіі прысвечаны шэраг работ М. С. Гутоўскай [4, 5, 6].

Такім чынам, у сучаснай лінгвістыцы лінгвакультуралагічная парадыгма суіснуе і цесна судачыняецца з кагнітыўна-інтэрпрэтатыўнай парадыгмай даследавання. У цэнтры ўвагі кагнітыўнай лінгвістыкі знаходзіцца пазнавальная функцыя мовы.

Кагнітыўны аспект даследавання фразеалагізмаў прадугледжвае разгляд фразеалагізмаў як двухбаковых адзінак мовы, гэта значыць гукавой (графічнай) формы, здольнай указваць на рэаліі свету сваім значэннем, якое ўключаецца пры гэтым у структуру ведаў пра свет. Значэнне фразеалагічных адзінак пры такім падыходзе разумеецца як шэраг кагнітыўных працэдур, якія ўказваюць не толькі на якасці аб'екта, уключаюць веды пра яго, што замацаваліся ва ўяўленні носьбітаў мовы, але і на характар суб'ектыўных адносін моўцы да рэчаіснасці і ўмоў зносін [20, с. 19].

У фразеалогіі закладзена двайная стэрэатыпнасць: з аднаго боку, змест фразеалагізмаў паказвае прынятыя ў дадзеным соцыуме стэрэатыпы маралі, паводзін чалавека ў грамадстве, прадпісанні і ацэнку гэтых паводзін (г.зн. усё тое, што складае аснову нацыянальнага светабачання); з другога боку, фразеалагічныя выразы адлюстроўваюць наглядныя стэрэатыпы штодзённага, побытавага жыцця народа, увасобленыя найперш ва ўнутранай форме фразеалагізма як складана-структураванага знака. Таму фразеалагічныя выразы нясуць ў сабе двайную інфармацыю пра кагнітыўную дзейнасць чалавека і ўяўляюць тым самым паказальны матэрыял для даследавання ў кагнітыўным аспекце.

Кагнітыўны падыход да выяўлення нацыянальна-культурнай адметнасці фразеалагізмаў прадугледжвае аналіз асобных фразеасемантычных палёў, у тым ліку і з мэтай апісання ў іх межах фразеаўтваральных мадэлей, сукупнасць якіх паказвае як нацыянальныя асаблівасці моўнай сегментацыі свету, так і спецыфіку лінгвакрэатыўнага мыслення пры стварэнні кожнага асобнага фразеалагізма. Такім чынам, кагнітыўны падыход – гэта прыдатны спосаб для даследавання менталітэту нацыі. Нацыянальна-культурная адметнасць фразеалогіі ў межах гэтага падыходу ёсць асаблівасці функцыянавання моўнага мыслення, асаблівасці вобразнай карціны свету.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Вражнова И. Г.* Идиоматика в когнитивном и лингвокультурологическом аспекте : на материале фразеологических единиц с компонентами семантического поля "Вода" в русском и английском языках : дис. … канд. филол. наук : 10.02.19. Саратов, 2004. 237 с.

2. *Гашимов Э. А.* Структурно-семантические и прагматические характеристики английского лингвокультурного кода : (на материале лексико-фразеологического поля “продукты питания”) : автореф. … дис. канд. филол. наук : 10.02.04. Самара, 2005. 20 с.

3. *Гусельникова О. В.* Когнитивный аспект изучения фразеологии // Актуальные вопросы современной науки. 2009. № 5–2. С. 155–162. [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/kognitivnyy-aspekt-izucheniya-frazeologii (дата звароту: 10.10.2020).

4. Гутовская М. С. Фразеология в когнитивном аспекте // Die slavischen Sprachen im Licht der kognitiven Linguistik = Славянские языки в когнитивном аспекте / Impressum : T. Anstatt, B. Norman. Wiesbaden, 2010. С. 241–255.

5. *Гутовская М. С.* Актуальные проблемы когнитивной фразеологии // Языки мира – в мир языков : межвуз. сб. науч. ст. [Электронный ресурс] / БГУ ; редкол. : Н. Н. Нижнева (отв. ред.) [и др.]. Минск, 2015. Вып. 6. С. 75–82. URL: http://elib.bsu.by/handle/123456789/123172.

6. *Гутовская М. С.* К проблеме выбора фразеологического концепта для лингвокогнитивного изучения // Вестник МГЛУ. Сер. 1. Филология. 2013. № 3. С. 13–20.

7. *Добровольский Д. О.* Типология идиом // Фразеография в Машинном фонде русского языка : сб. статей. М. : Наука, 1990. С. 48–67.

8. *Жевайкина Ю. В.* Когнитивные аспекты идиоматики (на материале семантического поля “безумие” в русском и английском языках) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.19. Ульяновск, 2004. 24 с.

9. *Ковалева Л. В.* Фразеологизация как когнитивный процесс. Воронеж : Изд-во Воронеж. гос. ун-та, 2004. 184 с.

10. *Ковшова М. Л.* Как с писаной торбой носиться : принципы когнитивно-культурологического исследования идиом // Фразеология в контексте культуры. М. : Языки рус. культуры, 1999. С. 164–173.

11. *Ковшова М. Л.* Культурно-национальная специфика фразеологических единиц (Когнитивные аспекты) : дис. … канд. фил. наук : 10.02.19. М., 1996. 244 с.

12. *Ковшова М. Л.* Опыт семантического поля в описании идиом // Фразеография в Машинном фонде русского языка : сб. статей. М. : Наука, 1990. С. 80–88.

13. *Ляшчынская В. А.* Сучасная беларуская мова : фразеалогія : вучэбны дапаможнік. Мінск : РІВШ, 2010. 230 с.

14. *Ляшчынская В. А.* Вобраз чалавека ў беларускай фразеалогіі : слоўнік / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. Мінск : РІВШ, 2020. 304 с.

15. *Ляшчынская В. А.* Базавыя канцэпты фразеалагічнай карціны свету беларусаў : манаграфія. Мінск : РІВШ, 2015. 224 с.

16. *Ляшчынская В. А.* Канцэпты прыродных стыхій у фразеалагічнай карціне свету беларусаў : агонь, вада, зямля і паветра. Мінск : РІВШ, 2018. 222 с.

17. *Ляшчынская В. А.* Фразеалагічная эмацыянальная канцэптасфера беларусаў. Мінск : РІВШ, 2012. 246 с.

18. *Мазаева А. Ю.* Национально-культурные особенности фразеологических единиц семантического поля “порок” : на материале английского и русского языков : дис. … канд. филол. наук : 10. 02. 20. Пятигорск, 2003. 159 с.

19. *Маслова В. А.* Когнитивная лингвистика : учебное пособие. Минск : ТетраСистемс, 2004. 255 с.

20. *Оксенчук А. Е.* Изучение фразеологии в ВУЗе : учебно-методическое пособие / А. Е. Оксенчук, О. В. Данич. Витебск : Изд-во УО “ВГУ им. П. М. Машерова”, 2003. 76 с.

21. *Телия В. Н.* Метафора как модель смыслопроизводства и ее экспрессивно-оценочная функция // Метафора в языке и тексте. М. : Наука, 1988. С. 26–51.

22. *Телия В. Н.* Русская фразеология : семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты. М. : Школа “Языки рус. культуры”, 1996. 288 с.

23. *Телия В. Н.* Коннотативный аспект семантики номинативных единиц. М. : Наука, 1986. 142 с.

24. *Феоктистова А. Б.* Когнитивные аспекты семантики идиом, обозначающих чувства-состояния : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01. М., 1996. 17 с.

25. *Чикина Е. Е.* Выявление национально-культурной специфики фразеологизмов : современные подходы [Электронный ресурс] // Международный научно-практический (электронный) журнал «INTER-CULTUR@L-NET». 2004. Вып. 3. URL: http://www.my-luni.ru/journal/clauses/127 (дата звароту: 10.10.2020).

ГАВОРКА ВЁСКІ ПЕЛІШЧА КАМЯНЕЦКАГА РАЁНА

Я. Р. Самуйлік

Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт,
вул. Маскоўская, 267, 224017, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь,
abit@bstu.by

Артыкул прысвечаны вывучэнню гаворкі вёскі Пелішча Камянецкага раёна, якая размешчана на тэрыторыі Заходняга Палесся. Мэта працы – на аснове матэрыялаў палявых дыялекталагічных даследаванняў вызначыць структурна-тэрытарыяльны тып гэтай дыялектнай адзінкі як састаўной часткі заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак.

На аснове сабранага фактычнага матэрыялу ўпершыню ў беларускай дыялекталогіі праведзена комплекснае даследаванне мовы карэнных жыхароў (аўтахтонаў) вёскі Пелішча Камянецкага раёна. Гэта дазволіла выявіць найбольш тыповыя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці і спецыфічныя рысы дадзенай гаворкі, устанавіць яе прыналежнасць да паўднёвазагародскага дыялектнага тыпу, адной з чатырох асобных разнавіднасцей заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак. Акрамя таго, выказана меркаванне аб паходжанні назвы паселішча.

Дадзеная праца можа знайсці прымяненне пры вывучэнні праблем дыялекталогіі; пры даследаванні ўзаемадзеяння гаворак з літаратурнымі мовамі; пры параўнальным даследаванні гаворак беларускай і іншых славянскіх моў; пры складанні праграм па вывучэнні беларускіх народных гаворак, дыялектных слоўнікаў, рэгіянальных дыялекталагічных атласаў. Вынікі даследавання рэкамендуюцца для выкарыстання ў практыцы выкладання спецыяльных вучэбных курсаў па беларускай дыялекталогіі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, гістарычнай граматыцы беларускай мовы, па курсе «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

Ключавыя словы: гаворка; фанетыка (вакалізм, кансанантызм); марфалогія; лексіка; паўднёвазагародскі дыялектны тып.

Вёска Пелішча – цэнтр аднайменнага сельсавета – размешчана за 12 км на паўднёвы ўсход ад раённага цэнтра горада Камянца. Паводле даступных нам пісьмовых крыніц, паселішча вядома з другой паловы XVI ст. пад назвай Пелішчава. Гэта дзяржаўная ўласнасць у складзе Берасцейскага павета ВКЛ. На 7 верасня 2020 г. у вёсцы налічвалася 1302 жыхары і 548 гаспадарак (апошнія статыстычныя даныя па гэтай вёсцы

атрыманы ад супрацоўніцы Пелішчанскага сельсавета Пыжык Алены Васільеўны) [1, с. 263; 4, с. 134, 228; 5, с. 74; 9, с. 18–19, 517].

У аснове назвы вёскі – балтыйскі тэрмін са значэннем ‘торф, чорны перагной’. Айконім мае форму на -ішча. Гэта можа ўказваць на тое, што паселішча ўзнікла каля старажытнага перасохлага возера (тарфяніку) (параўн.: літ. *pélke* ‘балота’, ст.-прус. *pelky* ‘багна, твань’, лат. *pelce* ‘лужа’) [9, с. 94; 11, с. 17].

Дыялектны матэрыял у вёсцы Пелішча (мясц. назва: *Пе́л’ішча;* жыхары: *з Пе́л’ішча*) быў запісаны ў ліпені-жніўні 2019 г. студэнтам першага курса будаўнічага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Мандрам Віталіем Раманавічам ад мясцовых жыхароў Аўсяніка Івана Браніслававіча (1954 г. нар.), Аўсянік Ганны Браніславаўны (1956 г. нар.), Мандра Галіны Іванаўны (1981 г. нар.). Для запісу дыялектнага матэрыялу экспларатарам былі выкарыстаны праграма “Атласа гаворак Выганаўскага Палесся. Фанетыка. Марфалогія. Лексіка” (дапрацаваны варыянт) [10, с. 32–35] і т. зв. вялікая (новая) праграма: «Як у вас гавораць?» (рукапіс).

Разгледзім асноўныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці гаворкі в. Пелішча Камянецкага раёна.

Для даследаванай гаворкі характэрны шасціфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е*], [*а*], [*о*], [*у*]. У першую чаргу адзначым такую спецыфічную рысу гаворкі, як рэалізацыя галоснага [*у*] на месцы ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных (у к а н н е): *wудá, hурóд* ‘агарод’, *дурóha, курówa, hулуwá, мулукó, hóруд, hолýд* і інш. Аднак у канцавых адкрытых складах ***о** захоўваецца: *с’і́но, л’і́то, жы́то, wысóко* і інш.

Наступная яркая і паказальная фанетычная адметнасць гаворкі – гэта вымаўленне галоснага [*е*] на месцы ***ę**, ***ѣ** ў складах пад націскам пасля мяккіх, часам паўмяккіх зычных: *пумн’éw* ‘памяў’, *мн’éсо* ‘мяса’, *м’éта* ‘мята’, *ж’éла* ‘жала’, *ж˙ер* ‘жар’, але (на месцы ***а**, ***ę**, ***ѣ**): *ша́пка, жа́ба, йа́мка, йа́блыко, буйа́wс’а, пра́л’і, wз’аw, з’ат’, п’ат’, д’а́д’ко* і інш.

Адной з найбольш выразных і адрозных асаблівасцей гаворкі з’яўляецца таксама наяўнасць гука [*і*] пасля мяккіх губных (зрэдку – [*у*] пасля цвёрдых зычных) і заднеязычных на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам: *w’із, w’іл, w’ін, м’іст, б’іл’ш,* але: *пýйдыш; к’ін’, к’іт, к’і́л’ко, ск’і́л’ко* ‘колькі’ і інш. Аднак галосны [*и*][3] [8, с. 32, 151–152] у акрэсленай пазіцыі звычайна ўжываецца тут пасля цвёрдых і паўмяккіх пярэднеязычных: *нис, стил, ж˙и́нка, пл˙ит*, але: *н’іж, н’іж^{ш}ка* і інш.

[3] Галосны [*и*] (сярэдні паміж гукамі, што абазначаюцца літарамі *і* і *ы*) верхняга пад’ёму сярэдняга рада. Ён прыкметна больш пярэдні за галосны [*ы*] ў гаворках асноўнага беларускага віду, больш блізкі да яго варыянта [*і*] пасля мяккіх зычных. Пазіцыйнае супрацьпастаўленне варыянтаў гука [*и*] ў даследаванай гаворцы з’яўляецца вельмі абмежаваным і невыразным пасля мяккіх і цвёрдых зычных. Зычныя перад гэтым галосным звычайна цвёрдыя або паўмяккія.

Вельмі значная і паказальная адметнасць гаворкі – гэта рэалізацыя гука [*і*], часам – [*и*] на месцы націскнога ***ѣ** адпаведна пасля мяккіх і паўмяккіх і цвёрдых зычных: *л’іс, с’і́но, сн’іh*^{x}*, л’і́то, хл’іw, д’ід, w’і́м’ор, кw’і́тка, р’і́чка, ц’і́wка, д˙и́wчына* ‘дзяўчына’, *тин’* ‘цень’ і інш.

Выразнай і істотнай асаблівасцю гаворкі з’яўляецца таксама вымаўленне галоснага [*ы*] ў першым пераднаціскным складзе ў наступных пазіцыях: на месцы ***е**, ***ѣ** пасля губных: *wысна́, быда́, wыдро́, мышо́к, пысо́к;* на месцы ***е** (***ь**) пасля ***з**, ***н**, ***с**, ***т**, ***д**: *зымл’а́, ныма́, сыло́, тыпе́р, дын’о́к.*

Адрозная і характэрная адметнасць гаворкі – гэта наяўнасць гукаў [*і*], [*ы*] на месцы ***ę** ў паслянаціскных складах у словах тыпу *за́йіц’, па́мыт’.* Аднак у пераднаціскных складах у акрэсленай пазіцыі зафіксаваны галосныя [*а*], [*и*] ў лексемах *wз’ала́, зл˙ика́wс’а, зл˙ика́тыс’.*

І нарэшце, значнай і істотнай асаблівасцю гаворкі ў галіне вакалізму з’яўляецца вымаўленне гукаў [*і*] і [*ы*], [*о*] на месцы націскнога і паслянаціскнога ***е** адпаведна ў словах *yw’і́с* ‘авёс’, *м’ід* ‘мёд’; *бе́рыh, wе́чор.* Аднак у націскным становішчы названы этымалагічны галосны захоўваецца ў лексеме *дал˙е́ко.*

Найбольш яркая і выразная адметнасць гаворкі ў галіне кансанантызму – гэта розная рэалізацыя зычных. Губныя цвёрдыя перад рэфлексамі ***е** (ва ўсіх пазіцыях), ***ѣ** (у ненаціскных складах), ***і**: *wысна́, бе́рыh, wе́чор, ду мыне́* ‘да мяне’, *пе́ршый, быда́, wыдро́, мышо́к, пысо́к; забыра́ты, лuwы́ты, мы́ска, пыса́ты, рубы́ты* ‘рабіць’. Пярэднеязычныя ***з**, ***н**, ***с**, ***т**, ***д** цвёрдыя, ***л** звычайна паўмяккі і мяккі перад рэфлексамі ***е** (***ь**), ***і**: *зымл’а́, ныма́, сыло́, тыпе́р, дын’о́к; зыма́, кусы́ты, худы́ты; л˙ед’, по́л’е; кул’і́, л˙и́па, л˙и́ты, худы́л’і.* Да таго ж паўмяккі ***л** мае месца тут і перад рэфлексамі ***ę** ў пераднаціскных складах у словах тыпу *зл˙ика́wс’а, зл˙ика́тыс’,* а таксама перад ***е** ў лексеме *дал˙е́ко*. Губныя (пераважна) і заднеязычныя мяккія перад рэфлексамі ***о** ў новых закрытых складах пад націскам: *w’із, w’іл, w’ін, м’іст, б’іл’ш,* але: *пу́йдыш; к’ін’, к’іт, к’і́л’ко, ск’і́л’ко* і інш. Аднак пярэднеязычныя ў акрэсленай пазіцыі звычайна цвёрдыя і паўмяккія: *нис, стил, ж˙и́нка, пл˙ит,* але: *н’іж, н’і́жка.* Зычныя пераважна мяккія, часам паўмяккія і цвёрдыя перад рэфлексамі націскнога ***ѣ**: *л’іс, с’і́но, сн’іh*^{x}*, л’і́то, хл’іw, д’ід, w’і́м’ор, р’і́чка, ц’і́wка, д˙и́wчына, тин’* і інш.

Паказальнай асаблівасцю гаворкі з’яўляецца таксама ацвярдзенне паўмяккіх ***д˙**, ***т˙** перад рэфлексамі ***е**, ***і**, мяккага ***т’** на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку: *ден’, тыпе́р, ты́хо, худы́ты; но́сыт, хо́дыт, но́с’ат, хо́д’ат.* Заўважым, што перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** адзначана розная рэалізацыя мяккіх ***д’**, ***т’**: *д’ід,* але: *тин’.*

Адрозная адметнасць гаворкі – гэта пераход цвёрдых зычных у мяккія ў этымалагічных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы**, што ўзніклі пры ўтварэнні поўных форм прыметнікаў, а таксама ў пазіцыі перад галосным [*е*] ў

прыметніках ніякага роду адзіночнага ліку: *до́wh’ій, куро́тк’ій, ты́х’ій; до́wh’е, куро́тк’е, ты́х’е.*

Значнай асаблівасцю гаворкі з’яўляецца таксама наяўнасць як цвёрдых, так і паўмяккіх і мяккіх ***р**, ***ж**, ***ч**, ***ш**, ***ц** у пэўных пазіцыях: *пура́док, ша́пка, жы́то, о́чы, ца́цка, хло́пцы* і *пор’і́заw, р’і́чка, на мыж’і́, ж˙ер, у́wш’ек* ‘вушак /бакавы брус у дзвярной асадзе/’, *дубр’і́йш’ій* ‘дабрэйшы’, *мулуды́ц’а, ц’і́wка* і інш.

Істотная адметнасць гаворкі – гэта зычны ***в**, што паходзіць з ***в**, ***л**. У пазіцыі перад галосным, а таксама пасля галоснага гука перад зычным і ў канцавым становішчы ён даў рэфлекс губна-губнога [*w*]: *wáma, wудá, cwубо́дный, w’і́m’ор, плыwу́, ла́wка, пра́wда, до́wh’ій, купы́w* і інш. Сустракаецца губна-губны [*w*] і ў пачатковым становішчы перад зычнымі: *wз’ала́, wда́рыты, w ха́ты* ‘у хаце’, *w л’і́сы* ‘у лесе’ і інш.

Вельмі выразнай асаблівасцю гаворкі з’яўляецца наяўнасць фрыкатыўна-фарынгальнага зычнага [*h*]: *hусты́й, hо́руд, hуро́д, hад’у́ка, з ну́h’і́* ‘з нагі’ і інш.

Значная адметнасць гаворкі – гэта захаванне (зрэдку частковае аглушэнне) звонкіх зычных у канцавым становішчы: *w’із, дуб, н’іж, б’іб* ‘фасоля’, *крыж, hо́луд, мыдw’і́д’* ‘мядзведзь’, *дуро́h*^{x} ‘дарог’ і інш. Аднак у сярэдзіне слова адбылася частковая асіміляцыя па глухасці: *заhа́д*^{m}*ка, сыруй*$^{ы\acute{}}$*ж*^{ш}*ка*[4] ‘сыраежка’, *н’і́ж*^{ш}*ка,* але: *hу́б*^{n}*ка* і *hу́пка* і інш.

Істотнай асаблівасцю гаворкі з’яўляецца рэалізацыя на месцы этымалагічнага спалучэння “мяккі зычны + **ьj**” у становішчы паміж галоснымі падоўжаных зычных: *з’і́л’л’е, нас’і́н’н’е.*

І апошняя выразная і паказальная адметнасць гаворкі ў галіне кансанантызму – гэта адсутнасць пратэтычных зычных або часам наяўнасць прыстаўнога [*h*] перад галоснымі [*о*], [*у*]: *о́зыро, о́сын’, о́чы, ура́ты* ‘араць’, *ну́ча* ‘ануча’, *ныуднуhо́* ‘ніводнага’, *hо́стрый, hу́лыц’а.*

Характарызуецца гэтая гаворка і сваімі граматычнымі асаблівасцямі.

Назоўнікі мужчынскага і ніякага роду другога скланення з асновай на мяккі і зацвярдзелы зычны ў творным склоне пашыраны з канчаткам *-ом: кун’о́м, рубл’о́м, нужо́м, йіц’о́м.*

Назоўнікам жаночага і мужчынскага роду адзіночнага ліку першага і другога скланенняў з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне ўласцівы канчатак *-і: на мыж’і́, на кунц’і́, на дwур’і́.*

Назоўнікі жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланенняў з асновай на цвёрды і мяккі зычны ў месным склоне ўжываюцца з канчаткамі *-ы, -оwы, -уwы: w ха́ты, w л’і́сы, w нусо́wы* ‘у носе’, *w кужу́хуwы* ‘у кажусе’, *w по́л’уwы* ‘у полі’.

[4] [*ŭ*^{ы}] – вымаўленне [*ŭ*] з прыгукам [*ы*].

Формы клічнага склону агульных назоўнікаў і ўласных імёнаў жаночага роду адзіночнага ліку зафіксаваны з канчаткам *-о: ма́мо, ба́бо, Wа́л’о, На́д’о, Ма́н’о*.

Назоўнікам жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне характэрны нулявы канчатак або канчатак *-іw: hула́w, йам, дурóh*^{x}*, стр’іх, баб’і́w, хат’і́w*.

Назоўнікі мужчынскага роду множнага ліку другога скланення ў давальным склоне адзначаны з канчаткам *-ом: ко́н’ом* ‘коням’, *л’у́д’ом* ‘людзям’.

Прыметнікам мужчынскага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне ўласцівы націскны і ненаціскны канчатак *-ый: мулуды́й, стары́й, малы́й, до́брый, но́wый, хуро́шый.*

Яркая і спецыфічная адметнасць прыметнікаў гаворкі – гэта т. зв. “сцягнутыя” аднаскладовыя ненаціскныя канчаткі *-а, -е* ў назоўным склоне адзіночнага ліку адпаведна жаночага і ніякага роду: *до́бра, но́wa; но́we, суло́дк’е, до́бре.* Аднак пад націскам прыметнікі ў акрэсленай пазіцыі маюць тут поўныя двухскладовыя націскныя канчаткі *-айа, -ойе: мулуда́йа, стара́йа; мулудо́е, старо́е.*

Яшчэ адной адрознай асаблівасцю прыметнікаў гаворкі з’яўляюцца суфіксы *-ш-, -ч-* простай формы вышэйшай ступені параўнання: *дуро́шшый* ‘даражэйшы’, *ш’і́ршый* [2, с. 96–97].

Інфінітыў дзеясловаў з асновай на галосны пашыраны з фанематычным варыянтам старажытнага суфікса *-ц’і (-ты): худы́ты, рубы́ты, спа́ты.*

Дзеясловам першага і другога спражэнняў у трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку характэрны канчаткі *-е, -ыт, -ут, -ат: ідé, нысé, хо́дыт, но́сыт, ідýт, нысýт, хо́д’ат, но́с’ат.*

Зваротныя дзеясловы ў гаворцы ўжываюцца з постфіксамі *-с’а, -с’: бра́тыс’а, зwа́тыс’а, мы́тыс’а, рубы́тыс’а* ‘рабіцца’, *зл ̈ика́тыс’, буйу́с’а, купа́йус’а, буйа́wс’а, купа́wс’а, шос’ зрубы́лос’* ‘нешта зрабілася’.

Значная і істотная асаблівасць гаворкі – гэта захаванне ў дзеясловах з асновай на [*к*] старажытнай формы інфінітыва на *-чы* з націскам на канчатку: *пычы́, сычы́.* Аднак дзеясловы з асновай на [*h*] маюць у інфінітыве своеасаблівы лексіка-граматычны выгляд: *стры́шты* ‘стрыгчы’. У форме ж трэцяй асобы множнага ліку цяперашняга часу падобныя дзеясловы захоўваюць у аснове зычныя [*к*], [*h*]: *пыкýт, сыкýт, стрыhýт* [3, с. 316–318; 12, с. 64, 116, 184–185].

Даследаваная гаворка мае шмат своеасаблівага і адметнага і ў сваім слоўнікавым складзе: *б’іб* ‘фасоля’, *бýн’к’і* ‘бурбалкі’, *бурудá, hрéбын’* ‘пропуск у кашэнні’, *бýханык* ‘падбярозавік’, *бéдрык* ‘божая кароўка’, *w’і́чко* ‘адтуліна ў жорнах’, *hлады́шка* ‘гладыш’, *hóйданка* ‘арэлі, гушкалка’, *hýсыныц’а* ‘вусень’, *дз’убáк* ‘дзюба /у птушак/’, *до́бры hрыбы́* ‘ядомыя грыбы’, *др’éска* ‘стрэмка’, *жаб’éччы hрыбы́* ‘неядомыя грыбы’, *жа́бы*

ку́мкайут ‘жабы квакаюць’, *заһлумы́ты* ‘нанесці шкоду пасевам’, *зан’а́те* ‘аплодненае яйцо’, *зб’іж* ‘збожжа’, *здух’і у куро́wы* ‘уздыхавіны /бакавыя ўпадзіны паміж апошнім рабром і клубам (у каровы)/’, *зл’і́wa* ‘лівень’, *зуба́чытыс’а* ‘сустрэцца’, *кawду́н* ‘страўнік у кабана, свінні’, *каплу́н* ‘цура /страва, прыгатаваная з сырой вады, кавалкаў хлеба з соллю або цукрам ці з малака і кавалкаў хлеба і інш./’, *карто́пл’і* ‘бульба’, *кwа́ска* ‘кубел /дзежка і пад. з вушкамі і векам для захоўвання салёнага сала/’, *к’е́л’н’а* ‘палукаш, палукашак /плецены кораб, які ўстаўляецца ў драбіны воза або сані/’, *кло́wн’а* ‘рыбалоўная крыга /ручная лавушка з сеткі, нацягнутай паміж двума «палазамі»/’, *клу́н’а* ‘гумно’, *красн’у́к* ‘падасінавік’, *кузя́к’і* ‘казяўка, кузурка /усякае маленькае, дробнае насякомае/’, *кунупл’а́* ‘каноплі’, *купы́ц’а с’і́на* ‘капа сена’, *курuwа́ты* ‘акорваць /абчышчаць дрэва (бярвенні, жэрдкі і інш.) ад кары; карыць/’, *куц’уба́* ‘качарга /прылада, якой выграбаюць жар з печы/’, *куц’у́бнык* ‘качарэжнік /месца каля печы, дзе стаяць вілкі, качарга/’, *ку́чка* ‘пячурка /ямка з боку печы, дзе сушаць што-небудзь і з дапамогай якой узбіраюцца на печ/’, *лата́ц’а* ‘лотаць’, *л’iһа́ты* ‘клыкаць’, *л’убы́we мн’е́со* ‘нятлустае мяса’, *напрушк’і́* ‘напрасткі’, *ныхл’у́йа* ‘неахайны /чалавек/’, *п’і́рйе цыбу́л’і* ‘лісце цыбулі’, *плускуха* ‘брыца /дробнае пустазелле/’, *пл˙ишны́к*[1] ‘аер /расліна з доўгім мечападобным лісцем і тоўстым паўзучым карэнішчам, якая мае своеасаблівы востры пах/’, *пл˙ишны́к*[2] ‘плюшчай /расліна, падобная да аера/’, *прawды́wый һрыб* ‘баравік’, *пра́чык* ‘апалонік /хвастатая лічынка жабы/’, *прuwыwа́ты* ‘ачышчаць абмалочанае збожжа’, *прыһру́док* ‘мясцовасць “прамежкавая” паміж балотам і грудом /выцерабленае месца ад хмызняку (лесу) пад сенажаць, поле і інш./’, *пудныбе́н’н’е* ‘верхняя частка ўнутры печы’, *пулу́дын’* ‘1. абед /час яды/; 2. поўдзень /адзін з чатырох напрамкаў свету, проціległы поўначы/; 3. сярэдзіна дня, поўдзень’, *пумн’е́тка* ‘таўчоная бульба /пюрэ/’, *пу́шка* ‘пятка /тупы канец яйца/’, *пырып’і́лка*[1] ‘матылёк’, *пырып’і́лка*[2] ‘перапёлка’, *пычу́рка* ‘шампіньён’, *руме́нок* ‘рамонак’, *ры́за* ‘пілавінне, апілкі’, *сwы́ны* ‘свінуха /ядомы пласціністы грыб з карычнева-бураватай шапкай/’, *с’і́нныk* ‘сяннік /матрац, набіты саломай ці сенам/’, *скарпе́ты* ‘шкарпэткі’, *ско́пыц’* ‘1. капец бульбы /звычайна круглай формы/; 2. земляны каморніцкі насып’, *сл˙ин* ‘услон’, *со́нычко* ‘сонейка’, *сулуне́чныk* ‘сланечнік’, *сын’а́к* ‘польскі грыб /ядомы губчасты грыб каштанава-карычневага, бурага або шакаладна-карычневага колеру/’, *уһла́дк’і* ‘бліны /мучны выраб з рэдкага цеста, спечаны на патэльні/’, *уһла́дк’і картупл’е́ны* ‘дранікі /блін з дранай бульбы/’, *у́сц’е* ‘чалеснікі /уваходная выемка ў печы/’, *чыбре́ц’* ‘чабор’, *шкwа́рк’і* ‘скваркі /падсмажаныя кавалачкі сала/’, *шкурлупа́* ‘шкарлупіна /цвёрдая абалонка яйца/’, *шчawу́х* ‘шчаўе’, *шчыл’у́бына* ‘шчыліна’, *шчы́нок с’і́на* ‘пласт сена’, *шы́пка* ‘іглаподобнае лісце хвойных дрэў і кустоў’, *йажы́на* ‘ажыны’, *йаты́л˙ина* ‘дзяцеліна /дзікая канюшына/’ і інш.

Такім чынам, на аснове сабранага фактычнага матэрыялу ўпершыню ў беларускай дыялекталогіі праведзена комплекснае даследаванне мовы карэнных жыхароў (аўтахтонаў) вёскі Пелішча Камянецкага раёна. Гэта дазволіла вызначыць характэрныя асаблівасці дадзенай гаворкі на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі, устанавіць яе прыналежнасць да паўднёвазагародскага дыялектнага тыпу, адной з чатырох асобных разнавіднасцей заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак [6, с. 133–135, 136; 7, с. 22–24, 38–39; 8, с. 150–157, 201–202, 204–206, 211–212].

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1996–2004. Т. 12 : Палікрат – Праметэй. 2001. 560 с.

2. *Блінава Э. Д.* Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапам. / Э. Д. Блінава, Е. С. Мяцельская. 2-е выд., дапрац. і дап. Мінск : Выш. шк., 1980. 303 с.

3. *Булыка А. М.* Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко. Мінск : Навука і тэхніка, 1979. 328 с.

4. Вялікі гістарычны атлас Беларусі [Карты] : у 3 т. / Дзярж. кам. па маёмасці Рэсп. Беларусь ; рэдкал.: В. Л. Насевіч (гал. рэд.) [і інш.]. [Маштабы розныя]. Мінск : Белкартаграфія, 2009. Т. 1. 2009. 1 атлас (244, [3] с.).

5. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. Т. 4, кн. ІІ. Брэсцкая вобласць / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 2007. 608 с.

6. *Клімчук Ф. Д.* Гаворкі Берасцейскай вобласці // Gdzie bije źródło... Pieśni ludowe pogranicza Polski i Białorusi / red. F. Czyżewski, A. Dudek-Szumigaj, M. Żygalova. Lublin–Wisznice, 2015. S. 129–143.

7. *Клімчук Ф. Д.* Гаворкі Заходняга Палесся: фанетычны нарыс / рэд. М. І. Талстой ; Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства. Мінск : Навука і тэхніка, 1983. 126 с.

8. *Крывіцкі А. А.* Дыялекталогія беларускай мовы : дапам. для філал. спецыяльнасцей ВНУ. Мінск : Выш. шк., 2003. 293 с.

9. Памяць : Кам. р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэд.-уклад.: Г. П. Парафянюк, Р. Я. Смірнова ; рэдкал.: А. Л. Петрашкевіч [і інш.]. Мінск : Ураджай, 1997. 526 с.

10. *Самуйлік Я. Р.* Атлас гаворак Выганаўскага Палесся / Брэсц. дзярж. тэхн. ун-т. Брэст : БрДТУ, 2013. 322 с.

11. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы : у 14 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства. Мінск : Беларус. навука, 1978–2017. Т. 9 : П / уклад. І. І. Лучыц-Федарэц [і інш.] ; рэд. Г. А. Цыхун. 2004. 367 с.

12. *Янкоўскі Ф. М.* Гістарычная граматыка беларускай мовы : вучэб. дапам. для філ. фак. пед. ін-таў. 2-е выд., выпр. і дап. Мінск : Выш. шк., 1983. 271 с.

ПРАВІЛЫ БЕЛАРУСКАЙ ПУНКТУАЦЫІ: НАРМАТЫЎНЫ І МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТ

І. Э. Саўко[1)], У. П. Саўко[2)]

[1)]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
SavkoIE@tut.by,

[2)]Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,
вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
SVP1704@tut.by

Разглядаюцца пэўныя правілы беларускай пунктуацыі з пункту гледжання дакладнасці і навуковасці іх выкладу, а таксама ўплыў недакладных фармулёвак і прыкладаў на навучанне пунктуацыйным нормам ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Мэта даследавання – звярнуць увагу на неабходнасць карэкціроўкі некаторых правіл беларускай пунктуацыі.

Ключавыя словы: правілы беларускай пунктуацыі; навучанне пунктуацыйным нормам.

Навучанне пунктуацыйным нормам на ўроках беларускай мовы ажыццяўляецца на падставе «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» [5], зацверджаных законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года № 420-З «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Гэта той дакумент, да якога неабходна звяртацца і тады, калі стаіць пытанне правільнасці пастаноўкі ці адсутнасці пэўных знакаў прыпынку.

Але пры ўважлівым чытанні правіл беларускай пунктуацыі ўзнікаюць некаторыя пытанні. Пералічым некалькі з іх.

І. У параграфе 49 «Коска пры адасобленых азначальных зваротах і словах» (пункт 1, апошні абзац) гаворыцца: «Калі дапасаваныя азначэнні не маюць выражанага акалічнаснага значэння, коска можа не ставіцца: *Працяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша і грамознага Мартына Рыля* (Я. Колас)» [5, с. 87]. У адпаведнасці з гэтай фармулёўкай наяўнасць коскі ў падобных выпадках залежыць, відаць, ад жадання таго, хто піша. Спалучэнне *можа не ставіцца* паказвае, што коска можа і быць.

У вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 8-га класа такога правіла няма і даецца наступная інфармацыя (яна адпавядае той, якая змешчана на с. 86 «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»):

«Дапасаваныя азначэнні, якія стаяць перад паяснёным назоўнікам, адасабляюцца ў наступных выпадках:

1) калі маюць дадатковае акалічнаснае значэнне прычыны ці ўступкі: ***Мокрыя ад дажджу**, пліты настыла блішчэлі пад нізкім вераснёўскім сонцам* (Л. Левановіч) <…>;

2) калі аддзелены ад паяснёных назоўнікаў выказнікам: ***Ахінутыя інеем**, прыгіналіся да самай зямлі **кусты** маліннiку і парэчак* (П. Броўка)» [1, с. 200].

У адпаведнасці з гэтым правілам настаўнік павінен залічыць за памылку адасабленне азначэння, якое стаіць перад паяснёным назоўнікам і не мае дадатковага акалічнаснага значэння. Але, згодна з «Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», гэта не памылка (гл. вышэй). Як быць настаўніку ў такой сітуацыі?

II. У параграфе 50 «Коска пры адасобленых акалічнасцях і акалічнасных зваротах» пункт 4 гучыць так: «Акалічнасці, выражаныя адзіночнымі дзеепрыслоўямі, не адасабляюцца і не выдзяляюцца коскамі, калі стаяць пасля дзеяслова-выказніка і сваім значэннем набліжаюцца да прыслоўя спосаба дзеяння ці часу» [5, с. 90]. Але апошні прыклад такі: *Людзі хутка ўстаюць, спяшаючыся апранаюць сваё скураное адзенне* (Э. Самуйлёнак) [5, с. 90]. Дзеепрыслоўе *спяшаючыся* адносіцца да дзеяслова *апранаюць* і стаіць перад ім, таму ўзнікаюць наступныя пытанні: 1) калі ў правіле сказана толькі пра пастпазіцыю дзеепрыслоўя адносна дзеяслова, да якога яно адносіцца, чаму даецца такі прыклад; 2) калі прыклад правільны, значыць, дастаткова толькі значэння дзеепрыслоўя і таго, што яно стаіць побач з дзеясловам-выказнікам?

У правіле, змешчаным у вучэбным дапаможніку для 8-га класа на старонцы 213, ва ўсіх прыкладах адзіночнае неадасобленае дзеепрыслоўе стаіць пасля дзеяслова, да якога адносіцца. Але што рабіць настаўніку, калі вучань адасобіць дзеепрыслоўе, якое па значэнні набліжаецца да прыслоўя і знаходзіцца перад дзеясловам-выказнікам?

III. У параграфе 57 «Коска ў бяззлучнікавым сказе» ўвесь тэарэтычны матэрыял выкладзены так: «Коскай аддзяляюцца часткі складанага бяззлучнікавага сказа, якія па сэнсе і інтанацыйна звязаны паміж сабой» [5, с. 108]. Іншых тлумачэнняў, калі павінна ставіцца менавіта коска, няма, далей ідуць прыклады. Такую фармулёўку правіла пастаноўкі коскі ў бяззлучнікавым сказе цяжка палічыць карэктнай і поўнай, таму што бяззлучнікавы складаны сказ (пра гэта пішацца і ў вучэбным дапаможніку для 9-га класа) – гэта «сказ, у якім часткі аб’яднаны ў адно цэлае сэнсава і інтанацыйна (без злучнікаў і злучальных слоў)» [2, с. 117]. Як вядома, часткі бяззлучнікавага сказа могуць аддзяляцца адна ад адной і коскай, і коскай з кропкай, і двукроп’ем, і працяжнікам, але заўсёды яны будуць звязаны паміж сабой па сэнсе і інтанацыйна.

IV. У параграфе 58 «Коска ў складаназалежным сказе» пункт 8 такі: «Перад другім злучнікам коска не ставіцца, калі галоўная частка пачынаецца словамі *дык*, *то*» [5, с. 111]. Але ў гэтым выпадку, відаць, весці гаворку пра галоўную частку не зусім правільна, пра што сведчаць і прапанаваныя прыклады: сярод трох сказаў, якія ілюструюць гэтае тэарэтычнае палажэнне, два такія: *А яшчэ помніць ён* [Алесь], *што калі прыходзілі жаўнеры ў вёску, дык насміхаліся з усіх, абзываючы «мужыкамі»* (П. Броўка). *Трэба было адпачыць, але Іван адчуваў, што калі ўпадзе ў снег, то, напэўна, болей ужо не ўстане* (В. Быкаў) [5, с. 111]. У гэтых сказах часткі, у якіх знаходзяцца *дык* і *то*, з'яўляюцца не галоўнымі, а даданымі.

У вучэбным дапаможніку для 9-га класа тэарэтычныя палажэнні гэтага правіла і прыклады адпавядаюць адно аднаму: «Часткі складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі раздзяляюцца коскамі. < ... > Калі побач стаяць два падпарадкавальныя злучнікі (ці злучнік і злучальнае слова), то паміж імі ставіцца коска. Напрыклад: *Просьбаў было столькі,* ***што, каб*** *працаваў нават ноччу, усё адно не справіўся б* (А. Бутэвіч). Але перад другім злучнікам коска не ставіцца, калі пасля даданай часткі стаіць другая частка парнага злучніка ***то***, ***дык***. Напрыклад: *Не думайце,* ***што калі*** *Вы далёка працуеце,* ***дык*** *я Вам і пісаць не буду* (П. Кавалёў)» [2, с. 111].

V. У параграфе 58 «Коска ў складаназалежным сказе» ў пункце 9 напісана, што «даданая частка ў пазіцыі пасля галоўнай, выражаная толькі адным злучальным словам або спалучэннем слоў, коскай не аддзяляецца» [5, с. 111]. Узнікае пытанне: што маецца на ўвазе под «спалучэннем слоў»? Гэтае пытанне не здымаецца і пасля аналізу прыклада «*Невядома хто тут гаспадар*» [5, с. 111].

Калі лічыць, што гэта складаназалежны сказ, то знакі прыпынку павінны быць, відаць, такія: *Невядома, хто тут гаспадар.* У даданай частцы ёсць і дзейнік, і выказнік, і акалічнасць, і яе нельга назваць проста «спалучэннем слоў». Калі ж гэты сказ праінтанаваць так, что паўза паміж словамі *невядома* і *хто* будзе адсутнічаць (у такім выпадку і сэнс сказа іншы), то спалучэнне слоў *невядома хто* будзе эквівалентна дзейніку: *Невядома хто тут гаспадар*.

Аналагічныя сінтаксічныя канструкцыі ёсць і ў рускай мове. Безумоўна, беларуская і руская мовы розныя, хоць і роднасныя, і пунктуацыйныя правілы ў іх таксама могуць быць рознымі. Але нам падаецца, што тлумачэнне адпаведнай пунктуацыйнай нормы ў акадэмічных правілах рускай пунктуацыі дае магчымасць дакладна зразумець, што ўяўляюць сабой такія спалучэнні слоў і якая іх сінтаксічная функцыя.

Адпаведны раздзел «Правил русской орфографии и пунктуации» [4] мае назву «Знаки препинания в цельных по смыслу сочетаниях с подчинительными союзами или союзными словами» і знаходзіцца ў блоку «Знаки препинания при обособленных членах предложения», і гэта

паказвае, што ў рускай мове сказы з такімі спалучэннямі слоў не лічацца складанымі. У параграфе 87 напісана, што не ставіцца коска «в неразложимых сочетаниях, включающих в свой состав цельные по смыслу выражения» [4, с. 256], у тым ліку:

1) «в неразложимых сочетаниях с подчинительными союзами и союзными словами *как ни в чём ни бывало, сделать как следует…*» (далей даецца значны пералік такіх спалучэнняў і прыкладаў сказаў з імі);

2) «в неразложимых сочетаниях с отрицательными и ограничительными частицами *не только что, не то что, не то чтобы, не иначе как…*» (даецца пералік такіх спалучэнняў і прыкладаў сказаў з імі);

3) «в неразложимых сочетаниях с местоименными и наречными словами *неизвестно кто, неизвестно что <...>, непонятно какой <...>, редко где ...*» (даецца пералік такіх спалучэнняў і прыкладаў сказаў з імі);

4) «в неразложимых сочетаниях *(не) больше чем, (не) лучше чем <...>*, если они не заключают в себе сравнения» (даецца пералік такіх спалучэнняў і прыкладаў сказаў з імі) [4, с. 256–258].

Пры аналізе прыкладаў прапануюцца наступныя тлумачэнні: «Такие обороты эквивалентны членам предложения: *Он выполнил работу как следует* (т. е. *хорошо*)» [4, с. 256]; «Если подобный оборот образует придаточную часть предложения, то он отделяется запятой: *Как следует, так он и выполнил работу*» [4, с. 257]; «Ср. при наличии придаточной части предложения: *Неизвестно, какой сюрприз готовит нам погода завтра*» [4, с. 257]; «Ср. при сравнении: *Спортсмен выполнил упражнение не хуже, чем его соперник*» [4, с. 258].

Мы звярнулі ўвагу на тое, як гэтая пунктуацыйная норма падаецца ў акадэмічных правілах рускай пунктуацыі, таму што ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 11-га класа вучні знаёмяцца з адпаведнай пунктуацыйнай нормай беларускай мовы, якая выкладзена так жа сцісла, як і ў «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»: «Даданая частка, выражаная адным злучальным словам або спалучэннем слоў, у пазіцыі пасля галоўнай коскай не аддзяляецца: <…> *Як казаў адзін з сяброў-настаўнікаў, такім голасам можна выпрасіць што хочаш* (А. Козел)» [3, с. 150]. Але, як сведчыць практыка, школьнікі навучацца правільна пунктуацыйна афармляць адпаведныя сінтаксічныя канструкцыі толькі тады, калі зразумеюць, что ж гэта за «спалучэнні слоў» і чаму яны не аддзяляюцца коскай. У прыведзеным у вучэбным дапаможніку прыкладзе спалучэнне *што хочаш* цэльнае па сэнсе, мае значэнне ‘ўсё’ і эквівалентна дапаўненню. У вучняў можа ўзнікнуць пытанне, ці з’яўляецца такі сказ складаным, і настаўніку прыйдзецца адказаць на гэтае пытанне.

VI. У параграфе 61 пункт 8 такі: «Працяжнік ставіцца перад недапасаваным азначэннем, выражаным неазначальнай формай дзеяслова ці спалучэннем з гэтай формай. Напрыклад: *Усіх непакоіла адна думка –*

выстаяць (М. Лынькоў). *Міканор успомніў бацькаў наказ – паглядзець, ці не прадаюць кос* (І. Мележ)» [5, с. 120].

У абодвух прыведзеных прыкладах азначэнне, выражанае неазначальнай формай дзеяслова, стаіць у канцы сказа ці ў канцы часткі складанага сказа, перад назоўнікам *наказ* ёсць яшчэ адно азначэнне (*бацькаў*), слова *адна* патрабуе канкрэтызацыі. Інфінітыўнае азначэнне ў такім выпадку набывае сэнс дадатковага тлумачэння.

А ці будзе ставіцца працяжнік у сказах «*Усіх непакоіла думка выстаяць*», «*Думка выстаяць непакоіла ўсіх*», «*Міканор успомніў наказ купіць касу*», «*Наказ купіць касу Міканор забыў*»? Калі кіравацца толькі вышэйпрыведзеным правілам, то інфінітыўнае азначэнне неабходна заўсёды адасабляць пры дапамозе працяжніка. Гэта павінна выглядаць, напрыклад, так (згодна правілу, працяжнік стаіць толькі перад недапасавым азначэннем): «*Думка – выстаяць непакоіла ўсіх*»? Ці ўсё ж такі хочацца напісаць так: «*Думка выстаяць непакоіла ўсіх*»? На жаль, адказы на гэтыя (і не толькі) пытанні ў «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» пакуль адсутнічаюць. Але хочацца спадзявацца, што хутка з’явіцца. Напрыклад, можна напісаць акадэмічны даведнік па пунктуацыі, у якім даць больш шырокую і грунтоўную, з дастатковай колькасцю прыкладаў характарыстыку пунктуацыйных норм беларускай мовы. Каб гэтым даведнікам было зручна карыстацца, пажадана згрупаваць правілы не па знаках прыпынку, а па тых сінтаксічных канструкцыях, у якіх гэтыя знакі прыпынку ставяцца, таму што пунктуацыя залежыць ад сінтаксісу, а не сінтаксіс ад пунктуацыі.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Бадзевіч З. І., Саматыя І. М.* Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 8 кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. 256 с.

2. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Валочка Г. М. і інш. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. 214 с.

3. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Валочка Г. М. і інш. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. 214 с.

4. Правила русской орфографии и пунктуации. Полный академический справочник / Под ред. В. В. Лопатина. М. : Эксмо, 2007. 480 с.

5. Правілы беларускай арфаграфіі і пунтуацыі. Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. 144 с.

ПОЭТИЧЕСКИЙ ДЕНДРАРИЙ, ИЛИ ФИТОНИМНАЯ ЛЕКСИКА В ЛИРИКЕ ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА: СЕМАНТИКА И ФУНКЦИОНИРОВАНИЕ

Т. П. Слесарева

Витебский государственный университет имени П.М. Машерова,
пр. Московский, 33 210038, г. Витебск, Республика Беларусь,
slestp@yandex.ru

Лирика Владимира Короткевича очень эмоциональна. И созданию этой эмоциональности способствуют как изобразительные средства, так и лексический состав его произведений В статье рассматривается семантический состав дендронимной лексики в лирике Владимира Короткевича, а также ее функционирование в качестве важного средства выражения философского и эстетического идеала поэта.

Ключевые слова: литературная ономастика; Владимир Короткевич; имя собственное; дендроним; семантические возможности.

26 ноября 2020 года свой девяностолетний юбилей отметил бы Владимир Семенович Короткевич – тонкий лирик, чье поэтическое наследие направлено на прославление красоты родного белорусского края.

Лирика мастера глубокого пейзажа очень эмоциональна. И созданию этой эмоциональности способствуют как изобразительные средства, так и лексический состав его произведений.

Особая роль принадлежит образам родной природы, для описания которой поэт использует самую разнообразную лексику.

Но сами по себе лексические единицы не сделают язык красочным и выразительным. Это мастер слова использует их в качестве образных выражений субъективного представления о предмете или явлении.

Родная природа выступает в поэзии Владимира Короткевича не просто темой - она определенным образом отражает философские взгляды поэта, его эстетический идеал.

Поэтому слова-репрезентаторы растительного мира, в частности, названия деревьев в качестве изобразительно-выразительных средств встречаются в текстах стихотворений Короткевича довольно часто. Нами зафиксировано 30 наименований различных деревьев: *бяроза, дуб, каліна, кіпарыс, ліпа, сасна, таполя, рабіна, ябланя* и другие.

Самым частотным употреблением явился дендроним *дуб* (18 словоупотреблений). Это дерево как в фольклоре, так и в поэзии выступает символом жизненной силы, мощи, выносливости, долголетия, благородства и славы.

І ***дубы*** *ў малочным тумане*
Веліканамі ціха стаяць [1, с. 52].

Ад дажджу пачарнеў небарака-дом
І ***дубоў*** *магутных слупы* [1, с. 49].

Над берагам зялёным явар звонкі
І моцныя, спрадвечныя ***дубы*** [1, с. 311].

Много пришлось испытать и вынести белорусскому народу, но он как дуб, который ломала и корежила судьба, стоит крепко и непоколебимо:

Бо мы народ вялікі, непарушны,
Народ, што да зямлі прырос, як ***дуб*** [1, с. 315].

Поэт задается вопросом:

Што вы варты без гэтай магілы,
Без ***каліны*** *на роднай мяжы?*
Без ***дубоў,*** *што ў тумане млеюць,*
Без расы на роднай траве? [1, с. 53].

Нет в нашем лесу дерева более поэтичного, чем *береза*. Эта лексема в анализируемых текстах нами зафиксирована 12 раз.

О березе сложено много песен, она является излюбленным мотивом пейзажной живописи. Русский художник Игорь Грабарь говорил: «Что может быть прекраснее березы, единственного в природе дерева, ствол которого ослепительно бел, тогда как все остальные деревья на свете имеют темные стволы. Фантастическое, сверхъестественное дерево, дерево-сказка».

Стройную, кудрявую, белоствольную красавицу сравнивают с нежной и красивой девушкой. Кроме того, береза издревле дерево-друг: из берёсты крестьяне мастерили корзины, лапти, кора берёзы когда-то являлась основным материалом, на котором учились начертаниям букв, писали письма.

Над спакойны і радасны дом над Акою
Нахіляюць зялёныя косы ***бярозы*** [1, с. 173].

Вечар зацяпліў ***бярозак*** *свечы* [1, с. 177].

Але ўсё ж праз туманна-дрыжачыя слёзы,
Бы з карцінкі зводнай у тонкіх руках,
Бачны жоўтыя павесмы ніцай ***бярозы***
І чароды на сумных асенніх лугах [1, с. 189].

Многое могли бы рассказать березы о страшной трагедии Великой Отечественной войны, поскольку, согласно обычаю, над могилой погибшего солдатасажали березу, чтобы его жизнь продолжалась в земном дереве. Березы – наша память.

Іх укрылі дзяругай, паклалі на воз
І павезлі па вёсках, па чорных пажарышчах

Каля чорных абвугленых мёртвых ***бяроз*** [1, с. 61].

Я знаю, як гінуць нашы ***бярозы:***
Без плачу [1, с. 231].

Дендронимы органично и мотивированно вливаются в систему языковых средств и ярко рисуют панораму окружающей действительности, являясь своего рода символами для отображения разнообразных воспоминаний, раздумий, переживаний автора, выражения его мыслей и впечатлений:

Вось дом стары. Два ***клёны*** *і* ***таполя,***
Як старыкі аперліся на дах [1, с. 317].

Ў гэтым горадзе, дзе златабрамскі сквер
Зараз, пэўна, ад ветру пажоўк,
Ёсць любімы раён, што завецца «Пячэрск»,
Ёсць ***каштаны*** *ў імжацы дажджоў* [1, с. 50].

У музейным завулку дом стаяў асаблівы.
*Звонку хата як хата****. Дубы.*** *Гарод.*
Дзесяць ***яблынь*** *белых. Старыя* ***слівы.***
Хмель і плюшч спавіваюць высокі плот [1, с. 95].

Я гэту ***яблыню*** *тады саджала,*
І дачакалася яна цябе [1, с. 67].

Хутка між ***яблынь*** *густых*
Будзеш смяяцца і ты [1, с. 69].

Короткевич рисует милые своему сердцу картины, изображая жизнь природы и жизнь человека в их единстве на фоне круговорота времен года. Вместе с автором читатель видит и «*маладыя, пушыстыя лісцейкі* ***грушы****»,* и «***вербы*** *ў дымнай расе»,* и «*зімовы россып* ***каліны****»,* и «*у дажджы пух* ***таполяў****»,* и то, как «*тачылася з* ***вішняў*** *смала»,* и как как «*асцярожнае сонца з голых* ***асін*** *выпаўзае на ціхі сінічы свіст*», и как «***каштаны*** *квітнелі вясной»,* «*на адхонах* ***ліпы*** *мокнуць»,* а «*на ўсіх баравых* ***рабінах*** *чырвоныя плахты вісяць»* и слышит, как «*над зямлянкай* ***яліна*** *рыпіць крывая»* и «*хрушчы басяць над* ***клёнамі****»,* и *«над галавою* ***дуб****, расколаты бомбай, тужліва рыпеў».*

У поэта природа не только прекрасна, но и одухотворена, она может грустить и чувствует себя по-человечески. Поэтому Короткевич часто прибегает к приему олицетворения и сравнения: «***явар*** *сумны і адзінокі пахіліў задумёны стан»,* «*чакаюць* ***вішні*** *белых пакрывалаў», «сястра мая, бяздольная* ***асіна****, апошняю лістотай не дрыжы», «****яліна*** *над сцежкай маёй – не* ***яліна****, а баба-яга».*

Мастер слова, детали, Короткевич-романтик способен увидеть реальность не только такой, какая она есть, но и другой, необычной, экзотической, яркой. Поэт признается:

Я ўсё жыццё хацеў
***Алівы** ўзрошчваць* [1, с. 160].

И пусть там, в далекой, чужой стороне «***бяроз** няма. Адны **кіпарысы**»,* поэт восклицает:

*Тыя цёмныя **цісы** і цёмныя **кіпарысы**,*
Тыя зарасці лаўраў і леташняй ссохлай травы…
Не забуду я іх [1, с. 214].

Короткевич любуется, как «***міндаль** палыхае, як лава, і персікаў белыя крылы»,* видит «***эўкаліптаў** лёгкіх пер'е», «у тумане – **кіпарысы** цёмныя», «**туі**, Іудзіна дрэва і пілы **агаваў**», «і над вокнамі косы звесіла **пальма** поўдня» и «**кедр** каханы з паўночных вышынь».*

В поэтическом дендрарии Владимира Короткевича есть и «***язміну** кветка на марозе»,* и «*у вільготнай пахучай цемры **магналій** белы падман»,* цветы которых «*так салодка дураць і так спавіваюць, што ні людзям, ні скалам дрымотай не ўзняць* галавы», и «*першы жоўты ліст на галінах **акацыі**»,* и «*залацістая **мімоза***», и ***вяргіні,*** которые «*як лёд, стаяць, усе абвітыя ў павой»,* и, конечно же, «*шалёны **бэз,** вільготны **бэз***».

Живые картины природы в стихах Владимира Короткевича учат читателей любить и хранить мир земной красоты.

Библиографические ссылки

1. *Караткевіч У.* Збор твораў : у 8 т. Т. 1 : Вершы, паэмы. Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. 431 с.

2. *Русецкі А.* Уладзімір Караткевіч : Праз гісторыю ў сучаснасць. Мінск : Маст. літ., 2000. 300 с.

РЭАЛІЗАЦЫЯ СЭНСАВЫХ АПАЗІЦЫЙ У ПАЭТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ МІКОЛЫ МЯТЛІЦКАГА

Т. Я. Старасценка

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт,
вул. Савецкая, 18, 220050, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
tstarascienka@gmail.com

У артыкуле аналіз паэтычных тэкстаў Міколы Мятліцкага праводзіцца на аснове аднаго з маладаследаваных аспектаў камунікатыўнай стылістыкі, заснаванага на падыходзе «ад рэакцыі да стымулу», або «ад чытача да тэксту», пры якім дэкадаванне мастацкага твора залежыць ад ментальна-эмацыянальнай сферы адрасата. Падыход «ад рэакцыі да стымулу» адлюстроўвае дынаміку камунікатыўнай прасторы мастацкага

дыскурсу праз разнастайныя моўныя сродкі і структуры тэксту, дзякуючы якім мадэлюецца ідыястыль пісьменніка. На матэрыяле паэтычнага дыскурсу М. Мятліцкага аналізуецца эксплікацыя сэнсавых апазіцый і іх інварыянтаў як базавых універсальных катэгорый. Паказана адметнасць дамінантнай сэнсавай апазіцыі **«жыццё – смерць»**, якая ўключаецца ў іншыя апазіцыі М. Мятліцкага. У адрозненне ад многіх даследаванняў мовы паэтычнага тэксту, акцэнт зроблены, у першую чаргу, на ўліку граматычных сродкаў мовы – катэгорый склону, часу, трывання, стану – у фарміраванні паэтычных вобразаў.

Ключавыя словы: кантрасная светабудова; сэнсавая апазіцыя; інварыянтная апазіцыя; эксплікант; тэматычная лінія.

Базавымі ўніверсальнымі катэгорыямі, якія адпаведным чынам вербалізуюцца ў паэтычным дыскурсе М. Мятліцкага, выступаюць чатыры сэнсавыя апазіцыі: **«жыццё – смерць», «святло – цемра», «цяпло – холад», «мінулае – будучае»**. Яны адлюстроўваюць асаблівасць кантраснай светабудовы, з'яўляючыся пазатэкставымі асацыяцыямі.

У апазіцыі **«жыццё – смерць»** ключавым рэпрэзентантам кампанента *смерць* з'яўляецца *магіла* з назоўным сумнай стабільнасці *Магілы скрозь* («Гарланіце бяспамятна аб чым…»); *Магіла бацькі пазаве* («Палешукі»). Акузатыў і творны памяці надае семантыцы магілы сему жыцця: *Вярнуўшы помна з забыцця / Святыні, / храмы / і* ***магілы*** («Нам вочы праўда ўраз адкрыла…»); *Драбнеюць беды ў ім, цішэюць войны /* ***Над*** *гэтаю магільнаю* ***плітой*** («З далёкіх вёрст…»). Характэрная для ідыястылю М. Мятліцкага трансфармацыя вобраза смерці імплікуе матыў вяртання са смерці ў жыццё праз цяперашні пастаянны: *Крокі зноў* ***чую*** *– гэта /* ***Вяртаюцца*** *дадому з кладоў / Дзяды* («Дыпціх чакання») з семай вечнай памяці аб памерлых родзічах чарнобыльскай вёскі: *Бабуля мая Аксіння /* ***Гоніць*** *перад сабой / Чароды аблок – / З белага небнага раю* («Дыпціх чакання») і футуральны індыкатыў: *Вы* ***прыйдзеце****, я веру, землякі, / Да родных ніў з бязмоўнага кургання* («Землякам»). Сема памяці нейтралізуе супрацьпастаўленне жыцця і смерці, а таксама тэмпаральную апазіцыю *мінулы/цяперашні*: *Кут пакінуты, кут родны / Даўняй памяццю жыве* («Сон»), прычым апазіцыя *актыў/пасіў* (пакінуты – жыве) актуалізуе вечнасць духоўнага жыцця, якое праз прыметнік *даўняя* звязвае мінулае з акцыянальным дзеясловам вечнага *жыве*. Антытэза *смерць – памяць* уключае прэдыкатнае супрацьпастаўленне *сыкае – не састарэла*: *смерць* ***сыкае*** *змяёй – ты* ***не састарэла*** *з гадамі, мама, у памяці маёй* («Пятнаццаць год мінула з хвілі чорнай…»), дзе часціца *не* эксплікуе сцвярджэнне пастаянства прысутнасці маці і дазваляе ўспрыняць дзеяслоў прошлага часу закончанага трывання ў цяперашнім часавым плане. Роля часціцы *не* перад футуральнымі індыкатывамі супрацьпастаўлення *зглух – не расчэпіцца, не счэзне*: *І кут бацькоўскі* ***зглух****. / Ды ў фарбах* ***не расчэпіцца****, /* ***Не счэзне*** *продкаў дух* («Мальберт мастака») – у выражэнні працягу жыцця. Лексема *памяць* набывае ў М. Мятліцкага сэнсавую і мадальную значнасць, рэпрэзентуючы вечнасць

быцця з экспрэсіяй шчасця, таму ў апазіцыі *тут/там*, якая, на думку Ю. Байды, мае шматзначны характар [7, с. 177], для лірычнага героя М. Мятліцкага асабліва дарагі сірканстант *там* з тэмпаральнай семантыкай. Ён звязвае мінулае і будучае праз акалічнасці і футуральныя індыкатывы: *Там, **за гадамі, далёка-далёка**, / Вейна, жаўцяна **ўздрыгне** крыло. / Жоўтага ранку **расплюшчыцца** вока, / Вокан пагаслых **блісне** святло* («Памяць мая…»). Кантамінацыя мінулага і цяперашняга адбываецца ў памяці з семай святасці: *І памяць светлая, як храм, / Аберагае лікі-фрэскі* («Пазнакі котлішчаў былых…») і з семай працягу роду: *Іменем светлым, голасам сына / Памяць Яго крыляе, жыве* («Не, не пагасне жывая хвіліна…»). Аб'яднанне жыцця і смерці ў семе 'вечнасць' рэпрэзентуецца супастаўленнем кантрасных паняццяў *лес, сенажаць, поле, блакіт – могілкі* («Усё тваё – і лес, і сенажаць…»). Парадыгма жыццёвых эксплікантаў заснавана на «супалажэнні вобразаў» [2, с. 246], якое выводзіцца на аснове падабенства паміж узуальна несуадноснымі назоўнікамі. Варта адзначыць, што апазіцыя **«жыццё – смерць»** звязана з актыўнай і пасіўнай пазіцыяй лірычнага «я». Гэта рэпрэзентуюць акцыянальныя дзеясловы з семай 'жыццё': ***Ішоў** назад у вёсачку, каб **жыць*** («Усё ў жыцці мінаецца…») і дзеяслоў страты жыццёвай энергіі з семантыкай смерці: *Мяне ў бяссіллі гора **павяло** / За матчынай халоднай дамавінай* («Усё ў жыцці мінаецца…»).

Апазіцыя **«святло – цемра»** знаходзіцца ў адносінах уключэння з апазіцыямі **«жыццё – смерць», «цяпло – холад», «мінулае – будучае»**. У вершы «Астатні начлег» вылучаюцца два фрагменты і адпаведна дзве тэматычныя лініі – «Цемра дзяцінства» і «Цемра сталасці», у якіх вобраз цемры набывае нарастальную градацыю. У першай тэматычнай лініі цемра мае сему няўпэўненасці ў дзеяслове незакончанага трывання і творным пераўтварэння: *Кралася зданямі / Ведзьмаў і лесавікоў*, у другой эксплікуе семантыку Чарнобыльскай трагедыі праз адназначную, узмоцненую прыслоўем, закончанасць дзеяння: *Цемра моцна заплюшчыла / Вочы Жыцця*. Такая ж семантыка характэрна для вобразаў святла і цемры вершаў М. Мятліцкага, звязаных з Чарнобылем, прычым яна кантамінуе кантрасныя па сутнасці кампаненты *святло/цемра*, эксплікатарамі якіх у вершы «Штоноч бяссонне кліча…» з'яўляюцца *безгалосы лёт*; *прывід згубы*; *ветры*; *згублівы накрап*; *пахмурыя вершаліны*; *сонца тут – як вока адзіноты*. Таму так часта ў М. Мятліцкага гучыць матыў могілак з ключавым вобразам палескага смутку, які перасякаецца з унутраным станам лірычнага «я». Прэзенс вяртання выгнаннікаў-дзядоў у атручаную Чарнобылем родную вёску адбываецца праз фізічную смерць, але не духоўную: менавіта на могілках Бацькаўшчыны жыццё і смерць становяцца сінонімамі, зліваючыся ў вечнасці («Бабчынскія могілкі»). Зямное зло, супрацьпастаўленае ў М. Мятліцкага высокім зорам, актуалізуе інварыянтную апазіцыю *верх/ніз* у цяперашнім *верху*: *І там, дзе зор высокае святло / У сцюжнай недасяжнасці залее* («Былое не вяртаецца…») і

будучым *нізу* з семай дабра: *Бязважкім стане ўраз зямное зло / І розум самагубца прасвятлее* («Былое не вяртаецца…»). Кампанент *святло* сімвалізуе ў М. Мятліцкага шчаслівае мінулае роднага краю, цемра – горыч Чарнобыльскай трагедыі. Антанімізацыя прыметнікаў *чыстыя – горкія* стварае асіметрычны вобраз верху – дажджу: *маленства чыстыя дажджы – Палесся горкія дажджы* («У небе воблачка плыло…»). Лірычны герой кантамінуе верх і ніз праз вобраз дзедавага саду як сімвала светлага мінулага, вербалізаванага імперфектам незакончанага трывання з працягласцю дзеяння: *Неба полымна лілося / У сутонне, на зямлю* («Абкладае грады лісцем…»). У будучым індыкатыва *запалю* лірычны герой аб'ядноўвае верх і ніз аксюмаранам *неба зямлі* з семай памяці: *Запалю высока зоркі / Ў небе сцішанай зямлі* («Абкладае грады лісцем…»). Вобраз зорак звязаны ў М. Мятліцкага не толькі з верхам: у вершы «Крыжуюць вокны, забіваюць хаты…» праз генітыўную метафару *дзве зорачкі матуліных вачэй* эксплікуецца ніз з семай найвялікшай чалавечай каштоўнасці. «Вобраз зоркі з'яўляецца не толькі арнаментам або вынікам творчага настрою, ён мае істотную функцыю – найперш каштоўнасцей рэчаіснасці» [8, с. 242].

Апазіцыя **«цяпло – холад»** разгортваецца ў М. Мятліцкага па гарызантальнай восі ў месным склоне з семантыкай духоўнага цяпла: ***У сценах*** *– цеплыні жывой дыханне* («Аксане Фёдараўне Куляшовай») і прыроднага цяпла: ***У садзе*** *маім / Белая яблыня звонам расы / Пудзіць пчалу, / Сонца – / Прыпарам веснім / Ліецца* («У садзе маім…»); ***На ўзлессі*** *восенню зіхоткай / Спачыне гордая краса* («На ўзлессі восенню зіхоткай…»); *Высокая восень,* ***у кронах бяроз*** */ Шапочаш лісцём залатым* («Высокая восень, у кронах бяроз…»). Верш «У парку восень…» эксплікуе прыроднае цяпло праз сінтаксічную кагезію – клічны сказ *Ў іх столькі сонца!* з выражэннем паслядоўнай сувязі: рэтраспекцыяй антэцэдэнта *лісты* ў адносінах да займенніка *іх*; *Ў ёй столькі сонца!* з антэцэдэнтам – перыфразай *агнялістая краса*; *Ў ім столькі сонца!* з антэцэдэнтам *ліст*. Цяпло ў прыродзе перасякаецца з духоўным станам: *Цяплом душы не выстылай / Скажы!*, рух якога набывае вектарны напрамак уверх: *Усё, што сэрцам пераведана / На ўзлёце яснасці зямной* («Кілім жыцця – тугой аброшаны…») або зліваецца з прыродным холадам нізу: *Ажухла багата ў халодным лісці / Нязбытных надзей і прыкмет* («Высокая восень, у кронах бяроз…»). У прыродным холадзе М. Мятліцкага можа прысутнічаць станоўчая ацэнка: *Кладу на холад цёплую руку. / Далонь сцюдзёнай вечнасцю пяку* («Валун халодны – выстыла душа…»). Цяперашні чалавечай памяці вынікае ў вершы з мінулага прыроднага, у вобразе якога знешні холад валуна асацыюецца са статыкай. Апазіцыя *адзінкавасць/множнасць*, звязаная з адзіночным лікам статыкі валуна і множным лікам яго памяці, эксплікаванай *эпохамі*, *завірухамі*, дазваляе выявіць у знешняй праяве холаду каменя канататыўную сему багатай разнастайнасці яго ўнутранага

свету. Паміж кампанентамі *цяпло* і *холад* у М. Мятліцкага прысутнічаюць медыятары, рэпрэзентаваныя абстрактным назоўнікам *дух* і прэдыкатывам *трывожна*. Пачатак верша «Жаўцяны жвір. І верасу набег…» уключае намінатыўныя сказы, якія «перадаюць пункт гледжання лірычнага героя (або персанажа), аднаўляюць або стылізуюць успрыманне ім той або іншай рэаліі тут і зараз» [5, с. 43]. Паралелізм аднасастаўных намінатыўных канструкцый *Жаўцяны жвір. І верасу набег – Халодны жвір. І першы мокры снег* спрыяе праекцыі граматычнага ўзроўню на семантычны. Кантрасныя адзінкі *жаўцяны – халодны*, *верасу набег – першы мокры снег* утвараюць архісему ‘адзінства прыроды’, падмацаваную супадзеннем гукавога комплексу рыфмы *набег – снег*. У выніку верх і ніз (неба і зямля) сінанімізуюцца: *Зямлі і неба згодлівае вечa*. Дзякуючы намінатыўным радам эксплікуецца дамінантная роля плана прэзенса і ў тэмпаральнай структуры вобраза медыятара – духу: ***Махаючы*** *астуджаным крылом, /* ***Лунае*** *дух / Між сцюжай і цяплом*. Медыятар-прэдыкатыў *трывожна* рэтраспектыўна звязаны з дзеясловам закончанага трывання *пагасла*, а дзеясловы закончанага трывання «заўсёды абазначаюць падзею» [3, с. 22], у дадзеным выпадку – з семай канца, якая прадвызначае мяжу: *Пагасла ўсё… / Трывожна на мяжы / Цяпла і сцюжы, смерці й нараджэння* («Туманныя асеннія дажджы…»). Лексічныя супрацьпастаўленні *цяпло – сцюжа*, *смерць – нараджэнне* вербалізуюць нялёгкі жыццёвы выбар.

У апазіцыю **«мінулае – будучае»** уваходзіць інварыянтная **«мінулае – цяперашняе»**, прычым адметнасцю ідыястылю М. Мятліцкага з’яўляецца спалучэнне розных значэнняў прэзенса, напрыклад, цяперашняга гістарычнага як эксплікатара мінулага і цяперашняга актуальнага – вербалізатара сучаснасці. Семантыка мінулага актуалізуецца ў дэйктычным паказчыку – тэмпаральным ва ўмовах кантэксту лакалізатары *там*, а цяперашні гістарычны набліжае важныя для лірычнага героя падзеі да чытача: *Адзічэла* ***крычаць*** */ Совы мёртваму вою*; ***Смягне*** *чорны ручэй / У цянётах ажыны* («Прарастаю з былін…»). Цяперашні актуальны працягвае тэму важнасці мінулага для лірычнага «я»: ***Прарастаю*** *з былін, /* ***Вырастаю*** *з паданняў*; *Хмурай памяці лёх /* ***Адмыкаю – шукаю****. /* ***Прарастаю*** *з эпох, / З дзён былых –* ***вырастаю***; ***Прарастаю*** *з вачэй / Ацалелай дружыны*. Варта звярнуць увагу на паўтор аднакаранёвых дзеяслоўных формаў *прарастаю*, *вырастаю*, якія «рэпрэзентуюць індывідуальна-аўтарскую карціну свету на парадыгматычным узроўні» [6, с. 5]. Ужытыя ў аднасастаўных пэўна-асабовых сказах у форме 1-й асобы адзіночнага ліку, яны, тым не менш, імплікуюць ідэю множнасці. У гэтым плане можна пагадзіцца з меркаваннем Г. Д. Архіпкінай: «Форма ліку дзеяслова адлюстроўвае перш за ўсё адзінкавасць/множнасць суб’ектаў і толькі ўскосна – адзінкавасць/множнасць саміх дзеянняў» [1, с. 17]. Даследчыца звяртае ўвагу на неабходнасць уліку паўтору як самага яркага іканічнага кода ў сінтаксісе, паколькі ён здольны ўзмацняць множнасць дзеянняў. У вершы

такая множнасць эксплікуецца ў паўторы з генітывам *былін*, *паданняў*, *эпох*, *дзён былых*, *вачэй ацалелай дружыны*. У паэтычным дыскурсе М. Мятліцкага назіраецца збліжэнне формаў дзеясловаў незакончанага трывання са значэннем цяперашняга актуальнага і формаў закончанага трывання з перфектнай семантыкай: *На сцежцы той, дзе босых ног сляды, / **Парос** бяды-разлучніцы палын. / Каханая, **іду** з-пад крыл бяды* («На сцежцы той, дзе босых ног сляды…»); *Ты **падступіла**, вёсачка, з туману, / Як сонечнай усмешкі даўніна. / Жвірыстай сцежкай **крочу** вінавата* («Бярозкі»). У кампаненце *мінулае* М. Мятліцкага рэалізуецца сэнсавая інверсія: з аднаго боку, у ім прысутнічаюць семы ‘каханне’, ‘шчаслівае маленства’, з другога – ‘дзікунства’. Найбольшую складанасць характарыстыкі цяперашняга часу Ю. П. Князеў бачыць у тым, што «ён не займае якой-небудзь самастойнай вобласці на часавай восі, а ўяўляе сабой аб’яднанне сумежных участкаў мінулага і будучага, працягласць якіх залежыць ад асаблівасцей абазначанай сітуацыі» [4, с. 394]. У М. Мятліцкага часавы план мінулага лагічна перацякае ў цяперашні, а цяперашні – у будучы. У выніку стылістычнага прыёму *рэтраспекцыі/праспекцыі* часавая перспектыва актуалізуе значнасць асабістага прэзенса лірычнага «я», уключанага ў кантэкст філасофскага абагульнення з семай пазачасавасці: *Іду, / І мне ў патыліцу / Дыхаюць / Усе стагоддзі твае*; *Іду / І думаю пра адно: / І мой крок, / Чутны ў гэтым натоўпе, / Перастуліць аднойчы / Мяжу / Астатняга ўдару сэрца* («Горад»).

У паэтычным дыскурсе М. Мятліцкага дамінантнай сэнсавай апазіцыяй з’яўляецца **«жыццё – смерць»**, якая ўключаецца і ў іншыя апазіцыі. Яны рэалізуюць матыў могілак з ключавым вобразам палескага смутку Чарнобыльскай трагедыі, якая перасякаецца з унутраным станам лірычнага «я». Фарміраванню паэтычных вобразаў апазіцый М. Мятліцкага садзейнічаюць граматычныя катэгорыі склону, часу, трывання, стану, прычым менавіта для гэтага паэта ўласціва спалучэнне розных значэнняў прэзенса – цяперашняга гістарычнага як эксплікатара мінулага і цяперашняга актуальнага – вербалізатара сучаснасці.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Архипкина Г. Д.* Когнитивные основания и антропоцентрические параметры грамматической категории числа : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.19 / Ростовский гос. ун-т. Краснодар, 2006. 43 с.

2. *Гаспаров Б. М.* Поэтический язык Пушкина как факт истории русского литературного языка. СПб. : Академ. проект, 1999. 398 с.

3. *Зализняк А. А.* Русская аспектология : В защиту видовой пары / А. А. Зализняк, И. Л. Микоэлян, А. Д. Шмелев. М. : Языки славянских культур, 2015. 392 с.

4. *Князев Ю. П.* Грамматическая семантика : Русский язык в типологической перспективе. М. : Языки славянских культур, 2007. 704 с.

5. *Николина Н. А.* Номинативные предложения в композиции поэтического текста // Поэтическая грамматика. Том II / Рос. акад. наук, Ин-т русского языка ; отв. ред. Е. В. Красильникова. М. : Азбуковник, 2013. С. 38–56.

6. *Чарыкова О. Н.* Роль глагола в репрезентации индивидуально-авторской модели мира в художественном тексте : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / Воронежский гос. ун-т. Воронеж, 2000. 39 с.

7. *Bajda J.* Poezja a sztuki piękne. Warszawa : DiG, 2003. 304 s.

8. *Matusiak A.* W kręgu secesji ukraińskiej. Wybrane problemy poetyki twórczości pisarzy «Młodej Muzy». Wrocław : Wyd. Uniwersytety Wrocławskiego, 2006. 395 s.

УЗРОЎНІ ВАЛОДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ЯК ЗАМЕЖНАЙ: СТРУКТУРА АПІСАННЯ І СПОСАБЫ ВЫМЯРЭННЯ

Л. І. Сямешка

Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы,
вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
lidiya1408@gmail.com

Праектаванне сістэмы ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай грунтуецца на ўвазе да вынікаў навучання, пад якімі разумеецца пэўны ўзровень камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў і тэставыя спосабы яе вымярэння. Распрацоўка метадычнай канцэпцыі апісання структуры беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі, суадноснай з еўрапейскім стандартам, адносіцца да ліку актуальных задач дыдактыкі беларускай мовы як замежнай. У артыкуле прапанаваны аналіз арганізацыйнай схемы апісання параметраў кампетэнцыі як аб'ектаў тэставага кантролю і крытэрыяў яе ацэнкі, распрацаванай дзеля патрэб сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай. Даследаванне мае на мэце паказаць, што апісанне беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі суадносіцца з катэгорыямі еўрапейскай сістэмы стандартаў у галіне вывучэння сучасных моў. Артыкул падрыхтаваны ў рамках навуковага даследавання «Распрацоўка адукацыйных стандартаў і тыпавых тэстаў па беларускай і рускай мовах як замежных», якое выконваецца ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў (на 2016–2020гг.) «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства».

Ключавыя словы: беларуская мова як замежная; беларускамоўная камунікатыўная кампетэнцыя; сістэма сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай; стандарты экзаменацыйных патрабаванняў; тэст па беларускай мове як замежнай (ТБМЗ).

Змены ў сістэме сучаснай моўнай адукацыі, звязаныя з усталяваннем стандартаў дзейнаснай парадыгмы, актуалізуюць пытанні арганізацыі навучання мове як камунікатыўнай дзейнасці і ацэнку яго вынікаў праз развіццё ў навучэнцаў камунікатыўнай кампетэнцыі ў роднай і/ці замежнай мовах. У галіне дыдактыкі беларускай мовы як замежнай працэсы стандартызацыі арыентаваны на стварэнне мадэлі беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі як стратэгічнай мэты і выніку навучання, змест і структура якой класіфікуюцца на шэсць узроўняў, і стварэнне сістэмы сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай (далей – БМЗ).

Распрацоўка сістэмы сертыфікацыйных узроўняў і адпаведнага экзамену “Тэст па беларускай мове як замежнай” (ТБМЗ) са статусам міжнароднага, якая вырашае задачу далучэння БМЗ да еўрапейскай сістэмы стандартаў, патрабуе ўліку шэрагу кваліфікацыйных крытэрыяў, галоўныя з якіх: суадноснасць узроўняў кампетэнцыі з агульнаеўрапейскай сістэмай узроўняў і гарантыя адпаведнасці тэстаў незалежнай сістэме максімальна поўнага апісання ўзроўняў кампетэнцыі ў фармаце дакладных, дыягнастычна сфармуляваных дэскрыптараў уменняў і навыкаў як аб’ектаў кантролю. У сувязі з гэтым становіцца актуальнай уніфікацыя падыходаў да дыферэнцыяцыі аспектаў камунікацыі і параметраў валодання мовай, якія сведчаць пра той ці іншы ўзровень кампетэнцыі навучэнцаў, і вызначэнне агульных (супастаўных з еўрапейскімі) катэгорый і паняццяў, якія забяспечваюць эквівалентнасць апісання ўзроўняў кампетэнцыі. У прапанаваным артыкуле разглядаюцца метадалагічныя аспекты праектавання мадэлі беларускамоўнай кампетэнцыі, рэпрэзентаванай у фармаце *Стандартаў* экзаменацыйных патрабаванняў, праз якія магчыма адназначна сфармуляваць, што павінен ведаць навучэнец на тым ці іншым узроўні, і што неабходна ацаніць на экзамене.

Паняцце “камунікатыўная кампетэнцыя” – складаная, шматаспектная катэгорыя, якая ўключае комплекс прымет, абумоўленых камунікатыўнай прыродай мовы, індывідуальнымі рысамі асобы і асаблівасцямі авалодання мовай як сродкам стасункаў. У розных лінгваметадычных парадыгмах камунікатыўная кампетэнцыя, хоць і прызнаецца за базісную катэгорыю, якая ёсць мэтай і вынікам вывучэння мовы. тым не менш мае розныя інтэрпрэтацыі, неадназначна трактуюцца змест і структура яе складнікаў і тэрміны для іх абазначэння, па-рознаму вызначаюцца суадносіны паміж імі. Выпрацоўка дзеля дыдактычных мэтаў адзінага падыходу ў адносінах да структуры складнікаў кампетэнцыі, іх фармулёўкі і арганізацыйнай схемы апісання адносіцца да ліку актуальных пытанняў сучаснай тэорыі практыкі выкладання беларускай мовы як замежнай.

За аснову распрацоўкі *Стандартаў* экзаменацыйных патрабаванняў да ўзроўняў беларускамоўнай кампетэнцыі – нарматыўнага дакумента Дзяржаўнай камісіі па атэстацыі валодання беларускай мовай як замежнай прынята канцэпцыя камунікатыўнай кампетэнцыі, распрацаваная экспертамі Рады Еўропы [1], у парадыгме якой асаблівая ўвага надаецца кантэксту камунікатыўнай дзейнасці – комплексу ведаў, звязаных з паняццем *камунікатыўная сітуацыя* (суразмоўцы, іх сацыяльны статус і сацыяльныя ролі, матывы, тэмы і мэты камунікацыі, месца і спосаб стасункаў і інш.). Паводле гэтай канцэпцыі, камунікатыўная кампетэнцыя разглядаецца як здольнасць вырашаць сродкамі мовы актуальныя камунікатыўныя задачы ў розных сацыяльна і культурна дэтэрмінаваных сітуацыях і сферах стасункаў. Змест паняцця “камунікатыўная кампетэнцыя” вызначаецца ў сувязі з паняццем “*дзейнасць асобы*” і

апісваецца [1, с. 10–13] як сума ведаў, уменняў і характэрных рыс асобы, якія развіваюцца ў працэсе вывучэння і выкарыстання мовы і дазваляюць асобе выконваць камунікатыўныя задачы і дзеянні ў розных сітуацыях і ўмовах. Усе віды дзейнасці, якія маюць свой "матыў, задачу, спосаб выканання і вынік", развіваюць уменне камунікацыі, таму іх можна лічыць складнікамі камунікатыўнай кампетэнцыі. Дзеля больш цэласнага ўспрымання структуры кампетэнцыі яны аб'яднаны ў дзве групы: *агульныя* (невербальныя) кампетэнцыі (*General competence)*, неабходныя для разнастайнай дзейнасці (але не адмыслова для маўленчай), і *камунікатыўная моўная* кампетэнцыя (*Communicative langua*ge *competence*), якая забяспечвае магчымасць дзейнічаць з дапамогай моўных сродкаў. Складнікамі *агульныя* кампетэнцыівыступаюць: *дэкларатыўныя* (savoir) веды (як сістэма арыенціраў пра свет, карціна свету); *сацыякультурныя* веды (з розных галін культуры носьбітаў мовы, з гісторыі краіны і інш.), якія разглядаюцца як важная частка агульнай карціны свету; *кагнітыўная* кампетэнцыя (уменні, навыкі пазнавальнай дзейнасці); *экзістэнцыяльная* кампетэнцыя і індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці асобы (погляды, каштоўнасці, перакананні, тып пазнавальнай здольнасці і інш.), якія дазваляюць з пэўнай ступенню паспяховасці ажыццяўляць камунікатыўную дзейнасць і карэктна карыстацца мовай.

Камунікатыўная моўная кампетэнцыя разглядаецца як стратэгічная мэта і інтэграваны вынік навучання мове. Асноўныя параметры яе структуры рэпрэзентуюцца праз тры асноўныя метакатэгорыі апісальнай схемы: 1) камунікатыўная (маўленчая) дзейнасць (навыкі, уменні карыстання мовай, дзе ўвасоблены ўсе магчымыя спосабы маўлення (*слуханне, чытанне, пісьмо, гаварэнне, інтэракцыя, медыяцыя*), 2) камунікатыўныя (маўленчыя) стратэгіі, неабходныя для паспяховай камунікатыўнай дзейнасці, 3) складнікі камунікатыўнай кампетэнцыі: л*інгвістычная* кампетэнцыя *(*веды і здольнасць карыстацца моўнымі сродкамі для пабудовы карэктна сфармуляваных і дакладных паводле сэнсу выказванняў); *сацыялінгвістычная* (здольнасць успрымаць і ствараць выказванні ў адпаведнасці з канкрэтным сацыялінгвістычным кантэкстам камунікацыі), *прагматычная* кампетэнцыя, у складзе якой актуалізуецца дыскурсіўная і стратэгічная (кампенсаторная) кампетэнцыі. Агульная схема апісання кампетэнцыі грунтуецца на аналізе выкарыстання мовы з пункту гледжання *стратэгій,* неабходных для рэалізацыі камунікатыўнай кампетэнцыі дзеля ажыццяўлення дзеянняў і працэсаў, стварэння і ўспрымання тэкстаў, пабудовы дыскурсу на пэўныя тэмы.

З улікам прапанаванай структуры, галоўным параметрам апісання ўзроўняў беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі выступаюць катэгорыі, якія ляжаць у аснове маўленчай дзейнасці. Пад маўленчай дзейнасцю падразумяваецца практычнае прымяненне камунікатыўнай кампетэнцыі ў пэўнай сферы і сітуацыі ў працэсе ўспрымання і/ці стварэння

вусных і пісьмовых тэкстаў, накіраванае на выкананне канкрэтнай камунікатыўнай задачы. Тэарэтычнай асновай для ўзроўневай дыферэнцыяцыі аспектаў валодання мовай і кампетэнцыі навучэнцаў выступае сам змест паняцця “узровень валоданне мовай”, які вызначаецца як паказчык (характарыстыка) камунікатыўнай кампетэнцыі, “ступень авалодання якой ацэньваецца з пункту гледжання агульнай эфектыўнасці працэсу маўленчых стасункаў і рэалізацыі ўменняў і навыкаў ажыццяўляць камунікацыю ў канкрэтных сітуацыях з улікам бегласці, гнуткасці маўлення, дарэчнасці выкарыстання моўных і маўленчых сродкаў” [1, 29]. На кожным з шасці ўзроўняў валодання беларускай мовай апісваюцца агульныя параметры кампетэнцыі і канкрэтызаваныя ўменні, навыкі ў межах розных відаў маўленчай дзейнасці. Якасныя характарыстыкі маўленчай дзейнасці, набытыя ў працэсе навучання, якія сведчаць пра ступень валодання рознымі яе складнікам, выступаюць аб’ектам тэставага кантролю. Прымаючы пад увагу, што кожны акт выкарыстання мовы адбываецца ў кантэксце пэўнай сітуацыі, у пэўнай сферы і абумоўлены пэўнай патрэбай, матывам, тэмай, а таксама залежыць ад шэрагу сацыяльна-культурных чыннікаў (веды традыцый, нормаў маўленчых паводзін), умоў і характару камунікацыі і індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей камунікантаў, складнікамі прадметнай структуры камунікацыі і мадэлі маўленчага развіцця навучэнцаў выступаюць рэпрэзентаваныя ў стандартах у форме пэўных каталогаў і спісаў наступныя лінгвадыдактычныя катэгорыі: 1) камунікатыўныя задачы і інтэнцыі; 2) сферы, тэматыка і тыповыя сітуацыі беларускамоўных стасункаў; 3) магчымыя камунікатыўныя ролі навучэнцаў як удзельнікаў стасункаў; 4) актуальныя для гэтых роляў віды дыскурсаў (тэкстаў); 5) суадносныя з гэтымі дыскурсамі функцыянальна-стылявыя і лексіка-граматычныя падсістэмы. Усе гэтыя аспекты камунікацыі і кампетэнцыі навучэнцаў, градуіраваныя па ўзроўнях, складаюць змест навучання і тэставага кантролю. Такім чынам, можна канстатаваць, што сістэма ТБМЗ вымярае ўзроўні: 1) сфарміраваных маўленчых уменняў, 2) камунікатыўных стратэгій і тактык маўленчых паводзін у розных сферах і сітуацыях, дынаміка авалодання якімі выяўляецца праз здольнасць прымяняць іх для дасягнення мэты камунікацыі ў розных сітуацыях, а таксама тэсціруе 3) складнікі камунікатыўнай кампетэнцыі: лінгвістычны, сацыялінгвістычны, прагматычны, якія рэалізуюцца ў канкрэтных сферах жыцця праз стварэнне, успрыманне і разуменне тэкстаў дзеля вырашэння пэўных камунікатыўных задач.

Узроўні кампетэнцыі як сістэма патрабаванняў і ацэнкі грунтуюцца на агульнаеўрапейскіх шкалах дэскрыптараў, якія акрэсліваюць у даступнай і зразумелай форме, чым трэба авалодаць навучэнцу, каб карыстацца мовай, а таксама якія веды і ўменні яму неабходна набыць, каб камунікацыя была паспяховай. Выразныя і дакладныя дэскрыптары камунікатыўных уменняў

і іх рэалізацый ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці даюць магчымасць вызначаць мэты навучання і фіксаваць дасягненні навучэнца, ацэньваючы іх у балах у адпаведнасці з параметрамі гэтых паказчыкаў, што дазваляе эфектыўна кіраваць адукацыйным працэсам і ажыццяўляць карэляцыю зместу навучання з вучэбнымі дасягненнямі навучэнцаў. Так, напрыклад, маючы на мэце пэўны ўзровень валодання мовай, можна дакладна апісаць задачы навучання, выкарыстаўшы таксанамічную схему параметраў. Пры неабходнасці (з улікам мэты і пажаданых вынікаў навучання) магчыма дэталізаваць класіфікацыю параметраў.

Комплексны кантроль рэалізацыі кампетэнцыі ажыццяўляецца паводле наступных катэгорый: а) агульныя паказчыкі камунікацыі: выніковасць (у якой ступені рэалізаваны маўленчыя інтэнцыі і камунікатыўныяя задачы); эканамічнасць і адэкватнасць сродкаў (наколькі эканомна дасягнуты мэты); прыдатнасць формы і зместу; б) канкрэтныя паказчыкі камунікатыўнай дзейнасці (параметры кампетэнцыі ў розных відах маўлення): *для чытання і аўдыявання* – складанасць, звязаная з успрыманнем структуры тэксту, глыбіня разумення зместу, хуткасць, незалежнасць; *для пісьма* – правільнасць, адпаведнасць камунікатыўным задачам, паўната выказвання, складанасць; *для гаварэння* – дыяпазон, дакладнасць, бегласць, звязнасць); в) *кагнітыўная* кампетэнцыя (стратэгіі маўленчай дзейнасці, рацыянальныя прыёмы пазнавальнага працэсу); г) *сацыякультурная* кампетэнцыя (эфектыўнасць стасункаў з носьбітамі беларускай лінгвакультуры на аснове ведаў пра беларускі свет, уменне атрымаць з моўных адзінак культурную інфармацыю і карыстацца ёю); д) складнікі камунікатыўнай кампетэнцыі: лінгвістычны (правільнасць і дакладнасць выкарыстання лексіка-граматычных формаў, вымаўлення і інш); *сацыялінгвістычны* (варыятыўнасць, дарэчнасць маўлення, этыкетныя нормы маўленчых паводзін); *прагматычны,* у тым ліку *дыскурсіўны* (складанасць тэм, звязнасць, кагезіўная арганізацыя тэксту, паўтаральнасць дзеля звязнасці і інш.).

Такім чынам, дэталёвае апісанне параметраў кампетэнцыі як з боку сэнсавага кантэнту камунікацыі, так і з пазіцыі дынамікі маўленчай здольнасці асобы, робіць празрыстым змест экзаменаў і тэстаў і дазваляе асэнсаваць, што і ў якім аб'ёме неабходна вывучыць, каб карыстацца беларускай мовай на тым ці іншым узроўні. Стандарты экзаменацыйных патрабаванняў да ўзроўняў кампетэнцыі, рэпрэзентаваныя ў фармаце эталонных індыкатараў уменняў, ствараюць аснову для распрацоўкі вучэбных праграм, экзаменацыйных матэрыялаў, падручнікаў і іншых навучальных сродкаў. Мэты, змест навучання БМЗ і метады ацэнкі, закладзеныя ў стандартах, накіраваны на развіццё навыкаў рэальнай камунікацыі на беларускай мове, іх ацэнку і атрыманне зваротнай сувязі праз удзел у маўленчай дзейнасці, на авалоданне камунікатыўнымі стратэгіямі, прыдатнымі ў тым ці іншым сітуацыйным кантэксце, на

фарміраванне ўмення асэнсавана адбіраць прадметны беларускі кантэнт і ўмець з ім працаваць, на падтрымку і развіццё індывідуальных інтэлектуальных якасцей навучэнцаў і ўмення вучыцца, на павышэнне матывацыі да далейшага вывучэння беларускай мовы..

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Modern Languages: Learning, Teaching, Assessment. Common European Framework of Reference // Council of Europe [Electronic resource]. URL: http://www.coe.int/t/DG4/linguistic/Source/CECR_EN.pdf [«Общеевропейские компетенции владения иностранным языком : Иучение, обучение, оценка». Московский государственный лингвистический университет (русская версия). 2003] (дата звароту: 18.11.2020).

НАЗВЫ ПЛАЦЯЖОЎ І ПАДАТКАЎ У СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Г. К. Ціванова

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Карла Маркса, 31, 220050, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
galina.tsivanova@gmail.com

Разглядаецца адна з тэматычных груп старабеларускай эканамічнай лексікі перыяду XIV - XVIII стагоддзяў – назвы плацяжоў і падаткаў. Апісваецца іх семантыка і этымалогія. Даследуюцца мадэлі ўтварэння і словаўтваральная актыўнасць лексем і словазлучэнняў тэрміналагічнага характару. Робіцца выснова пра значную перавагу ўласнабеларускіх складнікаў гэтай тэматычнай групы над запазычаннямі.

Ключавыя словы: старабеларуская мова; гісторыя эканамічнай лексікі; назвы плацяжоў і падаткаў; гістарычнае словаўтварэнне; словаўтваральная актыўнасць; даўнія запазычанні.

Пра асаблівасці пачатковага этапу фарміравання беларускай эканамічнай лексікі і тэрміналогіі можна меркаваць не толькі зыходзячы з фактаў гісторыі развіцця эканамічных адносін, але і ацаніўшы склад і семантычную разнастайнасць адпаведнай лексікі ў старабеларускай мове. Крыніцай інфармацыі тут служыць «Гістарычны слоўнік беларускай мовы». Выбраныя лексемы гэтай тэматычнай групы часта з’яўляюцца многазначнымі, іх значэнні часткова або поўнасцю супадаюць, але па меры ўжывання стыхійна пачынае пераважаць адна з намінацый – гэтым самым агульнаўжывальнае слова функцыянальна набліжаецца да тэрміна.

Апроч таго немалаважнай з’яўляецца ацэнка словаўтваральнай актыўнасці і здольнасці слова ўваходзіць ва ўстойлівыя словазлучэнні, якія ілюструюць гіпа- і гіперанімічныя адносіны ў данай тэматычнай групе, што ў сваю чаргу з’яўляецца ўскосным адлюстраваннем рэальнага эканамічнага жыцця пэўнага перыяду.

Так, для агульнага паняцця ‘плацеж’ існавалі словы: **датокъ, дача, мыто, наметъ, платъ, платежъ, поборъ, податокъ (податекъ; податка), подать, пошлина**.

Датокъ і **дача** – сінонімы, маюць значэнне ‘даніна, пошліна, падатак, выплата’, утвораныя ад дзеяслова *дати*. Словаўтваральнай актыўнасці гэтыя лексемы не праяўлялі: адзначана толькі вытворнае **дачка** – ‘памяншальнае ад **дача**.

Плата і **платъ** – ‘плацеж; грашовы або натуральны падатак’. З кантэксту: *вси платы наши пѣняжныи, чыншевыи, поборныи, куничныи, мытныи… маютъ державцы наши выбирати* (АЗР, II, 198, 1529)[5] – відаць, што гэта самая агульная намінацыя для розных відаў плацяжоў. Слова мае агульнаславянскі корань, але “вагаецца” ў граматычным родзе; пры гэтым толькі невялікая колькасць ілюстрацый дазваляе дакладна меркаваць пра род: *если платы не маете…* (Бібл., 101), *ꙗ҆дати плату* (Мак., 137) – канчаткі жаночага роду; *платъ корчомный* (АЗР, II, 11, 1507), *платъ нашъ г҆дарски҆* (Ст. 1529-Ф, 40) – род мужчынскі. У старабеларускай мове існаваў цэлы шэраг вытворных ад яго асновы: дзеясловы *платити, платитися*, дзеепрыметнік *платный* ‘абавязаны выплаціць; якому адплоціцца’, прыметнікі *платовый* ‘прызначаны для выплаты’ і *платнейшый* ‘якому больш адплоціцца, удзячнейшы’, назоўнікі *платокъ* ‘памяншальн. ад *платъ*’ і *платца* ‘той, хто плоціць’.

Платежъ – у значэнні ‘плата грашыма або іншымі сродкамі за карыстанне чым-н.’ супадае з разгледжанымі вышэй назоўнікамі, але мае і іншае значэнне: ‘дзеянне па дзеяслову *платити*’. У абодвух значэннях зафіксаваны ў такіх аўтарытэтных юрыдычных помніках як Статуты ВКЛ.

Поборъ – ‘падатак, часовая подаць; працэс збору падаткаў на карысць дзяржавы’. З гэтым словам зафіксаваны тэрміналагічныя словазлучэнні: ◊ *поборъ земский* – ‘збор падаткаў на карысць земства’, *поборъ лановый* – ‘падаткі за ўладанне зямлёй (ад *ланъ* ‘адзінка ворнай зямлі’), *поборъ чоповый* – ‘падаткі на валоданне карчмой’; *поборъ месткий* – ‘збор падаткаў з горада’; *поборъ поголовный* – ‘пагалоўны падатак для абароны айчыны і выкупу палонных з татарскай няволі’ і інш[6]. Само слова **поборъ** утварылася ад дзеяслова *побърати*, які з’яўляецца мнагазначным: мае аж 10 значэнняў (гл. ГСБМ, вып.24, с. 437 – 439). Вытворныя ад гэтага слова: *поборца* ‘зборшчык пабораў’ і *поборцова* ‘жонка зборшчыка пабораў’.

Податокъ (податекъ), податка, подать – ‘абавязковы збор з уладальніка або вытворцы’**.** Усе гэтыя словы ўтвораны ад дзеяслова *по-дати,* відавочна, адначасова з польскім podatek. “Гістарычны слоўнік…” прыводзіць прыклад ужывання ў XVI ст.: *слушны податекъ съ местъ*

[5] Ілюстрацыі прыводзяцца па Гістарычным слоўніку беларускай мовы, пашпартызацыя – адпаведна гэтаму выданню: гл. вып. 1. С. 45–49.

[6] Паколькі выбарка прыкладаў зроблена толькі на падставе ілюстрацый у ГСБМ, аўтар не прэтэндуе на паўнату адлюстраваня матэрыялу.

нашыхъ бывалъ (СДГВ, 104, 1557). Там жа выяўлены і вытворныя: прыметнікі *податковый, податный*, субстантыў *податное*. Таму нам здаецца не слушным сцверджанне аўтараў “Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы” пра запазычванне слова *падатак* з польскай у 60-х гадах XIX стагоддзя (ЭСБМ, т. 8, с. 100).

Наметъ – ‘дадатковы падатак’. У ГСБМ – артыкул **Наметъ II** (амонім да наметъ I – ‘шацёр, палатка’). Лексема славянскага паходжання, утворана ад дзеяслова *наметати, наметывати* – ‘накладаць якія-н. павіннасці, паборы’. Значэнне ілюструецца прыкладам: *дачъ на насъ у нихъ никоторыхъ не имать, ни серебщизны, ни ямщины, и никакихъ наметовъ на нихъ не метать, ани вѣсчего, ни помѣрного, ни повозного* (АЗР, I, 58, 1443). Вытворны субстантыў *наметное* мае тое ж значэнне – ‘дадатковы збор, падатак’.

Пошліна і **мыто** супадаюць у значэнні ‘грашовы збор’ і вельмі часта ўжываюцца як сінонімы. Звернемся да этымалогіі. **Пошлина**, па сведчані М. Фасмера, утворана ад граматычнай формы прошлага часу *‘пошло есть*’ дзеяслова *походити*’ (Фасмер, т. 3, с 349), гэта значыць у аснове наймення паняцце ‘як павялося, як ідзе здаўна’ = ‘звычайны, прыняты, устаноўлены плацеж’. **Мыто** (Фасмер, т. 3, с. 26) запазычана з ст.-в.-ням. mûta ‘пошліна’. Калі ж прааналізаваць ужыванне гэтых слоў у старабеларускай, то заўважаем, што слова *пошлина* ў значэнні ‘від падатку’ адзначана ў Полацкіх граматах з 1381 г. у кантэкстах, звязаных з плацяжамі на карысць царквы або князя. Слова *мыта* выяўлена таксама ў ранніх помніках з больш шырокім спектрам значэннем значэнняў: 1) ‘грашовы збор за вываз або ўвоз тавараў’, 2) ‘месца, дзе збіралі пошліну’, 3) пасада мытніка, 4) заработак. Паказальным здаецца прыклад: *штобы есте на всихъ виленскихъ мѣстичохъ мыта не имали ани которыхъ пошлинъ торговыхъ*… (СДГВ, 2, 1432) – відавочна, што ў гэтым прыкладзе *мыто* і *пошлина* суадносяцца як агульнае і прыватнае. Акрамя таго ГСБМ паказвае, што ў старабеларускай мове слова *мыта* больш ужывальнае, чым *пошлина*: ад яго больш вытворных *(пошлина – пошлинник* ‘зборшчык пошліны’; *мыто – мытникъ* ‘зборшчык мыта’, *мытница* ‘месца, дзе збіралі падаткі або пошліну’, *мытництво* ‘пасада мытніка; ліхвярства’, *мытце* ‘памянш. ад *мыто*’, *мытный*. Акрамя таго, выяўлены цэлы шэраг тэрміналагічных словазлучэнняў са словам *мыто*, якія ўтвараюць дзве семантычныя падгрупы:

1) віды пошліны за правоз тавара праз пэўны аб’ект ◊ *мыто воденое (водяное), водное* (па чужых водах)*, гребельное* (праз грэблю)*, морское, мостовое* (праз мост)*, подорожное* (па дарозе праз чужую тэрыторыю)*, сухое* (па сушы) і інш.;

2) назвы падаткаў у залежнасці ад аб’екта (гаспадаркі або віду дзейнасці), на які браўся плацеж: *мыто господарское, военное, замковое, мѣстское, торговое*.

На базе словазлучэнняў тыпу назоўнік + прыметнік (напр., *податокъ волочный, мыто воденое*) мова выпрацавала скарочаныя назвы падаткаў. У пераважнай большасці гэта субстантываваныя прыметнікі ніякага роду. Паводле семантыкі такія намінацыі групуюцца ў залежнасці ад

– аб'екта, за карыстанне ці ўладанне якім браўся падатак: *броварное* – з бровара; *вгайное* – за права на выраб з лясных тавараў; *весчее* (*весчое, вещое*), *весебное* – плата за ўзважванне; *возовое* – з кожнага воза за вываз тавару за мяжу; *ворковое* – ад тавараў, што перавозіліся ў мяхах (ад *ворекъ* – 'мех'); *воротное, подворотное* – за праезд праз вароты; *воскобойное* – з васкабойні; *грэбельное* – за праезд праз грэблю; *гуменное* – ад гумна; *закосное* – з сенакосных угоддзяў; *мостовое* – за праезд па мосце; *подводное* – абавязак пастаўляць падводы; *поземельное* – на зямельную ўласнасць; *посошное* – з сялян, ад сахі, *постожное* – з сялян, ад стога; *чоповое* – за выраб алкагольных напояў (ад слова *чопъ* 'чан': *чопы два до квашенья пива* (АСД, III, 240, 1571));

– часу / перыяду плацяжа: *великоденное* (*великодное*) – грашовы збор да пэўнай даты: вялікадня, *годовое* – штогадовы разавы плацеж за карыстанне зямлёй;

– суб'екта, які атрымліваў падатак: *гаспадарскае* – гаспадару, *замкавае* – на ўтрыманне замка.

У якасці скарочаных назваў ад гэтых прыметнікаў для аналагічных намінацый у мове ўтварыліся назоўнікі. Яны таксама паказвалі на

– аб'ект, за ўладанне або карыстанне якім браўся падатак: *бобровщина* – за уладанне бобровымі гонамі, *воловщина* – за рабочага вала; *езовщина* - за карыстанне езам (*езъ* – 'перагародка на рацэ для лоўлі рыбы'); *закосъ* – з сенакосу; *каменщизна* – з гандляроў за продаж тавараў *каменемъ* (*камень* у значэнні 'адзінка вагі' (ГСБМ, вып. 14, с. 251)); *капщизна* (*кобщизна, копщызна*), *капщина, капъ* – ад продажу спіртных напояў; *пневщина* – плата за нарыхтоўку лесу; *подвода* – абавязак пастаўляць падводы, *поконевшчызна, поконщина* – за карыстанне канём; *покотелщизна (покотельщина, покоцельщина)* – за арэнду броварнага абсталявання (катлоў); *посощина* – ад сахі; *темьянщина* – за набыццё фіміяму;

– мэту, на якую накіроўваўся падатак: *верховщина* – для забеспячэння верхавой перавозкі службовых асоб, *воевщина* і *жолнерщизна* – на вядзенне вайны; *городовшчина* – на гарадскія патрэбы; *коневщина* – на ўтрыманне каня; *подвода* – абавязак пастаўляць падводы; *пословщизна, пословщына* – на ўтрыманне паслоў.

– форму плацяжу і натуральных падаткаў: *барановъщина, вепровъщина, яловичщина* – абавязак на нарыхтоўку і пастаўку мяса, адпаведна бараніны, дзічыны, ялавічыны; *житщина* – падатак выплачваўся збожжам; *серебщизна* – плата серабром.

Назоўнікі для скарочанага абазначэння падаткаў утвараліся рознымі спосабамі:

– нульсуфіксальным: *закосное – закосъ*; *капщизна – капь* (ад *ка́паць* ?): падатак з карчмы або шынка за продаж алкаголю; *подводное – подвода* ‘абавязак пастаўляць падводы’;

– суфіксальным: ад асноў прыметнікаў з суфіксам -ск- далучэннем суфікса -ін- (< аснова ск+j > щ): *коневский > коневщина* або з польскім варыянтам суфікса –ізн/ызн-: *поконевский > поконевщизна*.

Колькасна пераважаюць назоўнікі суфіксальнай мадэлі ўтварэння.

Часам старабеларускі і польскі словаўтваральныя варыянты ўжываліся як сінонімы, напр., *бобровщина* (1488) – *бобровщизна* (1766), *поконщина* (1554) – *поконевшчызна* (1555). У дужках пазначана дата прыклада ў ГСБМ. Складальнікі “Гістарычнага слоўніка” звычайна прытрымліваліся прынцыпу: пры падачы ілюстрацыйнага матэрыялу адлюстроўваць самую раннюю і самую познюю фіксацыю слова паводле матэрыялаў картатэкі. Гэта дае магчымасць больш-менш дакладна прасачыць ужыванне і адказаць на пытанні аб часе з’яўлення, прыярытэце ўжывання і г.д. Параўнаем такія факты: *воловщина* (1407) – *воловщизный* (1488), *капщина* (1495) – *капщизна* (1495), *поконщина* (1555) – *поконевщизна* (1554), *пословщына* (1582) – *пословщызна* (1603). Такім чынам, мы можам канстатаваць: абодва суфіксы *-ін-* і *-ізн-* ужываліся раўнапраўна і, прызнаючы польскае паходжанне суфікса *-ізн-*, задоўга да ўтварэння Рэчы Паспалітай. Гэты факт набывае асаблівае значэнне, калі ўзяць пад увагу, што і дзяржаўнасць беларускай мовы была замацавана яшчэ ў Статуце 1566 года.

Разам з тым лексічных запазычанняў у гэтай тэматычнай групе амаль няма. Намі выяўлена толькі тры намінацыі:

вальцышъ – ‘пошліна за вываз лясных тавараў’ (з ням. Wald + Zins) і вытворнае ад яго *вальцышное* ‘тое, што і вальцышъ’;

мыто – ‘пошліна’(з ст.-в.-ням. Mûta);

шосъ – ‘падатак ад рамеснікаў і жыхароў горада’ (з кантэкстаў зразумела, што браўся з гарадскіх дамоў, млыноў), на думку А. М. Булыкі прыйшло з ням. Schoss праз польскае пасрэдніцтва – szos (Бул. ДЗ, 367). З тым жа значэннем устойлівы выраз *поборъ шосовый* і субстантыў *шосовое*.

Такім чынам, аналіз данай лексічнай групы дазваляе рабіць выснову пра развітую старабеларускую сістэму падаткаабкладання, для абслугоўвання якой выпрацавалася адпаведная разглінаваная сістэма намінацый. Гэтыя назвы ў пераважнай большасці маюць усходнеславянскія каранёвыя марфемы і ўтвораны адпаведна з уласнымі старабеларускімі мадэлямі словаўтварэння. Іншамоўны ўплыў праявіўся ў малой ступені.

Прынятыя скарачэнні

Бул. ДЗ – *Булыка А. М.* Даўнія запазычанні беларускай мовы. Мінск : Навука і тэхніка, 1972. 380 с.

ГСБМ – Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Выпускі 1–35. Мінск : Навука і тэхніка; Беларуская навука, 1982–2017 гг.

ЭСБМ – Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Мінск : Беларуская навука, 1978–2017. ТТ. 1– 4 (выданне працягваецца).

ВЫТВОРНЫЯ СІНТАКСІЧНЫЯ ДЭРЫВАТЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Н. У. Чайка

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,
вул. Савецкая, 18, 220000, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Natusia12@tut.by

Развіццё сінтаксічных сістэм моў свету выклікае шырокае функцыянаванне структурна-сінтаксічных мадыфікацый – канструкцый вытворных, далучальных, сегментаваных і рэдукаваных, эліптычных, што абумоўлена тэндэнцыяй да ўдасканалення механізмаў рэгулявання сінтаксічнай дэрывацыі. Актуальнасць даследавання абумоўлена неабходнасцю распрацоўкі кваліфікацыйных, класіфікацыйных і сістэмаўтваральных параметраў для ўпарадкавання сінтаксічных дэрыватаў і патрэбай устанавіць іх спецыфічныя ўласцівасці ў беларускай мове. ;

У артыкуле разглядаюцца парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый (эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя – канструкцыя з імпліцытнай семантыкай – перафразаваная канструкцыя – няпоўная канструкцыя), спосабы выражэння сінтаксічных дэрыватаў і іх функцыянальны дыяпазон. Выяўлены і сістэматызаваны фактары поліфункцыянальнасці словаформ: канструкцыйна-трансфармацыйны; канструкцыйна-катэгарыяльны; логіка-семантычны.

Ключавыя словы: сінтаксічная дэрывацыя; структурна-сінтаксічныя мадыфікацыі; вытворныя канструкцыі; эліптычныя канструкцыі.

Развіццё сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы на сучасным этапе выклікала значнае пашырэнне адзінак дынамічнага сінтаксісу: канструкцый з эліпсісам дзеяслова, парцэляваных канструкцый, канструкцый з імпліцытнай семантыкай, з сінтаксічнай рэдукцыяй і кампрэсіяй, вытворных канструкцый, падпарадкаваных універсальным філасофскім законам актуалізацыі неабходнай інфармацыі. Антрапацэнтрычны характар сучасных моўных працэсаў выклікаў тэндэнцыю да ўдасканалення механізмаў рэгулявання моўнай сістэмы, што паўплывала на карэляцыю паміж развіццём мыслення і матэрыяльнымі сродкамі яго выражэння. У сувязі з гэтым тыпалагічнае апісанне адзінак дынамічнага сінтаксісу з выяўленнем спецыфікі моўных з’яў і заканамернасцей іх функцыянавання стала адным з прыярытэтных напрамкаў айчыннага і замежнага мовазнаўства.

Важную ролю ў выяўленні моўных механізмаў, якія забяспечваюць функцыянаванне сінтаксічных канструкцый, адыгрываюць фактары, што

вызначаюць характар поліфункцыянальнасці словаформ. У мовазнаўстве функцыянальны дыяпазон словаформ даследаваўся выключна на матэрыяле дынамічных сінтаксічных адзінак (Г. А. Золатава, А. М. Мухін, М. У. Усеваладава, Е. У. Харытонава, П. Свігерс, А. Табіш, М. Трэмблэй [1–7]). Лічым мэтазгодным праводзіць сістэматызацыю на аснове парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый: эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя – канструкцыя з імпліцытнай семантыкай, што ахоплівае адзінкі дынамічнага сінтаксісу і ў якой з'ява поліфункцыянальнасці набывае выражаны характар. Пры гэтым у функцыянальны дыяпазон словаформы ўключаліся не толькі сінтаксічныя, а і семантычныя функцыі.

Асноўным параметрам тыпалогіі выступае спосаб ідэнтыфікацыі семантыкі словаформы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый. Структураванне кампенсаторнай прыкметы дазваляе вылучыць тыпалагічна істотныя прыкметы – спосабы ідэнтыфікацыі семантыкі словаформы: трансфармацыйную парадыгму, кантэкстуальнае і логіка-семантычнае ўзаемадзеянне кампанентаў і характар сінтаксічных сувязей і адносін – канстантны або пераменны, на аснове якіх створана адпаведная сістэматызацыя (класіфікацыя). Граматычная форма словаформы выступае базавай адзінкай сістэматызацыі. Падобная метадалогія дазваляе не толькі ўстанавіць функцыянальны дыяпазон словформ, але і сістэматызаваць фактары іх поліфункцыянальнасці ў адпаведнасці з тыпалагічна істотнай прыкметай. Аснову колькасных параметраў складае функцыянальны дыяпазон словаформ у розных структурна-сінтаксічных мадыфікацыях. Высокая ступень прадуктыўнасці словаформы (здольнасць выконваць розныя семантычныя ролі і сінтаксічныя функцыі) сведчыць пра стабільны характар сінтаксічнай з'явы.

Найбольш часта поліфункцыянальны характар набываюць словаформы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый: эліптычная канструкцыя – вытворная сінтаксічная канструкцыя без змены класа слоў. Гэты тып вытворных канструкцый характарызуецца тым, што суб'ект і прэдыкат захоўваюць свае функцыі, г. зн. не пераўтвараюцца. Змяняецца звычайна толькі форма прэдыката. Названы тып характарызуецца канстантным характарам сінтаксічнай сувязі і адносін і пераменным характарам граматычных форм: *З поту векавой мужыцкай праўды – соль зямлі* (Р. Баравікова). Словаформы ў форме роднага склону выконваюць таксама прэдыкатыўныя функцыі і ў вытворных канструкцыях з рэляцыйнымі прэдыкатамі. Такія сказы звычайна ўказваюць на адносіны часткі і цэлага, а словаформа выконвае ролю прэдыкатыўнага генератыва: *Сямён з жывёлаводаў* («Крупскі веснік»); *Сам я з літоўскага люду…* (В. Таўлай); *Ды што вы, // Я – з загартаваных. // Мне гэткі холад ані ў знак* (Н. Гілевіч); *Яны – з трывалае пароды, // Хоць ім нялёгкі выпаў век* (П. Прыходзька).

Словаформа ў форме роднага склону ў колькасна-іменным спалучэнні можа выконваць функцыю характарызацыйнага квантытатыўнага прэдыката (тып прэдыката – акцыянальны): *Анямела вечарэюць // Вочы руж і хрызантэм. // А да старасці яшчэ вам – // Столькі вершаў і паэм* (Я. Янішчыц). У адносіны канструкцыйнай аманіміі сказ можа ўступаць з эліптычнай канструкцыяй тыпу *Да вёскі – пяць кіламетраў* з прасторавай семантыкай. Назіраюцца выпадкі, калі сінтаксічную парадыгму ўтвараюць словаформы ў форме вінавальнага склону. У такім выпадку функцыянальны дыяпазон словаформ будзе ўключаць сітуант – прэдыкат (тып прэдыката – рэляцыйны): *Дык, значыць, ты за камандуючага* (А. Дудараў); *А Алег ужэ тры гады летам за памочніка камбайнёра* (А. Жук); *А я тут за вартаўніка* (А. Кулакоўскі); *І за бацьку, і за матку адзін – гэта праўда* (І. Мележ).

Выкарыстанне іменных выказнікаў у нетыповых формах (ва ўскосных склонах) абумоўлена або метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша, або пэўнымі стылістычнымі мэтамі і задачамі: *Дабрыню – у конюхі* (А. Петрашкевіч); *Хто – у настаўнікі, хто – у каморнікі, меліяратары…* (Л. Калюга); *Апанас на машыніста, // А Сцяпан на трактарыста, // Аляксей на агранома, // Мікалай на астранома* (А. Русак). Поліфункцыянальная іменная словаформа ў такіх сказах набывае форму творнага склону: *У небе зорак не злічыць, // Люстэркам – поўня* (М. Шабовіч); *Яшчэ ў павазе там прасніцы, // І хлеб акрасаю стала* (Р. Баравікова). Падобныя сказы адносяцца да рэгулярных граматычных з’яў.

Адносіны тоеснасці ў інтэлектуальна-творчай сферы рэалізуюцца іменнымі прэдыкатамі выключна ў форме назоўнага склону. Нетыповая форма іменнага прэдыката дазваляе кваліфікаваць канструкцыю як вытворную. У дадзеным выпадку канструкцыйная парадыгма словаформ уключае прэдыкатыўныя і залежныя кампаненты: *Дабрадзеем – стол кухонны. // Ліхвяром – пісьмовы стол* (Я. Янішчыц); *Ці помніш Аўдзеева Дзімку? // Цяпер старшынёю ў нас* (Я. Янішчыц); *Абсталяваў усім як мог вялізнае дупло. // З галля страха. // Расклаў цяпло. // А ложкам – шэры мох* (П. Броўка); *Ахоўнай цішаю – сасонка* (Я. Янішчыц); *Пясочкам – сцяжынка, // Перавяслам жытло, // І любоў, і Айчына, // Так, як зроду было* (Я. Янішчыц).

Назіраюцца выпадкі адваротнага пераўтварэння: кантэкстуальныя фактары ўказваюць на тое, што прэдыкат павінен мець форму творнага склону, а ўжываецца форма назоўнага склону: *Яны не шукалі начлегу ў доме пасярод поля. Прыдарожныя дрэвы для іх – і страха, і сцяна* (Р. Барадулін). Наяўнасць кампанента для іх указвае на пропуск дзеяслова-звязкі *былі.* Падобныя сказы кваліфікуюцца як рэгулярная граматычная з’ява з пераўтварэннем выказніка, што абумоўлена метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша. Аднак аманімічных форм падобныя канструкцыі не ўтвараюць: кампаненты *і страха, і сцяна* ў любым выпадку (у межах дадзенай фармальна-граматычнай схемы) будуць выконваць функцыю

выказніка.

Іменныя словаформы ў форме творнага склону ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый часам выконваюць розныя сінтаксічныя функцыі: *І вітаюць яго, // Пазнаюць беларускія сёлы, // Дзе ён – госцем // Жаданым і любым // У кожнай сям'і* (Н. Гілевіч). Аднак пры відазмяненні іменнага прэдыката словаформа набывае монафункцыянальны характар: *Балююць паны, як раней балявалі, // А маці – ўдавою, а я – сіратой* (З. Бядуля). Падобныя выпадкі часам маюць мастацкую або стылістычную абумоўленасць: *Мікола – аграном. Пятро – суддзёй у сталіцы* (А. Макаёнак); *Бацька парабкам у пана…* (П. Броўка); *У хляве наш бацька – акушэрам* (З. Бядуля); *Зямля мая – калінавы куток, // Дзе смаляком распаліць мама грубку, // Дзе да гасцей памыецца каток, // А госць – не ў хату, // Госцяю – галубка* (Т. Бондар). Суб'ектны кампанент у пераўтваральных канструкцыях з рэляцыйнымі прэдыкатамі – рэлянт – можа набываць форму творнага склону. Аднак падобныя выпадкі назіраюцца надзвычай рэдка і абумоўлены метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша: «*Альжбета Францаўна?» – знянацку // Схаваць здзіўлення ён не змог. // – «Ну так». // А прозвішчам – Кудзёлка. // Разводка быццам бы... Але // Па ўсім відаць, што не свісцёлка. // Да ўсіх з павагай у сяле* (Н. Гілевіч). Падобныя канструкцыі аманімічных форм не ўтвараюць.

Поліфункцыянальны характар набываюць і словаформы ў форме меснага склону. Яны характарызуюцца зменлівасцю семантычнай і сінтаксічнай функцый, пераменны характар якіх абумоўлены пераўтварэннямі або перафразаваннем: *Канец жніўня. Ва ўсім – пачатак восені* (Янка Брыль); *Я ўвесь – ва ўсім* (Г. Бураўкін). Канструкцыі з рэляцыйнымі прэдыкатамі часта дапускаюць пераўтварэнні кампанентаў, аднак поліфункцыянальнасць словаформ пры гэтым мае канструкцыйны характар: *Ён церпіць гэту муку. // Ён – ва мне* (Т. Бондар); *Бездань – у ім* (Т. Бондар); *Ратуй ад здранцвення, // Мая адзінота скразная. // У руху – збавенне, // І далеч свая і чужая* (Л. Дранько-Майсюк). Канструкцыйная поліфункцыянальнасць словаформ у форме меснага склону праяўляецца ў здольнасці іх выконваць розныя сінтаксічныя функцыі ў залежнасці ад лексічнага напаўнення сінтаксічнай пазіцыі. Дыферэнцыяцыя падобных з'яў заснавана на тыпах прэдыкатаў.

Рэляцыйныя прэдыкаты часцей дапускаюць пераўтварэнне прэдыкатыўных кампанентаў: *У словах шчырых, // У словах гарачых, // У думках трывожных, // У думках бунтарскіх // – Крыніца пакуты, // Крыніца надзеі* (З. Бядуля); *Ці не думаеш ты, што вырашэнне праблемы – у асабістых гаспадарках* (А. Дзялендзік). У такіх сказах выразна рэалізуюцца адносіны ідэнтыфікацыі. Эліптычныя канструкцыі з экзістэнцыяльнымі прэдыкатамі ўтвараюць аманімічныя формы з названымі вытворнымі канструкцыямі: *Ты гаворыш – лепшае – ў былым... // Ты гаворыш – светлае – ў былым* (Р. Баравікова); *У кожным садку Беларусі – //*

Сягоння пазёмка ў гасцях, // Раскладваць гады не бяруся, // Ды ў нейкім – шчаслівы працяг (Р. Баравікова). У сказах з рэляцыйнымі прэдыкатамі названая словаформа можа выступаць у функцыі дапаўнення (пры ўмове сінтаксічнага перафразавання): *Бяры і спакушай. // У ім – спакуса* (Р. Баравікова) і прэдыкатыўнай: *Калгас – гэта моц. Бо мы ўсе – у адзінай сям'і* (У. Скарынкін).

У сказах са статальнымі прэдыкатамі аналізуемыя словаформы выступаюць у якасці лімітатыва: *І ў душах маладых – адчай і боль* (У. Скарынкін); *У вачах – крыўда і боль* (В. Казько). Сінтаксема можа набываць форму роднага склону: *Да хлопчыка Лена імкнецца хутчэй, // Хораша часам памарыць з такім. // Якая ў малога дапытнасць – з вачэй! // І вось яна разам ля возера з ім* (П. Броўка). У канструкцыях з характарызацыйнымі прэдыкатамі звычайна адбываецца трансфармацыя прыметнік ← назоўнік, а словаформа выконвае функцыю лімітатыва: *То ж у яе натуры – чуласць, // Гасціннасць, мяккасць, дабрыня, // Гатоўнасць даць табе прытулак – // Ці ты чужы, ці ты радня...* (Н. Гілевіч); *Недасканала ўсё, // Ва ўсім – суладнасць* (Т. Бондар); *Ляжыць галінка бэзу на каленях, // У ёй – і адзінота, і маўклівасць* (Р. Баравікова); *Жыццё перамалола нас, // У лёсах – драмы!* (Р. Баравікова); І *ўсё часцей у позірку – нудота* (Р. Баравікова); *Ці поўні бляск, ці цацка заіскрыцца, // У поглядзе – пал, адчайнасцьі дакор...* (Р. Баравікова).

Пераўтвараюцца таксама іменныя выказнікі, выражаныя прыметнікамі. Падобныя выпадкі абумоўлены метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша і аманімічных форм з эліптычнымі сказамі не ўтвараюць: *Не, проста дзіўна, што Альжбета, // Імя такое... са старых* (Н. Гілевіч). Форма *са старых* ← *старое* ў падобных канструкцыйных тыпах будзе выконваць выключна функцыю выказніка і ўжывацца ў вытворных канструкцыях з характарызацыйнымі прэдыкатамі. Атрыбутыўная функцыя названага кампанента магчымая толькі ў канструкцыях, дзе ёсць азначаемае слова, напрыклад *са старых архіваў*.

Поліфункцыянальны характар словаформ можа назірацца ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый: эліптычная канструкцыя – вытворная сінтаксічная канструкцыя са зменай лексіка-граматычнага класа слоў. Прэдыкат у такіх канструкцыях можа набываць самыя розныя формы. Спецыфічнае семантычнае напаўненне некаторых канструкцый дазваляе залежнаму кампаненту ўтвараць значны функцыянальны дыяпазон. Падобныя выпадкі некаторыя даследчыкі кваліфікуюць як якаснае прэдыцыраванне. У такіх канструкцыях залежны кампанент страчвае рэферэнтныя якасці і набывае прэдыкатыўныя. Гэта дазваляе ім утвараць аманімічныя формы з эліптычнымі сказамі, а словаформы набываюць поліфункцыянальны характар. Пераўтварэнне кампанентаў *дзеяслоў – назоўнік* у форме назоўнага склону звычайна назіраецца ў канструкцыях з экзістэнцыяльнымі прэдыкатамі з часавай суаднесенасцю: *На зары ж –*

толькі дрэў трапятанне // І скупая на рэдкасць сляза (Р. Баравікова) або з прасторавай: *У сціхлым шэпце палыноў – // Вясны маёй дыханне* (Я. Янішчыц); *Там – удары стыхій, // Там – дажджу лапатанне...* (А. Разанаў); *У кронах – зыркіх промняў мітусня* (Р. Барадулін); *А скрозь – мітусня...* (Т. Бондар). Падобныя сказы кваліфікуюцца як эліптычныя з пропускам экзістэнцыяльнага прэдыката.

Назіраюцца канструкцыі, дзе структурныя пераўтварэнні абумоўлены выключна метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша: Чуеш, зноў наплывае яна... *Нехта смуткуе, // А некаму – радасць* (Р. Баравікова). Структурна-семантычная кваліфікацыя перафразаванай канструкцыі ажыццяўляецца на аснове аналогіі. Поліфункцыянальны характар набывае словаформа і ў форме вінавальнага склону пераважна ў аддзеяслоўных наміналізаваных канструкцыях: *Уля раптам у крык* (У. Паўлаў); *Я табе ў адказ* (Я. Янішчыц); *Зноў стук. Ледзяны. // Халодны. Бы ўяўны. // Так б'е калатун. // І думкі – ў россып* (Т. Бондар); *А яна – у адказ... І слязіны між слоў, быццам кроплі дажджу між лістоў* (П. Броўка). Функцыянальны дыяпазон словаформы абумоўлены не яе формай, а знешнімі фактарамі – здольнасцю структурных паказчыкаў фарміраваць разнастайныя сінтаксічныя сувязі ў замен нейтралізаваных.

Як паказала даследаванне, кампенсаторная функцыя парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый (эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя – канструкцыя з імпліцытнай семантыкай – перафразаваная канструкцыя – няпоўная канструкцыя) абумоўлена фактарамі поліфункцыянальнасці словаформ, асноўным параметрам сістэматызацыі якіх выступае спосаб ідэнтыфікацыі семантыкі словаформы. Былі выяўлены наступныя фактары поліфункцыянальнасці словаформ: канструкцыйна-трансфармацыйны; канструкцыйна-катэгарыяльны; логіка-семантычны.

Як паказала даследаванне, найбольш часта поліфункцыянальны характар набываюць словаформы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый ***эліптычная канструкцыя – вытворная сінтаксічная канструкцыя без змены класа слоў.*** У названых вытворных канструкцыях суб'ект і прэдыкат захоўваюць свае функцыі, змяняецца толькі форма прэдыката. Радзей поліфункцыянальны характар словаформ назіраецца ў наступных вытворных канструкцыях са зменай лексіка-граматычнага класа слоў: аддзеяслоўных наміналізаваных канструкцыях; адпрыметнікавых наміналізаваных канструкцыях. Часцей словаформы набываюць поліфункцыянальны характар у канструкцыях з прэдыкатамі: акцыянальным; экзістэнцыяльным; рэляцыйным; характарызацыйным. Сфера праяўлення прэдыкатыўнай прыкметы можа быць розная: фізічная; сацыяльная; псіхічная. Функцыянальны дыяпазон словаформы ўключае ўсе магчымыя семантычныя функцыі і абумоўлены тыпам прэдыката.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Всеволодова М. В.* Проблемы синтаксической парадигматики: коммуникативная парадигма предложений / М. В. Всеволодова, О. Ю. Дементьева. М. : Крон-Пресс, 1997. 170 с.

2. *Золотова Г. А.* Коммуникативные аспекты русского синтаксиса. М. : Наука, 1982. 368 с.

3. *Мухин А. М.* Сослагательное наклонение в древнеанглийском языке : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.04 / 1-й Ленингр. гос. пед. ин-т. Л., 1953. 19 с.

4. *Харитонова Е. В.* Динамика структуры синтаксиса современного русского языка : тенденции к экономичности и к дистинктности: на материале современной прессы : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Волгогр. гос. соц.-пед. ун-т. Волгоград, 2014. 27 с.

5. *Swiggers P.* Aux debut de la syntaxe structural: Tesnière et la construction d'une syntaxe // Linguistica. 1994. Vol. 34. №1. P. 209–219.

6. *Tabisz A.* Graficzno-treściowe i metatekstowe wykładniki segmentacji uczniowskich tekstów // Edukacja. 2013. № 4. S. 90–100.

7. *Tremblay M.* Du statut des prépositions dans la grammaire // Rev. Québécoise de Linguistique. 1999. Vol. 27. № 2. P. 167–183.

РЭКЛАМНЫ ТЭКСТ: АСАБЛІВАСЦІ ГЕНЕРАВАННЯ, СТРУКТУРАВАННЯ І ЎСПРЫМАННЯ

Г. К. Чахоўскі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
ChekhovskyGK@bsu.by

Рэкламны тэкст – гэта адзін з найбольш выразных феноменаў сучаснага існавання мовы, поле для ўжывання яе вобразна-выяўленчых сродкаў. У артыкуле актуалізуюцца праблемы лінгвістычнага даследавання рэкламнага тэксту, які мае камунікатыўную і кагнітыўную прыроду. Разглядаюцца этапы генеравання рэкламных тэкстаў з улікам рэкламнай канцэпцыі, стратэгіі, ідэі тэксту, умоў зносін, зместу, адрасата і сэнсавага тыпу маўлення, кампазіцыйнае рэструктураванне рэкламнага тэксту, рэдагаванне, рэцэнзаванне, уключэнне ў тэкст дадатковых фрагментаў з адпаведным значэннем, удасканаленне тэксту з мэтай узмацнення яго выразнасці. Характарызуюцца тыпы рэкламных тэкстаў паводле мэтавай аўдыторыі, працягласці ў часе, шырыні ахопу аўдыторыі і іншых крытэрыяў.

Ключавыя словы: структура рэкламнага тэксту; генераванне тэксту; успрыманне тэксту; камунікацыя; адрасат тэксту.

Для грамадзян Рэспублікі Беларусь рэклама стала звыклай жыццёвай з’явай, нягледзячы на тое, што яна мае працяглую гісторыю. Слова “рэклама” запазычана ў другой палове XIX ст. з французскай мовы, дзе *reclame* узыходзіць да лацінскага *reclamare* – ‘крычаць, выкрыкваць,

заклікаць’. Першапачаткова рэклама існавала ў вуснай форме. Гандляры Старажытнага Егіпта і Старажытнай Грэцыі не проста заклікалі пакупнікоў, але складалі песні і вершы, якія ўсхваляюць якасці тавара, прыцягваючы да яго ўвагу людзей.

Рэклама лічыцца мастацтвам і навукай адначасова. У ёй эфектыўна спалучаюцца інфармацыя і веды, атрыманыя з гуманітарных навук (навукі пра паводзіны чалавека), з майстэрствам і творчасцю камунікатыўных мастацтваў (літаратура, драматычнае мастацтва, тэатр, графіка, фатаграфія і г.д.) з мэтай матывавання, перайначвання або ўзмацненні пачуццяў, перакананняў, меркаванняў і паводзін спажыўца. Навуковы падыход да вывучэння рэкламы патрабуе ў першую чаргу вызначэння самога паняцця.

Успрыманне рэкламнага тэксту – сінтэз разнастайных адчуванняў, якія атрымліваюцца ад цэласных прадметаў ці складаных, з’яў, якія ўспрымаюцца як адзінае цэлае. Гэты сінтэз выступае як уяўленне аб прадмеце або з’яве. Пры ўспрыманні рэкламнай інфармацыі выключна важная роля належыць фарміраванню гэтай перцэпцыйнай выявы, якая аказвае (ці не аказвае) самае істотнае ўздзеянне на паводзіны пакупніка. Уяўленні непасрэдна адрасуюцца пачуццям чалавека. Іх сэнс разумеецца як добра наладжаны на ўзроўні свядомасці працэс: *напоўніце вейкі пышным, бязважкім аб’ёмам; шакаладная глазура; ад саломы да мяккасці* і інш. Асноўны прынцып успрымання заключаецца ў тым, што любы аб’ект успрымаецца як “постаць на фоне”. Чалавек жыве ў свеце прадметаў, таму яму лягчэй “зафіксаваць струмень уяўленняў, які праходзіць перад свядомасцю”, а не фармалізаваныя паняцці. Такое ўяўленне пацвярджаецца вербальным выражэннем вядучай ролі імёнаў (назоўнікаў) ва ўсіх відах рэкламных тэкстаў, якія дазваляюць арыентавацца ў свеце рэальных прадметаў, аб’ектаў: *Асляпляльны бляск крышталяў для ідэальнага колеру твару* (Parure); *Бездакорная ўстойлівасць. Абсалютная дасканаласць* (Lancome); *Новая брытва Panasonic для сухога і вільготнага галення; Ідэальны догляд за адчувальнай скурай. Без фарбавальнікаў, спірту, кансервантаў – 0%* (Чёрный жемчуг). Дамінантная роля назоўнікаў тлумачыцца яшчэ і тым, што яны здольныя вылучаць вызначаныя прыкметы аб’ектаў рэчаіснасці – якасць, уласцівасць, стан, дзеянне: надзейнасць і выгода, праходжанне, упрыгожванне, абарона, абрысы, пачуццёвасць, пяшчота і да інш. Назоўнік рэалізуе асноўныя патрабаванні ўспрымання як першаснага псіхічнага працэсу, вылучаючы найбольш значныя прыметы аб’екта. Свядомасць чалавека не здольная ўспрыняць абсалютна ўсе характарыстыкі рэальнага аб’екта ці з’явы, таму выява “дабудоўваецца” да цэласнага стану і захоўваецца ў такім выглядзе ў памяці, нават калі ў рэчаіснасці з прадметам ці з’явай адбыліся пэўныя змены. Такая магчымасць падаецца за кошт абагульнення характэрных рыс аб’екта падчас успрымання і прысваення гэтаму аб’екту назвы, якая, у сваю чаргу, суадносіцца з вызначаным класам аб’ектаў, якія маюць падобныя, агульныя

прыкметы, што вызначаюць змест назоўніка. Прадметнасць, цэласнасць, канстантнасць і катэгарыяльнасць (асэнсаванасць і акрэсленасць) – гэта асноўныя ўласцівасці ўяўленняў, якія складваюцца ў працэсе ўспрымання. Важную ролю ва ўспрыманні адыгрывае рух, без якога не адбываецца фарміравання адэкватнага ўяўлення, таму майстры рэкламнай справы надаюць дзеясловам адмысловае значэнне: *AQUAPOWER змяшчае эквівалент 5000 літраў актыўнай тэрмальнай вады. Здаволь смагу!*; *Быць вольным, як вецер. Адмяніць перашкоды і адлегласці* (Freelander), *Класічны стыль набывае ўльтрасучасныя рысы* (Ultra Metal 3G); *Ты можаш упэўнена наносіць касметыку. Наносіш. Карэктуеш*. (Avon); *Калі мікрацыркуляцыя запавольваецца, скура робіцца цьмянай. Яна губляе ззянне* (Vichy).

Задача рэкламы – стварыць вобраз прадукта, таму перш за ўсё тэкст звяртаецца да наглядна-вобразнага тыпу мыслення. Вобраз ствараецца пры дапамозе ілюстрацыі. Прыкладам можа служыць рэклама аўтамабіля Fiat 500: *Самы вялікі маленькі шэдэўр. Некаторыя маленькія рэчы вельмі прыцягальныя. Мы карыстаемся імі кожны дзень, часам не заўважаючы, што яны насамрэч маленькія шэдэўры дызайнерскага мастацтва. Прыгледзьцеся больш уважліва – кожная лінія ідэальная, кожная форма заслугоўвае захаплення!* Тэкст, змешчаны пад ілюстрацыяй аўтамабіля, мае каментарыі і ацэнку тавара, дапаўняючы створаныя вобразы і ўяўленні.

Рацыянальная рэклама інфармуе пра тавар, звяртаючы ўвагу на формулы ўздзеяння на пакупніка паводле лагічнай аргументацыі. *Эмацыянальная* рэклама звернутая да пачуццёвага фактару чалавека, таму будуецца звычайна на асацыяцыях. *“Цвёрдая”* рэклама разлічана на кароткатэрміновыя мэты, таму яна грунтуецца на вонкавым эфекце: ярка, хутка, вобразна. *“Мяккая”* рэклама стварае спрыяльную эмацыйную атмасферу, інфармуючы пакупніка пра добрыя якасці тавара. *Імідж-рэклама* – гэта рэклама па стварэнні станоўчага ўяўлення аб рэкламуемай фірме і таварах. Яе асноўная роля – азнаёміць патэнцыяльных пакупнікоў ці карыстальнікаў з прадукцыяй ці паслугай, з іх прызначэннем, характарыстыкамі, а таксама з кірункам дзейнасці, з перавагамі для пакупнікоў. У цэлым асноўнае значэнне імідж-рэкламы – замацаваць у свядомасці шырокага кола людзей пазітыўны вобраз аб таварах ці фірме. Імідж-рэклама, як правіла, дзейнічае больш шырока, чым іншы віды рэкламы. Гэта рэклама “на будучае”. Прыкладам такога кшталту рэклам служаць рэкламы ўжо вядомых фірм касметыкі, гадзіннікаў, мабільнай тэхнікі, гандлёвых прадпрыемстваў і г.д. Іх тэксты лаканічныя: *FERAUD. Paris. Parfum Des Sens*; *GUESS by Marciano*; *D&G DOLCE&GABBANA*; *Maurice Lacroix* і інш. У аснове тэксту – малюнак прадукта – у прыведзеных прыкладах гэта парфума, акуляры, гадзіннікі. Часта такі від рэкламы выкарыстоўваюць вытворцы адзення і абутку: *Calvin Klein Jeans, Oasis, BGN, In Wear* і інш. *Стымулюючая* рэклама накіравана пераважна на актывізацыю запатрабаванняў пакупнікоў. Гэта самы распаўсюджаны від

рэкламы. У ёй важна падкрэсліць асноўныя перавагі пэўнай прадукцыі і паслугі, іх станоўчыя якасці: *Пазногці ў новым вымярэнні. NailSpa Alessandro International адчыняе дзверы ў аазіс прыгажосці. Сардэчна запрашаем у пачуццёвы свет NailSpa. NailSpa – вы сабе заўсёды будзеце падабацца!* або *Гарньер Чыстая скура. Першы глыбока ачышчальны гель-саўна для твару з які моцным эфектам* (адметная рыса прадукта вылучана тоўстым шрыфтам і чырвоным колерам). *Формула з мікрачасцінкамі, цынкам і тэрмічным магніем. Разаграваецца на скуры пры кантакце з вадой і імгненна адкрывае поры. Без залішніх высілкаў скура цалкам вызваляецца нават ад глыбокіх чорных кропак і робіцца абсалютна чыстай. Імгненна. Клапаціся пра сябе. Гарньер.* Рэклама *стабільнасці* замацоўвае дасягнутыя вынікі. Найбольш эфектыўная такая рэклама ў выглядзе артыкулаў пра дзейнасць рэкламадаўца, таварах і паслугах. Такая рэклама можа складацца з рассылкі рэкламных праспектаў сталым партнёрам пэўнай фірмы. Існуюць і іншыя класіфікацыі рэкламных паведамленняў, якія ўлічваюць мэтавую аўдыторыю, ахоп тэрыторыі, сродкі перадачы рэкламы, яе функцыі і мэты і інш. Нягледзячы на тое, што прыведзеная класіфікацыя выглядае найбольш падрабязнай, застаюцца невыразнымі крытэрыі такога падзелу.

Мы прапануем наступную класіфікацыю відаў рэкламы.

1. ***Рэклама, накіраваная на спажыўца***, уключае дзве разнавіднасці:

а) рэклама тавараў і паслуг шырокага спажывання.

Такая рэклама заўсёды прызначана для пэўнай часткі насельніцтва, таму яе называюць мэтавай. Калі рэклама не цікавіць чалавека, ён не будзе звяртаць на увагі на яе тэкст, напрыклад рэклама спіртных напояў не прыцягне ўвагі чалавека, які не ўжывае гэтых прадуктаў; рэклама хатніх сродкаў для прыбірання ў пакоі будзе нецікавая дзецям. Пад мэтавай аўдыторыяй разумеецца група людзей, да якой звяртаецца рэкламны тэкст.

Звычайна вылучаюць дзве асноўныя групы мэтавай аўдыторыі – спажыўцы і пакупнікі. Асноўная маса рэкламных тэкстаў – гэта спажывецкая рэклама, якая прызначана для людзей, якія набываюць тавар у асабістае карыстанне ці купляюць яго для іншых. Напрыклад, рэклама сока накіравана як на пакупніка, так і на спажыўца, які можа быць, а можа і не быць адной і той жа асобай. Рэклама корму для жывёл накіравана на пакупніка, але ніяк не на спажыўца. У абодвух выпадках гэта будзе спажывецкая рэклама, якая размяшчаецца звычайна ў СМІ.

б) рэклама спецыялізаваных тавараў і паслуг.

Яе звычайна называюць справавой, або бізнэс-рэкламай, і вылучаюць у асобную групу. Такая рэклама разлічана на бізнэс-сферы, размяшчаецца звычайна ў спецыялізаваных публікацыях, прафесійных часопісах або на спецыялізаваных выставах-кірмашах і рэдка з’яўляецца ў сродках масавай інфармацыі. У справавой рэкламе вылучаюць 4 разнавіднасці: для прамысловасці, для гандлю, для вузкіх спецыялістаў і для сельскай

гаспадаркі. Рэклама для прамысловасці змяшчае інфармацыю пра тавары прамысловага прызначэння ці паслугі, якія выкарыстоўваюцца пры вытворчасці іншых тавараў (заводы, станкі, абсталяванне і г.д., а таксама сыравіна, паўфабрыкаты, камплектавальныя вырабы і інш.). Рэклама, разлічаная на такіх спецыялістаў, як настаўнікі, бухгалтары, медыкі, архітэктары, інжынеры, юрысты і г.д., называецца прафесійнай і часта змяшчаецца ў афіцыйных друкаваных органах прафесійных супольнасцей, напрыклад у часопісах "Главный бухгалтер", "Падатковы веснік" і інш. ***Прафесійная рэклама*** скіравана на вырашэнне трох задач: 1) пераканаць адмыслоўцаў-прафесіяналаў у неабходнасці набыцця прылады, абсталявання ці матэрыялаў для выкарыстання ў сваёй працы; 2) заахвоціць адмыслоўцаў рэкамендаваць сваім кліентам ужыванне пэўнага выраба ці паслугі; 3) пераканаць чалавека самога ўжываць рэкламуемыя вырабы. Мэтавая аўдыторыя гэтай рэкламы выяўляецца проста і выразна – яе складаюць спецыялісты, якія займаюцца закупам ці эксплуатацыяй тавараў прамысловага прызначэння.

2. Рэклама, у аснове якой ляжыць спосаб яе рэалізацыі, падзяляецца на прамую адсылкавую, друкаваную, тэлевізійную, радыёрэкламу, транзітную (у транспарце), вонкавую. Носьбітамі рэкламы выступаюць любыя платныя сродкі, што выкарыстоўваюцца для данясення рэкламы да мэтавай аўдыторыі. Асноўнымі сродкамі рэкламы з'яўляюцца газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, пошта і вулічныя носьбіты – шыльды і рэкламныя шчыты, аб'явы на транспартных сродках (на аўтобусах, тралейбусах, трамваях, грузавых аўтамабілях).

Прамая адсылкавая і непрамая рэклама. Да прамой адсылкавай адносяць рэкламу замоў па пошце. Некаторыя газеты і часопісы прыкладаюць да рэкламы купоны, па якіх чытач можа замовіць каталогі ці дадатковую інфармацыю. Такую рэкламу называюць яшчэ скіравана-зваротнай, яна заклікана стымуляваць прамы продаж па замове (тавары поштай): *Падпішыцеся на часопіс Psychologies. Першыя 40 чытачоў, якія афармілі падпіску, атрымаюць у падарунак дзённы крэм...*

Рэклама, якая накіравана на стварэнне вызначанага ўяўлення пра тавар і стымулюе замацаванне яго назвы ці вонкавага выгляду ва ўяўленні людзей, не прадугледжвае неадкладных дзеянняў адрасата, як у прамой адсылкавай рэкламе. Яе задача часта заключаецца ў тым, каб адрасат спыніў свой выбар на тавары, калі ў яго з'явіцца запатрабаванне ў ім. Такая рэклама звычайна размяшчаецца на радыё і тэлебачанні.

3. Паводле відаў рэкламуемага тавара рэклама бывае таварная і нетаварная. Таварная рэклама накіравана на рэалізацыю тавараў і паслуг, напрыклад: *ТАА "Рэгіянальнае агенцтва ацэнкі". Хутка і якасна выканае наступныя віды работ: 1) пастаноўка на дзяржаўны кадастравы ўлік; 2) афармленне дакументаў на зямельны ўчастак і аб'екты нерухомасці; 3)*

здымка падземных і наземных збудаванняў (інжынерных камунікацый) у маштабе 1:100 – 1:5000; геадэзічныя працы, звязаныя з вынасам і прывязкай збудаванняў; 4) праектаванне новага будаўніцтва (тапаграфічная здымка мясцовасці).

Нетаварная рэклама прызначана для прапаганды ідэй, мэтаў або філасофіі фірмы (кампаніі). Падобная рэклама называецца карпаратыўнай або прэстыжнай: *NISSAN NOTE. Шчаслівыя моманты сямейнага жыцця. Вам патрэбны сямейны аўтамабіль, ёмісты і дынамічны? Вы жадаеце падкрэсліць сваю індывідуальнасць? Тады NISSAN NOTE створаны менавіта для вас…*

4. Па спосабе фінансавання вылучаюць камерцыйную і некамерцыйную рэкламу. Камерцыйная дае інфармацыю пра тавары, паслугі, ідэі, з якіх вытворцы могуць атрымаць прыбытак. Некамерцыйная рэклама (грамадская, сацыяльная) фінансуецца дабрачыннымі ўстановамі, грамадскімі, рэлігійнымі ці палітычнымі арганізацыямі. Задачы некамерцыйнай рэкламы часта заключаюцца ў зборы сродкаў ці ў спробе паўплываць на паводзіны спажыўца: *Дзе цяпер гуляе ваша дзіця?; П'янства адрывае ад сям'і. Спыніся!*

5. Па ступені распаўсюджання рэклама падзяляецца на замежную, агульнанацыянальную, рэгіянальную і мясцовую.

Замежная рэклама прапануе тавары замежных вытворцаў, напрыклад рэклама парфумерыі: *Lancome. Paris. You are unique, you are. Magnifigue* і касметыкі: *Double Extension. Тэхналогія Beauty tubes. <...> L'Oreal. Paris*.

Агульнанацыянальная рэклама прызначана для розных рэгіёнаў краіны. Звычайна яна транслюецца па тэлевізійных каналах. Некаторыя даследчыкі прапануюць назвы *нацыянальна-спажывецкая рэклама* і *рэклама гандлёвай маркі*. Фокус такой рэкламы накіраваны на стварэнне ўяўлення і забеспячэнне ўстойлівай пазнавальнасці гандлёвай маркі: *Тэрафлю. Наш адказ хваробе*.

Рэгіянальная рэклама змяшчае інфармацыю пра тавары, якія рэалізуюцца ў адным рэгіёне краіны. Яна можа быць разлічана на некалькі абласцей, напрыклад кампанія па аказанні тэлекамунікацыйных паслуг, якая дзейнічае ў адным з рэгіёнаў краіны, можа займаць месца ў рэгіянальным друкаваным выданні на рэгіянальным тэлебачанні з трансляцыяй на вызначаны рэгіён, а не на ўсю краіну: *Будзь прадстаўніком TopDJ у Брэсце і Брэсцкай вобласці!*

Мясцовая рэклама прызначана для спажыўцоў аднаго населенага пункта, адной гандлёвай зоны. Яе часта называюць рэкламай раздробнага гандлю, паколькі яна аплачваецца пераважна прадпрыемствамі раздробнага гандлю (але не ўся рэклама раздробнага гандлю з'яўляецца мясцовай). Мясцовая рэклама мае лакальны характар і паказвае пакупнікам месца, дзе можна набыць тавар ці паслугі, інфармуе пра гадзіны працы, пра кошты на

тавары: *Вокны ФАВАРЫТ. Прафесійныя паслугі. Зніжка 20%. Глядзі на свет па-новаму. Адрасы прадстаўнікоў: г. Смаргонь…*

У мясцовай рэкламе можна вылучыць адрасна-даведкавую рэкламу, якая неабходна людзям, каб даведацца, як і дзе можна набыць якую-небудзь прадукцыю ці атрымаць неабходную паслугу. Вельмі часта ў рэкламах гэтага тыпу ўказваюцца кошты розных найменняў тавара. Такая рэклама змяшчаецца часцей за ўсё ў даведніках і спецыялізаваных выданнях. Прыкладам можа служыць інфармацыйны буклет гіпермаркета “Карона”.

Рэкламны тэкст уключае шмат замежных слоў, прычым не толькі ў слоганах, назвах брэндаў (BRAUN, L’OREAL, INNEOV, LANCOME, KENZO, GIVENCHY і інш.), але і ў тэксце, напрыклад: *Прас Braun TexStyle Control з новай асадкай Soft Textile Protector абараняе тканіну ад перагрэву...* (BRAUN). У рэкламе XBOX360 прыводзяцца словы вядомага акцёра Берта Рэйналдса на англійскай мове: “You’re in the Movies” – найлепшая гульня пра кіно з тых, якія я калі-небудзь бачыў!” Замежныя словы і фразы часам застаюцца незразумелымі. Так, у рэкламе гадзіннікаў TAGHeuer няма ніводнага слова на беларускай або рускай мове: *TAGHeuer. SWISS AVANT-GARDE SINCE 1860. WHAT ARE YOU MADE OF? BRAD PITT AND HIS AQUARACER AUTOMATIC*. Замежныя словы не адрозніваюцца выразнасцю, паколькі вобраз, які першапачаткова змяшчаецца ў слове, застаецца незразумелым, чужым носьбітам мовы-пераемніцы. Іншамоўныя словы не выклікаюць вядомых моўных асацыяцый, таму іх цяжка захаваць у памяці з наступным прайграваннем. Пра гэта пісаў З. Фрэйд, указваючы на схільнасць “да забывання гэтых вобразаў”, якая адбіваецца ў той нераўнамернасці, з якой мы размяшчаем запасы замежных слоў. Таму фрагментаў на замежных мовах у рэкламных тэкстах пажадана пазбягаць.

Такім чынам, існуюць вызначаныя правілы стварэння рэкламнага тэксту. Ён будуецца па зададзенай схеме-структуры, дзе кожны элемент адыгрывае спецыфічную ролю. Мова рэкламных тэкстаў павінна выконваць функцыі, абумоўленыя спецыфічнымі задачамі рэкламы. Кожны моўны знак, кожны рытарычны прыём павінен быць старанна прадуманы. Толькі ў гэтым выпадку рэкламны тэкст будзе эфектыўным. Спецыялісты па рэкламе павінны выдатна разбірацца не толькі ў граматычных нормах сучаснай беларускай мовы, але і дасканала ведаць стылістыку, рыторыку, псіхалінгвістыку і псіхалогію ўздзеяння.

АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ІНФАРМАНТАМІ ФРЫКАТЫЎНАГА [Г] VS. ВЫБУХНОГА [Ґ] У РОЗНЫХ КАМУНІКАТЫЎНЫХ СІТУАЦЫЯХ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЗАПІСАЎ У Г. П. ХОЦІМСКУ)

Н. В. Яненка

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
natallia.janienka@gmail.com

Асвятляецца адзін з аспектаў аналізу вуснага гетэрагеннага маўлення членаў адной сям'і і іх сяброў (інфарманты – жыхары г. п. Хоцімска Магілёўскай вобласці). Разглядаецца выкарыстанне моўцамі фрыкатыўнага [г] vs. выбухнога [г] у розных камунікатыўных сітуацыях – падчас сямейных размоў і ў рамках неафіцыйных размоў з калегамі на працоўных месцах. Аналіз маўленчых паводзін інфармантаў, праведзены з прымяненнем варыяцыянісцкай парадыгмы, сведчыць пра стылістычна абумоўленае выкарыстанне імі выбухнога [г] і нейтральнае – фрыкатыўнага [г]. Выяўленыя заканамернасці пацвярджаюць агульную тэндэнцыю ва ўжыванні інфармантамі «ўмоўна беларускіх», «мясцовых» і «ўмоўна рускіх» варыянтаў пераменных розных моўных узроўняў.

Ключавыя словы: вуснае гетэрагеннае маўленне; моўнае вар'іраванне; фанетычная варыянтнасць; варыяцыянісцкая сацыялінгвістыка; стылістычны фактар; знешнія аспекты камунікацыі; прагматычныя ўстаноўкі моўцаў.

Наша даследаванне прысвечана аналізу вуснага маўлення членаў адной сям'і і іх блізкіх сяброў (12 чалавек, усе – жыхары г. п. Хоцімска Магілёўскай вобласці). Разглядаецца маўленне інфармантаў у камунікатыўных сітуацыях двух тыпаў: падчас бытавых сямейных размоў і ў рамках нязмушаных размоў з калегамі на працоўных месцах.

Матэрыял уяўляе сабой вуснае маўленне жыхароў невялікага беларускага горада, якое бытуе ў неафіцыйных сферах і ўтварылася ў выніку «накладання» на пачаткова дыялектную (хоцімскую) аснову элементаў літаратурных рускай (у большай ступені) і беларускай (у меншай ступені) моў. Доля наяўнасці тых або іншых элементаў у маўленні мясцовых жыхароў моцна вар'іруе ў залежнасці ад іх узросту, адукацыі, сферы дзейнасці, а таксама ад канкрэтных умоў камунікацыі, такіх як склад суразмоўцаў, характар і тэма размовы, тыя ці іншыя задачы маўлення.

Працуючы ў рамках варыяцыянісцкай парадыгмы [2], маўленне інфармантаў мы разглядаем як адну мову, у аснове якой ляжыць мясцовая гаворка, з выразнай прысутнасцю моўных элементаў, якія адрозніваюцца ад хоцімскай гаворкі і ўмоўна ацэньваюцца намі як «беларускія» або «рускія». У якасці крытэрыю размежавання варыянтаў намі выкарыстоўваецца не іх руская або беларуская атрыбуцыя, а моўная кваліфікацыя, набытая імі ў матэрыяле ў рамках асобных дыялогаў. Сапраўды беларускімі або рускімі

з’яўляюцца тыя элементы, якія пацвярджаюць, «даказваюць» сваю беларускасць або рускасць у канкрэтных актах маўлення праз выкарыстанне тых ці іншых стылістычных эфектаў, «рускай» або «беларускай» маркіраванасці, падразумяваных «руска-беларускіх» процістаўленняў. Насычэнне моўнага фрагмента варыянтамі той ці іншай разнавіднасці стварае эфект своеасаблівага «беларускага» або «рускага» стылю маўлення інфармантаў. Прычыны і характар пераключэння інфармантаў з аднаго стылю маўлення на іншы мы разглядаем падрабязна.

Намі прааналізавана выкарыстанне інфармантамі шасці фанетычных, чатырох марфалагічных і чатырох лексічных саліентных пераменных, на аснове якіх часцей за ўсё робяцца высновы аб беларускасці або рускасці маўлення ў рамках канкрэтных маўленчых актаў; тым самым гэтыя пераменныя выступаюць у якасці стылістычных сродкаў маўлення [3, с. 383–384].

Выбар інфармантамі фрыкатыўнага [г] або выбухнога [ґ] мае стылістычны характар, г. зн. абумоўлены дзеяннем знешніх фактараў камунікацыі.

1. Сямейныя запісы. У сямейнай частцы запісаў намі зафіксавана толькі 5 выпадкаў ужывання выбухнога [ґ], у той час як фрыкатыўны [г] сустракаецца 1729 разоў. На нашу думку, такая вялікая розніца ў лічбах можа быць растлумачана тым, што абсалютная большасць дыялогаў, адлюстраваных у сямейных запісах, перадае звычайныя, бытавыя размовы блізкіх людзей, у якіх выкарыстанне выбухнога [ґ] магло б ацэньвацца як недарэчнае.

Малая колькасць выпадкаў ужывання выбухнога [ґ] дазваляе паспрабаваць растлумачыць кожны з іх. Аналіз паказаў, што кожны выпадак ужывання гэтага гука не быў выпадковым, а абумоўлены мэтамі экспрэсіі, узбагачэння выразных сродкаў мовы.

1.1. Дыялог 43. Маці (інфармант А, жанчына, 41 год, настаўніца пачатковых класаў) збірае сумку для дачкі-студэнткі (інфармант N, дзяўчына, 19 гадоў) перад выездам апошняй у Мінск пасля знаходжання дома, прапаноўваючы ёй узяць з сабой розныя прадукты, у тым ліку ёгурт:

Так, Ната́ш, гл’адз’і́ (43: 5; А)[7].
Мо́жа, саб’е́ ваз’м’е́ш (43: 6; А). <…>
***Йоґу́рт!** (43: 10; N)*
Во-йта п’ачэ́н’н’а! (43: 11; N)
*І п’ачэ́н’н’а, і **йоґу́рт** (43: 12; А*).

Інфармант N чытае назву на пакеце з ёгуртам, выкарыстоўваючы экспрэсіўны варыянт з націскам на другім складзе. Такі варыянт магчымы ў

[7] Тут і далей пасля ілюстрацый першая лічба абазначае нумар дыялогу ў нашым матэрыяле, другая – нумар выказвання, літара абазначае шыфр канкрэтнага інфарманта.

рускай літаратурнай мове (зафіксаваны ў нарматыўных слоўніках), але зусім не ўжываецца ў даследаваным рэгіёне. Інфармант таксама выкарыстоўвае выбухны гук [ґ] (выказванне 10). Услед за дачкой маці вымаўляе гэта слова з такім жа націскам, але з фрыкатыўным [г] (выказванне 12).

Слова з выбухным [ґ] было выкарыстана для экспрэсіі, бо гэта форма здалася маладому інфарманту N больш «цікавай», больш выразнай у параўнанні з формай з фрыкатыўным [г].

1.2. Дыялог 52. Размаўляюць маці (інфармант А) і яе калега па рабоце (інфармант L, жанчына, 38 гадоў, настаўніца пачатковых класаў). Узнікла тэма паклейкі шпалерамі кухні кватэры інфарманта L:

А мн’е там вс’іво´ л’іш на´да тр’і тру´бк’і (52: 104; L).
На твайу´ ку´хан’ку тр’і тру´бк’і? (52: 105; А)
Да (52: 106; L).
Ты што? (52: 107; А)
Пан’іма´іш, два ма´ла (52: 108; L).
Дв’е тру´бк’і ма´ла (52: 109; L).
Тр’і мно´га (52: 110; А).

Інфармант А зразумела, у чым справа (выказванне 110). Здавалася б, абмеркаванне можна скончыць. Тым не менш інфармант L працягвае:

А тр’і мно´га (52: 111; L).
Н’і ры´ба н’і м’а´са так (52: 112; L).
І астайе´цца, што н’і ры´ба н’і м’а´са (52: 113; L).
Ну йа´сна (52: 114; А).

Інфармант А ў выказванні 114 паўторна пацвердзіла, што сітуацыя ёй зразумелая. Але інфармант L працягвае тэму:

Н’і тудо´й і н’і с’удо´й (52: 115; L).

У выказванні «Ні тудой і ні сюдой» інфармант L выкарыстоўвае наўмысную няправільнасць: замест стандартнай формы гэтага выразу (бел.: *ні туды ні сюды*; руск.: *ни туда ни сюда*) яна дае прастамоўную, у якой нязменныя ў стандартнай мове прыслоўі *туды/туда, сюды/сюда* скланяюцца, ставяцца ў творным склоне. Такія формы ў маўленчай практыцы ўспрымаюцца іранічна, з усмешкай.

Вот (52: 116; L).
*Пайе´таму **так’і´йе піраґ’і´** (52: 117; L).*

Гульню завяршае стылістычна яўна нізкая форма *пайе´таму* (замест *паэ´таму*). Гэты варыянт, як і іншыя папярэднія, ужыты для экспрэсіі, для гульні, ён больш «цікавы». На гэтым фоне і з’яўляецца выкарыстанне (у дадзеным выпадку экспрэсіўнага) гука [ґ]. Выраз *так’і´йе піраґ’і´* можна разглядаць і як устаўку-цытату з рускай мовы (фразеалагізм *такія пірагі* не фіксуецца ў слоўніках беларускай мовы, хоць і сустракаецца ў Сеціве).

1.3. Дыялог 59. Інфармант L у прысутнасці мужа інфарманта A, сваёй сяброўкі, жартаўліва, падрабязна, з яскравымі размоўнымі выразамі расказвае пра тое, як яна хацела набыць сабе ўпадабаную парфуму. Для гэтага жанчына звярнулася да сваёй знаёмай, якая распаўсюджвала касметыку фірмы «Арыфлэйм», і заказала яе. Калі інфармант L атрымала жаданую парфуму, аказалася, што яна каштавала нашмат даражэй, чым чакала жанчына. Пачуўшы кошт, інфармант здзіўлена вымавіла *Мама дарагáйа!* з выкарыстаннем выбухнога [ґ]:

Йа гавар'у́: ско́л'ка э́та шча́с'ц'а сто́іц'? (59: 39; L)
Іна́ [адказвае]: *ц'і́л'і-ф'і́л'і (59: 40; L).*
Со́рак ты́с'іч (59: 41; L).
*Йа гавар'у́: **ма́ма дараґа́йа!** (59: 42; L)*

Фраза «Мама дарагая!» як выражэнне здзіўлення набыла асаблівую папулярнасць у вусных дыскурсах у 1970-я гг., пасля выхаду на экраны тэлевізійнага фільма «Людзі і манекены», створанага знакамітым савецкім комікам Аркадзіем Райкіным.

1.4. Дыялог 76. Інфарманты R (мужчына, 28 гадоў, муляр) і N размаўляюць пра школу, якую скончылі ў розны час:

Пато́м н'і зна́йу, како́й іро́н'ійій судз'бы́ йа папа́ў ў клас атл'і́чн'ікаў (76: 84; R).
О! (76: 85; N)
Э́та йа… (76: 86; R)
Да́жы кла́сный рукавадз'і́ц'іл', като́рый Кр'ів'і́цк'ій, сказа́ў: йа н'і зна́йу, как ты с'уда́ папа́ў (76: 87; R).
Кр'ів'і́цк'ій был кла́сным рукавадз'і́ц'іл'ім? (76: 88; N)
Да (76: 89; R).
***Н'і ф'іґа́ с'іб'е́!** (76: 90; N)*

Інфармант N, якой належыць рэпліка 90, здзівілася таму, што ў яе з суразмоўцам быў адзін і той жа настаўнік, нягледзячы на тое, што суразмоўца скончыў школу параўнальна даўно, а дзяўчына нядаўна. Акрамя таго, на фанетычнае афармленне выразу *ни фига себе* (з выбухным [ґ]) можа паўплываць сам яго характар – спецыфічны, экспрэсіўны, а таксама ўжытая форма займенніка – *сібе*, не *сабе*. Выраз выкарыстаны ў размове двух маладых інфармантаў з не вельмі вялікай розніцай ва ўзросце.

1.5. Дыялог 78. Удзельнічаюць тыя ж інфарманты – R і N. Інфармант N расказвае пра тое, што яна, студэнтка філалагічнага факультэта, чытае вельмі шмат кніг, сярод якіх часта сустракаюцца кнігі вялікага аб'ёму. У выказванні, якое змяшчае інфармацыю пра колькасць старонак, выкарыстаны выбухны [ґ]:

Мы пасл'е́дн'ій раз ч'іта́л'і праіз'в'ідз'е́н'ійе (78: 155; N).

Пра′ўда, на кампйу′тыр’і (78: 156; N).
*А **ґдзе-та** ты′с’ічу шыссо′т стран’і′ц (78: 157; N).*

Ужываючы слова з гэтым гукам, дзяўчына хацела ўжо ў пачатку выказвання надаць яшчэ большую вагу інфармацыі, якую яно змяшчае. На выкарыстанне інфармантам выбухнога [ґ] магла паўплываць і тэма размовы – горад, вучоба, а таксама мова твора, пра які ідзе гаворка.

2. Службовыя запісы. У рамках нязмушанай камунікацыі з калегамі на працоўных месцах інфарманты 7 разоў ужываюць выбухны [ґ], у той час як фрыкатыўны [г] сустракаецца 487 разоў. Разгледзім выпадкі выкарыстання выбухнога [ґ].

2.1. Дыялог 82. Настаўніцы, знаходзячыся ў класе без вучняў, размаўляюць пра дзяжурства на дыскатэцы, якое яны павінны перыядычна адбываць. Прамаўляюць інфарманты A, L і іх калега H2 (жанчына, 41 год, настаўніца пачатковых класаў):

Ты на дз’іскац’е′к’і н’і дз’іж’у′р’іла? (82: 305; A)
А м’ан’е′ н’і паста′в’іл’і (82: 306; L).
А как-та ц’іб’а′ так? (82: 307; A)
*Йа н’і **зажы̲ґа′ла** (82: 308; L).*
Н’ічыво′ с’іб’е′! (82: 309; A)
*Мы вун с Ната′л’йій Іва′ннай вм’е′с’ц’і **зажы̲ґа′л’і** (82: 310; A).*
Зна′йіш, йак бы′ла… (82: 311; A)
***Зажы̲ґа′ц’іл’на** (82: 312; H2).*
*Да, **зажы̲ґа′ц’іл’на** (82: 313; A).*

Інфармант L у выказванні 308 ужыла моладзевае слова «зажыгала» з выбухным [ґ] для таго, каб падкрэсліць асаблівыя, прыемныя ўражанні, якія можа выклікаць дыскатэка, пра якую ідзе гаворка. Гэту форму падхапіла інфармант A ў выказванні 310. Інфармант H2 у выказванні 312 ужыла аднакаранёвае слова з выбухным [ґ], якое за ёй паўтарыла інфармант A ў выказванні 313. Такім чынам, «гуляючы» з аднакаранёвымі словамі з выбухным [ґ], жанчыны перадаюць свае адносіны да падзеі – тэмы гаворкі і магчымыя эмоцыі, якія яна можа выклікаць.

2.2. Працяг дыялогу 82. Інфарманты A, L і H2 размаўляюць пра тое, што працаўнікі бюджэтных арганізацый павінны здаць старое адзенне. Прамаўляе інфармант L:

Ўчыра′ спра′шывайу у Канстанц’і′наўны (82: 474; L).
Гавар’у′: Канстанц’і′наўна, вы зда′л’і тр’а′пк’і? (82: 475; L)
*Да, ч’іты′р’і **к’і̲ґла̲ґра′ма** [адказвае Канстанцінаўна] (82: 476; L).*
Йа гавар’у′: зачэ′м сто′л’ка? (82: 477; L)
Ну два пал’то′ здала′ і там іш’ч’о′ э′тат (82: 478; L).
Йа гавар’у′: н’і магла′ падз’ал’і′цца па-бра′цк’і (82: 479; L).

Інфармант перадае сітуацыю, у якой яна пыталася ў сваёй калегі, ці здала тая адзенне. Звяртае на сябе ўвагу, што падчас цытавання слоў калегі (выказванне 476) маўленне інфарманта мае выразна русіфікаваны характар: у ім выкарыстоўваецца (двойчы) выбухны [ґ], мяккі [ч’]. Выказванні, якія належаць непасрэдна інфарманту L, маюць больш мясцовы характар. Русіфікаваны характар цытаваных выразаў неабавязкова азначае імкненне жанчыны дакладна перадаць характар маўлення суразмоўцы, які, верагодна, быў змешаным. Змест паведамлення, інтанацыя, з якой было вымаўлена выказванне, а таксама паўтор гука [ґ] у слове «кілаграм» (які сведчыць пра жаданне жанчыны «пакрыўляць» суразмоўцу) указваюць на адмоўнае стаўленне інфарманта да жанчыны (прынамсі ў той сітуацыі, калі апошняя, на думку інфарманта, здала зашмат адзення і тым самым вылучылася на фоне астатніх). У гэтым выпадку можам казаць пра «адмоўнае цытаванне» (выкарыстанне рускай мовы падчас цытавання чалавека, звычайнае маўленне якога з’яўляецца змешаным).

2.3. Дыялог 97. Інфармант А расказвае пра тое, што пасля змены Беларускай чыгункай раскладу цягнікоў і ўвядзення новых экспрэс-вагонаў дабрацца ад Хоцімска да Мінска і назад стала значна складаней:

Майа́ Ната́шка куп’і́ла б’іл’е́т на с’іво́дн’а (97: 186; А).
С М’і́нска п’ац’… (97: 187; А)
Тр’і с’імна́ццыц’, так, пр’ібыва́йіт ў Маґ’іл’о́ў (97: 188; А).
*А с Маґ’іл’о́ва ідз’о́т э́тат экспрэ́с-**ваґо́н** (97: 189; А).*
А на н’іво́ б’іл’е́таў ужы́ н’е́ту (97: 190; А).
Так харашо́, што мы ўчыра́ пазван’і́л’і (97: 191; А).
Во, ц’іп’е́р’ іна́ йе́дз’іц’ на Гро́дн’інскам (97: 192; А).
Да Маґ’іл’о́ва като́рый хо́дз’іт ц’іп’е́р’ то́л’ка (97: 193; А).

Нягледзячы на тое што ўсе выказванні датычацца гарадской тэматыкі, выбухны [ґ] быў выкарыстаны інфармантам толькі ў слове «экспрэс-вагон» (параўн. выкарыстанне фрыкатыўнага [г] у формах *Маґ’іл’о́ў, Гро́дн’інскам*). Выбухны [ґ] быў ужыты інфармантам для таго, каб паказаць, што новаўвядзенні, зробленыя «чужымі, гарадскімі» службамі, не ўлічваюць пажаданняў «простых, вясковых» людзей і выклікаюць нязручнасці. Такім чынам жанчына хацела перадаць пэўнае жаданне адмежавацца ад прадстаўнікоў гэтых службаў.

Асаблівасці выкарыстання фрыкатыўнага [г] vs. выбухнога [ґ] хоцімскімі інфармантамі ў рамках сямейных размоў і падчас нефармальнай камунікацыі з калегамі на працоўных месцах дазваляюць казаць пра стылістычна абумоўленае ўжыванне імі выбухнога [ґ] у абедзвюх сітуацыях. Так, выкарыстанне інфармантамі выбухнога [ґ] у сямейных запісах абумоўлена экспрэсіўнасцю іх маўлення, жаданнем зрабіць яго больш выразным, а таксама перадаць здзіўленне. У службовых запісах ужыванне выбухнога [ґ] сведчыць пра імкненне інфармантаў выразіць адмоўнае

стаўленне да падзей ці асоб, пра якіх вядзецца гаворка, або падкрэсліць цікавы змест інфармацыі. Уплыў сітуацыі камунікацыі на маўленне інфармантаў не адзначаецца – галоўнымі фактарамі, якія абумоўліваюць характар маўлення ўдзельнікаў даследавання, з'яўляюцца іх прагматычныя ўстаноўкі і знешнія аспекты канкрэтнага маўленчага акта. Атрыманыя вынікі пацвярджаюць агульную тэндэнцыю ў выкарыстанні хоцімскімі інфармантамі пераменных розных моўных узроўняў [1].

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Яненка Н. В.* Варыянтнасць у гетэрагенным гарадскім маўленні (на матэрыяле запісаў у г. п. Хоцімску) [Электронны рэсурс] : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2018. 27 с. URL: http://vak.gov.by/sites/default/files/2018-08/Яненка%20аўтарэферат.pdf (дата звароту: 21.10.2020).

2. *Яненка Н. В.* Да пытання вывучэння неафіцыйнага беларускага гарадскога маўлення ў рамках варыяцыянісцкай парадыгмы // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. 2015. № 3. С. 66–70.

3. *Яненко Н.* Вариативность городской белорусско-русской речи (на материале записей в г. п. Хотимске) [Электронный ресурс] // Антропол. форум. 2013. № 18. С. 381–392. URL: http://anthropologie.kunstkamera.ru/files/pdf/018online/yanenko.pdf (дата обращения: 21.10.2020).

ДАПАЎНЕННЕ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (КАНСТРУКЦЫІ З РОДНЫМ СКЛОНАМ)

Э. В. Ярмоленка

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
elvira-yar@yandex.by

У дадзеным паведамленні, якое падрыхтавана ў рамках планавай тэмы аддзела гісторыі беларускай мовы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, працягваецца асвятленне актуальных праблем гістарычнага сінтаксісу беларускай мовы. Мэта паведамлення – паказаць фунцыянаванне дапаўненняў, выражаных формамі роднага склону, помніках старабеларускай пісьменнасці розных жанраў.

Разглядаюцца дапаўненні, выражаныя формамі роднага склону, пры дзеяслове (засяроджваецца ўвага на родным часткі, родным аб'екта, родным суб'екта, родным аблятыўным), назоўніку (адзначаецца родны аб'екта, родны часткі, родны суб'екта), прыметніку (вылучаюцца канструкцыі, якія перадаюць адносіны аб'ектныя, камплетыўныя, параўнання), прыслоўі (указаны канструкцыі, якія перадаюць адносіны аб'ектныя і прыпадабнення). Пры назоўніках і прыслоўях зафіксаваны родны меры і колькасці, пры іменных часцінах мовы – родны вылучальны. Праведзены агляд засведчыў, што дапаўненні, выражаныя формамі роднага склону (без прыназоўнікаў і з прыназоўнікамі), шырока ўжываліся ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове пры

дзеясловах і імёнах (у прыватнасці, назоўніках) і перадавалі розныя адносіны. Змены ва ўжыванні дапаўненняў заключаліся ў асноўным у замене беспрыназоўнікавых канструкцый прыназоўнікавымі.

Вынікі работы могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні розных аспектаў гістарычнага сінтаксісу беларускай мовы і іншых славянскіх моў, пры правядзенні параўнальных даследаванняў, пры выкладанні сінтаксісу ў ВНУ і пад.

Ключавыя словы: гістарычны сінтаксіс; старабеларуская літаратурна-пісьмовая мова; гісторыя беларускай мовы; дапаўненне; родны склон.

Вывучэнне ўжывання даданых членаў сказа ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове XIV–XVIII стст., у прыватнасці дапаўнення, нягледзячы на напрацоўкі ў гэтым кірунку, па-ранейшаму застаецца актуальнай задачай беларускага гістарычнага мовазнаўства.

Дадзенае паведамленне прысвечана разгляду дапаўненняў, выражаных родным склонам. Асноўнае сінтаксічнае значэнне дапаўнення – гэта аб’ектнасць дзеяння або стану. Дапаўненні звычайна выражаюцца назоўнікамі ва ўскосных склонах (з прыназоўнікамі і без іх), а таксама іншымі словамі, якія ўжываюцца ў значэнні назоўнікаў (займеннікі-назоўнікі або іншыя часціны мовы пры іх субстантывацыі). У сказе дапаўненне можа адносіцца да выказніка, дзейніка або даданых членаў сказа: заказалъ, абы тыхъ делъ и доходовъ церъковныхъ, и судовъ духовъныхъ нихто отъ светъскихъ не смелъ судити (КЗ, 748, 1499); единакова е^{ст} погыбель человѣчиѧ и скотины, и ровно обои*х* приключение (Скар. ЕК, 7); ведъ же виненъ всего доложити чого собе сама сторона, або прокѹраторъ его жъ маеть припилновати (Ст. 1588, 267); Тамь прыбѣгли два его сторожи ... и привели языка значного от сыновныхъ [!] цр̃я Мамая (Мам., 179); хто бы ся важилъ тые каноны, отъ святыхъ отцевъ церкви Божой преданые, розривати (Пыт., 71).

Канструкцыі з родным склонам пры дзеяслове перадаюць аб’ектныя значэнні з рознымі адценнямі. Так, родны часткі (*Genetivus partitivus*) выражае значэнне прадмета, рэчыва, якія часткова падпадаюць пад дзеянне, што “накіроўваецца не на ўвесь прадмет, а на яго частку, ці… прадмет падпадае пад вядомае дзеянне не на ўвесь час, а толькі на вядомы яго момант” [2, с. 401]. У старабеларускіх пісьмовых крыніцах, як і ў іншых помніках усходнеславянскай пісьменнасці, больш частотныя ў гэтай пазіцыі канкрэтныя назоўнікі, радзей выкарыстоўваюцца абстрактныя, сярод дзеясловаў пераважаюць тыя, што абазначаюць дзеянне [гл.: 5, с. 156]: дали ему хлѣба абы елъ (Біблія, 355); салаты ... ѹ^{р}вала (Зб. 261, 157б); ѡбѣцала присла^{т} воскѹ скѹ^{р} и челѧди нево^{л}нои (Стрыйк., 442); тогды кислого хлѣба зажывали (Гарм., 205); наливши воды (Хран., 108); купили ечменю (ИЮМ, IX, 186, 1692).

Родны аб’екта паказвае, што аб’ект цалкам ахоплены дзеяннем (звычайна гэта абстрактнае паняцце або непадзельны канкрэтны прадмет). Родны аб’екта ўжываецца:

пры дзеясловах эмацыянальнага стану і адносін (*жалети* ‘шкадаваць’, *ждати* ‘чакаць’, *жедати* ‘жадаць; прасіць; патрабаваць’, *желати* ‘хацець, жадаць’, *замиловатися* ‘упадабаць што-н., захапіцца кім-, чым-н.’, *искати* ‘імкнуцца, хацець, спрабаваць што-н. зрабіць; старацца атрымаць што-н., дамагацца чаго-н.’, *ненавидети, плакати* ‘аплакваць’, *послухати* ‘паслухацца’, *просити* ‘прасіць; патрабаваць’, *смотрети* ‘шукаць, патрабаваць’, *требовати* ‘прасіць; патрабаваць’, *хотети* ‘мець жаданне, ахвоту да чаго-н., адчуваць патрэбу ў кім-, чым-н.’ і інш.): пр^{о}ркъ с па^{р}сѹны народѹ лю^{д}ско^{г} жедае*т* пришествіа на све*т* месіаша (Пс. XVI, 92); просила головы с$\tilde{т}$ого пре^{д}течи и кр^{ст}ителѧ Іѡанна (Будны, 26–26б); зновъ такой годыны прыждати (Мял., 316); ꙗко хто ... речи^{с} ꙗкое замилуе^{т} бѣгае^{т} шѹкае^{т} (Зб. 261, 78); поссесіи и интродукованья отъ насъ просилъ (АСД, І, 279, 1634); ѡное дитꙗ за ни^{м} бѣгало, и волало: тата, тата, коли чого потребовало (Зб. 752, 546); збавите^{л} ... плака^{л} збѹре^{н}ꙗ ерѹсали^{м}ского (Зб. 255, 92б); плакала девичства своегѡ на горахъ (Хран., 183);

пры дзеясловах успрымання (*выслухати, гледети* ‘глядзець, назіраць’, *отслухати* ‘адслухаць’, *послухати* (*послушати*) ‘паслухаць’, *послушати, скушовати* ‘ўспрымаць’, *слухати, смотрети* ‘чытаць, знаёміцца’ і пад.): назавътрие отслухавъ с$\tilde{т}$ое литоргие приидеш на обедъ (Чэцця, 95б); мы то^{г}о листа смотревъ зде^{с}ь з боꙗры з мѣщаны, а послали до ва^{с}, и вы сами на не^{м} вразумѣете (ПГ, ІІІ, 9, 1495); кто гледить вѣтрѹ сеи не сееть (Скар. ЕК, 16б); чи не оухо сло^{в} скѹшѹеть (Зб. 262, 17); одно бы … смотрѣли повинностей своихъ, и рядного справованья своего (АЗР, ІІІ, 13, 1547); тые бояре, выслухавши того сведецства тыхъ светковъ на то поведили (АВК, XXI, 169, 1557); слухали аръфы (Трыст., 24); словъ мои^{х} покорне послухайте (Алекс., 24); духовной науки слухати (Каліст, ІІ, 47б);

пры дзеясловах, звязаных з адносінамі валодання (*боронити, смотрети* ‘клапаціцца, непакоіцца пра што-н.’, *стеречи* і пад.): того усего князю Федору Ивановичу Глинскому смотрѣти, уживати подлугъ данины господарское (АВК, XIII, 13, 1508); Пчелы и тымъ подобнаѧ боронѧть ѹльевъ своихъ (Скар. КЮ, 2б); вси врядники дворные ... стерегли роботы (АЗР, ІІ, 198, 1529); боронячи нашого кгрунту (АСД, І, І71, 1546); Да^{s} же Б$\tilde{ж}$е … абы^{х} стереглъ ѹсправе^{д}ливени^{s} твои^{х} (Пс. XVII, 131б);

пры дзеясловах маўлення (*говорити, кричати, пытати* ‘звяртацца з пытаннем’ і пад.): не смѣти боудемъ поро^{ж}ни^{х} словъ говорити (Чэцця, 367б); теды цеса^{р} з боле^{ст}ю ѡчнѹ^{л}сꙗ и рату^{н}кѹ крича^{л} (Зб. 82, 285б);

пры дзеясловах, звязаных з дакрананнем да чаго-н., закрананнем чаго-н. (*дотычитися, касатися*): што ся дотычеть домовыхъ речеˢ – скатертеˢ, рѹчниковъ, мисъ ... того ми не вернено (КСД, 877, 1516); маеᵀ еще Іерей прыстѹпѹючы до ѡᵀправованѧ тое таᵘны ꙗко и до всѣхъ иныхъ таиᵘ быти безᶻ грѣха смертельного ... иначеᵘ сты̃хъ речей касаючисѧ грѣшъникᵏ, вмѣсто выслѹги оу пн̃а Бг̃а, в новый грѣхъ впадеᵀ (Навука, 85); што се дотычеть войны, посполитого рушеня (ИЮМ, XXIII, 476, 1630).

У названых пазіцыях сустракаюцца таксама формы вінавальнага склону, параўн.: кгвалтомъ тебе привели и припѹдили тыи слова говорити (КСД, 637, 1510); бурмистру зъ райцами ... вшелякіе таковые справы до суду ихъ припалые слухати, узнавати, судити, сказывати, карати ... моцою сего листу нашого (АВК, XIII, 41, 1580); чаровные поганские слова говорила (Барк., 151б); тотъ привилей огледавши и выслухавши, велели есмо его ... вписати (АСД, II, 48, 1633); староста выслухавши скарги оныхъ потварцовъ всказалъ по нихъ декретъ (Пралог, 589б); Иродᵈ пытаˡ Исуса многиˣ словᵛ, а ѡᴺ емѹ ничого не ѡᵀповедаˡ (Зб. 255, 262); тѣло мѹченіка ... ѡреˡ стереглъ пиˡне и ѡᵀ звѣрꙗ борониˡ (Зб. 82, 49б). Скарачэнне ўжыванняў вінавальнага склону пры дзеясловах маўлення, думкі і пачуцця звязваюць са змяненнем характару кіравання дзеясловаў [гл.: 2 с. 405; с. 213–214].

Канструкцыі з родным склонам традыцыйна ўжываюцца пры адмаўленні (агульнаславянская старажытная асаблівасць [1, с. 347]): не бѹдеᵀ в ниˣ тьмѧности. ни черности (Чэцця, 374); не чинечи фолькги никому (АВК, XXII, 2, 1555–1565); коли бы не было доброго рыцера з двема мечы и с чорнымъ щытом (Трыст., 29); мне заплаты не уделали (АВК, XXVI, 471, 1586); не смотримо смакѹ ꙗкиˢ чи горкии чи солодкиˢ (Зб. 261, 92); абысъте мнѣ чаровъ жадныхъ не причитали (Пралог, 614б).

Родны склон абазначае суб’екта дзеяння пры дзеясловах колькасных змен (напрыклад, *умноживатися*), а таксама ў адмоўных сказах са словамі *несть*, *нетъ*: коли митрополита нѣтъ (АЗР, I, 37, 1415); коли сѧ оумноживати начло праведныˣ. и бъ̃ велѣˡ аврамоу ... знамѧ положити на собѣ и на людеˣ своиˣ (Чэцця, 131б); Где несть ѹмениѧ вˢ души тамъ нетъ добра (Скар. ПС, 29б); неᵀ зрады во ꙗзыкѹ моиᴹ (Пс. XVI, 134). Таксама родны суб’екта сустракаецца пры дзеепрыметніках закончанага трывання (з прыназоўнікам *отъ* і без прыназоўніка): былъ адамъ прельщенъ ѡᵀ сотоны (Чэцця, 70); ты ... похотью преˡщенᴺ скверныꙗ плѧсавица (Там жа, 271б).

Родны аблятыўны (*Ablativus*), што абазначае аб’ект, ад якога накіроўваецца дзеянне, зафіксаваны пры дзеясловах аднімання, пазбаўлення, аддзялення, аддалення (*взяти, вкрасти, выплатити, забрати, згинути, отдалити, отняти, оступити, оторвати, побрати, пограбити, покрасти, убежати, уйти, удавити, украсти, улишитися* (*влишитися*), *умрети, утечи* і інш.). Яшчэ ў агульнаўсходнеславянскі перыяд родны аблятыўны ужываўся для абазначэння прадмета, адносна якога адбывалася

дзеянне аддалення, што “магло рэалізоўвацца як аддаленне ад прадмета шляхам перасоўвання ў прасторы або шляхам аддзялення ад яго” або “як аддаленне ад прадмета ў пераносным сэнсе, г. зн. у сэнсе паводзін” [3, с. 262], частотнымі былі канструкцыі без прыназоўніка *отъ*. Паступова такія канструкцыі пачалі замяняцца прыназоўнікавымі [гл.: 5, с. 153]. У помніках старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы з канца XV ст. пачалі пашырацца канструкцыі з прыназоўнікам *отъ*: моихъ несколько есачныхъ людей, отъ есака бегаючи, къ тобе прихилилися (КЗ, 349, 1484); хто иметь бѣгати ѡт силныхъ людеи (Чэцця, 108б); ѡтдалеж ѡт мене проклѧтство и взгаржене (Пс. XVI, 119); лѣкарьство избавлѧющи ѡт окормов посполитыхъ (Арыст., 207); нелацно мѣли ѡт дочасного живота того ѡторвати (Варл., 196); я ... почал был есми из малжонкою моею от них уходит (АВК, XXXIV, 293, 1663). Аднак паралельна працягвалі ўжывацца архаічныя канструкцыі без прыназоўніка *отъ*, якія сустракаюцца ў свецкіх, рэлігійных і дзелавых тэкстах: Имение еже исъперsва скоро и со хватаниемъ събираемо бываеть, напослѣды избавsлено будеть благославлениѧ (Скар. ПС, 31б); мы тежъ ꙋходꙗчы всꙗкихъ ꙋтратъ своихъ ꙋчынили есмо ѡ вси тые речы (КВС, 466б, 1552); скоупъ ꙗко песъ, гневливъ, какъ воронъ, бегаеть людеи как рысь (Арыст., 160); мы дей, уходечи оного клопоту (ИЮМ, VII, 282, 1577); вжо записадсѧ з нами ꙗкъ мает тебе избавити городов (Рач., 317); брати родное которыхъ ѡдна мати церковъ светаѧ, кафолическаѧ породила бегають, а до мачешиныхъ детеи ꙋтекаютсѧ (Унія, 4б); моглъ бы оуити гнѣвꙋ ближнег которыи сѧ мститъ крови (Хран., 170).

Да роднага аблятыўнага адносяць родны пры дзеясловах страху, боязі (*боятися, выстерегатися, встыдатися, убоятися, устрашитися* і інш.): [гл.: 2, с. 409], паколькі ён таксама абазначае аб’ект аддалення, пазбаўлення і пад.: естли бы боячися вины втекъ зъ земли (Ст. 1529, 65); ѡн … велми сѧ боит смерти (Бава, 145); ꙋстрашилисꙗ и ꙋбоꙗлисꙗ ихъ велми (Тр. гіст., 70); ѡ помноженю хвалы боsское не дбаю, юж вси ꙗк бы сꙗ ее встыдаю (Дыяр., 160б); вѣщбы, ворожбы и инныхъ забобоновъ выстерегалисѧ (Зб. вып., 104).

Пры назоўніку канструкцыі з родным склонам з прыназоўнікамі і без прыназоўнікаў перадаюць аб’ектныя і суб’ектныя значэнні:

родны аб’екта (дапаўненне ў родным склоне з’яўляецца аб’ектам дзеяння, выражанага назоўнікам): гекторъ ... ку ѡтрыманью тое то зброи с конꙗ своего сседлъ (Троя, 40); римскіе папежи ... о роsширенье своеи власти, старанье чинили (Апакр., 118); подобенство тое слꙋжит до ꙋшиs, иж ест ѻорстою, до слꙋханꙗ голосꙋ и слова бжго (Зб. 261, 150); розерваного пистолету у Печерска за направу слесару заплатили золотый одинъ (ИЮМ, IV, 220, 1686); за пробиване муру на двои двери и за муроване давныхъ дверей заплатили за дни два (ИЮМ, X, 185, 1695);

родны часткі (абазначае адносіны часткі да чаго-небудзь цэлага): держить подъ собою ѡ^{т}чизны часть мѹжа моего и спадокъ братьи его (КСД, 247, 1515); гротъ на кон^{s}ци копиѧ железныи важилъ естъ триста лотовъ (Скар. ДЦ, 109б); прочисти зѹбы свои карою древа горкаго (Арыст., 229); кгротъ ощѣпѹ его мѣлъ шестьсотъ сикле^{в} желѣза (Біблія, 307); продали спиже скарбовое, отъ арматы новой урезокъ (ИЮМ, Х, 9, 1695).

родны суб’екта: преданъ былъ на спаление огнѧ (Скар. ДП, 23б); по розъѣханію тыхъ войскъ пріѣхалъ до Острога (АЗР, IV, 214, 1605); смо^{т}ри^{л} на ро^{с}квитне^{н}е хр^{с}тиѣа^{н}ства (Бельск., 263); Устне прошоный о подписъ руки до тое протестаціи (АВК, VI, 280, 1637).

Пры назоўніку пашыраны канструкцыі з родным склонам з прыназоўнікам *зъ*, дзе родны склон выкарыстоўваецца для абазначэння матэрыялу, з якога што-небудзь зроблена: ѹделаешъ и заворъ з древа (Скар. КВ, 49б); каза^{л} г^{с}дъ бо^{г} мо^{s}сею ѹчини^{т} ... с касыи и ѡливы ѡлеекъ (Зб. 752, 270).

Канструкцыі з родным склонам пры прыметніку перадаюць адносіны:

аб’ектныя (родны аб’екта): тѧжкое моуки быва^{м} достоини (Чэцця, 118); листъ, полонъ боѧзни и страхѹ (Бер. саб., 49); Досадите^{л}: оукорите^{л} … полный крывды (Бяр., 36); привезлъ барилѹ великѹю полнѹю ѡливы (Пралог, 647б);

камплетыўныя (дапаўняльныя): до вэнуса велми склонъныи (Атыла, 179); человекъ длѣа скаженѣа греховного всегды естъ скло^{н}ны^{s} до мило^{с}ти рече^{s} земны^{х} (Зб. 255, 172); мл̃твами ѣако ѡружиемъ вспе^{р}ты^{s} до скаже^{н}ѣа твержъ бѣсовскихъ (Пралог, 558); Чи кождый чл̃къ можетъ быти сѹбѕектѹмъ зго^{д}ное до крещенiѧ ... чи кождый чл̃къ можетъ креститисѧ? (Зб. вып., 11);

параўнання (дапаўненне абазначае асобу або прадмет, з якімі іншая асоба ці прадмет параўноўваюцца): далеко барзо ме^{н}шее естъ ѡ^{т} нб̃а (Варл., 240б); гл̃ющаго ѣако г^{с}дь нш̃ъ ... естъ меншимъ ѡ^{т} Бг̃а ѡ^{т}ца (Зб. вып., 91б). Звернем увагу, што ў гэтай пазіцыі паралельна ўжываюцца канструкцыі беспрыназоўнікавыя, з прыназоўнікам *отъ*, а таксама каструкцыі з вінавальным склонам з прыназоўнікам *за*: з стенникомъ каплють гѹбы чѹжее и сладче ѡлѣю глаголець ее (Зб. 262, 95); в^{s} вѣрѣ ѡ^{т} насъ розный боудѹчи, еще прихилнѣйшимъ і до лѣченьѧ оуразѡвъ нашыхъ тымъ хѹтнѣишим и потужнѣишимъ ставити рачи^{ш} (Апакр., 3б); пе^{р}сове … мало розни ѡ^{т} тѹрко^{в} (Стрыйк., 417); Изали, слышачы, острейшые за ме^{ч}, блюзнѣрскіе слѡва, насмѣвиска, оурѹганѧ … оутробою сѧ не расте^{р}зала (Карп., 46б).

Канструкцыі з родным склонам пры прыслоўях абазначаюць асобу або прадмет, у дачыненні да якіх праяўляецца прымета, названая прыслоўем, і выкарыстоўваюцца для перадачы:

аб’ектных адносін: оказали нам копецъ неподалеку отъ замочку своего Милетина (АСД, I, 95, 1546);

адносін прыпадабнення: естъли же ѵзърить лица ваша высˢхлаѧ, более инˢшихъ отроковъ ровесниковъ вашихъ (Скар. ДП, 6); болеˢ было по насыщении собраⁿныхъ ѵломъковъ, анижли хлебовъ (Зб. 259, 163б).

Пры назоўніках і прыслоўях ужываецца таксама родны меры і колькасці: давати имъ по снопу сѣна (АЗР, I, 146, 1494); купилъ белецъ горелъки (ИЮМ, VII, 470, 1589); кадей салянокъ ни на што не годныхъ дванадцать (АВК, XIV, 508, 1594); ѡливы секстарій то естъ полтори кварты (Мак., 14б); на третимъ местцу лесу, заросли и троха сеножати (АВК, XXIV, 16, 1509); Прихилилъ есмъ мало оуха моего (Скар. ІС, 81); в тоᵐ есть много шкоды (Арыст., 228); коли сѧ соимете, мало мистерства будете простирати (Трыст., 95); много псовъ ѵстеклыˣ попсовалосѧ (Барк., 173б); на вулицаˣ ѵ местехъ наˢдеш страᵛ много купиᵀ а наболеˢ мꙗса бараⁿего а кашу рижовою (Наб. тур., 24).

Пры іменных часцінах мовы выкарыстоўваецца родны вылучальны (абазначае цэлае, з якога вылучаецца частка) у спалучэнні з прыназоўнікамі *зъ* або *отъ*: нихто з людеˢ простого стану ... волностѣи и привиˡевъ станᵘ шлꙗхэᵀского въживати не можэть (Ст. 1566, 33б); естли бы черезъ три годы нихто с повинныхъ до тое головщины не приповедалъсѧ (Ст. 1588, 421); таковый каждый зъ насъ маетъ подлечи подъ вѣчное неблагословенье и проклятство (АЗР, IV, 35, 1590); черезъ целниковъ цла новоподвышоные браны были ... отъ соболей, куницъ, лисовъ, волковъ, бѣлки … росомаховъ, отъ оливы, фарбъ, овощовъ (АЗР, IV, 249, 1605); преᵈнѣˢшие ѡᵀ нихˣ звано патреᶜ, то еᶜᵀ ѡᵀцове (Бельск., 145). Па назіраннях даследчыкаў, родны склон без прыназоўніка *изъ* (*зъ*) з вылучальным значэннем не атрымаў пашырэння ў старабеларускай мове: а Мацку ненадобе ся въ тую землицу вступати, ани кому ближних ихъ (ЛМ, РИБ, XX, 447, 1517) [4, с. 346].

Праведзены агляд засведчыў, што дапаўненні, выражаныя родным склонам (без прыназоўнікаў і з прыназоўнікамі), шырока ўжываліся ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове пры дзеясловах і імёнах (у прыватнасці, назоўніках) і выражалі розныя адносіны: аб’ектныя (з рознымі сэнсавымі адценнямі), суб’ектныя, меры і колькасці, вылучальныя, параўнальныя, камплетыўныя і інш. Адзначаны ў старабеларускіх тэкстах родны аблятыўны, формы роднага склону пашыраны пры адмаўленні. Змены ва ўжыванні дапаўненняў, выражаных родным склонам, заключаліся ў асноўным у замене беспрыназоўнікавых канструкцый прыназоўнікавымі.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Историческая грамматика русского языка. Синтаксис. Простое предложение. Москва : Наука, 1978. 448 с.

2. *Карский Е. Ф.* Белорусы. Язык белорусского народа / АН БССР, Ин-т языкознания. М. : Изд-во АН СССР, 1956. Вып. 2 : Исторический очерк словообразования и словоизменения в белорусском языке ; Вып. 3 : Очерки синтаксиса белорусского языка. 518 с.

3. *Ломтев Т. П.* Очерки по историческому синтаксису русского языка. М. : Изд-во МГУ, 1956. 596 с.

4. Нарысы па гісторыі беларускай мовы / А. Я. Бірала [і інш.]. Мінск : Дзярж. вуч.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1957. 450 с.

5. Сравнительно-исторический синтаксис восточнославянских языков. Члены предложения. М. : Наука, 1968. 297 с.

Прынятыя скарачэнні

АВК – Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Т. I–XXXIX. Вильна, 1885–1915; АЗР – Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. I–V. СПб., 1846–1853; Алекс. – “Александрыя” пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ, F.XVII.5); Апакр. – “Апакрысіс” (Вільня, 1598); Арыст. – “Арыстоцелевы вароты” канца XVI ст. (рукапіс НББ, 09/276 К); АСД – Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. I–XIV. Вильна, 1867–1904; Атыла – “Гісторыя аб Атыле” каля 1580 г. (рукапіс Бібліятэкі імя Э. Рачынскага ў Познані, № 94); Бава – “Аповесць аб Баве” каля 1580 г. (рукапіс Бібліятэкі імя Э. Рачынскага ў Познані, № 94); Барк. – “Баркалабаўскі летапіс” канца XVI – пачатку XVII ст. (рукапіс Дзяржаўнага гістарычнага музея, Зб. Сінад. 790); Бельск. – “Хроніка” М. Бельскага пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ, F.IV.688); Бер. саб. – “Абарона сабора берасцейскага” (Вільня, 1597); Біблія – Біблія пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ, F.I.2); Будны – “Катэхізіс” С. Буднага (Клецк, 1562); Бяр. – “Лексікон” П. Бярынды (Куцеін, 1653); Варл. – “Гісторыя аб Варлааме” (Куцеін, 1637); Гарм. – “Гармонія” пачатку XVII ст. // РИБ. Т. VII. СПб., 1882; Дыяр. – “Дыярыуш” А. Філіповіча 1638–1643 гг. (рукапіс ДГМ, Зб. Сінад. 856); Зб. 82, 255, 259 – Зборнікі павучанняў сярэдзіны XVII ст. (рукапісы БАН Літвы, RKF–82, 255, 259); Зб. 261 – Зб. 261 – Зборнік павучанняў пачатку XVII ст. (рукапіс БАН Літвы, RKF – 261); Зб. 262 – Зб. 262 – Зборнік біблейскіх кніг пачатку XVI ст. (рукапіс БАН Літвы, RKF – 262); Зб. 752 – Зборнік жыцій святых другой палавіны XVII ст. (рукапіс ДГМ, Зб. Сінад. 752); Зб. вып. – “Збор выпадкаў кароткі” (Супрасль, 1722); ИЮМ – Историко-юридические материалы, извлеченные из архивных книг губерний Витебской и Могилевской, вып. I–XXXII. Витебск, 1871–1906; Каліст – “Евангелле вучыцельнае” Каліста (Еўе, 1616); КВС – Кніга Віленскага замкавага суда 1552 г. (рукапіс ЦДАСА. Ф. 389, кн. 240); КЗ – Литовская метрика. Книги записей // РИБ. Т. XXVII. СПб., 1910; КСД – Литовская метрика. Книги судных дел // РИБ. Т. XX. СПб., 1903; Мак. – “Бяседы Макарыя” (Вільня, 1627); Мам. – “Сказанне аб Мамаевым пабоішчы” пачатку XVII ст. // Сборник отделения русского языка и словесности. Т. 81. СПб., 1906; Мял. – “Прамова Івана Мялешкі” канца XVI ст. // Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Ч. I. Мінск, 1961; Наб. тур. – “Аб набажэнстве турэцкім” канца XVI ст. (рукапіс ДГМ, Зб. Сінад. 790); Навука – “Навука аб сямі тайнах” (Вільня, 1620); ПГ – Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв. Вып. 1–5. М., 1977–1985; Пралог – Пралог – Пралог XVII ст. (рукапіс РДБ. Ф. 256, № 325); Пс. XVI – Псалтыр XVI ст. (рукапіс РДБ, № 335); Пс. XVII – Псалтыр XVII ст. (рукапіс РДБ, № 1017); Пыт. – “Пытанні і адказы праваслаўнаму з папежнікам” 1603 г. // РИБ. Т. VII. СПб., 1882; Рач. – Летапіс па спісе Рачынскіх каля 1580 г. (рукапіс Бібліятэкі імя Э.Рачынскага ў Познані, 3 94); Скар. – Біблія выдання Ф.Скарыны: ДП – Кніга Данііла прарока; ДЦ – Другая кніга Царстваў; ЕК – Кніга Еклезіяст; ІС – Кніга Ісуса Сірахава; КВ – Кніга Выхад; КЮ – кніга Юдзіф; ПС – Прытчы Саламонавы (Прага, 1517–1519); Ст. 1529 – Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 г. // Временник Императорского

Московского общества истории и древностей российских. М., 1854; С. 1566 – Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г. (рукапіс РНБ, F.II.34); Ст. 1588 – Статут Вялікага Княства Літоўскага (Вільня, 1588); Стрыйк. – “Хроніка” М. Стрыйкоўскага пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ, F.IV.688); Троя – “Аповесць аб Троі” пачатку XVI ст. (рукапіс БАН Украіны, ДА/п 157); Тр. гіст. – “Траянская гісторыя” пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ, F.XVII.5); Унія – “Унія” (Вільня, 1595); Хран. – “Хранограф” сярэдзіны XVII ст. (рукапіс РДБ, № 2405); Чэцця – “Чэцця” 1489 г. (рукапіс БАН Украіны, ДА/415л.

ПАЭЗІЯ НІЛА ГІЛЕВІЧА: ЖАНРАВА-СТЫЛЁВАЯ АДМЕТНАСЦЬ

І. П. Адамовіч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
ilonaadamovich@mail.ru

Навуковы кіраўнік: Бельскі Алесь Іванавіч, доктар філалагічных навук, прафесар.

У артыкуле зроблена спроба разгледзець жанравую сістэму паэзіі Ніла Гілевіча. Акрэслены наватарскія, эксперыментальныя тэндэнцыі ў творчасці паэта, прааналізаваны арыгінальныя, найбольш рэпрэзентатыўныя ў фармальна-стылёвых адносінах тэкставыя структуры. Н. Гілевіч, арыентуючыся на цвёрдыя формы верша, агульнавядомыя паэтычныя жанры, стварыў адметныя мастацкія мадэлі, жанравыя інварыянты. Адзначаецца сінтэз формы і зместу ў вершаваных творах паэта, іх ідэйная, лірычная, філасофская напоўненасць, кампазіцыйна-стылёвая своеасаблівасць. Зварот Н. Гілевіча да новых жанравых форм, развіццё вершаванай архітэктонікі спрыялі ўзбагачэнню паэтычнай культуры аўтара і ў цэлым беларускай нацыянальнай паэзіі.

Ключавыя словы: жанрава-тэматычны від; вершаваная форма; санетная форма; песенна-лірычны пачатак; актава; сямірадкоўе; танка; раман у вершах; творчая індывідуальнасць; паэт-наватар; творчы эксперымент.

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч – асоба шырокага творчага дыяпазону: таленавіты паэт-лірык, эпік, сатырык, перакладчык, публіцыст, літаратуразнавец, крытык, фальклярыст. Ён – знаўца народнай душы і мовы беларускага народа, адданы сын роднай зямлі. Пра яго ведаюць далёка за межамі Беларусі, што адначасова сведчыць пра вядомасць і аўтарытэт нашай нацыянальнай літаратуры.

У розныя перыяды творчай дзейнасці Н. Гілевіч выяўляў сябе і адкрываўся чытачу па-рознаму: як юнак-рамантык, чалавек закаханы, лірык-песеннік, палымяны прамоўца, філосаф-думаннік, дасціпны жартаўнік – усё гэта арганічна паядналася, злілося, знайшло яскравае ўвасабленне ў яго самабытнай і шматграннай асобе. Кожны з аспектаў творчай індывідуальнасці Н. Гілевіча па-свойму адметны, цікавы і заслугоўвае даследчыцкай увагі.

Ніл Гілевіч – носьбіт беларускага слова, народна-нацыянальнага светаразумення. У роднай прыродзе, вясковым свеце, вуснай народнай

творчасці ён бачыў вытокі духоўнай красы і маральнай моцы чалавека. Эстэтычны ідэал для паэта – прырода, яе харaство і яе вышэйшае тварэнне – чалавек. Невыпадкова чалавек і прырода ў паэзіі Н. Гілевіча – духоўнае адзінства, непадзельнае цэлае. Адметны жанрава-тэматычны від яго паэтычнай творчасці – пейзажны верш. Любоў, замілаванне – вось з чаго пачынаецца экалагічнасць пачуцця Гілевіча-паэта. Эстэтычная прывабнасць лірычнага пейзажу ў творчасці Н. Гілевіча адзначаецца ў крытычных артыкулах, прысвечаных першаму зборніку паэта, у публікацыях пазнейшага часу (П. Макаль, Г. Сіненка, У. Конан, А. Бельскі, Т. Нуждзіна і інш.). Важную ролю ў вобразным мысленні паэта пачынае адыгрываць умоўнасць, мастацкая дэталь, а таксама такія сродкі паэтычнай выразнасці, як адухаўленне, алегорыя, эпітэт, паўтор і некаторыя іншыя («Мой сіні бор, мой родны бор зялёны!..», «Замірае, сціхае мая залатая дуброва…», «Свята зямлі» і інш.). У вершы «Колькі раздолля ты дорыш жыццю» (1953) паэт услаўляе вясну як пару адраджэння і абнаўлення прыроды. Канкрэтныя прыметы вясны перарастаюць сваё непасрэднае значэнне і набываюць сімвалічнае гучанне: «Колькі раздолля ты дорыш жыццю, // Край мой узгоркавы, край мой лясны! // Зноў, праяснеўшы ад замецей-сцюж, // Неба адбілася ў люстрах вясны. // Бор, перакулены ўніз галавой, // Топіць у возеры радасны гул…», на гэту акалічнасць звяртае ўвагу Г. Сіненка [6, с. 34]. Верш «Цуд тварыўся – я праспаў…» (1960) – лірычна-настраёвая, гукажывапісная замалёўка прыроды. Тое ж самае можна сказаць і пра лірычны твор «Снежаньская імпрэсія» (1965) – гэта ўзор музычна-колеравага жывапісу словам.

Лірыка-эмацыянальнае ўспрыманне прыроды паступова ўключае ў сябе і публіцыстычны пафас, сацыяльныя абагульненні. У вершах на экалагічную тэматыку «Раўняюць хлопцы рэчку», «Сіняя пушча», «Загадка прыроды», «Даруйце, родныя бары і пушчы…», «Калі не апомнімся» паэт смела закранаў жыццёва важныя праблемы. Гэтыя творы насычаны глыбокім роздумам над сэнсам чалавечага быцця, гістарычнай роляй чалавека, у іх выяўляецца грамадзянскі неспакой аўтара. Н. Гілевіч адзін з першых у беларускай паэзіі 1960–1970-х гг. актуалізаваў праблему аховы прыроды, навакольнага асяроддзя. Пагаршэнне экалогіі ён звязваў з тэхнічным прагрэсам, з рацыяналістычным чалавекам эпохі НТР.

У паэзіі Н. Гілевіча гэтага часу выявілася філасофскае асэнсаванне дыялектычнай сувязі чалавека і прыроды. Прырода выступае не толькі як фон – яна арганічная складовая частка ў канцэпцыі асобы лірычнага героя. Прырода ў лірыцы паэта – жывая істота, актыўны дзейны персанаж, яна «салідарызуецца» з чалавекам, абуджае ў ім прагу жыцця, кліча да жыццялюбства, няўрымслівасці. У хвіліны смутку і гора прырода «спачувае», «спагадае» лірычнаму герою, дапамагае знайсці душэўную раўнавагу. У актаве «Не гаманіце, вербы, не будзіце…» (1963), створаным на фальклорнай аснове, ён просіць прыроду, яе сілы не парушаць глыбокі

сон маці, якая, даглядаючы дзіця, «задрамала толькі на дасвецці» [3, с. 143]. Экалагічны імператыў, пераняты ад Янкі Купалы, у творчасці Н. Гілевіча праяўляецца ў беларусацэнтрычнасці. Самаідэнтыфікацыя беларуса як грамадзяніна, яго любоў да свайго народа, да роднай мовы, да гісторыі краіны, звычаяў, традыцый, побыту народа – вось тое, што так моцна хвалявала Гілевіча-паэта, Гілевіча-публіцыста (вершы «Мова майго народа», «Вы не яе – вы сябе прыніжаеце», «Родная мова!..», «Нясмертны дух слова» і інш.).

Для стылістыкі многіх вершаў Н. Гілевіча характэрны лірычна-песенны пачатак, эўфанія роднай мовы, беларускага маўлення. Ён – знаўца паэтыкі беларускай народнай песні. Народная песня з яе меладычнасцю стала для паэта эстэтычным узорам і арыенцірам. Вуснае народнае спяванне прыкметна паўплывала і на арыгінальную лірычную творчасць Н. Гілевіча. Музыка і песня сталі спадарожнікамі жыцця і творчасці, яны выявіліся ў яго лірыцы яскрава і паслядоўна. Гэтая музычнасць светаадчування ўспрымаецца як яскравая, апазнавальная рыса нацыянальнай душы, беларускага менталітэту.

Песенна-лірычны пачатак выяўляўся ў розныя перыяды творчасці Н. Гілевіча абсалютна па-рознаму. Шасцідзясятыя гады – час узнёсла-рамантычнага ўслаўлення радасці жыцця, маладосці – былі, бадай, ці не самымі плённымі. Дыяпазон лірыкі Н. Гілевіча факусіраваўся ў адной, галоўнай, тэме таго перыяду – тэме роднага краю (вершы «Зямля бацькоў, *Лагойшчына* мая…», «*Край* мой беларускі, *край*!..» і інш.). Паэт складаў высока ўзнёслыя гімны і оды Бацькаўшчыне-Радзіме. Патрыятычная лірыка паэта 1960–1970-х гг. не страчвае сваю актуальнасць, надзённасць і па сёння, яна здольна «працаваць» на выхаванне нацыянальнага духу маладога чытача. Творамі «Я хаджу, закаханы…», «Вы шуміце, шуміце…», «Спадчына», «А дзе ж тая крынічанька?» аўтар сцвярджаў высокія нацыянальныя прыярытэты, жыццёва неабходныя ідэалы і прынцыпы, сярод якіх патрыятычны ідэал – найпершы, самы галоўны і вызначальны.

Заўважым: ужо раннім вершам Н. Гілевіча была ўласціва меладычнасць, якая часта пераходзіла ў напеўнасць, песеннасць. Такім па сваёй стылёвай афарбоўцы, напрыклад, з’яўляецца верш «Я паеду адна…» (1956): «Хлыне ў сэрца вясна, смутак гонячы прэч!» [3, с. 55]. Народна-песенныя матывы знайшлі ўвасабленне ў лірычных творах пра каханне, іх гучанне блізкае да складу беларускага нацыянальнага характару, беларускай душы. Верш «Ты ўсё не можаш дараваць…» (1960) – спавядальна-шчыры, яго лірычны герой перажывае драму, але разам з тым не страчвае сувязі са светам, пачуцця аптымізму, надзеі, веры ў моц і сілу кахання. На заключным этапе творчасці у інтымных вершах Н. Гілевіча знайшла эмацыянальна-пачуццёвы адбітак асабістая жыццёвая драма паэта, які перажыў глыбокую траўму – смерць сваёй каханай жанчыны: «Помню, сказала: // “Ой, як ты будзеш плакаць, // Калі я памру...” // Не, не ўяўляла яна

// Плачу майго землятрус» [4, с. 56]. Лірычны драматызм у падобных радках раскрывае ўнутраны свет перажыванняў і эмоцый аўтара. Як бачым, паэт мае свой уласны ідыястыль, для якога характэрны псіхалагізаваны лірызм, з аднаго боку, а з іншага – музычная экспрэсія слова.

Ніл Гілевіч заўсёды дэманстраваў адметныя пошукі ў галіне паэтычнай формы. Яго творчыя эксперыменты, нароўні з творамі іншых сучасных паэтаў, ствараюць наватарскае і самабытнае аблічча нашай нацыянальнай літаратуры.

Ніл Гілевіч – майстар беларускага санета. Традыцыйная санетная форма патрабуе пабудовы твора з двух чатырохрадкоўяў і двух трохрадкоўяў, дзе ў катрэнах падаецца развіццё тэмы, а ў тэрцэтах – кульмінацыя і развязка з рыфмай *абба абба* ці *абаб абаб*. Н. Гілевіч стварыў свой санет на ўзор санетаў У. Шэкспіра ў форме трох чатырохрадкоўяў і аднаго заключнага двухрадкоўя (так званы санет шэкспіраўскага тыпу). Адметнасць шэкспіраўскага санета Н. Гілевіча ў тым, што паэт выкарыстоўвае традыцыйную санетную рыфмоўку (*абба абба*), а не рыфмоўку санета шэкспіраўскага тыпу (*абаб вгвг деде жж*). Ён сінтэзуе форму традыцыйнага санета і яго разнавіднасці – санета шэкспіраўскага тыпу:

«Нас тут было чатыры мільёны!» –
Крычыць жахлівы надпіс са сцяны.
«Усім, усім падпальшчыкам вайны
На ўсе вякі мы шлём праклёны!» [2, с. 42].

У 1967 г. выйшла паэтычная кніга Н. Гілевіча «Перазовы», у якую ўвайшоў адзін з першых у беларускай літаратуры вянок санетаў «Нарач» (пасля да гэтай мастацкай формы звярнуліся А. Сербантовіч, Я. Сіпакоў, Х. Жычка, У. Дзюба і інш.), прысвечаны выдатнаму паэту XX ст. Максіму Танку.

Пра Н. Гілевіча як наватара ў галіне вершаванай формы часта гавораць, маючы на ўвазе яго сямірадкоўі. Ён – адзін з тых нямногіх паэтаў, хто звярнуўся да даўно забытай традыцыйнай формы. Сямірадкоўе, ці септыма (ад лац. *Septima* – сёмая) – сямірадковая страфа на адну, дзве або тры рыфмы з рознай схемай рыфмоўкі: *ааБввБв, аБаБввБ, ааБвваБ, ААББВВБ* і інш. [5, с. 383]. Дзякуючы варыянтнасці рыфмоўкі, аўтар змог выкарыстаць рознага кшталту размоўныя інтанацыі, якія працягваюць традыцыю яго песеннай лірыкі.

Адмысловымі паэтычнымі формамі, якімі плённа карыстаўся Н. Гілевіч, з'яўляюцца актава і васьмірадкоўе, ці актэт. Выразную мяжу паміж гэтымі дзвюма формамі праводзіць сам паэт у зборніку «Актавы» (1976): «У традыцыйным разуменні актава – гэта васьмірадковая страфа з рыфмоўкаю *АБАБАБВВ*. Тэрмін паходзіць ад італьянскага *ottava rima* – "васьмірадкоўе". Менавіта ў значэнні "васьмірадкоўе"

(васьмірадкоўе наогул, а не пэўнай “узаконенай” будовы) і ўжываецца гэты тэрмін у кнізе. Побач з актавамі кананічнай формы ў ёй змешчаны васьмірадковыя вершы з вольнай і таму самай разнастайнай кампаноўкай рыфмаў. Склалася гэта кніга не адразу. Першая невялікая нізка васьмірадкоўяў была напісана мною яшчэ ў 1961 годзе. Зрэдчасу звяртаўся я да гэтай формы і пазней. Але пераважная большасць вершаў напісана нядаўна – у апошнія тры-чатыры гады» [1, с. 5–6]. Н. Гілевіч у цыкл «Актавы» ўключыў каля дзесяці вершаў («Святочны, старажытны дух калядны…», «Куды ні глянь – над дахам строй антэн…», «Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы...», «Здзіўляешся: за што табе я ўдзячны?..» і інш.). У вершах-актавах аўтар выказваў самае дарагое і запаветнае, тое, што вынашана і здабыта ў пакутных роздумах і духоўных пошуках. Ён выяўляе філасофскі роздум пра сэнс быцця, асэнсоўвае маральна-этычныя праблемы жыцця і інш.

Адметнай у паэтычнай творчасці Н. Гілевіча стала форма танка. Зборнік «На флейце самоты» (2004) Н. Гілевіча цалкам складаецца з пяцірадовікаў – вершаў у форме танка. Гэта лірычныя мініяцюры, яны складаюць два сшыткі кнігі. Танка – адзін з асноўных класічных жанраў японскай паэзіі. Сам жа паэт пра новую форму ў яго творчасці напісаў так: «Трыццаць адзін склад // Уціснуць у пяць радкоў // Строга па схеме: // Пяць-сем-пяць-сем-сем, – і ўсё! // Вось вам, сябры, і “танка”» [4, с. 5]. Форма танка ў творчасці Н. Гілевіча набыла інтэлектуальна-філасофскую змястоўнасць, афарыстычнасць, напоўнена духоўным пошукам сэнсу чалавечага існавання.

Вялікае значэнне для беларускай літаратуры меў выхад рамана ў вершах Н. Гілевіча «Родныя дзеці» (1985). Твор, як і належыць раману, мае эпічна-апавядальны характар, але па-сапраўднаму прыцягальным яго робяць менавіта лірычныя адступленні. Лірычны пачатак становіцца дамінантай і ў раскрыцці сюжэта, і ў структурнай арганізацыі нетрадыцыйнай формы эпічнага твора. Бадай, пасля Коласавай «Новай зямлі» гэта адно з самых значных дасягненняў у галіне вершаванага эпасу.

Н. Гілевіч шмат эксперыментаваў з эпічна-лірычнай формай, што ўвасобілася ў такіх яго творах, як вершаваная камедыя «Формула іржавіны», вершаваныя апавяданні і фельетоны («Балбешка», «Чалавечак», «Пісьмо ў рэдакцыю» і інш.), сатырычная паэма («Ачмурэнне», «Гэй, наперад! Гэй, назад!» і інш.). Непаўторна і па-новаму загучалі эпічныя творы паэта.

Як мы пераконваемся, Н. Гілевіч – паэт-наватар, які смела ішоў на творчы эксперымент. Ва ўсім павінна быць эстэтычная мера і эстэтычны густ – гэта, бадай, адна з асноўных дамінантаў, якая прадвызначала мэту фармальна-стылёвых пошукаў Н. Гілевіча на кожным этапе яго творчасці.

Паэтычныя наватворы Н. Гілевіча дазволілі нашай нацыянальнай літаратуры яшчэ бліжэй дакрануцца да літаратуры сусветнай. У сваю ж чаргу цяпер сусветная літаратура, дзякуючы творчым набыткам Н. Гілевіча,

уключаецца ў кантэкст беларускай літаратуры: паэт стварыў па-беларуску яркія мастацкія эквіваленты, пераўвасабленні, яскравыя паэтычныя формы. У гэтым плане ён – прадаўжальнік творчых ідэй і традыцый Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, звязаных з эстэтычным узвышэннем і ўзбагачэннем беларускай нацыянальнай літаратуры.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гілевіч Н.* Актавы. Мінск: Маст. літ., 1976. 142 с.
2. *Гілевіч Н.* Выбраныя творы / уклад., камент. Н. Гілевіча; прадм. У. Конана. Мінск : Кнігазбор, 2009. 350 *с.*
3. *Гілевіч Н. З*бор твораў : у 23 т. Мінск : Кніга, 2003. Т. 1. 416 с.
4. *Гілевіч Н.* На флейце самоты: лірычныя мініяцюры ў жанры «танка». Мінск : Про Хрысто, 2004. 92 с.
5. *Рагойша В.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд., дапрац. і дапоўн. Мінск : Беларус. навука, 2004. 576 с.
6. *Сіненка Г. Д.* Ніл Гілевіч : нарыс творчасці. Мінск : Вышэйш. шк., 1981. 269 с.

ЦІШКА ГАРТНЫ – ПАЧЫНАЛЬНІК УРБАНІСТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ

А. І. Бельскі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
a_belsky@tut.by

Упершыню вершы Цішкі Гартнага пра горад разглядаюцца як адзінае тэматычнае цэлае і ў кантэксце станаўлення беларускай урбаністычнай паэзіі. Паэт па-свойму адметна ўвасобіў вобразны свет роднага мястэчка, прастору вялікага горада. Аб'ектам паэтычнага сузірання сталі не толькі рэаліі беларускага горада, але і локусы, рэчаіснасць Берліна. Цішка Гартны стварыў яскравыя ўрбаністычныя замалёўкі, пры гэтым перадаў свае ўражанні і настроі. Асобныя гарадскія тэксты паэта маюць імпрэсіяністычныя рысы, прыкметы містычнага сімвалізму. Урбанізм як адметны тып мыслення пашыраў вобразна-тэматычныя і выяўленча-стылёвыя абсягі беларускай паэзіі 1920-х гадоў.

Ключавыя словы: урбаністычная паэзія; гарадская тэма; урбанізм; урбаністычны пейзаж; вобразная структура; паэтычныя ўражанні.

У першай трэці XX ст. надзвычай хутка і прыкметна адбывалася станаўленне жанравай сістэмы беларускай паэзіі, пачаў пашырацца яе тэматычны і вобразны склад, запачаткоўваліся новыя плыні і кірункі. Адным з самых значных і яскравых паэтаў-наватараў стаў Максім Багдановіч, які, апрача іншага, з'яўляецца агульнапрызнаным пачынальнікам урбаністычнай паэзіі. Праўда, наспела патрэба змясціць акцэнты ў літаратуразнаўчым дыскурсе датычна гарадской тэмы ў айчыннай паэзіі, на што мы звярталі ўвагу ў ранейшых публікацыях [2]. Гістарычная і тагачасная Вільня знайшла ўвасабленне ў творах Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Ануфры Петрашкевіча і некаторых іншых паэтаў XIX ст. Асабліва

яскрава рысы ўрбаністычнага мыслення выявіліся ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. І ўсё ж менавіта пачатак XX ст. з яго імклівым ростам гарадоў, іх эканамічным і культурным развіццём стаў часам нараджэння паэтычнага ўрбанізму як літаратурна-эстэтычнай з'явы.

Зрэшты, урбаністычная тэма ў беларускай паэзіі ў асноўным разглядалася на матэрыяле твораў пачатку XX ст. (пачынаючы ад нашаніўскага крытыка Антона Луцкевіча і да нашага сучасніка Сяргея Дубаўца). Гарадскі дыскурс актуалізаваўся ў літаратуразнаўстве і крытыцы найноўшага часу, пра што засведчылі артыкулы Н. Пыско «Урбаністычныя матывы ў творах Янкі Купалы і Максіма Багдановіча» (2002), с. Грымуты «Горад у паэтычным адлюстраванні Максіма Багдановіча (параўнальны аспект)» (2009), Т. Ганчаровай-Цынкевіч «Вобраз Вільні ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя» (2009), М. Весялухі «Урбаністычныя матывы ў паэзіі Максіма Танка 1930-х гг.», «Паэзія Уладзіміра Жылкі ў кантэксце ўрбаністычнай традыцыі» (абодва – 2010), А. Багушэвіча «Паэтыка верша Янкі Купалы "На вуліцы" (да праблемы станаўлення ўрбаністычнай традыцыі ў беларускай паэзіі)» (2013) і інш. Аўтары гэтых публікацый – маладыя даследчыкі, прадстаўнікі новай філалагічнай генерацыі. Самымі свежымі, апошнімі па часе прыкладамі ўзмацнення навуковай цікавасці да ўрбаністычнай паэзіі могуць паслужыць артыкулы **В. Жыбуля, надрукаваныя ў часопісе** «Роднае слова»**:** «"Табе, мой Мінск, хвалу пяю…": мінскія рэаліі ў паэзіі Петруся Броўкі» (2020, № 5), «"Як жыццё – шырокі, і як песня – звонкі…": Мінск у творчасці Пятра Глебкі» (2020, № 6). Між тым айчынныя тэарэтыкі, складальнікі слоўнікаў літаратурных тэрмінаў і паняццяў не заўсёды паспяваюць фіксаваць новыя факты і з'явы, якія ўрэчаісніліся, зацвердзіліся ў эстэтычнай прасторы. Так, В. Рагойша ў сваім «Паэтычным слоўніку» адзначае, што «з пачатку XX ст. у беларускай літаратуры пашыраецца ўрбаністычная паэзія…» [8, с. 496], называе цыкл «Места» М. Багдановіча, імёны іншых паэтаў, у тым ліку сучасных. Аднак ён не вылучае як асобную катэгорыю «Урбанізм», адсутнічае характарыстыка ўрбаністычнай лірыкі як асобнай жанрава-тэматычнай разнавіднасці паэзіі, не знаходзім у «Прадметным паказальніку» адсылкі да паняцця «ўрбаністычны пейзаж». Зразумела, гэта пытанне часу – і, будзем спадзявацца, кола літаратурных катэгорый і тэрмінаў у даведачных выданнях па тэорыі літаратуры пашырыцца. А што мы ў гэтым плане спазняемся – факт. Скажам, тэрмін «урбанізм» улучаны ў адзінаццацітомную «Литературную энциклопедию», выдадзеную яшчэ ў 1939 г., дзе гэта паняцце тлумачыцца як «адлюстраванне ў літаратуры (у яе тэматыцы, вобразах, стылі) вялікага горада з высокаразвітай тэхнікай і індустрыяй, гарадскога быту, асаблівасцей псіхікі, спароджаных гарадскім укладам» [7, стлб. 606]. У «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (1987, т. 5) тэрмін «урбанізм» разглядаецца выключна як «кірунак у архітэктуры і горадабудаўніцтве 20 ст.» [10, с. 364]. У дачыненні да

літаратуры і мастацтва, на жаль, ён не выкарыстоўваецца. Зрэшты, цікава, што ў шэрагу даведачных выданняў савецкага часу паняцце «ўрбаністычная паэзія» набывае трактоўку з ідэалагічных пазіцый: «**УРБАНІСТЫЧНАЯ ПАЭЗІЯ** (ад лац. *urbanus* – гарадскі) – паэзія, у якой адлюстроўваецца жыццё буйных капіталістычных гарадоў з іх вялікім насельніцтвам, шумнай тэхнікай, з кантрастамі раскошы і беднасці» [9, с. 428]. Гэта азначэнне шырока растыражавана ў сучаснай інтэрнэт-прасторы.

Апрача М. Багдановіча, станаўленне і развіццё ўрбаністычнай тэмы ў беларускай паэзіі 1910–1930-х гг. справядліва звязваецца з імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Уладзіміра Жылкі, Андрэя Александровіча, Алеся Дудара, Янкі Бобрыка, Максіма Танка, Юлія Таўбіна і інш. У пераліку пачынальнікаў паэтычнага ўрбанізму Цішка Гартны калі і згадваецца, то рэдка ці мімаходзь, не кажучы пра тое, што ўрбаністычны дыскурс у яго лірыцы не быў прадметам асобнага разгляду. На тэму горада ў паэзіі Цішкі Гартнага звяртаў увагу даследчык яго творчасці С. Александровіч, сярод іншых вершаў ён вылучаў цыкл «Горад» і, у прыватнасці, пісаў: «Урбаністычныя матывы, гарадскія малюнкі арганічна суседзяць з непаўторнымі краявідамі роднай Капыльшчыны і Случчыны» [1, с. 13–14].

Цішка Гартны нарадзіўся ў Капылі, дзе ён гадаваўся і сталеў. У тую пару, калі тут паэт жыў, гэта было тыповае беларускае мястэчка ці невялікі горад, які меў рысы вясковага паселішча з яго адмысловым узгорыстым ландшафтам. Праўда, у часы ВКЛ і раней Капыль лічыўся княжацкім замкам з так званым местам – гэта значыць, горадам. Яго жыхарамі былі пераважна рамеснікі і гандляры, частка насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай. Былі і заможныя месцічы-мяшчане, купцы, шляхта. У 1652 г. Капыль атрымаў Магдэбургскае права. Цішка Гартны стаў першым паэтычным адкрывальнікам свету свайго мястэчка. На пачатку верша «Капыль», які датуецца 1914 г., ён стварае пейзажны вобраз радзімы, паэтызуе добра знаёмыя з маленства краявіды, улучае рэцыпіента ў ландшафтную прастору: «Капыль, Капыль! Маё мястэчка, // Вялікай Міншчыны куток! // Мне міла ўсё тваё: і рэчка, // І хаты, нівы і гаёк… // Вакол яго сноуе далінай // Шнурок вясёлы раўчука, // Якога нам, бы матка сына, // Спакон вякоў дала рака…» [5, с. 70–71]. А далей Цішка Гартны апавядае пра Капыль як месца спрадвечнае, гістарычнае. Мінуўшчына ў трактоўцы паэта паўстае як час гераічны, легендарны, даўнія падзеі ўспрымаюцца ім праз прызму барацьбы і змагання за родны край: «На нівах густа разлягліся // Астаткі шведскае вайны, // Што ў час вяковы не звяліся // Ў траве зялёнай курганы. // Пад іх грамадаю маўкліва // Ваякаў слаўных косці спяць, // Пайшоўшых смела ў час прызыву // Свой родны край абараняць. // Між тых курганаў, на адгону, // Высокі замак з цьмі вякоў // Ўстае, як сведка ўлады і закону // Старых часоў, сваіх князёў» [5, с. 71]. Як можна пераканацца, прыродна-ландшафтная прастора атрымлівае гістарычнае вымярэнне і адлюстраванне,

паэт запыняецца на слядах і знаках гераічнага мінулага. Цішка Гартны звяртаецца да старажытнай гісторыі Капыля, каб падкрэсліць яго значнасць у лёсе і гісторыі бацькаўшчыны. Локус горада паўплываў на фарміраванне кантэксту духоўнага быцця паэта, які, абмалёўваючы і дэталізуючы навакольны пейзажны свет, раскрывае, можна сказаць, «ландшафт душы». Затым гістарычны экскурс змяняе прыродаапісальная тэкставая частка, якая стварае ўражанне пракаветнай прыгажосці і загадкавасці родных мясцін.

Па-мастацку ўвасобіў Цішка Гартны вобраз роднага мястэчка і ў вершы пазнейшага часу з гэткай жа назвай «Капыль» (1927), які ўвайшоў у нізку «Чырвоная Случчына». Твору ў паэтычнай нізцы папярэднічае верш «Слуцк» (1925). Нягледзячы на яскрава выяўленыя ўрбаністычныя матывы, аўтарская візія, і гэта адразу заўважаецца, нясе ідэалагічны адбітак. У аснове канцэпцыі горада ляжыць ідэя падзелу, размежавання паводле прынцыпу «старое/былое – новае/савецкае». Гэтая бінарная апазіцыя, ці антыномія, тлумачыцца акалічнасцямі біяграфіі і светапогляду Цішкі Гартнага (Зміцера Жылуновіча), які ўспрыняў ідэі бальшавікоў-камуністаў, быў стваральнікам БССР, стаў па сутнасці першым пралетарскім паэтам. Пачатак верша «Капыль» з пункту гледжання сучаснага чытача шматабяцальны:

З сівых вякоў выглядае даўнасць:
Замчышча, роў, курганы…
Ў казках-байках туманная слаўнасць
Дзеяў яго старыны… [5, с. 101].

Пейзажна-гістарычная падсветка служыць фонам для стварэння карціны сацыяльнай няроўнасці і нядолі, якую напоўніцу зведаў працоўны люд. Князь, уладар замка, выступае як жорсткі эксплуататар, а сяляне – яго ахвяры. Аўтар дэманізуе локус замчышча: «…замчышча князя-пана – // Гэта быў страшны куток!» [5, с. 101]. Герой верша нагадвае князя-прыгнятальніка з паэмы «Курган» Янкі Купалы. Калі кіравацца трактоўкай урбаністычнай паэзіі савецкага часу паводле «Слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў» пад рэдакцыяй Л. Цімафеева і С. Тураева, то можна канстатаваць: Цішка Гартны паказвае былы Капыль «з кантрастамі раскошы і беднасці» [9, с. 428]. Паэт завастрае праблему трагічнага падзелу Беларусі паводле Рыжскай дамовы 1921 г. на ўсходнюю і заходнюю часткі. Непадалёк ад Капыля прайшла мяжа, якая распалавініла беларускі край: «Помніць Капыль і, поўны трывогі, // Ўголас пытае: калі // Звяжуць суцэльна шляхі-дарогі // Часткі парванай зямлі? // Покуль жа будуць з гэтым гадзіцца // Родны Слонім, Нясвіж?» [5, с. 102]. Тут пераклічка астыёнімаў нібы звязвае ў адзінае цэлае беларускую прастору. У асобных вершаваных радках яскрава выяўляецца аўтарская вобразная экспрэсія: «Мые-мые граніцу рэчка Мажа. // Рэжа, як грунт капачы..» [5, с. 103]. Верш «Капыль»

засведчыў пра эклектыку ўрбанізаванага мыслення паэта, наяўнасць у ім сацыяльнай дамінанты, палітычнага чынніка.

Асаблівай увагі заслугоўваюць творы з паэтычнага цыкла Цішкі Гартнага «Горад», якія былі надрукаваны ў часопісе «Полымя» (1924, № 2). Між іншым, у гэтым жа часопісе ў № 1 за 1924 г. змешчаны і цыкл вершаў «Горад» А. Александровіча. Верш «Адвячоркам» – адметны пейзаж вячэрняга горада. У абсалютнай большасці твораў Цішка Гартны з вялікай замілаванасцю апяваў традыцыйнае прыроднае ўлонне з яго нівамі, лугамі, сенажацямі, лясамі, тут жа ён з захапленнем, любаваннем сузірае гарадскія аб'екты і рэаліі, пераключае пры гэтым увагу з аднаго на іншае (пейзаж рухомы, зменлівы), перадае адбітак уласных уражанняў і ў выніку стварае ўрбаністычную вобразна-матыўную прастору верша: «шэрасць лёгкая над горадам»; «гудок фабрычны свіст зацяжны строма кіне»; «працоўных натаўп рэзва, шумна зашнуруе»; «драты, што сеткамі крыжуюць вулкі, пляцы» [5, с. 94] і інш. Паэт імкнецца як да паэтычнага ўзнаўлення візуальных назіранняў, так і да перадачы слыхавых адчуванняў. Паэтыка гарадской прасторы ў вершы ўяўляе сабой сукупнасць аб'ектаў і дынамічны падзейны шэраг, яскрава выяўлены вечаровы каларыт (спалучэнне шэрага і светлага колераў, цені, сярэбраны прамень, акварэльная лёгкасць): «Настрэчу ж месяцу блядному й зорак кучы // Агні электрыкі вакол з акон, з ліхтарань // Паднімуць ўверх прамень сярэбраны, бліскучы, // І зыкі выцісне дзяўчына на гітары…»; «Люблю сачыць, як дзень над горадам канае, // Лятучы ціха к небу дымам лёгкім, сівым!» [5, с. 94, 95]. Урбаністычны верш «Адвячоркам» мае рысы імпрэсіяністычнага жывапісу словам.

«Ноччу» – пейзажная замалёўка горада, у якой адлюстраваліся суб'ектыўныя вобразна-паэтычныя ўражанні. Гарадскі свет успрымаецца аўтарам як штосьці таямніча-загадкавае. Урбаністычная выява прыкметна міфалагізаваная ў духу рамантызму і сімвалізму: «І тут і там, здалёк і ўблізку, // Як ў цёмным полі – воўка вочы, // Ў раскідзе доўгай гнутай нізі // Агні па гораду бліскочуць»; «Хто іх разліў, з якой патрэбы – // Пытаеш – мрыюць над дамамі, // Як свечкі тыя над трунамі // Ў цалуне чорным звісшым з неба?» [4, с. 27, 28]. Паэт, зачараваны начным горадам, раскрывае філасофска-экзістэнцыйны стан душы, імкнецца спасцігнуць нейкую таямніцу быцця.

У прадмове да «Збору твораў» Цішкі Гартнага ў 4 тамах даследчык С. Александровіч асобна адзначае цыкл вершаў паэта «Берлін» (1922) [1, с. 13]. Праўда, у аўтарскім зборніку «Урачыстасць» (1924) гэты цыкл мае назву «Сучасны Берлін». Раней верш «З надворку», з якога пачынаецца цыкл, разглядаўся ў кантэксце так званай інтэрнацыянальнай тэмы. Напэўна, яго можна залічыць і да падарожных вершаў, экзатычнай тэмы, краіназнаўчай паэзіі. Аналіз тэматычнага зместу, вобразнай структуры верша «З надворку» дазваляе аднесці яго да ўрбаністычнай паэзіі. Трэба

сказаць, што Цішка Гартны здзейсніў падарожжа ў Германію, пра якое распавёў у нарысе «Ад Берліну да Мінску» (1922), надрукаваным у газеце «Савецкая Беларусь» [3]. У вершы «З надворку» паэт стварыў яркую прасторава-вобразную карціну Берліна:

На мерку зроўненых муроў
Ўстаюць крутыя рэбры дахаў,
Іх вежы лёгкія, як птахі,
Ўздымаюць лес сваіх галоў.
Для стыкаў вуліц, ля пляцоў
Сягаюць к небу кірхаў шпіцы,
Ў прастор паветра, ў бляск зарніцы
Нясуць шум грэшных гарадоў.
Уверх, уверх! Бо душны дол
Ў разрэзах цесных, вузкіх вуліц
Жыццё раз'юшанае туліць
Каменнай цяжкасцю вакол [6, с. 48].

Урбаністычны пейзаж фарміруюць такія локусы, як муры, дахі, камяніцы, гмахі, вуліцы, кірхі. Вобраз горада паўстае ў сваёй велічы, з шумнымі вуліцамі, шэрымі сценамі дамоў, чадным дымам. На ўспрыманне паэта, «каменні… здавілі яго» [6, с. 48]. Гарадскому тлуму і цяжару існавання ў замкнёнай прасторы, пачуццю стомы супрацьпастаўляецца свет жыцця прыроды. У вершы гучыць матыў уцёкаў да прыроднага ўлоння, распаўсюджаны, дарэчы, у паэзіі рамантыкаў: «…Нібы кудысь ўцячы мяркуе – // Прасторам, волей падыхаць»; «І, здэцца, вось агромны рух // Між шэрых сцен дамоў-грамадаў… паімчыцца // Ў зялёны луг, на рунь палёў» [6, с. 48, 49]. У вершы «Унутры» Цішка Гартны паказвае буржуазны, капіталістычны горад як свет сацыяльных кантрастаў і супярэчнасцей. Разам з тым у гэтым і іншых творах з цыкла «Сучасны Берлін» ён змог перадаць свае паэтычныя ўражанні ад сустрэчы з урбаністычнай экзотыкай:

Ідзеш ты ім, глядзіш наўкруг –
Сляпіць багацце твае вочы.
У час спачынку, ў час рабочы –
Людзей лядачых гулкі рух.
Ядвабы, золата і пух,
Мяхі, маноклі, дыяменты…
Пакроі вопратак к мамэнту,
Кафэ, салонныя акцэнты –
Давольства збытачнага рух… [6, с. 50].

Цішка Гартны быў адным з першых беларускіх паэтаў, які трапіў у Берлін, – буйны горад з вялікім насельніцтвам, цэнтр эканамічнага і палітычнага жыцця Заходняй Еўропы, тагачасны асяродак заможнасці і

багацця, з аднаго боку, і, з другога, – беднасці, нястачы сацыяльных нізоў, бяспраўнага становішча працоўнага люду. Паэт не хаваў негатыўнага стаўлення да буржуазнай рэчаіснасці. Берлін выклікаў у яго захапленне як індустрыяльны «горад-волат у каменным закуцці» [5, с. 90], горад працоўных, для якіх, на яго думку, хутка надыдзе «час другі, час зусім інакшы» [5, с. 90] (верш «У зялёным лесе»). Нягледзячы на сацыяльна-крытычны пафас, Цішка Гартны пашыраў культурную геаграфію, паэтычна абжываў прастору замежнага горада, засведчыў сваю духоўную і эстэтычную прысутнасць у ёй як назіральны і ўражлівы мастак слова.

Напрыканцы трэба дадаць, што, пачынаючы з гадоў юнацтва і на працягу жыцця, Цішка Гартны сваёй дзейнасцю і лёсам быў спалучаны з многімі гарадамі не толькі Беларусі, але і Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі. Горад, можна сказаць, гартаваў і фарміраваў яго як асобу, стаў месцам яго штодзённага быцця. Урбаністычная тапанімія ўвайшла ў яго свядомасць, біяграфію і творчасць. Урбанізм як спосаб мыслення не быў для Цішкі Гартнага чымсьці выпадковым, гэта з’ява бачыцца ментальна блізкай пісьменніку, які адметна ўвасобіў тэму і паэтыку горада.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Александровіч С.* Цішка Гартны // Гартны Ц. Збор твораў : у 4 т. Мінск : Маст. літ., 1987. Т. 1 : Вершы, 1909–1935; Апавяданні, 1909–1927. С. 6–26.

2. *Бельскі А.* «О, горада чароўныя прынады!» : станаўленне ўрбаністычнага мыслення ў беларускай паэзіі // Роднае слова. 2015. № 1. С. 3–6; № 3. С. 17–20.

3. *Гартны Ц.* Ад Берліну да Мінску : (з цягніка) // Сав. Беларусь. 1922. 3, 9, 14–17, 20 вер., 4 кастр.

4. *Гартны Ц.* З цыклю «Горад» // Полымя. 1924. № 2 (10). С. 27–28.

5. *Гартны Ц.* Збор твораў : у 4 т. Мінск : Маст. літ., 1987. Т. 1 : Вершы, 1909–1935; Апавяданні, 1909–1927. 438 с.

6. *Гартны Ц.* Урачыстасць. Менск : Дзяржвыд. Беларусі, 1925. 101 с.

7. Литературная энциклопедия : в 11 т. / редкол.: П. И. Лебедев-Полянский, И. М. Нусинов; гл. ред. А. В. Луначарский. М. : Худож. лит., 1939. Т. 11. 824 стлб.

8. *Рагойша В. П.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд., дапрац. і дап. Мінск : Беларус. навука, 2004. 576 с.

9. Словарь литературоведческих терминов / ред.-сост. Л. И. Тимофеев и С. В. Тураев. М. : Просвещение, 1974. 509 с.

10. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1987. Т. 5. 703 с.

ЗАХАД І УСХОД У ТВОРЧАСЦІ ІГАРА БАБКОВА

В.У. Барысенка

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт,
вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
volga.volha1964@gmail.com

Традыцыя ўспрымання арыентальнага як «іншага», чужога пераважае ў еўрапейскім светаўспрыманні да сённяшняга дня. Пры гэтым, яшчэ з канца XX ст. еўрапейская літаратура пачала асэнсоўваць новыя полікультурныя падыходы. Ігар Бабкоў, распрацоўваючы інтэлектуальна-метафізічную плынь, прыўносіць у скарбонку сучаснай беларускай літаратуры пэўную экзістэнцыйную вобразнасць, шматлікія алюзіі буддысцкай і індуісцкай філасофіі. Гэта ўяўляе сабой своеасаблівы мастацкі дыялог двух модусаў, паэтычнага і філасофскага.

Ключавыя словы: арыентальная вобразнасць; філасофскі; метафізічны; антычная міфалогія; філасофія Усходу.

На працягу ўсёй гісторыі ўзаемадачынення еўрапейскіх краін з цывілізацыяй Усходу пераважала традыцыя ўспрымання арыентальнага як «іншага», чужога і ў пэўнай меры другаснага. З часоў французскай рэвалюцыі пачалося сістэмнае вывучэнне тэкстаў літаратуры Усходу, якое не было аб'ектыўным, а працавала на каланіяльны палітычны пастулат пра перавагу еўрапейцаў над азіятамі . Нягледзячы на кардынальныя сацыяльна-палітычныя змены ў краінах Усходу, адносіны еўрапейцаў амаль не змяняліся. Эдвард Саід, амерыканскі вучоны і грамадскі дзеяч палесцінскага паходжання, адным з першых пачаў крытыкаваць такія старыя падыходы. Ягоная праца «Арыенталізм», выдадзеная ў 1978 г., сталася падмуркам для перагляду кірункаў навуковых даследаванняў па арыенталістыцы. Саід назваў арыенталізм «сістэмай ідэалагічных выдумак». Такім чынам, у навуцы тэрмін «арыенталізм» становіцца сінонімам стэрэатыпнага мыслення, а ў грамадстве – стэрэатыпнага дзеяння і, такім чынам, носіць асабліва адмоўнае адценне. «Проціпастаўленне Усход – Захад на працягу доўгага часу было галоўным цывілізацыйным ідэнтыфікатарам. Сёння межы паміж найбуйнейшымі цывілізацыямі свету размываюцца, а гэта, як мяркуюць многія даследчыкі, пагражае стратай ідэнтычнасці не толькі Захаду, але і Усходу. У той жа час ва ўмовах глабалізацыі праблема навуковага ўзаемаразумення і ўзаемадзеяння пры несумненнай адмове ад прадузятасцяў і стэрэатыпаў становіцца асноўнай» [4, с. 80].

Еўрапейская літаратура таксама пачала асэнсоўваць новыя полікультурныя падыходы. Паэты адлюстроўвалі патрэбу грамадства ў філасофска-тэарэтычным асэнсаванні анталагічных і гнасеалагічныя асноў гэтага складанага працэсу, яго этыка-аксіялагічных і сацыяльна-псіхалагічных аспектаў.

Ігар Бабкоў распрацоўвае інтэлектуальна-метафізічную плынь у беларускай паэзіі. Філасофская адукацыя, несумненна, наклала адбітак на мастацкія пошукі пісьменніка і пэўным чынам вызначыла ўнікальнасць і непаўторнасць творчасці. Сам Бабкоў гаворыць, што ўвогуле выпадае з любога кантэксту. Першая кніга «Solus Rex», якая была выдадзена ў 1986 г., была ўзнагароджана прэміяй «Гліняны Вялес» у 1993 г., была сустрэта крытыкамі неадназначна. І. Бабкоў абапіраўся на традыцыі інтэлектуальна-метафізічнай плыні заходнееўрапейскай і амерыканскай паэзіі. Паэт назірае глыбокі крызіс сучаснага грамадства, наступае «мізэрная эпоха». (Дарэчы, гэтая метафара адсылае нас да творчасці Ф.Гёльдэрліна). Ужо першы верш зборніка паказвае нам апакаліптычную карціну:

За небакраем Еўропы: у акопах заціхла туга
Людзі, нібыта пасля хлараформу, жывуць-паміраюць
Ціхае літанне: НЕ СПАЦЬ
Цёмныя, начныя словы на паперы згараюць
Кроплямі маляванага раю сцякаюць з-пад рук… [3, с. 5].

Сапраўдная культура саступае месца культуры масавай, чалавека перамагаюць тэхналогіі. Асоба чалавека нівелюецца, творчасць становіцца небяспечнай, недарэмна мы бачым вобраз царства памерлых. У кнізе шмат вобразаў антычнай міфалогіі, але адно з цэнтральных месцаў займаюць алюзіі Арфея і Эўрыдыкі. Незадаволенасць навакольным светам штурхае паэта да пошукаў месца сілы, дзе герой можа быць уладаром «прасторы і часу, нябеснай мілаты прыязных рэчаў».

На пошукі сапраўднага дому адыходзіць ён
Апрача восені згаданай і неба вачніц
Апрача пошату азяблых рамёнаў
Апрача воглых крокваў старых камяніц…[3, с. 7].

Альтэрнатывай мёртваму еўрапейскаму гораду, «царству Аіда» для паэта становіцца філасофія і літаратура Усходу. Большасць праблем, якія імкнецца і не можа вырашыць еўрапеец, усходняя філасофія нават не заўважае або знаходзіць для іх самае неверагоднае і лёгкае выйсце. Цэнтральным для кітайскай філасофіі з’яўляецца канцэпт адзінства Інь і Янь. Ніводная з частак цэлага не ацэньваецца, не нясе канфлікту паміж дабром і злом, што прыводзіць да спакойнага сузірання, ураўнаважанасці. У даасізме цэнтральнае месца займае так званае «не-дзеянне» (у-вэй), якое мае на ўвазе не бяздзейнасць, бязвольнасць і апатыю, а уважлівасць, спакой і волю. У вершах «Кавярня» і «Пакінуць крышку пустаты» наратар аспрэчвае неабходнасць падпарадкавання чалавечага жыцця нейкай хай сабе і высокай мэцэ.

Пакінуць крышку цішыні
Сярод затлумленага свету

Цяплом аспрэчваючы мэту
Халаднатворнай вышыні [3, с. 25].

Вышыня як мэта жыцця ў І. Бабкова халаднатворная. Думка перагукваецца з ідэяй будызму, у якім сцвярджаецца ілюзорнасць быцця і неабходнасць усведамлення гэтай ілюзорнасці як першага кроку на шляху да духоўнага вызвалення.

… жыццё – сон
словы – сон
у рызманах ночы
вуснамі вусны шукаю
але
здаецца
сусвет [3, с. 79].

У сваім эсэ «Цывілізацыя заходняга будызму» І. Бабкоў адразу адмаўляе сябе як прапаведніка будызму. «Пра будызм я анічога ня ведаю. Таму мае словы ня будуць ведай пра будызм. Чым яны будуць, я таксама ня ведаю. Магчыма, яны нагадаюць камусьці аблокі, якія павольна плывуць у вышыні. Калі аблокі зьнікаюць, застаецца чыстае, яснае неба, і мы разумеем: гэтае неба, якое хавалася пад аблокамі, і ёсьць будызм. <…>

Такім чынам, пра Заходні будызм можна сказаць па-рознаму. Напрыклад:

Вечнасьць – гэта неба, быцьцё і аблокі.

Альбо:
Аблокі – гэта лета, будызм і сьвядомасьць.

Альбо:
Сьвядомасьць – засохлая кветка на старонках вершаў пра лета
Ці нават:
У чыстым заходнім небе няма буды Амітабхі» [4, с. 191]

У сваёй пазнейшай творчасці І. Бабкоў працягвае выкарыстоўваць арыентальныя матывы і алюзіі. Ён нават пачынае перакладаць старажытнакітайскія тэксты. А адзіны раман «Адам Клакоцкі і ягоныя цені. Раман у дзесяці гісторыях» аўтар прэзентуе як практычны дапаможнік па «кітайскай гульні ў Інь і Янь» [1, с. 4]. У даасізме вельмі важным з’яўляецца не столькі Даа (Шлях), пра які нельга сказаць нічога пэўнага, колькі Тай Чы (Вялікая Мяжа). Квінтэсэнцыя даоскай мудрасці – існаванне на мяжы, прысутнасць у размежаванні і зліцці свайго і чужога, сустрэчы Інь і Янь. І. Бабкоў не лічыць гэтую філасофію спецыфічна кітайскай, сцвярджаючы яе актуальнасць для інтэлектуальных пошукаў Еўропы. Мяжа як філасофскі канцэпт прысутнічае ў многіх творах пісьменніка. І. Бабкоў сцвярджае, што культура – гэта не космас, не ўніверсум, а родны кут, непазбежна свой і

непазбежна абмежаваны. Ды і ўвогуле культура паўстае, фарміруецца на мяжы, у змаганні размежавання-адмежавання і імкнення перайсці сваю мяжу, выйсці за кардон. Не дарэмна, І. Бабкоў сучаснасць называе эпохай транскультурнасці. «Культурная трансцэндэнцыя, несупадзенне культуры (і культураў) са сваёй прастора-часавай лакалізаванасцю, размытыя практыкі культурных трансгрэсіяў – выхаду культураў на свае межы – у прастору іншых культураў альбо ў прасторы, якія кожная эпоха пазначае для сябе як акультурныя» [2, с. 114].

У 2017 г. у Лятучым універсітэце Ігар Бабкоў і Уладзімір Мацкевіч вялі семінар “Нараджэнне беларускага арыенталізма з … духа паэзіі”. Сцвярджалася, што еўрапейскі арыенталізм паўстаў у XIX ст., дзякуючы развіццю навукі і цывілізацыі ў цэлым. Цікавасць беларускага грамадства да Індыіі і ўвогуле Усходу распачалася ў эпоху постмадэрнізму з незадаволенасці класічнымі каштоўнасцямі. Недарэмна ў пачатку XXI ст. пачынаюць перакладаць Бхагаватгіту на беларускую мову.

Экзістэнцыйная вобразнасць паэзіі І. Бабкова, шматлікія алюзіі буддысцкай і індуісцкай філасофіі ўяўляюць сабой своеасаблівы мастацкі дыялог двух модусаў, паэтычнага і філасофскага. Метафізічнае паўстае ідэяй сінтэзу ідэальнага і матэрыяльнага: вобразы сну як ідэальнага і горада як матэрыяльнага. Можна ўбачыць, як І. Бабкоў па-свойму яднае і інтэрпрэтуе філасофскія ідэі Хайдэгера і вучэнне Будды, ствараючы яшчэ і інтэртэкстуальны дыялог.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Бабкоў І. М.* Адам Клакоцкі і ягоныя цені. Мінск : БАС, 2001. 107 с.
2. *Бабкоў І. М.* Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнні ру[і]наў. Мінск : Логвінаў, 2005. 140 с.
3. *Бабкоў І. М.* Solus Rex. Мінск : Маст. літ., 1992. 79 с.
4. *Бабкоў І. М.* Цывілізацыя Заходняга будызму // Дзеяслоў. 2003. № 4. С. 191–192.
5. *Кошелева Н.В.* «Ориентализм» Эдварда Саида // XXI век : актуальные проблемы исторической науки : Материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / редкол.: В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2004. С. 78–80.

МАСТАЦКІЯ ПАДЫХОДЫ ДА АДЛЮСТРАВАННЯ ТЭМЫ КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫХ ЛАГЕРАЎ У РАМАНЕ “КАРТАТЭКА ЖЫВАХ” ЧЭШСКАГА ПІСЬМЕННІКА НОРБЕРТА ФРЫДА

А. У. Вострыкава

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К.Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
vostrikova72@mail.ru

У артыкуле аналізуюцца мастацкія адметнасці рамана чэшскага пісьменніка XX стагоддзя Норберта Фрыда “Картатэка жывых”, які з’яўляецца самым паспяховым у спадчыне названага творцы. Прасочваецца адметнасць твора ў кантэксце чэшскай літаратуры, прысвечанай тэме Другой сусветнай вайны, а таксама месца рамана сярод іных празаічных сачыненняў Фрыда. Аналізуецца сістэма вобразаў, ідэйна-тэматычныя і мастацкія падыходы слыннага пісьменніка да тэмы канцэнтрацыйных лагераў. Робяцца высновы пра тое, што апісанне чалавечай псіхалогіі і шматлікія лёсы вязняў – аснова рамана Норберта Фрыда “Картатэка жывых”. Асобая ўвага надаецца аўтабіяграфічнасці, якая становіцца знакавым складнікам мастацкага поля твора. Акцэнтуюцца драматызм і эмацыянальнае напружанне, створаныя Фрыдам у “Картатэцы жывых”.

Ключавыя словы: чэшская літаратура XX стагоддзя; Н. Фрыд; раман «Картатэка жывых»; тэма канцэнтрацыйных лагераў; сістэма вобразаў; аўтабіяграфічнасць.

У творчасці чэшскага пісьменніка Норберта Фрыда (1913–1976) раман «Картатэка жывых» (1956) з’яўляецца самым вядомым і паспяховым творам аўтара. Яго вельмі пазітыўна прыняла тагачасная чэшская літаратурная крытыка [Гл.: 4, 6, 10], а сам твор быў перакладзены на многія мовы свету. Для чэшскага аўтара тэма Другой сусветнай вайны стала магістальнай, і ёй так ці інакш прысвечаны амаль трыццаць кніг, якія даследчыкі ўмоўна падзяляюць на чатыры групы. Да першай адносяць прозу рэпартажнага жанру, якая стала вынікам падарожжаў па розных чужых краінах (Мексіка, Гватэмала), паколькі сам Фрыд пэўны час працаваў аташэ па культуры ў пасольстве Мексікі. Другая група – творы прыгодніцкага жанру. Трэцюю ствараюць празаічныя кнігі пра будзённае жыццё сучаснікаў Норберта Фрыда. І ўрэшце, апошняя група, куды і ўваходзіць раман “Картатэка жывых”, а таксама трохчастковая сямейная хроніка «Апошнія сто гадоў» (1966–1971), якую ён пісаў як сагу свайго роду і дзе трэцяя частка таксама прысвечана адлюстраванню аўтабіяграфічнага вопыту пісьменніка, які сам быў вязнем канцэнтрацыйных лагераў у гады Другой сусветнай вайны. Але ў трылогіі гэта тэма ўводзіцца метадамі мемуарнай літаратуры, у адрозненне ад рамана «Картатэка жывых», жанр якога можна вызначыць як дакументальна-псіхалагічны, бо аўтар ў мастацкай форме сведчыць пра тыя злачынствы перад чалавецтвам, якія здзяйсняліся фашысцкімі карнікамі.

Трэба падкрэсліць, што тэма канцэнтрацыйных лагераў была адной з цэнтральных у чэшскай літаратуры пра Другую сусветную вайну [7, с. 513]. Да яе звярталіся такія пісьменнікі, як М. Ярыш, К. Бенеш, Э.Ф. Бурыян, А. Лусціг, Ф. Пяроўтка, Ф. Краўс, Ё.Кладзівы і нек. іншыя. Першую хвалю ваеннай тэмы ў чэшскай прозе адразу пасля 1945 г. складала літаратура дакументальнага жанру, якая сёння не вельмі запатрабаваная і чытаемая. Концлагерная проза ўзнікла пазней як адлюстраванне вельмі сумнага і трагічнага вопыту чэшскай нацыі. Яна была блізкая творам, дзе быў апісаны вялікі чалавечы калектыў, яго псіхалогія, настрой і памкнені, як гэта было ў творах М. Пуйманавай, А. Бранальда, К. Птачніка. Таксама падобныя чэшскія творы могуць быць разгледжаны ў рэчышчы іншых еўрапейскіх і славянскіх літаратур, дзе тэма канцэнтрацыйных лагераў таксама была запатрабаванай і прадстаўлена ў творчасці многіх польскіх, славацкіх, рускіх, нямецкіх аўтараў. «Хаця да жыцця вязняў фашысцкіх лагераў звярталіся пісьменнікі многіх краін, Фрыд падыйшоў да гэтай тэмы па-свойму» [1, с. 124] – зазначаюць рускія літаратуразнаўцы. На новы ракурс разгляду ваеннай тэмы Норбертам Фрыдам ў тагачаснай чэшскай літаратуры ўказвае і чэшскі даследчык З. Кожмін [Гл.: 9]. Апісанне чалавечай псіхалогіі і шматлікія лёсы вязняў – аснова рамана Норберта Фрыда «Картатэка жывых».

Раман адлюстроўвае жыццё чэхаў ў нямецкім канцэнтрацыйным лагеры ў канцы вайны. Дзеянне адбываецца ў выдуманым пісьменнікам канцэнтрацыйным лагеры Гіглінг 3 у апошнія месяцы 1944 г., таму перажыты вопыт і мастацкая фікцыя гарманічна і ўдала спалучаюцца пісьменнікам, пра што гаворыць слынны чэшскі літаратуразнаўца Ф. Бурыянэк [3, с. 17].Тэкст падзелены на тры часткі і кожная з іх мае шэраг падраздзелаў, у якіх вылучаюцца, у сваю чаргу, яшчэ больш дробныя структурныя адзінкі. Дзякуючы такой кампазіцыі аўтар здолеў паказаць лагернае і быццё, і быт вельмі шматбакова, ўвёў у вобразную сістэму вялікае мноства персанажаў. Вобразы жорсткіх і бесчалавечных эсэсаўцаў і іх ахвяр, вобразы здраднікаў і герояў, мужчын і жанчын, немцаў і чэхаў, прадстаўнікоў розных іншых еўрапейскіх народаў, крымінальнікаў, якія здзекуюцца над людзьмі, жывуць у разбэшчанасці і якіх фашысты скарыстоўваюць у сваіх мэтах. Ніводны з вобразаў не з’яўляецца схемай. Прапісаны і прапрацаваны вельмі грунтоўна нават другасныя і эпізадычныя персанажы.

Самая значная ўвага надаецца галоўнаму герою Здэнеку Роўбіку, маладому пражскаму інтэлектуалу, кінарэжысёру, які ў Гіглінгу займае пасаду памочніка лагернага пісара. Здэнек адказвае за лагерную картатэку, так званую “скрыню жывых”. Менавіта гэтая акалічнасць і вынесена ў назву твора. Мы бачым эвалюцыю героя, які напачатку забіты, сумны, зачынены для людзей і свету ў сваіх унутраных перажываннях і праблемах, асабістых нягодах і ўспамінах. «Зденек был раздавлен, стал бесчувственной вещью,

одной из многих, которые можно сотнями грузить в вагоны и разгружать, возить повсюду, толкать, запугивать, морить голодом и бить. Но когда у Зденека бывали проблески самостоятельного мышления, у него возникало желание выставить локти, отталкивать всех и пробиваться куда-то самому. Кто сказал, что в минуты опасности человеку хочется быть на людях? Зденек не замечал ничего подобного, по крайней мере у себя. Наоборот, чем больший гнет испытывали заключенные, тем сильнее Зденек стремился обособиться от запуганного человеческого стада… Уж лучше одному…Выбраться одному или подохнуть в одиночку, да, да, в одиночку. Он был давно готов к смерти. Жизнь в нем поддерживало, видимо, лишь едва теплившееся, но неистребимое любопытство. Уж если погибнуть, то погибнуть последним, не допустить, чтобы это перепуганное стадо пробежало по тебе, суметь в последний раз оглявуться, увидеть собственный конец…» [2, с. 15]. Недзе ён індывідуаліст і нават эгаіст. Паступова Здэнек пазбаўляецца ад душэнай апатыі, пасіўнасці і пачынае дапамагаць іншым, становіцца ўдзельнікам падпольнай арганізацыі, знаходзіць у сабе сілы перажыць свае няшчасці, смерць брата Іржы, з якім ён сустракаецца ў концлагеры і толькі там, перад смерцю Іржы адбываецца іх прымірэнне, бо па жыцці яны былі антыподамі («Тебе-то хорошо, – шепчет младший брат. – Я тебе завидую. В жизни ты шел прямым путем, тебе стыдиться нечего. – Ничего ты не знаешь, – старший погладил брата по руке. – Я вечно дрался, это верно. Но доволен жизнью я бывал редко. Знаешь ты, что я всегда тебе завидовал. Тебя мать любила больше. – Нет, нет, это неверно, Иржик. Тебя она любила во стократ сильнее, честное слово! Но ты был своенравный, все делал ей наперекор. Они опять замолчали. Кругом хрипло дышали спящие. В памяти братьев проходило всё пережитое. – Жаль, что нам так мало довелось быть вместе, – сказал один. – Легче было бы понять друг друга…– Неверно, – возразил другой. – Мы никогда не были одиноки. Мысленно я всегда вел и вас с собой – отца, маму, тебя. Куда бы я ни шел, я всегда был с вами.– В самом деле? А я нет, – признался младший. – Эгоист, всегда думал только о себе… Но я был уверен, что ты думаешь о нас еще меньше. Иржи усмехнулся. – Ошибся. Брат положил свою руку на его. – Больше этого не будет. Мы все-таки теперь вместе») [2, с. 292].

Таксама Норберт Фрыд падае ў рамане цэлую галерэю вязняў з розных еўрапейскіх краін, большасць якіх жыдоўскага паходжання. Усе гэтыя персанажы адрозніваюцца сваім становішчам у лагеры і характарызуюцца індывідуальна чэшскім аўтарам, падрабязна вымалёўваюцца іх псіхалагічныя характарыстыкі. Гэта прадуманыя чэшскім пісьменнікам вобразы, а не проста “прахадныя” героі. «Сапраўднае рэалістычнае майстэрства Фрыда праяўляецца ў тым, што кожны чалавек гаворыць, дзейнічае, думае так, як гэта ўласціва толькі яму, што ў кожным яго целаруху падаецца нешта непаўторна індывідуальнае» [1, с. 125]. Асобную групу вобразаў складаюць эсэсаўцы Копіц, пісар Фрош, вязні-немцы Хорст,

Карлхен, Фрыц і Берл. Сярод персанажаў таксама можна асоба вылучыць чэхаў Ярду, Мірэка і Гонзу, грэка Фрэда, французаў Гастона і Жожо, венгерскага лекара Шімібачы, іспанца Дыега, венгерак Юлішку і Беа. Фрыд ў рамане падрабязна падае нам будзённае жыцё гэтых людзей, іх узаемныя адносіны, працу, пакуты. Аўтар пазбягае адназначнасці ў падачы вобразаў, няма толькі "чорных" альбо цалкам "белых" герояў, калі казаць пра вязняў і іх надзіральнікаў. Гэта шматгранныя, са сваімі станоўчымі і адмоўнымі рысамі людзі, якія могуць мець унутраныя ваганні і душэўную няўпэўненасць. Нават станоўчыя героі надзяляюцца некаторымі адмоўнымі рысамі і наадварот. Так, хітры пісар Эрых Фрош умее дамовіцца і ладзіць з гестапаўцамі, але часта гэта ідзе на карысць вязням канцлагера. Альбо высакародныя урачы, якія дапамагаюць і ратуюць здароўе і жыцці многім зняволеным, паказаны не пазбаўленымі часта разгубленасці альбо апалітычнасці. Так, адзін з іх, Оскар, звяртаецца да ўрача-камуніста з такімі словамі: «Ты себя уговорил, что знаешь, что хорошо и что плохо, и этим ты руководствуешься в своих поступках. А я вот думаю, что никто не может этого безошибочно знать. Я не так тщеславен, но и не так ограничен, как ты. Я признаюсь, что иду на ощупь. Прежде я всегда думал, что, став врачом, легко избавлюсь от всякого правдоискательства: помогай жизни побеждать смерть, вот и все. Но знал бы ты, Фредо, сколько раз я уже помог смерти против жизни. Никогда не прощу себе, например, того, что в Варшаве я спас жизнь Эриху. Эта жаба воплощенная смерть» [2.с.58].

У творы шмат драматычных сцэн, поўных эмацыянальнага напружання. Чытач атрымлівае поўнае ўяўленне пра расклад лагернага рэжыму, падрабязнасці быту, пра тое, як там існавалі людзі, як праяўляліся чалавечыя парокі і слабасці. Можна казаць пра жыццёвую даставернасць і нават натуралізм апісанняў у творы пісьменніка, які сам прайшоў праз некалькі концлагераў. Мы бачым бруд баракаў, босых вязняў, якія зімой стаяць на снезе, пабоі, эпідэмію сыпнога ціфа, якую мужна спрабуюць спыніць урачы і якую хочуць "замаўчаць" і скрыць лагерныя начальнікі. Але раман «Картатэка жывых» напісаны не як раман жахаў, не як раман факту, а перш за ўсё як псіхалагічны раман, дзе шмат вострых сюжэтных сітуацый і галоўны акцэнт робіцца на псіхалагічным увасабленні характараў персанажаў, на адлюстраванні ўнутранага свету герояў. Псіхалагічнаму аналізу падлягаюць у рамне як вязні гітлераўскага канцлагера, так і іх каты. «Вера ў чалавека складае галоўны пафас рамана Фрыда» [1, с. 125]. Паказваецца падаўленне і ўціск чалавечай асобы, растленне ўсяго добрага і чалавечага ў фашысцкіх лагерах Другой сусветнай, але і тое, што гэтаму можна супрацьстаяць, з гэтым можна змагацца і захаваць гуманістычны пачатак у неймаверна цяжкіх умовах. Можна сцвярджаць, што як раз захаванне чалавечай годнасці і высакароднасці, пазітыўных маральных якасцей – такая лінія акцэнтуецца ў станоўчых персанажах рамана. Пісьменнік паказвае, што ў нечалавечых, фізічна і маральна, умовах

мужнасць і самаадданасць дазваляюць стварыць калектыў і аказаць супраціўленне машыне падаўлення.

Раман, як ужо згадвалася, аўтабіяграфічны. Сам Норберт Фрыд прайшоў вязнем праз засценкі Тэрэзіна, Асвенцыма і Дахаў. Там ён страціў бацьку, жонку і малодшага брата, дарэчы яму чэшскі пісьменнік прысвяціў свой паэтычны зборнік «Брат Ян» (1945). Герой рамана «Картатэка жывых» Здэнек таксама пакідае ў Тэрэзіне цяжарную жонку Ганку: «После того, как его увезли из Терезина, он потерял всякий интерес к людям. Закрывая глаза, он отчетливо представлял себе Ганку: казарменное окно и в нем ее маленькое лицо с темными пятнами от беременности; Ганка не хочет плакать, заставляет себя улыбаться, ее маленькая рука машет кусочком красной ткани. Эта сцена разлуки погасила в Зденеке всякий интерес к внешнему миру» [2, с. 15]. Аднак раман становіцца не толькі сведчаннем пра перажытае, але і папярэджаннем для сучаснікаў і нашчадкаў. Гэта падкрэслівае ў сваіх даследаваннях Ф. Бурыянэк [Гл. 5]. Можна вылучыць у ім і філасофскае асэнсаванне падзей, у якім прысутнічае аб'ектыўнае бачанне рэальнасці і гуманістычная пазіцыя аўтара, на што ўказвае чэшскі крытык С. Влашын [11, с. 34]. Фрыд упэўнены , што нават у нялюдскіх умовах канцэнтрацыйнага лагера можна супрацьпастаяць злу сваімі паводзінамі, актыўнасцю, салідарнасцю з іншымі вязнямі і калектывізмам. Гэтая пазіцыя ўвасоблена ў вобразах герояў рамана. «У гэтай глыбока варожай чалавеку, напружанай, удушлівай атмасферы, дзе ўсё зроблена дзеля таго, каб задавіць, зацiснуць чалавека, абудзіць у ім усё дрэннае, вынішчыць яго спачатку маральна, а потым і фізічна, дзейнічаюць жывыя людзі ва ўсёй іх індывідуальнай складанасці» [1, с. 124]. І яны перамагаюць абставіны. Аднак трэба заўважыць, што аўтар пазбягае ў сваім аповядзе пафасу і высокіх слоў. Ён акцэнтуе ўвагу на розных дэталях, якія могуць мець сімвалічнае значэнне. Напрыклад, нейкія рэчы для вязняў сімвалізуць блізкае вызваленне, родных людзей і шчаслівае мінуле, таму яны хаваюць іх пад пагрозай для свайго жыцця. Вялікая ўвага надаецца такім прыёмам адлюстравання персанажаў, як аналіз іх пачуццяў і разважанняў (вобраз Здэнека), падрабязнае апісанне іх слоў і паводзін (Фрош і многія іншыя). Такім чынам аўтар раскрывае ўнутраны свет сваіх герояў. Асноўную частку мастацкай тканіны рамана складаюць дыялогі-размовы вязняў, эсэсаўцаў, праз іх Фрыд характарызуе сваіх персанажаў. У выніку чытаць выразна можа сфармуляваць ідэйную пазіцыю кожнага персанажа, гэта таксама вылучае раман Фрыда сярод твораў лагернай тэмы, паколькі апісваюцца не проста жахі концлагернага жыцця, экзістэнцыяльныя, фізічныя пакуты людзей, а даецца светапоглядная арыентацыя кожнага і мы дакладна разумеем стаўленне да яе самога аўтара і суаднесенасць яе ў сістэме каардынат маралі, дабра і зла, станоўчага і адмоўнага. Знакі "плюс-мінус" чэшскім пісьменнікам расстаўлены і яны не пярэчаць сучасным падыходам да тагачасных падзей. У XXI стагоддзі кніга не састарэла, яна чытаецца з

вялікай цікавасцю, дзякуючы дынаміцы апісаных падзей, мноству жывых дыялогаў, глыбіні псіхалагічнага пранікнення ў душы сваіх персанажаў, створанай вялікай галерэі вобразаў прадстаўнікоў розных народаў і розных сацыяльных груп. Пра вялікі рэзананс і запатрабаванасць рамана сведчыць і перавыданне твора на рускай мове ў 2008 г. пасля першага выдання 1958 г. у перакладзе Ю. Малачкоўскага.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Бернштейн И., Олонова Э.* Современный чешский и словацкий роман. М. : Изд-ва АН СССР, 1962. 172 с.
2. *Фрид Н.* Картотека живых. Москва, 2008. 303 с.
3. *Burianek F.* Prožitá skutečnost a umělecká fikce / Ohlednuti. Praha, 1978. 260 s.
4. *Burianek F.* Velky umělecky přínos / O současné české literatuře. Praha, 1982. 345 s.
5. *Burianek F.* Norbert Fryd / O současné české literatuře. Praha, 1982. 345 s.
6. *Jelinek A.* Krabice živych. RP 6.9.1956.
7. *Haman A.* O tak zvané "druhé vlně" valečné prozy v naší literatuře. 1961. Č. 4. S. 513.
8. *Norbert F.* Krabice živych. Praha. 1956. 437 s.
9. *Kožmin Z.* Od vyjevu k ovjevům. Plamen, 1963. Č. 4.
10. *Valja J.* Vyzrály koncentráčnícky román. Hlas revoluce. 1956, č. 11.
11. *Vlašín S.* Lahvová pošta lidskosti / Ve škole života. Praha, 1980. 184 s.

МОНОДРАМА В СОВРЕМЕННОЙ ДРАМАТУРГИИ (РУССКО-БЕЛОРУССКИЙ КОНТЕКСТ)

С. Я. Гончарова-Грабовская

Белорусский государственный университет,
ул. К.Маркса, 31, 220030, г. Минск, Республика Беларусь,
goncharova_s@tut.by

В современной жанрологии монодрама заняла полноправное место как в русской (Е. Гришковец, Н. Коляда, В. Леванов, Я. Пулинович, О. Михайлова и др.), так и белорусской (Е. Попова, Д. Богославский, П. Пряжко, А. Иванюшенко, Н. Халезин, Д. Балыко, В. Ольховская и др.) драматургии. Ее жанровая специфика исследована недостаточно глубоко. Предлагается новая классификация монодрамы, основанная на *субъектно-объектных отношенях* (автор - герой). В первом случае *автор и герой – одно лицо.* Драматург выступает в роли *alter ego героя*, одновременно исполняя роль повествователя (нарратора). Во втором, повествование ведется от лица героя, но *автор и герой – не одно лицо.* Как правило, герой рассказывает о себе, своем состоянии, пережитом моменте в жизни, обращаясь к «скрытому» собеседнику. Первая модель (автор и герой одно лицо) характерна многим монодрамам Е. Гришковца, Е. Поповой, П. Пряжко и др. Вторая (*автор и герой не одно лицо*) чаще встречается в творчестве Л. Леванова, Д. Богославского, Я. Пулинович, В. Ольховской. Безусловно, современная монодрама отличается от монодрамы начала XX века, она сохранила жанровый канон, но модифицировала многие признаки под влиянием художественной системы и авторской индивидуальности драматурга. По сравнению с монодрамами Н. Евреинова она упростила действие до монологического дискурса, придав ему больше эстетической

свободы, граничащей с экспериментом. Стремление передать «рассказ» о жизни в форме монодрамы обусловило тенденцию эпизации драматической структуры.

Ключевые слова: монодрама; русская и белорусская драматургия; автор; герой; субъектно-объектные отношения.

В жанрологии современной драматургии монодрама заняла полноправное место. Она заявила о себе в пьесах Е. Гришковца («Как я съел собаку», «ОдноврЕмЕнно», «Планета» и др.), Н. Коляды («Американка, «Шерочка с машерочкой, «Родимое пятно» и др.), В. Леванова («Смерть Фирса», «Прощай, настройщик», «Что значит заслонить?» и др.), Я. Пулинович («Наташина мечта», «Победила я», «Как я стал» и др.), В. Славкина («Стрижка»), О. Михайловой («Пельмени»), А. Слаповского («Елочка»), А. Печейкина («Соколы»). Этот список можно продолжать, так как проявили себя в этом жанре не только известные драматурги, но и начинающие (А. Донатова, В. Зуев, О. Иванова, Е. Кузнецова, А. Чичканова и др.).

Не были исключением и белорусские драматурги («Наблюдатель», «Портрет из реплик и монологов» Е. Поповой, «Руки» Д. Богославского, «Хозяин кофейни», «Три дня в аду» П. Пряжко, «Мне бы хотелось обрести свободу» А. Иванюшенко, «Поколение Jeans» Н. Халезина, «Я пробью эту стену» В. Мороз, «Pine Bar» Д. Балыко, «Жизнь на Марсе» В. Ольховской и др.). О том, что монодрама стала популярной, свидетельствует и конкурс «Монодрама-2019», победителями которого явились Влада. Ольховская (Беларусь), О. Болычева, Е. Ерпылева (Россия). По итогам конкурса издан сборник «Монодрама 2019», куда включены лучшие пьесы.

В литературоведении монодрама изучена недостаточно глубоко. Интерес к ней был проявлен еще в начале XX в. и отражен в работах Н. Евреинова, А. Кугеля, Вяч. Иванова, А. Белого. Н.Евреинов не только написал «Введение в монодраму» (1909), но и пьесы этого вида («Представление любви», «В кулисах души», «Бедной девочке снилось»). Он представлял монодраму как «новую архитектонику драмы», способную вытеснить устаревшую структуру классической пьесы [4, с. 2]. По его мнению, монодрама, «стремясь наиболее полно сообщить зрителю душевное состояние действующего лица, являет на сцене мир таким, каким он воспринимается действующим в любой момент его сценического бытия» [1, с. 8]. При этом зритель видит окружающий мир глазами героя, а герой видится зрителям таким, каким он кажется себе в тот или иной момент. А. Кугель уточнял, что монодрама дает право каждому видеть изображаемое на сцене по-своему [5, с. 196-201]. Важную черту в этом виде драмы отметил Вяч. Иванов: он акцентировал внимание на субъективном мировидении драматурга, его личности и душевной судьбе [3, с. 284].

В конце XX –начале XX1 вв. произошло дальнейшее осмысление жанровой специфики монодрамы. Безусловно, современная монодрама

отличается от монодрамы начала XX века, она сохранила жанровый канон, но модифицировала многие признаки под влиянием художественной системы и авторской индивидуальности драматурга. По сравнению с монодрамами Н. Евреинова она упростила действие до монологического дискурса, придав ему больше эстетической свободы, граничащей с экспериментом.

Среди современных исследований следует огтметить и работы Н.А. Агеевой, в которых монодрама относится к жанровым вариантам драмы (поджанр / субжанр), излагается коммуникативный подход к монодраматическому тексту (апеллятивная, медитативная, декларативная модальность высказывания) [1, с. 9–10].

Мы предлагаем свою классификацию монодрамы, основанную на *субъектно-объектных отношенях* **(**автор - герой). В первом случае *автор и герой – одно лицо.* Драматург выступает в роли *alter ego героя*, одновременно исполняя роль повествователя (нарратора). Во втором, повествование ведется от лица героя, но *автор и герой – не одно лицо.* Как правило, герой рассказывает о себе, своем состоянии, пережитом моменте в жизни, обращаясь к «скрытому» собеседнику. Первая модель (автор и герой одно лицо) характерна многим монодрамам Е. Гришковца («Как я съел собаку», «Город», «Планета», «ОдноврЕмЕнно», «Дредноуты») [2, с. 26–31].

Так, например, сюжетную основу пьесы *«Как я съел собаку»* составляют воспоминания героя о том периоде, когда он служил во флоте. При этом субъективная переоценка объективных реалий представляется в пересказе историй и жизненных ситуаций. Драматург показывает, каким образом события жизни трансформируются в сознании героя. В памяти всплывают отдельные эпизоды, картины внезапно обрываются, сменяются, в них прошлое сочетается с настоящим. Его не заботит логика и законченность фраз, мысли, он говорит все то, что приходит ему в голову. Все выстроено на ассоциациях, спонтанной интерпретации. Здесь главную роль играет *слово*, оно движет сюжет. Экспрессия, сумбур, рефлексия пропитывают повествование, придавая ему динамику. Монолог часто переходит в скрытый диалог. И лишь в некоторых случаях, прерывая диалогическую нить, переходит на внутренний монолог-самоанализ. Форма беседы предполагает диалог, но он «условный», так как ведется на подсознательном уровне со зрителем и с самим собой. При этом субъективное настроение героя выглядит объективным. Его личный опыт кажется убедительным.

Необычна по своей монодраматической структуре и пьеса Е. Поповой *«Елена Попова: портрет из реплик и монологов»* (2019), в которой герой – alter ego драматурга выступает под маской критика Е. Мальчевской. При этом автобиографическая основа четко выражена. Сюжет монодрамы выстроен по принципу самоинтервью, внутреннего монолога автора о своем

творчестве. На первый взгляд, это критическая статья о специфике авторской индивидуальности известного белорусского драматурга. Монодраматическая структура дискретна: монологи перебиваются «псевдо-интервью», репликами, выделенными курсивом. Их органическое сочетание образует текст, в котором Я автора= Я героя. Повествование подано через призму одного человека (в данном случае автора), рассказывающего о своей творческой лаборатории, о времени и себе в этом времени. Объективированное повествование соткано из воспоминаний и критической самооценки автора-рассказчика. Структура состоит из «реплик о прошлом», о котором «некогда думать», так как слишком «современная», «реплики о первом впечатлении от студии «Юность», «реплика о гонорарах», «реплика о городе», «реплика о режиссерах» (Пинигин, Барковский), реплика «об исключениях и правилах». Эти реплики чередуются с «монологами»: монолог о Сургуте (работала там на радио), о творческом методе (лаконизм, глубина подтекста, глубина в целом ее пьес). Из монолога о творческом методе мы узнаем тайну творческой лаборатории драматурга – ученицы В. Розова. «Текст –это закрытый в песке сосуд. Начинаешь его выкапывать. Сначала только очертания проступают, но тебе надо его вытащить. Это не значит, что ты его делаешь – он есть, он есть в подсознании, существует в неком параллельном мире, и ты его должен вытащить оттуда. Иногда нужно усилие, иногда нужно время. Иногда это просто – пых! – и он сам появился. И я копаюсь, копаюсь…» [8, с. 142]. Голос Поповой-драматурга, ракурс ее мыслей, оценок органично переходит в голос журналиста, предполагаемого собеседника (под маской Е. Мальчевской), рассуждающей об особенностях пьес. Мы сталкиваемся с двумя видами модальности высказываний героя (медиативной и декларативной). Прием подачи материала от лица героя (автора) в сочетании с мнением критика (псевдособеседника), от первого лица и второго, но пропущенного через сознание первого, составляет монодраматическую модель, которая встречается не так часто.

Подобная структура присуща пьесе П. Пряжко *«Хозяин кофейни* (2010). Эпическое и лирическое в ней взаимопереплетены, так как повествование ведется от лица героя Павла Пряжко («Меня зовут павел пряжко»), являющегося alter ego автора. Драматург даже не скрывает «авторское я» под маской героя. Так даже правдивее, да и незачем. Моногерой (жанровый маркер монодрамы) мучается поиском правдивого отражения картины мира. Трогательные искренние признания, извинения, благодарность Вырыпаеву, письмо Волкострелову, рассуждения о манере писать без знаков препинания и должной орфографии, способ отражения человека (списывание с конкретного лица), метод строить текст, рассуждения об аномалии и инфантильности, желание написать о «нормальном человеке» и т. д. – все это осколочное (дискурсивное) сознание героя-рассказчика отражает постоянное движение его мысли, активизирующей сознание и читателя/зрителя. Мысль – ощущение – осознание – чувство сливаются

воедино. Эпическое повествование насыщается элементами лирической авторефлексии, превращающей автора одновременно в субъект и объект изображения. Он – носитель опыта драматурга, некая формотворческая сила, задающая себе вопросы и ищущая ответы на них. Так П. Пряжко создает фрагментарную цепочку рассуждений, формируя единое пространство. Единый мир сохраняет ощущение цельности, хотя распадается на разные дискурсивные локусы, сосуществующие в едином пространстве автора-рассказчика. Обращенный к себе дискурс предполагает актерскую форму выражения. Создается условный мир театра одного актера, на котором сосредоточено все. Экспрессия, рефлексия пропитывают повествование, придавая ему динамику. Монолог часто переходит в скрытый диалог. И лишь в некоторых случаях - на внутренний монолог-самоанализ. Разграничить «Я» героя и «Я» автора невозможно. Подобная манера письма – маска, за которой можно спрятаться обоим. И в этом случае самоирония выполняет бинарную функцию: с одной стороны, самозащиты, а с другой – критики.

Втора**я** *модель монодрамы,* учитывая *субъектно-объектные отношения* (автор – герой), когда *автор и герой не одно лицо*, представлен в пьесах В. Леванова «Прощай, настройщик», Я. Пулинович «Наташина мечта», «Как я стал», Е. Поповой «Наблюдатель», Д. Балыко «Pine Bar», К. Стешика «Яблоки», П. Пряжко «Три дня в аду», В. Ольховской «Жизнь на Марсе» и др.

Монодрама В. Леванова *«Прощай, нгастройщик!»* (2007) ассоциируется с «Лолитой» В. Набокова (В.Смирнов). В интервью драматург сказал следующее: «Думаю, у каждого мужчины есть такая история. Можно еще назвать ряд авторов. В любом случае это тоже ипостась взаимоотношений мужчины и женщины – их глобального противостояния. Что касается этой пьесы, то в ней я хотел сказать про изменение полярности, которая происходит в современном мире, когда женщина становится ведущим, а не ведомым [6, с. 2]. Повествование ведется от первого лица. Действие пьесы построено на воспоминаниях и личных чувствах к герою, ставшему объектом повествования. Монодраматическая структура дискретна: включает монологи, вставные диалоги, что типично для этого жанра. Тем не менее, она несет авторскую индивидуальность, манеру, присущую В. Леванову: глубокий психологизм, сочетающийся с достоверным характером героя-повествователя. Драматург тонко и глубоко прочувствовал состояние девушки-подростка, описав специфику ее поведения и рассуждений, поэтому можно подумать, что писала женщина-драматург. В данном случае герой не является alter ego драматурга. В. Леванов создает образ героини, убеждающий нас в правдоподобии. Действие пьесы держится на движении мысли героя-повествователя, интриге замысла героини, ведущей к неожиданной развязке. Автор проследил взросление девушки-подростка, испытавшей первую

влюбленность. Этим обусловлена декларативная модальность подачи материала. Монодраматический текст состоит из пяти частей, отделенных друг от друга паузами. Каждая из них содержит важный информационный материал, отражающий этапы встреч героини с настройщиком, подчиненных общей интриге. Диалоги и встречи с ним составляют композицию пьесы. Художественное время разомкнуто, хотя сжато рамками периода в жизни героини и движется линейно, последовательно раскрывая событие. При этом пространственно-временной континуум сосредоточен на квартире героини, где происходят события. Ее глазами драматург передает все происходящее, прибегая к самоанализу протагониста.

Монодрама В. Леванова «Прощай, настройщик!» представляет миметическую репрезентацию перформатива, так как героиня не является alter ego автора, выступающего нарратором. От лица героини он делится с предполагаемым собеседником своими воспоминаниями. Адресатом выступает сама героиня. Произошедшее она воспроизводит как то, что было, но рассказывает об этом «здесь и сейчас».

Интерес представляет монодрама Влады Ольховской *«Жизнь на Марсе»* (2018), занявшая призовое место в российском конкурсе «Монодрама 2019». Ее монодраматическая структура отличается от предшествующих пьес тем, что представляет внутренний *монолог-рассуждение*, движущий действие пьесы, архитектоника которой традиционна: одно действующее лицо (Актриса), семь сцен, ремарки, отделяющие одну сцену от другой. В преамбуле (аннотации) сообщается, что известной актрисе предложено выступить перед пациентами онкологической клиники и поделиться собственным опытом борьбы с болезнью. В. Ольховская передает психологическое состояние моногероя в «действенных» ремарках: «Актриса становится перед зеркалом, принимает картинную позу, делает паузу, задумывается, снова обращается к своей воображаемой аудитории, но уже без театральности, устало садится, прикрывает глаза…» [7].

Драматург показывает движение мысли и чувств, психологию Актрисы, готовящейся к выступлению. Она поставлена перед фактом заглянуть в страшное прошлое, поделиться своим опытом и в то же время она не готова это сделать сейчас. В ремарке отмечено, что «по лицу Актрисы легко догадаться, что она возмущена, в шоке» [7]. Ситуация необычная, психологически сложная, требующая самоанализа. Этому подчинена монодраматическая структура, раскрывающая внутренний конфликт «Я – Я». Действие монодрамы держится на рефлексии мысли Актрисы, но интрига в том, что зритель не знает, к какому выводу придет героиня: будет выступать или откажется? И все же она принимает решение выступить. Вербализованное ментальное действие связано с процессом познания героем самого себя, готовности рассказать о себе тем, кто в этом нуждается.

Как видим, на рубеже XX–XX1 вв. монодрама вновь заняла место в системе драматургии, обновив свою поэтику. Она активно ставится в театрах. Интерес к ней обусловлен антропоцентрическим фактором современной драмы, интересом к личности, ее самовыражению. Не исключен и такой фактор, как тенденция современной драмы к эпизации, стремлению передать «рассказ» о жизни в форме монодрамы.

Библиографические ссылки

1. *Агеева Н.А.* Жанр монодрамы в современной отечественной драматургии : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.08. Новосибирск, 2016. 23 с.
2. *Гончарова-Грабовская С. Я.* Монодрама в творчестве Е.Гришковца // Вестник БГУ. Сер. Филология. 2009. №3. С. 26–31.
3. *Иванов В.* Борозды и межи. СПб., 1916.
4. *Евреинов Н*. Введение в монодраму. СПб., 1909.
5. *Кугель А*. Утверждение театра. М., 1923.
6. *Леванов В.* Вечная субстанция // Совр. драматургия. 2007. № 4. С. 2–3.
7. *Ольховская В.* Жизнь на Марсе / [Электронный ресурс] // Влада Ольховская. URL: https://olhovskaya.ru/plays/zhizn-na-marse/ (дата обращения: 10.12.2020).
8. *Попова Е.* Елена Попова : портрет из реплик и монологов // Все нормально. Ее-версия: антология современной беларусской драматургии / под ред. Т. Артимович, К. Князевой, Е. Мальчевской. Vilnius [Вильнюс] : Логвінаў, 2019.

МАСТАЦКІ ГІСТАРЫЗМ ТВОРЧАСЦІ ЯНА ЧАЧОТА

Т. С. Кохан

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі,
вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
taniakokhan@tut.by

Навуковы кіраўнік: Саверчанка Іван Васільевіч, доктар філалагічных навук, прафесар.

На прыкладзе цыклу «Спеваў пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.» даследуецца мастацкі гістарызм творчасці Я. Чачота, вызначаюцца асноўныя асаблівасці творчай манеры пісьменніка. Для паэтычнага адлюстравання чатырохсотгадовай гісторыі беларускіх зямель, у тым ліку гарадоў і мястэчкаў Барысава, Навагрудка, Заслаўя, Гародні, Рудавы, Полацка, Крэва, Я. Чачот чэрпаў звесткі з «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» М. Стрыйкоўскага і «Старажытнай гісторыі літоўскага народа» Т. Нарбута. Праз прызму мінулага паэт узнімае важныя праблемы сучаснасці. Фактаграфічная дакладнасць мастацкага апісання падзей і постацей спалучаецца з глыбокім маральна-дыдактычным зместам, што спрыяе духоўнаму развіццю і асвеце грамадства.

Ключавыя словы: Ян Чачот; мастацкі гістарызм; гісторыя Беларусі; мастацкі вобраз.

Цікавасць да мінулага знайшла сваё адлюстраванне ў творчасці многіх пісьменнікаў, якія імкнуліся паказаць жыццё і лёс народа ў гістарычнай перспектыве. Асабліва яскрава патрэба ў творчым асэнсаванні даўніх падзей выявілася ў пераломныя эпохі, што абумоўлена імкненнем этнасу да самапазнання, вызначэння свайго месца сярод іншых народаў. Беларусы пачалі сваё абуджэнне ў XIX ст., у гэты перыяд перад прадстаўнікамі эліты не было выразных гістарычных перспектыў, мова была ў заняпадзе, а тэрыторыі, якія доўгі час уваходзілі ў склад іншых дзяржаў, не мелі акрэсленых межаў і адзінай афіцыйна замацаванай назвы.

Сярод пачынальнікаў-адраджэнцаў, якіх зацікавіла гісторыя нашага краю ва ўсёй паўнаце і шматграннасці, быў Я. Чачот. На падставе гістарычных звестак, узятых з “Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі” М. Стрыйкоўскага, а таксама “Старажытнай гісторыі літоўскага народа” Т. Нарбута, пісьменнік стварыў выдатны цыкл “Спеваў пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.”, дзе таленавіта апаэтызаваў гісторыю нашых зямель, у прыватнасці, гарадоў і мястэчкаў Барысава, Навагрудка, Заслаўя, Гародні, Рудавы, Полацка, Крэва, што доўгі час належалі аб’яднанай дзяржаве – Вялікаму Княству Літоўскаму, Рускаму, Жамойцкаму.

Нягледзячы на тое, што ў XIX ст. ураджэнцы беларускіх зямель нярэдка называлі сябе ліцвінамі (прыгадаем сакраментальнае міцкевічаўскае “Літва, мая Айчына!”), аўтар выдатна разумее, якая прорва падзяляе дахрысціянскіх ліцвінаў і яго сучаснікаў: “*Як Літва, так і самыя зацятыя яе ворагі крыжаносцы – цяпер ужо ў мінулым, яны належаць сусветнай гісторыі. Літва з ідалапаклонніцкай стала ўжо хрысціянскай і славянскай, крыжакі цалкам зніклі*” [1, с. 155]. Творца робіць акцэнт на эвалюцыі светапогляду продкаў: “*Мы ўсе, дзякуй Богу, // Іншыя ўжо людзі. // Так, як продкі нашы, // Не сядзім у будзе. // Рабаваць не едзем, // Кожны працай слынны. // А не так, як колісь // Дзеялі ліцвіны. // Па адзінай жонцы // К сэрцу прытуляем, // Рабаваных жонак // Мы цяпер не маем*” [1, с. 167].

Паэтычны цыкл удала перадае рух часу ад 1040 г. да 1434 г., арганічна спалучаючы дакладнасць факта з эмацыянальнай выразнасцю мастацкага вобраза. У цыкл уваходзяць тапанімічныя паданні (“XVII. Заснаванне Вільні, 1322 г.”, “XXV. Старыя Трокі”), апісваюцца значныя гістарычныя падзеі (“XL. Хрышчэнне Літвы Ягайлам”), ёсць згадкі пра бітвы (“XLII. Бітва пад Рудавай у часы Альгерда, 1370 г.”, “LIV. Бітва над Ворсклай, 1399 г.”), сустракаюцца спевы-характарыстыкі, прысвечаныя значным гістарычным асобам (Скірмунту, Віценю (Вітаўту), Гедыміну, Альгерду, Ягайле і інш.).

Паэт неаднаразова падкрэслівае, што ў даўнія язычніцкія часы сістэма маральных каштоўнасцяў насельнікаў нашага краю не мела выразных арыенціраў. Шырока распаўсюджанымі былі забойствы, гвалт, здрады, паэт-хрысціянін не падзяляў поглядаў дзікіх ліцвінаў, а таму часта шукаў прыклады жыццяпісаў, дзе б няўхільнае пакаранне знайшло грэшніка,

нягледзячы на яго пасаду і аўтарытэт. Так, бясслаўная смерць Міндоўга была вынікам несумленнага жыцця: “*Быў ён свой кароль, ліцвінскі, // Меў калісьці сілу. // Ды абманам жыў. Абман той // Звёў яго ў магілу. // Быў прыняў святую веру, // Ды адкінуў вонкі. // Што ж ён гэтак Даўмантовай // Не адрокся жонкі?*” [1, с. 158]

На думку Я. Чачота, смерць “ваўка ў авечай скуры” Войшалка, сына Міндоўга, таксама з’яўляецца наступствам яго паводзінаў: “*Уночы Леў прыходзіць // У спальню госця ў тлуме. // З пасцелі ўзняўшы, кажа: //*

–Яшчэ мо вып’ем, куме? // І ўзняўшы меч, са словам // Нянавісці з размаху //Б’е Войшалка. Хто быў там – // Аж анямеў ад жаху. // Такі канец прышоў во // Міндоўгаваму сыну. // Хто ворагам быў людзям, // Хіба б інакш загінуў?” [1, с. 159] У той жа час, калі жыццё было сумленным і карысным для людзей, то і смерць была слаўная. Так, у спеве пра Віценя (Вітаўта) чытаем: “*Ён хадзіў з сваёй літвою, // Праслаўляў наш край у свеце // Зброяй праведнай сваёю. // Нездарма ж і смерць да князя // Не змагла ўсё падступіцца. // Сам Пярун яго ў нябёсы // Ўзяў пад водбліск бліскавіцаў. // Шмат хто ў час той, кажуць, бачыў, // Як між хмар, дзе золак мройны, // На кані, бы месяц, белым, // Пралятаў ён, рыцар збройны*” [1, с. 162].

Маралізатарства і дыдактызм, уласцівыя творчай манеры пісьменніка, напоўніцу выявіліся ў цыкле “Спеваў пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.” Пры стварэнні вобразаў гістарычных асоб паэт удала расстаўляе акцэнты, паступова падводзіць чытача да маралі, змешчанай у канцы твора. На прыкладах, узятых з хронік, паэт выяўляе важныя праблемы сучаснасці, звяртае ўвагу грамадства на неабходнасць сумленнга жыцця і адданага служэння Радзіме. У такім ракурсе гістарычны вобраз можна разглядаць не толькі як крыніцу ведаў пра мінулае, але і як аснову пабудовы нацыянальнай ідэнтычнасці.

У творах Я. Чачота прасочваецца жаданне пракаменціраваць ход гістарычных падзей, аднак пры гэтым аўтар імкнуўся да фактаграфічнай дакладнасці, таму дыялогі і ўчынкі герояў часта маюць летапісную аснову: “ *– Што ж ён значыць, сон мой дзіўны? // Князь, прачнуўшыся, пытае. // Тут Крывэ-Крывэйт Ліздзейка // Гэтак мудры сон тлумачыць: // – Князь вялікі Гедыміне, // Воўк той – замак новы значыць. // Гэта ж будзе тут во замак, // Горад велічны тут будзе. // Галасы ж ваўкоў – то слава // Пра яго, што пойдзе ў людзі*” [1, 164–165].

З такой жа скрупулёзнасцю паэт апісвае звычаі і характар дзікіх ліцвінаў, так, у адным са спеваў знаходзіцца этнаграфічна дакладная інфармацыя пра пахаванне Свінтарога Утанэсавіча: “*У жалобе люд спяшае // Пахаваць там Свінтарога, // Як і зычыў, ля парога. // Бы ў паход, яго прыбралі – // Шабля, лук, кап’ё пры боку. // Выжлаў двух, хартоў звязалі, // З імі – сокала звысоку, // Потым ястраба з-пад неба // І каня з сядлом – як трэба. // Гэта ўсё на стос – вам дзіва? – // Узвялі. З слугой адданым! // Падняслі агонь імкліва, // Міг – і ўсё ў віры агняным! // Кінулі ў агонь – да*

высяў – // Кіпцюры мядзведзяў, рысяў. // Меркавалі: так жа будзе, // Як на гэтым, на тым свеце. // Так жа там ваююць людзі, // Так палююць, ладзяць клеці. // А караскацца на неба // Па крутых гарах там трэба" [1, с. 160–161].

Рытуальная крэмацыя згадваецца і ў спеве пра Кейстута: "*Верны быў паганству ён, таму й самога // Адвязлі, дзе попел цела Свінтарога. // Там усклалі князя на касцёр высокі, // І ў пламенні ўзнёсся Кейстут пад аблокі*" [1, с. 174].

Жорсткасць ліцвінаў выявілася ў абрадах чалавечага ахвярапрынашэння. Варта звярнуць увагу на ўрывак з апісаннем спалення крыжака Руды: "*Ты дарма прыйшоў да Меднік, // Руда, з намі біцца: // Мусіш – звязаны, са зброяй – // На каня садзіцца. // Ды не ў бой ты зноў паскачаш, // А на стос агністы. // Панясеш багам паклон ты // Ад нас урачысты! // Ехаў Руда, мусіў ехаць // Пад кліч зычны рога // У гарачыя абдоймы // Віру агнявога! // Бы паходня, гарыць Руда, // А Літва ў гуморы, // Што багам сваім ахвяру // Шле такую ў зоры*" [1, с. 163].

Не менш жахлівым уяўляецца чытачу-хрысціяніну падзел здабычы: "*Неяк два ліцвіны // Спрэчку распалілі – // Гожанькую панну // Між сабой дзялілі. // Не маглі да згоды // Ўсё прыйсці абое. // Сварку немалую // Усчынілі воі. // Ухапіў адзін з іх // Меч свой у хвіліну // І рассек з размаху // Напалам дзяўчыну*" [1, с. 168].

Для творчага метаду Я. Чачота характэрна выкарыстанне пэўных дэталяў, артэфактаў, без якіх гістарычны аповед губляе сваё жыццепадабенства. Паэт удала знаходзіў яскравыя і запамінальныя дэталі, якія падмацоўвалі аўтарскую думку і высновы, служылі ідэі сувязі пакаленняў. Так, у спеве "Рынгольт Альгімунтавіч, першы вялікі князь Літоўскі, Жмудскі і Рускі" ёсць адразу два напаміны пра былыя падзеі: насыпаныя курганы і назва вёскі Магільна. У спеве "Магіла Міндоўга" паэт таксама дае адсылку да гары ў Наваградку, якая носіць імя караля: "*У Наваградку дагэтуль // Ёсць гара Міндоўга // Там ляжыць ён, яго помніць // Люд наш будзе доўга. // Быў ён свой кароль, ліцвінскі, // Меў калісьці сілу*" [1, с. 158].

Яшчэ адна рэліквія, апаэтызаваная Я. Чачотам, – барысаў камень: "*Яшчэ ці ёсць той камень // над Дзвіною, // Што ад Дзісны // Адной не далей мілі, // Дзе крыж і словы: // «Дапаможе, о Божа, Твайму рабу Барысу»*" [2].

Пра тое, што Я. Чачот не перапыніў працы над гістарычнымі спевамі сведчыць зборнік "Pieśni ziemianina przez Tłómacza Piosnek z nad Niemna i Dzwiny" (1846), куды ўвайшлі песні на гістарычную тэматыку. Паэт па-ранейшаму прытрымліваўся прынцыпаў храналагічнай паслядоўнасці, лаканічнасці і дакладнасці. Нягледзячы на сваё падабенства з папярэднімі спевамі, гэтыя творы ўтвараюць асобны цыкл таму, што былі створаны на падставе гістарычных крыніц пра больш познія часы.

Такім чынам, гістарызм творчасці Я. Чачота абумоўлены праўдзівым паказам лёсу ліцвінаў на падставе хронік М. Стрыйкоўскага і Т. Нарбута.

Паэт па-мастацку ўзнавіў летапіс жыцця нашых продкаў, стварыў панарамную карціну мінулага.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Чачот Я.* Выбраныя творы. Мінск : Беларускі кнігазбор, 1996. 374 с.
2. *Чачот Я.* Спевы пра даўніх ліцьвінаў [Электроны рэсурс] // Pavet/ URL: http://pawet.net/library/v_literature/mury/05/12/Ян_Чачот._Спевы_пра_даўніх_ліцьвінаў.htm (дата звароту: 24.09.2020).

ДЫХАТАМІЯ *ВЁСКА – ГОРАД* У МАСТАЦКІМ СВЕЦЕ ЛІРЫКІ АЛЕСЯ БАРСКАГА

Г.М. Мятліцкая

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Карла Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
metlit@tut.by

Разглядаецца рэалізацыя дыхатаміі вёска – горад у лірыцы Алеся Барскага, раскрываецца ўспрыняцце лірычным героем свайго дваістага становішча: рэаліі вясковай і гарадской рэчаіснасці не ўтвараюць апазіцыі, а з'яўляюцца ўзаемазвязанымі ў яго свядомасці.

Ключавыя словы: дыхатамія; вёска; горад; прырода; лірыка.

Малой радзімай паэта Алеся Барскага (Аляксандра Баршчэўскага) з'яўляецца вёска Бандары на Беласточчыне. У гэтым краі, хоць тэрытарыяльна ён адносіцца да Польшчы, захавалася жывое гучанне беларускай мовы.

Пераезд пісьменніка, маленства якога прайшло ў вёсцы, у гарадскую прастору – даволі тыповая для айчыннай літаратуры сітуацыя. Вясковае дзяцінства было ў многіх нашых творцаў. Гэта абумовіла не толькі непасрэдную далучанасць іх да сялянскай працы, натуральнае засваенне сялянскага светаўспрымання, яго каштоўнасцей і ідэалаў, а таксама стыхіі народнай мовы, фальклору, але і магчымасць быць уключанымі ў прыроднае асяроддзе, назіраць за яго жыццём, адчуваць душэўнае суладдзе з ім.

У вершы "***Дзе тыя Бандары?.." Алесь Барскі ўспамінае сваю малую радзіму, на ўлонні якой прайшло яго маленства. Кожны чалавек носіць у душы адчуванне свайго бацькоўскага дому, і яго лірычны герой шчымліва памятае і сваё акно ў сад, і язмін пад акном, і матчыны малітвы па вечарах, ён усё аддаў бы, каб сказаць: "Ізноў я – дома!" [1, с. 43]. Мастацкімі дэталямі ў асобных творах паэта служаць такія элементы роднай хаты, як калыска (верш "У зялёнай калысцы з лугоў"), парог, калаўрот (вершы "Парог" і "На далонях тваіх"). Як вядома, парог – таксама адзін з вобразаў-сімвалаў малой

радзімы, роднай хаты. Памяць пра яго ў лірычнага героя заўсёды дзесь у падсвядомасці:

Мне сягоння лягчэй уявіць,
У чым сіла традыцый і спадчын.
Спеў парога астаўся ў крыві,
Бо ён родны, ён бацькаў, ён матчын [3, с. 15].

Алесь Барскі супастаўляе гарадское жыццё, у якім зашмат мітусні і тлуму, са спакойным вясковым (верш "Там дзесьці трывогі"). Горад асацыятыўна звязваецца з безгалоўем і пустаслоўем, а таксама з тымі людзьмі, "што сяброў сваіх шчырых // тапілі у ложцы", а вёска – гэта прырода, якая дае спатолю душы і лечыць цела. Лірычны герой, прыязджаючы з горада ў вёску, "уцёк у здароўе, // лёг на лісточак, // вылячыў сэрца, // вылячыў вочы". Паэт жыве тлумным гарадскім жыццём і бясконца тужыць па вясковым раздоллі, дзе блукае ў думках і знаходзіць спакой. Цішыня малая заглушыць какафонію горада (верш "Дайце малую цішу").

Белавежа для паэта – гэта цэлы сусвет, бязмежны духоўны акіян: "Белавежа! // Ты мой акіян, // апускаю пяро, як вясло, // з гарадоў да цябе плыву я, // каб сабраць ураджай – // жнівень слоў" [1, с. 31]. Праз адлюстраванне прыгажосці "салаўінай краіны" паэт перадае замілаванне красой дзяўчыны (верш "Белавежанка"), каханай (верш "І зноў прыплывае"). Знаходзім і параўнанне Белавежы з маладзіцай, якая глядзіцца ў люстэрка. Бачачы гэта, усё навокал – птушкі, дрэвы, лірычны герой – адчувае сябе шчаслівым (верш "Глядзела Белавежа ў паляну"). Нездарма ў пушчы на лістках-далонях лірычны герой хоча напісаць паэму пра каханне (верш "Пушча, сціхамірся, супакойся").

Яркім, гучным, суладным, як цэльны арганізм, бачыць паэт жыццё пушчы: "Ў кожнай кроне канцэртны зал, // ў кожнай зале звініць хор, // на галінах сто партытур, // у ляшчынах тысяча ціш, // у асінах тысяча бур, // у далінах тысяча згод // і столькі ж нязгод-авантур" [2, с. 146] (верш "***Белавежа – анёлаў гурт").

Паэт пранікнёна ўзіраецца ў тое, што адбываецца навокал. І ў вершы "Валодзю Паўлючуку" крыху з гумарам, аднак з вялікай адказнасцю ён мудра перасцерагае: калі б не засталося лясоў, чалавек "шкельца чарадзейскае" згубіў бы, праз якое глядзіць на свет.

Сёння цяжка аддзяліць горад ад вёскі. Тым не менш на працягу XX стагоддзя ў беларускай літаратуры вясковай і ўрбаністычнай тэматыкі існавала дыхатамія *вёска – горад*, калі горад найчасцей успрымаўся як увасабленне матэрыяльнага, тэхнічнага боку чалавечага жыцця, а вёска паказвалася як свет гарманічнага жыцця, цесна знітаваны з прыродай, некранутая стыхія спрадвечнай мудрасці і духоўнасці. Як сцвярджаюць даследчыкі, у прыватнасці С. Домнікаў [4], падзел на культуру і цывілізацыю ўзнік яшчэ ў старажытныя часы, калі адбывалася станаўленне

цывілізацый і з’яўляліся першыя гарады. Чалавек у пошуках самога сябе, сэнсу свайго існавання, душэўнай раўнавагі і магчымасцей для свайго духоўнага росту паступова станавіўся “пасрэднікам” паміж горадам і вёскай.

У такім становішчы знаходзіцца і лірычны герой мастацкага свету А. Барскага, для якога прыезд з горада ў вёску заўсёды дорыць сілы і натхненне. На яго думку, менавіта Зямля і Пушча павінны выратаваць чалавецтва. Ён ведае, што гэта толькі мроя, але прамаўляе: “Зямля, // расшыр зялёныя даліны // і звузь да кроплі гарадскія выспы!” [2, с. 165]. Герой верша “Калі ўцякаю з гарадоў” знаходзіцца на раздарожжы – ён разумее, што нельга адкідваць гарады з іх мастацкімі і тэхнічнымі дасягненнямі і своеасаблівай прыгажосцю, але ў той жа час для яго мілей за ўсё Белавежа, ён хоча “быць п’яным энтузіястам Пушчы”.

Радзіма дапамагае зведаць пачуццё радасці. Паэт кліча радасць прыйсці да яго, зноў забраць у палон сэрца, каб узнікла натхненне, напісаліся новыя радкі (верш “Белавежская радасць”). Пра гэта чытаем і ў вершы “Спявайце, жнівеньскія сосны”.

Для творцы лес – святы: “Зайшоў у лес, як у святыню, // Паслухаў псальмаў // Чарадзейных” [1, с. 52]. Лірычны герой прыехаў у лес “з душою млоснай”, і там пачынае адчуваць сябе частачкай сусвету, здольнай да самаачышчэння, абнаўлення: “Мяне спавіў лірычны мотак, // Залечыў стрэсавыя раны. // Стаю з сасной, // Як роўны з роўным, // П’ём разам сонечную радасць, // І прыгажосць мне сэрца поўніць // Бурлівым гулкім вадаспадам” [1, с. 52-53]. У вершы “***Калі ідзеш у лес…” паэт дае наказ чытачам, што туды трэба ісці з найвялікшай пашанай, стаць падобным “да праменя, // Які цалуе // Ствол сасны зялёнай” [1, с. 52].

Прагулка ў лесе дорыць творчы настрой. Менавіта на малой радзіме, а не ў горадзе лёгка пішуцца новыя творы (верш “Дзесь далёка за мною сяло”). “Я прыйшоў абарваны, // пусты і прыбіты, // бо горад сарваў // рукой дабрабыту // з плячэй маіх кужаль. // Пушча, мяне не гані ты, // дай вопратку целу, // дай сэрцу дужасць” [2, с. 159], – чытаем у вершы “Белавежа, ты як малітва”.

Падобны матыў вяртання ў пушчу для набыцця творчых сіл сустракаецца і ў вершы “Узняты сосны, як бакалы”, лірычны герой якога гаворыць: “Як толькі ў горадзе заплачу // іду у Белавежу, ў гушчу, // я выціраю вочы пушчай, // і свет я зноў зялёным бачу. // і свет здаецца мне пахучым, // і свет здаецца мне дзіцячым // і радасным, і не балючым” [2, с. 153].

А. Барскі робіць спробу перадаць атмасферу жыцця пушчы, дзе пераплятаюцца ўсе тоны гукаў – ад звонкай цішыні да прарэзлівага крыку, дзе ўвесь раслінны і жывёльны свет запалонены, узбуджана-захмялелы ад разлітых у паветры паэзіі, водару, любові:

Белавежа, ты, як малітва.

Ты, нібы ерась бязмежная,
твая песня, як шэпт,
як крыкі мяцежныя.
Кожны клён тут абвіты
хмелем паэзіі,
промнем мускату абліты, абмыты,
п'яны каханнем [2, с. 159].

Прыгажосць пушчы, сяброўства лірычнага героя з ёй, адчуванне непарыўнай (нават кроўнай) сувязі з яе векавымі нетрамі выступаюць як ключавыя матывы ў лірыцы А. Барскага: "Дружбу прыношу вам, // Дрэвы" [1, с. 41]; "Язычнік я – // Малюся дрэвам" [1, с. 46] (вершы "***Ад сонца я тут", "***Тут хочацца задумацца").

"Нягледзячы на ўсю прыхільнасць да ідэі сусветнай грамадзянскай супольнасці, жыве ва мне цэнтрабежная сіла, якая звязвае мяне арганічна з маёй Малой Айчынай – Бандарамі і іх наваколлем. Гэта ж тая зямля, на якой я нарадзіўся, над якой першы раз пабачыў сонца, на якой зрабіў першы крок, сказаў першае слова і напісаў першы верш. Урэшце, з гэтай светлай краіны рушыў у шырокі свет. І не магу да яе не вяртацца, каб зноў прайсці па матчыных слядах, каб падняць грудку зямлі са свежаўзаранай глебы, каб кінуць зерне ў раллю, каб скасіць першы даспелы колас, каб захапіцца і ўсумніцца" [1, с. 65-66], – так па-сыноўняму цёпла напісаў пра свае родныя мясціны А. Барскі ў прадмове да аўтабіяграфічнай кнігі "З пабачанага і перажытага".

Варта звярнуць увагу на своеасаблівую самабытнасць яго мастацкага таленту. Сам аўтар пра сваё станаўленне як асобы, як беларускага паэта і адначасова як польскага грамадска-культурнага дзеяча зазначыў наступнае: "Належу да людзей, у нейкай ступені раздвоеных духоўна. Раздвоенасць гэта праяўляецца ў тым, што як беларус атаясамліваюся з беларускім народам, а як грамадзянін – атаясамліваюся з Польскай дзяржавай. Зрэшты, усё болей прыхільным позіркам паглядаю на ідэю прыналежнасці да еўрапейскай ці нават сусветнай грамадскасці або, як кажа адзін з герояў Ісака Бабеля, – інтэрнацыяналу добрых людзей" [1, с. 65].

Апаэтызаваныя Алесем Барскім луг, поле, пушча і іншыя маляўнічыя краявіды ваколіц – гэта канкрэтныя нацыянальныя вобразы і разам з тым архетыповыя, знаёмыя кожнаму з яго маленства.

У некаторых творах паэта заўважаюцца рысы міфалагізму, гэта выяўляецца найперш у адлюстраванні адчування злітнасці чалавечага жыцця з жыццём Сусвету (вершы "Вось рэчанька бяжыць тут", "Ноч у Белавежы" і інш.). Так, чуйнасць лірычнага героя да зменлівасці ў навакольнай прыродзе і апісанне восені перададзены праз яго самаадчуванне ў вершы "Ногі ў агні па калені": "Я сёння <…> нейкі іншы, новы: // я палявы, // я баравы, // я верасовы" [3, с. 37]. У таямнічым навакольным свеце лірычны герой асабліва тонка прыкмячае цуды і чары,

якія адбываюцца вакол яго: “І свет нас паставіў // з ног на галовы, // а сам закружыўся, // закуралесіў” [3, с. 28].

Як нязбыўная мара паэта гучыць яго рытарычнае пытанне: “А што, каб вярнуцца, мой браце, мой дружа, // Каб вызваліць сэрца з-пад горада пяты, // І ў беларускі адзецца зноў кужаль, // І жыць пад страхой саламянай той хаты?!” [1, с. 26] Пытанне адрасавана В. Баршчэўскаму, які, па словах А. Барскага, “адным з першых заўважыў балючую з’яву – тое, што маладыя беларусы пачалі масава пакідаць вёскі, дэнацыяналізавацца і праяўляць абыякавыя альбо і пагардлівыя адносіны да сваіх нацыянальных каранёў” [1, с. 197].

Паэт заўважыў, што чалавеку, які паспытаў гарадскога жыцця, нялёгка вяртацца “ў недаснёныя мары”, як кроплі, якая рынула ўніз, цяжка ўзняцца наверх, “стацца часцінай // вялікае хмары” [2, с. 182]. А. Барскі верыць, што, магчыма, сярод сённяшняй вясковай моладзі ёсць тыя, каго “можа не вабіць // <…> горад і вырай, // бо любяць разлогі // зялёнай краіны” [тамсама].

Людзі, якія разбрыліся па шырокім свеце, – па сабе ведае творца, – нясуць свой вясковы боль (верш “У зялёнай калысцы з лугоў”). Многімі з тых, чыё маленства прайшло ў вёсцы, горад успрымаецца як нейкая страшная пачвара, і яны прагнуць вяртання ў вёску: так, у вершы “***Зямля і неба веснавыя…” сустракаем наступны малюнак: “і раптам вырас перад намі // горад распяццямі антэнаў // і трунамі каменных блокаў, // нас вабіў ён, як анаконда, // і рэшткай сіл мы павярнулі // у сінь, у сонца свае твары, // і у лугі свае пабеглі” [2, с. 150]. У вершы “Горад” чытаем, што значыць урбаністычная прастора асабіста для паэта: “Горад, // ты сцёр з майго краявіду // колеры, // ніву сонца засеяў // і сажай і пылам, // трубамі фабрык // прабіў небасхілы” [2, с. 157]. Пры гэтым аўтар падкрэслівае, што гарадская атмасфера ніяк не спрыяе творчаму ўздыму: “Горад, // ты сцёр з майго неба // блакіты” [тамсама].

Такім чынам, паэт, хоць і жыве ў горадзе, застаецца ў душы сынам вёскі, які ўспаміны з маленства і краявіды прыроды “пранёс праз радасць і праз гора // не пазволіў гораду замучыць”. Ён шчыра прызнаецца: “калі мне цяжка – усміхаюся, // з горада вяртаюся ў даліны” [2, с. 137].

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Барскі А.* Выбраныя творы. Мінск : Кнігазбор, 2011. 416 с.
2. *Барскі А.* Жнівень слоў. Беласток : Выд-ва ГП БГКТ, 1967. 193 с.
3. *Барскі А.* Мой бераг. Мінск : Маст. літ., 1975. 96 с.
4. *Домников С.Д.* Мать-земля и Царь-город. Россия как традиционное общество. М. : Алетейа, 2002. 672 с.

ПОЛЬСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1918–1939 ГГ. У САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

М. М. Хмяльніцкі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
KhmelnickiNN@bsu.by

Артыкул прысвечаны даследаванню відам і формам рэцэпцыі польскай літаратуры 1918–1939 гг. у беларускай сацыякультурнай прасторы XX-XXI стст. Выяўлены і ахарактарызаваны тры перыяды ўспрымання і асэнсавання польскай міжваеннай літаратуры беларускімі перакладчыкамі і літаратуразнаўцамі. Вызначаны польскія аўтары, творы якіх перакладаліся найбольш інтэнсіўна (Л.Стаф, Б.Лесьмян, Ю.Тувім, С.Пясецкі, В.Гамбровіч, Б.Шульц, Я.Корчак і інш.). Вызначана спецыфіка мастацкіх перакладаў твораў польскіх пісьменнікаў 1918–1939 гг.

Ключавыя словы: польская літаратура; традыцыя; беларуска-польскае памежжа; аўтабіяграфізм; паэтыка; мастацкі пераклад; дыскурс.

У сучасных умовах, калі актуалізуецца дыялог паміж рознымі культурамі, назіраецца ўстойлівая неабходнасць ведання іншанацыянальных каштоўнасцей і традыцый. У працэсе міжкультурнай камунікацыі не апошняя роля належыць і прыгожаму пісьменству. Літаратура Польшчы, якая мае багатую і адметную спадчыну, у XX ст. стала для беларускіх чытачоў своеасаблівымі ўводзінамі ў еўрапейскую, застаючыся пры гэтым глыбока славянскай. У апошнія дзесяцігоддзі польская літаратура знаходзіцца ў дастаткова актыўным рэжыме ўспрымання: з беларускага боку назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя весці дыялог, знаёміцца праз пераклады з помнікамі мастацтва слова суседняй краіны.

Пытанне рэцэпцыі і друку твораў польскіх пісьменнікаў міжваеннага дваццацігоддзя (1918–1939 гг.) ў беларускай кніжнай прасторы пакуль што не атрымала належнай увагі, але пэўная база для высноў і магчымых перспектыў такога даследавання ўжо назапашана. Творы знакавых польскіх аўтараў гэтага перыяду стала прысутнічаюць у практыцы выкладання замежнай і нацыянальнай (польскай) літаратур установ сярэдняй і вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, таму выяўленне заканамернасцей, якія абумоўліваюць міжлітаратурныя сувязі на пэўным этапе, з’яўляецца актуальнай задачай. Не прэтэндуючы на асвятленне ўсёй іх палітры, звернемся толькі да мадэлі рэцэпцыі, якая ўключае ў сябе пазіцыянаванне тых ці іншых твораў, іх прысутнасць праз пераклады ў беларускай сацыякультурнай (кніжнай) прасторы, а таксама рэакцыю на новую эстэтыку і спосабы мастацкай прэзентацыі.

Самабытны характар, багацце традыцый, дэмакратычнасць польскай літаратуры і поліэстэтычны характар яе функцыянавання набываюць адначасова ўніверсальны характар, становячыся ў многіх момантах сугучнымі беларускаму разуменню творчасці ў ракурсе індывідуальнага, сацыяльнага і нацыянальнага самавызначэння.

Для высвятлення дынамікі прысутнасці польскай літаратуры 1918–1939-х гг. у сацыякультурнай прасторы Беларусі мэтазгодна вылучыць тры этапы, кожны з якіх характарызуюцца сваёй спецыфікай.

Адметнасць **I этапа** (1920–1930-я гг.) рэцэпцыі польскай літаратуры была абумоўлена ўстанаўленнем савецкай улады, палітыкай беларусізацыі на пачатковай фазе дзяржаваўтварэння, заключэннем Рыжскай дамовы 1921 года, нестабільнасцю і нават варожасцю у адносінах суседніх краін, што адпаведным чынам уплывала на ўспрыманне і перакладчыцкую палітыку ў тагачаснай Савецкай Беларусі (перакладаліся часцей і ахвотней класікі польскай літаратуры – А.Міцкевіч, Э.Ажэшка, Г.Сянкевіч, М.Канапніцкая[8], а таксама аўтары левай, сацыялістычнай арыентацыі – У.Бранеўскі, В.Васілеўская, Е.Путрамант, Э.Краінскі, Ю.Эйсманд, с. Стандэ, В.Вандурскі і інш.). Аднак былі і выключэнні: так, напрыклад, у 1928 годзе часопіс “Узвышша”, друкаваны орган аднайменнага літаратурна-мастацкага згуртавання, змясціў артыкул Канстанціна Пушкарэвіча “Юліан Тувім (поэта сучасны Польшчы)” [47], у якім беларускі крытык зрабіў агляд творчасці польскага аўтара, у прыватнасці яго зборнікаў 1918–1926 гг. (праўда, фрагменты твораў падаваліся па-польску, а не ў перакладзе), асабліва засяродзіўшы ўвагу на пытаннях вобразна-матыўнай сферы, праблематыцы, майстэрстве вершаскладання.

Звярнуліся беларускія аўтары і да перакладу празаічных і вершаваных твораў дастаткова вядомага ў той час пісьменніка-футурыста Бруна Ясенскага: так, напрыклад, на рускую мову былі перакладзены ўрыўкі раманаў “Человек меняет кожу”, “Я жгу Париж” (1929), а ў 1932 годзе дзякуючы перакладу У.Жылкі была надрукавана асобным выданнем паэма “Слова пра Якуба Шэлю” Бруна Ясенскага[9] – гэта, падкрэслім, адзін з першых перакладаў польскага паэта на ўсходнеславянскія мовы. Можна вылучыць некалькі прычын такога звароту: роднаснасць паэтычных індывідуальнасцей, магчымае асабістае знаёмства пісьменнікаў, жаданне паспрабаваць сябе ў перакладчыцкім майстэрстве, звярнуўшыся да дастаткова папулярнага ў Польшчы на той час твора (другі раз паэма Бруна Ясенскага ў перакладзе У.Жылкі будзе надрукавана толькі ў 1986 г.). Адзначым, што беларускаму паэту пры моўнапаэтычнай трансфармацыі

[8] Напрыклад: М. Канапніцкая. Мэндэль Гданьскі. Перакл. на руск. мову К.Станюковіча. З расійскай мовы пераклаў В.Каваль. – Менск: Белдзяржвыдавецтва, 1930.

[9] Ясенскі, Б. (1901–1938), У. А. (1900–1933) Жылка. *Слова пра Якуба Шелю*. – Менск [Мінск]: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, ЛіМ, 1932.

ўдалося захаваць вобразна-стылёвы ключ і экспрэсіўна-музычны дух арыгінала.

У 1937 годзе з'явіўся першы пераклад на беларускую мову хрэстаматыйнага верша К.І.Галчынскага "Serwus Madonna", які быў здзейснены Максімам Танкам. Прасочваючы матывацыю беларускага аўтара як перакладчыка, А.Лойка слушна зазначыў: "Тым не менш у даваеннёўскі час будзе пераважаць у М.Танка больш імпульсіўны пачатак у выбары польскіх арыгіналаў, а яшчэ і пошукавы. Вось адзін мо з найлепшых прыкладаў імпульсіўнасці М.Танка-перакладчыка (запіс ад 30.XII. 1937: "Пад снегапад пачаў перакладаць цудоўны верш І.Галчынскага "Прывет, Мадонна", – верш пададзены ў "Лістках календара" поўнасцю)…" [33, с. 134]. Наконт перакладчыцкай стратэгіі Максіма Танка ў міжваенны перыяд А.Лойка падкрэсліў: "Такім чынам, на самым пачатку ў М.Танка-перакладчыка відавочна паўстаюць тры крытэрыі: першы – цікавае для яго тое, што авангардысцкае, – з наступнай агаворкай: "Можа, наша гісторыя выхавала нас такімі "абмежаванымі", але для нас сапраўдная авангардная літаратура перадусім мусіць быць рэвалюцыйнай (дзённікавы змест ад 10.V. 1936г.); другі крытэрый – эстэтычны, з прагі і ўвагі да прыгожага; трэці назавём патрыятычным, бо ён з пераключэннем паэзіі іншых народаў у нацыянальную паэзію, – беларусікі. Асобна адзначым, што гэтыя тры універсальныя танкаўскія крытэрыі ўзніклі ва ўлонні беларуска-польскага пагранічча, што перадусім заўдзячна польскай паэзіі сталася ў творчай біяграфіі М.Танка менавіта такое хуткаснае вылонванне ягоных артыстычных пазіцыяў перакладчыка" [33, с. 132].

У 1920–30-я гг. на старонках перыядычнага друку Савецкай Беларусі з'явілася некалькі перакладаў паэзіі Уладзіслава Бранеўскага: "Парыская камуна" (урывак з паэмы; вольны пераклад Янкі Купалы; часопіс "Полымя", 1927, №4), "Песня аб вайне грамадзянскай. Уступ да паэмы" (пераклад Янкі Купалы), "Шпег" (пераклад М.Лужаніна; "Звязда"). А Юрка Гаўрук у 1928 г. выдаў кнігу перакладаў "Кветкі з чужых палёў", у якой было і некалькі тэкстаў з польскай паэзіі [20].

Але такіх прыкладаў спарадычнага звароту да твораў і аўтараў азначанага перыяду намі выяўлена няшмат. Хутчэй у такім узаемадзеянні складвалася аснова ўспрымання і асэнсавання польскай літаратуры акрэсленага перыяду, перспектывы будучай працы беларускіх перакладчыкаў і крытыкаў.

На працягу **II этапа** (1950–1980-я гг.) акцэнт рабіўся пераважна на асвятленні таго, што збліжае народы сацыялістычнага лагера, адпавядае ідэалагічным устаноўкам савецкай краіны. Таму з рэцэптыўнага кантэксту доўгі час былі выключаны многія польскія аўтары і творы 1918–1939-х гг., асабліва авангарднага характару ці з выразным антысавецкім пафасам, нягледзячы на іх глыбокую філасофскую, псіхалагічную, сацыякультурную праблематыку і мастацкую адметнасць. У выніку такой грамадска-

палітычнай і ідэалагічнай зададзенасці ўзнікалі лакуны ў азнаямленні з некаторымі творамі польскіх пісьменнікаў азначанага перыяду, а адсюль вынікаў чыннік выпадковасці імёнаў, палітычнай кан'юнктуры ў выбары твораў, сфальсіфікаваная мадэль рэцэпцыі. Але, нягледзячы на розныя пазалітаратурныя прычыны, беларуска-польскія літаратурныя сувязі рэалізоўваліся ў разнастайных формах і відах, закладваліся трывалыя традыцыі культурнага супрацоўніцтва.

У пяцідзесятыя-васьмідзесятыя гады XX ст. агляды і звесткі аб літаратуры і пісьменніках Польшчы, у тым ліку 1918–1939 гг., дастаткова актыўна змяшчала тагачасная беларуская энцыклапедычна-даведачная літаратура (канечне ж, пасля цэнзурных узгадненняў); айчынныя навукоўцы займаліся вывучэннем і даследаваннем праблем развіцця польскага прыгожага пісьменства розных перыядаў. Савецкая перыёдыка інфармавала чытача, няхай сабе і прафільтравана, аб найбольш значных падзеях культурнага жыцця Польшчы, у тым ліку і пра з'яўленне новых кніг і перакладаў. Перыядычна праводзіліся дэкады і дні польскай кнігі, культуры, літаратурныя святы і сустрэчы. Водгалас разнастайных дыскусій у польскай літаратуры і літаратуразнаўстве таксама знаходзіў ўвасабленне на старонках савецкага друку: беларускія і польскія даследчыкі давалі ацэнку тым ці іншым аспектам дыскусій (часта неадназначную і з ідэалагічных пазіцый), разглядалі пытанні пераемнасці, традыцый і наватарства ў літаратуры, яе месца ў жыцці грамадства і ў сістэме дыялогу культур.

Больш за ўсё публікацый традыцыйна было прысвечана класікам польскай літаратуры – А. Міцкевічу, Ю.І. Крашэўскаму, Ул. Сыракомлі, М. Канапніцкай, Э. Ажэшцы, Ст. Жаромскаму, У. Рэйманту і інш. Што датычыцца перакладаў з міжваеннай літаратуры Польшчы, то перакладалі найбольш часта і ахвотна Ю. Тувіма, Е. Путраманта, Ул. Бранеўскага, К. Ілаковіч, Я. Івашкевіча, К.І. Галчынскага, М. Дамброўскую, М. Паўлікоўскую-Яснажэўскую, Я. Леханя і інш. У рускамоўным кніжным дыскурсе актыўны друк іх твораў пачынаецца ўжо з канца 1950-ых гадоў як асобнымі выданнямі, так і ў анталогіях польскай паэзіі ў разнастайных перакладах (перакладалі А. Базілеўскі, Д. Самойлаў, С. Свяцкі, А. Гелескул, Б. Слуцкі і інш.). У беларускім узнаўленні гэта выглядала больш сціпла: творы польскіх аўтараў звычайна друкаваліся на старонках перыядычнага друку ("тоўстыя" часопісы). Але можна канстатаваць, што ў акрэслены перыяд ў цэлым была спрыяльная атмасфера для развіцця беларуска-польскіх літаратурных узаемасувязей.

Напрыклад, калі звярнуцца да гісторыі рэцэпцыі і распаўсюджвання твораў Юліяна Тувіма, то можна сустрэць больш за сто перакладаў вершаў гэтага польскага аўтара, надрукаваных ў розных перыядычных выданнях Беларусі другой паловы XX-XXI ст. ("Полымя", "Літаратура і мастацтва", "Маладосць", "Бярозка", "Далягляды" і інш.). Многія творы гэтага паэта

ўвайшлі ў такія анталогіі, як “Сучасная польская паэзія” (1955), “Горад мільённы і мы: паэзія чырвонай Лодзі” (1972), “На зорных шляхах: З паэзіі народаў свету” (1991), “Напярэймы: ад Буга да Варты: анталогія польскай паэзіі XX стагоддзя” (2003); асобнымі кнігамі выйшлі зборнік дзіцячай паэзіі “Падарунак дзецям” (пераклады ажыццявілі А. Вялюгін, С. Дзяргай, 1956) і паэма “Польскія кветкі” (пераклад, прадмова і заўвагі В. Сёмухі, 1984). Крытычныя артыкулы беларускіх літаратуразнаўцаў утрымлівалі наступныя характарыстыкі паэтычнай індывідуальнасці Юліяна Тувіма: “прызнаны майстар слова”, “тонкі ювелір мастацкага слова”.

У гэты перыяд папулярнасцю сярод беларускіх перакладчыкаў і аматараў польскай паэзіі карысталася паэзія Уладзіслава Бранеўскага (“romantycznego bojownika Sprawy”), якую перакладалі ў свой час М. Лужанін, М. Танк, П. Пестрак, С. Законнікаў, М. Машара, А. Лойка, Р. Барадулін, П. Макаль, М. Аўрамчык і інш. Тым больш, што вядомы польскі аўтар часта наведваў Савецкі Саюз і, напрыклад, быў добра знаёмы з Якубам Коласам. Сёння айчынны чытач можа пазнаёміцца па-беларуску з такімі вершамі У. Бранеўскага, як “Горад мой”, “Вераснёвае сонца”, “Мне шкада не перажытай у змаганні…”, “Ціша”, “Чысты аркуш лепшы”, “Дваццаць другога ліпеня”, “Штораз карацеюць вершы”, “Майская песня” і інш. Асобнымі кнігамі выйшлі выбраныя творы У.Бранеўскага [12], Я. Івашкевіча [24], убачылі свет анталогіі польскай прозы “Ад Буга да Одры” [1], замежнай паэзіі (з паралельнымі польскамоўнымі тэкстамі): “Табе, Беларусь. Паэты свету пра Беларусь” [51].

Кардынальныя змены пасля 1989 года распачалі **III этап** (1990-я–2020 гг.) рэцэпцыі, агульная атмасфера якога спрыяла больш інтэнсіўнаму азнаямленню з польскамоўнай літаратурай, спозненаму, але вельмі запатрабаванаму ў беларускай сацыякультурнай прасторы адкрыццю і вяртанню некаторых аўтараў і твораў 1918–1939 гг. Рэцэпцыя супадала з рэзкай зменай каштоўнасных арыентацый. Хоць папулярнасць заходнееўрапейскіх і амерыканскай літаратур сярод перакладчыкаў і чытачоў была відавочнай, але заставаўся і застаецца польскі кантэкст. Падкрэслім, што дынаміка перакладаў і логіка выбару імёнаў пісьменнікаў часам былі дастаткова выпадковыя (асабліва ў 1990-ыя гг.): пры змене агульнай сітуацыі нацыянальная літаратура заканамерна вяртаецца да месца абрыву, каб узнавіць страчаныя гісторыка-культурныя звенні. Так было ў выпадку і з польскай літаратурай 1918–1939 гг.

У 1990-я гады міжлітаратурныя кантакты суседніх краін ажыўляюцца, дзякуючы чаму з’яўляюцца новыя пераклады, а на старонках такіх выданняў, як “Голас Радзімы”, “Культура”, “Кантакты і дыялогі”, “Літаратура і мастацтва”, “Крыніца”, “Arche”, друкуюцца навукова-папулярныя артыкулы, рэцэнзіі на польскія кнігі ў беларускай мастацкай трансфармацыі. Адкрыццё ў 1997 годзе ў Мінску Польскага інстытута таксама значна паспрыяла прысутнасці польскай культуры і актывізацыі

творчых кантактаў. Сталі традыцыйнымі месяцы польскай літаратуры, на якіх праводзяцца прэзентацыі перакладаў і сустрэчы з вядомымі польскімі пісьменнікамі. У сферы кнігадрукавання на гэтым этапе вялікую ролю адыграла серыя выдавецтва “Беларускі кнігазбор”, на рахунку якога – многія кнігі польскіх і беларускіх класікаў (“Э. Ажэшка Выбранае”, “Ян Чачот”, “Ян Баршчэўскі” і іншыя). У канцы XX – пачатку XXI стагоддзя выходзяць асобнымі выданнямі кнігі такіх аўтараў, як А. Міцкевіч, Г. Сянкевіч, Ст. Лем, Л. Стаф, Ц.К. Норвід, Б. Лесьмян, а таксама ў літаратурна-мастацкіх газетах і часопісах друкуюцца асобныя творы ці іх фрагменты такіх аўтараў міжваеннай польскай літаратуры, як В. Гамбровіч, С.І. Віткевіч, К.І. Галчынскі, Я. Івашкевіч, Я. Лехань, Б. Шульц, Ю. Чаховіч, С. Пясецкі, Л. Падгорскі-Аколаў і інш [2].

Узаемная адкрытасць культурнай і інфармацыйнай сфер стала умовай пераходу да паўнавартаснага дыялогу літаратур, у тым ліку вяртання і адкрыцця невядомых раней твораў польскага прыгожага пісьменства 1918–1939-х гг. Звернемся да канкрэтных прыкладаў.

Намаганнямі аматараў польскай паэзіі і пры падтрымцы адпаведных зацікаўленых арганізацый у 2006 годзе была выдадзена прыстойная кніга выбраных твораў польскага паэта К.І. Галчынскага “Сёмае неба” ў перакладах Л. Дранько-Майсюка, А. Хадановіча, В. Болбаса, Г. Герасінай, Л. Баршчэўскага, Н. Русецкай і інш [17]. Трэба прыгадаць і пераклады асобных вершаў Галчынскага ў анталогіях польскай паэзіі XX стагоддзя Яна Чыквіна (“Лісце срэбнай таполі”, 1999) і Алега Лойкі (“Напярэймы: ад Буга да Варты. Анталогія польскай паэзіі XX стагоддзя”, 2003), у якую ўвайшла нізка выбраных твораў К.І. Галчынскага розных гадоў (“Serwus, мадона”, “Аб маёй паэзіі”, “Ноч у Вільні”, “Песня пра жаўнераў з Вестэрплятэ”, “Зачараваныя дрожкі” і інш.).

Як нам падаецца, дастаткова падстаў для параўнальна-тыпалагічнага даследавання паэзіі К.І.Галчынскага з паэзіяй Максіма Танка. Нездарма Ул. Калеснік аднойчы заўважыў, што “сярод польскіх паэтаў-сучаснікаў найбольш ахвотна перакладае М. Танк Уладзіслава Бранеўскага, Канстанты Ільдэфонса Галчынскага, Тадэвуша Ружэвіча” [27, с. 184]. Гуманістычны пафас, актывізацыя філасафічнага і інтэлектуальнага дыскурсаў, багацце і цікавае паяднанне ўмоўна-асацыятыўнай і канкрэтна-рэалістычнай вобразнасці, арганічная далучанасць да маральнага, эстэтычнага і духоўнага вопыту свайго народа і набыткаў сусветнай культуры – апазнавальныя знакі творчасці беларускага і польскага пісьменнікаў. Герой іх паэзіі – высокадасведчаны інтэлігент, інтэлектуал, знаўца сучаснасці і гісторыі.

У серыі “Паэзія народаў свету” (1994) з’явілася кніга вядомага польскага паэта Леапольда Стафа “Высокія дрэвы”, у якой было надрукавана каля ста твораў у перакладах Алега Мінкіна. У грунтоўнай прадмове да зборніка У. Калеснік адзначыў: “Перачытваючы сёння паэзію Л. Стафа, як ніколі раней адчуваеш дзіўную слодыч гармоніі, якою

праменіць душа паэта. Гэта не алімпійскі спакой, а інтуітыўная надзея на лепшае, хоць жыццё здаецца кодлам мярзоты, цынізму і зла. Калі спрабуеш вытлумачыць гэтую бласлаўёную мудрую сцішанасць духу, дык заўважаецца натуральная дыстанцыя паэзіі ад палітыкі. Пачынаеш задумвацца, а ці сапраўды не найлепшы рэцэпт на сённяшнія дыскамфорты – узнясенне асобы чалавека над ідэалагічнымі шумамі. Але тут жа напрошваюцца контраргументы: Леапольд Стаф быў польскім патрыётам, тварыў у часы адчайнай барацьбы свайго народа за свабоду і незалежнасць і гэтыя грамадзянскія праблемы не абмінаў у творах, толькі падаваў іх пераасэнсаванымі ў кантэксце высокай духоўнасці, гуманізму, спажыткоўваў здабыткі неарамантызму і мадэрнізму, тых плыняў, на якіх ішла польская паэзія XX стагоддзя" [50, с.9].

Надзвычай арыгінальны польскі паэт Баляслаў Лесьмян таксама дачакаўся ў Беларусі дзве кнігі перакладаў: першая – "Пан Блішчынскі" (1994) ў перакладах А. Мінкіна і другая – "Выбраныя вершы" (2017). У прадмове да перашага выдання Сяргей Дубавец трапна-іранічна заўважыў: "Беларуская мова, спаткаўшы Лесьмяна, неяк ураз забылася на ўвесь свой савецкі досьвед і прагна дапала да эстэтыкі мадэрну, ажно млеючы часам ад асалоды. Гэтак марнаваная праз даўгі час жанчына дападае да свайго першага, патаемнага каханьня. Ад дотыку беларускага слова ажывае каменны грыфон на фасадзе старасьвецкага будынку, і маліньнік стаіць барвовы – так багата ў ім ягад, і так добра – да сьмерці. Бо прыйшоў пан бліскучы, блішчысты, пан Блішчынскі. Цяжкое прабуджэнне пасьля доўгага сну…" [32, с. 5].

Асобнай размовы патрабуе ў кантэксце заяўленай праблемы рэцэпцыя і друк твораў Чэслава Мілаша (1911-2004), польскага пісьменніка, паэта, літаратуразнаўцы, перакладчыка, які распачаў свой творчы шлях у міжваенны перыяд. На жаль, творчасць Чэслава Мілаша яшчэ мала вядома беларускаму чытачу, нягледзячы на тое, што ён з'яўляецца лаўрэатам Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры за 1980 год. З канца 1980-х гг. у атмасферы прадчування змен грамадска-палітычнага і духоўнага жыцця творы Чэслава Мілаша пачынаюць з'яўляцца і ў беларускім друку. На сённяшні дзень беларускі чытач мае магчымасць пазнаёміцца ледзь не з усёй спадчынай Нобелеўскага лаўрэата. Напрыклад, у 2011 годзе выйшла дзвюхмоўная кніга выбраных твораў Чэслава Мілаша "Іншага канца сьвету ня будзе" [16], куды ўвайшлі і вершы міжваеннага перыяду са зборнікаў "Паэма пра застылы час" (1933) і "Тры зімы" (1936), якія спалучылі ў сабе футурыстычныя эксперыменты, сюррэалістычную вобразнасць і экспрэсінісцкую паэтыку мастацкага мыслення маладога паэта (пераклады А. Разанава, Я. Чыквіна, Ю. Бушлякова, А. Хадановіча і інш.). Ігар Бабкоў, аўтар прадмовы да мілашаўскай кнігі, так акрэсліў самабытны характар яго творчасці ў міжваенны перыяд: "У трыццатыя ён пісаў катастрафічныя вершы і хацеў быць сучасным. І таму марыў вырвацца з задушлівай

крэольскай атмасфэры міжваеннага Вільно. Пакуль не натрапіў у Парыжы на свайго дзядзьку Оскара Мілаша з Чарэяў, зь беларускай галіны роду. Паэта, містыка, літвамана, кабаліста. Які навучыў яго, што ў кожнага свой час – і свая сучаснасць. У сямідзесятыя, у Каліфарнійскім Бэрклі, ён вырашыў быць верным. І таму пісаў пра гэтае самае Вільно, пра даліну Ісы, пра цывілізацыю, якая прамінула і якая наўрад ці, як ён уяўляў, на другім канцы сьвету была камусьці цікавая» [41, с. 6].

Наяўнасць шматлікіх перакладаў Чэслава Мілаша на беларускую мову стала імпульсам узнікнення новага узроўню асэнсавання і прысутнасці яго спадчыны: алюзіі ў творах сучасных беларускіх пісьменнікаў на асобу польскага Нобелеўскага лаўрэата (напрыклад, кніга Т. Скарынкінай “Шмат Чэслава Мілаша, крыху Элвіса Прэслі”).

На працягу трэцяга этапа рэцэпцыі і перакладаў польскіх пісьменнікаў 1918–1939 гг. з’явілася магчымасць пазнаёміцца з творамі раней невядомых у Беларусі, але вельмі папулярных польскіх авангардыстаў-празаікаў міжваеннага дваццацігоддзя: “Ferdydurke” Вітальда Гамбровіча [19], “Цынамонавыя крамы”, апавяданні і эсэ Бруна Шульца [57], фрагмент рамана С.І. Віткевіча “Неспатоленасць” [17]. Увагі заслугоўвае і выхад кнігі аповесцей і апавяданняў Яраслава Івашкевіча “Панны з Вілька” [25].

Знакавай падзеяй стала з’яўленне кнігі “Вар’ят і манашка. Польская драматургія XX стагоддзя” (Мінск, 2006), у якую ўвайшлі пераклады п’ес С.І. Віткевіча (“Вар’ят і манашка”, пераклад – Н. Русецкай), В. Гамбровіча (“Івона прынцэса Бургундская”, пераклад – Н. Русецкай), Т. Ружэвіча (“Майстар галадання адыходзіць”, пераклад – С. Кавалёва), С. Мрожака (“Эмігранты”, пераклад – М. Дубянецкага). Трэба адзначыць і такі спосаб прысутнасці і ўплыву польскай літаратуры міжваеннага дваццацігоддзя, як тэатральнае ўвасабленне. Паказальная ў гэтым плане драматургія В. Гамбровіча і С.І. Віткевіча. Можна сцвярджаць, што п’есы гэтых аўтараў, як і Славаміра Мрожака, на пэўным этапе з’явіліся каталізатарам тэатральных і драматычных пошукаў на Беларусі. Эстэтыка польскай драматургіі XX стагоддзя прама ці апасродкавана паўздзейнічала на айчынную тэатральную культуру, на творчасць некаторых беларускіх драматургаў (напрыклад, І. Сідарука). На падмостах розных тэатраў Беларусі атрымалі ўвасабленне п’есы В. Гамбровіча “Івона, прынцэса Бургундская” (2004 год, у інтэрпрэтацыі рэжысёра Аляксандра Гарцуева яна была акрэслена як “трагічны парадокс”) і “Шлюб” (рэжысёр – Аляксандр Янушкевіч), С.І. Віткевіча (“У малым двары” (“В маленькой усадьбе”), рэжысёр – Саўлюс Варнас (Магілёўскі драматычны тэатр), “Вар’ят і манашка” – сцэнічнае ўвасабленне ажыццявіў польскі рэжысёр Кшыштаф Ясінскі ў Рускім акадэмічным тэатры імя М.Горкага ў 1989 г.), якія атрымалі станоўчыя водгукі тэатральнай крытыкі. Праўда, гэтыя пастаноўкі патрабавалі і падрыхтаванага гледача.

Беларуская літаратуразнаўчая паланістыка, якая доўгі час знаходзілася пад прымусам заідэалагізаванасці, толькі ў гэты перыяд распачала адкрываць многіх пісьменнікаў Польшчы 1918–1939 гг., якія па месцы нараджэння і па тэматыцы творчасці моцна звязаныя з Беларуссю і якім было наканавана лёсам ўпрыгожыць польскі літаратурны Парнас – Мельхіёр Ваньковіч, Ян Булгак, Леанард Падгорскі-Аколаў, Міхал Паўлікоўскі, Фларыян Чарнышэвіч і інш. Гэтыя аўтары ў савецкі час не маглі быць прызнанымі на роднай зямлі па прычыне іх уключанасці ў складаныя палітычныя рэаліі XX стагоддзя.

Апошнім часам зведала рэнесанс у нацыянальнай культурнай прасторы спадчына беларуска-польскага пісьменніка Сяргея Пясецкага (1901–1964). Найперш прыцягальным выяўляецца экзатычна-прыгодніцкі элемент біяграфіі гэтага пісьменніка: ён – кантрабандыст на беларуска-польскай мяжы, а пасля ўсталявання Рыжскай дамовы 1921 г. – агент польскай разведкі. Сёння С.Пясецкі ў Беларусі – герой дакументальна-мастацкіх кіна- і тэлестужак, пра яго як пра самабытнага жыхара Мінска 20–30-гг. XX ст. расправядаюць беларускія экскурсаводы. Да гэтага часу з’явілася некалькі выданняў твораў С. Пясецкага або іх фрагментаў ў перакладзе на беларускую і рускую мовы. Тыя, што ўбачылі свет, – заслуга некалькіх перакладчыкаў: А. Астраўцова (“Запіскі афіцэра Чырвонай арміі”, 2005), Ф. Янушкевіча (“Каханак Вялікай Мядзведзіцы”, 2009), Я. Янушкевіча (“Пяты этап”, 2012), Г. Бенкевіч (“Человек, превращенный в волка”, “К чести организации”, абедзве – 2012, “Багам ночы роўныя”, “Каханак Вялікай Мядзведзіцы”, абедзве – 2019), Р. Равякі (“Жыццё раззброенага чалавека”, 2014). Некалькі ўрыўкаў з твораў пісьменніка ў перакладзе П. Рагойшы, В. Арэшкі, Р. Равякі, В. Наддзвінскага апублікавалі перыядычныя выданні Беларусі (“Полымя”, “Спадчына”, “Arche”).

Падзеяй літаратурна-мастацкага жыцця стала з’яўленне кніг-анталогій польскай паэзіі: у 1999 г. беларускім літаратурным аб'яднаннем “Белавежа” быў выдадзены зборнік польскай лірыкі XX ст. “Лісце срэбнай таполі” (укладальнік і перакладчык – Ян Чыквін); у 2003 годзе ўбачылі свет два томы перакладаў пад загалоўкам: “Напярэймы: ад Буга да Варты. Анталогія польскай паэзіі XX стагоддзя” (укладальнік і перакладчык – даследчык, паэт, знаўца польскай літаратуры Алег Лойка). Таксама зроблена ўдалая спроба перакладаў польскай дзіцячай паэзіі – цудоўна ілюстраваная кніга “Каляровая карова” (2007 г., перакладчыца – І. Кур’ян).

У 2012 годзе быў здзейснены поўны пераклад кнігі Януша Корчака “Król Maciuś Pierwszy”, якая падчас СССР па ідэалагічных прычынах друкавалася з купюрамі (на Беларускім радыё ў 2016 годзе раз на тыдзень беларускі слухач мог пачуць аўдыёверсію кнігі Корчака).

Бясспрэчна, што магчымасці Інтэрнэт-камунікацыі дапамагаюць міжкультурнаму дыялогу, спрыяюць самавыяўленню і самапрэзентацыі. Гэта адзін са сродкаў знаёмства іншамоўнага чытача з літаратурамі свету.

Прааналізаваўшы дадзены сегмент прысутнасці польскага прыгожага пісьменства ў беларускай Інтэрнэт-прасторы, можна вылучыць два блокі яго функцыянавання: 1) мастацкія тэксты; 2) літаратуразнаўча-крытычныя артыкулы і эсэ, прысвечаныя пытанням развіцця і гісторыі літаратуры Польшчы. Асабліва шматстайна і нетрадыцыйна прадстаўлена польская паэзія на старонках інтэрнэт-часопіса перакладной літаратуры “ПрайдзіСвет” (год заснавання – 2008), на віртуальным рэсурсе якога чытач можа прачытаць па-беларуску творы Ю. Тувіма, Б. Лесьмяна, Ч. Мілаша, Я. Леханя, К.К. Бачынскага і ішых польскіх аўтараў.

Найбольш вядомымі і шчырымі папулярызатарамі і знаўцамі польскай літаратуры 1920–30-х гг. былі і застаюцца Я. Брыль, М. Танк, М. Лужанін, А. Лойка, У. Мархель, І. Багдановіч, А. Вялюгін, В. Сёмуха, Я. Семяжон, С. Дзяргай, Э. Агняцвет і многія іншыя перакладчыкі, якія не толькі добра ведалі польскае прыгожае пісьменства, творчасць многіх аўтараў, выказвалі свой пункт гледжання па тых ці іншых праблемах літаратурнага жыцця, перакладалі, але і зафіксавалі ў сваёй творчасці многія актуальныя з’явы і імёны літаратуры Польшчы.

Падводзячы вынікі, адзначым, што беларускія пісьменнікі, крытыкі і перакладчыкі на працягу акрэсленага ў тэме перыяда прысвяцілі дастатковую колькасць даследаванняў і аглядаў творчасці польскім майстрам слова міжваеннага дваццацігоддзя, шмат і якасна перакладалі польскую літаратуру, што стала адчувальным чыннікам беларускай кніжнай прасторы. Але айчынны чытач чакае яшчэ цэлую кагорту польскіх аўтараў 1918–1939-х гадоў, творы якіх яшчэ не перакладаліся на беларускую мову – З. Налкоўская, М. Радзевіч, Е. Анджаеўскі, Ю. Кадэн-Бандроўскі, Т. Пайпер і інш.

Такім чынам, мы можам убачыць, што ў сацыякультурнай прасторы Беларусі прысутнічаюць пераклады твораў асобных польскіх аўтараў 1918–1939 гг., але асаблівая цікавасць назіраецца да ўраджэнцаў беларуска-польскага памежжа, якія зафіксавалі ў сваіх творах яго самабытны тэрытарыяльны, сацыяльна-палітычны, гісторыка-культурны, шматнацыянальны характар.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ад Буга да Одры : апавяданні польскіх пісьменнікаў. Мінск, 1969. 440 с.
2. «Адчыню табе я золак…» : нізка вершаў польскіх паэтаў XX ст. Полымя, 2001. №12. С. 158–166 (пераклад А. Лойкі); На вершинах: Из польской поэзии XX века. Неман, 2001. №5. С. 137–148 (перевод В.Тараса).
3. *Бранеўскі У.* Дарогай дзён: Вершы і паэмы. Мінск, 1961. 220 с.
4. *Віткевіч С.І.* Неспатоленасць: Раздзел 2: Вечарына ў княгіні Цыкандэрога // Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры. 1996. №1. С. 114–128.
5. *Галчыньскі К.І.* Сёмае неба. Выбраныя творы : пер. з польск. Мінск, 2006. 329 с.
6. *Гамбровіч В.* Ferdydurke: раман. Мінск, 2009. 266 с .
7. *Гаўрук Ю.* Кветкі з чужых палёў. Пераклады. Мінск, 1928. 107 с.

8. *Івашкевіч Я*. Дзяўчына і галубы : апавяданні. Мінск, 1977. 54 с.
9. *Івашкевіч Я.* Панны з Вілька : аповесці і апавяданні. Мінск, 2006. 402 с.
10. *Калеснік У.* Максім Танк. Нарыс жыцця і творчасці. Мінск, 1981. 189 с.
11. *Лесьмян Б.* Пан Блішчынскі. Вільня-Мінск, 1994. 93 с.
12. *Лойка А.* Роўнакутны трохвугольнік, або Ад Палямона да Максіма Танка. Дапаможнік па спецкурсе «Беларуска-руска-польскія літаратурныя сувязі». Мінск, 2003. 214 с.
13. *Лойка А.А.* Польска-беларускія літаратурныя кантакты першай паловы XX стагоддзя // Славянскія літаратуры ў сусветным кантэксце : Маэрыялы III Міжнароднай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (Мінск, 18–20 лістапада 1997 г.). У 2 ч. Ч.1. Мінск : БДУ, 1999. С. 6–9
14. *Мілаш Ч.* Іншага канца сьвету ня будзе. Выбраныя творы. Менск, 2011. 352 с.
15. *Мусіенка С.* Генрых Сянкевіч на Беларусі // Powieść historyczna dawniej i dziś. Kraków : Wydawnictwo naukowe Akademii Pedagogicznej, 2007. S. 334–343.
16. *Пушкарэвіч К.* Юліан Тувім (поэта сучасны Польшчы) // Узвышша. 1928. №3. С.158–164.
17. *Стаф Л.* Высокія дрэвы. Мінск, 1994. 131 с.
18. Табе, Беларусь. Паэты свету пра Беларусь. Мінск, 1968. 230 с.
19. *Шульц Б.* Цынамонавыя крамы : выбраная проза. Мінск, 2006. 176 с.
20. *Ясенскі Б.* Слова пра Якуба Шелю. Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, ЛіМ, 1932. 34 с.

МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАЛАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

МАЎЛЕНЧЫ ЭТЫКЕТ ВА ЎВОДНЫМ КУРСЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

Г.М. Валочка

Нацыянальны інстытут адукацыі,
вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь;
Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў,
вул. Мачандаа, 117, 300204, г. Цяньцзінь, КНР,
h.valochka@mail.ru

Работа прысвечана праблеме авалодання замежнымі студэнтамі этыкетнымі формуламі (этыкемамі), якія выкарыстоўваюцца носьбітамі мовы ў штодзённых сітуацыях зносін і дазваляюць уключыцца ў працэс міжкультурнай камунікацыі, захоўваючы выпрацаваныя грамадствам нацыянальна спецыфічныя і гістарычна зменлівыя правілы маўленчых паводзін. Прыводзіцца праца з беларускімі этыкетнымі формуламі вітання, развітання, знаёмства, падзякі, прабачэння ва ўводным курсе беларускай мовы для кітайскіх студэнтаў, заснаваная на мадэляванні сітуацый маўлення з выкарыстаннем дыялогу.

Ключавыя словы: маўленчы этыкет; этыкетныя формулы; беларуская мова як замежная; уводны курс; мадэляванне сітуацый; афіцыйныя зносіны; неафіцыйныя зносіны.

Асноўнай мэтай навучання замежным мовам (у тым ліку беларускай як замежнай) прызнаецца фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі як «здольнасці вырашаць сродкамі замежнай мовы актуальныя для навучэнцаў і грамадства задачы зносін з бытавога, вучэбнага, вытворчага і культурнага жыцця; уменне навучэнца карыстацца фактамі мовы і маўлення для рэалізацыі мэтаў зносін» [1, с. 109].

Ужо з першых заняткаў працэс навучання кітайскіх студэнтаў беларускай мове накіраваны на фарміраванне ўменняў і навыкаў звязнага маўлення: адказы на пытанні па змесце прачытаных і ўспрынятых на слых тэкстаў, удзел у дыялогах, складанне невялікіх выказванняў па ўзоры, па пытаннях выкладчыка, па малюнку. Такая падача вучэбнага матэрыялу дазваляе далучаць студэнтаў да маўленчых зносін на беларускай мове і тым самым рэальна ажыццяўляць камунікатыўную накіраванасць навучання.

Актуальнай на пачатковым этапе з’яўляецца праблема засваення навучэнцамі этыкетных формул (этыкем), якія выкарыстоўваюцца носьбітамі мовы ў штодзённых сітуацыях зносін: прывітанне, развітанне, знаёмства, падзяка, прабачэнне і г.д. Засваенне такіх формул маўленчага этыкету неабходна перш за ўсё для ўстанаўлення, падтрымання і завяршэння кантакту. Пад маўленчым этыкетам разумеецца сукупнасць правіл, якія рэгулююць маўленчыя паводзіны, а таксама сістэма спецыфічных і ўстойлівых этыкетных формул, якія прыняты канкрэтным грамадствам для ажыццяўлення маўленчага ўзаемадзеяння.

Маўленчы этыкет – важны элемент любой нацыянальнай культуры. У мове, маўленчых паводзінах, устойлівых этыкетных формулах адлюстроўваецца багаты народны вопыт, непаўторнасць звычаяў, ладу жыцця, умоў побыту кожнага народа.

Авалоданне нормамі маўленчага этыкету, якія перадаюць асаблівасці беларускага нацыянальнага характару, спецыфічныя асаблівасці мыслення і нацыянальнай спецыфікі культуры і самой сістэмы беларускай мовы, уяўляецца адной з асноўных задач фарміравання ў студэнтаў культуры маўленчых зносін. Задача выкладчыка беларускай мовы як замежнай – навучыць студэнтаў дарэчы карыстацца стандартнымі этыкетнымі формуламі, якія адпавядаюць пэўным сітуацыям зносін. Таму ўжо на пачатковым этапе навучання спецыяльнай увагі патрабуе ўвядзенне ва ўласную маўленчую практыку студэнтаў формул беларускага маўленчага этыкету. З рускімі этыкетнымі адзінкамі студэнты, якія вывучаюць беларускую мову ў Кітаі, ужо знаёмыя. Для іх ужо прывычны зварот да выкладчыка па імені і імені па бацьку, хоць у кітайскай мове не прыняты, нават лічыцца няветлівым, такі традыцыйны для этыкету беларусаў зварот. Актуальным жа для кітайцаў з’яўляецца ўказанне пры звароце на сацыяльны статус суразмоўцы, таму зварот “Выкладчык, можна выйсці?” тыповы для кітайскай аўдыторыі на першых этапах навучання.

Як справядліва адзначаюць Я.М. Верашчагін і В.Г. Кастамараў, праца па засваенні замежнымі навучэнцамі правілаў маўленчых паводзін бывае вельмі карпатлівай, у ёй няма дробязей. А ў некаторых выпадках тлумачэнні, звязаныя з прынятымі штодзённымі нормамі, прама закранаюць вельмі істотныя светапоглядныя і этычныя праблемы [5]. Так, напрыклад, у Кітаі вельмі распаўсюджаныя і “лічацца стылістычна нейтральнымі звароты *бабуля* і *дзядуля*, якія кітайскі студэнт можа адрасаваць і расійскім выкладчыкам пажылога ўзросту, тым самым груба парушаючы правілы рускага маўленчага этыкету” [6, с. 208].

Важнасць валодання правіламі маўленчага этыкету, а таксама асэнсаванне спецыфікі беларускага маўленчага этыкету вымагае ўключэння адпаведнага матэрыялу ў курс беларускай мовы як замежнай. Так, ужо ва ўводным курсе беларускай мовы [4] кітайскія студэнты знаёмяцца з беларускімі формамі ***вітання*** (*Прывітанне! Добры дзень! / Дзень добры!*

Добры вечар! / Вечар добры!), ***развітання*** (*Бывай(-це)! Бывайце здаровы! Усяго добрага (найлепшага)!* і інш.*)*, ***падзякі*** (*Дзякую. Шчыра дзякую. Дзякуй!* і інш.), ***прабачэння*** (*Даруйце. Прабачце. Прашу прабачэння*). Засваенню падлягаюць і этыкетныя формулы, якімі абменьваюцца пры сустрэчы (*Як маешся? Як маецеся? Як жывеш? Што новага?* і інш.) і адказы на іх (*Дзякуй, добра. А як ты (Вы)?* і інш.), формулы маўленчага этыкету за сталом (*Смачна есці! – Узаемна!* і інш.).

Напрыклад, пры азнаямленні з беларускімі формамі прывітання *Вітаю Вас! Прывітанне! Добры дзень / Дзень добры! Добры вечар / Вечар добры!* і інш. неабходна звярнуць увагу студэнтаў на тое, што прывітанне, звернутае да роднага або блізкага чалавека, вызначаецца цеплынёй і сардэчнасцю, а да выкладчыка, да чалавека старэйшага ўзросту – карэктнасцю і пачцівасцю.

Пры засваенні этыкетных формул знаёмства адзначаецца, што ў афіцыйнай сітуацыі знаёмства этыкетная формула пачынаецца звычайна са слова дазвольце: *Дазвольце пазнаёміцца. Дазвольце з вамі (з табой) пазнаёміцца. Я хацеў бы (хацела б) з вамі пазнаёміцца*. У неафіцыйнай сітуацыі (паміж людзьмі, блізкімі па ўзросце ці статусе) выкарыстоўваюцца наступныя этыкетныя формулы: *Знаёмцеся! Пазнаёмся! Пазнаёмцеся!* (калі знаёмства адбываецца па ініцыятыве трэцяй асобы) і *Будзем знаёмыя. Давай(це) пазнаёмімся. Я хацеў бы (хацела б) з вамі (з табой) пазнаёміцца* (калі знаёмства адбываецца па ініцыятыве першай асобы).

Адначасова студэнты знаёмяцца са словамі і выразамі, якімі людзі звычайна абменьваюцца пасля знаёмства: *Вельмі прыемна! Вельмі рад (рада, рады) з вамі пазнаёміцца! Будзем знаёмыя. Рады (рада) знаёмству. Прыемна пазнаёміцца* і інш.

Вялікая роля ў маўленчым этыкеце беларусаў заўсёды надавалася не толькі прывітанню, але і развітанню. С. Важнік вылучае некалькі груп формул развітання паводле іх значэння: развітанні-пажаданні; развітанні з указаннем на сустрэчу ў будучыні з тым, з кім развітваюцца; развітанні-перфаматывы; развітанні-эматывы; развітанні-просьбы [2]. Таму пажадана данесці да замежных студэнтаў розніцу ў выбары развітання ў залежнасці ад маўленчай сітуацыі. Так, у развітаннях-пажаданнях утрымліваецца пажаданне таму, з кім развітваюцца: *Бывайце (будзьце) здаровы! Заставайцеся здаровы! Добрага Вам здароўя!* Этыкетныя формулы *Да пабачэння! Да спаткання! Да (хуткай) сустрэчы! Да новай сустрэчы! Да новага спаткання!* указваюць пры развітанні на сустрэчу ў будучыні з тым, з кім развітваюцца. З іх дапамогай выказваецца надзея на новую сустрэчу, таму так не гавораць, напрыклад, пры наведванні ўрача, калі толькі мы не плануем чарговы візіт да яго.

У адказ каму-небудзь за аказанне якой-небудзь паслугі, за дапамогу ці падтрымку можна ўжыць нейтральныя *Дзякуй! Дзякую вам! Вялікі дзякуй!* і больш эмацыйныя, экспрэсіўныя этыкетныя формулы: *Вялікі дзякуй!*

Шчыры дзякуй вам (табе) за … Вельмі ўдзячны! (Я) вельмі (так) удзячны вам! Я ўдзячны вам за тое, што… Няма слоў, каб выказаць вам (табе) маю падзяку і інш. У афіцыйных абставінах гавораць: *Дазвольце падзякаваць…; Дазвольце выказаць (шчырую) падзяку* …

Для адказу на словы падзякі ў беларускай мове выкарыстоўваюцца наступныя маўленчыя формулы: *Калі ласка. Не варта. Не трэба дзякаваць. Мне было вельмі прыемна вам дапамагчы. На здароўе (*у адказ на падзяку за пачастунак) і інш.

Этыкетныя формулы прабачэння (даравання), аснову якіх складаюць дзеясловы *прабачаць, выбачаць, дараваць,* «істотна адрозніваюцца паміж сабой у плане функцыянавання. Выбар дзеяслова (і, адпаведна, "выбачальнай" формулы) залежыць ад таго, наколькі вялікая і малая "віна" моўцы перад "пакрыўджаным", "абураным" і г. д. суразмоўцам» [3, с. 56]. Сярод іх могуць быць як дастаткова нейтральныя этыкетныя формулы тыпу *Прабач(це)! Выбачай(це)! Прабач(це), калі ласка! Калі ласка, прабач(це)! Даруй(це)! Даруй(це) (мне), калі ласка!,* так і эмацыянальна-экспрэсіўныя або з тлумачэннем ці прызнаннем сваёй віны: *Выбачайце (даруйце), калі можаце! Абяцаю, што гэта было апошні раз! Выбачайце (даруйце) за...! Выбачайце за спазненне!/ Прашу прабачэння, што прымусіў вас чакаць! Гэта мая віна! Вельмі вас перапрашаю!* і г.д.

Выражэнне ветлівасці ў беларускім маўленчым этыкеце перадаецца праз этыкетныя формулы *калі ласка, будзь (будзьце) ласкавы, зрабіце ласку* і інш., якія характарызуюцца камунікатыўнай шматфункцыянальнасцю; яны ўжываюцца амаль ва ўсіх этыкетных сітуацыях і "выступаюць або ў пазіцыі дадатку да асноўнай этыкетнай формулы, якая павінна стварацьтанальнасць ласкавай далікатнасці, ветлівасці, уважлівасці, або ў якасці самастойнай рэплікі, што прымае на сябе ўсю зместавую нагрузку: выражае і камунікатыўны намер моўцы" [7, с. 27]. Пытаючыся *Колькі часу? Як прайсці?* таксама прынята папярэдне выказаць просьбу: *Скажыце, калі ласка, …; Будзьце ласкавы, дапамажыце …; Ці не маглі б вы сказаць …* і г.д.

Кітайскія студэнты звычайна вывучаюць беларускую мову пасля рускай, таму ў адукацыйным працэсе неабходна акцэнтаваць увагу на тым, што аднолькавыя камунікатыўныя намеры ў рускай і беларускай мовах могуць выражацца па-рознаму. Напрыклад, бел. *Дазвольце пазнаёміць Вас з…* і рус. *Позвольте представить Вам …* (знаёмства); бел. *Зрабіце ласку* і рус. *Сделайте одолжение* (як спроба звярнуць увагу); бел. *Вельмі ўдзячны, Шчыра дзякую Вам* і рус. *Большое спасибо, Искренне благодарю Вас* (падзяка). Абавязкова звяртаецца ўвага на тое, што па-беларуску трэба дзякаваць не каго, а каму (*дзякую вам),* прабачаць не каго, а каму (*прабачце / даруйце мне)*.

Найбольш эфектыўнай формай працы з формуламі маўленчага этыкету з'яўляецца дыялог (спачатку студэнты слухаюць і чытаюць прапанаваныя дыялогі, потым дапаўняюць дыялог патрэбнымі рэплікамі, затым

адказваюць на пытанні выкладчыка і толькі пасля гэтага працуюць у парах, рэалізуючы пэўную камунікатыўную сітуацыю (вітання, прабачэння, развітання і г.д.), пасля чаго паведамляюць аўдыторыі, пра што яны даведаліся ад свайго суразмоўцы ў пары).

З мэтай азнаямлення з правіламі ўжывання ў беларускай мове займенніка ў *ты, вы (Вы)* студэнтам прапаноўваецца заданне вызначыць, да каго звяртаюцца (аднаго ці некалькіх людзей, знаёмага ці незнаёмага):

Антон, прывітанне! Як жывеш?

Дзяўчаты, добры дзень! Запрашаю вас заўтра ў госці.

Дзень добры, Віктар Іванавіч! Дазвольце пазнаёміць Вас з маім бацькам Пятром Вітальевічам. Ён перакладчык.

Такім чынам студэнты засвойваюць, што займеннік “ты” выкарыстоўваецца ў сітуацыі роднасных, сяброўскіх, нефармальных, нават фамільярных зносін, займеннік “вы” – ветлівых, паважлівых, афіцыйных, «чужых» зносін, а “Вы” – у пісьмовым маўленні (у афіцыйных абставінах ці з мэтай перадачы паважлівых адносін).

З мэтай замацавання прапануецца прачытаць рэплікі дыялогаў і вызначыць, які з займенніка ў, што ў дужках, трэба выкарыстаць пры размове:

Добры дзень, Галіна Антонаўна! Дазвольце (цябе, вас, Вас) пазнаёміць з маім братам Аляксеем. Ён лётчык.

Павел, вітаю (цябе, вас, Вас)! Як жыццё?

О, дзяўчаты! Вітаю (цябе, вас, Вас)! Пазнаёмцеся, калі ласка. Гэта мая новая сяброўка. Яе завуць Ангеліна. Яна таксама студэнтка.

У працэсе навучання маўленчаму этыкету кітайскіх студэнтаў метадычна апраўданым з’яўляецца мадэляванне сітуацый маўлення, якія могуць быць стандартнымі, якія таксама называюць стабільнымі, і варыябельнымі, або зменнымі [5], калі паводзіны чалавека вызначаюцца зменлівымі кампанентамі сітуацыі: сацыяльна-асобаснымі ўзаемаадносінамі суразмоўцаў, іх агульнаадукацыйным узроўнем, ступенню знаёмства і г. д.

Стандартныя сітуацыі прадвызначаюць, **што** ў пэўных абставінах трэба гаварыць. Аднак, напрыклад, сітуацыя «Прывітанне» ў адным выпадку патрабуе выкарыстання звароту “Прывітанне, Віктар!”, а ў іншым – “Добры дзень, Аляксандр Іванавіч!”. Выбар фразы-клішэ ў такім выпадку дастаткова прадказальны, аднак мадэляванне такіх сітуацый, калі форма маўлення залежыць ад канкрэтных абставін, з’яўляецца абавязковым элементам працэсу навучання замежных студэнтаў. Усё гэта патрабуе ўліку ў працэсе навучання экстралінгвістычных і лінгвістычных асаблівасцей, характэрных для розных стыляў маўлення.

Нягледзячы на тое што ў курсе беларускай мовы як замежнай вывучаецца літаратурная мова, ужо ва ўводным курсе адбываецца размежаванне афіцыйнага і гутарковага маўлення. Як ужо адзначалася, пры азнаямленні студэнтаў, напрыклад, з формуламі маўленчага этыкету прывітання і развітання (*Добры дзень! – Прывітанне!, Да пабачэння! – Бывай!*), знаёмства (*Дазвольце пазнаёміцца з Вамі… – Давай пазнаёмімся…*), звароту на “ты” і “вы (Вы)” і інш. абавязкова акцэнтуецца ўвага на іх ужыванні ў розных сітуацыях маўленчых зносін.

Такім чынам, праца на занятках з матэрыялам па беларускім маўленчым этыкеце, веданне асноўных этыкетным нормаў, якія закладзены ва ўсіх сферах нацыянальнай культуры і асабліва ў мове (этыкетныя формулы і клішэ, жэсты і міміка, інтанацыя), дазваляе студэнтам засвоіць лінгвакультурныя адрозненні паміж беларускай і кітайскай мовамі і ўключыцца ў працэс міжкультурных зносін, захоўваючы выпрацаваныя грамадствам нацыянальна спецыфічныя і гістарычна зменлівыя правілы маўленчых паводзін.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Азимов Э.Г.* Словарь методических терминов / Э.Г. Азимов, А.Н. Щукин. СПб. : Златоуст, 1999. 471 с.

2. *Важнік С.А.* Здароў! – Здароў, калі змалоў! Этыкетныя формулы вітання і развітання // Роднае слова. 2008. № 3. С. 53–56.

3. *Важнік С.А.* Навука выбачаць, або як правільна па-беларуску прасіць прабачэння і як выбачаць // Роднае слова. 2008. № 6. С. 56–59.

4. *Валочка Г.М.* Беларуская мова як замежная. Уводны курс для кітайскіх навучэнцаў 白俄罗斯语入门教程 / Г.М. Валочка, Фу Мэйянь, Юань Хаа. Мінск : Вышэйшая школа, 2020. 94 с.

5. *Верещагин Е.М.* Язык и культура : Лингвострановедение в преподавании русского языка как иностранного / Е.М. Верещагин, В.Г. Костомаров. 4-е изд., перераб. и доп. М. : Рус. яз., 1990. 246 с.

6. *Гуанцзе Чжэн.* Лингвокультурные отличия как основа обучения китайских студентов русскому языку // Филологические науки. Вопросы теории и практики. Тамбов : Грамота, 2015. № 12 (54) : в 4-х ч. Ч. 4. С. 205–208.

7. *Піваварчык Т. А.* Ласкавае слоўка, як сонейка, грэе: пра ўжыванне ўстойлівых выразаў са словамі ласка, ласкавы, ласкава // Роднае слова. 2002. № 10. С. 27–30.

МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК РЭАЛІЗАЦЫІ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ

С. Д. Грынько

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
вул. Э. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь,
s.grinko@inbox.ru

Прэярытэтнай задачай у педагагічным працэсе пры рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу з'яўляецца развіццё індывідуальнасці навучэнца, яго сацыялізацыя, самавызначэнне ў грамадстве. Выкарыстанне музейна-педагагічнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры садзейнічае спасціжэнню школьнікамі сваёй уласнай сутнасці праз вывучэнне твораў нацыянальнага мастацтва, этнічнай культуры, што з'яўляецца асновай для самапазнання і самаактуалізацыі іх у соцыуме.

Ключавыя словы: кампетэнтнасны падыход; музейна-педагагічная дзейнасць; музейная педагогіка; беларуская літаратура.

Працэс выхавання маладога пакалення ў XXI стагоддзі набывае асаблівую важнасць, зыходзячы з рэалій сучаснага грамадства: наступствы глабалізацыі і інфарматызацыі ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, тэхнічны прагрэс і пагаршэнне экалагічнай сітуацыі на планеце. У эпоху хуткасных сацыяльна-эканамічных змен актуальнай для падрыхтоўкі навучэнскай моладзі да жыцця ў грамадстве з'яўляецца арыентацыя іх на агульначалавечыя каштоўнасці, заахвочванне да сацыяльна значымай і творчай працы.

Музей – інстытут соцыуму, які выконвае ролю захавальніка каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам, што напамінаюць грамадзянам аб іх гістарычных каранях і нацыянальным багацці. Ва ўмовах рынкавых адносін, канкурэнцыі, росту спажывецкіх інтарэсаў, калі абвастраецца недахоп гуманнасці, спагады, дабрыні, маральнасці людзей, музей выступае той інстанцыяй, якая здольна скіраваць чалавека да найлепшых узораў яго дзейнасці, да культурных здабыткаў. Для гэтай установы, па словах рускага філосафа М. Ф. Фёдарава, не існуе таго, што «ўваскрасіць і ажывіць немагчыма», таму музей можа і павінен «вяртаць жыццё» [9, с. 10].

Адукацыйная дзейнасць «храма музаў» (грэч. museion, літаральна храм музаў) вывучаецца асобнай галіной ведаў – музейнай педагогікай, якая даследуе гісторыю, асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, метады ўздзеяння іх на розныя катэгорыі наведвальнікаў, узаемадзеянне з адукацыйнымі ўстановамі [3]. Даследчык А. Г. Ванслава падкрэслівае важнасць эмацыянальнага ўплыву сродкаў «храма музаў» на наведвальнікаў, адзначаючы, што ўвесь свет можна разглядаць як музей. Згодна яе меркаванню, музейная педагогіка – перш за ўсё методыка і

тэхналогія работы з людзьмі, з іх свядомасцю, з дапамогай музейных сродкаў [2, с. 25]. Б. А. Сталяроў вызначае музейную педагогіку як «галіну навукова-практычнай дзейнасці сучаснага музея, арыентаваную на перадачу культурнага вопыту праз педагагічны працэс ва ўмовах музейнага асяроддзя», якое ў адрозненні ад школьнага з'яўляецца ўнікальным, бо ў музеі сама атмасфера «валодае эстэтычнай аўрай, мастацкім і творчым зместам, а значыць – магутным духоўным патэнцыялам» [6, с. 106].

У Беларусі музейная педагогіка развіваецца ў рэчышчы асветніцкай і адукацыйнай дзейнасці музеяў розных профіляў. Праграмы гэтых устаноў змяшчаюць шэраг форм працы з аўдыторыяй, якія ўключаюць як традыцыйныя, так і шматлікія інтэрактыўныя метады ўзаемадзеяння з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў, найбольш з дзіцячай і юнацкай аўдыторыяй.

Значэнне музейна-педагагічнай дзейнасці для адукацыйнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь падкрэсліваецца ў «Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2016–2020 гады». У канцэптуальна-праграмным дакуменце вызначаны шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму ў выхаванцаў устаноў адукацыі. Сярод найбольш важных з іх называецца выкарыстанне сродкаў музейнай педагогікі, што ўключае развіццё сеткі школьных музеяў, арганізацыю даследчай працы на іх базе, папаўненне экспазіцыі гэтых устаноў, правядзенне конкурсу віртуальных музеяў [5]. Важнасць выкарыстання адукацыйнай дзейнасці музея ў педагагічным працэсе вынікае са спецыфікі ўплыву гэтай установы на светапогляд асобы шляхам пагружэння яе ў спецыяльна арганізаванае прадметна-прасторавае асяроддзе, якое змяшчае ў сабе творы мастацтва і помнікі прыроды, экзатычныя прадметы і гістарычныя рэліквіі [8, с. 23].

На сучасным этапе развіцця сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі выкарыстанне музейна-педагагічнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры дазваляе далучыць навучэнца да духоўнай культуры, што дазволіць асобе лепш зразумець сваю прыродную сутнасць праз спасціжэнне эстэтычнага ідэалу, створанага чалавецтвам. Літаратура як мастацтва слова з'яўляецца «дзейсным сродкам маральнага выхавання асобы з багатым духоўным светам, гуманістычным поглядам на рэчаіснасць, далучанай да беларускай культуры і іншых народаў свету, з жывым крытычным мысленнем, выразна сфарміраванымі жыццёвымі інтарэсамі і каштоўнасцямі» [7, с. 52]. Літаратура – неад'емная частка грамадства. Менавіта ў ёй засяроджаны сацыяльны, гістарычны і асабісты вопыт у спасціжэнні свету. Дзякуючы літаратуры чалавек падтрымлівае сувязь з папярэднімі пакаленнямі, мае магчымасць пераймаць іх каштоўнасці і лепш разумець структуру светабудовы.

Трэба адзначыць, што асоба, пазнаючы праз розныя віды мастацтва (у тым ліку і літаратуру) уласную сутнасць, дадзеную ёй ад нараджэння, пачынае лепш разумець менталітэт свайго народа, нацыянальны характар, які абумоўлівае паводзіны чалавека. Таму вельмі важна, на наш погляд, далучаць навучэнца да этнічнай культуры, якая з'яўляецца падмуркам да самаадукацыі і рэалізацыі сябе ў грамадстве.

На сённяшні дзень кампетэнтнасны падыход выступае прыярытэтным напрамкам працэсу адукацыі, які рэалізуе задачы дэсацыялізацыі асобы на аснове яе самапазнання і самаактуалізацыі, і адначасова з'яўляецца канцэптуальнай асновай для рэалізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці пры засваенні зместу вучэбных дысцыплін.

У навуковай літаратуры кампетэнтнасны падыход разглядаецца як «арыентацыя адукацыі на яе вынікі: фарміраванне неабходных агульнакультурных і прафесійных кампетэнцый, самавызначэнне, сацыялізацыю, развіццё індывідуальнасці і самаактуалізацыю» [8, с. 7].

На думку С. Л. Траянскай, вельмі важна пры засваенні гуманітарных ведаў абапірацца на пачуццёвае ўспрыманне інфармацыі: эмпатыю, інтуітыўна-эмацыйнае пранікненне ў сакральны сэнс, які не можа быць дасягальны для звычайных рацыянальных шляхоў навуковага пазнання [8, с. 12]. На наш погляд, выкарыстанне адукацыйных магчымасцей музея пры вывучэнні беларускай літаратуры забяспечвае «пагружэнне» асобы ў каштоўнасную сутнасць матэрыялу за кошт візуалізацыі, эстэтычнага і культурнага ўздзеяння музейнага асяроддзя. Такім чынам ствараюцца ўмовы для лепшага разумення сэнсу, зместу, ідэйнай сутнасці вывучаных твораў. У гэтай сувязі на ўроках беларускай літаратуры пры арганізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці мэтазгодны зварот да такіх метадаў навучання, як метад творчага чытання, эўрыстычны, даследчы, рэпрадуктыўны метад [1, с. 19–20]. Акрамя таго, наладжванне адукацыйнага працэсу сумесна з музеем можа быць забяспечана пры наступных умовах:

- кожнае наведванне музея мае канкрэтную адукацыйную мэту;
- настаўнік і навучэнцы павінны ўсвядоміць, што наведванне музея не забаўка, а сур'ёзная праца, а таму трэба да яе рыхтавацца;
- арганізоўваць супрацоўніцтва з музеем трэба пасля папярэдняй падрыхтоўкі і ў працэсе школьных заняткаў, калі навучэнцы не стаміліся і гатовыя да ўспрымання;
- варта адмовіцца ад аглядных экскурсій як складанай формы працы як для школьнікаў, так і для дарослых;
- адбіраць экспанаты для экскурсійнага паказу трэба з улікам узроставых інтарэсаў навучэнцаў;
- вынікам музейна-педагагічнай дзейнасці становіцца творчасць школьнікаў (малюнак, сачыненне на тэму ўбачанага, стварэнне мадэляў і г. д.) [6, с. 28].

Зыходзяч ы з асноўных палажэнняў кампетэнтнаснага падыходу намі распрацавана сістэма заданняў па рэалізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці пры навучанні беларускай літаратуры (схема № 1 і № 2).

Схема 1: Асноўныя віды вучэбнай дзейнасці

А С Н О Ў Н Ы Я В І Д Ы В У Ч Э Б Н А Й Д З Е Й Н А С Ц І			
Метад творчанга чытання	**Рэпрадуктыўны метад**	**Эўрыстычны метад**	**Даследчы метад**
чытанне	складанне планаў	канструяванне вучнёўскага мэтавызначэння	самастойны аналіз матэрыялу
ілюстраванне	састаўленне сінхранічных табліц	фармуляванне эўрыстычных пытанняў	супастаўленне
пераказы	падрыхтоўка вусных адказаў	пастаноўка і вырашэнне праблем	назіранне
водгукі	слуханне	рэфлексія	падрыхтоўка рэфератаў

Схема 2: Тыпы заданняў

Т Ы П Ы З А Д А Н Н Я Ў			
Метад творчанга чытання	**Рэпрадуктыўны метад**	**Эўрыстычны метад**	**Даследчы метад**
чытанне вершаў, звязаных з экспазіцыяй музея;	апрацоўка інфармацыі, атрыманай у музеі;	напісанне розных відаў творчых прац на аснове музейнай экспазіцыі пасля наведвання;	вывучэнне гісторыі жыцця пісьменніка і стварэнне віртуальнага музея;
ілюстраванне лёсу асобы, падзеі праз чытанне верша на матэрыяле музейнай экспазіцыі;	выкарыстанне інфармацыі з сайтаў музеяў;	выкананне творчых заданняў на матэрыяле сайта музея: буклет, рэклама, афіша і інш.;	вывучэнне гісторыі сваёй сям’і, роду і стварэнне музея сям’і;
пераказ убачанага ў музеі і выразнае чытанне верша, якое адпавядае музейнаму асяроддзю	агляд віртуальных тураў па музеі	стварэнне віртуальнага музея асобы галоўнага героя твора, мясцовасці яго жыхарства на матэрыяле вучэбнага дапаможніка, дадатковай літаратуры,	напісанне навукова-даследчых прац на аснове музейных матэрыялаў

		вучэбнага кантэнту ў электронным адукацыйным рэсурсе (http://e-vedy.adu.by/)	

Такім чынам, музейна-педагагічная дзейнасць на ўроках беларускай літаратуры разглядаецца з пазіцый кампетэнтнаснага падыходу і заключаецца ў стварэнні ўмоў для фарміравання ў навучэнцаў сацыяльнага вопыту за кошт далучэння асобы да духоўнай культуры свайго народа і чалавецтва. Уключэнне адукацыйных сродкаў музея ў працэс навучання літаратуры ўяўляецца магчымым, што ў сваю чаргу спрыяе наладжванню культурна-гістарычнага дыялогу, укараненню новых метадаў і форм работы па фарміраванні ў падрастаючага пакалення кампетэнцый, неабходных ім для паўнавартаснага жыцця ў высокатэхналагічным і хутказменным свеце.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларуская літаратура ў школьным выкладанні: вучэбна-метадычны дапаможнік / А. В. Руцкая, М. У. Грынько, М. Г. Бубешка. Гродна : Выд-ва УА «Гродзенскі ДАІПК і ПКР і СА», 2006. 106 с.

2. *Ванслова Е. Г.* Музейная педагогика в XXI веке // Мир музея. 2005. № 3. С. 25–27.

3. Музейная педагогика [Электронный ресурс] // Педагогический терминологический словарь. URL: http://pedagogical_dictionary.academic.ru (дата обращения: 12.03.2019).

4. *Праскаловіч В. У.* Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V–XI класы). Праект / В. У. Праскаловіч, І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Роднае слова. 2016. № 3. С. 51–60.

5. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2016–2020 гг. // Минский городской методический портал [Электронный ресурс]. URL: http://mp.minsk.edu.by/main (дата обращения: 22.02.2019).

6. *Столяров Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика: учеб. пособие. М. : Высш. шк., 2004. 216 с.

7. *Троянская С. Л.* Основы компетентностного подхода в высшем образовании: учеб. пособие. Ижевск : Издательский центр «Удмуртский университет», 2016. 176 с.

8. *Троянская С. Л.* Музейная педагогика и ее образовательные возможности в развитии общекультурной компетентности: учеб. пособие [Электронный ресурс] // С. Л. Троянская. Ижевск: Ассоциация «Научная книга», 2007. URL: http://elibrary.udsu.ru/xmlui (дата обращения: 12.08.2019).

9. *Фёдоров Н. Ф.* Музей, его смысл и назначение // Музейное дело и охрана памятников. М.: Российская государственная библиотека, 1992. 60 с.

ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

В. У. Праскаловіч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
praskalovich@tut.by

У артыкуле раскрываецца роля вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры як аднаго са сродкаў навучання ва ўмовах рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў сучаснай адукацыі. Аўтарам вучэбны дапаможнік разглядаецца як мадэль адукацыйнай дзейнасці вучняў, а таксама метадычны арыенцір настаўніка, які вызначае стратэгію навучання.

Праблема: Як павінны змяніцца прынцыпы і форма канструявання вучэбнага дапаможніка, каб адпавядаць патрабаванням часу?

Мэта даследавання: выяўленне сутнасных характарыстык сучаснай мадэлі вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці вучняў, творчага патэнцыялу вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Распрацаваныя дыдактычныя патрабаванні да зместу і структуры вучэбнага дапаможніка могуць выкарыстоўвацца пры абнаўленні вучэбна-метадычнага комплексу па літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Ключавыя словы: вучэбныя дапаможнікі (падручнікі); кампетэнтнасны падыход; беларуская літаратура; установы агульнай сярэдняй адукацыі; творчы патэнцыял падручніка.

У дзеючых вучэбных дапаможніках па беларускай літаратуры новага пакалення для V–XI класаў паслядоўна ўвасабляецца адзін з асноўных прынцыпаў Канцэпцыі літаратурнай адукацыі – развіццё ўласнай творчай дзейнасці вучняў [1]. Гэта забяспечваецца прадуманай сістэмай пытанняў і заданняў на літаратурным матэрыяле і на аснове жыццёвых уражанняў, асацыяцый вучняў, якія стымулююць іх творчае ўяўленне.

Дыдактычнай асновай новых вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца кампетэнтнасны падыход у спалучэнні з класічнымі падыходамі да фарміравання зместу адукацыі, які сарыентаваны на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці. Функцыянальная пісьменнасць – здольнасць выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і навыкі для рашэння максімальна шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах дзейнасці і сацыяльных узаемаадносін. У святле функцыянальнай пісьменнасці стратэгічны прыярытэт навучання беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне дзейснага чытача – асобы з высокім узроўнем чытацкай пісьменнасці (функцыянальны аспект) і здольнасцямі да каштоўнасна-сэнсавага засваення твораў літаратуры як

мастацтва слова (аксіялагічны і мастацка-эстэтычны аспекты). А гэта азначае, што сучасная літаратурная адукацыя мэтава накіравана на выхаванне сродкамі беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета выпускніка базавай школы як чытача кампетэнтнага (II ступень), выпускніка агульнай сярэдняй школы як чытача кваліфікаванага (III ступень) [2].

Ва ўмовах рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў сучаснай адукацыі (у тым ліку літаратурнай) асаблівасцю новых вучэбных дапаможнікаў з'яўляецца больш выразны акцэнт на фарміраванні кампетэнтнасці навучэнцаў. Кампетэнтнасны падыход у навучанні беларускай літаратуры прадугледжвае накірунак не на механічнае запамінанне пэўнага аб'ёму літаратуразнаўчай інфармацыі, а на фарміраванне ў навучэнцаў досведу самастойнага вырашэння задач, звязаных з практычным прымяненнем ведаў культуралагічнага і гісторыка-літаратурнага зместу з апорай на сацыяльны вопыт. Развіццё прадметных кампетэнцый (прадметных уменняў) адбываецца за кошт пашырэння відаў вучэбнай дзейнасці, якія рэалізуюць практыкаарыентаваны характар літаратурнай адукацыі: складанне плана, тэзісаў і канспекта тэксту (мастацкага, публіцыстычнага, навукова-папулярнага і да т.п.), падрыхтоўка вусных выказванняў, міні-паведамленняў, вучэбных праектаў на літаратурную тэму (у тым ліку з мультымедыйным суправаджэннем), вопыты мастацка-творчага характару (мастацкія замалёўкі, эсэ, вершы) і інш.

Універсальным маніторынгавым інструментам сфарміраванасці прадметных кампетэнцый навучэнцаў з'яўляюцца інтэграваныя кампетэнтнасна арыентаваныя заданні, якія дазваляюць праверыць некалькі відаў кампетэнцый рознага ўзроўню.

Структура кампетэнтнасна арыентаваных заданняў.

Стымул пагружае ў кантэкст задання і матывуе на яго выкананне.

Задачная фармулёўка дакладна ўказвае на дзейнасць і/або спосабы дзейнасці навучэнца, неабходныя для выканання задання.

Крыніца інфармацыі спрыяе паспяховай дзейнасці навучэнца па выкананні задання. Утрымлівае інфармацыю, прадстаўленую ў разнастайным відзе (урыўкі літаратуразнаўчых артыкулаў, табліцы, памяткі-алгарытмы, ілюстрацыі, інтэрнэт-рэсурсы і г.д.).

Новыя вучэбныя дапаможнікі ўяўляюць сабою тып вучэбнага выдання на папяровым носьбіце. Перадусім, прызначанасць для выкарыстання ў высокатэхналагічным адукацыйным асяроддзі абумоўлівае істотнае ўзрастанне ролі яго электронных кампанентаў. Для забеспячэння камп'ютарнай падтрымкі навучання беларускай літаратуры асаблівае значэнне набывае электронны рэсурс па беларускай літаратуры для V–XI класаў. Электронны адукацыйны рэсурс (ЭАР) складаецца з некалькіх узаемазвязаных паміж сабой модуляў (даведачна-інфармацыйнага, трэніруючага, кантрольна-дыягнастычнага, інтэрактыўнага); размешчаны

на нацыянальным адукацыйным партале: http://e–vedy.adu.by. У навігацыйным апараце вучэбнага дапаможніка выкарыстоўваецца новы элемент – QR-код (графічная выява спасылкі), які дазваляе атрымаць доступ да ЭАР праз спецыяльны дадатак на электронным планшэце, мабільным тэлефоне. Дадатковае выкарыстанне электроннага рэсурсу паспрыяе значнаму пашырэнню адукацыйных магчымасцей вучэбных дапаможнікаў.

У поўнай меры ў дзеючых вучэбных дапаможніках па беларускай літаратуры новага пакалення для V–XI класаў рэалізавана адно з важных педагагічных патрабаванняў, а менавіта ўлік узроставых асаблівасцей навучэнцаў. Рэгламентуецца адбор зместу, формы і спосабы выкладання і адлюстравання матэрыялу.

Сучасная методыка навучання літаратуры падкрэслівае, што галоўным у арганізацыі структуры і зместу вучэбнага дапаможніка новага пакалення з'яўляецца не толькі іх зместавае напаўненне, а тая праца, якая можа быць з гэтым тэкстам арганізавана. Вучэбная кніга павінна выконваць функцыі забеспячэння такой арганізацыі зместу, якая дапаможа настаўніку мэтанакіравана планаваць пэўныя вучэбныя дзеянні.

Спынімся на асаблівасцях структурна-зместавага напаўнення новых вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры на прыкладзе вучэбнай кнігі для IX класа [3].

Вучэбны дапаможнік прызначаны для забеспячэння абавязковага мінімуму зместу навучання беларускай літаратуры ў адпаведным класе і ўключае наступныя раздзелы: метадычная прадмова (уступнае слова *"Ад аўтараў"*); уводзіны; тэматычныя раздзелы з наборам разнастайных тэкстаў[10]; выніковае абагульненне, слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў.

У змесце новага вучэбнага дапаможніка для IX класа паслядоўна рэалізуюцца міжпрадметныя сувязі з такімі вучэбнымі прадметамі, як "Гісторыя Беларусі", "Беларуская мова", "Руская літаратура", "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)". Да біяграфіі майстроў слова і іх твораў змяшчаюцца рэпрадукцыі карцін беларускіх і сусветных мастакоў, фотаздымкі і інш. Фрагменты кіно, тэатра, музейных экспазіцый і інш. прадстаўлены ў электронным рэсурсе са спасылкай у вучэбным дапаможніку. Гэта паспрыяе наладжванню з вучнямі дыялогу культур, будзе фарміраваць "чалавека ў культуры" і "чалавека культуры", здольнага ўмела карыстацца ведамі, усведамляць іх, разважаць, па-рознаму мысліць, асэнсоўваць і параўноўваць набыткі розных культур.

Упершыню змест вучэбнага дапаможніка па літаратуры прадстаўлены элементамі так званай *"дабаўленай рэальнасці"*, якія імітуюць пэўныя працэсы і сітуацыі.

[10] У сучаснай інфармацыйна-адукацыйнай прасторы паняцце *тэкст* трактуецца ў шырокім сэнсе: "...гэта не толькі пісьмовы, вербальны тэкст, але і відэафрагмент, анімаваная схема, мадэль", прычым "апошнія ўтрымліваюць унікальную здольнасць павышаць інфармацыйную шчыльнасць выкладання за кошт паскоранай перадачы інфармацыі" [4].

Ствараючы мадэль вучэбнага дапаможніка, аўтары імкнуліся да максімальнай тэхналагічнасці кнігі, такой яе пабудовы, пры якой магчыма эфектыўная самастойная праца вучня з тэкстам, даступнасць і выразнасць апарата арыенціроўкі, што арганізуе іх дзеянні.

Сістэма навігацыі, якая прадстаўлена значкамі-піктаграмамі, дазваляе хутка арыентавацца ў матэрыяле вучэбнага дапаможніка.

Умоўныя абазначэнні:

	– успомніце раней вывучаны матэрыял ці паняцце;
	– дадатковая інфармацыя;
	– абмяркоўваем разам;
	– прыкладныя тэмы для даследчых праектаў і творчых заданняў;
	– спасылкі на электронны адукацыйны рэсурс “Беларуская літаратура”;
	– спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта.

Метадычны апарат вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры IX класа складаецца з трох блокаў пытанняў і заданняў.

1) З мэтай актуалізацыі раней атрыманых ведаў першы блок пытанняў і заданняў змешчаны перад кароткімі звесткамі аб жыцці і творчасці пісьменнікаў, з творчасцю якіх вучні ўжо знаёміліся ў папярэдніх класах (у рубрыцы *“Успомніце”*).

2) Другі блок пытанняў і заданняў змешчаны пасля навучальнага матэрыялу. Прызначаны, як і папярэднія, для фарміравання літаратурных кампетэнцый вучняў.

3) Рознаўзроўневыя пытанні і заданні для ўрока абагульнення пасля кожнага раздзела (па 10–12 пытанняў і заданняў). У іх аснову пакладзена пяць паслядоўных узроўняў засваення ведаў вучнямі ў працэсе прадуктыўнай дзейнасці. Адпаведна з узроўнямі прадуктыўнай дзейнасці вучняў можна вылучыць наступныя тыпы практыкаванняў: узнаўляльныя, рэканструктыўна-варыятыўныя, эўрыстычныя, даследчыя і творчыя.

У прапанаваных практыкаваннях і заданнях усіх узроўняў заахвочваецца творчы падыход да вучобы ў час работы як з вучэбным дапаможнікам, так і з электронным рэсурсам, творамі сумежных відаў мастацтва, прадугледжваецца ўдасканаленне пэўных уменняў і навыкаў работы ў новых вучэбных сітуацыях.

Распрацаваная сістэма творчых заданняў, дзе знайшлі адлюстраванне прагрэсіўныя спосабы адбору, падачы і інтэрпрэтацыі вучэбных

матэрыялаў, якія адпавядаюць запытам вучнёўскай аўдыторыі, скіравана да эмацыянальна-творчай сферы рэцыпіента, а таксама дае штуршок да пашырэння педагагічнага арсенала настаўніка.

Мы звернем увагу на тыя творчыя заданні, мэтавыя ўстаноўкі якіх прадугледжваюць развіццё крэатыўных здольнасцей школьнікаў.

На ўроках літаратуры дастаткова папулярны заданні крэатыўнага тыпу, як узнаўленне працэсу нараджэння казкі, песні, прыказкі, загадкі; слоўнае маляванне, мастацкае расказванне, творчы пераказ, а ў межах творчага пераказу такія яго віды, як замена прамой мовы ўскоснаю, першай асобы трэцяю, і наадварот (апошні від творчай дзейнасці называюць пераказам са зменаю асобы апавядальніка); складанне кадрапланаў, слоўнікаў апісання эмацыянальных станаў персанажаў мастацкага твора; прайграванне роляў рэжысёраў, акцёраў, ілюстратараў кніг; стварэнне вучнямі славесных адукацыйных прадуктаў у розных жанрах: мастацкія замалёўкі, апавяданні, нарысы, вершы, эсэ, водгукі (на самастойна прачытаны літаратурны твор, на твор выяўленчага мастацтва, кінафільм або тэлеперадачу) і да т.п. Прапанаваныя віды прадметна-творчай дзейнасці міжвольна ставяць вучня ў пазіцыю аўтара і творцы, выхоўваюць назіральнасць і чуйнасць да слова, спрыяюць развіццю эўрыстычных здольнасцей. Па выніках выкананання такіх заданняў можна меркаваць пра ступень сфарміраванасці творчых уменняў школьнікаў і кіравацца гэтым у далейшай дзейнасці. Акрамя таго, ажыццяўляецца запамінанне пры “навучанні з захапленнем” [5]. Прадукт разглядаемай намі вучнёўскай літаратурна-творчай дзейнасці можа з’яўляцца новым толькі для яе суб’екта, мець не абсалютную, а вучэбна-выхаваўчую каштоўнасць.

Такім чынам, сучасны сродак навучання літаратуры разглядаецца як:

– вучэбны дапаможнік – сучасная мадэль вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці вучняў, здольная забяспечыць засваенне абавязковага мінімуму зместу навучання беларускай літаратуры ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам;

– кніга – метадычны арыенцір настаўніка, які вызначае стратэгію навучання.

Да адметнасцяў новых вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для V–XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі трэба аднесці больш даступнае выкладанне вучэбнага матэрыялу, яго практыкаарыентаванасць, розныя формы прадстаўлення вучэбнай інфармацыі, больш дасканалы дызайн, наяўнасць навігацыйнага апарату, які арыентуе вучня на пошук дадатковых матэрыялаў, што дазволяць яму паглыбіць і пашырыць веды па вучэбным прадмеце і праверыць узровень засваення вучэбнага матэрыялу. Вучэбны дапаможнік у такім складзе забяспечыць выкананне асноўных дыдактычных функцый: кіраванне самастойнай пазнавальнай дзейнасцю вучняў, кансультацыйна-

рэгламентуючая, даведачна-інфармацыйная, арыенціровачна-ілюстрацыйная, інфармацыйна-дадатковая, кантралююча-ацэньваючая.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Канцэпцыя рэфармавання літаратурнай адукацыі / пад навук. рэд. М.А. Лазарука, В.У. Івашына. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1996. 28 с.

2. *Праскаловіч В.У.* Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V–XI класы). Праект / В.У. Праскаловіч [і інш.] // Род. слова. 2016. № 3. С. 51–60.

3. Беларуская літаратура : вуч. дапам. для 9 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.У. Праскаловіч, В.П. Рагойша, Т.І. Шамякіна, Т.В. Кабржыцкая, М.В. Жуковіч; пад рэд. В.У. Праскаловіч, В.П. Рагойшы. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. 288 с.

4. *Шалыгина И.В.* Современный мультимедийный урок: дидактические ориентиры в море технологий : практикоориентир. электрон. моногр [Электронный ресурс]. М. : Садовое кольцо, 2006. 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

5. *Иванихин В.В.* Почему у Ильина читают все? : кн. для учителя. М.: Просвещение, 1990.

ДА ПЫТАННЯ АБ МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКІ НА ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Т. І. Скікевіч[1)], І. М. Курловіч[2)]

[1)]Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія,
вул. Мічурына, 5, 213407, г. Горкі, Магілёўская вобл., Рэспубліка Беларусь,
t_skikevich@mail.ru

[2)]Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія,
вул. Мічурына, 5, 213407, г. Горкі, Магілёўская вобл., Рэспубліка Беларусь,
irinakurlovich@mail.ru

Даецца аналіз навучальнага дапаможніка па беларускай мове для студэнтаў землеўпарадкавальнага факультэта. Вылучаюцца найбольш складаныя аспекты вывучэння беларускай тэрміналагічнай лексікі, прапануюцца некаторыя прыёмы для зняцця цяжкасцяў засваення спецыяльных тэрмінаў. Асаблівая ўвага надаецца праблеме руска-беларускай марфалагічнай і сінтаксічнай інтэрферэнцыі.

Ключавыя словы: тэрмін; тэрміналогія; спецыяльная лексіка; марфалагічная інтэрферэнцыя; сінтаксічная інтэрферэнцыя.

У вышэйшых навучальных установах Беларусі з 2000 года выкладаецца вучэбны курс “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”. Праграма гэтага курса накіравана на засваенне і прафесійнае выкарыстанне беларускай нацыянальнай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць розную інфармацыю на беларускай мове, асэнсавана і дакладна выказваць любую думку, спрыяць павышэнню культуры вуснага маўлення.

Кафедра лінгвістычных дысцыплін Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі актыўна супрацоўнічае з выкладчыкамі спецыяльных дысцыплін, і на аснове іх лекцый рыхтуюцца сумесныя вычэбна-метадычныя дапаможнікі па беларускай мове на матэрыяле тэкстаў па гэтых дысцыплінах. Так, на кафедры падрыхтаваны дапаможник “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” для студэнтаў спецыяльнасцяў “Землеўпарадкаванне” і “Зямельны кадастр”.

Дапаможнік прызначаны для практычных заняткаў па беларускай мове і пабудаваны на аснове тэкстаў па землеўпарадкаванні і зямельным кадастры. Частка тэкстаў дапаможніка прызначана для перакладу студэнтамі з рускай мовы на беларускую, астатнія тэксты перакладзены на беларускую мову з дапамогай электроннага перакладчыка і ўтрымліваюць памылкі руска-беларускай моўнай інтэрферэнцыі, якія студэнты павінны знайсці і выправіць.

Усе тэксты дапаможніка суправаджаюцца разнастайнымі пасля-тэкставымі заданнямі па фанетыцы, арфаграфіі, лексіцы, словаўтварэнні, марфалогіі, сінтаксісе, стылістыцы і культуры маўлення.

Беларуская і руская мовы роднасныя і вельмі падобныя адна да адной, таму паралельнае існаванне дзвюх моў негатыўна адбіваецца на пісьменнасці тых, хто карыстаецца гэтымі мовамі, адмоўна ўплывае на культуру і чысціню маўлення. Пры гэтым адбываецца ўзаемны ўплыў моў і ў маўленні ўзнікаюць памылкі інтэрферэнцыі. У сувязі з гэтым большасць заданняў пабудавана паводле прынцыпу супастаўлення тых ці іншых моўных з’яў у беларускай і рускай мовах.

У дапаможнік уключаны невялікі руска-беларускі слоўнік, які складзены на матэрыяле лексікі тэкстаў. Акрамя таго, змешчаны набор лексічных сродкаў для перадачы інфармацыйнага зместу з аналізам структуры навуковага тэксту, які можна выкарыстоўваць пры складанні анатацый тэкстаў па спецыяльнасці.

Навучанне прафесійнаму маўленню мэтазгодна пачынаць з тэксту па спецыяльнасці, праца над якім павінна пачынацца са слоў-тэрмінаў. Без ведання агульнанавуковай і тэрміналагічнай лексікі нельга зразумець асноўны змест тэксту, вызначыць ключавыя словы для далейшай яго перадачы ў выглядзе вуснага пераказу, рэферата або анатацыі. Таму важнае месца пры навучанні ў спецыяльных мэтах займае семантызацыя новага слова (у нашым выпадку тэрміна), або засваенне яго значэння.

Тэрміналагічная лексіка займае вялікае месца ў навуковых тэкстах, што абумоўлена яе функцыянальным прызначэннем: тэрміны ўтрымліваюць інфармацыю значна большую, чым іншыя лексічныя адзінкі. Як адзначаюць мовазнаўцы, у тэрмінах заключаецца максімальна дакладнае, канцэнтраванае эканамічнае выражэнне тых агульных і прыватных паняццяў, з якімі спалучаецца навуковая дзейнасць чалавека.

Тэрміналагічныя сістэмы розных галін навукі і тэхнікі, нягледзячы на іх адрозненні, маюць агульныя рысы, паколькі складаюцца з лексічнага матэрыялу той мовы, на якой гавораць вучоныя, і з выкарыстаннем некаторых лагічных заканамернасцяў. Тэрміналогія пэўнай навукі – гэта штучна створаны лексічны пласт, кожная адзінка якога мае пэўныя абмежаванні для свайго ўжывання і аптымальныя ўмовы для свайго існавання і развіцця.

Улічваючы вышэйадзначанае, у дапаможніку з мэтай семантызацыі спецыяльнай лексікі прапануюцца наступныя заданні: *Выпішыце з беларускамоўнага тэксту словы (словазлучэнні), якія належаць да тэрміналагічнай лексікі, і растлумачце іх значэнне; Вызначце лексічнае значэнне выдзеленых слоў, словазлучэнняў у тэксце (пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам); Выпішыце з абодвух тэкстаў (рускага варыянту і беларускага) тэрміны, параўнайце іх вымаўленне і напісанне ў рускай і беларускай мовах* і інш.

Пры навучанні ў ВНУ студэнтам неабходна авалодваць уменнем карыстацца навуковымі тэкстамі па спецыяльнасці, рабіць кампеляцыю і разгортванне навуковай інфармацыі, засвойваць беларускую нацыянальную навуковую тэрміналогію, пісаць рэфераты і анатацыі, выпрацоўваць навыкі правільнага ўспрымання рознай інфармацыі на беларускай мове, асэнсавана і дакладна выказваць любую думку, спрыяць павышэнню культуры вуснага і пісьмовага маўлення. Усё гата патрабуе правільнага, граматнага ўжывання тых спецыфічных асаблівасцяў беларускай мовы, якія адрозніваюць яе ад рускай.

Таму асаблівую ўвагу, на нашу думку, выкладчык павінен засяродзіць на словаўтваральных, марфалагічных і сінтаксічных інтэрферанцыйных памылках.

Працуючы над спецыяльнымі тэкстамі, можна паралельна падаваць іх на рускай і беларускай мовах (пры гэтым беларускі варыянт можа быць з памылкамі) з наступнымі заданнямі: *Прачытайце тэкст на рускай мове і яго пераклад на беларускую мову. Прааналізуйце беларускамоўны тэкст з пункту гледжання правільнасці, дакладнасці і чысціні маўлення, выпраўце памылкі, растлумачце іх прычыны; Вызначце ў беларускім тэксце марфалагічныя, словаўтваральныя, сінтаксічныя асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай; Знайдзіце ў беларускім тэксце назоўнікі, якія адрозніваюцца ад рускіх у родзе. Выпішыце іх, вызначце род; Выпішыце з беларускамоўнага тэксту назоўнікі мужчынскага роду і пастаўце іх у форме роднага склону адзіночнага ліку* і інш.

Як вядома, адной з сінтаксічных асаблівасцяў навуковага тэксту з’яўляецца выкарыстанне дзеепрыметных і дзеепрыслоўных зваротаў, што выклікае цяжкасці пры іх перакладзе на беларускую мову. Таму асаблівую увагу выкладчык павінен звярнуць менавіта на выкарыстанне дзеепрыметнікаў у беларускай мове.

У сучаснай беларускай літаратурнай мове не ўсе формы дзеепрыметнікаў ужываюцца аднолькава. Найчасцей выкарыстоўваюцца дзеепрыметнікі прошлага часу залежнага стану з суфіксамі **-н-, -ен-, -ан-, -т-**: *сасланы, скошана, пакрытыя, абпалены.* Часта ўжываюцца дзеепрыметнікі прошлага часу незалежнага стану з суфіксам **-л-:** *пасівелы, счарнелыя, утравелыя.*

Пры гэтым трэба пазбягаць выкарыстання дзеепрыметнікаў незалежнага стану з суфіксамі **-уч- (-юч-), -ч- (-яч-), -уш-, -ш-** і залежнага стану з суфіксамі **-ем-, -ім-.** Для беларускай мовы нехарактэрныя і зваротныя дзеепрыметнікі. Акрамя таго, дзеепрыметнікі мужчынскага роду ў ролі выказніка звычайна ўжываюцца ў поўнай форме.

Пры перакладах з рускай мовы, каб пазбегнуць непажаданых формаў дзеепрыметнікаў, патрэбна карыстацца ўжывальнымі формамі дзеепрыметнікаў, прыметнікамі і спалучэннямі іх з назоўнікамі, даданымі сказамі, дзеясловамі, дзеепрыслоўямі, назоўнікамі.

Улічваючы ўсё вышэйсказанае, мэтазгодна паказаць спосабы перакладу усіх формаў рускіх дзеепрыметнікаў на беларускую мову. Для гэтага можна выкарыстаць параўнальную табліцу (табліца № 1).

Табліца 1.

Утварэнне дзеепрыметнікаў у рускай і беларускай мовах

Утварэнне дзеепрыметнікаў у рускай мове	**Спосабы перакладу дзеепрыметнікаў на беларускую мову**
Действительные причастия настоящего времени: **-ущ- (-ющ-)** – читающий, определяющий **-ащ- (-ящ-)** – подходящий	які чытае, **-льн-** – вызначальны які падыходзіць
Действительные причастия прошедшего времени: **-вш-, -ш- –** читавший, почерневший	які чытаў **-л-** – пачарнелы
Страдательные причастия настоящего времени: **-ем-, -им-** – читаемый, высеваемый	які чытаецца **-н-** – высеяны
Страдательные причастия прошедшего времени: **-енн-, -нн-** – прочитанный, обожженный **-т-** – открытый	**-н-, -ен-** – прачытаны, абпалены **-т-** – адкрыты

Пасля падрабязнага аналізу прадстаўленай табліцы неабходна выканаць шэраг практыкаванняў на замацаванне. Заданні могуць быць такія: *Знайдзіце ў рускім тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі, параўнайце іх з беларускім перакладам, выпішыце абодва варыянты і растлумачце адрозненні; Перакладзіце дзеепрыметныя словазлучэнні на беларускую мову, параўнайце іх, растлумачце адрозненні* і інш.

Прапанаваныя таксама заданні, якія спрыяюць выпрацоўцы навыкаў аналізу зместу тэксту і выдзялення найбольш важнай інфармацыі (*Выпішыце з тэксту словы і выразы, якія выкарыстоўваюцца для апісання формаў землекарыстання; Выкарыстоўваючы матэрыял тэксту, скончыце дадзеныя ніжэй сказы* і інш.*)*.

Для развіцця навыкаў маўлення выкарыстоўваюцца наступныя заданні: *адказаць на пытанні да тэксту, задаць пытанні па тэксце, скласці пытальны і назыўны планы тэксту, пераказаць тэкст па складзеным плане, напісаць анатацыю, выкарыстоўваючы сродкі лагічнай сувязі, якія ўжываюцца для анатавання.*

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Малько Г. І.* Беларуская мова. Як пазбегнуць памылак руска-беларускай моўнай інтэрферэнцыі : вучэбна-метадычны дапаможнік / Г. І. Малько, П. І. Малько. Горкі : БДСГА, 2010. 60 с.

2. *Скікевіч Т. І.* Беларуская мова. Прафесійная лексіка : дапаможнік для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях «Заатэхнія», «Прамысловае рыбаводства» / Т. І. Скікевіч, І. М. Курловіч. Горкі : БДСГА, 2018. 83 с.

4. *Скікевіч Т. І.* Некаторыя метадычныя прыёмы пры выкладанні тэмы «Віды інтэрферэнцыі» студэнтам нефілалагічных ВНУ / Т. І. Скікевіч, І. М. Курловіч // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце: матэрыялы III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 20–21 лістапада 2019 г. / Віцеб. дзярж. ун-т; рэдкал. : Г. А. Арцямёнак (адказ. рэд.) [і інш.]. Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2019. С. 238–241.

СПЕЦИФИКА АНАЛИЗА ТЕКСТА В МЕТОДИКЕ ФУНКЦИОНАЛЬНОГО И КОММУНИКАТИВНОГО ПОДХОДОВ К ИЗУЧЕНИЮ ЧАСТЕЙ РЕЧИ

В. А. Тутькина

Могилёвская городская гимназия № 1,
ул. Мовчанского, 47, 212038, г. Могилев, Республика Беларусь,
mggymn1@yandex.ru

Актуальность настоящего исследования обусловлена необходимостью создания системы упражнений, а также модели анализа текста в методике функционального и коммуникативного подходов к изучению частей речи.

Предметом исследования послужило содержание и методическая организация этапов работы над текстообразующей функцией слов различных частей речи на уроках русского языка.

Практическая значимость исследования: разработанный комплекс упражнений и созданная модель анализа текста в методике функционального и коммуникативного подходов к изучению частей речи в дальнейшем могут быть использованы для обучения на уроках русского языка в средней школе.

Ключевые слова: текстообразующая функция; аспект культуры речи; собственно текстообразующий аспект; функциональный подход; коммуникативный подход.

При реализации функционального принципа изучения единиц языка лингвостилистический анализ текста играет обучающую роль, так как знакомит учащихся с текстовыми функциями глаголов и других частей речи. В основе данного анализа лежит выделение словесных рядов, которые образуют композицию текста. «Цель анализа – обнаружение знаков авторской позиции, что поможет школьникам выйти на понимание основной мысли текста» [1, с. 99].

Лингвостилистический анализ текста в методике функционального подхода используется с разными целями: на этапе изучения нового материала он «открывает» особенности употребления языковых единиц – их текстообразующие и изобразительно-выразительные функции в тексте, на этапе закрепления проводится анализ текста с целью определения роли изученных явлений в оформлении связного высказывания.

О. В. Алексеева считает, что «лингвостилистический анализ можно рассматривать и как основу проектной деятельности учащихся при создании собственного текста, в котором учащиеся сознательно придут к выбору грамматических форм для достижения цели эффективного общения» [1, с. 103].

Анализ текста в методике функционального подхода – это новый вид анализа, рожденный на стыке функциональной грамматики (А. В. Бондарко, Г. А. Золотова, М. А. Шелякин и др.) и стилистики текста (В. В. Виноградов, А. И. Горшков, В. В. Одинцов, Г. Я. Солганик и др.).

В методике обучения на функциональной основе апробирован анализ в единстве содержания и формы (термин предложен М. Т. Барановым). Название анализа обосновано текстообразующей способностью языковой единицы проявляться, во-первых, при оформлении содержания текста, а во-вторых, в процессе его композиционного (структурного) оформления.

Анализ в единстве содержания и формы ориентирован на постижение основного смысла высказывания. Основная мысль, то есть то, что хотел сказать автор, имеет «опознавательные знаки» на уровне лексики, грамматики, композиции. Выявить их и осознать роль языковых средств в реализации авторского замысла является главным в ходе анализа.

В нашем исследовании мы предлагаем свою модель анализа текста в методике функционального и коммуникативного подходов к изучению частей речи, которая соединяет в себе два аспекта исследования: текстообразующий и стилистический. Анализ текста проводится по следующему плану:

1. Прочитайте текст. Определите его тему.
2. Определите функционально-смысловой тип речи в тексте. Обоснуйте свою точку зрения. Определите стиль текста.

3. Выпишите опорные (ключевые) слова. Установите, какой частью речи они являются. Что они обозначают, какое место занимают в картинке, которую предлагает нам увидеть автор? Как они связаны между собой: близки по смыслу или противопоставлены? Как связаны с темой текста? Какие словесные ряды образуют? Какова роль в тексте существительных? Могут ли они называть свойства, признаки?

4. Какова роль прилагательных в тексте? Что они обозначают, какое место занимают в изображении событий и картин? Как они связаны между собой: близки по смыслу или противопоставлены? Как связаны с темой? Какие словесные ряды образуют? Опишите изобразительно-выразительные возможности прилагательных в тексте.

5. Определите роль глаголов в тексте. Установите вид глагольных форм. Показывают ли они развитие действия? Важны ли в тексте? На какой тип речи указывают (повествование, рассуждение, описание: статическое или динамическое)? Определите изобразительно-выразительные функции глагольных форм. Образуйте словесные ряды, которые включают в себя глаголы. Рассмотрите особенности употребления глагольных форм в тексте.

6. Найдите наречия и охарактеризуйте их роль в тексте.

7. Установите, какую роль в тексте играют местоимения разных семантических разрядов.

8. Найдите служебные слова, которые являются выделенными, особыми, функция которых в процессе образования этого текста значима.

9. Определите основную мысль текста, позицию автора. Каковы «знаки» присутствия автора в тексте (в композиции, лексике, грамматике)?

Рассмотрим пример анализа текста по данному плану.

*«Время нежности и грусти»***(6 класс)**

В августе в природе улавливаешь приметы перехода лета в осень. В этих приметах нежность и грусть.

Прощальными раскатами прогремели летние грозы. Ливни пошли на убыль. Но солнце еще щедро отдает свое тепло.

Разнотравье превратилось в душистые скирды. Небо расчистилось от облаков и стало звонким. Оно приготовилось и ждет, когда в нем зазвенят прощальные поклики птиц.

Когда в полдень припекает солнце, замечаешь особо нежное томление земли. Зеленая листва отслужила свое и начинает блекнуть. Полиняли краски летней поры.

Солнце выплывает теперь в глубокой тишине и посеревших от ночной прохлады туманах. (По А. Марину) [2, с. 41].

1. Тема текста – прощание с летом.

2. Это текст-описание, так как в нем находим перечисление признаков, свойств, элементов предмета речи. В тексте используются приемы сравнения, аналогии, противопоставления. Текст легко свертывается.

Данный текст относится к художественному стилю, так как в нем используются изобразительные и выразительные средства (эпитеты, метафоры), активно применяется смысловая многозначность слов. Текст характеризуется эмоциональностью и экспрессивностью изображения.

3. Опорными ключевыми словами в тексте «Время нежности и грусти» являются имена существительные: ***грозы, ливни, солнце, тепло, лето, осень, нежность, грусть, переход, небо, поклики, земля, листва, краски, тишина, туманы***. Их можно разделить на следующие семантические группы:

1группа – погодные явления: грозы, ливни, тепло, туманы.

2 группа – поры года: лето, осень.

3 группа – явления природы: солнце, небо, земля, листва.

4 группа – эмоции: нежность, грусть.

Словесные ряды в тексте выражают предметную информацию.

В данном тексте опорные слова отражают смену картин в создании пейзажа.

В тексте нет ключевых слов, которые были бы противопоставлены. Все они близки по смыслу.

В данном тексте есть существительные, выражающие признаки и свойства (***нежность, грусть***). Эти существительные участвуют в раскрытии темы, находясь в позиции сказуемого.

Имя существительное выполняет ведущую текстообразующую функцию в тексте – обеспечение тематического единства текста. Имена существительные, находящиеся в позиции подлежащего и дополнения, называют явления и признаки, являющиеся частью картины природы, и непосредственно связаны с темой текста.

В предложениях текста опорные слова занимают коммуникативно значимые позиции, благодаря чему выделяются логическим ударением в устной речи. Так как это текст-описание, то опорными являются наименования явлений природы, признаки и свойства с ними связанные.

4. Средствами художественной выразительности данного текста являются имена прилагательные: ***прощальными, летние, душистые, звонким, прощальные, нежное, зеленая, летней, глубокой***.

Имена прилагательные в атрибутивной позиции называют наблюдаемые (***душистые, звонким, зеленая***), эмоциональные (***прощальными, нежное***), информативные (***ночной, летние, глубокой***) признаки предметов речи в тексте.

Имена прилагательные в тексте «Время нежности и грусти» выполняют изобразительно-выразительную функцию. В тексте употреблены следующие эпитеты: «***прощальные раскаты», «душистые скирды», «звонкое небо», «прощальные поклики», «нежное томление», «глубокая тишина»***.

Синтаксическую доминанту текста составляют динамические сказуемые, которые выражаются глаголами совершенного и несовершенного вида. Глаголы в данном тексте не выполняют содержательно-композиционную функцию. Эти глаголы представляют собой действия, состояния, процессы как отличительные признаки, свойства предмета речи.

Рисуя картину перехода лета в осень, автор использует художественные приемы: олицетворение ***(«солнце отдает», «небо приготовилось и ждет», «листва отслужила»***), метафору («***солнце выплывает***»). Это делает текст-описание выразительным. Автор использует глаголы в переносном значении, что указывает на художественный стиль текста: глаголы выполняют стилистическую функцию.

Звуковые образы создаются с помощью глаголов ***«прогремели», «зазвенят»***.

6. В тексте найдено 5 наречий: ***когда, теперь, еще, особо, щедро***.

Наречия ***когда, еще и теперь*** описывают временные границы. Наречия-детерминанты, указывая на время происходящего, объединяют несколько предложений и даже частей текста. Наречие меры и степени ***особо*** отражает высокую степень проявления признака прилагательного «нежное». Эмоционально-оценочную функцию выполняет наречие образа действия «***щедро***».

Текстообразующая роль наречных слов заключается в обозначении обстоятельственных признаков действий, состояний, признаков. Кроме этого, наречия являются средством тематической связи ключевых предложений текста, уточняя тему текста (переход лета в осень).

7. В тексте встречаются личные местоимения (***оно, в нем***), притяжательные (***свое***), указательное (***этих***).

Личное местоимение используются как семантическая замена во избежание повторов (***оно*** – небо).

Заменяя и предваряя предметные и признаковые имена, местоимения обеспечивают развертывание темы текста, установление смысловых связей между его предложениями.

8. В данном тексте предлог ***в*** встречается 7 раз. Он выражает различные отношения между явлениями: пространственные (***в природе, в скирды, в нем***), временные (***в августе, в полдень***).

9. Основная мысль текста: переход лета в осень – прекрасная пора, время нежности и грусти, разлитых в природе.

Автор выражает свои эмоции в первой композиционной части текста (общее впечатление от предмета речи).

Через лексические повторы слов ***прощальный, нежный*** автор передает свое отношение к описываемому.

Любование автора природой выразилось в использовании средств художественной выразительности (эпитеты, метафоры, олицетворения).

Таким образом, лингвостилистический анализ текста в школьной практике является миниатюрной моделью научного стилистического анализа, основы которого заложены в трудах В. В. Виноградова, В. В. Одинцова, А. И. Горшкова, Г. Я. Солганика.

Анализ языковой композиции текста состроит в выделении словесных рядов, которые отражают предметно-логическую и эмоционально-экспрессивную стороны плана содержания.

В основе данного анализа лежит образ автора, поэтому главный вопрос при работе с текстом – определение «знаков» авторского пристутствия. Это путь к пониманию основной мысли текста, авторского замысла.

В результате проведения лингвостилистического анализа текстов у учащихся вырабатываются умения: 1) осознанно проводить элементарный языковой анализ художественного текста, воспринимать художественные и публицистические тексты во всем многообразии используемых в них языковых и структурно-семантических средств; 2) указывать средства связи между частями текста; 3) определять тему и основную мысль текста; 4) определять тип и стиль речи; 5) использовать знания о тексте и изобразительно-выразительных средствах языка при анализе текста; 6) определять текстообразующие функции различных частей речи.

Библиографические ссылки

1. *Алексеева О. В.* Лингвостилистический анализ текста на уроке грамматики при функциональном подходе к изучению единиц языка // Вестник МГОУ. Серия : Педагогика. 2010. № 1. С. 99–103.

2. *Блинов Г. И.* Сборник диктантов по орфографии и пунктуации : 5–9 кл. : кн. для учителя / Г. И. Блинов, В. А. Антохина. 5-е изд. Москва : Просвещение, 2001. 239 с.

МЭТЫ І ЗАДАЧЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК ЗАМЕЖНАЙ У КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ ЛІНГВАДЫДАКТЫЧНЫХ ПАРАДЫГМ

Т. Л. Чахоўская

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
ChekhovskajaTL@bsu.by

З улікам сучасных дасягеннняў лінгваметодыкі асэнсоўваюцца мэты навучання беларускай мове як замежнай (якім павінен быць вынік вучэбнай дзейнасці), як можна акрэсліць змест навучання (чаму вучыць), якія прыёмы і метады забяспечваюць авалоданне мовай у вызначаны для гэтага часавы інтэрвал (як вучыць), якія сродкі

пажадана выкарыстаць для дасягнення пастаўленых мэтаў і рэалізацыі запланаванага зместу навучання (пры дапамозе чаго вучыць).

Ключавыя словы: беларуская мова як замежная; лінгвадыдактыка; мэты навучання мове; задачы навучання мове.

Мэта навучання мове – гэта запланаваны вынік дзейнасці па авалоданні мовай, які дасягаецца пры дапамозе адпаведных прыёмаў, метадаў і сродкаў навучання.

У лінгваметодыцы традыцыйна вылучаюцца тры мэты навучання: *практычная, агульнаадукацыйная, выхаваўчая і развіццёвая*. У спецыяльнай літаратуры апошніх гадоў гаворка ідзе яшчэ пра адну мэту навучання – *стратэгічную (глабальную)*, якая з'яўляецца адлюстраваннем сацыяльных інтарэсаў грамадства ў адносінах да навучэнцаў.

У метадычнай літаратуры апошніх гадоў усё часцей сцвярджаецца думка аб раўнапраўі ўсіх мэт навучання ў навучальным працэсе, паколькі «нераўнапраўнае стаўленне» да розных мэт прыводзіць да глабалізацыі маўленчага кампанента ў сістэме навучання насуперак іншым аспектам навучання.

Рэалізацыя практычнай мэты на занятках прадугледжвае авалоданне навучэнцамі мовай як сродкам зносін, а таксама фарміраванне агульнавучэбных уменняў (такіх, як уменне працаваць з кнігай, лагічна і паслядоўна выкладаць свае думкі, рабіць навучальныя запісы, карыстацца сучаснымі тэхналогіямі навучання), што забяспечваюць эфектыўнасць авалодання мовай у зададзеных параметрах. Такім чынам, практычная мэта ў сучаснай методыцы разумеецца шырэй, чым толькі здольнасць да камунікацыі, набытая падчас навучання (часта практычная і камунікатыўная мэты разглядаюцца як сінанімічныя паняцці), але і ўключае веды, навыкі і ўменні тэхналагічнага характару, якія стымулююць працэс авалодання мовай.

Аднак такое даволі шырокае разуменне мэты дыферэнцыруецца ў залежнасці ад пэўных умоў навучання мове. Так паўстала праблема ўзроўняў практычнага валодання мовай і неабходнасць вылучаць прамежкавыя і канчатковыя мэты навучання па кожным тыпе дзейнасці і аспекце мовы ў межах этапаў і профіляў навучання.

На занятках са студэнтамі-філолагамі ў якасці канчатковай мэты прапануецца свабоднае валоданне мовай у яе вуснай і пісьмовай формах у межах, блізкіх да ўзроўню валодання мовай яго носьбітамі, набыццё ведаў пра сістэму мовы і ўменняў карыстацца такімі ведамі ў будучай прафесійнай дзейнасці. Пры гэтым прафесійная дзейнасць выкладчыка і перакладчыка прад'яўляе больш высокія патрабаванні да ўзроўняў валодання мовай у параўнанні з іншымі катэгорыямі філолагаў (рэдактар, журналіст, лінгвіст, спецыяліст па міжкультурных зносінах).

На пачатковым этапе ставіцца больш вузкая, прамежкавая мэта ў параўнанні з канчатковай мэтай навучання мове: авалодаць асновамі мовы на памежным узроўні.

На занятках са студэнтамі-нефілолагамі мова засвойваецца ў аб'ёме, неабходным для атрымання адукацыі па профілі ВНУ. Яшчэ больш абмежаваны характар мэты навучанні мае месца ў працы кароткатэрміновых курсаў, дзе пераважная ўвага надаецца фарміраванню навыкаў і уменняў вуснага маўлення на загадзя адабраным лексіка-граматычным матэрыяле ў межах абмежаванага кола тэм і сфер зносін (штодзённа-побытавая і сацыяльна-культурная).

Выкладчык павінен мець выразнае ўяўленне пра прамежкавую і канчатковую мэтах навучання (яны пералічаны ў адпаведных мінімумах і праграмах), што вызначае выбар метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання, якія забяспечваюць дасягненне пастаўленых мэт.

З гэтага вынікае, што практычная мэта навучання мае розны змястоўны выражэнне і розныя ўзроўні яе рэалізацыі ў залежнасці ад этапаў і профіляў навучання. Мэты могуць быць выбарчымі (авалоданне адным з відаў маўленчай дзейнасці) і комплекснымі (авалоданне сродкамі мовы і відамі маўленчай дзейнасці ў розных тыпах і формах). Выбарчыя мэты навучання характэрныя для заняткаў на моўных курсах, калі праграма заняткаў будуецца з улікам інтарэсаў і запатрабаванняў навучэнцаў, а комплексныя – ва ўмовах пралангаванага навучання, характэрнага для заняткаў у сярэдняй і вышэйшай школе.

Пры характарыстыцы мэты навучання варта размяжоўваць паняцці «мэта навучання» і «задача навучання». Задачы навучання – гэта аб'ектыўнае адлюстраванне мэты навучання ў дачыненні да пэўнага этапа і тыпу заняткаў. У межах адной і той жа мэты могуць вырашацца розныя задачы навучання. Яны фармулююцца ў выглядзе пераліку ведаў, навыкаў, уменняў, якія рэалізуюцца ў рамках сфер, тым, сітуацый і тактык зносін.

Пры гэтым важна, каб задачы былі адэкватныя мэтам навучання. У межах рэалізацыі практычнай мэты яе задачамі могуць быць розныя: удасканаленне навыкаў і уменняў вуснага і пісьмовага маўлення, фарміраванне аднаго з відаў кампетэнцыі, авалоданне прыёмамі перакладчыцкай дзейнасці і інш. Цяжкасці ў працы выкладчыка часта выклікаюцца тым, што ён не заўсёды выразна можа вызначыць і давесці да навучэнцаў задачы, якія вырашаюцца на занятках, што змяншае эфектыўнасць аўдыторнай працы.

Прадметныя задачы ўключаюць той прадметны змест, які з дапамогай моўнага і маўленчага матэрыялу можа быць перададзены ў працэсе камунікацыі: сферы, тэмы, сітуацыі зносін, камунікатыўныя інтэнцыі як элементы маўленчых актаў.

У якасці *сфер зносін* вылучаюцца наступныя: а) *сацыяльна-побытавая* (магчымасць задавальнення асабістых і побытавых запатрабаванняў у

сферы вытворчай дзейнасці і ў сферы грамадскіх інтарэсаў пры неафіцыйных зносінах); б) *навучальная* (задавальненне запатрабаванняў падчас навучальнай дзейнасці); в) *прафесійна-вытворчая* (задавальненне запатрабаванняў у працэсе прафесійнай дзейнасці); г) *сацыяльна-культурная* (задавальненне эстэтычных і пазнавальных запатрабаванняў пры ўспрыманні і абмеркаванні твораў літаратуры і мастацтва, наведванні музеяў, выкананні рэлігійных абрадаў і інш.; д) *афіцыйна-справавая* (мае месца пры вырашэнні сацыяльна-маральных пытанняў у працэсе зносін з прадстаўнікамі адміністрацыі, дзяржаўных устаноў).

Тэмы зносін, у межах якіх навучэнцы могуць ажыццяўляць маўленчыя зносіны, прадстаўлены наступнымі: а) тэмы, актуальныя для моўцы ў сферы яго асабістых інтарэсаў і міжасобасных адносін (чалавек і яго асабістае жыццё, праца, прафесія, адукацыя, выхаванне, вольны час, захапленні); б) тэмы сацыяльна-культурнага характару (чалавек і грамадства, чалавек і палітыка, чалавек і навука, чалавек і мастацтва, чалавек і эканоміка); в) тэмы агульнагуманітарнай праблематыкі (чалавек і прырода, духоўнае развіццё чалавека); г) тэмы прафесійнай скіраванасці (навучэнец як суб'ект навучальнай дзейнасці, педагог як суб'ект педагагічнай дзейнасці, педагагічная дзейнасць у розных адукацыйных сістэмах, сучасныя тэхналогіі навучання).

Камунікатыўныя інтэнцыі – намеры, у межах якіх моўца мяркуе рэалізаваць свой маўленчы акт). Інтэнцыі (ад лац. *intentio* – імкненне) – скіраванасць свядомасці, мыслення на які-небудзь прадмет, у аснове якога ляжыць жаданне, задума.

У якасці інтэнцый вылучаюцца наступныя: а) кантактавызначальныя (жаданне ўступіць у камунікацыю, падтрымаць/завяршыць гутарку, прыцягнуць увагу, прадставіцца, падзякаваць, запрасіць, прынесці прабачэнне і інш.); б) рэгуляцыйныя (імкненне заахвоціць суразмоўцу да здзяйснення дзеяння, выказаць просьбу (пажаданне), згода рэагаваць на захвочванне і інш.); в) інфармацыйныя (задаваць пытанні і паведамляць інфармацыю ў розных умовах, распытваць, удакладняць і інш.).

Моўныя задачы. Вырашэнне моўных задач мяркуе авалоданне навучэнцамі наборам прадугледжаных праграмай моўных адзінак і фарміраванне на іх аснове ведаў і фанетычных, лексічных, граматычных навыкаў, якія забяспечваюць магчымасць карыстацца мовай як сродкам зносін. Узровень дасведчанага карыстальніка (4 сертыфікацыйны ўзровень) прадугледжвае валоданне навучэнцамі фанетычнымі і рытміка-інтанацыйнымі нормамі беларускай мовы, яе графічнай, арфаграфічнай, словаўтваральнай сістэмамі, марфалогіяй, сінтаксісам, лексічным мінімумам у межах 7000 адзінак. Лексічны мінімум у 3000 слоў дазволіць замежным навучэнцам разумець да 95% любога тэксту на беларускай мове.

Маўленчыя задачы. Рэалізуюцца ў працэсе фарміравання і развіцця камунікатыўных уменняў на аснове моўных і сацыякультурных ведаў і

навыкаў у межах прадметнага зместу гаворкі (сфер, сітуацый і тэм зносін). Ахарактарызуем маўленчыя задачы па відах маўленчай дзейнасці, якія вызначаюць змест камунікатыўнай і сацыякультурнай кампетэнцыі.

Аўдзіраванне. Уменне разумець змест, камунікатыўныя намеры і эмацыянальна-экспрэсіўныя асаблівасці моўцы пры аб'ёме пасіўнага слоўніка да 7000 слоў. Слухач павінен умець адрозніваць правільнае вымаўленне ад няправільнага, здагадвацца па кантэксце пра значэнне незнаёмых слоў (іх колькасць не павінна перавышаць 10%, і такія лексічныя адзінкі не павінны быць апорнымі) і адрозніваць на слых сэнсавыя адценні блізкіх па значэнні слоў. Маналагічны тэкст можа прапаноўвацца да розных камунікатыўных тыпаў маўлення (апісанне, апавяданне, разважанне) і розных сфер зносін. Дыялагічны тэкст складаецца з розных дыялогаў (інтэрв'ю, абмен думкамі і г.д.). Пры ўспрыманні на слых аўтэнтычнага тэксту (прагноз надвор'я, рэклама, аб'ява) навучэнец павінен умець вылучыць асноўную думку.

Маўленне. Уменне дасягаць мэты камунікацыі, арганізуючы сваю гаворку ў форме дыялога і маналога з выкарыстаннем розных відаў маўленчых зносін (апісанне, разважанне) у рэчышчы розных сфер і тэм зносіны і розных стылістычных сродкаў, адэкватных сітуацыі зносін пры аб'ёме актыўнага слоўніка ў межах 3500 адзінак. Моўца павінен правільна ўжываць формулы маўленчага этыкету, ставіць лагічны націск, правільна інтанаваць фразу.

Чытанне. Уменне разумець змест любога неадаптаванага тэксту без слоўніка або з мінімальным зваротам да слоўніка, карыстаючыся пры гэтым рознымі відамі чытання: аглядным, навучальным, азнаямленчым, пошукавым. Хуткасць пры вывучальным чытанні – да 100 слоў/мін, пры азнаямленчым – 350-400 слоў/мін. Навучэнец павінен прадэманстраваць: а) разуменне агульнага зместу тэксту і яго асноўнай думкі пасля аднаразовага прачытання тэксту; б) уменне арыентавацца ў структуры тэксту (знаходзіць у тэксце рэплікі персанажаў, выяўляць пазіцыю аўтара, здабываць новую для сябе інфармацыю, вылучаць выразныя і выяўленчыя сродкі стварэння мастацкага выражэння); в) вызначаць жанр твора; г) здагадвацца па кантэксце пра значэнне невядомых адзінак мовы.

Пісьмо. Уменне ствараць уласныя тэксты розных жанраў (тэзісы, канспект, анатацыя, рэзюмэ, рэферат, заява, пераказ, сачыненне), якія належаць да розных сфер зносін, выкарыстоўваючы формы апісання, апавядання, разважання. Створаныя навучэнцам тэксты павінны таксама дэманстраваць уменне пісаць пад дыктоўку, перадаваць сваімі словамі змест тэксту, а таксама знаходзіць і выпраўляць памылкі.

Агульнавучэбныя задачы. Вырашаюцца ў працэсе набыцця ўменняў: працаваць з кнігай, слоўнікам, тэхнічнымі сродкамі, рабіць навучальныя запісы, лагічна і паслядоўна будаваць выказванне, выкарыстоўваць пераклад і г.д.

Сацыякультурныя задачы. Дасягаюцца падчас набыцця лінгвакраіназнаўчых ведаў, навыкаў, уменняў, што складаюць аснову сацыякультурнай кампетэнцыі.

Прафесійныя задачы. Іх дасягненне звязана з набыццём ведаў і развіццём навыкаў і ўменняў, неабходных для будучай прафесійнай дзейнасці на занятках па практыцы маўлення. Такія задачы вырашаюцца ў выніку чытання і абмеркавання тэкстаў педагагічнай скіраванасці, наведвання заняткаў, падрыхтоўкі рэфератаў. Тым самым забяспечваецца ўзаемадзеянне практычнага курса мовы з профільнымі дысцыплінамі.

Агульнаадукацыйная мэта навучання прадугледжвае выкарыстанне навучэнцамі беларускай мовы для павышэння агульнай культуры, пашырэння кругагляду, ведаў пра краіну, мова якой вывучаецца і – праз пасрэдніцтва мовы – пра навакольны свет у цэлым. Агульнаадукацыйная мэта навучання дасягаецца ў выніку аналізу выкарыстаных на занятках тэкстаў, гутарак з навучэнцамі, абмеркаванні актуальных праблем, прагляду відэастужак і інш. Падчас рэалізацыі гэтай мэты навучання паляпшаецца практычнае валоданне не толькі замежнай, але і роднай мовай навучэнцаў у выніку супастаўлення сістэм дзвюх моў і наяўных у іх спосабаў выражэння думак. Дасягненне агульнаадукацыйнай мэты ўносіць уклад у развіццё лагічнага мыслення навучэнцаў у выніку выканання такіх заданняў, як: складанне планаў, тэзісаў, а таксама спрыяе ўдасканаленню культуры зносін, прыёмам разумовай працы.

Дасягненне агульнаадукацыйнай мэты прадугледжвае набыццё навучэнцамі краіназнаўчых і лінгвакраіназнаўчых ведаў. *Краіназнаўчыя* веды складаюцца з звестак пра краіну, мова якой вывучаецца, у склад іх уваходзіць інфармацыя пра геаграфічныя і прыродныя ўмовы Беларусі, яе дзяржаўным ладзе, культуры краіны і яе ўкладу ў сусветную культуру, адукацыйных установах, святах, знамянальных датах і інш. *Лінгвакраіназнаўчыя* веды даюць уяўленне пра нацыянальна-культурную спецыфіку маўленчых зносін носьбіта мовы, якая ўключае безэквівалентную лексіку, фонавыя веды, закладзеныя ў імёнах уласных, прыказках, прымаўках, фразеалагізмах, назвах прадметаў і з'яў традыцыйнага і новага побыту, асаблівасцях паводзін і этыкету, якія на занятках па мове разглядаюцца з пункту гледжання адлюстравання ў іх культуры, нацыянальна-псіхалагічных асаблівасцей, вопыту людзей. Пры гэтым пашыраецца лінгвістычны кругагляд навучэнцаў праз паглыбленне ведаў пра беларускую мову як сродак міжнародных зносін. Такія веды ствараюць спрыяльныя магчымасці для лепшага разумення роднай мовы і ўдзелу ў дыялогу дзвюх культур – беларускай і роднай.

Выхаваўчая мэта навучання рэалізуецца праз сістэму асобасных адносін навучэнца, які далучаецца да мовы і культуры актыўных носьбітаў мовы. Яна прадугледжвае вырашэнне задач, звязаных з фарміраваннем: а) паважлівага і добразычлівага стаўлення да народа, мова якога стала

прадметам вывучэння; б) сістэмы маральных каштоўнасцей і ацэнкава-эмацыянальнага стаўлення да свету; в) станоўчага стаўлення да мовы, культуры народа, які размаўляе на гэтай мове; г) разумення важнасці вывучэння замежнай мовы, запатрабавання карыстацца ёю як сродкам зносін ва ўмовах міжнароднага супрацоўніцтва; д) пачуцця справядлівасці, усвядомленага стаўлення да маральных учынкаў і дзеянняў людзей, жаданне разабрацца ў пэўнай сітуацыі, зрабіць правільны маральны выбар.

Фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі разглядаецца ў якасці важнай задачы, якая вырашаецца ў працэсе навучальна-выхаваўчай працы. Выкладчык пры гэтым імкнецца выпрацаваць у навучэнцаў пачуццё адказнасці, павагі да асяроддзя, добрасумленнае стаўленне да працы. Выхаваўчая мэта рэалізуецца пры чытанні і абмеркаванні тэкстаў, гутарак, сустрэч з носьбітамі мовы, экскурсій. Яе характар і змест павінны будавацца з улікам узроставых асаблівасцей навучэнцаў, іх інтарэсаў, узроўню валодання мовай.

Развіццёвая мэта навучання выяўляецца ў дзейнасці выкладчыка, накіраванай на развіццё моўных здольнасцей навучэнцаў, культуры маўленчых паводзін, агульнавучэбных уменняў, устойлівай цікавасці да вывучэння мовы, такіх якасцей асобы, як устойлівыя станоўчыя эмоцыі, маральныя якасці, памяць і інш.

Найбольш спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі ўсіх мэт навучання маюць месца пры арганізацыі заняткаў ва ўмовах моўнага асяроддзя, что дазваляе максімальна выкарыстоўваць метад дэманстрацыі і непасрэдных зносін навучэнцаў з носьбітамі мовы. Адзінства мэтаў навучання дазваляе пазбегнуць аднабаковасці ў навучанні, калі адны мэты, напрыклад практычная, вырашаюцца асобна ад іншых. Важна таксама, каб мэты навучання ўсведамляліся навучэнцамі і былі імі трывала засвоены. Калі мэты стануць матывамі навучальнай дзейнасці навучэнцаў і будуць успрымацца імі як асобасна значныя, роля навучэнца як аб’екта навучання можа змяніцца: ён стане суб’ектам дзейнасці па авалоданні мовай, што станоўча паўплывае на вынікі навучання.

НАВУЧАННЕ АЎДЫЯВАННЮ Ў КАНТЭКСЦЕ ФАНЕТЫЧНЫХ СІСТЭМ БЕЛАРУСКАЙ І КІТАЙСКАЙ МОВЫ

В. В. Шахаб[1)], К. С. Шахаб[2)]

[1)]Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў,
вул. Мачандаа, 117, 300204, г. Цяньцзінь, Кітайская Народная Рэспубліка,
shahab.olga@yandex.by

[2)]Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў,
вул. Мачандаа, 117, 300204, г. Цяньцзінь, Кітайская Народная Рэспубліка,
kasangdela@yandex.by

Навучанне беларускай мове як замежнай ставіць перад вучонымі-метадыстамі і практыкамі шэраг тэарэтычных і прыкладных задач, адна з якіх – развіццё перцэптыўных і прадуктыўных відаў маўленчай дзейнасці. Артыкул прысвечаны працы з кітайскімі студэнтамі па аўдыяванні беларускай мовы з улікам істотнай розніцы ў беларускай і кітайскай фанетыцы. Спецыфічныя падыходы да навучання аўдыяванню як віду маўленчай дзейнасці непасрэдна звязаны з фанетычнымі асаблівасцямі мовы навучэнцаў. Выяўлены фактары, якія ўплываюць на асаблівасці ўспрыняцця кітайскімі студэнтамі аўдыятэкстаў і жывой гаворкі. Акрэслены алгарытм дзейнасці навучэнцаў па авалоданні аўдыяваннем і паралельна з ім вымаўленнем, пералічаны найбольш прадуктыўныя заданні на пачатковым этапе навучання. Увага звяртаецца на калектыўныя формы працы, актуальныя для арганізацыі штучнага моўнага асяроддзя і актывізацыі маўленчай дзейнасці студэнтаў.

Ключавыя словы: аўдыяванне; фанетычная сістэма; станоўчы і адмоўны пераносы; прамыя, свядомыя, камбінаваныя і інтэнсіўныя метады навучання.

Беларуская мова сёння – не толькі мова тытульнай нацыі Рэспублікі Беларусь, яе духоўны скарб і сховішча народнай мудрасці, але і транслятар унікальнага беларускага менталітэту, навукі і культуры ў міжнароднай прасторы. У прыватнасці, упершыню ў Кітаі з 2017 года ў Цяньцзінскім універсітэце замежных моў пачалося навучанне па спецыяльнасці бакалаўрыяту “беларуская мова”. На сённяшні дзень такіх універсітэтаў у Кітаі ўжо тры, акрамя таго, працуе звыш 12 цэнтраў даследавання Беларусі, дзе студэнты іншых спецыяльнасцей маюць магчымасць вучыць беларускую мову факультатыўна.

Беларуская тэорыя і методыка навучання беларускай мове як замежнай мае ўжо дастаткова многа тэарэтычных і практычных набыткаў, але, на нашу думку, варта дадаткова засяродзіць увагу на спецыфічных заканамернасцях навучання студэнтаў таму ці іншаму віду маўленчай дзейнасці. Агульнавядома, што авалоданне кітайскімі навучэнцамі беларускай мовай як замежнай грунтуецца на ўсведамленні непарыўнай сувязі мэтавай і роднай мовы, інакш кажучы, засваенне беларускай мовы і развіццё маўлення студэнтаў адбываецца з апорай на іх родную кітайскую

мову. На працэс навучання ўплываюць, акрамя таго, англійская і руская мовы, якія засвойваюцца студэнтамі паралельна з беларускай.

Адна з прычын, якая абумовіла напісанне дадзенага артыкула – практычныя складанасці, якія ўзніклі падчас навучання кітайскіх студэнтаў аўдыяванню беларускай мовы і засваення імі артыкуляцыйных норм. Сярод іх неабходна ў першую чаргу назваць істотную розніцу ў фанетычных сістэмах абедзвюх моў. Варта адзначыць, што кітайская мова з'яўляецца сілабічнай (складовай), а не фанемнай. Гэта тое, што моцна ўплывае як на здольнасць студэнтаў распазнаваць вуснае маўленне, так і на здольнасць яго інтанаваць і прадуцыраваць. Акрамя таго, у Кітаі існуюць некалькі дыялектных груп, і носьбіты кожнага з дыялектаў маюць унікальныя памылкі ва ўспрыманні і вымаўленні, якія ў поўным аб'ёме не могуць быць прадугледжаны выкладчыкам (у студэнцкіх вучэбных групах аб'яднаны прадстаўнікі карэннага насельніцтва хань з розных правінцый краіны і малых нацыянальнасцей). Гэта накладвае адбітак на ўсю сістэму навучання, пазбаўляючы вучэбны працэс універсальных рэкамендацый і патрабуючы карпатлівай працы з кожным складаным выпадкам. Тым не менш, у дадзеным артыкуле мы дазволім сабе абагульніць некаторыя важныя для выкладчыка аспекты.

Галоўнай умовай фарміравання правільнай артыкуляцыі з'яўляецца добрае ўспрыманне мовы на слых, ці, інакш кажучы, здольнасці студэнтаў да распазнавання і сэнсавай інтэрпрэтацыі маўленчай плыні ў поўным аб'ёме. У працэсе навучання кітайскіх студэнтаў беларускай мове былі выяўлены некаторыя фактары, якія ўплываюць на асаблівасці ўспрыняцця навучэнцамі аўдыятэкстаў і жывой гаворкі і развіццё вуснага маўлення.

Вядома, што ў лінгвістыцы і методыцы выкладання замежных моў існуюць такія паняцці, як "正迁移" (станоўчы пераносе) і "负迁移" (адмоўны пераносе). І калі пры станоўчым пераносе навучэнец можа з дапамогай валодання адной мовай папоўніць прабелы ў ведах мэтавай мовы, то пры адмоўным пераносе валоданне адной мовай адбіваецца на мове вывучэння ў адваротны бок, выклікаючы пры гэтым памылкі рознага характару (стылістычныя, граматычныя, фанетычныя і г.д .), інакш кажучы, назіраецца інтэрферэнцыя. Безумоўна, гэта датычыцца ўсіх відаў маўленчай дзейнасці, у тым ліку аўдыявання. Акрамя таго, "без уліку фізічных асаблівасцей фанетычных з'яў цяжка ахарактарызаваць сітуацыю пры розных відах інтэрферэнцыі моўных сістэм…" [1, с.15]

Тут варта згадаць, што фанетычную сістэму сучаснай нарматыўнай кітайскай мовы (путунхуа) звычайна апісваюць пры дапамозе тэрмінаў "ініцыяль", "фіналь", "тон". Калі ініцыяль стаіць у пачатку склада і суадносіцца з зычным гукам, то фіналь – абавязковая астатняя частка склада – можа ўтрымліваць галосны ці спалучэнне зычнага з галосным гукам. Што

датычыцца кітайскіх тонаў, то пры навучанні беларускай мове яны для нас не маюць значэння, таму што не ўплываюць на артыкуляцыю гукаў.

Да станоўчага пераносу на фанетычным узроўні мы можам аднесці, па-першае, тое, што ў кітайскай мове існуюць так званыя змычна-фрыкатыўныя і каранальныя нёбныя гукі (舌尖 后 音), сярод якіх ёсць такія, як [zh], [ch], якія па сваім гучанні вельмі набліжаюцца да беларускіх змычна-шчылінных [ž] і [ч]. Менавіта гэта служыць прычынай таго, што гэтыя гукі добра ўспрымаюцца кітайскімі навучэнцамі і прамаўляюцца вельмі выразна і чыста. Таксама ў кітайскай мове ёсць апікальна-зубны гук [z] (舌尖 前 音), які па сваім гучанні падобны да беларускага змычна-шчыліннага [z’]. Вышэйназваныя гукі кітайскай мовы маюць агульныя характарыстыкі па месцы ўтварэння з беларускімі, таму кітайцы, якія вывучаюць беларускую мову, у большасці выпадкаў распазнаюць і прамаўляюць іх правільна і без складанасцяў. Адметна тое, што кітайскія студэнты выключна добра чуюць і пасля перадаюць у вусным маўленні асімілятыўныя з’явы ў спалучэннях зычных.

Па-другое, нельга не адзначыць падабенства паміж беларускім гукам [ў] і кітайскім складам [wu]. Гэта дае магчымасць студэнтам добра чуць гэты адметны беларускі гук і вымаўляць яго прыгожа і выразна.

З практыкі навучання заўважана, што кітайскімі навучэнцамі горш, чым астатнія, распазнаюцца і вымаўляюцца дрыжачы [р], губна-губныя [б]–[п], [б’]–[п’], змычныя (выбухныя) [д]–[т], а таксама заднеязычныя [г]–[г’] і ў меншай ступені [к]–[к’] і [х]–[х’].

Варта перш за ўсё адзначыць, што гук [р] у кітайскай мове цалкам адсутнічае, як і адсутнічае які-небудзь іншы гук, аддалена падобны на [р]. Менавіта з гэтай прычыны шматлікім (але не ўсім) кітайскім навучэнцам ён даецца цяжка як пры распазнаванні, так і ў вымаўленні (часам пры артыкуляцыі ў пачатку слова гучыць выразна, але ў сярэдзіне слова – як [л]).

Што тычыцца [б]–[б’], [п]–[п’], [д]–[т], [г]–[г’], [к]–[к’], [х]–[х’], заўважана: носьбіты кітайскай мовы часам не распазнаюць іх падчас аўдыявання (некаторыя навучэнцы не адрозніваюць гукі [б]–[п], [б’]–[п’] адзін ад аднаго і ў сувязі з гэтым часта іх блытаюць), і ў сувязі з гэтым падчас іх вымаўлення можа паўстаць шэраг пытанняў. Напрыклад, хоць і кітайскія, і беларускія [б]–[б’] належаць да губна-губных, кітайскі гук [b] зусім не падобны да беларускага варыянту. Тое ж мы можам сказаць і пра гукі [п]–[п’], якія гэтак жа належаць да губна-губных, але ў абедзвюх мовах вымаўляюцца па-рознаму. З пункту гледжання фізіялогіі, пры вымаўленні беларускага [б] гук утвараецца з дапамогай галасавых звязак, а пры вымаўленні [п] галасавыя звязкі не працуюць, таму “выбух” мацнейшы. Язычная артыкуляцыя [б’]–[п’] таксама істотна адрозніваецца ад іх цвёрдых пар: язык не адцягваецца назад, а прасоўваецца наперад. [1, с. 42–43] У кітайскай мове няма супрацьпастаўлення зычных паводле звонкасці – глухасці, а ёсць паводле напружанасці – прыдыхальнасці. Вымаўленне

любога з існуючых варыянтаў складоў з гукам [р] прыдыхальнае, таму студэнты дапускаюць памылкі ў пачатку беларускіх слоў, калі вышэйразгледжаныя гукі вымаўляюцца больш напружана.

Тое ж самае назіраецца з успрыманнем і вымаўленнем пярэднеязычных цвёрдых [д]–[т], у артыкуляцыі якіх не прымаюць удзелу губы (акрамя некаторых выпадкаў). Беларускі [д] таксама характарызуецца ваганнем галасавых звязак, пры вымаўленні ж [т] галасавыя звязкі не вагаюцца наогул. [1, с. 47] Бліжэйшыя да іх кітайскія гукі адносяцца да апікальна-альвеалярных (па месцы ўтварэння) і змычна-выбухных (па спосабу артыкуляцыі) гукаў. Пры вымаўленні [d] няма прыдыхання, [t] наадварот з'яўляецца аспіратай.

Акрамя зычных, існуюць гэтак жа два найбольш праблемныя галосныя гукі [і] і [ы], асабліва ў пазіцыі пасля зычных. Пры вымаўленні беларускага [і] моўны апарат нагадвае рупар з вузкім канцом спераду (такая нагляднасць дапамагае патлумачыць студэнтам асаблівасць вымаўлення дадзенага галоснага). Палажэнне языка пры вымаўленні кітайскага гука [і] вышэйшае, чым пры ўтварэнні беларускага. Вымаўленне ж [ы] ў беларускай літаратурнай мове характарызуецца больш шырокім праходам паміж языком і паднябеннем, чым пры артыкуляцыі [і]. [1, с. 37–38] У кітайскай мове адпаведнага [ы] ці блізкага да яго гука няма. Магчыма, менавіта гэтым тлумачыцца тое, што студэнты часта блытаюць [і] і [ы] ў маўленні, замяняюць адзін гук на другі і, адпаведна, горш за іншыя распазнаюць і прамаўляюць іх.

У сувязі з тым, што склады ў кітайскай мове досыць простыя і лёгкія для вымаўлення, доўгія беларускія словы з блізкімі гукамі, якія часам паўтараюцца, таксама ствараюць пэўную праблему для распазнавання гукаў у моўнай плыні і пастаноўкі вымаўлення, бо такіх слоў у кітайскай мове няма. У ходзе заняткаў мы заўважылі, што нават такія, на першы погляд, невялікія і простыя словы, як *Беларусь, Барбара, цырульня, сцішыўся, усхваляваныя, пульхны, скарылася, драпежнік, цемрашальства і г.д.* выклікалі ў кітайскіх студэнтаў складанасці ў распазнаванні і, адпаведна, у вымаўленні. На наш погляд, акрамя вышэйзгаданых фактараў, гэта звязана і са збегам зычных, у тым ліку на стыку марфем, а таксама з даўжынёй і фанетычнай складанасцю некаторых слоў.

Метады навучання замежным мовам традыцыйна дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад асаблівасцей роднай мовы навучэнцаў і магчымасці абапірацца на яе ў працэсе навучання. У адпаведнасці з гэтым вылучаюць прамыя, свядомыя, камбінаваныя і інтэнсіўныя метады. Пры правядзенні з кітайскімі студэнтамі аўдыявання бачыцца мэтазгодным улічваць і метадычна абгрунтавана карэкціраваць уплыў іх роднай мовы мовы на беларускую, супастаўляючы і проціпастаўляючы артыкуляцыйныя характарыстыкі гукаў абодвух моў ужо пачынаючы з прапедэўтычнага этапа, падчас так званых фанетычных размінак. Акрамя таго, уводна-

фанетычны курс і аўдыяванне павінны знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі. Пры авалоданні тэхнікай чытання і вымаўленчымі навыкамі развіваецца фанематычны і інтанацыйны слых студэнтаў, і менавіта тады рэгулярнае праслухоўванне і фанетычны разбор правільна агучаных тэкстаў адыгрывае вядучую ролю.

Алгарытм упарадкававання дзейнасці кітайскіх студэнтаў па авалоданні аўдыяваннем і паралельна з ім вымаўленнем, на нашу думку, павінен уключаць:

– метадычныя прыёмы і заданні для распазнавання і артыкуляцыі беларускіх гукаў і фанетычных слоў у моўнай плыні;

– метадычныя прыёмы і заданні для распазнавання і пастаноўкі блізкіх паводле артыкуляцыі гукаў;

– метадычныя прыёмы і заданні для распазнавання і пастаноўкі беларускіх гукаў, якія адсутнічаюць у кітайскай мове;

– метадычныя прыёмы на засваенне фанетычных законаў беларускай мовы: акання, якання, аглушэння, асіміляцыі па мяккасці, глухасці, звонкасці.

Сярод найбольш прадуктыўных заданняў, якія пацвердзілі эфект на пачатковым этапе навучання аўдыяванню, варта згадаць фанетычныя размінкі і дыктанты, шматразовае выразнае паўтарэнне слоў з самымі “праблемнымі” для кітайскіх навучэнцаў гукамі разам з выкладчыкам, праслухоўванне і аналіз невялікіх фраз, добра агучаных адаптаваных тэкстаў з правільным беларускім вымаўленнем і дэталёвы іх разбор з чляненнем на фанетычныя словы. Можна прапанаваць студэнтам прачытаць новыя, аналагічныя ўжо засвоеным (з тымі ж фанетычнымі з’явамі) словы самастойна, без папярэдняга чытання выкладчыкам ці праслухоўвання аўдыязапісу.

Варта звярнуць увагу на тэмп маўлення: спачатку ён павінен быць павольным і выразным, далей паскарацца як на кожным уроку, так і па меры ўскладнення лексікі, тэкстаў і заданняў да іх. Абавязкова неабходна прапаноўваць студэнтам для рэгулярнага праслухоўвання аўдыя- і відэазапісы з жывой мовай, неадаптаваныя тэксты, інакш кажучы, выкарыстоўваць усе рэсурсы, якія могуць абудзіць цікавасць навучэнцаў і прыстасаваць іх маўленчы слых да правільнага ўспрыняцця мовы. На жаль, у сеціве вельмі абмежаваная колькасць беларускіх моладзевых праграм, серыялаў і фільмаў на беларускай мове, што пазбаўляе магчымасці актывізаваць маўленчыя працэсы.

Вялікі плён маюць і калектыўныя формы працы, напрыклад, так званыя флэш-мобы, дзе студэнты па чарзе запісваюць вершы вядомых паэтаў, рыхтуюць прывітальныя відэасюжэты, а таксама конкурсы выканаўцаў песень і вершаў на замежных мовах. Для такой працы неабходна навучыць студэнтаў не толькі добра прамаўляць гукі, але і выразна інтанаваць тэксты, дакладна расстаўляць націскі, адчуваць рытмічную арганізацыю мовы.

Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў актыўна заахвочвае студэнтаў да такой пазааўдыторнай актыўнасці, якая мае на ўвазе актыўную маўленчую дзейнасць, што бясспрэчна спрыяе эфектыўнасці навучання.

У выніку падагульнім, што аўдыяванне як від маўленчай дзейнасці мае шэраг спецыфічных падыходаў, звязаных з фанетычным асаблівасцямі мовы навучэнцаў. Таму выключнае значэнне мае агульны досвед выкладчыка па агульным мовазнаўстве, яго імкненне дэталёва разабрацца ў характары ўспрымання і распазнавання кітайскімі студэнтамі гукаў, фанетычных слоў і фраз на беларускай мове, арганізаваць і максімальна актывізаваць навучанне аўдыяванню суразмерна са ступенню складанасці для іх вучэбнага матэрыялу.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І.Р. Бурлыка, Л.Ц. Выгонная, Г.В. Лосік, А.І. Падлужны. Мінск : Навука і тэхніка, 1989. 335 с.

СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АСПЕКТ У ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

С М. Якуба

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Yakuba SM@bsu.by

Артыкул прысвечаны пытанням вывучэння словаўтваральных паняццяў і словаўтваральных адзінак замежнымі навучэнцамі. Звяртаецца ўвага на актуальнасць засваення іншафонамі камунікатыўна мэтазгодных словаўтваральных адзінак (вытворнае слова, словаўтваральная мадэль, словаўтваральнае гняздо), праводзіцца думка пра неабходнасць вывучэння словаўтварэння на практычным узроўні з улікам узроўню засваення беларускай мовы, прапануецца тыпалогія практыкаванняў, якія могуць быць выкарыстаны пры авалоданні словаўтваральнымі ведамі, уменнямі і навыкамі на базавым узроўні і якія будуць садзейнічаць фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі іншафонаў.

Ключавыя словы: камунікатыўная кампетэнцыя іншафонаў; камунікатыўная мэтазгоднасць; словаўтваральны кампанент; вытворнае слова; словаўтваральная мадэль; словаўтваральная база; словаўтваральнае гняздо.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход разглядаецца вучонымі як асноўны падыход пры выкладанні замежнай мовы. Раскрываючы яго сутнасць, А. М. Шчукін адзначае: «Навучэнцаў знаёмяць з базіснымі функцыямі мовы, магчымымі камунікатыўнымі сітуацыямі і моўнымі сродкамі, здольнымі рэалізаваць гэтыя функцыі і сітуацыі. Мэтай данай варыяцыі падыходу з’яўляецца навучанне замежнай мове як сродку камунікацыі» [4, с. 104]. У сувязі з гэтым неад’емнай часткай развіцця асобы іншафона

з’яўляецца фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі (пададзена моўным, маўленчым, дыскурсіўным, прагматычным, прадметным, лінгваметадычным, прафесійным, сацыякультурным, лінгвакультуразнаўчым кампанентамі) – умення карыстацца вывучанай мовай ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, вырашаць пры яе дапамозе разнастайныя праблемы і задачы.

Словаўтваральны кампанент як складнік моўнага кампанента з’яўляецца неад’емнай часткай фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі. Пры апісанні словаўтварэння ў дыдактычных мэтах вучоныя засяроджваюць увагу на двух напрамках. Першы напрамак мае на мэце вывучэнне заканамернасцей функцыянавання словаўтваральнай марфемы ў складзе вытворнага слова з мэтай выражэння намінатыўнай функцыі мовы. Другі напрамак прадугледжвае даследаванне асаблівасцей функцыянавання вытворнага слова ў працэсе камунікацыі.

Авалоданне іншафонамі элементарнай лінгвістычнай тэорыяй па словаўтварэнні, выпрацоўка ўмення аналізаваць вытворныя словы і канструяваць лексічныя адзінкі па прадуктыўных словаўтваральных мадэлях садзейнічаюць усвядомленаму чытанню тэкстаў на беларускай мове, даюць вялікія магчымасці для ўзбагачэння слоўнікавага запасу навучэнцаў, фарміравання камунікатыўных уменняў і навыкаў, асэнсавання стылёвай прыналежнасці лексічнай адзінкі і выяўлення яе экспрэсіўных магчымасцей.

Засваенне словаўтварэння мае на мэце падвесці навучэнцаў да разумення прычынна-выніковых сувязей ў мове, да асэнсавання таго, што словаўтваральная сістэма – частка агульнай сістэмы мовы, усе элементы якой знаходзяцца ва ўзаемасувязі.

Л. В. Красільнікава адзначае, што «ўсе адзінкі, якія выдзяляюцца ў словаўтваральнай сістэме, валодаюць пэўным метадычным патэнцыялам, пры гэтым асноўнымі вучэбнымі адзінкамі выступаюць вытворныя словы, рэальна прадстаўленыя ў маўленчай практыцы, і метамоўная адзінка – словаўтваральная мадэль» [3, с. 12]. Вучонымі адзначаецца, што словаўтваральны матэрыял павінен адбірацца з улікам крытэрыяў частотнасці ўжывання вытворнага слова, яго стылістычнай характарыстыкі і камунікатыўнай мэтазгоднасці для данага этапу навучання іншафона. Што да словаўтваральнай мадэлі, то асаблівая ўвага надаецца такім яе характарыстыкам, як прадуктыўнасць і рэгулярнасць, а адбор мадэлей праводзіцца з улікам іх камунікатыўнай запатрабаванасці на тым ці іншым узроўні авалодання беларускай мовай. Напрыклад, на базавым узроўні вывучэння беларускай мовы навучэнцам прапануецца засвоіць назвы асоб паводле нацыянальнасці з суфіксам *-ец, -анін-/-к-а,* назвы асоб паводле прафесіі з суфіксамі *-ар-, -іст-, -нік-, -чык-*; назвы асоб жаночага полу з суфіксамі *-к-* і *-ніц-*; назвы адцягненага дзеяння з суфіксамі *-анн- / -енн-* і інш., а таксама мадэлі прыметнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў: прыметнікі з

суфіксамі *-н-, -ск-/ -цк-*; прыслоўі з суфіксамі *-а-* і канфіксам *па-…-ску;* дзеясловы з суфіксамі *-ва-,-ава-.-а-, -ну-*; дзеясловы руху з прыстаўкамі *па-, пра-, вы-* і інш. Пры гэтым словаўтваральная мадэль, прапанаваная іншафону для азнаямлення, павінна быць дастаткова спрошчанай і ў той жа час утрымліваць поўны набор неабходнай моўнай інфармацыі.

Неабходнасць азнаямлення са словаўтваральнай мадэллю Л. В. Красільнікава тлумачыць тым, што «словаўтваральная мадэль традыцыйна выступае як аснова для семантызацыі замежнымі навучэнцамі незнаёмага вытворнага слова на аснове словаўтваральнага аналізу пры рэцэптыўных маўленчых дзеяннях, у той жа час … словаўтваральная мадэль з пэўнымі абмежаваннямі з'яўляецца ўзорам і для пабудовы вытворных слоў пры рэпрадуктыўна-прадуктыўных маўленчых дзеяннях» [3, с. 13]. Аднак сама словаўтваральная мадэль – гэта абстрактная схема, таму пры навучанні беларускай мове як замежнай выкарыстоўваюцца пэўныя маўленчыя ўзоры, ажыццяўляецца знаёмства з канкрэтнымі словамі ў канкрэтных тэкстах, што ўжо на пачатковым этапе навучання садзейнічае ўсведамленню лексічных адзінак пэўнай будовы і выкарыстанню іх у маўленні.

Засваенне асноўных словаўтваральных адзінак з'яўляецца базай для ўсведамлення іншафонамі працэсу мадэліравання, фарміраванне ўмення выяўляць словы пэўнай будовы ў тэкстах, тлумачыць значэнне аднакаранёвых на аснове вядомай словаўтваральнай мадэлі, канструяваць словы з мэтай узбагачэння слоўнікавага запасу і развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі.

Для таго каб навучэнцы змаглі ўсвядоміць заканамернасці ўтварэння слоў, трэба дапамагчы ім асэнсаваць, што вытворныя словы ўтварыліся на базе іншых па словаўтваральных мадэлях, характэрных для сучаснай беларускай мовы (*лётА(ць) → лётчык, выкладА(ць) → выкладчык; лет(а) → летні, зім(а) → зімні; сушыць → высушыць, казаць → выказаць* і інш.). Разглядаць вытворнае слова неабходна ў супастаўленні з утваральнай асновай (словаўтваральнай базай), таму што кожнаму вытворнаму слову адпавядае ўтваральная аснова, а іх адносіны характарызуюцца сэнсавымі і структурнымі сувязямі. Пра вытворнасць можна гаварыць толькі пры супастаўленні значэнняў і марфемнай будовы ўтваральнай асновы і вытворнага слова. Таму пры вызначэнні асновы словаўтварэння неабходна ўлічваць фармальны і семантычны паказчыкі. Такі падыход дапаможа іншафонам усвядоміць законы словаўтварэння, бо толькі шляхам супастаўлення і параўнання вытворных і ўтваральных асноў можна асэнсаваць сутнасць словаўтварэння як працэсу, зразумець, як і пры дапамозе чаго ўтварылася тое ці іншае слова.

Мэтазгодна скіраваць увагу замежных навучэнцаў на засваенне значэнняў найбольш ужывальных суфіксаў і прыставак розных часцін мовы, фарміраваць уменне утвараць словы па прапанаваных мадэлях і ўжываць лексічныя адзінкі пэўнай канструкцыі ў вусным і пісьмовым маўленні,

паказаць стылістычную ролю словаўтваральных сродкаў. Варта звярнуць увагу на адметнасць суфіксаў і прыставак як службовых марфем, засяродзіцца на асноўнай іх прымеце – абавязковай паўтаральнасці ў словах, якія маюць аднолькавую будову і агульны элемент значэння. Да прыкладу, *мяд+ов+ы, абрыкос+ав+ы, парэчк+ав+ы* (суфікс *–ав-* мае значэнне ‘*прыгатаваны з нечага’*); *вы+сушыць, вы+гладзіць, вы+мыць* (прыстаўка *вы-* мае значэнне ‘*давесці дзеянне да канца’*).

Адсутнасць ведаў і навыкаў, неабходных для ўспрымання словаўтваральнай мадэлі і асэнсавання тых змен, якія могуць адбывацца ва ўтваральнай аснове, нярэдка становіцца прычынай не толькі словаўтваральных, а і маўленчых памылак навучэнцаў. У сувязі з гэтым іншафоны ўжо на пачатковым этапе навучання знаёмяцца з прадуктыўнымі ў сучаснай беларускай мове словаўтваральнымі мадэлямі, што дапамагае спасцігаць заканамернасці словаўтварэння. Назіранне над словамі з тэксту і канструяванне лексічных адзінак па прадуктыўных словаўтваральных мадэлях дапаможа ўсвядоміць, словы якой часціны мовы могуць выступаць у якасці ўтваральных да прапанаваных і якія марфемы удзельнічаюць ва ўтварэнні слоў пэўнай часціны мовы. Так, мэтазгодна прапанаваць заданні на ўтварэнне знамянальных часцін мовы з прадуктыўнымі словаўтваральнымі сродкамі (*бегчы → вы+ бегчы = выбегчы ‘выдзеліцца з чаго-небудзь’, будавА(ць) → будаў+ нік =будаўнік – ‘той, хто будуе’, мёд*(□) *→ мяд+ов = мядовы – ‘той, што ўтрымлівае мёд’* і інш.). Навучэнцы ўтвараюць словы паводле ўзору, паводле прапанаванага значэння слова і словаўтваральных марфем, выкарыстоўваюць лексічныя адзінкі пэўнай будовы ў словазлучэннях, сказах і тэкстах. Такая работа дае магчымасць падрыхтаваць трывалую базу для засваення вялікай колькасці слоў, узбагачэння слоўнікавага складу іншафонаў новымі лексічнымі адзінкамі, выкарыстання іх ў маўленні, разумення марфалагічных працэсаў.

Навучанне беларускаму словаўтварэнню іншафонаў будзе эфектыўным пры ўмове выкарыстання навукова абгрунтаванага комплексу практыкаванняў, накіраванага на развіццё ўмення выяўляць вытворныя словы ў кантэксце і тлумачыць іх значэнні, вызначаць семантыку марфем, з якіх складаюцца лексічныя адзінкі, аналізаваць словы з пункту гледжання іх словаўтваральнай будовы, утвараць лексічныя адзінкі прапанаваных словаўтваральных мадэлей і ўжываць іх у маўленні.

На сёння ў лінгваметодыцы актуальным лічыцца меркаванне пра неабходнасць знаёміць замежных навучэнцаў са словаўтваральным гняздом. На думку Н. Л. Кудзінай, работа са словаўтваральным гняздом дапаможа іншафонам успрымаць «лексіку ў сістэме, якая дазваляе бачыць дынаміку словаўтваральных механізмаў», а таксама будзе садзйнічаць усведамленню моўнай карціны свету беларусаў [2, с. 157].

Падтрымліваючы думку пра лінгваметадычную мэтазгоднасць знаёмства іншафонаў са словаўтваральным гняздом, варта адзначыць

цяжкасці азнаямлення з такім матэрыялам. У першую чаргу яны выкліканы тым, што ў беларускай лексікаграфіі не прадстаўлены словаўтваральны слоўнік гнездавога тыпу, на аснове якога можна праводзіць слоўнікавую работу. У сувязі з гэтым педагогу давядзецца праводзіць вялікую падрыхтоўчую работу па складанні словаўтваральных гнёзд для пэўнага этапу навучання. Вучоныя падкрэсліваюць, што на падрыхтоўчым этапе гэтыя гнёзды могуць рэпрэзентавацца скарочана, а на прасунутым ужо падавацца іншафонам у поўным аб'ёме. Падчас працы са словаўтваральнымі гнёздамі «навучэнцы аналізуюць кампанентны склад гнёзд, назіраюць, як разгортваецца тое ці іншае гняздо, пераносяць вопыт у незнаёмыя моўныя абставіны, па вывучаных мадэлях узнаўляюць значэнні невядомых слоў» [1, с. 17].

Так, на базавым узроўні пры знаёмстве з найменнямі асобы паводле месца жыхарства і нацыянальнасці, іншафонам прапануецца скарочанае словаўтваральнае гняздо з вяршыняй *Іспанія,* у склад якога ўваходзяць словы *іспанец, іспанка, іспанскі, па-іспанску*. Падчас азнаямлення з аднакаранёвымі словамі на практычным узроўні праводзіцца аналіз словаўтваральнай парадыгмы, словаўтваральных пар, словаўтваральных ланцужкоў, ажыццяўляецца праца са словаўтваральнымі гнёздамі з іншымі вяршынямі-назвамі краін паводле прапанаваных узораў. Прапануюцца практыкаванні на лінгвістычнае назіранне на аснове словаўтваральных ланцужкоў (*Прачытайце. Як утвараюцца прыметнікі і прыслоўі: Іспанія – іспанскі – па-іспанску; Японія – японскі – па-японску; Манголія – мангольскі – па-мангольску*), утварэнне слоў па аналогіі (*Утварыце прыметнікі і прыслоўі ад назваў краін: Партугалія, Бразілія, Манголія*), па прапанаванай мадэлі (*Іспанія – іспанец*), выкарыстанне лексічных адзінак пэўнай словаўтваральнай будовы ў прапанаваных маўленчых мадэлях (*Раскрыйце дужкі, замяняючы словы ў дужках прыметнікамі і прыслоўямі: Мая родная мова (Іспанія). Я яшчэ размаўляю (Швецыя); Назавіце жыхароў розных краін паводле нацыянальнасці: Мой сябар жыве ў Кітаі. Ён …*). Навучэнцы выяўляюць вывучаныя вытворныя словы ў прачытаным тэксце, адказваюць на пытанні да тэксту з выкарыстаннем засвоеных аднакаранёвых слоў, працуюць у парах, ствараюць дыялогі і невялікія апавяданні з ужываннем роднасных слоў. Праца на аснове словаўтваральных гнёзд дапамагае паказаць сувязь паміж словаўтваральным і лексічным узроўнямі мовы.

Такім чынам, словаўтваральная работа на аснове матадычна мэтазгодных словаўтваральных адзінак садзейнічае свядомаму засваенню лексікі беларускай мовы, у прыватнасці вытворных слоў, якія валодаюць пэўным культурна-канцэптуальным патэнцыялам, дазваляе папоўніць актыўны і пасіўны слоўнікавы запас і развіваць камунікатыўную кампетэнцыю іншафонаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гвоздева Е.В.* Гнездовой принцип изучения лексики при обучении русскому языку как иностранному // Вестник МГОУ. Серия : Русская филология. 2015. № 3. С. 14–19

2. *Кудина Н.Л.* К вопросу об основных словообразовательных единицах, актуальных для РКИ // Карповские научные чтения : сб. науч. ст. Вып. 11 : в 2 ч. Ч. 1 / редкол.: А.И. Головня (отв. ред.) [и др.]. Минск : «ИВЦ Минфина», 2017. С. 153–159.

3. *Красильникова Л. В.* Формирование словообразовательной компетенции филолога-русиста : русский язык как иностранный : дис. ... д-ра педагогических наук : 13.00.02. Москва, 2012. 453 с.

4. *Щукин А.Н.* Методика преподавания русского языка как иностранного : учеб. пособие. М. : Высшая школа, 2003. 334 с.

ЗМЕСТ

Мікалай Прыгодзіч
На філалагічным сумежжы 3

Круглы стол (пленарнае пасяджэнне).
Памяці прафесара А. Я. Міхневіча

І. С. Роўда
З успамінаў пра А.Я. Міхневіча 4

В. К. Шчэрбін
Роля А.Я. Міхневіча ў развіцці лінгвістыкі
афарызма як аднаго з напрамкаў сацыяльнай семіётыкі 5

С. А. Важнік
Арталагічная граматыка праф. А.Я. Міхневіча 12

М. І. Канюшкевіч
Да інвентарызацыі злучнікаў і іншых сродкаў
сувязі беларускай мовы 17

Н. Ю. Паўлоўская
Роля гіпотэзы ў навуковым даследаванні
(памяці А.Я. Міхневіча) 23

Т. В. Игнатович
Арнольд Ефимович Михневич: секреты
риторического обаяния 27

Ю. В. Назаранка
А. Я. Міхневіч – паэт, перакладчык, майстар
эпіграмы 30

Т. Р. Рамза
Унёсак А. Я. Міхневіча ў папулярызацыю беларускай
мовы як замежнай 35

Мовазнаўства

А. В. Варанецкая, У. І. Куліковіч
Лінгвадыдактычны аспект вывучэння
памылак у беларускамоўных тэкстах 42

В. Б. Галай
Из истории развития анатомической терминологии
в Беларуси 47

І. А. Гапоненка
Украінскія лінгвісты пра праблему пераемнасці
ў гісторыі ўкраінскай і беларускай моў 51

М. У. Гуль
Словаўтварэнне ад асноў іншамоўных дзеясловаў 58

В. П. Дзігадзюк
Актулізацыя фактычнай рэтраспекцыі
ў мастацкіх творах В. Іпатавай і Л. Рублеўскай 62

О. Н. Жизневская
Факультативные функции кавычек в текстах
СМИ Беларуси 67

І. У. Каліта
Сіні колер у моўнай карціне свету
беларусаў і рускіх 71

І. І. Караткевіч
Беларускамоўныя тэксты XVIII стагоддзя
ў замежных выданнях 79

А. А. Кірдун
Праблемы перакладу з рускай мовы на беларускую
тэрмінаў сферы камп’ютарных тэхналогій 83

А. И. Ковалева
Трактовка разницы внутренних форм слов:
синхронный подход 87

В. Д. Косціна
Спецыфіка моўных сродкаў рэкламы ў газеце
«Наша ніва» (1906–1915) 93

У. І. Куліковіч
Акцэнтуацыя ў «Слоўніку цяжкасцей беларускай мовы» 99

К. П. Любецкая
Да акрэслення паняцця “фактар” у лінгвістыцы 105

А. А. Печенькова
Числовой код в творчестве Е.А. Евтушенко 110

В. У. Праконіна
Змены ў правапісе беларускіх
эканамічных тэрмінаў 114

М. Р. Прыгодзіч
Мікола Шабовіч як стваральнік і даследчык
аўтарскіх неалагізмаў 119

Г. Ч. Рыжковіч
Тыпалагічна-семантычныя асаблівасці
тэмпаральных сінтаксем у беларускай мове 123

М. Л. Савасцюк
Сацыяльна-палітычная лексіка
англамоўнага паходжання ў публіцыстычным
дыскурсе (семантычны аспект) 128

А. Л. Садоўская
Кагнітыўны падыход у фразеалогіі 137

Я. Р. Самуйлік
Гаворка вёскі Пелішча Камянецкага раёна 143

І. Э. Саўко, У. П. Саўко
Правілы беларускай пунктуацыі:
нарматыўны і метадычны аспект 150

Т. П. Слесарева
Поэтический дендрарий, или фитонимная
лексика в лирике Владимира Короткевича:
семантика и функционирование 155

Т. Я. Старасценка
Рэалізацыя сэнсавых апазіцый у
паэтычным дыскурсе Міколы Мятліцкага 158

Л. І. Сямешка
Узроўні валодання беларускай мовай як замежнай:
структура апісання і спосабы вымярэння 164

Г. К. Ціванова
Назвы плацяжоў і падаткаў
у старабеларускай мове 169

Н. У. Чайка
Вытворныя сінтаксічныя дэрываты
ў беларускай мове 174

Г. К. Чахоўскі
Рэкламны тэкст: асаблівасці генеравання,
структуравання і ўспрымання 180

Н. В. Яненка
Асаблівасці выкарыстання інфармантамі
фрыкатыўнага [г] vs. выбухнога [ґ] у розных камунікатыўных
сітуацыях (на матэрыяле запісаў у г. п. Хоцімску) 187

Э. Я. Ярмоленка
Дапаўненне ў старабеларускай мове
(канструкцыі з родным склонам) 193

Літаратуразнаўства

І. П. Адамовіч
Паэзія Ніла Гілевіча: жанрава-стылёвая
адметнасць 202

А. І. Бельскі
Цішка Гартны – пачынальнік урбаністычнай
паэзіі 207

В. У. Барысенка
Захад і усход у творчасці Ігара Бабкова 214

А. У. Вострыкава
Мастацкія падыходы да адлюстравання
тэмы канцэнтрацыйных лагераў у рамане “Картатэка жывах”
чэшскага пісьменніка Норберта Фрыда 218

С. Я. Гончарова-Грабовская
Монодрама в современной
драматургии (русско-белорусский контекст) 223

Т. С. Кохан
Мастацкі гістарызм творчасці Яна Чачота 229

Г. М. Мятліцкая
Дыхатамія *вёска – горад* у мастацкім свеце
лірыкі Алеся Барскага 233

М. М. Хмяльніцкі
Польская літаратура 1918–1939 гг.
у сацыякультурнай прасторы Беларусі 238

Методыка выкладання філалагічных дысцыплін

Г. М. Валочка
Маўленчы этыкет ва ўводным курсе
беларускай мовы як замежнай 249

С. Д. Грынько
Музейна-педагагічная дзейнасць на ўроках
беларускай літаратуры як сродак рэалізацыі кампетэнтнаснага
падыходу 255

В. У. Праскаловіч
Творчы патэнцыял вучэбных
дапаможнікаў па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай
сярэдняй адукацыі 260

Т. І. Скікевіч, І. М. Курловіч
Да пытання аб методыцы
выкладання спецыяльнай беларускай лексікі на
землеўпарадкавальным факультэце 265

В. А. Тутькина
Специфика анализа текста в методике
функционального и коммуникативного подходов к изучению
частей речи 269

Т. Л. Чахоўская
Мэты і задачы навучання беларускай мове як
замежнай у кантэксце сучасных лінгвадыдактычных парадыгм 274

В. В. Шахаб, К. С. Шахаб
Навучанне аўдыяванню ў кантэксце
фанетычных сістэм беларускай і кітайскай моў 281

С. М. Якуба
Словаўтваральны аспект у выкладанні беларускай
мовы як замежнай 286

Навуковае выданне

МОВА – ЛІТАРАТУРА – КУЛЬТУРА

Матэрыялы IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі памяці прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча

Мінск, 15–16 кастрычніка 2020 г.

У аўтарскай рэдакцыі

Адказны за выпуск *А. А. Радзевіч*

Падпісана да друку 22.12.2020. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 17,44. Ул.-выд. арк. 19,25.
Тыраж экз. Заказ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка